# МІКОЛА ВАДАНОСАЎ





# МІКОЛА ВАДАНОСАЎ

*Выбраныя творы ў двух тамах*

*том 1*

**Аповесці**

МІНСК «МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА» 1983

Бел 2
В 12

$\text{В}\frac{4702120200-056}{\text{М}302(05)-83}116-83$

© Прадмова. Афармленне. Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1983.

# ПАМЯЦЬ СЭРЦА

Пачну з самага істотнага, з таго, што вызначае адметны характар творчасці Міколы Ваданосава. А каб зрабіць гэта болей-менеі грунтоўна, трошкі збочу на сцежку лірыкі...

Мікола Ваданосаў, як і ягоныя аднагодкі, людзі таго пакалення, чые юначыя мары апаліла апошняя вайна, пакаленне, якое, хоць і моцна парадзелае, усім смерцям назло жыць засталося. Жыве яно, працуе, творыць, ды... ніяк не можа пазбыцца жудаснай памяці вайны...

Дзе б ні працаваў былы партызан, франтавік, а ўсплыве, запалоніць памяць чорна-жахлівае мінулае, адаб'ецца на тваім настроі, уладарна пагоніць думкі па сваім рэчышчы.

Пакаленне пісьменнікаў, якія непасрэдна ўдзельнічалі ў вайне, зведалі і слату і нягоды, не маленькае. У кожнага з іх сваё творчае аблічча, свой голас. Некаторыя пішуць выключна пра перажытае, пра вайну. У Міколы Ваданосава амаль усе творы пачынаюцца з мірных пасляваенных дзён, хоць пасля не раз і не два ён вернецца разам са сваімі героямі ў віхуру таго ваеннага часу калатнечы і лакальна, невялікімі адступленнямі раскажа пра самае жахлівае, што перажылі яны, яго героі. І разам з імі — сам аўтар...

Бо не расказаць пра гэта нельга. Яно, тое мінулае, жыве ў душы, у сэрцы, і як незагойная рана ўвесь час нагадвае пра сябе.

Колькі мірных гадоў прайшло, а балючае рэха вайны ўсё не сціхае. Жыве яно ў велічных манументах і ў сціплых помніках-абелісках на нашай зямлі, жыве ў цяжкіх ранах, залечаных і не залечаных дагэтуль.

Рэха вайны. Яно жыве і не можа не жыць у свядомасці тых, хто прайшоў вайну ад пачатку да канца. Прайшоў не

і Мікола Ваданосаў, спачатку партызанскі радыст, а пасля вызвалення роднай Беларусі — радыст-франтавік. Чалавек, які вярнуўся з вайны з ордэнамі і медалямі, так і не здолеў канчаткова вырвацца з палону ўспамінаў пра той жахлівы час. Ён помніць усё. Ён разумее, што абавязаны расказаць пра вайну і пра сябе на дарогах вайны людзям, сваім чытачам.

Мікола Ваданосаў умее расказаць пра вайну і сурова, і сціпла, і разам з тым цікава, захапляюча. Які твор ні прачытай, аповесць гэта ці апавяданне, дзецям ён адрасаваны ці дарослым, пра мінулае ці пра дзень сённяшні, усюды чуецца даўкі пах ваеннага пораху, бо на жахлівых дарогах вайны спазнаў аўтар і голад, і холад, і раненні. Не раз глядзеў смерці ў вочы, і яна, бязносая, не раз заносіла над ім, тады яшчэ зусім юным, сваю пяўмольную касу.

Юнак Мікола пісаў тады, у вайну, вершы, і амаль кожны дзень, і ўсё — пра баі-паходы. Першыя радкі тады маладога паэта Міколы Ваданосава ўбачылі свет на старонках партызанскай лістоўкі. Праўда, як прызнаецца зараз, у свае шэсцьдзесят сталых год, сам аўтар тых вершаў, былі яны слабаватыя і рытарычныя. Але, дададзім мы, па-юначаму шчырыя. Пісаць хацелася. А нарадзілася цяга пісаць даўно, яшчэ да вайны, калі Мікола вучыўся ў дарожна-механічным тэхнікуме ў Мінску.

Пасля вайны гэтае жаданне пісаць перарасло ў паўсядзённую неабходнасць. Ну як жа не расказаць тым, хто прыйшоў на змену пакаленню, апаленаму вайной, хаця б пра частачку бачанага і перажытага?

І вось у «Чырвонай змене» з'яўляецца першае апавяданне Міколы Ваданосава «Атака», неўзабаве — другое, затым — яшчэ і яшчэ. І так за год каля дзесятка. Амаль на цэлую кніжку.

А паралельна ідзе праца над аповесцю «У Баркоўскай пушчы». Яе ахвотна бярэ да друку старэйшы і самы аўтарытэтны ў Беларусі часопіс «Полымя». Гэта было прызнанне, яно акрыліла, абнадзеіла...

І хаця былы партызанскі радыст па-ранейшаму працаваў па сваёй спецыяльнасці — тэхнікам па Беларускім радыёцэнтры,— ягонай паўсядзённай працай стала і літаратура. Услед за кніжкамі «Першае знаёмства» (1954) і «У Баркоўскай пушчы» (1956) адна за адной выходзяць усё новыя, адрасаваныя як дарослым, так і дзецям. Гэта «Аднагодкі» (1959) ,«Пабярэжцы» (1960), «Рачны госць» (1961), «Надзеі і здзяйсненні» (1963), «Апошні вадзянік» (1964), «Хатабыч-

малодшы» (1965), «Здарэнне на Спюдзенцы» (1967), «Адзінай маці сыны» (1968), «Пад чужым паролем» (1971), «Дзе віруе Бяроза» (1973), «Лясныя прыгоды» (1976), «Жыць, каб змагацца» (1978)... У апошнюю кнігу ўключаны дзве аповесці, якія на рэспубліканскім конкурсе на лепшую дзіцячую кнігу, былі адзначаны прэміямі. Асабліва плённымі былі гады пасля вучобы на Вышэйшых літаратурных курсах пры Літінстытуце імя М. Горкага ў Маскве, якія Мікола Вадапосаў скончыў у 1959 годзе. Яго кнігі чытаюць юнакі і дарослыя, чытаюць з цікавасцю, бо пісьменнік піша так, што, адгарнуўшы першую старонку, не адарвешся, пакуль не дачытаеш да канца. Той-сёй можа зазначыць, нібыта Ваданосаў спецыяльна для чытабельнасці «закручвае» сюжэт.

Не і не!

Сюжэты ўсіх кніжак Міколы Ваданосава ідуць ад жыцця. А каб ведаць жыццё, трэба не назіраць яго, а жыць у ім, жыць разам са сваімі героямі. Бо чытачу патрэбна толькі праўда жыцця. І калі ты ў сваіх творах адлюстроўваеш яе, то можаш не хвалявацца, што кніжкі твае будуць безнадзейна старэць, пыліцца на паліцах. Мікола Ваданосаў усё гэта даўно і добра разумее. Таму і піша гранічна-каратка, сцісла, без традыцыйна-дакучлівых адступленняў, якія часцей за ўсё нічога істотнага ў твор не ўносяць, а толькі замаруджваюць дзеянне.

Возьмем да прыкладу такое апавяданне, як «Галасы на вадзе», якое найбольш адпавядае творчасці пісьменніка. Нездарма яно прагучала па-руску, па-малдаўску, па-чэшску. У ім — багата матэрыялу, каларытнейшыя вобразы, напружанасць дзеяння. З усяго гэтага можна б было стварыць вялікую аповесць, а то і раман.

Дык не ж. Мікола Ваданосаў немалы матэрыял «заганяе» ў рамкі сярэдняга па сваіх памерах апавядання. І чытач выразна бачыць усіх герояў, ведае, чым яны жывуць, чым будуць жыць заўтра, праз год...

Такой мне ўяўляецца і новая аповесць пісьменніка «Скарб Загорскага касцёла», якая на Рэспубліканскім конкурсе на лепшую кнігу для дзяцей і юнацтва 1981—1982 гадоў адзначана заахвочвальнай прэміяй.

Аўтарам гэтага двухтомніка, Заслужаным работнікам культуры БССР, пройдзены па жыцці шлях у шэсцьдзесят гадоў. У яго шмат новых, цікавых задум. Яны ўжо набываюць абрысы будучых кніг. У іх мы, безумоўна, пачуем водгулле мінулай вайны і, вядома ж, зноў сустрэнем новых герояў, якія

жылі ці жывуць на Бярозе-рацэ, рацэ-калысцы пісьменніка.

Вось як гаворыць пра гэта сам Мікола Ваданосаў: «Амаль у кожным маім творы ёсць часцінка роднага куточка па Барысаўшчыне (вёска Ніўкі.— *Я. К.*). І колькі б новых кніжак яшчэ ні было, у кожнай з іх знойдзецца месца маім слаўным землякам, маёй любімай рацэ, якая ўзгадавала мяне, дала крылы для палёту...»

Так вобраз роднага куточка становіцца вобразам літаратурнага твора. Амаль у кожным творы адчуваецца подых лясоў і дуброў Барысаўшчыны з яе гаманкой ракою, з яе паплавамі і азёрамі, якія з дзіцячых год і на ўсё жыццё глыбока запалі ў сэрца...

*Яўген Курто*

# ПЕРАЛОМНАЕ ЛЕТА

## 1

Пачыналася лета. Ужо больш двух тыдняў не было дажджу. Нагрэтыя сонцам цагляныя гмахі дамоў дыхалі гарачынёю, нібы печы. Ліпы каля тратуараў пажоўклі, пачалі скідаць лішняе лісце, не здолеўшы напаіць яго вільгаццю. А яшчэ ж толькі чэрвень...

Вечар не прынёс халадку.

Асташонак стаяў ля ўваходу ў гарадскі парк і абыякава глядзеў на афішы. Яго бялявыя доўгія валасы спадалі на вушы. Высокі, узмужнелы не па гадах Зміцер Асташонак нагадваў рабочага, зморанага дзённай працай.

Ён толькі ўчора атрымаў атэстат сталасці, але сталасць прыйшла раней, у сакавіку, калі памерла маці і хлопец застаўся ў сям'і за гаспадара...

Што рабіць, як жыць далей? Такія пытанні прыходзілі часта. Спачатку ён хацеў кінуць школу і пайсці шукаць працу, бо Алік і Ганя яшчэ зусім малыя, на іх ідзе шмат грошай, пенсіі не хапае. Але Змітрок вельмі добра вучыўся. Настаўнікі, сябры, суседзі дапамаглі завяршыць вучобу. І вось ужо ў яго на руках атэстат, якога ніхто ў іхнім класе не мае — з аднымі пяцёркамі!

«Далёка пойдзеш, Дзіма!» — прыгадаў ён словы сваёй сяброўкі Іны Коўшык і схамянуўся. Што, калі схадзіць да яе? Іна вельмі па-дарослому разважае. Змітраку чамусьці заўсёды здавалася, што ёй куды больш гадоў, чым яе аднакласніцам. Прыгадаўся твар яе, чысты, нібы белая ружа, прыпухлыя вусны і вочы-васількі. Не забыць яму тых вачэй праз усё сваё жыццё!

— Змітрок! — ён адчуў, як чыясьці рука лягла яму на плячо.— Ну, чаго тут стаіш? Мы з ног збіліся, шукаючы...

Змітрок азірнуўся і ўбачыў Пятра, рабога Петрака, з якім тры гады сядзеў на адной парце.

— Навошта я вам спатрэбіўся? — непрыязна спытаў ён.

— Як — навошта? На развітальны вечар!

— На вечар? — толькі цяпер Асташонак успомніў, што сёння ў іх неафіцыйны вечар, развітальны баль.— Не, я не пайду...

— Ну, чаму? Там я, там усе... Іна...

— Вось бачыш? — Змітрок працягнуў рукі.— Перарос, брат, свой вучнёўскі касцюм. Рукавы да локцяў...

Пятрок хацеў прапанаваць яму свой касцюм, але толькі змераў таварыша вачыма.

— Ну і праўда — выцягнуўся ты, таварыш Асташонак! — паспрабаваў жартаваць Пятрок.— Нічога, ісці трэба ўсё роўна. Можа, больш не давядзецца так вось разам весяліцца. Удвух што-небудзь прыдумаем...

— Пачакай! — Змітрок схапіў яго за руку.— Здаецца, я прыдумаў адзін... Пайшлі да мяне!

Яны зайшлі да Асташонка на кватэру.

Проста з парога Змітрок падышоў да шафы і спыніўся ў нерашучасці. Асцярожна перавёў позірк на партрэт бацькі, што вісеў на сцяне.

— Не,— нарэшце вымавіў ён,— не падыдзе...

— А ты паспрабуй,— зразумеўшы яго намер, падказаў Пятрок.— Цяпер гэта тваё, будзь аптымістам, дружа!

З бакавых дзвярэй раптам выйшла Ганя. На свае трынаццаць год яна была залішне высокая, хударлявая. Але вельмі падобная на брата. Вочы ў яе карыя, матчыны.

— А-а, гэта ты, Дзіма? — прамовіла Ганя.— Пойдзеш на выпускны вечар?

— Не ведаю...

Ганя шпарка падышла да шафы і адкрыла яе. Асцярожна зняла з вешалкі бацькаў касцюм і звычайна, нібы Змітрок ужо даўно яго насіў, сказала:

— Я адпрасавала крыху... Вось, трымай.

Змітрок глянуў на таварыша і мігам апынуўся каля сястры. Абняўшы яе бялявую галаву з тугімі касіцамі, ён расчулена пацалаваў Ганю ў лоб.

— Дзякуй, Ганя... Дзякуй,— хутка міргаючы вачыма, прамовіў ён.— Ты ў мяне сапраўдная тут гаспадыня...

І, трымаючы ў руках бацькаў цёмна-сіні касцюм, Змітрок выйшаў у другі пакой. Там было ўтульна, чыста. «Гэта Ганя стараецца, каб у хаце быў такі ж парадак, як і пры маці...»

Пятрок зайшоў следам, наблізіўся да акна. На невы-

сокай тумбачцы стаяў прыёмнік. Хлопец уключыў яго. З дынаміка паплылі меладычныя гукі скрыпкі. Ганя адчыніла дзверы, прыпала плячамі да вушака і задумалася.

— Як хораша! — прамовіла яна, калі музыка скончылася.— Каб я так магла калі...

— Зможаш, Ганя! У цябе здольнасцей хопіць... Толькі пастарайся,— адказаў ёй брат, скідаючы свой стары вучнёўскі касцюм.

Неўзабаве Пятрок падвёў сябра да люстэрка і ўсклікнуў:

— Ты толькі зірні на яго, гэтага незнаёмца!

— Так,— ціха адказаў Змітрок.— Парог сталасці я, здаецца, пераступіў.

Перад тым як пайсці з дому, ён зноў шчыра пацалаваў сястру, як некалі цалаваў маці...

У зале грымела музыка, кружыліся пары, і прыход Асташонка заўважылі нямногія. Але затое многія заўважылі другога хлопца, гадоў дваццаці. Ён быў апрануты ў дарагі светла-шэры касцюм. На нагах гарэлі яркай чырванню сандалеты. Белыя манжэты кашулі крыху віднеліся з-пад рукавоў пінжака. На плячы вісеў фотаапарат. Разумныя карыя вочы хлопца кагосьці шукалі.

Юнак заўважыў Іну і пакіраваўся проста да яе. І цяпер толькі Асташонак убачыў сваю сяброўку. Белая пышная сукенка прыгожа аблягала яе стан, надаючы яму небывалую лёгкасць. Сэрца ў Змітрака раптам сціснулася ад крыўды і злосці, калі ён убачыў побач з Інай гэтага незнаёмага хлопца. Дзеля яе, толькі дзеля яе Асташонак прыйшоў на вечар!

— Прабачце....— Іна адчула на сваім плячы руку і задаволена павярнулася. Але яе ружовы твар адразу спахмурнеў, васільковыя вочы глянулі злосна.

— Я не танцую,— імгненна сказала яна і адвярнулася.

Хлопец, уражаны асаблівай прыгажосцю дзяўчыны, усміхнуўся:

— І я не танцую! Толькі скажыце мне, дзе знайсці Ганну Аляксандраўну. Я да яе...

— Ідзіце вунь туды,— не гледзячы на хлапца, Іна паказала ў правы куток залы.

— Дзякуй,— разважна адказаў той і пайшоў павольнай хадою праз усю залу.

Іна паглядзела яму ўслед якраз у той момант, калі і ён азірнуўся. І нічога асаблівага, яны толькі ўсміхнуліся адно аднаму. Гэтую ўсмешку заўважыў самалюбівы Змітрок. Ён ужо быў гатовы пакінуць залу, але Іна ўбачыла яго і падляцела як на крыллях.

— Нарэшце... Ну, хутчэй, хутчэй у круг! — пацягнула яна Асташонка за руку, але, заўважыўшы на ім новы касцюм, спынілася.

— Што, не падыходзіць? — скрывіўшы вусны, спытаў той.

— Цудоўны!.. Пашыты якраз на цябе. Толькі ў плячах, здаецца, шыракаваты...

Не, ён не мог сёння пакрыўдзіць дзяўчыну!

— Цяпер гэткая мода,— пажартаваў Змітрок, і яны, вясёлыя, пусціліся ў круг...

Патанцавалі, а потым ля буфета, седзячы за столікам, ласаваліся марожаным, гутарылі. Як многа ім сёння трэба сказаць адно аднаму! Ды, мабыць, такое, аб чым ніколі-ніколі яшчэ не гаварылі...

— Ты — медаліст, табе ўсё ж ёсць нейкая магчымасць стаць студэнтам. А я вось не ведаю, што буду рабіць. Хоць марожанае стапавіся прадавацьі — гаварыла Коўшык, сумна пазіраючы на свайго таварыша, які быў для яе цяпер крыху больш, чым проста сябра, бо тры апошнія гады, якія яны разам правучыліся ў школе,— гэта ўсё ж дастатковы тэрмін, каб зразумець, што прыйшло каханне...

Асташонак маўчаў. Яму зусім не хацелася гаварыць пра вучобу, тым больш — пра будучую вучобу. Аднак і аб сваім каханні ён гаварыць не мог: Іна не жадала такой размовы, гэта Змітрок зразумеў адразу.

Прайшоў той самы незнаёмы хлопец з фотаапаратам цераз плячо. Цяпер Змітрок разгледзеў на яго правай шчацэ чырвоную пляму, з пятак. Заўважыўшы Іну, хлопец спыніўся.

— Адну хвілінachку! — скамандаваў ён. І не паспеў Змітрок што-небудзь уцяміць, як хлопец ужо сфатаграфаваў іх. Усміхнуўся, памахаў над галавой рукою і пайшоў далей.

— Што за непрыемны тып? Ён так глядзіць на цябе...— незадаволена прамовіў Асташонак.

Іна ўзяла яго за доўгі нос і моцна сціснула.

— Раўнуеш?

— Раўную...

— Вось гэта мне падабаецца! Ведаеш, хто гэта? Пляменнік нашай Ганны Аляксандраўны... Памятаеш, яна казала, што ён прыйдзе фатаграфаваць.

Адчуўшы сябе ніякавата, Змітрок сказаў:

— Табе так да твару гэтая сукенка... Ты ў ёй, як дзяўчынка, кожны закахаецца...

— Дзяўчынка? Не, Дзіма, я ўжо... вырасла з гэтага ўзросту. Даўно...

Асташонак прыклаў правую руку да сваіх грудзей.

— Для мяне ты на ўсё жыццё цудоўная, прыгожая дзяўчынка...

Яна пяшчотна паглядзела на яго, як маці глядзіць на сваё наіўнае дзіця, і тут жа стала сур'ёзнаю.

— Ты гэта цяпер гаворыш. А паступіш у інстытут, нават не ўспомніш...

— Думаеш?

Іна не адказала. Яна працягвала выказваць свае думкі ўголас:

— Будзеш, скажам, галоўным інжынерам якога-небудзь вялікага завода. Пашана, гонар, уласная машына, сям'я...

— Сям'я? — лагодна запытаўся Асташонак.

— Сям'я,— адказала Іна, апусціўшы галаву і памешваючы лыжачкай марожанае ў вазачцы.— Усе людзі, калі становяцца дарослыя, ствараюць сям'ю, жывуць для яе, працуюць...

Хвіліну абое маўчалі.

— У мяне ўжо ёсць сям'я,— парушыў паўзу Змітрок.— Сястра, брат... Пра іх я павінен клапаціцца ў першую чаргу. Клапаціцца штодзень, каб яны не адчувалі ні ў чым патрэбы. Ні ў адзенні, ні ў ядзе...

Іна ўстала. Ёй чамусьці стала сумна з Асташонкам, і Змітрок адчуў гэта, але не ведаў, чаго сумуе дзяўчына.

— Ці не думаеш ты ісці працаваць? — абыякава спытала Коўшык, прыкрываючы рот рукою.

Гэтае пытанне сёе-тое праясніла.

— Сёння я ні аб чым не магу думаць,— адказаў Змітрок.

Ідучы дадому, Асташонак усё ж думаў, думаў пра свой далейшы лёс. «Як хочацца стаць студэнтам!» — ледзь не сказаў уголас Змітрок і падумаў пра Пятра, які, як каза-

лі, недзе дастаў даведку, што два гады працаваў карэктарам на тэлеграфе, і цяпер паступае ў інстытут.

«Але ж і ў мяне ёсць шанцы — выдатнік, медаліст... Праўда, не зусім выпадае куды-небудзь паступаць: я ж старэйшы ў сям'і. Гэта трэба ўлічваць... Маці гаварыла, што ўсе сілы аддасць, а Ганю вывучыць, бо ў яе — талент. Цяпер маці няма, цяпер я павінен замяніць ёй маці...»

З сённяшняй размовы на вечары Асташонак зразумеў, што Іна вельмі хоча, каб ён вучыўся. Нават узлавалася, калі ён пачынаў гаворку пра работу. Праўда і тое, што ён здольны да вучобы. Завод ці будоўля могуць адбіць ахвоту вучыцца. Ва ўсякім выпадку, так гаворыць Іна. Яго бацькі ніколі так не гаварылі...

«Мілыя, родныя бацькі, навошта вы так рана пакінулі свайго Змітрака, прымусіўшы яго самому выбіраць шлях у жыццё?..»

Як цудоўна яны жылі ўсе разам! Бацька яго быў чыгуначнікам, маці — загадвала дзіцячым садам, жылі ў дастатку, дружна. Памятае Змітрок і апошнія словы бацькі, які ўсё сваё жыццё аддаў аднойчы выбранай любімай справе: «Помні, сынку, што не чорная праца ганьбіць чалавека, а яго чорныя справы, душа. Не бойся і не цурайся ніякай працы — і ты будзеш шчаслівы...»

Каля самага пад'езду свайго дома хлопец сустрэўся з суседам, Антонам Пятровічам Забаўскім, старым майстрам з завода. Гэта быў хударлявы, яшчэ дужы чалавек, хоць скроні даўно ўжо сталі сівыя.

Яны спыніліся, павіталіся.

— Ну, сусед, як справы? Працуеш ужо? — левай рукою падкручваючы вус, спытаў дзядзька Антось, як называлі яго ўсе суседзі.

— Яшчэ не...

— А куды думаеш?

— Не ведаю.

— Ідзі да нас. Там, брат, разгон! Ого-го, які разгон!..

— Я падумаю.

— Ну, ну, думай. Калі што — проста да мяне! Памагу...

Стары пайшоў у пад'езд, а Змітрок завярнуў у садзік, што быў насупраць дома. Ён здзівіўся, калі ўбачыў Петрака, які ішоў цяпер яму насустрач.

— Увесь вечар за табой сачу і нічога не магу зразумець,— пачаў Пятрок.— Шкада мне цябе...

Асташонак спыніўся, насцярожыўся. Ганарлівы па на туры, ён не цярпеў, калі яму спагадалі.

— Шкада? Чаму ж гэта?

— Ты можаш паступіць вучыцца...

Змітрок непрыязна адказаў:

— Змагу ці не, а фальшывых даведак, як некаторыя, даставаць не буду і не пашлю іх з дакументамі. Разумееш? Дворнікам пайду, швейцарам, але сумленна! Глядзі, калі вернуць табе дакументы з фальшывай даведкаю,— сораму не абярэшся...

— Фальшывай, кажаш? Гэта ты пра мяне?! А я ж два гады на вячэрняй і на начной зменах дзяжурыў... Спаў, бывала, па чатыры гадзіны... Не думай, што за таткавай спіною сядзеў. І не хваліўся, і не плакаў! А ты... паверыў, што злыя языкі менцяць. Яшчэ сябрам завецца...

Рэзка павярнуўшыся, Пятрок шпарка пайшоў па тратуары. Толькі гучна разносіўся грукат яго чаравікаў аб асфальт.

«Эх і навошта хлопца пакрыўдзіў! — папракнуў сябе Асташонак.— Вось чаму яго ніколі вечарамі не відаць было. Працаваў...»

— Пеця, стой!..

Змітрок памкнуўся ўслед, але, ведаючы гарачлівасць таварыша, спыніўся і паволі пайшоў у пад'езд...

## 2

Раніцою ўсё ж выйшаў Змітрок на цэнтральную плошчу, дзе знаходзіліся вітрыны з аб'явамі. «Можна хоць куды-небудзь ды паступіць»,— падмывала спакуслівая думка.

Нейкі стары, што стаяў ля Змітрака, зняў акуляры, выцер іх хусцінкаю і прамовіў:

— Разгубіцца можна, так іх тут многа, аб'яў гэтых. Хто ў наш час мог нават думаць!..

Асташонак хуценька шпырыў вачамі па радках аб'яў. У размову пускацца яму не хацелася.

Стары зноў надзеў акуляры і праз іх паглядзеў на засяроджаны твар Змітрака.

— Што, цяжка выбраць? — спытаў ён усміхаючыся.

— Цяжка...

— Чаму ж? Столькі інстытутаў! — развёў ён рукамі.— А наш дурань два гады назад скончыў дзесяцігодку і падаўся на завод.

— На завод? Два гады назад? — перапытаў між іншым Змітрок, не звяртаючы асаблівай увагі на старога.

— Ведаеш, дружа... Адзіны прадстаўнік і прадаўжальнік нашага старэйшага роду, мой шаноўнейшы ўнук Іван Азарчук-малодшы здрадзіў свайму дзеду! — не адступаў гаварлівы стары.— Мы ўсе хацелі, каб ён стаў пастаўнікам. Не памагло! «Завод!» — крычыць, і канец. Пытаюся — ці ж гэта не глупства?

— Глупства,— механічна адказаў Асташонак.

Стары завохкаў:

— А-ей... Вось бачыш, і твая думка такая... Гэта думка ўсіх разумных людзей, акрамя пары гарачых галоў, якія гоняцца за модай...

Стары змоўк, дастаў з кішэні хусцінку, выцер пот, што выступіў на яго твары, і, пераканаўшыся, што з маладым чалавекам надта не разгаворышся, сабраўся ісці.

— У кожнага чалавека ёсць свая турбота,— сказаў ён на развітанне.— Прабач, малады чалавек, перашкодзіў. Выбірай, выбірай, дарагі мой...

Твар Змітрака стаў яшчэ больш хмуры і задумлівы. Ён горка ўсміхнуўся і падумаў: «Выбірай, выбірай... А што мне тут выбраць, калі мне трэба знайсці шлях у жыццё. Дзе ён ляжыць, той шлях? Раней, калі жылі бацькі, я гэта ясна ведаў — шлях у жыццё ляжыць праз вышэйшую адукацыю. А цяпер?..»

Увесь у роздумах, паволі ідучы па тратуары, Змітрок не прыкмеціў, як апынуўся каля кінатэатра. І там, у летнім фае, за невялічкім кусцікам бэзу, ён убачыў Іну Коўшык! Яна стаяла каля клумбы, плячыма да вуліцы, а побач у капронавым капелюшы і белым спартыўным касцюме гутарыў з ёй высокі бландзін з доўгім дзюбатым носам.

Змітрок адступіў у цень ля газетнага кіёска.

— Ты не павінен ехаць адгэтуль, Артур! — горача гаварыла дзяўчына, трымаючы хлопца за руку.— Пакінуць горад, нават не скончыўшы вучобы ў інстытуце? Гэта вар'яцтва!

Той, каго Іна назвала Артурам, перасмыкнуў плячыма.

— Дзівачка! У мяне ж разрад... Бяруць трэнерам на курорт. Не абы-куды — на ку-рорт! І думаеш — так сабе бяруць? — Тут ён нахіліўся і штосьці шапнуў дзяўчыне на вуха.

Іна засмяялася і далікатна ўдарыла Артура па твару. Ён злавіў яе руку і прыклаў да сваіх вуснаў...

Іна рэзка выхапіла руку.

— Ведаю, чаго ты едзеш туды!

— Працаваць...

— Уцякаеш! Грош цана твайму каханню і ўсім абяцанкам...

— Як толькі ўладкуюся, адразу забяру цябе. Мы будзем разам, толькі крышку пачакай...

— Мне ўжо надакучыла чакаць, ведай гэта...

— Тым горш для цябе...

«Значыць, гэта той фізкультурнік, што праводзіў яе са школы яшчэ летась... А гаварыла — сваяк!» — падумаў Асташонак, яшчэ крыху пастаяў і пайшоў па тратуары далей.

«І каго я слухаю? Гэтую здрадніцу, што аднолькава ўсміхаецца кожнаму? Трэба мець сваю галаву, свой розум, а яе... вырваць з сэрца!»

Ён нават пасмяяўся ў душы са сваіх думак. Душэўны смех перамешваўся са слязьмі. Грудзі напоўніліся крыўдай на жыццё, на людзей, на тое далёкае, няўлоўнае шчасце, якога так цяпер не стае яму, асірацеламу заўчасна, разгубленаму юнаку. Ён параўноўваў сябе з птушанём, якое неасцярожным рухам вывалілася з гнязда і не ведае, куды падацца, дзе знайсці заспакаенне ад нахлынуўшага жаху...

Каля свайго дому Асташонак прыцішыў крок.

— А нам пошта грошы прынесла... А нам пошта грошы прынесла,— пачуў ён голас меншага брата.

— Добра, добра, Алік... Ідзі гуляй з дзецьмі. Ты ж у садзе. Дысцыпліна, брат, павінна ўсюды быць!

— Я невінаваты, што дзіцячы сад зрабілі ў нашым доме,— спахмурнеўшы, апраўдваўся той.

— Невінаваты,— усміхнуўся Змітрок.

— А ведаеш, колькі нам грошай прынеслі? — зноў ажывіўся Алік.

Змітрок паклаў руку на яго кучаравую галоўку. Алік увесь удаўся ў матку: вочы ласкавыя, карыя, валасы цёмныя і кучаравыя...

— Ну, колькі ж?

— Пяць рублёў — во! І Ленін на кожным...

— Значыць, пяцьсот...

— Уй-ю-юй!

— Што, многа?

— Віця сёння нос разбіў...

— Ідзі гуляй, чарцянё ты маленькае,— усміхнуўся старэйшы брат.

Алік пабег у праторны двор, абсаджаны маладымі дрэўцамі. Там гулялі такія ж, як і ён, віхрастыя дзеці.

Змітрок узышоў на другі паверх, адчыніў дзверы. Пяцьсот рублёў пенсіі, якія ён атрымліваў штомесячна, ляжалі на стале пад кнігай. Гэта суседка, жонка Забаўскага, паклала іх так, на віду. Яна амаль заўсёды атрымлівала за Змітрака грошы.

Асташонак узяў у руку пяць сторублёвых паперак, нібы ўзважыў іх. «Яшчэ плюс зарплата...» — падумаў ён, апускаючыся на крэсла. Але адразу перад ім узнік вобраз Іны, яе абяцанне прыйсці сёння да кінатэатра ў дзевяць гадзін вечара, абяцанне другому, не яму...

«Пайду на завод — і ўсё! На злосць ёй...— падумаў Змітрок.— Ці толькі ёй на злосць? А сабе хіба не на карысць? А Гані? Яна павінна вучыцца! У яе талент, а ў мяне толькі здольнасці... У першую чаргу трэба падтрымліваць талент... Ніякая праца, нават самая чорная, не ганьбіць чалавека. Пайду!»

І Змітрок ужо ніяк не мог дачакацца, калі прыйдзе з работы сусед, дзядзька Антось. А калі той нарэшце з'явіўся, адразу пайшоў да яго.

Стары сядзеў на канапе, што стаяла ля сцяны. На маленькім круглым століку перад ім быў пастаўлен чайны прыбор, на сподачку ляжаў цукар і пячэнне.

— А-а, заходзь, заходзь, сусед... Сядай вось, пагасуемся, пагутарым,— сустрэў Змітрака стары, уважліва сочачы за ім сваімі дабрадушнымі блакітнымі вачамі.

— Я ненадоўга...— Асташонак спыніўся сярод пакоя, не ведаючы, што рабіць далей. Але адступаць ужо было позна. Узяў крэсла і сеў да стала.

— Дзе ходзіш, што бачыш? — нібы між іншым спытаў Забаўскі.

— Ды так... Сёння адзін стары расказваў мне пра свайго ўнука, якога хацелі зрабіць пастаўнікам, як ён пайшоў на завод... Дзівак такі гэты стары. Не зразумееш, задаволены ён ці пакрыўджаны на свайго ўнука. Толькі любіць яго надта моцна.

— Той стары быў у акулярах? — спытаў Забаўскі, некалькі разоў глынуўшы са шклянкі.— Ды вазьмі ты вунь на буфеце шклянку, дзікуп!

Змітрок узяў шклянку і наліў з чайніка трохі чаю.

— Адкуль вы ведаеце, дзядзька Антось?

— Ведаю... Яго ўнук працуе ў нас на заводзе. Дык,

кажаш, не зразумець? Ён, брат, гапарыцца ім. Ого!.. Бяры пячэнне, не бойся, хопіць па дваіх.

— Дзякуй, не хачу...

— Дык што парашыў? — нарэшце проста спытаў стары.

Асташонак не хацеў адказваць яму на гэтае пытанне. Лепш самому пачуць добрую, бацькоўскую параду. І таму ён абыякава прамовіў:

— Вымушаны пакінуць думку пра вучобу... Хоць ведаю, што раблю глупства. Дурань... Стаць рабочым ніколі не позна.

Забаўскі рэзка ўстаў з месца. Яго твар пацямнеў ад злосці. Не пазіраючы па Змітрака, ён сказаў:

— Хадзем! — і выйшаў на балкон.

Змітрок у недаўменні пайшоў следам. «Чым гэта я ўгнявіў старога?» — падумаў ён.

З балкона віднеліся стройныя карпусы завода, вялізны парк.

— Глядзі туды! — Дзядзька Антось тыцнуў перад сабою пальцам. Змітрок паглядзеў.

— Ну, завод, парк...

— Колькі чалавек цяпер там працуе? Як ты думаеш?

— Напэўна, тысяч дваццаць,— адказаў хлопец, усё яшчэ не разумеючы сэнсу пытання.

— Памнож цяпер на тры змены. Колькі будзе?

— Шэсцьдзесят тысяч.

— У нашай краіне многія-многія сотні такіх заводаў, як наш... Колькі будзе, калі мы шэсцьдзесят тысяч памножым на тыя сотні?

— Многа! — усміхнуўся Асташонак.

— Значыць, па-твойму, выходзіць, што ў нашай краіне столькі дурняў? — раззлаваўся стары яшчэ больш.— І дурні яны таму, што сталі рабочымі. Тут нас двое. Адзін з іх дурань...

— Я не хацеў гэтага сказаць,— разгублена прамовіў Змітрок, зразумеўшы нарэшце прычыну злосці старога.

— Не хацеў, а так атрымалася,— адказаў Забаўскі.— Цяпер хадзем дапіваць чай.

Змітрок вінавата апусціў галаву.

— Скажыце,— ціха пачаў ён, калі яны зноў вярнуліся ў пакой і ўзяліся за свае шклянкі,— ці хутка можна стаць добрым рабочым?

— Гледзячы, што за чалавек,— звычайна сказаў сусед.

— Ну, калі ён скончыў дзесяцігодку.

— Гледзячы, які чалавек скончыў дзесяцігодку...— быў адказ.

— Я зразумеў: не ўсякі чалавек, нават і з сярэдняй адукацыяй, можа стаць добрым рабочым. Няўжо так можа быць? Не верыцца...

— Уяві, дарагі мой, можа...

— Толькі не са мною!

Стары ўсміхнуўся, устаў, паставіў шклянку на стол і моцна паціснуў Асташонку руку. Ён быў куды ніжэйшы за Змітрака, амаль увесь сівы, але якая яшчэ сіла адчувалася ў той старэчай руцэ!

— Значыць, вырашыў?

— Вырашыў. Пайду на завод! Дакументы я падрыхтаваў...

3

«Іна... Іна...»

Чаму ён так часта думае аб ёй? І чым больш турбот, чым цяжэй работа,— тым яскравейшыя робяцца ўспаміны...

Круглы, амаль дзіцячы тварык, вялікія васільковыя вочы. Харошыя вочы... Ці могуць яны хлусіць? Колькі ўжо год ведае Змітрок Іну, а не памятае выпадку, каб яна ашукала, не стрымала слова. Хто ж ён, той Артур, якому яна ўсміхалася сваімі добрымі, даверлівымі вачамі і абяцала прыйсці ўвечары да кінатэатра? Навошта ён яе сёння так выпадкова ўбачыў? Не было б гэтых цяжкіх успамінаў. Значыць, Артур сустракаўся з Інай і два гады назад? Значыць, яе вочы хлусілі?..

Змітрок паглядзеў на гадзіннік. Было роўна сем. Ён цвёрда вырашыў «пагаварыць» з Інай шчыра, раз і назаўсёды. Можа, нават пасварыцца, абразіць яе, пакрыўдзіць...

Ён ішоў да яе з трапяткім сэрцам. І ледзь толькі апынуўся за знаёмай брамкай, як з беленькага аднапавярховага доміка, што захаваўся між дрэў саду, выйшла Іна.

Яна была ў новым квяцістым халаце, які прыгожа аблягаў стан дзяўчыны, бадзёрая, расчырванелая. Доўгія русыя валасы хвалямі клаліся на плечы. «Якая прыгажосць! — імгненна падумалася Змітраку.— Я не здолею, не змагу з ёю сварыцца, абражаць яе...»

— О! — усклікнула Іна, збегшы па драўляных сходках на дарожку, абапал якой густа раслі рамонкі і яшчэ нейкія ружовыя кветкі.

Сэрца ў Змітрака нібы абарвалася, калі ён пачуў яе голас. Ён абапёрся плячыма на зачыненую брамку і, як ад вялікай зморанасці, заплюшчыў вочы, перавёў дух. Злосць адразу знікла, нібы яе зусім не было. «Усё ж прыгожая яна, харошая»,— гледзячы на дзяўчыну, якая паволі падыходзіла да яго, думаў Змітрок.

— Ну, чаго стаіш? — здзіўлена прамовіла Іна, спыніўшыся на палавіне дарогі.

— Ды я... Ішоў тут блізка. Дай, думаю, зайду,— нібы апраўдваўся ён.

— І добра зрабіў! Дзе ты прападаеш наогул? Мы зусім згубілі адно аднаго. Я так сумавала, так сумавала... Ну, што ты, куды думаеш паступаць? Ды сядай хутчэй вось тут, расказвай. Я паміраю ад нецярпення хутчэй усё ведаць,— як звычайна, скорагаворкай сыпанула Коўшык.

Яны селі ў ценю веранды, абсаджанай дзікім вінаградам, усміхнуліся адно аднаму...

Асташонак ведае гэты асабняк даўно, быў тут сваім чалавекам, але толькі цяпер чамусьці адчуў сябе чужым. І цяжкія шторы на дзвярах, і кожны год новая расфарбоўка фасада, і заасфальтаваныя дарожкі ў садзе — усё гаварыла аб тым, што гаспадары мелі ў кішэні лішні рубель. Не тое што ён — полы дзярэ, а плечы латае. І ранейшы настрой, тыя думкі, з якімі ён збіраўся сюды, паступова вярнуліся да яго. Змітрок, што называецца, спусціўся на зямлю...

— А я нічым асаблівым і не пахвалюся,— пачаў ён, па звычцы страсянуўшы галавою, каб адкінуць валасы, што спаўзлі на вушы.— Я... працаваць іду. На завод!

«Вось няхай праглыне гэтую пілюлю!» — задаволена падумаў ён,назіраючы за тварам дзяўчыны.

Іна прыклала ружовую пухлую руку да яго лба.

— Тэмпература, здаецца, нармальная, а гаворыць глупства... Ты ж быў самы здольны сярод нас!

— Ну і што з таго? Здольны, а не таленавіты...

— Як — што? Пеця стане журналістам. Ігар — доктарам, Раман — хімікам, а ты — рабочым. Гэта, паўтараю, недаравальна!

Калі Іна скончыла, Змітрок шчыра глянуў ёй у вочы.

— Я стану рабочым, адным з мільёнаў! — у роздуме сказаў ён. Халодны агеньчык успыхнуў і згас у яго пры-

жмураных вачах.— Кіпь, Іна, па-дзіцячаму разважаць... Пеця, Ігар... Мне трэба выхоўваць дзяцей, жыць...

— Дзяцей выхоўваць, а самому гібець, трапіць у балота, хадзіць брудным,— скрывіла яна свае вусны.

— Бруд, калі ён зверху, адмываецца, а вось калі душа чорная, яе ніколі не адмыеш! Так гаварыў мне яшчэ бацька...

— Справа твая...— паціснула плячыма Іна і паглядзела кудысьці па вуліцу.— І наогул... Як ты змяніўся! Памятаеш, мы марылі...

— А вось ты не змянілася,— перапыніў яе Змітрок і асцярожна дакрануўся да Інінай прычоскі.— І валасы тыя ж, і вочы...

— Валасы, дарэчы, сёння апошні дзень дажываюць...— яна ўсміхнулася і, накруціўшы на руку ладны касмылёк, дадала: — Як гэта бацька гаворыць? Ага... Кансерватары ў любым іх праяўленні — шкоднікі грамадства.

Іна звычна засмяялася.

— Значыць, будзе прычоска «пасля тыфу» ці «хлапчук без маці»? Гэткае памяло? — Змітрок ускалмаціў свае валасы.

Яна кальнула яго позіркам.

— Чаму ў цябе сёння такі злы язычок? Ты прыйшоў, каб пасварыцца?

— Я прыйшоў запрасіць цябе ў кіно. На дзевяць вечара,— зусім неспадзявана прамовіў Асташонак і дапытліва паглядзеў на дзяўчыну. Яна адразу сумелася, але хутка авалодала сабою і грэбліва паглядзела на яго вопратку: клятчастую кашулю з закасанымі рукавамі і цёмна-сінія выцертыя штаны. Змітрок спакойна вытрымаў гэты позірк, скрывіў вусны і сказаў:

— Не падыходжу? Нічога, дарагая, атрымаю зарплату, куплю што-небудзь лепшае. Я ж цяпер гаспадар у хаце...

— Калісьці ты да нечага імкнуўся,— мяняючы тэму размовы, адказала Іна.

— Што ты хочаш гэтым сказаць?

— Ты і без сярэдняй адукацыі мог стаць звычайным рабочым...

— А я не звычайны рабочы,— непрыязна адказаў Асташонак.

— Інжынер?

— Так, інжынер! Галоўны інжынер вялізнага завода,— ледзь стрымліваючыся, каб не абразіць яе, адказаў Змітрок.— Пашана, уласная машына, сям'я...

Іна крыва ўсміхнулася: гэта былі яе словы.

— У кіно сёння я не пайду,— сказала яна і ўстала.— Мы з мамай едзем да знаёмых.

— Ах, прабач! Ужо восем гадзін, а табе трэба ў дзевяць быць у знаёмага...

Цяпер Іна зусім не бянтэжылася. Яна проста глядзела на Змітрака цікаўна, з усмешкай на твары. А ён глянуў у яе добрыя васільковыя вочы і падумаў: «Калі яны і маняць — усё адно прыгожыя».

— Што ж, да лепшай сустрэчы, Іна,— прамовіў Змітрок, і голас яго сарваўся: усё-такі ён кахаў яе, гэтую дзяўчыну.

— Будзь здароў... Ты яшчэ падумай. Хоць работу выберы не абы-якую,— праводзячы Змітрака на вуліцу, павучальна сказала Коўшык...

А на другі дзень, калі Змітрок вярнуўся з магазіна, ён убачыў дома незнаёмага чубатага хлопца ў шэрым замасленым камбінезоне, з выгляду гадоў на дваццаць пяць, прыгожага...

«Ад дзядзькі Антося!» — здагадаўся Змітрок і прывітаўся. Але хлопец не адказаў на прывітанне. Ён сядзеў ля стала і ўважліва чытаў газету. У яго былі надзвычай густыя чорныя бровы, якія амаль сыходзіліся на пераносіцы.

— Добры дзень! — ужо гучней сказаў Змітрок.— Маё прозвішча Асташонак. Вы да мяне?

— Кручанюк! — коратка прывітаўся хлопец і зноў апусціў галаву, нібы да Змітрака яму і не было справы.

Асташонак ужо чуў пра Кручанюка ад суседа. Ён ведаў, што пасля дэмабілізацыі з арміі Анатоль Кручанюк пачаў працаваць на заводзе токарам і цяпер ужо слыў вядомым рацыяналізатарам.

— Ну, брат, зайшоў па цябе — лічы сябе шчаслівым! — Кручанюк нарэшце склаў газету і, устаўшы з крэсла, абедзвюма пацiснуў Асташонку руку.— Будзеш працаваць у нашым цэху. Гэта, брат, вялікі гонар!

Змітрок паглядзеў на яго замасленую спяцоўку, на чорныя ад металічнага пылу рукі і абыякава адказаў:

— Была б шыя — хамут знойдзецца...

Адкуль мог ведаць Кручанюк, што ў хлопца на душы!

— Ды ты што? У наш цэх не кожнага так, адразу... Падзякуй Антону Пятровічу...

— А мне ўсё роўна куды. Хадзем...

Анатоль паківаў галавою:

— Ну і работнічак будзе Івану. Адна радасць, дый годзе!

Калі падышлі да прахадной, заўважылі Забаўскага. Ён прыемна ўсміхаўся, бліскаў вачамі праз залатыя акуляры і махаў пропускам. Відаць было, што майстар ганарыўся сваім новым вучнем...

— Зноў куранё сустракаеш? — спытаў непаваротлівы вахцёр, такі ж вусаты, як і Забаўскі. Толькі вусы ў яго былі рудыя ад махоркі, якой дыміў цэлы дзень.

— Рыхтуем, так сказаць, новае пакаленне рабочага класа! — адказаў майстар.

Пры сустрэчы з дзядзькам Антосем Асташонак павесялеў: усё ж свой чалавек клапоціцца аб ім! Змітраку хацелася сказаць што-небудзь вельмі разумнае, але слоў не было.

На двары завода хораша!

Глядзіць Змітрок уздоўж шырокай вуліцы, што пралягла між доўгіх карпусоў, і дзівіцца: якая наўкол чысціня! Кожны корпус, захаваны ў гушчары хвой ды бяроз, ледзь віднеўся вялізнымі вокнамі. Усюды дрэвы, клумбы з кветкамі, дарожкі, абапал якіх доўгімі шарэнгамі стаялі зашкленыя стэнды. Уражанне было такое, быццам Змітрок трапіў не на завод, а на двор якога санаторыя...

А вунь, у сапраўдным бэзавым садзе, невысокі будынак з прыгожым фасадам. Туды вядуць заасфальтаваныя дарожкі.

«Гэта — клуб»,— здагадваецца Асташонак, і душа яго напаўняецца гордасцю за тых людзей, якія клапоцяцца, каб завод іх быў такі прыгожы...

Забаўскі ішоў наперадзе і маўчаў. Раптам ён спыніўся і паказаў на вялізны цэх злева:

— Ты будзеш там працаваць.

Змітрок паглядзеў на Анатоля і запытаўся:

— Пойдзем?

— Рад бы, ды не магу,— адказаў той, развёўшы рукі.— Я — да дырэктара. З мяне тут такога героя зрабілі, хоць уцякай. У цэх зайсці няма калі...

Калі Кручанюк пайшоў, стары растлумачыў:

— Ён у нас першы рацыяналізатар. А дырэктар, трэба сказаць, падтрымлівае кожнага, у каго галава што-небудзь тумкае... Эх, не сапсаваў бы ён Толю! Хлопец, праўда,

сціплы, але хто ведае, які яшчэ злы дух не разбуджаны ў ім!..

Спярша яны прайшлі цэх рэзальных машын. І Змітрок з непрывычкі аж закрыў вушы далонямі, жахаўся на кожным кроку.

Потым пабывалі ў кавальска-прэсавым, у зборачным. І ўсюды ў вочы кідаліся механізмы. Людзі імі толькі кіравалі. Упершыню Асташонак падумаў, што ён тут, як малое дзіця, якое толькі дзівіцца на новыя цацкі і нічога ў іх не разумее.

Да гэтага часу ён сур'ёзна не задумваўся над сваёй новай прафесіяй рабочага, лічыў, што калі ёсць сіла ў руках, дык і працаваць здолее, а цяпер пачаў пераконвацца, што да працы ён зусім не падрыхтаваны. Аказалася на практыцы, што, акрамя сілы, рабочаму чалавеку трэба мець і адпаведную адукацыю, навык у рабоце...

«Вось табе і дзесяцігодка... і атэстат сталасці. А што я магу, што?»

І было крыўдна на некага, што ён да гэтага часу лічыў сябе ледзь не вучоным, а зайшоў у сапраўдны цэх і глядзіць на ўсё як баран на новыя вароты...

— Дзядзька Антось!

— Што?

Змітрок паказаў на адчыненыя дзверы, і мужчыны адзін за другім выйшлі на двор.

— Не падабаецца наш завод? — хітра жмурачы вочы, спытаў стары.

— Я другое скажу, дзядзька Антось.— Асташонак азірнуўся на карпусы.— Які я маленькі тут... Ніколі я не быў такім маленькім! За дзесяць год мяне навучылі любіць Радзіму, як маці, ведаць і адчуваць яе пульс, а не навучылі знайсці сваю справу, каб я стаў карысным для яе, як сапраўдны сын! А ці адзін я такі? — з запалам гаварыў Асташонак.— Іна сказала неяк раз: Пятрок будзе журналістам, Ігар — доктарам. Людзі ідуць абы-куды! А потым толькі чуеш, як абвінавачваюць тых настаўнікаў, што не любяць дзяцей, дактароў, што абыякава адносяцца да хворых...

— Ну, вось... Патроху пачынаеш разумець. Толькі пачынаеш! — падкрэсліў Забаўскі.— Значыць, сваю справу знойдзеш.— Ён рэзка павярнуўся і дадаў: — А цяпер пойдзем пазнаёмлю цябе з рабочым месцам, з майстрам. Знойдзецца і сляпой курыцы зярнятка!..

Мірна гутарачы, яны вярнуліся ў такарны цэх.

Гэта вялізная светлая зала, з чыстай зацэментаванай падлогаю, дзе, нібы спаборнічаючы між сабою, гулі станкі, шарэнгамі выстраеныя па ўсёй даўжыні цэха. Як і ўсюды, людзей нямнога.

Ля станка, куды прывёў Асташонка стары майстар, завіхаўся цёмна-русы хлопец. Ён так быў заняты працай, што, здавалася, нічога не заўважаў вакол — рухі разлічаныя, дакладныя, увішныя. Змітрок зірнуў хлопцу ў твар, і яму здалося, што недзе яны ўжо сустракаліся. Ля вока, як пятак, радзімая пляма...

— Здароў, Ваня! — прывітаўся з ім за руку стары.— Гасцей прымеш?

Іван дапытліва зірнуў на Змітрака, спытаў:

— Гэта той самы?

— Той! Змітрок, знаёмся — твой майстар... Азарчук.

— Значыць, Дзмітры! Ну, што ж, будзем знаёмыя! — і хлопцы моцна паціснулі адзін аднаму рукі.

— Зрабі, Ваня, з яго такога чалавека, каб нам з табою не было сорамна! — зазначыў Забаўскі і, смеючыся, дадаў: — Словам, скуру табе, косці — мне...

— Гэта будзе залежаць не толькі ад мяне,— развёў той рукамі.

— Мой сусед... Хлопец што трэба, не падвядзе,— запэўніў Забаўскі і звярнуўся да Змітрака: — Чакай ля варот, разам дадому пойдзем!

І ён пакінуў іх удвух.

«Іван Азарчук... Ды гэта ж... гэта ж унук таго дзеда, што быў тады ля вітрын!» — успомніў нарэшце Змітрок і больш уважліва паглядзеў на свайго новага настаўніка.

Іван замацаваў чарговую дэталь у патрон і ўключыў матор.

Хвілін пяць Змітрок глядзеў на яго работу, а потым спахапіўся:

— Што я павінен рабіць?

— Збяры стружку і пакладзі вунь у тую скрынку...

— А яшчэ што?

— Пакуль хопіць і гэтага,— спакойна адказаў Іван, схіляючыся над станком.

«Вось ён — завод!.. Я тут, сапраўды, магу толькі стружку збіраць»,— падумаў Асташонак, але недзе ўнутры ўжо загараўся агеньчык веры ў свае сілы.

4

Надышоў першы выхадны дзень, і Змітрок з самай раніцы пабег на лодачную станцыю гарадскога парку, каб пазагараць на вадзе.

Сонца не шкадавала цяпла. Лёгкі ветрык ледзь варушыў лісце на старых ліпах. На душы ў Змітрака было радасна. Справы яго наладжваліся, жыццё паступова станавілася прыгажэйшым, чым думаў аб ім яшчэ нядаўна Асташонак.

Алік цяпер круглыя суткі знаходзіўся ў дзіцячым садзе. Ганя не пакідала заняткі па музыцы. Яе ўжо добра слухалася скрыпка, і гэта бадзёрыла дзяўчынку.

Калі Асташонак падышоў да білетнай касы, то заўважыў Арцёма Белага, сакратара камсамольскай арганізацыі завода, і Анатоля Кручанюка. Чорныя як смоль валасы і буры ад загару твар, высокі рост і магутныя плечы Арцёма вылучалі яго сярод астатніх у людскім патоку. Анатоль яму штосьці гаварыў. Ён быў у светлым касцюме, чыста паголены, свежы. І не скажаш, што ён працуе токарам.

Змітрок нясмела падышоў да іх, усё яшчэ адчуваючы сябе «чужым».

— Кажу — бяры мой білет, і ўсё! — пачуў ён голас Арцёма.

— А-а, Змітрок, здарова... Хадзі сюды, паглядзі, як наш камсамольскі сакратар новага героя знайшоў! — звярнуўся Анатоль да Асташонка, як да старога знаёмага.— Свой білет на лодку аддае...

— Аддаю! Гонар нашага завода без лодкі? Не дазволю! Вось, бяры — і каб тваёй нагі на беразе не было! Хутка дзяўчаты падыдуць, а ты ж іх з першага позірку чаруеш, хай цябе...— нават пачырванеў Арцём, так сур'ёзна ён угаворваў Кручанюка. А потым ціха дадаў: — Дружочак, бяры... Мне ж усё роўна на якой лаўцы сядзець, я ж весляваць не ўмею. Выручы, братка...

Воддаль ад білетнай касы, цярэбячы ў руках букецік васількоў, Арцёма чакала дзяўчына.

— Калі білетаў у касе няма — бяры! — параіў Анатолю Змітрок.— Паедзем разам...

— Чэрці, угаварылі! — пацісвуў плячыма Анатоль.— Што ж, паедзем... З дзяўчатамі яно, канешне, было б весялей, але... Не нашым носам малівы клявацъ!

Шчырасць і прастата Анатоля спадабаліся Змітраку.

Ён засмяяўся і хацеў ужо ісці за таварышам, як убачыў, што да касы падыходзіла Іна Коўшык. Яна была ў той белай сукенцы, якую падзявала на выпускны вечар, але ўжо з хлапечай прычоскай...

Асташонак зморшчыўся і схапіў Кручанюка за руку.

— Адну хвіліначку,— узрадаваны, што выпадае пабыць з Інай разам, сказаў ён.— Здаецца, у нас будзе дзяўчына! Хоць адна на двух...

— Гэта ўжо лепш, чым ніводнай!

Іна ўбачыла Асташонка. Ён быў у сваёй клятчастай кашулі, але ў новых светлых штанах. Цень незадаволенасці лёг на яе круглы тварык. Відаць было, як міжволі, на якое імгненне, яна завагалася, а потым глянула на Анатоля і рашуча падышла, усміхаючыся ім абодвум.

— Прывітанне рабочаму класу! — весела, па-сяброўску, прамовіла Іна і адразу напала на Асташонка: — Ты ўсё ж пягоднік! Зноў не прыходзіш. Я чула — ты ўжо на заводзе...

— Вось таму і не было часу, Іна,— апраўдваўся Змітрок і, кіўнуўшы галавою на Анатоля, дадаў: — Пазнаёмся вось з маім таварышам...

Увесь час Кручанюк не спускаў з дзяўчыны здзіўленага і радаснага позірку.

— О-оў! Адразу і не скажаш, што вы з завода,— дапытліва глянуўшы на Кручанюка з галавы да ног, яна падала руку.— Інэса...

— Толя,— адказаў хлопец і чамусьці зачырванеўся. Але руку Іны ён затрымаў у сваёй крыху даўжэй, чым гэтага вымагала простае знаёмства.

Коўшык ледзь улоўна ўсміхнулася і схавала вочы пад доўгімі, густымі вейкамі. Белы твар ледзь паружавеў.

«Вось так механічна заплюшчваюць вочы дарагія лялькі»,— міжволі падумалася Змітраку.

— Іна, паедзем з намі катацца,— прапанаваў ён дзяўчыне.

Яна зірнула на яго, на Кручанюка і пацiснула плячыма.

— Паехалі! — падтрымаў Змітрака і Анатоль.

— Вам пашанцавала дастаць білеты на лодку? — проста пацікавілася яна.

— Гэта яму, Толю, як лепшаму рацыяналізатару і...

— Змітрок, не трэба,— перапыніў яго Анатоль.— Цэлымі днямі на заводзе толькі гэта і чуеш... Ды яшчэ тут...

— Добра, не буду.

Коўшык згадзілася паехаць разам з хлопцамі з умовай, што праз гадзіну яе высадзяць тут жа. І калі адплылі ад берага, яна, між іншым, пацікавілася:

— Ну, вось скажыце, Анатоль, што вы такое новае прыдумалі там? Калі не сакрэт, безумоўна.

Ён адказаў не адразу. Скінуў пінжак і, застаўшыся ў блакітнай тэнісцы, узяўся за вёслы. Змітрок заслаў лавачку на карме сваёй кашуляй і пасадзіў на яе Іну. А сам перайшоў на нос лодкі, лёг на спіну, падставіўшы сонцу свае шырокія грудзі.

— Гледзячы, што вас цікавіць,— глыбакадумна пачаў Анатоль.— Скажам, разец «зорачка» маёй канструкцыі дае эканомію рабочага часу да дзесяці хвілін у гадзіну. Гэта значыць...

— Адна гадзіна дваццаць хвілін за змену,— хутка падлічыла Іна, бліснуўшы на Кручанюка сваімі вочкамі.

— Яшчэ не ўсё. Разец разлічаны на сілавое рэзанне, значыць, зноў эканомія...

Змітрок глядзеў на раку і думаў: «А чым я магу пахваліцца? Чым? Колькі за дзень стружак сабраў? Ці тым, што добра вычысціў станок?.. Досыць! Я ўжо ўволю наглядзеўся на чужую працу, час брацца і за сваю. Будову станка я ўжо ведаю...»

Узняўшы галаву, ён заўважыў, што Іна і Анатоль глядзелі адно на аднаго і ўсміхаліся. Яму была добра знаёма гэтая ўсмешка Іны! Калісьці пасля такой усмешкі ён страціў спакой...

«І Артуру, і мне, і яму... Аднолькава ўсім, як за грошы! — падумаў Асташонак, адчуваючы, як злосцю напаўняюцца яго грудзі.— Усім... Анатоль тут ні пры чым. Ён хлопец, і няма нічога дзіўнага, што загледзеўся на прыгожы твар. Вінавата яна, толькі яна! Нібы тая кобра, гіпнатычна ўставіла свае вочы на чарговую ахвяру. Добра, дзейнічай, гадзюка! Мяне ты ўжо не ўкусіш...»

Ён зрабіў выгляд, што зусім не цікавіцца Інай і нешта такое заспяваў сабе пад нос. А калі зноў глянуў на яе, то ўбачыў, што Іціны вочы свяціліся шчасцем.

З нейкай радасцю яна ўсклікнула:

— О-оў! А вы ўжо і армію адслужылі...

Змітрака здзіўляла новая прывычка Іны гаварыць гэтае расцягнутае «о-оў». З кожнай хвілінай ён адчуваў, як таямнічая натура Іны паступова раскрываецца перад ім...

Ён успомніў школу. Там, у школе, Іна аддавала перавагу спачатку выдатніку. Потым фізкультурніку Артуру:

спартсмены былі ў модзе... Цяпер — герою, новай модзе... Адным словам, што ўкусіць, тое з'есць... Няхай! Яшчэ прыйдзе час — падавіцца!

А на возеры было цудоўна!

Дзесяткі лодак сноўдалі паўз бераг, і ўсюды — моладзь, усім весела. З парку даляталі гукі духавога аркестра, а над возерам разлягалася чароўная песня:

Ме-сяц на не-э-бе, зо-рань-кі ззя-а-юць,
Па сі-ня-му мо-о-ру чо-вен плы-ве...—

спяваў гучны барытон, і ўжо дружны хор галасоў падхопліваў:

У чоў-не дзяў-чы-ы-на пе-сню спя-ва-а-е,
А ка-зак чу-у-е, сэр-цай-ка мрэ-э!..

— Студэнты... Шчаслівыя,— з зайздрасцю сказала Іна.— А я от нікуды не паступаю. Хоць замуж выходзь!..

Яна засмяялася і пачырванела да вушэй.

«Так,— падтрымаў яе ў думках Змітрок.— Табе дужа хочацца замуж... Хоць сёння. Відаць, дзеля гэтага я і не падыходжу...»

Анатоль прапанаваў:

— Прыходзьце да нас. У нас яшчэ весялей!

— За станок?

— Чаму — за станок? Можна і касірам. Я чуў — патрэбен касір. Можна пагаварыць з дырэктарам...

— О-оў!

Змітрок не вытрымаў.

— «О-оў»,— перадражніў ён.— Іна, не падрабляйся пад англічанку, непрыемна слухаць...

Яна гнеўна зірнула на яго і адразу супакоілася.

— Калі пану непрыемна слухаць, то пан можа дэсантам высадзіцца на бераг,— лагодна сказала Коўшык.— Тым больш што ён не вяслуе, а бясплатным пасажырам...

— Ах, так?! — прыжмурыўся на яе Асташонак.

— Іменна так...

Цяпер вочы яе, здавалася, былі зроблены з лёду.

— У такім выпадку, дайце маю кашулю...

— Калі ласка!

Яна кінула яму скамечаную кашулю, але прамахнулася, і адзежына ўпала ў ваду.

— Ай, як вы неасцярожна,— сказаў Анатоль, вымаючы кашулю вяслом. Відаць было па ўсім, што ён не асуджае Іну, а, наадварот,— задаволены яе ўчынкам.

— Нічога, калі трохі і пабялее, сёння ж свята! — засмяялася дзяўчына.

Асташонак з няпавісцю глянуў на Іну і, стаўшы на нос лодкі, скочыў на бераг. На хаду надзеў майку і, не азіраючыся, шпарка пайшоў у глыб парку...

Анатоль маўчаў. Ён, бадай, нічога не ведаў пра іх ранейшыя адносіны і, вядома, рад быў застацца з дзяўчынай адзін на адзін.

«Ну, вось і ўсё... Усё! — думаў Асташонак.— Вырваў з сэрца... Не заўважаў, што расло там пустазелле...»

На вуліцы, куды выйшаў Змітрок, перад ім спыніўся каштанавы «Масквіч». Адтуль глянулі на яго знаёмыя вочы шафёра. Ды гэта ж Ігар Стук! А побач — Раман, сябры-аднакласнікі.

— Садзіся! — адчыніўшы дзверцы, прапанаваў Стук.

Не раздумваючы, Змітрок сеў на задняе сядзенне, прывітаўся. Хлопцы пераглянуліся.

— Возьмем? — спытаў Ігар.

— Возьмем,— згадзіўся Раман. Ён заўважыў на Асташонку мокрую кашулю і пацікавіўся: — Дзе гэта ты так выкупаўся, што яшчэ не абсох?

— Ты лепш скажы, «пацук», як інстытуцкія справы? — у сваю чаргу спытаў Змітрок.

— Пераслалі дакументы назад! — з нейкім задавальненнем прамовіў таўстаносы, з маленькімі нерухомымі вочкамі, хударлявы Раман, якога ў школе ўсе называлі пацуком.

— Мы з ім не прападзём і так,— хрыплым баском уставіў Ігар, дужы чырванатвары дзяцюк. Асташонку былі добра вядомы яго спакойны, напорысты нораў, сляпая адвага і рашучасць.

«Ігар будзе доктарам, Раман — хімікам,— успомніліся яму словы Іны.— А кіруюць да рэстарана... Хімікі! За якія толькі грошы п'юць?»

Калі машына спынілася, Змітрок выйшаў і падзякаваў Ігару.

— Не так развітваюцца сябры,— сказаў той і скінуў з плячэй пінжак.— Апранай і шагам марш з намі!

— Не ма-гу! — адрэзаў Змітрок.— Я не «пацук» цягацца за табою. Думаеш, яму дужа ахвота?..

— Мужчына! — Ігар моцна пацісиуў Асташонкаву руку.— Калі спатрэбімся, з дзесяці вечара нас тут знойдзеш кожны дзень. Будзь здароў!

— Усяго добрага...

Калі крокі Асташонка заціхлі, Раман плюнуў на зямлю і прамовіў:

— Я так і знаў!.. Змітрака рэстаранам не купіш. Яму патрэбны грошы, каб купіць за іх тую лялльку, што паехала з другім... Няўжо ты не разумееш, Гіра?

— Нічога! Зловім і на чарку! — упэўнена адказаў на гэта Ігар.— Няхай падвучыцца на заводзе. Тады мы запросім яго кваліфікаваным узломшчыкам дачных замкоў...

— Не-е, Гіра! На дачныя аперацыі я не пайду! — замахаў рукамі Раман і падаўся да машыны, але Ігар дужай рукою схапіў яго за каўнер і тузануў да сябе.

— Ты, пацук, будзеш рабіць толькі так, як захачу я! Праз шыбіну ў чужы дом палезеш, ля гасцініцы інтурысцікаў будзеш лавіць, жабраваць — усё, што мне ўздумаецца...

— Кінь, Гіра, жартаваць. Досыць!

Гіра — гэта мянушка Ігара, складзеная з перастаўленых літар яго імя. Стук любіў, калі яго так называлі.

— Жартаваць, кажаш? Колькі дзён, як мы не зарабілі ні рубля? Тыдзень... А на якія «гронікі» ты, пацук, чалавекам жывеш? На пазычаныя... Іх трэба вярнуць. Пайшлі ў наш хол!..

— І навошта толькі я з табою звязаўся, Гіра? Дазнаюцца дома — заб'юць! — завыў Раман, пакорліва ідучы за Ігарам у рэстаран...

## 5

У самым канцы двара, дзе жылі Асташонкі, за маладымі ліпкамі, быў невялічкі басейн. Калі Змітрок увайшоў на двор, ён заўважыў, як убаку, далей ад другіх хлапчукоў, стаяў Алік. Відаць было, што ён пакрыўджаны. Мокрая вопратка прыліпла да яго цела. «І гэты выкупаўся»,— з усмешкаю падумаў Змітрок і ўбачыў Ганю, якая стаяла каля дрэва і сварылася на малога:

— А калі б ты ўтапіўся?

— Ты ўтопішся,— адказаў той, папурыўшыся.

— Ты разумееш, што робіш?

— Ты разумееш...

— Вось няхай прыйдзе Дзімка, паглядзіш!

— Ты паглядзіш...

І так бясконца, пакуль Ганя не ўзяла Аліка за руку.

— Ідзі дадому! — загадала яна.

— Ты ідзі! — пачаў вырывацца Алік.

— Ідзі, кажу...
— Не пайду, кажу!
Тут ён заўважыў брата і хуценька, хаваючыся ад яго, пабег дадому. Змітрок падышоў да сястры.
— Цяжка табе з ім ваявацъ?
— Не... Ён мяне слухаецца.
— Слухаецца? Гэта добра.
Яны зайшлі ў кватэру і доўга шукалі малога, пакуль той сам не вылез з шафы. Змітрок паглядзеў на яго і паківаў галавою:
— Ай-я-яй, Алік! І табе не сорамна?
— Сорамна... Толькі трошачкі,— падумаўшы, шчыра прамовіў ён.
— Чаму трошачкі?
— Ганя ўжо сварылася...
— Калі мяне няма дома, яна для цябе камандзір. Ясна? Ты павінен слухаць яе.
— Не буду слухаць,— калі Ганя выйшла на кухню, настойліва адказаў Алік, спадылба пазіраючы на брата.
Ганя адчыніла дзверы з кухні і зазначыла:
— Калі не будзеш слухаць, Дзімка цябе адлупцуе!
— Ад-луп-цуеш? — спалохана спытаў Алік, дапытліва пазіраючы брату ў твар.
— Біць не буду, але пакрыўджуся.
Хвіліну памаўчаўшы, Алік спытаў:
— А чаму ў Гані няма штаноў і пагонаў?
— Навошта гэта ёй?
— Камандзір без штаноў не бывае...— упэўнена прамовіў Алік і звярнуўся да Гані, якая ставіла на стол талеркі.— Ага!
Змітрок і Ганя засмяяліся.
— Ну, хіба не чарцянё? — правёўшы рукою па кучаравых валасах брата, пяшчотна сказаў Змітрок.
— Садзіцеся за стол,— паклікала нарэшце Ганя.
Змітрок дапамог Аліку пераадзецца і памыцца, потым пасадзіў яго на крэсла побач з сабою.
— Смачна! — прыпяўшыся есці першую страву, сказаў ён.— Малайчына, Ганя, за сённяшні абед стаўлю табе пяць!
Ганя задаволена ўсміхнулася.
Алік толькі паспытаў суп і зморшчыўся.
— Нясмачна,— сказаў ён.— Мамка гатавала лепш... Чаму яе так доўга не вязуць з бальніцы, Дзімка? — і не па-дзіцячаму цяжка ўздыхнуў.

Змітрок і Ганя разам глянулі на сцяну, дзе побач з партрэтам бацькі з нядаўняга часу вісеў і матчын партрэт. Маці была сфатаграфавана з пушыстай хусткай на плячах, як хадзіла яна ўсе астатнія дні свайго жыцця...

У горле Змітрака нешта казытнула. Ён моўчкі перавёў позірк на Ганю, разумеючы, што робіцца на душы сястры.

Ганя зачэрпнула лыжкай, але раздумала, выліла зноў у талерку, паклала лыжку на стол, апусціла галаву, хаваючы вільготныя вочы. Потым шпарка выйшла на кухню, сказаўшы:

— Зусім забылася выключыць плітку...

І там, за дзвярамі, прыпаўшы галавой да акна, дала волю слязам. Яна прыгадала апошнія дні жыцця хворага бацькі. Ён так пакутаваў ад незагоеных ран! Потым да ўсяго гэтага — запаленне лёгкіх, смерць.

Маці памерла раптоўна, неспадзявана... Яшчэ раніцою згатавала снеданне, падала на стол... Але ўжо не снедала сама. Лягла на ложак, і не стала яе...

— Не трэба, Ганя... Ты ж не маленькая,— пачула яна словы брата і схамянулася: ён стаяў побач. Яна і не заўважыла, калі ён зайшоў.

— Цяжка... Не магу без мамы,— праз слёзы сказала Ганя.

— А мне лёгка?

Раптам дзверы адчыніліся. Паказалася кучаравая галава Аліка. Спалохана пазіраючы на брата і сястру, ён сказаў:

— Ганя... Суп смачны,— і паспрабаваў усміхнуцца.— Ідзіце есці! Пра маму я больш ніколі-ніколі не буду...

Змітрок схапіў яго на рукі і моцна прыціснуў да грудзей.

— Ах ты, хітрун малы... Ты яшчэ нічога-нічога не ведаеш,— хутка загаварыў ён.

— А вот ведаю! — запярэчыў Алік.— Хочаш, я табе раскажу казку? Хочаш?..

— Раскажы...

Змітрок ужо не слухаў Аліка. Успомніўся яму сённяшні дзень з усімі нечаканасцямі... Ігар, Раман... Іна, Анатоль — колькі падзей за адзін дзень! «Жыць трэба... Нам трэба жыць... Займацца справай, сапраўднай, карыснай і для сябе, і для людзей...» Хто гаварыў яму гэтыя словы? Хіба не Ганна Аляксандраўна, іхні дырэктар школы?

Мусіць, толькі сёння добра зразумеў Асташонак, што

пайшоў ён на завод не выпадкова, што рашэнне гэтае падрыхтавала само жыццё. Там ён стане чалавекам, там знойдзе сваё прызванне.

Іван Азарчук забег да сваёй цёткі Ганны Аляксандраўны позна ўвечары. Яна працавала. Стол быў завалены кнігамі.

— Ведаю, чаго прыйшоў, Ваня,— не ўзнімаючы галавы, прамовіла жанчына.— Сядзь на канапу, хвіліначку...

Іван сеў якраз насупраць стала і з замілаваннем глядзеў на старую настаўніцу. Што яе прымушае працаваць? Валасы ўжо зусім сівыя, вочы ледзьве бачаць праз акуляры...

Потым ён перавёў позірк на партрэт Макаранкі, што вісеў на сцяне, якраз над сталом.

Нарэшце Ганна Аляксандраўна адклала кнігу і звярнулася да Івана:

— Непаладкі з вучнем?

— Адгадалі! — узрадаваўся Іван.— Я наконт Асташонка...

— Што мінаў, тое і атрымаў,— усміхнулася яна.

— Не, не! — запярэчыў Іван.— Быць майстрам — гэта не значыць быць яшчэ і добрым настаўнікам. Што мне далей рабіць, як паставіцца да яго?

— Што рабіць? — Ганна Аляксандраўна задумення прыжмурылася, стала збіраць раскіданыя на стале кнігі і сшыткі, зняла акуляры: — Чалавечая душа захавана вельмі глыбока. Пакуль яшчэ не распрацаваны агульны рэцэпт...

— Значыць? — спытаў Азарчук.— З чаго пачынаць?

— Вывучыць чалавека з усіх бакоў. Пакуль доктар не вызначыць хваробы, ён не пачынае лячыць.

— Я не разумею! Няўжо мне трэба быць яшчэ і псіхолагам?

— Добры майстар павінен быць і добрым настаўнікам. Як у вас там гэта называецца? Адзін плюс адзін... Вось і вучы чалавека! — усё гэтак жа спакойна, з добрай усмешкай на твары сказала Ганна Аляксандраўна. Голас у яе мілагучны, мяккі, так бы і слухаў яе Іван, слухаў бясконца. Але ж трэба было нешта адказваць...

— Значыць, я дрэнны майстар...

— Яшчэ рана гаварыць... Вось што, Іван... Пастарайся пасябраваць з Дзімкам. Ён вельмі разумны і шчыры хло-

пец, але крыху ганарлівы. Не любіць, калі з яго насміхаюцца, калі яго настаўляюць, а не вучаць. У цябе трохі ёсць у характары фанабэрыі!

— Пасябравацъ? Гэта не падарве майго аўтарытэту?

— Пасябраваць, як роўны з роўным. Вы амаль аднагодкі. Гэта лёгка зрабіць. Не лічы адразу сябе прафесарам, будзь заўсёды простым, шчырым — і цябе ён палюбіць.

Іван, ледзь паружавеўшы, сказаў:

— Калі ён... хавае галаву, як чарапаха.

— Значыць, не давярае. Трэба зрабіць так, каб давяраў.

— А як? Як?

— Ты гаварыў, што Асташонак спяшаецца стаць майстрам. Я-то ведаю яго! Напорысты! Дык вось... Трэба даць яму самастойнасць. Убачыш — чарапаха адразу высуне галаву з панцыра!

— Што ж, паспрабую,— пасля невялікага роздуму сказаў Азарчук і ўстаў. Пажадаўшы Ганне Аляксандраўне ўсяго добрага, ён паволі выйшаў з кабінета...

На вуліцы Іван успомніў, што дамаўляўся з Анатолем пайсці ў кіно, і, спрытна абмінуўшы пешаходаў, ускочыў на падножку тралейбуса.

Аднак яму не пашанцавала: калі ён падняўся на другі паверх дома, дзе жыў Анатоль, на званок выйшла яго маці, даволі поўная, маладая з твару жанчына ў стракатым хатнім халаце, з кароткай завіўкай на галаве. Жанчына непрыемна зморшчыла свой кірпаты нос і грубаватым голасам спытала:

— Вам Толю?

— Ага...

— У яго, як бы гэта... госця! — нарэшце знайшла яна патрэбнае слова.

— Мы дамаўляліся...— пачаў быў разгублены Іван, але жанчына замахала рукамі.

— Ведаю, ведаю — у кіно! Ён, як бы гэта... відаць, не пойдзе. Не турбуйце яго, калі ласка.

Праз расчыненыя дзверы Іван заўважыў, як з-за ружовай запавескі, што разгароджвала пакоі, на момант паказалася галава Анатоля і адразу знікла. «Убачыў і хаваецца»,— здагадаўся Азарчук і, рэзка павярнуўшыся, пабег па сходках уніз.

«Вось дык сябра! Нават на парог не пусціў. І з-за каго? З-за нейкай бабы... Як «зорачку» разам рабілі, дык у лю-

бы час мог прыходзіць, хоць ноччу»,— з крыўдай думаў ён, шпарка крочачы на тралейбусны прыпынак.

Азарчук і не здагадваўся, што ў гэты самы момант на кватэры Анатоля ішла дзелавая размова пра тое, дзе лепш згуляць вяселле: у асабняку Іны Коўшык ці тут, на другім паверсе...

6

І шанцуе ж яму, Кручанюку!

Ледзь толькі разец «зорачка» быў прызнаны на тэхсавеце завода, як адразу дырэктар узнагародзіў Анатоля шчодрай грашовай прэміяй. Апрача таго, ён ва ўсе інстанцыі напісаў безліч паперак. І праз тыя паперкі Анатоль стаў сапраўдным героем.

Аднойчы Кручанюка выклікаў «сам» — Валянцін Паўлавіч Грыб. Важны, поўны, з невялікімі залысінамі і маладым, чыста паголеным тварам, ён сядзеў за сталом і ледзь спраўляўся адказваць на тэлефонныя званкі, калі, нясмела пастукаўшы ў дзверы, на парозе з'явіўся Анатоль.

Заўважыўшы яго сарамлівасць, дырэктар пакінуў сваё лёгкае плеценае крэсла і, нарыпваючы ботамі, цяжкаю хадою наблізіўся да Кручанюка. Хвіліну ён разглядаў яго, а потым, зусім нечакана, ляпнуў па плячы і сказаў:

— Дык вось які ты! Эх, і нясмелы ж, брат...

— Ды я... ды вы не зважайце.

— Ды я, ды вы, ды мы з табою цяпер вунь як загрымім! — перадражніў яго дырэктар, папраўляючы шырокі рэмень на шарсцяной гімнасцёрцы з адкладзеным каўняром і дзвюма адвіслымі кішэнямі на грудзях. З гэткага ж цёмна-сіняга матэрыялу былі ў яго і штаны-галіфэ...— Выплывем на прастор! Сябе пакажам, другіх павучым. Саромецца — ты ж не дзеўка! Загрымім, брат, няхай не тыцкаюць на нас, што не працуем з кадрамі! Мы сваіх герояў не толькі ў вітрыну! Мы іх на волю, так сказаць, у людзі...

Анатоль усміхнуўся і перасмыкнуў плячыма.

— Ды што вы, Валянцін Паўлавіч... Які я герой? Мне б ужо і да станка пара, а то ўжо колькі дзён...

— Што за размовы? Садзіся! — звёў густыя чорныя бровы дырэктар.— Ты ведаеш, што твая ўзнагарода — гонар для ўсіх нас!

— Дзякуй... За прэмію дзякуй,— спахапіўся Анатоль.— Я за іх куплю сабе баян... Музыкант жа ўсё-такі.

Дырэктар разваліўся ў крэсле і галасна рассмяяўся.

— Музыкант!.. Дык мы табе баян ад імя заўкома, так сказаць, падкінем... А прэмія спатрэбіцца на іншыя мерапрыемствы! Герой жа!

Анатоль не ведаў, куды яму дзявацца ад гэтай сваёй славы.

«Навошта такі шум? Яшчэ, чаго добрага, усе дасягненні прыпішуць мне аднаму... А што пасля?» — з трывогай думаў ён. Але трывога хутка прайшла, бо дырэктар быў у добрым настроі і паведаміў, што яны сёння едуць на суседні завод дзяліцца вопытам, а потым — у міністэрства...

— А цяпер — дадому! — падаў каманду Грыб.— Апраніся, як на вяселле! І каб у дзве гадзіны быў тут...

Анатоль узняў галаву.

— Валянцін Паўлавіч... Я сёння не магу. Вы разумееце — сёння...

Дырэктар, не зважаючы на словы Анатоля, перапыніў яго:

— Сёння ў цябе дзень другога нараджэння, галава!

Анатоль устаў.

— Я сёння павінен дамовіцца аб дні нашага вяселля,— прамовіў ён і пачырванеў. Кручанюк не сказаў усёй праўды, не прызнаўся, што сёння яны дамовіліся з Інай пайсці ў загс...

— Ах, у цябе сапраўды вяселле! — глыбакадумна паківаў галавою Грыб.— Вяселле — гэта добра! Нікуды не сплыве твая рыбка, пачакае. Вяселле мы табе на заводзе адгрохаем, у клубе!

Абодва засмяяліся, і Анатоль пайшоў.

Па праўдзе кажучы, Анатоль чамусьці баяўся гэтага нечаканага вяселля, але на ім настойвала маці. Даведаўшыся, што бацька Іны прафесар, яна ўжо справілася пабываць у тым ціхім завулку, дзе стаяў асабняк, і пазнаёмілася з усімі яго жыхарамі. Анатолева маці сама ўзялася за справу абедзвюма рукамі. Іна са сваім вясёлым характарам і ўменнем трымаць сябе на людзях падабалася ёй нават больш, чым Анатолю. А свацця з яе атрымалася адмысловая. «Мой Толя не рабочы ўжо. Ён — канструктар!» — пры кожным выпадку паўтарала яна, і ўсе разумелі сэнс гэтых слоў, тым больш што дацэнт Коўшык (а не прафесар!), бацька Іны, цэлае лета павінен быў сядзець на сваёй рыббазе недзе на Азоўскім моры, а дома былі адны жанчыны — Іна, яе мачаха, стройная чарнявая ма-

ладзіца гадоў трыццаці, і служанка, глухаватая бабулька, ахвотніца да ўсякіх плётак.

Цяпер жа Анатолю была магчымасць на нейкі час адцягнуць вяселле і лепш прыгледзецца да сваёй будучай жонкі, якая так нечакана парушыла яго душэўны спакой і мірнае халасцяцкае жыццё...

Два пакоі, з якіх складалася кватэра Кручанюкоў, былі абстаўлены звычайна, без раскошы. Сярод простай мэблі кідалася ў вочы толькі вялізная старасвецкая канапа, палічка якой была ўстаўлена касцянымі слонікамі рознай велічыні і пакрыта вышыванымі сурвэткамі.

— Што так рана? — сустрэла Анатоля маці, калі ён, бадзёры і радасны, прыйшоў з завода.

— Еду ў міністэрства! — здымаючы рабочую вопратку, кінуў на хаду Анатоль.

— Я так і знала! — пляснула далонямі маці, і, пакуль Анатоль мыўся, яна выбегла ў калідор, каб паведаміць навіну суседзям. Шустрая, задаволеная жыццём, яна ўсю энергію і сілу аддавала сям'і, парадку ў хаце. Таму кватэра іх заўсёды ззяла чысцінёю.

— Не, не! Гэты гальштук не падыдзе! — ужо чуўся ў кватэры яе грубаваты голас.— Надзень паласаты. Ён больш яркі...

І калі Анатоль, апрануты ва ўсё новае, выйшаў у калідор, ён быў прыемна ўражаны: амаль усе суседзі іхняга пад'езда выйшлі павіншаваць яго і пажадаць шчаслівай дарогі. А белагаловая суседская дзяўчынка проста здзівіла.

— Вы новую машыну прыдумалі? — спытала яна шчыра.

— Ммм! — паціснуў ёй руку Анатоль, адчуваючы, як чырванеюць яго вушы. Ён выйшаў на вуліцу, нібы з лазні.

«Што яшчэ будзе, а яна такую авацыю падрыхтавала!» — незадаволена думаў ён пра маці. Але тут жа з'явілася і другая думка: «А можа, варты я пахвалы людзей? Можа, сапраўды я ўжо не толькі рабочы, але і канструктар, калі дырэктар вызваліў ад работы, Арцём Белы аддаў свой білет на лодку, а Змітрок... ахвяраваў каханнем? Усе віншуюць, паважаюць, як гэта прыемна!»

Так паступова, заглушаючы ранейшую сціпласць, прабіваліся на паверхню гонар, самалюбства...

Непадалёку ад прахадной ён заўважыў Іну. Яна была ў чорнай, вельмі вузкай сукенцы, з ярка пафарбаванымі вуснамі і моцна збытанымі валасамі наперадзе. Зрабіўшы

некалькі дробных крокаў яму насустрач, яна спынілася, стаўшы пеяк бокам і пазіраючы кудысьці ўсцяж вуліцы.

«Ці злуецца, ці проста рысуецца»,— падумаў Анатоль і прывітаўся.

— Іна, віншуй! Я сёння еду з дырэктарам у міністэрства...

— А як жа мы? Не пойдзем? — падзьмулася дзяўчына і зусім натуральна выцерла хусцінкаю вочы.

— Так, ведаеш, атрымалася,— пачухаў патыліцу Анатоль.— Няёмка неяк, але ты не думай, што я...

— Глупства! — Коўшык раптам павярнулася і шчасліва глянула яму ў вочы.— Табе трэба выбівацца ў людзі, Толь, разумнік мой... Я прыйшла павіншаваць цябе. Ідзі...

— Павіншаваць? — здзівіўся Анатоль.— Адкуль ты даведалася пра гэта?

— Ты забыўся, што ў цябе ёсць добрая, разумная маці, а ў мяне дома — тэлефон...

— Ах, вось што!

— Ідзі. А я пачакаю сяброўак... Тут павінна падысці адна экскурсія, дык я хачу з імі завод паглядзець...

— Сустрэнемся ўвечары! — сказаў на развітанне Кручанюк.

Іна, прыемна ўсміхаючыся яму ўслед, памахала над галавой рукою.

Забегшы на хвілінку ў цэх, Анатоль адвёў убок Івана і, каб не чуў Змітрок, сказаў:

— Я назначыў з Інай спатканне ўвечары, але не пайду. Хутка яна будзе з экскурсіяй... Растлумач, калі ласка, што не мог...

— А як яе пазнаць?

— Пазнаеш! Самая прыгожая... Ты ўжо бачыў яе! Іна гаварыла...

Іван, ведаючы гэтую дзяўчыну толькі па словах Анатоля, з радасцю згадзіўся дапамагчы яму і, калі Анатоль пайшоў, расказаў пра гэтае даручэнне Змітраку.

— Калі ўжо я пагутару з гэтай Інай, век да нашых хлопцаў не стане чапляцца!

— З Інай? — перапытаў Асташонак.

— А што? Ты ведаеш яе?

Змітрок паціснуў плячыма.

— Мала ў горадзе такіх імён? Тысячы...— і пайшоў да дзвярэй.

Ён зразумеў усё. Значыць, Іна тады не выпадкова пасспрачалася з ім. Паспрачалася, каб астацца з Анатолем

удваіх. Ён быў проста лішні. Цяпер Анатоль перадае дзяўчыну ў другія рукі. Што ўсё гэта значыць? Няўжо Іна ступіла на такі нядобры шлях? Цікава было б ведаць...

— Чаму гэта вы не маеце прывычкі вітацца? — пачуў Асташонак ля дзвярэй цэха знаёмы голас Галі Ждан і сумеўся: ён хацеў пабыць адзін. Галю ён убачыў упершыню ўсяго некалькі дзён таму назад. Адказаў абыякава:

— Думаю, што на дзень толькі адзін раз гавораць «добры дзень», ці не так? — і ўзняў вочы на гэтую чарнявую задзіру.

Галя, магчыма, прайшла б далей, калі б не такі яго адказ. Цяпер жа спынілася і зрабіла сур'ёзны твар:

— А можна задаць пытанне больш аднаго разу?

— Хіба ў гэтым ёсць патрэба?

— Калі ў школе давалі залаты медаль, улічвалі ваша красамоўства ці не?

Змітрок здзіўлена паглядзеў на Галю. Злуецца? Не! Яе задумлівыя карыя вочы і смуглявы твар з прыгожым маленькім носікам не былі злосныя. Што ж тады ёй ад яго трэба, гэтай запэцканай чарняўцы?

На пытанне ён адказаў пытаннем:

— А калі вас выбіралі сакратаром цэхавай арганізацыі камсамола, улічвалі вашу назойлівасць ці не, таварыш Ждан?

Яна трошкі пачырванела, ад чаго смуглявы твар стаў нібыта бронзавы. У гэтую хвіліну яна выглядала вельмі прыгожаю.

— Вам непрыемна са мною размаўляць? — здзівілася дзяўчына.

— Радасць не вялікая... Маё вам!

Вось якая была іх першая размова!

Галя пакрыўджана павярнулася і пайшла. Ужо ў сталоўцы яна паскардзілася Азарчуку:

— Размаўляла з тваім вучнем... Мядзведзь!

— Значыць, не размаўляла,— уздыхнуў Іван.— Хлопец ён добры, толькі надта гарачыцца...

— Гэта натуральна,— умяшаўся рабочы-сусед.— Усім навічкам здаецца, што сам станок зробіць любую дэталь, варта толькі яго ўключыць.

— А па-мойму, ён проста ганарлівы,— заўважыла Ждан.

— Ганарлівы? Чым яму ганарыцца? — спытаў той жа рабочы.

— Сваёй дзесяцігодкай, медалем,— растлумачыла Галя.

— Хіба ён адзін з дзесяцігодкай? — смеючыся, пярэчыў сусед.

Іван доўга маўчаў, мусіць, нешта абдумваў. Калі настала пара абеду, ён узяў у рукі кавалак хлеба і загаварыў да Галі:

— Сёння на вачах у Асташонка былі слёзы. Гэта што? Таксама ад ганарлівасці?

Яна не ведала, што адказаць.

Толькі пасля абедзеннага перапынку, калі ў цэх увайшла група экскурсантаў, Азарчуку сёе-тое стала зразумела...

Сярод экскурсантаў была Іна. Іван не мог пазнаць яе сярод дзяўчат. Ён толькі раз бачыў яе на выпускным вечары. А прыгожых было шмат!

Інжынер, што вёў групу, тлумачыў:

— Гэта адзін з буйнейшых цэхаў. Тут вырабляюцца дэталі, з якіх потым збіраюцца машыны...

— А гэта станкі айчынныя ці імпартныя? — спытаў хтосьці.

— Мы ўжо даўно карыстаемся толькі айчыннымі,— адказаў інжынер.— А вунь тыя, універсальныя такарныя, зроблены нават нашым заводам.

— А ці можна пабачыць вашага лепшага майстра? — гучна спытала Іна.

Змітрок насцярожыўся, змяніўся ў твары. Ён пачуў Інін голас зусім неспадзявана і ціха ўсклікнуў:

— Іна?!

Іван пачуў гэтае імя, глянуў на дзяўчыну, на Змітрака і стаў збоку, каб лепш было назіраць. «Значыць, гэтая... Іна. Цікавая дзяўчына...»

— У нас майстры ўсе добрыя,— смеючыся, адказаў інжынер.— Вось, калі ласка, сюды... Я пазнаёмлю вас з адным. Ён прыйшоў на завод з атэстатам сталасці...

«Змітрок... Ён!» — задаволена падумала Іна, выходзячы з групы наперад. Яе вочы прыемна і так знаёма заўсміхаліся, што Асташонак сумеўся і нечакана схапіўся за супарт.

— Ціха ты! — раптам крыкнуў Іван, але ўжо было позна. Сваім неасцярожным рухам Змітрок рэзка падаў супарт уперад, разец высек сноп іскраў і зламаўся...

— Іван, знаёмся... Гэта з інстытута экскурсанты,— па-

чуўся голас інжынера.— Хоць тут у вас непаладкі, разец зламаўся.

— Універсальная «зорачка»! — вырвалася з грудзей Азарчука.

— Нічога, наладзіш! — заспакоіў інжынер.— А вучню гайкі падкруці як след...

Коўшык насмешліва паглядзела на Змітрака. «Вучань... у рабочыя,— расчаравана падумала Іна.— Ён прапаў як вялікі чалавек... Яму не быць такім».

Азарчук заўважыў, што Змітрок не без прычыны пабег на выхад з цэха, але заглушыў недзе ўнутры сваю ўзрушанасць і зусім спакойна звярнуўся да групы:

— Дык што вас, таварышы, больш за ўсё цікавіць?

— У чым сакрэт такіх высокіх паказчыкаў вашай працы? — спыталі ў яго экскурсанты.

— Сакрэт?.. Вось у чым: займаюся боксам, харчуюся рэгулярна, сплю колькі трэба...

Усе засмяяліся. Ім спадабаўся жарт маладога майстра, які адразу загаварыў сур'ёзна аб тым, што, выхоўваючы волю і настойлівасць, чалавек можа дайсці да любой мэты. Азарчук яшчэ раз звярнуў увагу на тое, як спорт дапамог яму ў рабоце.

— Вось і ўсё... Астатняе дапоўніць вам інжынер,— паціснуў ён плячыма.

Пакуль гаварыў, Азарчук воч не зводзіў з Іны. Яна ж зразумела гэта па-свойму. «Які ён прыгожы, гэты пляменнік Ганны Аляксандраўны! — думала дзяўчына.— Дарэмна я тады, на вечары, не пайшла з ім танцаваць...»

Ініны вочы заблішчэлі, пацямнелі і зноў успыхнулі. Група адышла, а яна, нібыта цікавячыся станком, затрымалася. Івану гэта і трэба было. Ён падышоў да яе зусім блізка.

— Вас, здаецца, Інай завуць? — спытаў ён.

— Значыць, вы мяне яшчэ помніце? — прыемна ўсміхнулася дзяўчына і папраўіла свае валасы.

— Вас цяжка забыць...

— І я вас пазнала. Адразу!

— Ну, гэта не дзіва! — пажартаваў Іван.— Я мечаны,— і ён паказаў на чырвоную пляму каля вока.— Але гэта глупства. Я хачу з вамі вось аб чым дамовіцца... Вы будзеце сёння ў восем ля бібліятэкі Леніна?

Коўшык азірнулася і разгублена адказала:

— Я... не ведаю. Я павінна...

— Сустракаць Анатоля? — перапыніў яе Азарчук.

— Адкуль вы ведаеце?

— Ён перадаў, што не зможа. Будзе заняты...

— Ах, так! — прыжмурыла яна вочы.— А я ўсё роўна прыйду да бібліятэкі...

Яна па-змоўніцку кіўнула галавою і накіравалася даганяць групу. «Вось так! — з усмешкаю падумаў Іван.— Я цябе ўзрадую, лялька... Запомніш мяне!»

Змітрок так і не вярнуўся ў цэх.

Ледзь скончыўся рабочы дзень, Азарчук сам хуценька пачысціў станок і памчаўся дадому. Не распранаючыся, ён замкнуўся ў сваёй фоталабараторыі-каморцы і праз некалькі хвілін вынес адтуль гатовыя здымкі. Так, памылкі не было: Коўшык сядзела з Асташонкам і шчасліва ўсміхалася. У руках яна трымала вазачку з марожаным. Цудоўны здымак!

Іван успомніў той выпускны вечар, Змітрака з Інай і ўсё зразумеў. «Ім трэба дапамагчы... Анатоль, бадай, не ведае нічога, а гэтая лялька закружыць галаву любому...»

А палове восьмай ён ужо тупаў каля гарадской бібліятэкі, час ад часу паглядаючы на гадзіннік.

— Восем...— нарэшце прамовіў ён.

— А я ўжо тут!

Іна падышла ззаду вельмі ціха. Іван нават разгубіўся.

— Дакладна, нічога не скажаш... Можна правяраць гадзіннік! — пахваліў ён дзяўчыну.— Вечар добры...

— Добры вечар,— шчасліва ўсміхаючыся, адказала Коўшык і агледзела хлопца з галавы да ног.— О-оў, вы так умееце падбіраць адзенне!

— Гэта справа няхітрая, уменне многа не патрабуе — з аднаго касцюма выбіраць адзін,— засмяяўся ён. Яна прыняла гэта за жарт і таксама засмяялася. Яны пайшлі па цяністай алеі парку.

— Памятаеце той вечар,— пачаў Іван, сур'ёзна пазіраючы дзяўчыне ў вочы.— Я вельмі часта ўспамінаў вас... Якая шчаслівая пара́ маладосці!

— Успаміналі? — пацікавілася Іна.— А я думала, што вы, як усе, хутка забываеце...

— Магчыма, я горшы за іншых.

Яны селі на свабодную лаўку.

— Вы, здаецца, хацелі са мною аб нечым пагутарыць? — спытала Коўшык.

— Давайце тады пазнаёмімся як след. Мяне завуць Іван,— усміхнуўшыся, хлопец працягнуў руку.— Азарчук...

— Я вельмі рада. Іна,— у сваю чаргу сказала яна.— Давайце лепш хадзіць...

Яны зноў усталі і паволі пайшлі побач. Іван у захапленні ад сваёй місіі настаўніка ў новым жанры пагледзеў на прыгожы твар Іны і не мог наглядзецца. Адчуваючы гэта, Коўшык спытала:

— Чаму вы так на мяне глядзіце?

— Зачараваны вашай прыгажосцю, Іна...

Змітрок сачыў за імі з самага пачатку, але толькі цяпер, схаваўшыся за тоўстую ліпу, ён, нарэшце, злавіў гэты першы сказ. І які! Лепш бы Іван так не гаварыў!..

Іна засмяялася:

— Вы цікавы хлопец!

— Чаму?

— Вы ні на кога з маіх знаёмых не падобны...

— Натуральна! Толькі кураняты, што выходзяць з інкубатара, бываюць падобныя адно да аднаго,— сказаў Азарчук.

Іна прастадушна засмяялася.

— Вы пачынаеце мне падабацца,— амаль сур'ёзна заначыла яна.

— А мо пройдземся па гэтай алеі? Яна цішэйшая.

— Сюды? Гэта алея закаханых...

— Тым лепш. Якраз месца для нашай гутаркі,— усміхнуўшыся, заўважыў Іван. Узяўшы Іну ямчэй, ён паволі павёў яе ў засень стогадовых дрэў, у кучаравым лісці якіх заблыталіся трапяткія сонечныя праменні.

7

Цяжка было Змітраку абыякава глядзець на гэта спатканне Іны з яго майстрам, і ён пайшоў дадому. Здавалася, ужо забыўся, плюнуў на яе. А ўбачыў — зноў бура ўзнялася ў грудзях, разгарэўся агонь. І не згасіць таго пякучага агню ні працай, ні часам. Што ў яе за натура? Можа, ён зусім не разумее Іны? Можа, дарэмна хавацца і крыўдзіць яе сваімі прыдзіркамі? Хіба варта было, не пагутарыўшы, раўнаваць яе да нейкага фізкультурніка Артура? А потым — да Анатоля? Той вось узяў ды не прыйшоў на спатканне. Хіба дзяўчыне не абраза гэта? І ці прыемна ёй, як гэта здаецца збоку, выслухваць прызнанні другога, Івана? Магчыма, яна на злосць Змітраку робіць гэта, а ён, замест таго каб быць на іх месцы, толькі хаваецца?..

З такімі думкамі Асташонак зайшоў у пакой, зачыніў акно і сеў да стала. Выняў з шуфляды пачак пісем, асцярожна распячатаў адно і прачытаў. У ім Коўшык скардзілася на нецікавасць жыцця, на вячэрнюю сумату...

— Хлусня! Усё гэта хлусня,— сказаў Змітрок. Звязаў пакет зноў, узяў аловак і напісаў зверху: «Пацукі ўцякаюць з карабля, які павінен затануць....Але яны іншы раз памыляюцца і дарэмна гінуць. Усяго добрага...»

Потым зазірнуў у спальню і, упэўніўшыся, што Ганя спіць, асцярожна выйшаў на двор.

На вуліцах ужо запальвалі ліхтары. Прыемны халадок асвяжыў Змітракоў твар. Ён і не прыкмеціў, як падышоў да знаёмага асабняка ў завулку. «Аддам пісьмы... Можа, яна што-небудзь скажа». Ён зламіў сябе на думцы, што ўсё ж хоча, усё ж чакае, каб яна яму сказала хоць слова. Значыць, не згасла яшчэ каханне? А чаму яно павінна згаснуць? Цяпер, як ніколі ў жыцці, патрэбен сапраўдны друг, таварыш. А ён нават не змагаецца за яго, не дае належнага адпору сваім сапернікам! Ён толькі крыўдзіўся і ўцякаў, пакідаў яе. А шчасце ж трэба заваёўваць, здабываць...

Зайшоўшы на двор, Асташонак спыніўся ў нерашучасці: ні ў адным акне святла не было. Тады ён пазваніў. На званок ніхто не выйшаў.

«Яшчэ мілуюцца недзе! — сцяўшы зубы, падумаў хлопец.— А я ўсё ж дачакаюся вас, хоць раніцой...»

Неўзабаве Змітрок пачуў Інін голас, Іванаў. Усё бліжэй і бліжэй...

— Язычок у вас, трэба сказаць, як на падшыпніках,— адчыніўшы брамку і прапусціўшы Іну ўперад, заўважыў Азарчук.

— Уся сіла жанчын — на кончыку языка! — смеючыся, адказала Коўшык.

І тут Змітрака апанавала такая злосць, што ён гатоў быў адразу ж кінуцца ў бойку. Але гэты раз стрымаўся, скочыў з ганка і пабег за рог асабняка. Яму чамусьці зрабілася нібы холадна.

Вось Іна і Іван падышлі да дзвярэй.

— Дзе гэта я паклала ключы? — данёсся прыглушаны голас дзяўчыны, і Змітрок пачуў, як пстрыкнуў замочак сумачкі.

— Значыць, вы тут жывяце? А дзе ж вашы? — спытаў Азарчук.

— Маці ніколі па вечарах не сядзіць дома,— адказала

Іна.— Маці... Як смешна гэта гучыць! Яна старэйшая за мяне ўсяго на восем год...

— Значыць, ёй цяпер дваццаць шэсць?

— О-о, не! — засмяялася Коўшык.— Больш...

— Колькі ж?

— Дваццаць дзевяць.

— Гмм, цікава... А вам?

— Дваццаць адзін... Вы здзіўлены? Растлумачу, калі не будзеце з мяне смяяцца і нікому не раскажаце сакрэту...

— Абяцаю.

— У першым, трэцім і сёмым класе...

— Па два гады? — здагадаўся Азарчук.

— Што зробіш — тупіца... Вось яны, знайшліся.

У дзвярах павярнуўся ключ. Іна сказала зноў:

— Я спярша запалю тут святло.

— Не турбуйцеся, я пайду дамоў... Толькі помніце, што я сказаў — выкіньце з галавы глупства...

— Я хачу, каб вы мяне правільна зразумелі,— адказала Коўшык.

— Я вас разумею,— шматзначна заўважыў Іван.— Асташонак не апраўдаў вашых надзей — раз! Ён для вас занадта малады — два. І трэцяе...

— Я яго будучыню ўяўляла інакш,— уздыхнула Іна.— Усе думалі, што ён стане вялікім чалавекам. Сяброўкі зайздросцілі мне. І раптам...

— Звычайны рабочы...— прадоўжыў яе думку Іван.

Яны ўвайшлі ў сенцы, і Змітрок чуў цяпер толькі ціхі шэпт.

— Шэпчуцца, у каханні прызнаюцца,— праз зубы працадзіў ён.— Я вам пакажу, хто занадта малады!..

Іна запаліла святло. Іван моўчкі паглядзеў на яе.

— Чаму вы так глядзіце? — як пры сустрэчы, спытала яна.

— Думаю,— адказаў Іван, злуючыся.

— Аб чым, калі не сакрэт?

— Думаю, па якіх законах прырода напоўніла такую чароўную галаву такімі бруднымі думкамі...

Коўшык зусім не разгубілася ад такога «кампліменту», а толькі разгневалася. Яна вельмі позна зразумела сэнс гэтага непатрэбнага спаткання. Ад злосці яе вочы яшчэ больш расшырыліся, сталі, нібы ў савы.

— Прашу не абражаць... Інакш я вас выганю! — павысіла яна голас.

— Буду вам толькі ўдзячны! — нібы абрадаваўся Іван.— Вы — абывацелька, бо вызначаеце вартасць карціны па бляску рамы... Застаецца толькі радавацца, што вы адмаўляецеся ад Асташонка, але Анатолю я не зайздрошчу. Прападзе хлопец як ніць даць, калі справы ўжо дайшлі да вяселля!..

— Нахабнік! — не знайшоўшы іншых слоў, сказала Іна і, прыхінуўшыся да вушака, пачала плакаць.

Азарчук, выйшаўшы на ганак, сказаў:

— Спакойнай ночы... Мне было вельмі прыемна пазнаёміцца з вамі!

Змітрок пачуў гэта і з горыччу падумаў: «Эх, сябры! Людзі... Кожны толькі пра сябе дбае, сябе бачыць, сябе любіць... Што ім да гора другіх? Анатоль адбіў Іну ў мяне, Іван імкнецца вырваць яе ў Анатоля! А я вам усім зубы павырываю».

Паклаўшы пісьмы ў кішэню, Змітрок пакрочыў следам за Іванам. Ён сам не ведаў, што будзе рабіць далей, але жаданне адпомсціць сваім сапернікам, хоць позна, стала для яго неадкладнай патрэбай. За што, дзеля чаго — гэта не мела значэння.

Ля гарадскога парку ён дагнаў Івана і заступіў яму дарогу.

— Чакай!

Іван спыніўся.

— Дзімка? Ты што тут...

— Я ўсё ведаю,— перапыніў яго Змітрок, сціскаючы кулакі.

Іван здагадаўся аб яго злых намерах.

— Што хочаш? — коратка спытаў ён.

Сцяўшы зубы, Змітрок паглядзеў па баках і пагрозліва зірнуў на таварыша:

— Зойдзем у сад. Я павінен сказаць табе пару слоў...

— Толькі пару? Ну, што ж, зойдзем!

Яны моўчкі ўвайшлі ў асветлены парк. Там было ўжо зусім мала народу. Насустрач, спакойна зірнуўшы на хлопцаў, прайшоў дзяжурны міліцыянер. Ён заўважыў у іх паводзінах штосьці няладнае і пайшоў назіркам.

Яны звярнулі на цёмную алею. Нідзе нікога няма. Спыніліся, сталі адзін насупраць аднаго.

— Ну, я цябе слухаю,— сказаў Іван і мірна паглядзеў Асташонку ў вочы. Той, нічога не адказаўшы, раптам ударыў Івана ў твар.

— Вось мае словы!..

Іван пацёр сківіцу рукою і гэтак жа спакойна прамовіў:

— Адно слова пачуў... Не скажу, што надта важкае. Цяпер кажы другое...

— Другое? — з запалам спытаў Змітрок і зноў замахнуўся.

І тут быццам з зямлі вырас міліцыянер і схапіў яго за руку.

— Грамадзянін, усё ясна... Хадзем са мною ў аддзяленне!

Азарчук засмяяўся і стаў насупраць міліцыянера.

— Нічога не ясна, таварыш міліцыянер! — сказаў ён так спакойна, што той выпусціў руку Змітрака.— Ён — лепшы баксёр завода, а я — яго трэнер. Заўтра ў нас адказная сустрэча. Я даю апошнія парады перад боем...

Азарчук дастаў з кішэні маленькую кніжачку і з сур'ёзным выразам твару працягнуў яе дзяжурнаму:

— Вось маё трэнерскае пасведчанне.

Міліцыянер узяў у рукі кніжачку і падышоў бліжэй да ліхтара. Іван жа, быццам нічога і не было, тлумачыў Змітраку:

— Разумееш сваю памылку? Твой удар не цяжкі, забываеш самае галоўнае. Трэба ўвесь цяжар цела ўкласці ў адзіны ўдар. Прыблізна вось так...

З апошнімі словамі Азарчук з майстэрствам спецыяліста ўдарыў Змітрака. Той, ступіўшы крок назад, паваліўся на зямлю.

Іван падышоў, памог падняцца.

— Цяпер ясна?

— Ясна,— механічна адказаў Асташонак, трымаючыся за шчаку рукою.

Міліцыянер падазрона паглядзеў на дзівакоў баксёраў і, вяртаючы Івану яго кніжачку, сказаў:

— Канчайце, таварышы, канчайце... А то людзі падумаюць, што вы на самай справе пачалі тут біцца, а я знарок не заўважаю... Не месца і не час!

І ён павольна пакрочыў далей.

Іван, па-сяброўску ўсміхаючыся, спытаў:

— Цяпер пагутарым на чалавечай мове?

Але Змітрок не адказаў яму, крута павярнуўся і амаль пабег прэч. Яму было балюча і крыўдна. Ён адчуваў, што зрабіў не тое і не так, як гаварыла сэрца. Тут ён дзейнічаў адным розумам, які так часта падводзіць чалавека, калі не ўлічваць пачуцці.

У вушах звінела ад моцнага ўдару. Змітрок быў нібы п'яны. Нават жанчыны, што сустракаліся яму, саступалі ўбок.

Дайшоўшы да скрыжавання, Змітрок пачаў пераходзіць вуліцу, але перад ім рэзка затармазіў знаёмы каштанавы «Масквіч»! Дзверцы адчыніліся, працягнуліся дзве пары рук. Яны схапілі Змітрака за каўнер, за вопратку і ўцягнулі ў машыну. Дзверцы зачыніліся. Машына кранулася з месца. Усё гэта адбылося імгненна.

— Чэрці! — апамятаўшыся, прамовіў Асташонак. На яго глядзелі нерухомыя вочкі «пацука» Рамана. Ігар Стук сядзеў за рулём. Хтосьці трэці сядзеў побач з Асташонкам. Заўсёды спакойны, самаўпэўнены і чырвоны Ігар павярнуўся і сказаў:

— Сёння, думаю, не адмовішся з намі пасядзець?

— Па-аехалі! — махнуў рукою Асташонак.

Трэцім аказаўся шафёр, які пагнаў машыну дадому, калі яны сышлі каля знаёмага рэстарана. Там ужо было мала народу. Змітрок глянуў на гадзіннік, што вісеў на сцяне, і пашкадаваў:

— Хутка зачыняць...

Ігар і Раман моўчкі пераглянуліся і пайшлі ў канец залы, дзе знаходзіўся невялікі асобны пакойчык з адным сталом.

— Тут можаш быць, як дома, і заказваць усё, што пажадае душа! — сядаючы за стол, усміхнуўся Стук.— Мы — людзі адмысловага складу! Жывём для жыцця...

— Да вашых паслуг, маэстра, Ромул пятнаццаты, кароль вольнай краіны «Зялёны змій»! — прыклаўшы хударлявую руку з доўгімі жылістымі пальцамі да даўно нястрыжанай галавы, адрапартаваў пацук.

«Прападзеш ты, Ромул пятнаццаты, са сваім дурным характарам жыць чужой галавою як піць даць!» — з ухмылкай падумаў Змітрок. Яго здзівіла, што афіцыянтка, не атрымаўшы заказу, прынесла ўсё сама. Яна, ужо не маладая дзяўчына, жартавала з імі, гэтымі дарослымі дзецюкамі, як з роўнымі, і дакарала іх, што доўга не заходзілі.

Відаць, яны былі тут свае людзі!

— Ты, Змітрок, добры хлопец! — пасля першай чаркі пачаў Ігар.— Я заўсёды спадзяваўся на тваё здольнасці. Выпі яшчэ, і тады пагутарым аб справе...

— Аб якой справе? — не зразумеў Асташонак.

— Аб тым, як будзем жыць далей... Мы не пакінем

цябе ў адзіноце, каб кожны з нашага таварыша смяяўся і глуміўся. І павер, што той, хто сёння пакрыўдзіў цябе, заўтра будзе цалаваць твае сляды на зямлі!..

«Вось яно што-о! — падумаў Змітрок.— Яны, аказваецца, сочаць за мной і з'яўляюцца на дарозе не выпадкова, а ў самыя «крытычныя» хвіліны... Збавіцелі! Пастойце ж, галубкі!»

Асташонак выпіў яшчэ чарку і зрабіў выгляд, што дужа ап'янеў. Звесіў галаву, прыжмурыў вочы...

Раман пстрыкнуў у яго кавалачкам хлеба.

— Дзімка, не спі...

— Налі яму кавэ,— прапанаваў Ігар.— Яно бадзёрыць...

— Кавы? Давай кавы! — грымнуў кулаком па стале Змітрок. Пад смех сяброў ён адным духам асушыў паднесеную Раманам чарку каньяку, абвёў мутным позіркам кампанію.

— З такой хеўрай вялікім чалавекам не станеш,— пакруціў ён галавою і засмяяўся.— Вось убачыла б Іна! Доктар і хімік... Ха-ха-ха!

Ігар падміргнуў Раману і праз стол нахіліўся да Змітрака.

— А ты плюнь на вялікага чалавека. І на сваю Іну... Будуць грошы — будуць тры Іны! Дзесяць!

— Грошы? Без працы хто іх дасць? У мяне ж няма бацькі...

Ігар адказаў:

— А ты думаеш — мне бацька дае грошы? Я машыну і то бяру тайком, калі ён у камандзіроўцы...

— Ну, а грошы хто дае? — спытаў у яго Змітрок.— Калі не працуеш, дык не толькі не пап'еш у рэстаране, але і не паясі!

— Пакінь свае дурныя думкі, а разам з імі і завод! Мы выедзем за горад, і ты будзеш мець грошы. Як мы...

— Кра-сці? — па складах вымавіў Асташонак.

— Ш-шш,— Раман закрыў яму рот рукою.— Не красці, балда, а здабываць...

Але Змітрок не слухаў яго.

— Красці — гэта не па маёй часці! Памыліліся адрасам, пацук і Гіра...— гучна ўсклікнуў ён.— Бач, чаго захацелі! Каб я ды кра...

Тут Змітрок убачыў незнаёмага хлопца з фотаапаратам у руках. Ён ужо сфатаграфаваў усіх за сталом і цяпер нахабна ўсміхаўся.

— Заткніце глотку гэтаму шчанюку! — раптам строга прамовіў незнаёмы.

— Няхай пажартуе! — засмяяўся Ігар.— Пасля ўдалай аперацыі не грэх і павесяліцца...

«Ну, сябры, не вельмі я папалохаўся вашых фатаграфій! — падумаў Асташонак.— Стары прыём вярбоўкі, прыдумалі б хоць што навейшае...»

— Я не ведаю, хто вы,— звярнуўся ён да хлопца, адразу працверазеўшы.— Што датычыць астатніх, то з імі ў мяне асобны рахунак! — Змітрок павярнуўся да Ігара і дадаў: — Гэй ты, атаман... Вось табе дваццаць пяць рублёў, што тут растраціў! І больш я вас не ведаю... Ні цябе, пацук, ні цябе! Ды і не доўга вам весяліцца... Бывайце!

Ідучы праз залу рэстарана, Асташонак спыніўся каля афіцыянткі і гучна прамовіў:

— Як вам не сорамна! На падачках у тых трутняў жывяце... Лакейнічаеце! Адказваць вы ўсе будзеце разам...

Усю дарогу Змітрок прыдумваў спосабы, як выкрыць Ігара і яго кампанію. Спачатку ён вырашыў звярнуцца проста ў міліцыю. Але што ён там скажа? Патрэбны доказы, а іх няма. Што разам піў? Гэтага мала.

Пад'ехала таксі. Машына спынілася недалёка наперадзе, і з яе выйшлі трое. Змітрок адразу пазнаў сяброў з рэстарана.

«Палохаюць. Ці задумалі адпомсціць? Іх трое, а я адзін... Што рабіць?»

Скочыўшы на вуліцу, Асташонак падняў руку і спыніў таксі, якое развярнулася, каб ехаць назад.

— Паштовая, дваццаць! — гучна, каб чулі хлопцы, прамовіў ён і сеў у машыну, хоць грошай у кішэні не было. Ён убачыў толькі, як Ігар пагразіў услед кулаком, але ўжо зрабіць што-небудзь не мог...

А калі Змітрок прыехаў дадому і па шчасліваму выпадку сустрэчы з суседам першага паверха разлічыўся з шафёрам таксі, пяўпэўненасць авалодала ім. Падымаючыся па прыступках, ён ужо шкадаваў, што згадзіўся ехаць у рэстаран, шкадаваў, што не змог выканаць змоўніцкую ролю да канца, што саромеў афіцыянтку і што спалохаўся тых трох на вуліцы...

Раптам Змітрок спыніўся. Перад ім на шэрых прыступках, цьмяна асветленых лямпачкай з трэцяга паверха, накінуўшы на плечы пушыстую хустку, сядзела... маці! Вось яна ўзняла галаву, строга паглядзела на яго.

Змітрок ступіў крок назад.

— Я... Я не хацеў... Яны прымусілі выпіць! — спалохана прашаптаў ён і закрыў вочы рукамі. Праз якую хвіліну адкрыў і ўбачыў, што маці ўсміхалася. Змітрок працёр вочы.

— Хто тут?! — закрычаў ён.

— Я...

Гэта Ганя. Яна ўстала і радасная кінулася да яго.

— Прыйшоў, Дзіма! Я так хвалявалася...

— Ты? — здзівіўся і абрадаваўся Змітрок.— Тут спала?

— Я не ведала, дзе ты. Чакала-чакала, і крыху зморыў сон.

— А гэта? — ён сарваў з яе плячэй матчыну хустку.— Нашто ты ўзяла гэта?

— Было холадна...

Ён зморана паплёўся да дзвярэй.

8

Дзесяць дзён ездзіў Кручанюк з дырэктарам завода. Ён патроху звыкся са сваёй славаю, добра прымераўся да розных трыбун і пачынаў ужо адчуваць сябе незаменным чалавекам для грамадства. «Гэта ж нябдага ездзіць увесь час па рэспубліцы, перадаваць свой метад другім, дзяліцца вопытам, чуць воплескі, падзякі. Няхай ведаюць нашых, як гаворыць дырэктар»,— думаў Анатоль.

У гэтым, можа, ніякай бяды і не было. Бяда была ў другім: Кручанюк пачаў задавацца. Яшчэ не паспеўшы добра папрацаваць, убачыць плён сваёй працы, навучыцца паважаць яе і шанаваць, ён адчуў асалоду славы.

Няхай сабе і даваў разец «зорачка» пэўную эканомію часу, меў пэўную перавагу над астатнімі разцамі, але ж не аднаго яго гэта заслуга. Яго была толькі ідэя. А хто памог зрабіць разлікі? Хто шмат часу патраціў па ўдакладненне формы разца? Азарчук і другія майстры, тэхнічны персанал завода, кожны па драбніцы...

Першыя дні Анатоль яшчэ таго-сяго ўспамінаў. А пасля смела пачаў гаварыць з трыбуны аб тым, як ён выпайшаў «зорачку», як ён удасканаліў яе...

І вось Анатоль дома. Даведаўшыся аб яго прыездзе, прыйшла Іна. Яна пры маці пацалавала Анатоля ў шчаку і нагаварыла столькі прыемных слоў, што ў хлопца закружылася ад шчасця галава.

— Будзеш у нас... Толькі ў нас! — цвярдзіў ён, заглядаючы дзяўчыне ў вочы.— За гэтыя дзесяць дзён я зразумеў, што без цябе няма мне шчасця!

— А мне — без цябе...

Калі маці выйшла, ён стаў насупраць Іны, моцна сціснуў у сваіх абдымках і, цалуючы, гаварыў:

— Іна... Інэса... Інютка...

— Ну, досыць табе, мядзведзь!

Яна вырвалася з яго абдымкаў і адышлася да акна, папраўляючы сваю кароткую стрыжку. А ён гаварыў:

— Я тады, на возеры, калі толькі ўбачыў цябе, сказаў у душы: «Гэтая дзяўчына будзе маёю!» І цяпер гавару ўжо адкрыта — ты мая!.. Мая! Ты — тая, якую я чакаў і дачакаўся...

«Што ж, гэта праўда,— думала між тым Іна.— Дайшла чарга, дык і дачакаўся...»

— Прашу да стала,— пачуўся з другога пакоя голас маці, і яны, узяўшыся за рукі, пайшлі палуднаваць.

— Я чуў — навенькі ўдарыў Івана...— насцярожана пачаў Анатоль за сталом.— Што ў цябе з ім было? З Асташонкам, ці як яго...

Коўшык недаўменна паціснула плячыма і скрывіла вусны.

— Чорт іх ведае... Змітрок, відаць, яшчэ ў школе закахаўся па вушы, а Іван... Убачыў, што я зусім не зважаю на яго прызнанні, і пачаў гаварыць рознае глупства... Што з-за мяне Асташонак пакутуе. А мне што? Я параіла купіць яму соску...

Анатоль уважліва паглядзеў на Іну.

— А раней ты з ім сустракалася?

— Ды так, па школе...— Вочы яе раптам загарэліся гневам.— Гэта што — допыт? Ці не ўздумаў ты раўнаваць мяне да таго дзіцяці?

— Асташонак ужо не дзіця! — гучным басам сказаў Анатоль.— Калі ён з'явіўся на заводзе, кажуць, наша Галінка страціла спакой... Бедны Іван!

— Гэта што яшчэ за Галінка? — адразу астыўшы, пацікавілася Коўшык.

— А цябе гэта хвалюе? — усміхнуўся Анатоль.

— Ды так... Цікава, хто можа такім цельпухом захапляцца...

— Ну, тады... налівай віно. Мама! Дзе ты там? — гукнуў ён.

Маці Анатоля неўзабаве прынесла з кухні і паставіла

пасярод стала на сярэбраным падносе смажаную качку. Яна ведала толк у стравах!

— О-оў! — усклікнула Іна.— За гэтым сталом можна прасядзець усю маладосць!

— Частуйцеся, дзеткі! — задаволена прамовіла гаспадыня, падсоўваючы сподачкі.— Мой Толя любіць паесці, а я люблю прыгатаваць.

— Табе, мама, хутка работы прыбудзе! — жартоўна сказаў Анатоль.— Іна, як і я, любіць добра паесці...

Ён дакрануўся да Ініпай рукі вышэй локця. Яна пачырванела і замахала на яго хусцінкай...

— Не мані! Я таксама сёе-тое магу зрабіць. Вось паедзем да нас — убачыш...

— А што ж — ідэя! — згадзіўся Анатоль.— Пасля нашага полудня — ваш. Мама, згодна?

— Ды вы ўжо без мяне. Я павінна дагледзець усё ў хаце, не ты ж адзін у мяне,— адказала маці.

Папалуднаваўшы, Анатоль і Іна пайшлі.

— Пойдзем ці паедзем? — ужо на вуліцы спытаў Кручанюк.

— Пойдзем! — адказала Іна і ёмка падхапіла Анатоля пад руку.

Адвячорак быў прыгожы, цёплы. Недзе далёка-далёка на небасхіле часта жыхалі маланкі, а над горадам вісела светла-блакітнае неба. На ім нібы раскатваў бяліць па сонцы доўгае палотнішча нябачаны простым вокам рэактыўны самалёт...

Іна глянула на строгі профіль Анатоля. Ёй падабаліся яго густыя чорныя бровы, чысты ружаваты твар і даволі салідны чуб. «Усё ж ён прыгажэйшы за Змітрака!» — з замілаваннем падумала дзяўчына і яшчэ бліжэй прытулілася да каханага.

— Я не пушчу сёння цябе дадому,— блізка-блізка ля вуха шапнула яна.

— А я не вельмі буду рвацца! — з усмешкай адказаў Анатоль.

Яны самі не заўважылі, як пайшлі хутчэй, і толькі калі апынуліся на ціхім завулку, збавілі хуткасць. Ужо за форткай Іна сказала:

— Дома сёння... Чуеш, спявае?

Анатоль прыслухаўся: праз адчыненае акно даносіўся прыемны жаночы голас.

— Тым лепш! — ажывіўся ён.— Я адразу пазнаёмлюся з цешчай!

Анатоль першы адчыніў дзверы і... спыніўся ў першучасці: перад ім стаяла стройная чарнабровая жанчына і з ухмылкай глядзела на яго. На ёй была лёгкая стракатая сукенка з вузкім надолам. Смуглявыя плечы вытыркаліся з западта вялікага выразу, а поўныя грудзі, здавалася, вось-вось разарвуць туга нацягнуты станік сукенкі. Вусны ў жанчыны былі ярка нафарбаваны. Яна акінула Анатоля з галавы да ног уладным позіркам цёмных вачэй і лагодна ўсміхнулася:

— Праходзьце. Можа, у сваты?

— У сваты...— Іна выйшла наперад, узяла разгубленага жаніха за руку.— Знаёмся, Толя... Гэта — маці.

— О-оў! — як і Іна, усклікнула тая.— Якое прыемнае знаёмства! Гэта ён... ну, той, за каго...

— Сабралася выйсці замуж! — падказаў Кручанюк.— Мая маці тут была ўжо, а я вось упершыню, прабачце... Анатоль.

Іна бліснула на мачаху злоснымі вачамі, але тая не заўважыла гэтага позірку, бо ўся яе ўвага была аддадзена Анатолю.

— Каця,— адказала мачаха, знаёмячыся. Кручанюк адчуў у сваёй руцэ мяккую, пульхную далонь. Гэтая далонь моцна трымала яго руку і ніяк не хацела выпускаць яе.— Вы, прабачце, часам не з опернага?

— Не-е...

— Са студыі?

— Не ўгадалі зноў.

— Няўжо ты забылася? Ён — канструктар! — падказала Іна.

Каця зноў усклікнула «о-оў» і хуценька пабегла ў сенцы.

— Зараз будзе добры стол! — падміргнула Іна Анатолю.— Ты спадабаўся ёй... Толькі глядзі-і...— яна падышла і ўдарыла яго пальцам па носе.— Не будзь памаўзлівы!

— Што ты гаворыш?! — абурыўся Кручанюк, звёўшы бровы.— Так пра маці...

— А-а, ты яе не ведаеш...— адмахнулася Іна і, адчыніўшы шафу, дастала новы абрус з адмысловымі белымі ўзорамі.— Пойдзем лепш да стала.

«Чорт ведае, што гэта за людзі! Мне здаецца, што я ўжо сто год жанаты... Эх, шкада — не пайшла мама!» — падумаў Анатоль, ідучы за Інай у другі пакой.

Вялікая гасцінная была ўстаўлена добрым дзесяткам крэслаў вакол круглага стала. Збоку стаяў сервант. Двое

завешаных шторамі дзвярэй вялі ў другія пакоі, мусіць, у спальні.

— Ну, як... Падабаецца? — накрываючы абрусам стол, спытала Іна.

— Нішто сабе,— адказаў Анатоль, а сам падумаў: «Выхаванне мачахі адчуваецца ва ўсім. Аднак... тая куды прыгажэйшая!»

Кручанюку было прыемна сядзець насупраць Іны і «адкрываць» на яе твары новыя прыкметы хараства. Вось, напрыклад, гэтая маленькая радзімка над брывом нібы спецыяльна зробленая алоўкам... А гэтае міргаише вачэй! Яны то загарацца, стануць вялікія, то патухнуць раптам, а праз момант зноў становяцца вялікія. Тады, здаецца, яны свецяцца недзе надта далёка схаваным агнём... А гэты пяшчотны аксаміт яе твару!..

— Вы сёння будзеце за гаспадара тут! — ажыўлена загаварыла Каця да Анатоля, адчыняючы дзверы. У яе руках былі адны бутэлькі. Анатоль прыкмеціў на адной з іх пяць маленькіх зорачак і сумеўся: каньяку ён ніколі не піў! Але, каб не выдаць сваёй збянтэжанасці, узяўся адразу адкрываць гэтую бутэльку.

— Мы з Інай ужо крыху, як кажуць, на ўзводзе! — між іншым заўважыў ён.

Каця засмяялася.

— У нас так рэдка бывае сапраўдны мужчына, што проста адвыкаеш нават ад голасу,— сказала яна, вымаючы з серванта розны посуд і начынне.

Кручанюк адчуў, што яму дужа хочацца выпіць. Раней такога жадання ён не меў.

— А дзе ж, скажыце, ваш гаспадар? — спытаў ён, зірнуўшы на Кацю.

— Муж? — падхапіла яна.— Ён цалюткае лета будзе... як гэта ён казаў? Во — павялічваць прырост рыб у нашых марах і азёрах. Пытанне штучнага планктону!.. Вясёлая работа, ці не праўда?

— Гэта яго новая дысертацыя,— падказала Іна. На яе твары раптам знікла радасць доўгачаканай сустрэчы. Анатоль гэтага не заўважаў, бо старанна завіхаўся ля бутэлек, памагаючы гаспадыні. Калі прыгатаванне было скончана, ён падняў сваю чарку і сказаў:

— Першы тост я падымаю за цудоўных гаспадынь гэтага райскага кутка на зямлі!..

Ён чамусьці глядзеў толькі на старэйшую гаспадыню, нібы перад ёю быў вінаваты і прасіў спагады.

— Я не буду,— запярэчыла Іна.— Каньяк — гэта не для мяне.

Каця лагодна зазначыла:

— Не прыкідвайся, дзіця маё!.. Памятаеш, як мы на твой дзень нараджэння глушылі...

— Досыць табе!

Іна груба абарвала мачаху, схапіла сваю чарку і адным духам апаражніла яе. Каця падміргнула Анатолю і ўсміхнулася:

— Вось гэта па-нашаму!

Анатоль паднёс дзяўчыне на хлебе шпроцінку.

— Ты кісленькага ёй, грыбочка! — параіла мачаха.

Кручанюк падаў грыба, а сам падумаў: «Вось бы не праваліцца мне на гэтых іспытах... Што спярша лепш — кісленькае ці салодзенькае?» І наўгад узяў кавалачак лімона.

— Бывалы чалавек адразу відаць! — сказала Каця.— Ведаеце, што да чаго трэба...

Іна раптам папрасіла выпіць яшчэ:

— Пачакайце! Я хачу з вамі... разам!

Ніхто ёй не забараніў, і яны выпілі разам. Анатоль задаволена адзначыў, што не так ужо і страшна піць каньяк. Ён адразу хмеліць, а з хмелем жа прыходзіць смеласць, якой яму часам так не стае.

— Яшчэ! — пачуўся голас Іны.

Ён здзівіўся, убачыўшы ў дрыготкай яе руцэ парожнюю чарку. А вочы! Яны патухлі зусім. Яна глядзела на мачаху абыякава...

— Не-е, даражэнькая, табе ўжо даволі! — усміхнуўся Кручанюк. Мачаха была іншай думкі. Яна паднялася, каб уключыць радыё, і сказала на хаду:

— Не бойся! Яна ж дома...

Чаркі напаўняліся ўсё часцей. Усім стала весела. Нават паспрабавалі спяваць, заглушаючы радыё. І раптам Іна паклала галаву на рукі, заплакала. Анатоль разгубіўся зусім, не ведаў, што і рабіць.

— Ну, вось... Я казаў, што больш не трэба ёй піць. Можа, выклікаць хуткую дапамогу?

— Нічога ёй не трэба! Псіхоз... Няхай ідзе спаць,— адрэзала мачаха.

Удваіх з Анатолем яны завялі Іну ў спальны пакой і паклалі проста ў сукенцы на пуховую коўдру. Самі вярнуліся ў гасціную.

— Ну, вось... Цяпер мы пагутарым! — пачаў Анатоль, сядаючы да стала.

— Аб чым жа? М-м?..— Каця зноў наліла чаркі, насмешліва глянула на яго прыжмураным позіркам чорных вачэй. Ён разгублена ўсміхнуўся і падняўся з-за стала.

— Аб нашым вяселлі...

— Я ж замужняя! Ха-ха-ха! — залілася гучным смехам Каця.— Аб нашым вяселлі!..

«Вось я паслухаю, як ты з ёю пагаворыш!» — раптам ачуняўшы, падумала Іна, але ўстаць не магла. Галаву быццам хто трымаў моцнымі рукамі.

Спачатку Анатоль выхваляўся сваімі заробкамі, а потым мачаха доўга і нудна гаварыла пра сваё нецікавае жыццё «замужняй удавы». Іна чула ўжо такія споведзі не раз...

Грымела музыка, у паўзах дзынкалі чаркі. І раптам усё сціхла: Іна заснула...

9

Усю ноч Ганя праспала на крэсле, побач з ложкам брата. Сон быў трывожны: Змітрок часта варочаўся і стагнаў. Тады яна ўсхоплівалася і падавала вады.

— К чорту... Усіх к чорту! — скрыгочучы зубамі, гаварыў Асташонак і зноў засынаў...

Наступіла раніца, ціхая, празрыстая. Праз адчыненае акно ў пакой хваля за хваляй уліваласяхаладнаватае паветра. Яно пахла лесам і хлебам. «Гэта прывезлі свежы хлеб і згружаюць у магазін па сасноваму латку. Значыць, пара ўставаць»,— падумала Ганя і хуценька саскочыла з ложка. Якраз у гэты момант зазваніў на стале будзільнік. Ганя падышла да брата і спынілася. Змітрок спаў глыбокім і спакойным сном.

— Дзіма...— ціха паклікала яна. Ён зварухнуўся.— Дзіма, уставай на працу,— сказала гучней.

Змітрок незадаволена расплюшчыў вочы, узяўся за лоб рукою.

— Не даеш паспаць! — гыркнуў ён і павярнуўся на другі бок.

Ганя ўздыхнула і адышлася. «Мусіць, моцна захварэў»,— вырашыла яна. Згатавала на кухні чай, зноў зайшла ў пакой, падышла да ложка і прыклала руку да братавай галавы. У той жа міг Змітрок спалохана падхапіўся і сеў на ложку.

— Ой, што гэта? Дзе я? — Туманнымі вачамі ён глядзеў па столь, па сцены.— Дома... Такі паганы быў сон, проста жах...

— Ты не хворы? — узрадавалася Ганя.— Тады — хутчэй збірайся, спознішся! Учора, здаецца, недзе падгуляў...

Змітрок глянуў на будзільнік. Было ўжо каля васьмі гадзін.

— Ч-шорт! Казюлька, чарвяк! — вылаяўся ён, хутка апранаючыся.— Загарні, Ганя, што-небудзь перакусіць з сабой! Хуценька...

Праз які момант ён ужо быў на вуліцы. Не ішоў, а бег, жуючы на хаду тоўсты бутэрброд. «Першая і апошняя мая выпіўка... Сорам! Каб ведала мама... Сорам!» — дакараў сябе Асташонак, хаваючы вочы ад людзей, быццам яны маглі здагадацца аб яго ўчарашнім непрыстойным учынку.

А на заводзе рабочы дзень ужо быў у разгары. Гулі станкі, грукалі на рэйках ваганеткі, зыркала з гартавальных печаў ярка-зялёнае полымя. Скрозь завіхаліся людзі, і нікому, здавалася, не было спраў да нейкага там вучня, які спазніўся і бег на завод, праклінаючы сваё маладушша.

Без пятнаццаці дзевяць.

— Не прыйдзе,— вырашыў Азарчук, імкнучыся абвінавaціць ва ўсім станок. Учарашняя сустрэча з Асташонкам не выходзіла ў яго з галавы. Не, не так ён зрабіў, як думаў. Думаў памагчы ўладкаваць яго адносіны з Інай, хацеў замірыцца са Змітраком, пасябраваць, а выйшла наадварот. Навошта ён быў грубы з Інай? Якая яму справа да чужых густаў? Ёй падабаецца больш Анатоль. Можа, яму ўдасца выкіраваць дзяўчыну на правільны шлях. А ён, Іван, дрэнны настаўнік. Хіба не з-за яго ўчора Змітрок трапіў у рэстаран з падазронымі асобамі? Аб гэтым ён даведаўся сёння ля прахадной...

Калі ў апусцелую прахадную ўскочыў, ледзь пераводзячы дух, расчырванелы і ўспацелы Змітрок, дзяжурны вахцёр з дакорам паглядзеў на яго, паківаў галавою.

— Добрай раніцы! — прывітаўся Асташонак. І раптам аж збялеў: ён не знайшоў у кішэні пропуска.

— Выспаўся! Ужо амаль паўдня, а ў яго яшчэ раніца! — засмяяўся вахцёр, хітра жмурачы вочы.

— Крыху прыхварэў,— растлумачыў прычыну спазнення Змітрок і, прадаўжаючы мацаць свае кішэні, нарэшце вінавата сазнаўся: — Нават пропуск забыўся дома...

— А ты б яшчэ гадзінкі дзве паспаў, і хваробу як ру-

кой зняло б! — падміргнуў яму вахцёр.— Пропуск твой, хлопча, не дома...

— А дзе? — хутка спытаў Асташонак, адчуваючы новую бяду.

— Вось ён, твой пропуск,— паказаў яму дзяжурны чырвоную кніжачку.— З рэстарана афіцыянтка прынесла. Наламаў ты, казала, там дроў, абражаў яе, крыўдзіў...

«Вось яно што! Ужо тут усё вядома... Што ж цяпер рабіць?» — падумаў Змітрок, апусціўшы галаву.

— Бяры! І бяжы ў цэх...— неяк злосна прамовіў вахцёр, усунуўшы Асташонку ў рукі пропуск.

Толькі Змітрок ступіў на заводскі двор, як тварам у твар сустрэўся з Галяй Ждан. На вялікай дошцы паказчыкаў яна рабіла нейкія запісы, але згледзела хлопца, хоць ён і імкнуўся праскочыць непрыкметна.

— Можна на хвілінку, таварыш медаліст? — спыніла яго Ждан і перагарадзіла дарогу. На яе сур'ёзным твары быў смутак.

Змітраку стала шкада гэтую невысокую чарнабровую дзяўчыну, якой, як яму здавалася, не месца тут, на заводзе, хоць складзена яна была, як гаварыў Іван, нібы з граніту: пругкія ногі, высокія грудзі, дужыя, хоць і малыя, рукі...

— Слухаю,— ціха прамовіў Асташонак, чакаючы добрай праборкі.

— Сёння, здаецца, сустракаемся першы раз. Добры дзень...

— Дзень добры,— вінавата адказаў Змітрок.— Я не заўважыў, прабачце...

— Чаму вы спазніліся на працу?

У Галіным голасе адчувалася нейкая крыўда і злосць. «Хітрыць,— вырашыў Змітрок.— Прыкідваецца, мусіць, што нічога не ведае». І ён адказаў шчыра:

— Гэта, думаю, вас не ўзрадуе... Я быў п'яны. Выпіў, значыць, залішне, ну і праспаў.

— Жартуеце?

— Кажу праўду.

— Тым горш для вас...

— А што, лепш хлусіць? Калі ласка... Балела сярэдзіна. Ну, сярэдзіну можна, нарэшце, замяніць галавой, пячонкай, страўнікам... Але справа не ў гэтым. Як камсорг цэха, вы павінны былі б спытаць у мяне — чаму гэта я сноўдаю па заводзе без усякай патрэбы?

— Гэта на ваш погляд? — спытала Галя.

— Трэба мець і свой погляд! — з'едліва заўважыў Асташонак, якому ўжо абрыдлі гэтыя пытанні. Ды і хто яна такая, гэтая кнопка, каб весці допыт? Камсорг? Але ж ён не браўся тут на ўлік, бо яшчэ невядома, ці атрымаецца з яго што-небудзь людскае...

Галя не ведала, што адказаць. Яна толькі змерала хлопца сваім строгім позіркам і, крута павярнуўшыся, адышлася зноў да дошкі паказчыкаў. Змітрок паволі накіраваўся да варот свайго цэха, зноў папракаючы сябе ў душы за круты нораў...

Іван працаваў сёння без асаблівага энтузіязму.

— Замест таго каб выправіць брыво, ты вока сапсаваў,— сустрэў ён жартам Змітрака.— Думаў, што зусім раззлаваўся і не прыйдзеш...

— Зусім?..— Асташонак, не вітаючыся, спыніўся воддаль і ўважліва паглядзеў на Івана.— Гэта, бадай, было б лепш. Але яшчэ не ўсё страчана, пакуль пабуду...

— Ідзі сюды бліжэй, Дзімка. Ты ўсё неяк не так разумееш. Даведаешся — сорамна будзе. От паглядзіш...

«Мне ўжо было і ёсць сорамна»,— падумаў Змітрок, падаючы на рабочы стол неапрацаваныя дэталі.

«Што ўчора было з братам?» — думала ў гэты час Галя, застаўшыся адна дома. Пасля бяссоннай і трывожнай ночы яна ніяк не магла пачаць свае практыкаванні на скрыпцы. Нуднымі здаваліся ёй гукі, бессэнсоўнымі — ноты.

І толькі яна зайграла нарэшце па-сапраўднаму, як дзверы адчыніліся і ў пакой забег расчырванелы, узрушаны Алік.

— Схавай мяне! — крыкнуў ён, падбегшы да сястры.— У нас доктар робіць уколы, а я збег...

— Уцякаць ад уколаў не трэба, Алічак, а то можаш захварэць,— адказала Ганя.— Ідзі назад і будзь самы смелы!

— Дык жа баліць, як колюць,— жаласліва цягнуў Алік.— Я не хачу ўколаў...

Ганя паклала скрыпку, каб угаварыць брата:

— Ты мне ўсю душу выцягваеш!

— Схавай мяне-е...

— Ты ж бачыш, што я займаюся.

— Я не хачу ўколаў!

— Дык уцякай... А мне няма часу з табой у хованкі гуляць. Калі будзеш перашкаджаць і не пойдзеш у сад, я скажу Дзімку,— і яна зноў узялася за скрыпку.

Бачачы, што нічога не выходзіць, Алік некалькі хвілін сачыў за сястрою, як тая іграла, а потым ціха, на пальчыках, выйшаў на двор.

Упэўніўшыся, што за ім ніхто не сочыць, Алік пагнаўся за вялікім рудым катом на вуліцу. Там ён спрабаваў схапіць ката за хвост, але той лоўка вырваўся і кінуўся праз вуліцу. Хлапчук не адставаў...

Гэта здарылася якраз у абедзенны перапынак, калі Галя Ждан, выйшаўшы з тралейбуса, пераходзіла вуліцу недалёка ад таго месца, дзе Алік, расставіўшы рукі, бег, як здалося ёй, проста пад машыну. Галя ўскрыкнула, кінулася да хлопчыка і выхапіла яго ледзь не з-пад самага кола магутнага МАЗа. Машына, гучна скрыгануўшы тармазамі, спынілася. Дзверцы адчыніліся, і з іх высунулася калматая галава шафёра, які хацеў ужо вылаяцца, але, убачыўшы перапалоханы твар маладзіцы, адразу памякчэў.

— Грамадзяначка! — грымнуў гучны, але лагодны бас.— Сваіх дзяцей трэба вадзіць за руку і не заглядацца на бландзінаў і розных там шатэнаў!

Ждан сярдзіта глянула на гэтага медзведзяватага шатэна, але нічога яму не адказала і павяла Аліка на тратуар.

— Як цябе завуць? — спытала яна.

— Алік.

— А дзе ж ты жывеш?

— Ву-унь там,— паказаў Алік на адчыненае акно, з якога даносіліся гукі скрыпкі.

— Ага, ясна,— сказала Галя, злуючыся яшчэ больш.— Там весяляцца, а дзеці няхай гінуць...

Калі яны ўвайшлі ў адчынены пакой Асташонкавай кватэры, Галя на момант спынілася і, прыкрыўшы Аліку, які нешта хацеў сказаць, рот рукою, заслухалася. Ганя ж, захапіўшыся музыкай, нічога не чула і не бачыла. І толькі калі скончыла, пачула ў пакоі чужы голас:

— Дзе вашы бацькі?

Яна ўздрыгнула і, нічога пакуль не разумеючы, ціха адказала:

— Няма...

— На працы?

— Не. Яны памерлі.

— Ах-х...— Галя ўзяла Аліка на рукі і прытуліла да грудзей.— Ён вось ледзь не трапіў пад машыну... А старэйшыя хто ёсць?

— Брат. На заводзе.

— На якім?

— Не ведаю, ён нам не гаварыў.

— Я скажу! Я скажу! — заматляў нагамі Алік, вырваўся з Галіных рук і падбег да акна.— Ву-унь там...

— У тым баку два заводы, Алічак,— сказала Галя і, глянуўшы на гадзіннік, спытала: — А сваякі ў вас ёсць?

Дзяўчынка адмоўна паківала галавою.

Галя здагадалася, што ў гэтай кватэры зусім нядаўна здарылася вялікае гора.

— Як цябе завуць? — спытала яна.

— Ганя, а што?

— Ты так хораша іграеш! Можа, яшчэ што-небудзь выканаеш?

І Ганя зайграла зноў.

Ждан прысела на крэсла і слухала яе, успамінаючы сваё дзяцінства. Прыкладна ў такім узросце, як Ганя, і яна засталася без бацькоў, доўгі час жыла ў дзіцячым доме, пакуль не пайшла на завод...

Ужо даўно скончыўся абедзенны перапынак, а Галя, забыўшыся, што ёй трэба было зайсці ў райком і наспець вярнуцца да званка на работу, усё слухала цудоўную ігру дзяўчынкі. Алік, прымасціўшыся ў Галі на каленях, заснуў, мусіць, ад моцнага перапуду.

У пакоі былі чутны толькі гукі скрыпкі ды ціхае цікание гадзінніка...

## 10

Іна ўвесь дзень не знаходзіла сабе месца. Яна бралася чытаць, але не чыталася. Спрабавала заняцца хатнімі справамі — усё валілася з рук. Тады яна выйшла ў сад, села пад яблыняй на разасланую коўдру і аддалася марам. Успомніла ўчарашні дзень. Як ён пачаўся? Спрэчкай з мачахай з-за сукенкі, якую Іна незнарок спаліла прасам... Намер у Іны быў добры — памагчы маці. Хіба ж яна вінавата, што пазваніў Анатоль? Думала — хто іншы, адкажа, і ўсё. Ды загаварылася... А потым — вечар... Лепш не ўспамінаць...

Яна прачнулася раніцаю і асцярожна адхінула парцьеры ў спальным пакоі мачахі. Адразу супакоілася: Каця

салодка спала, раскінуўшы на падушцы поўныя рукі. «Значыць, Анатоль не астаўся начаваць,— вырашыла тады Іна.— Трэба як мага хутчэй канчаць, а то гэтая думае, што я так сабе... Артур паляцеў, яго не вернеш. Трэба трымацца за гэтага, глядзець...»

Потым устала мачаха. Яна была надзвычай вясёлая і ўвесь дзень хваліла жаніха. У Іны з'явілася сумненне. Сумненне, а не рэўнасць. «Адкуль будзе рэўнасць, калі не было сапраўднага кахання?» Так думалася ёй. Але яна цвёрда вырашыла «канчаць з вяселлем».

Дачакаўшыся вечара, Іна апранулася і пайшла да Анатоля на кватэру. Яе сустрэла маці.

— Ах, гэта ты? Заходзь, заходзь, даражэнькая! — хітравата ўсміхаючыся, жанчына макам рассыпалася перад сваёй нявесткай.— Ах, свавольніца! Я не спала аж да раніцы. Што толькі не прыдумвала: і, можа, ён дзе пад машыну, не дай бог, трапіў, і, можа, якія бандыты на яго напалі... А ён, галубок, з'яўляецца такі вясёлы, такі шчаслівы! Адпачні, хутка ён зойдзе...

«Вось як! Анатоль прыйшоў пад ранне... Цікава, дзе ён да раніцы мог быць?» — старалася здагадацца Іна. Калі Анатоль нарэшце прыйшоў, яна забылася на сваё падазрэнне і пачала настойваць на тым, каб заўтра пайсці ў загс...

Коўшык дамаглася свайго: праз тыдзень згулялі вяселле, і Анатоль забраў Іну да сябе. Бацьку яна напісала адразу пасля вяселля: «Мой дарагі татачка! Чаму ты не прыляцеў, атрымаўшы маю тэлеграму? Я нарэшце паслухалася мудрай парады маці і выйшла замуж... Муж малады і знатны...» І далей усё, што яна лічыла патрэбным паведаміць пра Анатоля свайму роднаму бацьку, які «не мог нават прыляцець», бо атрымаў позна тэлеграму.

Ён — больш таго! — пакрыўдзіўся і адказаў таксама тэлеграмай: «Гэтак не запрашаюць бацьку на вяселле. Ён — не ракета!» Яна ж не ведала, у чым вінаватая, і ў пісьме імкнулася апраўдаць сваю паспешлівасць.

«Вось я і замужняя... Замужняя!» — думала Іна, ідучы па праспекце адна. Ёй па-ранейшаму хацелася гуляць адной.

Вечар быў ціхі, цёплы. Сонца вісела на небасхіле, нібы затрыманае краем чорнай хмары. Ад ліп пёсся прыемны водар маладой кветкі: сёлета яны зацвілі раней тэрміну.

Іне раптам стала весела. Вось яна гарэзліва прайшлася пальцамі па валасах прыгожага кучаравага хлопчыка, які стаяў каля магазіна. Той здзіўлена і падазрона паглядзеў услед жартаўлівай жанчыне і раптам пазнаў яе. Некалькі разоў Змітрок вяртаўся са школы з Інай. Але яна ніколі не прыносіла пачастунку, як Галя...

— А цётка Галя лепшая за цябе! — крыкнуў Алік.

Іна спынілася. Штосьці знаёмае было ў гэтым дзіцячым голасе. «Дзе я бачыла яго? — успаміпала Іна, паволі ідучы назад, да хлопчыка.— Ды гэта ж... Алік!»

— Падыдзі сюды, Алічак,— лагодна паклікала яна.

— Не пайду,— надзьмуўся той.— Ганя загадала, каб я тут стаяў і нікуды не ішоў. А Іван сказаў, што ты благая...

— Чаму ж благая?

— Благая, і ўсё.. Як дворнікава Мальва...

Чырванню пакрыўся набелены твар Іны. Яна крута павярнулася і пайшла далей. Пайшла так, быццам услед ёй лінулі варам. Не прыкмеціла, як апынулася каля будынка паштамта. «Зайду, можа, што ёсць».

Прайшоўшы ў залу, Іна спынілася каля акенца, дзе выдаваліся пісьмы да запатрабавання, і няўпэўнена падала пашпарт, свой дзявочы пашпарт. Ёй пашанцавала. Дзяўчына падала пісьмо. Яно было з Крыма, ад Артура. Іна не спяшаючыся падышла да століка, разарвала канверт і прачытала:

«Мілая Інэса! Толькі тут, далёка ад цябе, я зразумеў, якую вялікую зрабіў памылку, што паехаў адзін. Я зразумеў, як цяжка жыць без чалавека, які ўжо даўно і моцна авалодаў і сэрцам, і думкамі, і кожнай хвілінай майго жыцця...»

— Прыязджай... Прыязджай,— ціха паўтарала Іна апошняе слова пісьма.— Чаго гэта так дрыжаць рукі? — яна прыціснула пісьмо да грудзей і ў асалодзе заплюшчыла вочы. «Толькі яго я кахаю па-сапраўднаму... Прыеду, Артур... Мы абавязкова зноў сустрэнемся ў Зосі. Добрай таўстухі Зосі... Ой, што я сабе думаю! Навошта ехаць, калі ўжо я — жонка другога? Як дворнікава Мальва...» — прыгадаліся ёй раптам і Алікавы словы. Яна паклала пісьмо ў сумачку, але тут жа дастала яго і парвала на дробныя кавалачкі.

Калі Іна вярнулася з пошты, Анатоль з мацi займаўся абсталяваннем свайго пакоя. Яна спынілася на парозе і сумнымі вачыма паглядзела на гэтую сямейную ідылію. Не, не такога шчасця жадала яе шырокая натура...

— Твая прыйшла, паможа,— чамусьці вельмі суха прамовіла свякруха і пайшла за дзверы.

Анатоль, каб згладзіць няёмкасць, кінуўся да Іны, узяў з яе рук сумачку і летняе паліто, пацалаваў у руку.

— Аднак ты сапраўдны кавалер,— нехаця ўсміхнулася яна.

— Я муж твой. Гэта куды больш, чым кавалер!— сур'ёзна зазначыў Анатоль, дапытліва пазіраючы на Іну.— А ведаеш што? Вось тут мы павесім тваю самую любімую карціну. Я зараз схаджу...

— Карціну прынясу я сама,— перапыніла яго Іна.

Анатоль зразумеў яе.

— Не давяраеш? — страсянуў ён вялізным чубам.

— Мужчынам давярай ды правярай,— прыжмурылася на яго жонка.— Можа, скажаш, што ў цябе і на заводзе нікога не было?

Анатоль раззлаваўся:

— Я ж не пытаюся, дарагая, які ў цябе я — пяты ці дзесяты? Важны сам факт. Цяпер песня, як гаворыцца, спета, і мы павінны жыць адно для аднаго...

— А-а, не любіш успамінаць мінулае?

— Я надаю мала значэння мінуламу... Нават тваймў, дарагая, пасля ўсяго, што адбылося між намі...

— Ах, так! Ты намякаеш вельмі ясна...

— Калі гэта можна назваць толькі намёкам...

— Я пайду дамоў! Што ён гаворыць... Я пайду-у...

Іна кінулася на ложак і, закрыўшы твар рукамі, пачала ўсхліпваць. Сорам і злосць на момант нібы аглушылі яе, хоць да гэтага яна была даўно гатова. А потым, калі ўсё ўляглося, яна ў думках паўтарыла сама сябе: «Я люблю толькі Артура... Толькі яго...» І ляжала так, пакрыўджаная, гатовая адпомсціць свайму крыўдзіцелю пры першым жа выпадку...

Анатоль ужо шкадаваў, што залішне пагарачыўся. Ён стаяў сярод пакоя і не ведаў, як суцешыць жонку. Нарэшце падышоў і ўзяў за плечы.

— Ну, прабач... Усё гэта глупства, Іна, я гавару абы-што, бо дужа кахаю цябе і баюся страціць. Мне чамусьці здаецца, што ўсё гэта сон і не сёння, дык заўтра я цябе страчу.

— Тады хутчэй бяры свае словы назад!

— Бяру, бяру,— згадзіўся ён радасна.— Хочаш, паедзем адгэтуль. Я вазьму адпачынак, і мы наладзім сапраўднае вясельнае падарожжа!

Іна ўпутрана ажывілася, і, не адымаючы ад вачэй рук, праз шчыліны між пальцаў зірнула на Анатоля.

— Куды паедзем?

— Абы-куды. Мне дырэктар абяцаў даць адпачынак. У мяне ёсць грошы. Паедзем!

Іна села, папраўіла валасы і падумала: «Пачакай жа, даражэнькі, успомню я табе і пятага і дзесятага...» А сказала з крыўдай у голасе:

— Цяпер вельмі добра на поўдні. Ты ведаеш, што ў Крыме жыве мая цётка? Дык вось цётка Зося запрашае да сябе. Там цудоўна — сонца, мора...

— Едзем у Крым! Абы далей адгэтуль.

Анатоль рэзкім рухам закінуў яе галаву і моцна пацалаваў у вільготныя вусны, у зусім сухія, толькі пацёртыя да чырвані, вочы...

11

Неяк раз, седзячы ў заводскай сталовай і чакаючы, пакуль прынясуць абед, Галя Ждан думала: «Якая дружная сям'я! А без бацькоў — адны дзеці». Ёй прыгадаўся чорнавалосы кучаравы Алік, сціплая задумлівая Ганя, яе чароўная музыка,— і ўсё гэта здалося дзіўным добрым сном. Яна закрыла твар рукамі і аддалася ўспамінам. «Які ён, іх старэйшы брат? Колькі яму год — дваццаць, трыццаць? Чаму ён не знойдзе гаспадыню сабе ў дом, каб даглядала дзяцей?»

— Грамадзяначка, вагон далей не ідзе,— пачула яна голас Івана і расплюшчыла вочы.

— Ой, напалохаў, хай цябе! — махнула рукою Галя.— Заўсёды ён са сваімі жартамі...

— Па начах трэба менш гуляць,— з сур'ёзным выразам твару заўважыў Азарчук.— Абед заказала?

— Толькі сабе і Змітраку! — з'едліва сказала яна.— Чаму не прывёў яго?

— А-ат,— зморшчыўся Іван.— Між намі прабегла чорная кошка. Што, не верыш? Ужо былі памірыліся, ды сёння зноў пасправаліся.

— Чаго ж?

— З-за цябе... Цэлы дзень толькі і глядзіць у твой бок. А якое ён мае права?

— Калі ты ўжо кінеш свае недарэчныя жарты?

Ён адказаў пытаннем:

— Чаму не заказала мне абеду?

— Не заказала, і ўсё! Ці ж я абавязана?

Галя не хацела пакрыўдзіць Івана, але так атрымалася.

— Асташонку ты ўсё ж заказала! — папракнуў ён Галю.

— Мне трэба з ім пагутарыць.

— А са мною не жадаеш? Я для цябе нішто, дым ад папяросы, дзірка ад барашка... А я жывы чалавек, Галя... Жывы! — стукнуў ён сабе кулаком у грудзі.

— Без драматычнай дэкламацыі я магу сёння паабедаць?

— Можаш... І наогул... Больш ніколі ні слова ты ад мяне не пачуеш. Сэрца маё, не стучы, каханне маё, замаўчы!

— Так будзе лепш для нас абаіх, бо каханне па рабоце — шкодны занятак...

Іван засмяяўся. Але каб яна ведала, які гэта быў смех!

«Не, ніколі ў жыцці, відаць, я не буду для яе не кім іншым, як проста добрым таварышам»,— падумаў Азарчук, праклінаючы сваю нясмеласць.

Амаль тое ж думала і Галя.

«Аб каханні не гавораць жартам... Не першы раз ён так, а сур'ёзна — ніколі... Не любіць ён, проста лічыць добрым таварышам, з якім можна і пагуляць у каханне. Ох, як гэта крыўдна!» Яе доўгія вейкі апусціліся на вочы.

— Я ніяк не магу зразумець яго,— зноў пачала пра Змітрака.— Хлопец, здаецца, і разумны, але нейкі дзівакаваты...

— У кожнага чалавека сваё гора,— уздыхаючы, адказаў Іван.— У Асташонка памерлі бацькі — ёсць ад чаго стаць, як ты кажаш, дзівакаватым.

Галя адразу ўзняла галаву і ціха спытала:

— Праўда? Учора я выпадкова трапіла ў адну такую ж сям'ю. Уяўляеш, хлопец страціў бацькоў і застаўся з малымі: сястрою і братам.

У гэты момант афіцыянтка прынесла абед. Азарчук памог паставіць на стол талеркі. Адну паставіў каля Галі, другую — насупраць парожняга крэсла.

— Ну і што ж гэты хлопец? — спытаў ён, калі афіцыянтка адышлася.

Ждан зірнула на гадзіннік, падсунула талерку Івану і адказала:

— І гэты хлопец працуе на заводзе, корміць усю сям'ю!

— Цікава,— вымавіў Іван, беручыся за яду.— Як гэта ўсё падобна!

— Да чаго?

— Да сапраўднасці,— загадкава адказаў Азарчук.

Неўзабаве афіцыянтка прынесла на сподачку плітку шакаладу «Шчаслівае дзяцінства».

— О! Каму гэта? — пацікавіўся хлопец.

— Аліку,— адказала Галя.— Майму новаму знаёмаму.

— Аліку?

— Так, а што?

— Можа, і Гані?

— І Гані... Ты іх ведаеш?

Іван паклаў на стол лыжку і задумаўся.

— Значыць, ты была ў Асташонка на кватэры,— прамовіў ён, пільна гледзячы на дзяўчыну.

— У Дзімкі? — неяк спалохана спытала Галя і ўстала з месца.— Няўжо ў яго? Ганя іграла на скрыпцы, Алік спаў у мяне на руках...

Яна ўзяла плітку шакаладу і шпарка выйшла са сталоўкі, недаканчыўшы абеду...

У час абедзеннага перапынку Змітрок застаўся ў цэху адзін. Ён хутка з'еў свой «сухі» полудзень і падышоў да станка. У яго раптам узнікла адважная думка. «Толькі не трэба спяшацца, не забыць пра парадак уключэння»,— успомніў ён кадр з кінафільма, у якім паказвалася, як адна дзяўчына гэтак жа, як і ён цяпер, наважылася ў час перапынку даказаць, што яна ўжо добры майстар, і ўрэшце паламала станок...

Поўны рашучасці, ён ачысціў супарт ад стружкі, уключыў рубільнік. Ціха загуў матор. І гэты гул выклікаў на твары ўсмешку. «Паглядзі! — гаварыў нехта ўнутры.— Не толькі чысціць станок можа Дзімка Асташонак... Ён не дзяўчына, як здаецца табе, шаноўны мой настаўнік».

Змітрок замацаваў загатоўку і падаў асцярожна разец. Усё ў парадку. Змітрок дакладна паўтарае рухі Азарчука. Кучаравіцца і крышыцца з-пад разца стружка, дэталь справа становіцца танчэйшая. Як усё проста і лёгка!..

Асташонак спыніў станок, зняў яшчэ гарачую дэталь і паклаў побач з гатовымі, вытачанымі Іванам. Паклаў і... спахмурнеў: яна была толькі падобна да іншых па форме, але ж не такая. Няроўная — дзе танней, а дзе таўсцей...

Не паспеў Змітрок схаваць свой выраб, як нечая рука, працягнутая з-за яго плячэй, узяла дэталь і панесла ўгару.

Асташонак здрыгануўся і ступіў крок убок, павярнуўся назад. Перад ім стаяла Галя Ждан...

— Зноў — вы? — міжволі вырвалася з пабялелых вуснаў Асташонка.

— Я... А вы незадаволены? Дык, можа, сваёй працай больш задаволены? — спытала яна строга.

Ад хваляваиня і крыўды ў Змітрака нешта сперла ў горле. Прайшло некалькі секунд, пакуль ён сабраўся з сілай.

— Што як цень за мной ходзіце?! — ускліккуў ён у роспачы.— Што вам трэба ад мяне?

— У мяне ёсць да вас справа! — цвёрда сказала дзяўчына.— А ў вас проста няма ні вытрымкі, ні... павагі да нашага цэха, да людзей. Сюды ідуць... Маўчыце і не падавайце выгляду, што ў вас няўдача. Ды схавайце дзенебудзь гэты брак!

Асташонак хуценька паклаў дэталь у кішэнь камбінезона.

«У кватэры ў іх парадак, чысціня,— думала між тым Галя.— А вось верхні гузік у кашулі вырваны. Каўнер не адпрасаваны. Ганя ўсё ж яшчэ малая, каб быць за гаспадыняю ў такой сям'і...»

У цэх заходзілі рабочыя пасля абеду. Змітрок засунуў руку ў кішэнь і да болю сціснуў яшчэ цёплую дэталь, нібы імкнуўся раструшчыць яе ў парашок. У душы ён дзякаваў Галі і стаяў, вінавата апусціўшы галаву. Нібы ў сваё апраўданне, гаварыў ціха, каб не чулі астатнія:

— Я не магу кожны дзень збіраць адно стружкі ды чысціць станок. Я прыйшоў сюды, каб стаць майстрам! Дзеля гэтага ахвяраваў усім...

— Ах-вя-раваў? — глянуўшы ва ўпор на Змітрака, спытала Галя.— Ну, ведаеш... Я крыху сумняваюся нават у тым, што з цябе калі-небудзь атрымаецца сапраўдны майстар! Думаеш, быць рабочым — проста? — адразу перайшоўшы на «ты», загаварыла Ждан.— Дык ведай, што не проста і не лёгка.

Асташонку стала сорамна. «Яна гаворыць праўду... Ці здолею я навучыцца працаваць так, як яна?» — падумаў хлопец. Але гонар не дазволіў яму прызнацца ў гэтым Галі. Перад ёю Змітрок застанецца самім сабой! Ён — пакрыўджаны, ён — ахвяра, ён — што хочаце, толькі не невук. Мусіць, лепш за ўсё трэба адразу пакінуць завод...

— І не патрэбен мне ваш рабочы! — у запале прамовіў Змітрок.— Вось вазьму і не прыйду заўтра...

Галя зразумела, што цяпер трэба хлопцу пабыць аднаму, абдумаць свой учынак, і яна, пацiснуўшы плячамі, пайшла. Нават не звярнула ўвагу на апошнія словы Асташонка.

Так-сяк адбыўшы змену, Змітрок сумны выйшаў з заводскіх варот.

На двары было горача і парна. Нагрэты, як пліта, асфальт высыхаў следам за палівальнымі машынамі, якія, нібы вялізныя сінія жукі са срэбнымі вусамі пырскаў, поўзалі па вуліцы ўзад-уперад. І ў небе ўжо хмарылася. Здалёк даносіліся грымоты...

«Нарэшце будзе дождж»,— падумаў Асташонак і неяк спакайней, лягчэй стала яму. Вось ён перасек плошчу і апынуўся па бязлюднай, ціхай вуліцы. Як ён сюды трапіў? Няўжо ногі самі прывялі да знаёмага белага асабняка з ружовым франтонам? Раней ён сюды хадзіў да Іны, і кожны раз, як падыходзіў, замірала сэрца. А цяпер нічога такога не адчуў, сэрца білася спакойна. Значыць, апынуўся ён тут выпадкова. «Гэта добра... Мінула тое, што я калісьці, зусім пядаўна, хацеў вырваць за адзін вечар». Прыгадалася толькі адна размова з Інай. Неяк яна спытала: «Дык ты нікуды не паступаеш?» — «Не. А ты?» — «А я што... Замуж пайду!»

«І вось пайшла за Анатоля Кручанюка... Хто б мог падумаць, што яны так хутка знюхаюцца? — думаў Змітрок, пазіраючы скоса на знаёмы асабняк.— Дзе яны цяпер, цікава?»

— Дзіма, а-ау-у! Дзе гэта ты прападаеш?

Ён і не прыкмеціў, як з-за куста бэзу выйшла Каця — Іціна мачаха.

— Дзень добры вам,— падышоўшы да форткі, прывітаўся Асташонак.— Працую, заняты. Як вы жывяце?

— Ах, маё жыццё! Асталася вось адна з глухой старою. Зусім адзічэла.

— А дзе ж ваша дачушка?

Каця звонка засмяялася і прыжмурылася на Змітрака.

— Не забыўся яшчэ? А яе схапіў смялейшы за цябе!

— І не папярхнуўся такім кавалачкам? — усміхнуўся ў сваю чаргу Асташонак.

— Ого! Такі хлопец...— наківала галавою Каця.— Канструктар, не абы-хто!

— Канструктар? — спытаў Змітрок і гучна засмяяўся.— Анатоль? Ды ён жа токар з нашага цэха!

— Жартуеш?

— Гэта вы жартуеце... Іна таксама ўсё жартавала! Я не ўпэўнен, што гэты раз яна не пачаставала сваім жартам і Кручанюка, бо такія жанчыны існуюць не для мужа і не для сямейнага шчасця...

Мачаха незадаволена фыркнула і пайшла ў дом. Змітрок ухмыльнуўся ёй услед і зноў вярнуўся да сваіх ранейшых думак: «Няўжо канец? Няўжо завод не для мяне? З кім параіцца, паспрачацца? Завод кінуць — значыць, загінуць, як Раман... Вось пайду да яго і пагавару... Шкада Рамана, бязвольны ён чалавек».

Асташонак дайшоў да праспекта і сеў у тралейбус. Жаданне самому пайсці да Рамана з'явілася не адразу. Пасля той памятнай ночы, калі яго перанялі трое, Змітрок не раз думаў аб тым, што так проста банда Гіры не адчэпіцца ад яго. Калі Раман дома, ён скажа ўсё...

Ля чатырохпавярховага дома, дзе жыў Раман, Асташонак доўга разважаў — заходзіць ці не. Потым парашыў усё ж зайсці.

Дзверы адчыніліся толькі пасля трэцяга званка. Паказаўся Раман. Яго хударлявы твар быў увесь у плямах-падцёках, тоўсты нос нібы яшчэ больш распух і пасінеў. Сіняк быў і пад левым вокам. «Раман будзе хімікам»,— успомніў Змітрок Ініны словы і ўсміхнуўся.

— Ты-ы?!

Убачыўшы Асташонка, Раман выйшаў на пляцоўку, імкліва зачыніўшы за сабою дзверы, і насцярожыўся.

— Бачыш — я,— адказаў Змітрок.

— Што здарылася, Дзімка?

— Нічога асаблівага... Проста пакінуў завод рабочаму класу...— схлусіў ён для пачатку.— А што здарылася з табой? Я ледзь пазнаў.

Раман зірнуў на дзверы і цяжка ўздыхнуў:

— А-а, лепш маўчы. Чаго прыйшоў?

— Ты, памятаю, абяцаў памагчы мне ў цяжкую хвіліну. Лічы, што яна настала.

Нечакана Раман пачаў ціха смяяцца.

— Што тут смешнага? — здзівіўся Змітрок.

— Сапраўды смешна! Толькі што бацька кіем пераконваў мяне паступіць на завод. Цябе ў прыклад ставіў!

— Мя-не?

— Ага, цябе... Кажа, наколькі я цяпер вызваліўся

ад вялікіх спраў і маю час заняцца тваім выхаваннем, дык...

— Ромул! — пачуўся з кватэры жаночы голас.

— Зараз! — адказаў Раман і ціха, скорагаворкай прадаўжаў да Змітрака: — Я не магу цяпер што-небудзь параіць, а Гіры бойся, абяцаў адпомсціць табе за скандал. Ён стаў вельмі папулярны ў нашым горадзе. Цікавяцца ім дружыннікі.

— Як жа табе ўдалося вызваліцца з рабства?

— Адпусцілі за выкуп... У бацькі былі залатыя рэчы. Цяпер іх няма. Чакаю... Яшчэ грымне новая бура! Ой-ё-ёй!..

І Раман, адразу зрабіўшы плаксівы выраз твару, паплёўся ў кватэру.

Змітрок якую хвіліну глядзеў яму ўслед, потым выйшаў на вуліцу. Там дастаў з кішэні сваю няўдалую дэталь, уважліва паглядзеў на яе і ціха, сам сабе, прамовіў:

— Ва ўсім вінавата ты, даражэнькая... Атрымалася б як належыць, дык не стаў бы я рабіць глупства і гаварыць, што заўтра не прыйду на завод...

Доўга блукаў ён па вуліцах, у парку, але нідзе не знаходзіў заспакаення. Толькі пасля васьмі гадзін вярнуўся дадому.

У пярэднім пакоі, асядлаўшы акулярамі нос, з кніжкаю ў руках, сядзеў ля стала сусед Забаўскі. З другога пакоя даносілася музыка: там, як заўсёды, займалася Ганя, і Змітрок з зайздрасцю падумаў пра сястру. Вось каб яму такая напорыстасць і вытрымка. Да любой мэты дайшоў бы.

Дзядзька Антось адразу падняў акуляры на лоб і моцна ляпнуў кніжкай па стале.

— Ну-с, малады чалавек... З'явіліся?

— Добры вечар, дзядзька Антось... Ганя! — гукнуў ён сястру.— Згатуй нам чайку!

— Не трэба! — запярэчыў стары, устаўшы.— Я ненадоўга. І не па сваёй ініцыятыве! Так-с, малады чалавек, мяне паслала грамадскасць!

Змітрок зразумеў і смела глянуў суседу ў вочы:

— Што мне рабіць?

— Перш за ўсё, паводзіць сябе не як школьнік, а як рабочы чалавек!

— Я не ведаю... Мне няма чаго на заводзе рабіць.

— Бач ты! А ў рэстаране табе ёсць занятак?

— Абяцаю вам... больш туды ні разу не зайду.

— Яго пусці хутчэй да станка, і ён вытачыць немаведама што,— нібы не чуючы абяцання Змітрака, са злосцю ўсклікнуў Забаўскі.— Вучыцца трэба!

Змітрок зразумеў, што старому ўсё вядома: і рэстаран, і няўдалая спроба вытачыць дэталь, і словы, якія ён сказаў Галі, што не прыйдзе заўтра на завод...

— Ждан несумленная дзяўчына, калі расказала ўсё вам...

— Мне нічога ніхто не гаварыў! — перапыніў яго сусед.— А што датычыць Галі Ждан, дык магу паведаміць, малады чалавек,— у яе куды больш сумлення, чым у цябе нахабства! Яна правільна кажа, што ты баішся цяжкасцей і шукаеш лёгкай дарогі да славы.

— Не цяжкасці палохаюць мяне, а бяздзейнасць! — запярэчыў Асташонак.— Кожны чалавек мае права патрабаваць працу па яго сіле і здольнасцях. Вы не пераканаеце мяне, што прыбіраць стружкі і чысціць станок гэта пачэсна, гераічна, самаадданa. Агульныя словы. Я не хачу быць проста рабочым...

Забаўскі выслухаў Змітрака ўважліва. Зноў сеў ля стала і доўга аб чымсьці думаў. Але па твары старога было відаць, што ў душы ён зусім не такі спакойны, як здаецца.

— Значыць, ты лічыш сябе не проста рабочым, а звышгеніяльным чалавекам, якому варта толькі захацець — і ён стане кім хочаш? Так, так...— стары ўважліва памераў Змітрака доўгім позіркам.— Скажы, малады чалавек, хто адбудаваў гэты горад, якім ты дарэчы і недарэчы хвалішся? Хто даў жыццё гэтым каменням? Рабочыя! Гэтую століь, пад якой ты жывеш, стол, за якім ясі, вопратку, якую носіш, хто табе даў? Звычайны рабочы... За гэтыя сцены з прыгожым накатам, за хараство вуліц перад кім ты павінен скідаць шапку? Перад рабочым, простым рабочым, як ты гаворыш... А хіба ж прастата горш за пустату таго чалавека, хто нічога не стварыў для грамадства? Пусты пакуль яшчэ і ты, зялёнка! — не ў сілах больш стрымаць сябе, закончыў дзядзька Антось і выйшаў з пакоя.

## 12

Мякка пагойдваецца вагон. Нават не чуваць грукату колаў на стыках рэек. У адным купэ, абапёршыся локцямі па столік, моўчкі ўзіраецца праз акно ў адкрыты стэп Кручанюк. Аб чым ён думае? Аб родным горадзе, заводзе,

сябрах? О, не! Анатоль думае аб тым, што жыццё яго, нарэшце, стала, як гэты цягнік, на моцныя рэйкі... Апошні рубеж сталасці пройдзен, выпрабаванне на трываласць сям'і зроблена. Мінулі хвіліны спрэчак і непаладак. Іна стала паслухмянай жонкай. Шчасцю, здавалася, не будзе канца...

— Ты ўпэўнена, што цётка Зося не ўзяла ўжо каго-небудзь на кватэру? — спытаў Анатоль, сядаючы побач з жонкай. Апрача іх, у купэ было яшчэ трое пасажыраў: дзве жанчыны і невялічкі хлапчук, гадоў пяці.

Іна ціха, каб не чулі іншыя, адказала:

— Яна ніколі не трымае кватарантаў. І будзе вельмі рада, што мы завіталі да яе!

Пры гэтым яна пяшчотна зірнула на Анатоля. Ён любіў такі яе ўважлівы позірк. Ад яго цяплела на душы, усё навокал станавілася прыгажэйшым, больш радасным, чым звычайна. «Кахае... Яна мяне кахае»,— спявала самалюбівая душа Кручанюка. У такія хвіліны яму здавалася, што Іна нікога і не кахала да яго, што падазрэнне і ранейшыя папрокі — памылка, якую хутчэй трэба забыць...

У дынаміку штосьці шчоўкнула, зашыпела і хрыплы голас дыктара абвясціў, што цягнік прыбывае на станцыю Сімферопаль.

Яны заспяшаліся, выйшлі з вагона. А праз дзве гадзіны ўжо ехалі ў Ялту...

У гэтых мясцінах Анатоль быў упершыню, і таму вачэй не зводзіў з цудоўных пейзажаў старой горнай дарогі. Яго здзіўлялі яркія фарбы тутэйшых кветак, іх велічыня, цёмнае зяленіва лісця.

Вечарэла, калі яны нарэшце селі ў запыленае таксі.

— Усходняя, дзесяць,— сказала Іна шафёру.

Яны ехалі па цудоўных вуліцах і праспектах курортнага горада, па квяцістых дарогах прыгарада, пакуль не вырваліся на адкрыты прастор.

Домік з мезанінам, куды яны пад'ехалі, стаяў наводшыбе, кіламетраў за пяць ад горада, у прыгожым садзе. Белыя аканіцы і ярка-чырвоны чарапічны дах, веранда і чысценькія, пасыпаныя жоўтым пяском сцяжынкі між сапраўднага гушчару баярышніку і вінаграднай лазы — усё сведчыла аб руплівасці гаспадыні дома.

Калі развіталіся з шафёрам таксі і адчынілі сінюю, пад колер мора, фортку ў сад, Зося ў светлай сукенцы, якую яна надзявала ў асабліва ўрачыстыя хвіліны, ужо

бегла гасцям насустрач, і ўсё трэслася ў яе ладнай камплекцыі...

— А божухна!.. Каго гэта я зараз абдыму ў сваім садзе? Іначка, дзіцятка ты маё... Вось дачакалася радасці!

Як Іна і гаварыла, сустрэча была вельмі радасная для ўсіх.

Расцалаваўшы Іну, Зося падала Анатолю пульхную гарачую руку і сарамліва апусціла свае хітрыя, дапытлівыя вочы.

— Мой муж Анатоль,— сказала Іна, зразумеўшы жанчыну па-свойму.

Зося яшчэ больш заружавелася і сказала:

— Вельмі і вельмі прыемна... Рада. Зося...

Анатоль сумеўся і падумаў: «Зося... Не дзяўчына ж ты, даражэнькая, а, можна сказаць, маці мне... Па бацьку б сказала як».

— Добры дзень, Зося... м-мм...— пачаў ён.— Як вас...

— Проста — Зося,— засмяялася таўстуха, махнуўшы кароткай аголенай рукою, і павяла гасцей па адной з дарожак у свой казачны домік.— Вось тут будзеце чай піць,— гаварыла на хаду яна, паказваючы на беленькі столік і два крэслы, што стаялі пад нізкім галіністым дрэвам.— А тут будзеце адпачываць ад спякоты. Можна прымаць паветраныя ванны — хі-хі — у касцюме Адама, ніхто не патрывожыць. У мяне пірыфірыя...

«Нішто сабе «пірыфірыя», цэлая сяліба! Колькі, цікава, яна здзярэ з нас за гэтую «пірыфірыю»?»— думаў Кручанюк, цягнучы ўслед за жанчынамі два вялізныя чамаданы.

Яны спыніліся каля сплеценых кустоў вінаградніку, які ўтварыў нешта накшталт жывога будана.

— Як тут цудоўна! — у захапленні ўсклікнуў Кручанюк.— І ўсё гэта, Іна, дзякуючы табе. Сам бы я, напэўна, не хутка пазнаў прыгажосць такога райскага кутка на зямлі!

— А сад аж ву-унь куды цягнецца,— паказала гаспадыня.— Усё мая работа, мае мазалі...

Анатоль усміхнуўся, успомніўшы мяккі поціск яе гарачай рукі, быццам ён пацiснуў аладку проста з патэльні. Над такім жа садам працы шмат, і працы штодзённай...

Жанчыны селі каля веранды на лаўку. Анатоль паставіў чамаданы і пайшоў аглядаць сад.

Калі ён адышоўся далёка, Зося таямніча гаварыла Іне:

— Быў у мяне Артур... Сумаваў па табе, спадзяваўся,

што прыедзеш, як летась, на месяц. І вось — радасць ты яму прывезла! Мужа...

— Не магла я больш, цётачка,— засмучона прамовіла Іна.— Дваццаць адзін год мне... Без усякіх спраў, без месца...

— Хіба гэты лепшы за Артура? Хто ён — прафесар які, вучоны?

— Пакуль што ён на добрай пасадзе,— ухілілася ад тлумачэння Іна.

— Артур прыгожы, дужы хлопец, а ты яму такое зрабіла, хоць не паказвайся цяпер на вочы! — папракнула яе Зося.— За што?

Іна сарвала, нахіліўшыся, рамонак і пачала сашчыкваць белыя пялёсткі.

— За што?.. Артура я любіла, вы ведаеце,— у задуменні сказала яна.— І люблю, можа, мацней за ўсё на свеце, а ён... Ён проста глуміўся над маімі пачуццямі! — Іна сарвала апошні пялёстак і ў злосці кінула кветку на зямлю.— О, я ведаю, што ён рады будзе мяне сустрэць зноў, быць са мною, запэўняць, што прыгажэйшай за мяне няма нікога, але ж... Каму патрэбны яго хлуслівыя словы? Наш век — практычны век, адным каханнем і абяцанкамі жыць не цікава і сыты не будзеш... А так, за прыгожыя словы, растрачваць маладосць і здароўе...

— Ты ж была з ім вельмі строгая, помню,— уставіла гаспадыня, паківаўшы галавой.

— Пасля таго мінуў год... Прайшла і строгасць. Я сама куды больш вінавата, чым Артур, бо залішне давярала яму, была самаўпэўненай. А ён нацешыўся і ўцёк сюды, як той злодзей!..

— Няпраўда! — запярэчыла Зося.— Артур і цяпер даражыць табой...

— Цяпер яго каханне мне не патрэбна: я — замужняя...

— Дык ты яму патрэбна...

— Ведаю! Ён проста будзе рады выпадку лішні раз папракнуць, што не чакала, хоць патрэбна я яму не на доўгі час, самі ведаеце...

Жанчыны, разумеючы адна адну, пераглянуліся і разам засмяяліся.

— Хочаш убачыць?

— Ой, цётачка, дазнаецца Толя! Ён дужа раўнівы,— Іна паківала на Зосю пальцам, але вочы яе ўжо свяціліся знаёмым гарэзлівым агеньчыкам. Разважлівасць і стро-

гасць, гэтыя часовыя госці, пакінулі свой выпадковы прытулак, як падарожныя пакідаюць начлежны дом...

— А мы твайго адправім у «камандзіроўку», і ўбачыш Артура,— адказала па гэта гаспадыня.

Іна ўстала і, зірнуўшы на дарожку, па якой ішоў да іх Анатоль, прамовіла:

— Ён згарыць ад злосці, калі дазнаецца...

Зося не ведала, хто згарыць ад злосці, але яна цвёрда памятала, што гэтая «аперацыя» прынясе ёй сякія-такія выгады.

— Ой, каго гэта я сёння замарыла голадам! — ускліннула яна і падхапілася з месца.

Падышоў Анатоль і прымацаваў да белай кофтачкі Іны ружовую кветку.

— Вы быццам у ваду глядзелі! — сказаў ён гаспадыні.— У мяне ўсярэдзіне так бурчыць, нібы я двух галодных сабак праглынуў...

Зося дробненька засмяялася, і яны ўсе ўтраіх рушылі на веранду.

## 13

Аб тым, што Змітрок наведаў рэстаран, ведалі амаль усе ў цэху. Сябры яго занепакоіліся. Вось чаму Іван пасля работы сабраў некалькі чалавек і доўга раіўся з імі. Яму сказалі, каб неадкладна зайшоў да Арцёма Белага, пакуль справа не пайшла далей.

І вось Азарчук спыніўся ля дзвярэй, на якіх вісела шыльда з надпісам: «Камітэт ЛКСМБ завода». Пастукаў і, крыху адчыніўшы дзверы, спытаў:

— Можна?

— Калі ласка! — пачулася ў адказ.

Іван зайшоў. У невялікім пакоі, насупраць дзвярэй, стаяў пісьмовы стол, два крэслы і ў куце — тумбачка з графінам вады. Злева на сцяне вісела рэпрадукцыя вядомай карціны «Ленін выступае на Трэцім з'ездзе камсамола». Вось і ўсё, што ўбачыў Іван у кабінеце свайго сакратара.

Арцём, сагнуўшыся ў дугу, штосьці шукаў па падлозе пад сталом, і толькі спіна яго ледзь узвышалася над раскладзенымі на стале кнігамі.

— Няма, ліха яго бяры! — падняўся Арцём.— Такое пяро было! Згубіў...

Нешта дзіцячае было ў яго дробным твары, хоць вымахаў хлопец ростам ледзь не ў два метры.

— Дзень добры, Арцём Ігнатавіч! — прывітаўся Азарчук і, нахіліўшыся, падняў з другога боку стала новенькае пяро ад аўтаручкі.— Вось тваё пяро.

— Бач ты, куды заляцела! — усклікнуў Арцём.— Давай яго, цяпер-то ўжо не згублю... Дык садзіся — чаканаму госцю лепшае месца. Гавары! Не для таго ж ты сюды заглянуў, каб дапамагчы мне шукаць пяро!

Абедзвюма рукамі Арцём паціснуў Іванаву руку, рэзкім рухам галавы ўскінуў свае доўгія чорныя валасы і энергічна сеў за стол. Азарчук падставіў другое крэсла да стала і прымайстраваўся побач.

— Дык вось,— пачаў ён.— Я наконт свайго вучня.

— Ведаю.

— Мне здаецца, што Асташонак адаб'ецца ад рук, калі мы будзем, як гэта павялося, адзін раз на тыдзень даваць усім навічкам порцыю тэорыі, а потым толькі паказваць работу станка... Чалавек ён хоць і таленавіты, але не вытрымае такога вучнёўскага стажу...

— Не разумею,— развёў рукамі Арцём.— Таленавіты, а не вытрымае стажу. Як гэта можа быць? Можа, дрэнна вучыш яго?

Грукнуўшы некалькі разоў у дзверы, якія адразу ж адчыніліся, у пакой увайшла Галя. Убачыўшы Івана, яна ўзрадавалася.

— І настаўнік тут? Вельмі добра! — сказала Галя і катэгарычна патрабавала ад Арцёма: — Трэба яго паводзіны абмеркаваць на агульным сходзе!

— Чые паводзіны, Азарчука? — спытаў Арцём, падсоўваючы Галі сваё крэсла.— Садзіся і выпі спачатку вадзіцы. Астынь...

— Вядома, Змітрака,— незадаволена прамовіла Ждан.— Ён — грубы, цягаецца з невядомымі па рэстаранах...

— І трэба «катэгарычна патрабаваць», каб свой прыход на прадпрыемства ён не лічыў ахвяраваннем? — усміхаючыся, спытаў Белы.

— А што? Чаго ты смяешся? — зусім пакрыўдзілася дзяўчына.

— Я пакуль што проста ўсміхаюся,— спакойна адказаў Арцём і звярнуўся да Івана: — Прапанова Ждан — вынесці пытанне паводзін Асташонка на агульны сход. Як ты думаеш, яна мае падставы для гэтага?

Іван цвёрда адказаў:

— У Змітрака характар наравісты, сілай не возьмеш.

— О! Чуеш? — звярнуўся Арцём да Галі.— Сілаї яго не возьмеш. А чаму? Вельмі проста. Ты патрабуеш сабраць амаль увесь завод і хорам чытаць мараль, пагражаць адміністрацыйна, патрабаваць, каб Асташонак схіліў сваю гарачую галаву перад усімі і сказаў: «Прабачце, я больш не буду...»

— А як жа? Для чаго ж тады камсамольская арганізацыя? — гарачылася Ждан.

— Для таго, каб у такіх вось выпадках папярэджваць хваробу, а не абвастраць яе! — ужо сур'ёзна зазначыў Арцём.

Галя паціснула плячамі, загаварыла зноў узрушана:

— Значыць, будзем прасіць яго: «Ах, паважаны Змітрачок, ты памыліўся, не рабі таго, не рабі гэтага, вось табе цукерачка!» А ён ужо не маленькі! Ён — гаспадар у хаце, карміцель дваіх дзяцей...

— Вось з гэтага табе трэба было і пачынаць,— паказаў на яе пальцам Іван.— У Змітрака цяжкае, складанае становішча. Ты ведаеш, што ў школе разам з ім вучылася нейкая Іна, вельмі прыгожая асоба... З гэтай Інай Змітрок быў звязаны ўсёй душою. Ва ўсякім выпадку, да таго, як яна раптоўна стала жонкаю нашага героя Кручанюка. Гэта таксама трэба ўлічыць, таварыш Галя...

«Для чаго ён мне ўсё гэта гаворыць? Каб ведала, што сэрца Змітрака ўжо належала адной? Эх, Іван, Іван... Які ты наіўны хлопец! Наіўны і сляпы... Я проста шкадую Асташонка, шкадую яго брацікa і сястрычку, а цябе кахаю, Ваня...» — думала Галя, апусціўшы вочы.

— Дык якой ты думкі аб сваім вучні? Што прапануеш? — спытаў Белы, весела пазіраючы на Івана.

Іван жа, заўважыўшы, што Галя раптам засумавала, палічыў прычынай гэтага сваю залішнюю балбатню. «Значыць, ёй непрыемна, што ў Асташонка быў раман... Ён, бясспрэчна, падабаецца ёй больш, інакш, не хадзіла б туды»,— думаў хлопец, збіраючыся з адказам на Арцёмава пытанне. Адчуваючы падтрымку сакратара і той сяброўскі тон, якім Арцём так падкупіў Івана, ён шчыра прызнаўся:

— Асташонак не з тых людзей, якія лёгка ад усяго адмаўляюцца. Ён наш, увесь наш! Мы павінны толькі памагчы яму разабрацца ў жыцці. А ў першую чаргу — даць самастойнасць, праэкзаменаваць. Я падрыхтую яго за некалькі дзён...

— Правільна! — падтрымаў яго Арцём.— На Змітрака

трэба ўздзейнічаць не адміністрацыйна, а толькі па-сяброўску. І давай паспрабуем выпусціць яго экстэрнам...

— Вось пра гэта я і прыйшоў да цябе параіцца! А што ён недзе быў з кімсьці ў рэстаране, дык... больш туды не пойдзе, калі будзе з намі! — ажывіўся Іван і падышоў да Галі.— Бачыш, без сходу вырашылі...

— І вырашылі правільна,— уставіў Арцём.

Яна паднялася, хацела нешта адказаць Івану, але раздумала і, развітаўшыся з Арцёмам, пайшла за дзверы...

У душы яна згадзілася з рашэннем, але голас сумнення гаварыў ёй і другое: а яна прыйшла на гэты завод не такой жа маладой і нявопытнай работніцай? Але Галя тады адразу ўзялася за справу сур'ёзна і настойліва. І не лічыла гэта ахвяраваннем і ні ў каго не прасіла скідкі на сваю маладосць. Праз вялікую працу, не раз хаваючы ад сяброў зморанасць і слёзы, прыйшла Ждан да цікавай сваёй прафесіі. Дык чаму ж яму, здароваму хлопцу, трэба расчышчаць дарогу, каб лёгка было авалодваць таямніцамі майстэрства? І тут жа пярэчыла сама сабе: каб зменшыць удар лёсу, трэба ўзяць частку Асташонкавых клопатаў і раскласці на ўсіх...

Змітрок нават і не думаў, што аб ім, яго лёсе, нехта дбае, хвалюецца. Чакаў, што выклічуць, пачнуць папракаць за наведванне рэстарана, за згублены пропуск, а тут мінуў дзень і ніхто ні слова. «Каго гэта цікавіць, хоць захлыніся ў гарэлцы»,— з крыўдай на некага, хто не вылаяў яго, падумалася хлопцу.

Доўга не спалася Змітраку ў гэтую ноч. Пакой, асветлены праз вокны вулічнымі ліхтарамі, здаваўся яму нейкім чужым, незнаёмым. Толькі на сцяне цьмяна вырысоўваюцца партрэты бацькоў. Змітраку цяжка глянуць на іх, бо ён ведае цяпер, пасля ўсяго, што здарылася, позіркі са сцяны будуць асуджальныя...

«Яны працавалі ўсё жыццё. З гэтага жылі, тым ганарыліся. А я? Чым магу ганарыцца?»

Асташонак варочаўся з боку на бок і ўсё дарэмна: заснуць ніяк не мог.

Ганя асцярожна падняла галаву, паглядзела на яго ложак. Яна адчувала, што ў брата здарылася нейкая непрыемнасць, але папытаць не адважвалася. Ведала — усё пераадолее яе мужны брат. «Трэба толькі, каб не адчуваў ён адзіноты»,— вырашыла яна ў думках.

Зміток прыўзняўся, сеў на ложку і цяжка ўздыхнуў.

— Што, Дзіма, галава баліць? — спытала нарэшце Ганя.

— Балела... Прайшло ўжо,— адказаў ён. Ускінуў на плечы пінжак, устаў.

— Куды ты? — захвалявалася Ганя.

— Нікуды, спі...

Змітрок выйшаў на балкон і, не зачыніўшы дзвярэй, абапёрся на агароджу, прыслухаўся да начных гукаў.

Горад спаў. Толькі заводскі раён дыхаў жыццём. Над ім вялізным арэолам ззяла ў цемені святло, маланкамі ўспыхвалі агні электразварак, у прасторы раз-пораз раздаваўся кліч гудка. І з другога боку, ад вакзала, на гэты кліч адгукаўся паравоз.

— Працуюць. Людзі працуюць...— ціха прамовіў Змітрок, сціскаючы скроні далонямі.

І раптам да яго данёсся глухі голас суседкі, жонкі дзядзькі Антося. Іх спальня была побач, за адчыненымі дзвярамі балкона.

— Чаму не спіш, Антосік? — пытала жанчына.

— Душна,— адказаў стары.

Праз момант зноў пачуўся голас жонкі:

— Заўсёды так... Пакрыўдзіш каго-небудзь, пасварышся, а потым сам пакутуеш! Як дзіця...

— Сказаў — душна! — відаць, раззлаваўся стары.

Змітраку стала сорамна: гэта з-за яго хвалюецца дзядзька Антось, з-за яго не спіць. А яму ж заўтра з васьмі станавіцца каля палаючага горна і кіраваць молатам! Стаяў, сцішыўшыся, і ў душы прасіў прабачэння за свае глупствы, да якіх, як яму здавалася, апрача самога, нікому няма спраў. Гэта ж ён, сусед, рэкамендаваў Змітрака на завод, ён гутарыў з начальствам, і яму, напэўна, цяпер сорамна за такога вучня...

Гэтыя думкі з'явіліся ўпершыню. Яны прымусілі ўспомніць і паводзіны Івана, Галі... «Усім за мяне сорамна»,— Змітрок да болю прыкусіў верхнюю губу...

— Адчапіся, я ўжо сплю! — пачуў ён голас дзядзькі Антося, і ў гэтую хвіліну гадзіннік адзваніў тры разы.

Пачынала днець. Унізе прапаўзлі палівальныя машыны, а Змітрок усё стаяў на балконе. І толькі калі гадзіннік прабіў чатыры, ён папраўіў на плячах пінжак і вярнуўся ў пакой.

«Калі б былі папяросы...» — падумаў хлопец, не ведаючы нават смаку гэтых папярос.

Павесіў пінжак у шафу, лёг у пасцель. Успомніў Рамана, яго выгляд і падумаў, што кій для такога гультая, як Раман, бадай, самае лепшае лякарства. Ён жа «ехаў» з класа ў клас на адных троечках, як і Іна... Іна... Смешна цяпер Змітраку, што ён тры гады жыў марамі аб ёй, вучыўся лепш за ўсіх толькі дзеля яе, а яна аказалася для яго бутафорыяй...

«Галя — вось хто сапраўдны чалавек і... друг. Яна не «строіць» вочкі, а глядзіць на цябе шчыра...»

Будзільнік зазваніў, як звычайна, у сем гадзін, а Змітраку здалося, што ён толькі-толькі заснуў. Устаў і пераціучы ўзяўся за вопратку. Потым лёг зноў. Яму захацелася паляжаць яшчэ хвілінку. Пачуў, як апраналася Галя.

Вось яна падышла да яго ложка:

— Уставай, Дзіма...

— Га?.. Што? — салодка пацягваючыся, быццам ён толькі прачнуўся, спытаў Змітрок.

— Час ужо на працу.

— Добра, ведаю. Лажыся...

— Спознішся ж! — незадаволена адказала сястра.

Змітрок рашуча падняўся з ложка і пачаў апранацца, каб ісці на працу.

Але чым бліжэй падыходзіў ён да заводскіх варот, тым рашучасць станавілася меншай і слабейшай. Навошта ён сказаў Галі, што не прыйдзе сёння на завод! Калі б каму іншаму — дарма, а вось як насмяецца з яго Галя...

Каля прахадной было ажыўлена. Заходзілі і выходзілі грузавікі, ішлі на працу і з працы людзі. Змітрок спыніўся, потым падышоў да латка, дзе прадаваліся папяросы. Пакапаўшыся ў кішэні, дастаў дзесяць рублёў.

— Дайце пачак папярос,— сказаў ён, працягваючы грошы.

— Якія жадаеце? — спытаў прадавец.

— Любыя,— махнуў рукою Асташонак, задуменна пазіраючы на прахадную.

Прадавец паціснуў плячамі і недаверліва прыжмурыўся на яго. Потым узяў самыя дарагія папяросы, сказаў:

— Калі ласка.

Змітрок, нават не зірнуўшы на пачак, моўчкі паклаў яго ў кішэню і пайшоў.

— Малады чалавек! — паклікаў яго прадавец.— Вы ж хоць рэшту вазьміце.

Асташонак вярнуўся, узяў грошы і, не палічыўшы іх,

паклаў у кішэню. Прадавец падазрона паглядзеў яму ўслед.

— Ці закаханы, ці вар'ят, ці з грамадскага кантролю! — з выглядам знаўцы, сказаў ён новаму пакупніку.

Стаўшы з боку ад прахадной, Змітрок закурыў. З непрывычкі адразу ж закружылася галава, запудзіла. Зацягнуўся. Ад кашлю на вочы набеглі слёзы.

— Вось, значыць, дзе вы! — пачуў ён знаёмы дзявочы голас і падумаў, што здалося. Павярнуўся — аж не, не здань, а жывая, вясёлая дзяўчына стаяла каля яго і шчасліва ўсміхалася. Усюды яго знойдзе гэтая Ждан! Інстынктыўна схаваў папяросу і, як вучань, прамовіў:

— Добры дзень...

— Добры дзень! А я, ведаеш, толькі сёння задумалася над тваімі ўчарашнімі словамі і занепакоілася. Няўжо ты мог гэткае зрабіць: не пайсці на завод, падвесці Івана, калектыў?

Змітраку стала шкада яе — не хапала яшчэ, каб дзяўчына турбавалася з-за яго неразумных паводзін і слоў! Але верны сваіму бунтарскаму характару, абыякава адказаў:

— Мне няма каго падводзіць...

— Няпраўда! У цябе ўжо ёсць мы, і ты павінен паважаць нас, давяраць нам...

Як лёгка Ждан перайшла на «ты»! Нават Змітрок не заўважыў гэтага спярша, а потым і сам адказаў:

— Ты лічыш, што я ўжо сярод вас «свой чалавек»?

— Завод прызнае чалавека «сваім» толькі тады, калі ён, той чалавек, не згінаецца ад першых няўдач, а становіцца яшчэ больш напорыстым.

Змітрок пачырванеў, бо Галя выказала і яго думкі.

— Ды я не працы баюся,— пачаў згладжваць ён рэзкасць тону, але Ждан перапыніла яго.

— Калі ў цябе няма сілы волі, каб прымусіць сябе дайсці як мага хутчэй да мэты, дык падумаў бы хоць аб дзецях...

Асташонак рэзка ўзняў галаву:

— А-аа, дык гэта ты за мной шпіёніш?

— Зноў няпраўда! Я трапіла ў вашу кватэру выпадкова. Алік ледзь не папаў пад машыну, ну і прыйшлося перапалоханага яго аднесці дамоў...

Змітрок аб гэтым не ведаў. Відаць, Ганя не хацела нагаварваць на брата.

— Вось што... Дзякую... Значыць, у мяне няма сілы? — з пагардлівай усмешкай спытаў хлопец. Вядома, крыўдна было яму слухаць такое ад дзяўчыны, якая нават крыху падабаецца яму сваім напорыстым характарам і прастатой.

— Мы лічылі цябе сапраўдным мужчынам, а ты... — з лагоднымі ноткамі ў голасе, папракнула яго Ждан.— Звязаўся з нейкай мамчынай дачушкай і глядзіш на свет яе вачамі! Скажыце, калі ласка,— развяла яна рукі,— не збыліся надзеі, загінулі мары...

Змітрок пануры ўся. Ён ведаў, што пра Іну ёй расказаў Іван. Але не тое, што дзяўчына ведае аб яго інтымных справах з Інай, непакоіла яго. Ён адчуў у душы нейкую рэўнасць да Азарчука, які знаходзіць час гаварыць з Галяй пра ўсё, нават пра такія справы, якія датычаць толькі яго, Змітрака...

— Ах, табе і гэта вядома? — здзіўлена прамовіў ён.— Што ж, у такім выпадку мне нічога не застаецца, як прасіць ва ўсіх вас прабачэння за свае памылкі маладосці...

Асташонак зняў перад Галяй шапку і шпарка пайшоў у прахадную, сціскаючы ў руцэ недакураную папяросу.

Галя ледзь спраўлялася за ім. «Не ўмею я з такімі працаваць... Мусіць, нагаварыла шмат лішняга, як дзяўчынка,— незадаволеная размовай, падумала яна і тут жа супакоіла сябе: — Але ж працаваць іменна з такімі карысна і цікава. Сам навучышся многаму...»

## 14

Адпачыўшы і набраўшыся сіл, Анатоль упершыню ў сваім жыцці выйшаў да мора. Яно адчувалася здалёк. Надвор'е стаяла ціхае, але мора глуха шумела. Кручанюку прыгадалася вялізная марская ракавіна, што з незапамятных часоў стаяла ў іх каля люстэрка на этажэрцы. Не раз ён, будучы яшчэ малым хлапчуком, браў тую ракавіну, прыкладаў яе да вуха і такім чынам «слухаў далёкае мора». Цяпер яно, магутнае, неабдымнае, каціла свае неўгамонныя хвалі да самых яго ног...

Вось і бераг, пакаты, пустэльны. Як прыгожа глядзець на бяскрайнюю сінь, на шкляныя глыбы хваль, якія адна за адною набягалі на светлы пясок, усеяны рознакаляровымі ракавінкамі, выкінутымі на бераг. Велічнае мора! Яно, здавалася, было нібы жывое, уздыхала магутнымі сваімі грудзьмі, і кожны ўздых узносіў высока но-

вые хвалі і каціў, каціў іх бясконца па пустэльны бераг...

Як тут хораша!

Кручанюк распрануўся. Расставіўшы рукі, ён бег насустрач хвалям,— і вось ужо ледзь віднеецца яго галава на іх грэбнях, гойдаецца, як паплавок...

Іна, у акулярах ад сонца і ружовым купальніку, хадзіла па беразе і збірала ракавінкі. «Сёння ў дзве гадзіны ля газетнага кіёска, што ў канцы вуліцы, будзе Артур... Прыйдзе на спатканне са мною, хоць усё ведае. Што мне яму сказаць, як апраўдацца?» — думала яна.

Анатоль, па калені ў вадзе, падбег да яе.

— Як здорава, Іна! Лезь сюды...

— Ты шчаслівы са мною? — спытала яна, пазіраючы на мужа чорнымі шкельцамі акуляраў.

— Яшчэ як! Гэты месяц пакіне ва ўспамінах след на ўсё жыццё!

Каб ведаў Анатоль, што гэта так і будзе, што след той цяжкай ранай ляжа на сэрца, то ніколі б ён не згадзіўся ехаць да мора і любавацца яго прыгажосцю.

Кручанюк падхапіў Іну на рукі і панёс насустрач хвалі, што імчалася да берага. Іна смяялася, імкнучыся вырвацца з рук. І Анатоль, і хваля пацалавалі Іну разам. Яна фыркнула, сербанула гаркаватай вады і, вырваўшыся, пабегла на бераг. Гэта быў жарт, усяго толькі жарт. Але Анатоль зразумеў, што імена жарт памог Іне ўцячы і ад яго, і ад пацалункаў. Яна вырвалася не жартам, а моцна штурхнула рукамі ў грудзі. Смеючыся, але з нянавісцю ў вачах, якія — Іна гэта не ведала — заўсёды былі шчырыя.

Ён стаяў у вадзе і ўжо не адчуваў вады, не адчуваў таго прыліву пачуццяў, што хвіліну назад далі яму чароўная прырода і каханне. І мора, і сонца, і свежы ласкавы вецярок паступова трацілі сваю прыгажосць і чароўную сілу над ім.

«Жыць усё ж сумна... — міжволі думаў Анатоль, нарэшце вылазячы на бераг.— Ганяешся за сваім шчасцем, як за казачнай жар-птушкай. А яно засвеціць недзе на небасхіле і знікне. І няма яго. Ці па той дарозе я іду за сваім шчасцем? Ці не збіўся дзе? І якога шчасця прагне душа? Славы? Сваёй славы... Кахання? Толькі ўзаемнага... Дабрабыту? Здабытага сваімі рукамі... У мяне ж усё не тое, ненатуральнае нейкае, занадта лёгкае... Чужым жыццём жыву, вось і сумна...»

— Ідзём дадому... Так можна згарэць! — зірнуўшы на

гадзіннік, сказала Іна. Яе зусім не цікавіла змена ў настроі мужа.

Анатоль моўчкі падпарадкаваўся ёй. У душы пакрыўджаны, знешне спакойны, ён упершыню задумаўся над сваім становішчам чалавека і грамадзяніна. Цяпер ён, як ніколі дагэтуль, яскрава ўбачыў сябе і сваю ролю «галавы сям'і», якую ён згубіў яшчэ тады, на лодцы, калі Іна лёгкай птушкай перамахнула ад Змітрака да яго, а ён змоўчаў, горды сваёй перамогай, што здабыў яе сабе на ўсё жыццё...

«Божа — на ўсё жыццё! — думаў Анатоль, употай пазіраючы на Іну, твар якой быў раўнадушна-спакойны, бесклапотны, замкнёны.— Усё жыццё з сумненнем... з няўпэўненасцю... Гэта было б занадта жорстка для мяне нават за подласць, якую я зрабіў у дачыненні да таварыша...»

— Купіў бы хоць газету калі! Можа, ужо ўслед за касмічным караблём паслалі новы — на Месяц, з людзьмі, а мы і не ведаем нават! — зусім сур'ёзна сказала Іна, калі яны выйшлі на дарогу, што вяла ў горад.

— А дзе іх тут купіш... У горад ехаць, ці што? — адказаў ён непрыязна.

Іна нахмурыла лоб, нібы нешта ўспамінаючы, і няўпэўнена зазначыла:

— Мне здаецца, на Усходняй недзе быў кіёск.

Усходняя вуліца цягнулася на цэлы дзесятак кіламетраў між пышных асабнякоў накшталт Зосінага. Тут, апрача газетных кіёскаў, сустракаліся і «закусачныя», каля якіх заўсёды было людна.

Яны ішлі крыху воддаль адно ад аднаго, як чужыя.

Яшчэ здалёк Іна пазнала Артура, яе першае каханне, яе мару і цяперашнюю цьмяную надзею. Ён стаяў побач з газетным кіёскам, у светла-шэрым касцюме, з папяросай у зубах, франт-франтам. Усё такі ж кучаравы, высокі, статны. Толькі валасы пабялелі ад сонца яшчэ больш.

— Іна! — заўважыў яе Артур і кінуўся насустрач.— Вось нечаканасць! Ты тут?..

«Вар'ят, што ён робіць!» — падумала з жахам Іна і, стаўшы бліжэй да Анатоля, зрабіла абыякавы выраз твару.

— Як бачыце, тут,— усміхнулася яна.

— Ну тады — добры дзень, таварыш Коўшык...

— Архаізм... Маё прозвішча — Кручанюк. Добры дзень... Знаёмцеся — мой муж,— і кіўнула галавою на Анатоля.

Мужчыны паціснулі адзін аднаму рукі, сустрэўшыся дапытлівымі позіркамі.

— Артур.

— Анатоль...

— Гэта мой знаёмы яшчэ з сёмага класа,— растлумачыла Іна.— Я з ім два гады сядзела разам... У вас, здаецца, разрад? Вас тады прынялі ў фізкультурны па разраду?

— Але,— сказаў Артур.— Што ж... Віншую вас, Іна, так сказаць, з законным... Прыемна так!

Артур зноў паціснуў руку Іне, а Анатоль у гэты час купляў газеты. За яго спіной, адчуваў ён, адбылася сустрэча не толькі старых знаёмых. Як ні трымалася Іна, а вочы яе выдалі. Адзінае, што заўсёды выдавала яе, гэта — вочы. Анатоль навучыўся іх разумець. У вачах увесь адбітак яе душэўнага стану, як у люстры: і радасць, і гора, і страх, і жаданне, і непавісць... Адны яны не ўмелі лгаць.

Цяпер яны гарэлі радасцю, жаданнем. Гарэлі, як некалі, вядома, гарэлі перад Змітраком, перад ім, Анатолем, і хто ведае яшчэ перад кім...

— Вы не жадаеце разам з намі папалуднаваць? — раптам павярнуўшыся, прапанаваў Анатоль.— У мяне тут ніводнага знаёмага, з кім бы можна было хоць выпіць чарку.

Ад нечаканага запрашэння Артур разгубіўся. Дастаў з кішэні прыгожую касцяную расчоску з выразной ручкай у выглядзе рыбінай галавы і, прычасаўшы валасы, сказаў:

— Ахвотна б... Але — справы. Я ж не адпачываю, а, так сказаць, на службе.

— Іна, папрасі ты,— сур'ёзна сказаў Анатоль.— Жанчын лепш слухаюцца.

— Ну, не ўпірайцеся, таварыш Блазнюк,— папрасіла Іна, не ведаючы сама — настойліва прасіць Артура, радавацца гэтаму выпадку ці не. Артур спачатку для выгляду адмаўляўся, але хутка даў згоду «забегчы на гадзінку-другую».

І вось яны ўтраіх падышлі да дома з мезанінам. Таўстуха Зося даўно чакала іх: на століку, які быў вынесен на веранду, ужо стаялі талерачкі і чаркі.

— Ой, каго гэта я зараз пачастую старым кахецінскім! — пахвалілася яна.— Прагаладаліся пябось ля мора? Ой, яно нагапяе апетыт!

Іна зірнула на стол, на гаспадыню і змяпілася ў твары: стол быў накрыты на чатырох! Зося ціха ойкнула, кашлянула і хуценька, мітусліва пачала «наводзіць парадак» на стале, пасля чаго адна чарка і талерачка зніклі. Хоць старая дзейнічала спрытна, як той фокуснік, аднак усё гэта не мінула Анатолевай увагі. Усё ж ён не падаў выгляду, а наадварот — пацягнуў Артура паказваць сад.

— Што вы нарабілі! — адразу накінулася на гаспадыню Іна.— Падрыхтаваць стол на чатырох, а сустрэчу зрабіць выпадковую. Артур мог і не прыйсці...

— Ого! Мала ты яго яшчэ ведаеш, даражэнькая. Мне ён сказаў, што пры любых абставінах будзе тут!

— Дык нельга ж выдаваць гэта.

— Здаецца, усё абышлося як трэба,— вінавата апраўдалася гаспадыня.

— А-а, толькі такі асёл, як мой Толя, не мог здагадацца, што ўся гэтая сустрэча падрыхтавана загадзя!

— Ну, вінавата, вінавата, прабач мне, старой,— усё апраўдвалася Зося, прыціскаючы рукі да грудзей.— Памяць у мяне стала нікуды не вартая.

Іна зірнула на яе грозна.

— Не прагаварыцеся ж толькі, што мы з Артурам былі ў вас летась... А вы — мая родная цётка па маці...

— Лепш будзе, калі не родная, а якая-небудзь трэцяя радня, га? — спытала Зося, хітравата жмурачы вочы.— Ой, памяць стала, бадай яе качкі...

Іна заўважыла гэтую хітрасць і паклала на стол пяцьдзесят рублёў.

— Цяпер, я думаю, не прагаворыцеся?

Зося лоўка, як драпежнік, скрабянула рукою па стале,— грошы зніклі.

— Навучы яшчэ! Я з Артурам не знаёма... Вось як трэба! Ну, а ты? — усміхнулася яна.— Сэрцайка ў парадку?

— Ой, цётачка! — Іна закрыла вочы і дадала: — Не бачыла яго, думала прайшло, забылася ўсё, а цяпер... Страціла я сваё шчасце навекі.

— Яшчэ, бог дасць, знойдзеш... у мяне тут. Дурніца!

Неўзабаве вярнуліся хлопцы. Яны ўжо добра пасябравалі, жартавалі, размаўлялі на «ты».

— Вы гатовы? А то мы хутка з голаду ногі выцягнем! — паглядаючы на стол, сказаў Анатоль. Іна пляснула далонямі і зрабіла кіслы выраз твару.

— Толя! Што за слоўцы! Хамства...

— Хамства — абражаць каго-небудзь, ашукваць і крывіць душою, а ўсё, што выказана шчыра, ад душы — добрая прастата! Ці не так, Артур? — ляпнуў Анатоль па спіне Артура.— Давай лепш сядзем за стол...

Зося прынесла назад чарку і сподачак, паставіла ўсё гэта насупраць Артура і прамовіла:

— Даруйце, на вас не разлічвалі... Э-э, выбачайце, як вас завуць? — і заружавелася ад гэтай хлусні, нібы дзяўчына.

— Проста — Ар-тур,— працягнуў ён Зосі руку.

І ў гэты момант рыпнула сіняя фортка. На дарожцы паказалася яшчэ адна пара: чарнявы невысокі хлопец у флоцкай форме, з гітарай на плячы, і даволі прывабная на выгляд, тоўсценькая і бледнатварая бландзінка гадоў пад трыццаць. Белыя, «модна» падстрыжаныя валасы лямцам абляпілі яе невялікую галаву з сімпатычным кірпатым носікам. Васільковая сукенка, пашытая з густам, падкрэслівала даволі стройную постаць.

— Вітанне райскаму кутку! — здалёк замахаў гітараю хлопец.— Каюта — люкс!.. Тут, Элен, не грэх і прышвартавацца!

Зося спярша разгубілася, а потым, бачачы, што гасцей прымаць усё ж прыйдзецца, распасцёрла рукі і падалася насустрач.

— Ой, каго гэта я зноў бачу на сваім парозе! — як звычайна, з найгранай радасцю і захапленнем, прамовіла яна і абняла жанчыну. Хлопцу падала для пацалунка толькі руку.— Праходзьце, тут усе, як кажуць, свае. Толькі сабраліся перакусіць...

Яна зноў пачала бегаць то ў хату, то на веранду. Між гэтай справай сумела ўсіх пераznаёміць. Мігам з'явіліся дзве новыя чаркі, два сподачкі і два плеценыя лёгкія крэслы.

Хлопца ў марской форме звалі Віктарам. Ён адразу стаў сваім чалавекам і залпам выпаліў некалькі «самых апошніх» анекдотаў пра тое, як маладая жонка ашуквае свайго мужа, і як ашуканы муж плаціць грошы любоўніку жонкі за «адрамантаваны тэлевізар» і яшчэ на падобныя тэмы.

Лена, бландзінка, саромелася такіх анекдотаў і ўсё апускала свае вадзяністыя, нібы шкляныя, вочы.

— Ах, навошта гэткія! — гаварыла яна тоненькім галаском Віктару, калі той пачынаў новы анекдот. Відаць было па ўсім, што яго «рэпертуар» ёй даўно вядомы.

Нарэшце стол быў пакрыты, усе размясціліся, і гаворка сціхла.

Зося наліла чаркі і сказала:

— Вып'ем, шаноўныя, за шчасце нашых маладажонаў! — і, спахмурнеўшы, дадала: — Калісьці і мы з Пятром вось так за сваё шчасце пілі. Забрала вайна...

Яна змахнула слязінку, села і моўчкі выпіла сваю чарку. Анатоль падумаў: «Пачала за здароўе, а скончыла за ўпакой... Не падабаецца мне гэты тост». Аднак віно яму спадабалася. Нават не закусіўшы, ён прапанаваў:

— А цяпер вып'ем за добрую памяць вашага Пятра. Каб ніколі больш вайны нікога не забіралі!

Гэты тост быў прыняты аднагалосна. Калі скончылася добрае кахецінскае, невядома адкуль з'явілася на стале празрыстая «сталічная», якую ўзяўся разліваць марак, загадзя смакуючы любыя тосты. Потым яму прыйшла ідэя крыкнуць «горка». Усе падхапілі гэтае слова. Анатоль, смеючыся, прыгарнуў Іну да сябе і сілком пацалаваў яе сціснутыя вусны.

Гэта была першая крупля атруты, якую ўліла Іна яму ў душу. Анатоль сцяў зубы, але стрымаўся. Павярнуўся тварам да бландзінкі, што сядзела побач з ім, і, быццам нічога не здарылася, ціха, па-змоўніцку, спытаў:

— Як адпачываеце? Не сумна тут?..

— Ой, што вы, наадварот!

— Мужу-то, мусіць, сумна там... дома...

Кручанюк дапытліва зірнуў суседцы ў вочы, і яны здаліся без ваганняў, хуценька зірнулі на падлогу.

Паступова Анатоль пачаў здагадвацца, што кампанія гэтая не выпадкова збіраецца тут, што, наогул, асабняк Зосі нездарма прыцягвае ўвагу легкадумных «зязюль» і норсткіх марачкоў. Ён выпіў сваю чарку і ўстаў з-за стала, каб пакурыць, а сам зводдаль стаў назіраць за жонкай. Так, яна была шчаслівая ў гэтай кампаніі! Артур вельмі асцярожны, але часам прарвецца і ў яго слоўца, па якім можна здагадацца, што не першы раз ён тут...

«Ці не з гэтага кола выкацілася і Іна?» — з жахам падумаў Анатоль, адчуваючы, як разрасталася ў грудзях тая крупля атруты. Энергічна падышоўшы да стала, ён крута спытаў у Артура:

— Ты заўсёды адзін?

Той разгубіўся ад такога нечаканага пытання.

— Як сказаць... Я люблю кампанію,— ухіліўся ад прамога адказу Артур, назіраючы кудысьці міма Анатоля.

Зося заўважыла, што гэтая размова тут зусім лішняя, і хуценька наліла чаркі. Іна падміргнула ёй і кіўнула ў знак згоды галавою. «Правільна дзейнічаеш, старая!» — быццам гаварылі яе іскрыстыя вочы.

Усе чокнуліся і пачалі піць. «Не, дудкі вы мяне споіце, шаноўныя змоўшчыцы!» — падумаў Анатоль і непрыкметна выліў сваю чарку праз плячо на густую сетку дзікага вінаграду, што віўся навокал.

— Э-эх, здорава! — крэкнуў ён і доўга нюхаў кавалачак хлеба, пасля паклаў па стол і звесіў галаву.— Пы-ы-ыя-на-я ж я-а, пы-ы-яна-ая ж...— зацягнуў ён хрыплым голасам.

Іна, нічога не падазраючы, шапнула Артуру:

— Мне сорамна за яго... Не зважай.

— Знайшла-такі... Проста не магу змірыцца з думкай, што гэты баран...— Артур бліжэй пасунуўся да Іны і шапнуў ёй нешта такое, ад чаго чырвань заліла твар. Потым моцна сціснуў пад сталом яе трапяткую, гарачую руку. Гэта заўважыла гаспадыня і за плячамі Анатоля паказала яму язык.

— А каб дома, як кажуць, не журыліся,— нальём яшчэ па адной! — гучна сказала яна.

Анатоль, за якім ужо амаль ніхто не сачыў, і гэтую чарку выліў за спіну. Тым часам Віктар настроіў гітару і прыемным барытонам пачаў спяваць:

Мора шуміць на прасторы,
Б'ецца аб бераг круты.
Ззяе у небе між зораў
Месяца рог залаты...

З захапленнем пазіраючы на яго закаханымі вачамі, Лена паспрабавала спяваць у лад. Гэта ў яе атрымалася нядрэнна.

— А вы ўжо добра зладзілі свае галасы! — раптам кінуў Анатоль, узняўшы галаву.— Напэўна, з мужам у вас так гладка не атрымлівалася, га? Ха-ха-ха! — засмяяўся ён.— Уяўляю... Уяўляю цудоўны залаты рог на салідпай лысіне вашага шаноўнага...

Усе сумеліся. Бландзінка паружавела.

Але гэта не перашкодзіла ёй какетліва пагразіць Анатолю маленькім кулаком.

Віктар перастаў спяваць і ўстаў.

— Ну, таварышы, гэта ўжо аўрал. Моцны крэн, як гаворыцца, налева... Цётка Зося!

— А што? — нібы нічога не разумеючы, спытала тая.

— У вас тут сёння нейкі непарадак. Шторм дванаццаць балаў! — запратэставаў марак.— Грошы, здаецца, плацім адналь...

— А-а-а, нічога, калі п'яны чалавек і пажартуе! — хуценька перапыніла яго Зося і звярнулася да Анатоля: — Пажартаваў, і ўсё, ці не праўда?

— Штар-рмяга! — раптам раўнуў Анатоль, ненатуральна скасіўшы на гаспадыню вочы.— Наш марачок тане... Як кажуць, прабоіна ў днішчы! А-ах-ха-ха... Прабоіна! — грукнуў ён кулаком па стале. Зося спалохана адышлася.

— Бес-куль-тур'е! — раздзельна вымавіў Віктар, адвярнуўшыся ад Анатоля.

Іна не чакала такога павароту спраў.

— Ну, Толя! — заламаўшы рукі, узмалілася яна.— Ты зусім ап'янеў і гаворыш глупствы...

Марачок схапіў сваю гітару.

— Можаце не ўгаворваць яго, мадам! Будзьце здаровы, цётка Зося, я аддаю канцы. Мне ў вас было вельмі прыемна, але ў райскім кутку завёўся кракадзіл!..

Гаспадыня нездаволена паціснула плячамі: яна сама не ведала, як выблытацца з такога становішча, якое, відаць, падабалася толькі Артуру. Ён сядзеў, разваліўшыся ў крэсле, і ўсміхаўся. Іна і Лена перашэптваліся.

— Аддавай канцы, палундра! — Анатоль наліў чарку і цяпер выпіў.— Хочаш, я пакажу зараз «бой шклянак» на носе? Толькі не на карабельным...

Госці хутка пакінулі веранду.

Калі Анатоль астаўся за сталом адзін, ён спахапіўся і падумаў: «Ці не перагнуў я з гэтай роллю п'янага? Цяпер ужо ўсё роўна трэба працягваць у тым жа стане...»

Эх, свеціць у небе між зораў!
Эх, месяца рог залаты! —

зацягнуў ён на матыў «Раскинулось море широко» і пайшоў услед за гасцямі. Прыжмурыўшы вочы, Анатоль заўважыў, як Іна з Артурам схаваліся ў цені густога вінаградніку.

— Даруй, Артур, што так выйшла...— даволі гучна гаварыла на развітанне Іна. Анатоль чуў яе словы. Ён толькі не бачыў, як яна перадала Артуру складзеную паперку, а той прыціснуў да грудзей — калісьці сваю каханку, цяпер ужо чужую жонку.

— Да сустрэчы, Іна!

Змітрок з задавальненнем адзначыў, што заўсёды стрыманы і фарсісты Іван усё часцей і часцей пачаў давяраць яму прасцейшыя аперацыі па апрацоўцы дэталей, нават адыходзіўся куды-небудзь надоўга. Іван жартаваў, расказваў розныя гісторыі — адным словам, трымаў сябе, як роўны з роўным.

Ды і Галя Ждан, нібы хто яе падмяніў, падыходзіла цяпер з добрай усмешкай, не крыўдзілася нават і тады, калі Змітрок забываўся прывітацца ці па-ранейшаму размаўляў з дзяўчынай рэзка.

«Мусіць, і мне трэба абыходзіцца з імі інакш... Галя ж да нас ходзіць, відаць, не толькі дзеля дзяцей...» — падумаў Змітрок. Ён усё часцей і часцей пачынаў заўважаць, што варта яму лагодна зірнуць на Галю, як яна ружавее і сарамліва апускае свае карыя вочы... Ад гэтага ў яго балюча сціскаецца сэрца, і новыя думкі апаноўваюць хлопца: «Няўжо? Няўжо гэта можа быць? Такая дзяўчына! Я не варты таго, каб яна пакахала... А можа, варты? Трэба быць вартым...»

Аднойчы ў час абедзеннага перапынку Змітрок затрымаў Галю каля станка.

— Прывітанне, «добрая цёця»!

Яна падышла, усміхаючыся, спытала:

— Так называе мяне Алік?

— І ўсё чакае, калі «добрая цёця» прыйдзе зноў і прынясе цукерак!

— Сёння прыйду,— паабяцала Ждан. Яе тонкія бровы нібы ўзляцелі над бяздоннымі азёрцамі вачэй, твар ажывіўся, стаў прыгажэйшы і дабрэйшы. На хвіліну апусціўшы доўгія вейкі, Галя шчыра глянула Змітраку ў вочы.— Мне заўсёды так добра ў вас, быццам дома...

— І з табой, відаць, дзецям добра, што чакаюць не дачакаюцца! — адказаў Асташонак, адчуваючы, як гулка затахкала яго сэрца.

Хвіліну Галя і Змітрок глядзелі адно на аднаго зусім не так, як дагэтуль, глядзелі, нібы ўпершыню сустрэліся. Ждан дастала з кішэні камбінезона паперку і падала яму.

— Прачытаеш, калі я схаваюся, добра? — і сама, як гарэзлівая дзяўчынка, пабегла з цэха.

Змітрок разгарнуў паперку. Гэта быў звычайны запрашальны білет, а не пісьмо, як падумалася яму.

«Паважаны таварыш,— прачытаў Змітрок.— Г. Ждан!

(Г. Ждан было закрэслена і вышэй надпісана — Зм. Асташонак.) Гарком камсамола запрашае вас прыняць удзел у вечары дружбы паміж студэнтамі і камсамольцамі вытворчасці, які адбудзецца ў заводскім парку». Унізе было дапісана: «Прыйдзеш абавязкова! Галя».

І ён пайшоў...

Усюды ў парку было ўрачыста. На «зялёнай» эстрадзе іграў духавы аркестр, юнакі і дзяўчаты парамі і групамі праходзілі па цэнтральнай алеі, гучалі песні, стаяў вясёлы гоман, раздаваўся смех...

У бацькавым святочным касцюме, з чырвонай ружай у руцэ, Змітрок паволі шпацыраваў у зацішку, дзе дарожка пятляла між густых кустоў. Ён ужо не адчуваў сябе адзінокім, не сумаваў, як было нядаўна, у пачатку лета, якое стала пераломным для Змітрака.

«Калісьці я хадзіў тут з Інай»,— падумаў хлопец, ясна разумеючы, што ў асобе Іны ён, асеплены каханнем, бачыў уяўную асобу. Сапраўдная, жывая Іна была зусім не падобна на тую, якую ён тры гады кахаў! Дзіўна — як гэта можна памыляцца тры гады... А можа, Змітрок і бачыў яе недахопы, ды не звяртаў на гэта ніякай увагі? Усё ж вельмі марудна рассейваецца ўяўленне, цяжка забываецца першае пачуццё кахання, хоць і ашуканага...

Звярнуўшы на алею, дзе былі вывешаны партрэты перадавікоў завода, Асташонак пайшоў яшчэ цішэй. Ён зусім не ведаў, што на адной з лавачак парку сядзелі Галя і Іван. Яны ўважліва сачылі за галоўным уваходам, а потым разышліся шукаць хлопца...

Змітрок усё тупаў ля стэндаў з партрэтамі, пакуль не заўважыў на адным з іх Азарчука. Падышоў, прыгледзеўся да знаёмых рыс яго твару. Пад партрэтам было прозвішча, а ніжэй прыпіска: «Прыйшоў на завод з атэстатам сталасці».

— А цяпер ён сам вучня мае! — пачуў Змітрок нечы голас і азірнуўся. Ля яго стаяў стары чалавек у акулярах, той самы стары, што некалі ля дошкі з аб'явамі аб прыёме ў навучальныя ўстановы скардзіўся на свайго ўнука, які ні за што на свеце не хацеў быць настаўнікам. Асташонак пазнаў яго, Іванавага дзеда.

— А вы адкуль ведаеце, што ён мае вучня? — спытаў ён, каб завязаць гутарку.

— Як гэта — адкуль? Ён — мой унук, дарагі хлопча, вось адкуль! — пахваліўся стары. Добрыя і гордыя вочы старога ўсміхаліся.

— Ах, унук,— нібы ў роздуме адказаў Асташонак.— Гэтыя ўнукі заўсёды няўрымслівы народ. Дзед, скажам, хоча, каб ён быў настаўнікам, а ён абавязкова, каб насаліць дзеду, пойдзе на завод...

Стары насцярожыўся, зняў акуляры і, адкінуўшы галаву, уважліва паглядзеў на хлопца. Абышоў яго навокал, зноў спыніўся, намагаючыся нешта ўспомніць.

— Пачакай, пачакай, голубе, дзе гэта я цябе мог бачыць? Такі, ведаеш, знаёмы твар... А-а! Успомніў! — нарэшце пазнаў ён і засмяяўся.

— Ля дошкі з аб'явамі...

— І яшчэ з табой размаўляў!

— Ага.

— Тады мне ясна, на якіх унукаў ты намякаеш... Прывычка, бадай яе, раіцца з людзьмі, як бачыш, захавалася і ў старога. Нічога не зробіш! Аднак скажу, дружа, што лепш быць добрым рабочым, чымся дрэнным настаўнікам.

Змітрок падумаў тое ж самае, але для парадку спытаў:

— Адкуль вам вядома, што ён быў бы дрэнным настаўнікам? Магчыма, наадварот...

Стары паглядзеў наўкол і, упэўніўшыся, што ніхто яго не падслухоўвае, шапнуў:

— Ад яго аднойчы нават збег вучань...

— Не можа быць! — нібы здзівіўся Змітрок.— Хіба што яго вучань быў дрэнным хлопцам?

— Што ты гаворыш! Ён цудоўны хлопец, сам Іван казаў,— і цішэй: — Толькі, даражэнькі, нікому аб гэтым...

— Ні-ні! — з усмешкай запэўніў Змітрок.

Раптам стары зірнуў на алею і, спяшаючыся, загаварыў:

— Прабач, малады чалавек, трэба паціснуць руку вунь таму грамадзяніну. Гэта ён вывеў у людзі майго ўнука! — і хуценька пайшоў, апіраючыся на кіёк.

Асташонак паглядзеў услед. Там, апрануты па-святочнаму, ішоў з жонкай дзядзька Антось. «Гэты чалавек і мяне ў людзі вывеў, дарагі дзед Азарчук!» — падумаў Змітрок і адчуў на сваім плячы руку. Але не павярнуўся, а пачакаў, пакуль той, хто паклаў руку, не загаварыў.

— Як ты думаеш, хто гэты стары з жонкай? — пачуў ён голас, але не той, якога чакаў. Вельмі знаёмы голас! Азірнуўся і здзівіўся.

— Гі-ра?

— Бачыш жа... А што цябе так здзівіла? Што яшчэ

ходзіш па грэшнай зямлі? Дзяцей тваіх пашкадавалі, балда...

Змітрок паглядзеў на багаты касцюм Ігара, на сіні ад частага ўжывання спіртнога твар і адказаў:

— Здорава, відаць, жывеш! Франт! Пашкадавалі... А ты не думаў, хто б з нас раней пакінуў грэшную зямлю! І наогул... Дні твае злічаны.

— Кâпнеш? — закрыўшы рукой ад людзей твар, з ухмылкай спытаў былы Змітракоў аднакласнік.

— Не абавязкова! Хаваешся ад людзей... Яно не без прычыны — у цябе ж не твар, а шыльда, дзе ўсё напісана.

— Змоўкні! — павысіў голас Ігар.— Перашкодзіш сёння, дык мы рашэнне можам адмяніць, не паглядзім і на дзяцей...

— Не вельмі напалохаў. Я не Раман, выкуп не атрымаеш...

— Малайчына, пацук! — усклікнуў «атаман Гіра».— Яшчэ за доўгі язык заплаціць!

— Ён паехаў у Салігорск, не дагоніш! — усміхнуўся Змітрок.— З яго яшчэ будзе чалавек.

Не даслухаўшы Змітрака, Ігар раптам пашыбаваў той самай сцяжынкай, адкуль нядаўна выйшаў Асташонак. «За кім гэта ён улёг?» — падумаў хлопец, пільна ўзіраючыся на дарожку. Па ёй даволі шпарка трусіла дзяўчына. Змітрок глянуў на яе дужыя ногі з прыгожымі ікрамі, на паходку і схамянуўся. Ён пазнаў Галю!

— Стой, Ігар!..

Змітрок дагнаў яго і схапіў за руку.

— Пусці! — гыркнуў той, вырваўшыся.

— Чаго за ёю бяжыш?

— Не твая справа!

— Гавары...— задыхаючыся ад хвалявання, вымавіў Асташонак. Відаць, выраз твару яго прымусіў Ігара адказаць.

— Ну... у нас з ёю старыя рахункі. Нагаварыла зашмат... Лепш адыдзі, кажу!

Але Змітрок не адставаў. У канцы сцяжынкі, дзе зусім нікога не было, Ігар дагнаў Галю і заступіў ёй дарогу.

— Маё вам, паненка! Бяры плату за данос...

Змітрок убачыў, як у Ігаравай руцэ бліснуў нож, і адразу, нібы яго хто штурхнуў, скочыў наперад і магутным ударам зваліў Ігара з ног. Пасля падняў і ўдарыў яшчэ. Той выпусціў нож і, курчачыся ад болю, застагнаў.

Галя падхапіла нож. Закрычала хрыплым ад перапалоху голасам:

— Мі-лі-цыя-аа!

Адусюль пачалі збягацца людзі. Прыбег і Іван.

— Вось, аказваецца, дзе вы! — узрадаваўся ён, але глянуў на акрываўленага Ігара і спахмурнеў: — Змітрок? Гэта ты яго так?..

— Шкада, мала даў! — адказаў Асташонак, папраўляючы на шыі гальштук.

Людзі, што прыбеглі на здарэнне, далі дарогу двум міліцыянерам. Тыя падпялі Ігара, зірнулі на вялікі сіняк пад вокам, разбітую губу і паківалі галовамі. Адзін з іх сказаў:

— Фізіяномія пашкоджана, але яшчэ пазнаць можна... Вось і папаўся Гіра, «дачны кліент». Цябе даўно шукаем, галубок! Сведкі не патрэбны,— звярнуўся ён да Галі і Змітрака.— А халодную зброю возьмем...

Ігара павялі. Народ разышоўся.

— Дзякуй,— сказала нарэшце Галя і паціснула Асташонку руку.— Ты такі мужны... Ніколі б не паверыла!

— А помніш, гаварыла, што ў мяне няма сілы? — паспрабаваў усміхнуцца Змітрок.

— Забудзем, што было,— адказала яна.

— Калі б'еш вінаватага, аказваецца, і твой удар моцны! — напомніў яму Іван пра той выпадак, калі Асташонак атрымаў ад яго добры ўрок.

— Ад цябе навучыўся... Увесь удар укласці ў цяжар цела, ці не так?

— Ды не-е,— засмяяўся Азарчук.— Увесь цяжар цела ўкласці ў адзіны ўдар! Але Галя гаворыць праўду — мінулае не трэба ўспамінаць.

— Забудзем!..

Раптам Азарчук спыніўся і, уважліва зірнуўшы Змітраку ў вочы, сказаў:

— Ну, брат, трымайся! Сем патоў спушчу, а даб'юся...

— Чаго? — не зразумеў яго Асташонак.

— Начальнік цэха сказаў, што хутка ты будзеш здаваць экзамен... Зробіш сваю першую дэталь, сапраўдную! — радасна паведаміла Галя.

— Першую?

— Ага...

— «Другую»,— падумаў Змітрок і паглядзеў на Галю. Яна прыклала палец да вуснаў і пакруціла галавою, нібы гаворачы, што ніхто нічога не ведае.

«Не сказала... Не сказала нікому на свеце!» — зноў падумаў хлопец, і яны, бадзёрыя, вясёлыя, быццам тут, на гэтым месцы, нічога не здарылася, пакрочылі да прасторнага заводскага клуба, дзе хутка мелася пачацца свята маладосці...

16

Забаўскі доўга крыўдзіўся на Змітрака. Гэта ж ён прывёў хлопца на завод, і ўсе непрыемнасці трэба было перажываць яму, старому кадравіку!

— Завод можа абысціся і без яго! — не раз гаварыў стары жонцы.— А ён без завода — загіне!

Аднойчы раніцай, выйшаўшы на лесвічную клетку, стары майстар не стрываў, спыніўся ля суседавых дзвярэй паслухаць, ці збіраецца ён там на працу.

— Ды зайдзі ты! Памірыцеся...— раптам, адчыніўшы дзверы, сказала жонка. Яна, аказваецца, таксама хацела прымірэння і сачыла за мужам!

Забаўскі надзьмуўся і хацеў нешта запярэчыць, але не паспеў, бо выйшаў Змітрок. Яны прывіталіся і моўчкі пайшлі ўпіз.

— Вы мне даруйце, дзядзька Антось...— пачаў Змітрок, ды той, здавалася, і не слухаў яго.

— Праца, як песня, ці не праўда? — раптам спытаў Забаўскі, падкручваючы вусы.— Яна павінна ліцца з глыбіні душы... Толькі тады ты адчуеш радасць.

— Праўду кажаце! — згадзіўся Змітрок, радуючыся, што так проста абыходзіцца з ім стары. Але тут дзядзька Антось спахмурнеў і ўжо іншым тонам заўважыў:

— Падумай добра, парайся са сваім сэрцам, Змітрок. Завод — гэта не прахадны двор!

— А я і надумаў! Вось здам экзамен, стану за станок, свой станок! Разумееце?..

— Чаму ж не.

Так проста між імі ўсталявалася згода і мір.

Калі яны развіталіся, звапок абвясціў аб пачатку рабочага дня і нібы падагнаў Змітрака ў цэх. Ён ледзь спраўляўся сёння адказваць на прывітанні: вось колькі сяброў і знаёмых стала за такі кароткі час!

— Добрай раніцы! — весела крыкнуў Змітрок Івану, які ўжо стаяў ля станка. Ён трымаў адну руку на ўключальніку, а ў другой была неапрацаваная дэталь.

— Здароў! Пачнём?

— Пачнём...

Так пачалася самастойная праца Змітрака. Усю змену, пад наглядам Івана, ён замацоўваў дэталі, рабіў больш складаныя профілі, чым дагэтуль, тлумачыў кожны свой рух...

А дома, сёе-тое перакусіўшы на хаду, ён садзіўся за стол і, натхнёны музыкай, якая даносілася з суседняга пакоя (там рыхтавалася да экзаменаў Ганя), вывучаў тэхналогію рэзання металаў, паўтараў будову станка.

— Супарт, станіна, хадавы вінт...— бясконца паўтараў ён, і толькі Алік, гэты непаседлівы свавольнік, бывала парушаў працоўную атмасферу, якая панавала вечарамі ў кватэры Асташонкаў. Уцячэ з сада дадому, адчыніць паціху дзверы і, паказаўшы бяззубы рот, перадражніць брата:

— Шупарт, штаніна... Ганя! Я хачу цукерку...

У суседнім пакоі змаўкала музыка, і Ганя выносіла яму загадзя прыгатаваныя то цукерку, то кавалачак піражнага, то булку з варэннем. Схапіўшы пачастунак, ён моцна ляпаў дзвярамі і ўжо на калідоры паўтараў звонкім галаском:

— Шупарт, штаніна...

Так міналі дні, дні напружанай працы Змітрака і Гані, якія рыхтаваліся да экзаменаў на сваю сталасць.

І вось настаў час, калі Змітрок павінен быў паказаць сваё майстэрства людзям...

Іспыты былі назначаны адразу пасля абедзеннага перапынку. А пакуль у сталоўцы наўкруг стала сядзелі трое: Галя, Іван, Змітрок. Апошні еў з нейкім небывалым апетытам. Яго талерка хутка апусцела.

— Еш — пацей, працуй — мерзні! — пажартаваў з таварыша Іван.— Куды спяшаешся? Да званка яшчэ больш чым чвэрць гадзіны.

— А я і не спяшаюся,— зірнуўшы на поўныя талеркі сяброў, адказаў Асташонак.— Гэта вы марудзіце...

Галя супакоіла яго па-свойму:

— Урэшце, няма чаго хвалявацца... Людзі, што будуць прымаць экзамен,— свае, не чужыя. А ты ўжо не вучань, сваю справу добра ведаеш.

Слухаючы іх парады, Змітрок усё ж непрыкметна з'еў і другую страву. З палёгкай уздыхнуў:

— Ну, вось і супакоіўся,— паказаў ён на парожнія талеркі.— Хваляванне, як рукой зняло!

Усе засмяяліся. У гэты час зазваніў званок, абвяш-

чаючы аб тым, што перапынак скончапы. І як ні імкнуўся Змітрок супакоіць сябе думкаю аб тым, што справу ён ведае добра, але ёкнула сэрца ад гэтага званка. Здавалася, ён ішоў у цэх спакойнай хадою чалавека, даўно прызвычаенага да сваёй працы і абавязкаў, хадою не госця, а гаспадара. Але ніхто не бачыў, як дрыжалі яго калені і нейкі халадок прабіраўся пад кашулю. Ніхто не чуў, як гулка тахкала юначае сэрца...

Ля Іванавага станка ўжо сабраліся начальнік цэха, інжынер, некалькі рабочых. Начальнік цэха падаў Асташонку каманду:

— Пачынай!..

Змітрок ступіў крок да станка, замацаваў загатоўку і ўключыў матор. Ён загуў рытмічна, ціха, нібы супакойваючы хлопца. І Асташонак не спяшаўся. «Калі што хочаш зрабіць хутка — ніколі не спяшайся»,— прыгадаў ён словы, якія часта паўтараў дзядзька Антось. Падвёў разец да дэталі, і з-пад яго закучаравілася сталёвая стружка. Трымаючыся за свой баявы штурвал — варанёную ручку супарта, Змітрок па-гаспадарску нахіліўся над станком. Яго твар пакрыўся дробнымі кропелькамі поту, але хлопец не адчуваў гэтага. Ён увесь нібы зросся са станком, стаў нейкай галоўнай яго часткаю. На некалькі хвілін для Асташонка знікла камісія. Ён не чуў гаворкі, не бачыў людзей. Адно, што час ад часу заўважаў Змітрок, гэта Галіны вочы. Уважлівыя, строгія...

І калі разец канчаў здымаць апошнюю фаску — нібы ачнуўся хлопец. «Ці так я ўсё рабіў, як належала? Ці атрымалася дэталь наогул?» — мільганулі трывожныя думкі.

У гэтую хвіліну Азарчук паглядзеў на Галю і спахмурнеў. Яе нельга было пазнаць: твар дзяўчыны пабялеў, выцягнуўся, застыў у напружаным чаканні, вочы нерухома глядзелі на дэталь, на разец...

«А супакойвала»,— падумаў Іван. Ён нават не ўяўляў сабе, што калі-небудзь Змітрок можа стаць на яго дарозе. Цяпер жа задумаўся над гэтым. Так, ён страціў час, у душы дзяўчыны адбыліся змены. Цяпер ёй ужо не варта гаварыць пра свае пачуцці — позна! Іван ясна гэта разумеў і таму яшчэ больш злаваўся на сябе за нясмеласць.

— Хвалюешся, Галя? — ціха спытаў ён, стаўшы побач.

— Зусім не,— суха адказала яна, не адрываючы позірку ад станка, стаіўшы нават дыханне. Галя не была ўпэўнена ў тым, што Змітрок здолее вытрымаць экзамен,

бо так мала вучыўся. Гэта магло быць толькі выключэннем...

Нарэшце станок спынены. Зміcрок зняў сваю першую дэталь, і яе адразу падхапілі нечыя рукі. Ён не заўважыў — чые. Адчуваў толькі, што каля станка раптам стала ціха-ціха...

Ішлі ў ход і кронцыркуль, і мікраметр, і сталёвая лінейка.

Маўчанне парушыў інжынер. Ён паклаў у нагрудную кішэню мікраметр і, усміхаючыся, сказаў:

— Нядрэнна! Можаш працаваць...

І толькі пасля гэтых слоў Змітрок адчуў, што вакол яго многа людзей, яны, здавалася яму, загаварылі адразу ўсе. Дэталь пераходзіла з рук у рукі, крытычна абмяркоўвалася. Вось яна ўжо ў Галіных руках. Твар яе ажыў, вочы засвяціліся ўсмешкай. І Змітрок усміхаўся ёй у адказ.

— Ну, вось... І прайшло,— апошняй паціснула яму руку Ждан.— Віншую.

Асташонак удзячна паглядзеў ёй у вочы, а Галя шчыра, але нячутна адказала Змітраку тым жа. Яна думала: «Які ён прыгожы, калі шчаслівы! Мусіць, усе людзі такія». Змітрок затрымаў руку Галі крыху больш, чым астатніх. Гэты поціск дзвюх рук не прайшоў міма ўвагі Івана. Падышоўшы да іх, ён сказаў:

— Ну, ты... задаволены?

Змітрок адхапіў сваю руку.

— Дзякуй! — неяк вінавата прамовіў ён.— Ты быў добры настаўнік ва ўсім. Скажы аб гэтым свайму дзеду!

Яны абняліся, як сапраўдныя сябры. Галя падала Змітраку дэталь.

— Вазьмі. Першы вынік тваёй працы...

Асташонак узяў дэталь, задумліва і доўга глядзеў на яе, а радасці ў вачах, здаецца, не было мяжы. Нечакана ён павярнуўся і амаль бягом накіраваўся да выйсця. Іван і Галя здзіўлена паглядзелі яму ўслед.

— Здурнеў ад радасці! — сказала Галя.

Іван сумна паглядзеў на яе і, уздыхнуўшы, прамовіў:

— Ад такой радасці і здурнець можна... Ёсць ад чаго.

Галя зразумела хлопца, моўчкі павярнулася і павольна пайшла на сваё рабочае месца. Гэты яе рух гаварыў больш за ўсякія словы...

А Змітрок, трымаючы дэталь над галавою, прыбег аж у кавальскі цэх і гукнуў:

— Дзядзька Антось! Дзядзька Антось...

— Што з табой? — не зразумеў яго стары.

Асташонак спыніўся, перавёў дух і, азірнуўшыся на цікаўных, сказаў:

— Вось... Я зрабіў! Сваімі рукамі...

— Пакажы.

Забаўскі спакойна ўзяў дэталь у свае рукі, агледзеў яе з усіх бакоў і нечакана для ўсіх кінуў у горн, што сінім агнём палаў побач з молатам.

— Ой! — усклікнуў хлопец і кінуўся да печы, але адразу ж адскочыў назад. На яго вачах былі слёзы...

— Што вы зрабілі!.. Гэта ж мая!

Кавалі засмяяліся, а Забаўскі паклаў руку яму на плячо і па-бацькоўску заўважыў:

— Пашкадаваў? Значыць, ведаеш цану сваёй працы! Гэта добра, сынку!.. Кожны рабочы штодня робіць сотні такіх дэталяў!

— Гэта ж я зрабіў...

Стары ўсміхнуўся.

— Вось гэтага табе і не ставала! Ідзі і працуй. Цяпер ты сапраўдны рабочы чалавек...

## 17

Анатоль прачнуўся позна, Іны ў пакоі ўжо не было. Ён пачаў успамінаць, калі яна прыйшла ад Зосі, але не ўспомніў, бо сам заснуў, не дачакаўшыся яе, і праспаў аж да раніцы. «Гэтак жа Іна тады нічога не ведала,— падумаў ён пра выпадак у яе на кватэры, і гарачыня ўдарыла ў твар.— Яна магла мне адпомсціць з гэтым... Артурам!»

Не хацелася ўставаць. Ён ляжаў і ўспамінаў Кацю. Як жа гэта ўсё тады здарылася? Ён нічога не памятае. Ва ўсім была вінавата Каця. Ці толькі Каця? Чаму ж тады, раніцаю, уцякаючы чуць свет дамоў, абяцаў прыходзіць?..

— Ч-шорт! Як усё брыдка! — гучна вылаяўся Анатоль і адразу ўстаў з ложка.

— А-аа, сёння табе брыдка! Учора ж было вельмі прыемна?

Толькі цяпер ён заўважыў Іну. Яна стаяла каля расчыненага акна ў сваёй белай сукенцы, зусім непрыкметная побач з белай, доўгай, да падлогі, фіранкай.

Анатоль адзеўся, падышоў да яе.

— Іна... Зразумей — я не хачу, каб тут у нас збіралі-

ся няпрошаныя госці, нам трэба адпачываць! — прамовіў ён.

Іна павярнулася да яго. Колькі злосці ўбачыў Анатоль у халодных, зусім не прыгожых на гэты раз вачах.

— Ты што мне абяцаў? Пакорлівасць? Дзе яна, твая пакорлівасць? Не будзем ужо гаварыць пра каханне... Ты ніколі не кахаў мяне. А ўчора што нарабіў? Цяпер сорамна з людзьмі сустрэцца.

— Я хачу спакою! — пастукаў ён сабе кулаком у грудзі.— А тут чорт ведае што...

— А я прывыкла жыць сярод людзей...

— Але ж гэтыя людзі нам дорага каштуюць! Дзе мы набяромся грошай кожны вечар так гуляць?

— Вось, вось,— паказала на яго пальцам Іна.— Грошы! Ты хваліўся, што ў цябе іх многа, а хапіла толькі прыехаць сюды і пражыць у людскіх умовах пару дзён. Цяпер, кажаш, засталася на білеты, каб паехаць дамоў. Не зусім салодкі наш мядовы месяц, каб ты ведаў...

Гэта быў выклік. Анатолю хацелася нагаварыць мноства розных папрокаў, абразіць яе, але цяпер ускладняць адносіны было раўназначна разрыву, і таму ён здаўся.

— Ну, не трэба так, Іна,— падабрэў Анатоль, хоць на душы «скраблі кошкі». Паклаў рукі ёй на плечы і павярнуў тварам да сябе.— Пакуль я жывы, грошы будуць! Хочаш, я пайду ў горад і дам тэлеграму...

Іна ўздыхнула.

— Як мне цяжка з табою... Невыносны характар.

«Гэта праўда — чым больш кошачку гладзіш, тым яна вышэй задзірае свой хвосцік!» — падумалася Анатолю.

— А з табою...— Ён паспрабаваў пацалаваць яе ў вусны але яна адвярнула твар.— Ну і збірайся сабе дадому! — не стрываў Кручанюк. Адышоўся да акна, змораны сеў на крэсла і падпёр галаву рукамі.

Цяпер ужо яна, адчуваючы сваю віну, падышла да яго.

— Каханнем трэба даражыць, але ж яго трэба і заслужыць,— зрыфмавала яна какетліва.— Вось ты і заслужы...

— Не ўмею...

— Ты кудысьці хацеў даць тэлеграму, калі я не памыляюся? Успомні — куды...

— І гэтага хопіць, каб заслужыць каханне?

— Нават — шчасце быць каханым!

— Мне здаецца, што шчасце наша наогул недаўгавечнае. Яно абарвецца раптам,— устаўшы, адказаў Анатоль.

— А гэта таму, што не жыў ты, Толя, яшчэ сапраўдным жыццём, шырокім! Цябе палохае яго размах... Гэта хутка пройдзе, дарагі, павер мне.

— Можа, яно і так,— уздыхнуў ён.— Але я думаю, што ў нас розныя погляды на вялікае жыццё. Што ж, пабачым...— стукнуў ён кулаком па стале...

Да пошты Анатоль пад'ехаў на таксі. Падышоў да акенца прыёму тэлеграм, узяў бланк і размашыстым почыркам напісаў: «Вельмі прашу выслаць дзве тысячы рублёў...» Потым закрэсліў лічбу, падумаў. Узяў новы бланк, напісаў спачатку: «Вельмі прашу выслаць тры тысячы рублёў лік авансу. Прывітаннем — Кручанюк».

Здаўшы тэлеграму, Анатоль выйшаў на вуліцу і зусім неспадзявана наткнуўся на ўчарашніх гасцей — марака і бландзінку. Яны ішлі на пошту.

Лена, зірнуўшы на Анатоля, усміхнулася і штосьці шапнула Віктару. Той азірнуўся.

— Ба-а! Шчаслівчык! — пачуў Анатоль за спіною голас марака.— Ён уяўляе, што ходзіць без рог... Гэтакі боскі анёлачак, ха-ха-ха!

І смех той скалануў усю душу Анатоля. «Гэта не проста помста за ўчарашняе, гэта праўда! Страшная праўда... Я прымушу Іну прызнацца!» — падумаў ён, ледзь стрымліваючы сябе, каб не кінуцца ўслед за мараком і бландзінкай.

Шпарка падышоўшы да таксі, Анатоль сказаў шафёру:

— Усходняя, дзесяць — гані!

Адчуўшы, што пасажыр спяшаецца, шафёр гнаў машыну так, што яна, здавалася, гатова была разваліцца на часткі. Але даехалі добра і хутка.

Вось ужо і знаёмы асабняк...

Анатоль зайшоў у сад. Адчыніўшы фортку, ён на момант застыў у нямым здзіўленні: яму здалося, што з другога боку саду над плотам мільганулі белыя тапачкі. Гэта было адно імгненне, і Анатоль не мог пэўна сказаць, што ён бачыў тыя спартыўныя тапачкі. Яшчэ імгненне — і ён накіраваўся да зялёнага будана. «Калі яна там, то сумнення быць не можа!» — падумаў Кручанюк, расхінаючы лісце.

Іна адпачывала. Убачыўшы мужа, схапілася за расшпіленую кофтачку рукамі і ўсклікнула:

— Ой, напалохаў! Цьфу, цьфу, цьфу... Толькі задрамала.

— Задрамала?

— Ага... Але ты хутка. Тэлеграму даў?.. Што ты так глядзіш на мяне?..

Анатоль прайшоў у будан, моўчкі сагнуўся і падняў з коўдры белую касцяную расчоску з ручкай накшталт рыбінай галавы.

— Вось, прычашыся крыху... Дужа ў цябе валасы паблытаныя, быццам чэрці іх дралі! Ну!..

Іна спачатку збянтэжылася, але тут жа смела глянула на Анатоля:

— Каму патрэбен такі грозны выгляд і тон? Што здарылася?

— У цябе яшчэ хапае нахабства пытацца? — сціснуўшы кулакі, глуха вымавіў Кручанюк.— Дык набярыся ж смеласці сказаць, што ён тут быў... Маўчыш? Чыя гэта расчоска?

— Цьфу, дурань! — сумна і надзіва спакойна сказала яна.— А я думаю, што з ім такое... Гэта Артурава расчоска. Ён яшчэ ўчора яе забыўся.

Спакойны выгляд і тон жонкі абяззброілі Анатоля.

— Я... веру табе, Іна,— адказаў ён і паволі выйшаў з будана. Хвіліну яшчэ пастаяў, а потым рушыў за фортку.

Неўзабаве быў ужо ля мора, на тым месцы, дзе зусім нядаўна трымаў Іну на руках і думаў, што шчаслівы. Дзе яно, тое шчасце?

Шуршыць пад нагамі пясок, перасыпаны дробнымі каменьчыкамі, адна за адною набягаюць зеленаватыя хвалі. Лёгкі вецер з мора прыемна асвяжае твар, дыхаецца вольна, лёгка. Ішоў бы так бясконца, не азіраючыся, ні аб чым не думаючы, аж да самага дому. А з галавы не выходзілі словы адной старой песні: «Хлопец здуру ажаніўся, ой-ёй-ёй! Навек жонкай падавіўся, ой, божа ж мой!..»

Анатолю раптам так захацелася на родны завод, што аж прыбавіў ходу. «Да працы, да сяброў! Сябры... Ці ёсць яны ў мяне? Іван, напэўна, пакрыўдзіўся за тое, што «зорачку» я прысвоіў... Фактычна, не мая ж яна, я толькі першы выказаў думку... А Змітрок?.. Хіба так робяць сябры, як паставіўся я да гэтага добрага хлопца?..»

Кручанюку здавалася, што ўсё гэта дзіўны і непрыемны сон. Калі ён жаніўся? Ён жа нікога яшчэ не кахаў, не праводзіў з каханай дзіўных хвілін, не адчуў шчасця сустрэч... Вось хутка прачнецца і...

Але таму, хто не спіць, не суджана прачынацца...

Раптам далёка ў моры Анатоль заўважыў маторку. Яна

усё бліжэй і бліжэй падыходзіла да берага. I вось ужо ўткнулася носам у пясок крыху воддаль. Матор заглух...

— Анатоль!.. Садзіся, пакатаю з вецярком!

Чый гэта голас? Ды гэта ж голас Артура! Адкуль ён узяўся тут, па моры, з лодкаю? Кручанюк прыбавіў ходу і неўзабаве апынуўся каля маторкі. Здзіўлена пазіраў на Артура і не мог вымавіць ні слова.

— Ну, здароў! — выскачыўшы на пясок, прамовіў Артур і моцна паціснуў Анатолю руку.— Што, яшчэ пасля ўчарашняга не ачуняў? А здорава ты лізнуў... Давай прыкурыць усім!

Анатоль глянуў Артуру на ногі. «Карычневыя сандалеты».

— Што адзін катаешся? — панурыўшыся, непрыязна спытаў Кручанюк.

— А я да цябе еду.

— Да мяне?

— Ага... Па-першае, пасля ўчарашняга асвяжыцца марскім паветрам вельмі і вельмі карысна; па-другое, я ўчора абяцаў тваёй жонцы пакатаць яе; па-трэцяе, мы...

— Досыць і другога! — раптам усміхнуўся Анатоль.— Калі абяцаў Іне, то ніякай гамонкі не можа быць!

Артур запусціў пяцярню ў валасы і, скрывіўшыся, жаласліва сказаў:

— Слухай, Анатоль... Я ўчора недзе згубіў расчоску. Дробязь, але ж памяць... Мне яе купіла сястра, бо я заўсёды во-ось такі хадзіў,— ускалмаціў ён свае валасы.

«Няўжо здалося?.. Белыя тапачкі»,— падумаў Кручанюк і задаволена адказаў:

— Ёсць, ёсць твая расчоска! Едзем, Артур, да мяне, едзем па Іну... Гані ў адкрытае мора!

Артур скочыў у лодку і завёў матор.

— Ёсць, таварыш капітан! — заглушаючы траскатню матора, з юначым запалам адказаў ён.

— Трэба супакоіцца. Галюцінацыя, нервы... Цьфу! Белыя тапачкі... Здасца ж такое,— сам сабе засмяяўся Анатоль.

Але то была не галюцынацыя...

Дні праз тры пасля гэтага выпадку Анатоль стаў заўважаць, што жонка засумавала. Яна часта выходзіла за фортку і доўга глядзела на дарогу.

Неяк раз Анатоль ціха падышоў ззаду і нечакана спытаў проста ля вуха:

— Каго гэта ты чакаеш?

Іна здрыганулася, але спакойна, не павярнуўшыся, адказала:

— Проста слухаю мора.

— Яно ж чуваць і ў садзе...

— Дык і слухай там сабе.

Анатолю нічога не аставалася, як пайсці адсюль. І хоць пасля гэтай размовы Іна больш не глядзела на дарогу, яе чаканне адчувалася ва ўсім. Варта было ветру бразнуць форткай, як яна ажывала, выбягала на веранду, а потым, расчараваная, садзілася дзе-небудзь у кутку. Зашуміць лісцем дзе куст — яна насцярожыцца, стоіць дыханне...

Але той, каго Іна так чакала, не ішоў. Анатолю ад гэтага не было лягчэй, і ўсе спробы пачаць гаворку заканчваліся новай спрэчкай. Непрыемнасці ішлі адна за адной. Кручанюк атрымаў тэлеграму з завода не ад дырэктара, як спадзяваўся, а ад галоўнага бухгалтара. У ёй былі толькі два словы: «Авансе адмоўлена».

— Вось, глядзі! — злуючыся, Анатоль паказаў тэлеграму Іне.— Як ад'ехаў, дык адразу і забыліся...

Іна, надзіва, не пачала яго папракаць, а толькі спачувальна зазначыла:

— Што ж ты хацеў... За каго сябе лічыш, каб дырэктар адразу слаў грошы? Але не бядуй... Я дам бацьку тэлеграму. Ён мне не адмовіць, хоць і пакрыўдзіўся.

«Зусім правільна Іна гаворыць! Хто я такі? Як я не думаў аб гэтым раней, калі пісаў тэлеграму?» — разважаў сам сабе Анатоль, не ведаючы, як паладзіць з жонкай. Але яна, здавалася, пайшла сама яму насустрач.

— Што гэта мы нікуды не ходзім, Толя! — аднойчы ажывілася Іна.

Падлічылі свае рэсурсы: было роўна тысяча рублёў.

— Мала...— задумліва прагаварыў Анатоль.

— Нічога... Гэтага нам хопіць да канца! — весела адказала Іна.— А на дарогу бацька вышле...

Анатоль насцярожана сачыў за яе ажыўленнем, ён адчуваў, што яно часовае, штучнае...

І не памыліўся.

Пасля паўдня яны пайшлі гуляць не да мора, як звычайна, а за сад, дзе быў цудоўны гай з таполяў і каштанаў. Так захацела Іна. Яму ўжо не надзвычай было здзіўляцца. Толькі калі заўважыў невялічкую бухтачку з маторкамі, адразу ж спахапіўся: «Артур мог тут узяць лодку і, выехаўшы ў мора, завярнуць назад...» Ён і сам не ведаў, наколькі зрабіў правільны вывад! Аднак і гэтую думку

адагнаў ад сябе. Хмары ўсё згушчаліся над яго сямейным шчасцем...

— Многа разоў я быў несправядлівы да цябе... А ты — харошая. Анатоль абняў яе за плечы.

Іна закінула галаву і ўсміхнулася:

— Бо ты — сапраўдны дзікун... Мядзведзь.

Наўкол было цудоўна! Ярка свяціла сонца, спявалі птушкі, пералятаючы з галінкі на галінку між зялёнага лісця сунічных дрэў з ружовай і тонкай карою. Пад нагамі, нібы шаўковая, мякка слалася высокая трава. Пахла ружамі і мёдам. Гэта цвілі абапал сцяжынкі, па якой яны ішлі, нагрэтыя сонцам магноліі...

— Паглядзі сюды! — у захапленні гаварыў Анатоль. Іна пазірала, але не захаплялася, быццам гэтыя кветкі даўно надакучылі ёй.

— Чаго ты маўчыш, Іна?

Анатоль зірнуў і сумеўся: твар жонкі быў белы, вусны пасінелі і ўздрыгвалі.

— Вось чаму ён не прыходзіў! — гнеўна бліснуўшы вачамі, прамовіла яна і моцна сціснула кулакі.

Анатоль зірнуў уніз, дзе быў гай, і заўважыў Артура. Той стаяў, плячыма да іх, і моцна сціскаў у абдымках чорнавалосую дзяўчыну ў лёгкай, з аголенымі рукамі, стракатай сукенцы...

— І-іна!— не памятаючы сябе, крыкнуў Анатоль.

Ён схапіў яе за руку, але Іна вырвалася. Зірнуўшы на мужа злоснымі, прыжмуранымі вачыма, з пагардай прамовіла:

— Які ты ўсё ж дурань...— і што было сілы пусцілася з узгорка ўніз...

Кручанюк стаяў, аглушаны яе апошнімі словамі, і бессэнсоўна глядзеў, як бегла ад яго каханая жонка, бегла да другога, ужо не хаваючыся, і не мог крануцца з месца, не мог спыніць яе. Штосьці тонкае-тонкае, але надзвычай балючае, абарвалася ўсярэдзіне. У галаве стаяў звон. Анатолю ўяўлялася, што гэта яшчэ гучыць канчатак апошняга слова Іны — «дурань». Ад мноства зблытаных думак, здавалася, разваліцца галава...

Але ўсё прайшло, галава не развалілася і знік непрыемны звон.

«Скончана сямейнае жыццё,— думаў Анатоль, хутка ідучы назад.— Скончан этап славы. Працаваць... Быць з людзьмі чалавекам...»

Зосі дома не было. Ён хуценька сабраў свае рэчы, па-

клаў у Ініну сумку грошы — тыя тысячу рублёў — і пешшу пусціўся ў горад.

У цягнік ён садзіўся ўжо без свайго любімага светлага касцюма. Палягчэў і чамадан з дробязнымі рэчамі пасажыра-халасцяка...

18

Галя жыла ў новым заводскім доме на трэцім паверсе. Яе дзесяціметровы пакойчык меў даволі сціплы выгляд. На высокім акне віселі чысценькія фіранкі сваёй работы, ля дзвярэй, у куце, стаяла невялічкая шафа. Ложак быў устаўлены падушкамі, а побач з ім, засланая чыстым белым абрускам, стаяла тумбачка. Адзінае крэсла знаходзілася за тумбачкай каля акна.

Памыўшыся і пераапрануўшыся пасля працы, Галя села да акна і падпёрла галаву рукамі.

«Вось і скончана мая трывога... Станок атрымаў, пойдзе ў людзі. Як хораша на сэрцы! Я так за яго хвалявалася... Больш, чым за сябе, калі здавала экзамены. Больш...» — падумала яна.

І не зайздросціла Галя, што Асташонак за такі кароткі тэрмін асвоіў станок і тэхналогію, а ёй для гэтага спатрэбілася больш трох месяцаў. Наадварот — радавалася поспеху таварыша, як свайму, бо лёс яго супаў з яе лёсам. Яны абое страцілі бацькоў...

«Чаму я ўвесь час думаю пра яго? Чаму мне прыемны гэтыя думкі?» — задавала сабе пытанні Галя. І баялася адказваць на іх. Вабіў яе гэты чалавек са сваім цвёрдым, але поўным супярэчлівасцей характарам, вабіў крыху суровы, мужны выраз твару, яго разумныя сінія вочы...

«Калі б Змітрок часцей усміхаўся, то ён быў бы вельмі прыгожы хлопец»,— падумала Галя, пазіраючы з вышыні на шумлівую вуліцу. Ведала яна — не многа бывае ў яго вясёлых хвілін, каб усміхацца. А яна часта ўсміхаецца? Вось, калі б ім разам быць... А як жа тады Іван? Ён жа любіць яе і падабаецца ёй... Але ён пры бацьках, пры вялікай і багатай радні, якая амаль носіць свайго любімца на руках. Дзімка не мае нават звычайнай матчынай ласкі, як і яна...

Стук у дзверы перапыніў яе дзявочыя мары. Галя зірнула на сябе ў люстэрка, што стаяла перад ёй на акне, і прамовіла:

— Калі ласка...

Як жа яна была здзіўлена, калі адчыніліся дзверы!

— Ой, Ваня! — спахапілася яна.— Не чакала. У мяне тут зусім не прыбрана...

Азарчук глянуў на сцены, ложак, стол і ўсміхнуўся:

— Чаму гэта ўсе дзяўчаты, калі да іх заходзіш, любяць гаварыць, што не прыбрана? Ну, зрабі лепш, чым ёсць!

Галя засмяялася:

— Твая праўда, хай цябе... Садзіся на крэсла, а я тут на ложку прымайструюся.

А сама з нейкай радасцю падумала: «Значыць, ён заходзіў ужо і да другіх дзяўчат, калі так гаворыць... Не я адна ў яго».

Іван сеў, па звычцы абапёрся локцем на тумбачку і далоняй прыкрыў чырвоную пляму на шчацэ ля вока.

— Я хачу пагаварыць з табою пра Анатоля Кручанюка,— пачаў ён, чамусьці пачырванеўшы.

— Чаму пра Кручанюка? — ускінула бровы Галя.

— А вось чаму... Вясною ён у адпачынку быў?

— Быў.

— З дырэктарам два тыдні ездзіў?

— Ездзіў.

— Цяпер атрымаў адпачынак на цэлы месяц. Ну, скажы, гэта справядліва?

Ждан паціснула плячыма.

— Не задумвалася, прызнацца, над такім пытаннем.

— А-а, вось бачыш,— папракнуў яе Іван.— Цяпер слухай далей... Возьмем «зорачку». Гэты разец перацярпеў вялікую эвалюцыю, тэхсавет зацвердзіў наш групавы варыянт, пасланы чарцяжы ў Маскву. Пры чым тут Анатоль, што з ім так няньчацца! Добры чалавек, а можа звіхнуцца. Што чакае Кручанюка? Расча-ра-ванне! — закончыў Іван.

— Што мы можам зрабіць? — спытала Галя.

— Напісаць калектыўнае пісьмо, папярэдзіць, змякчыць удар, калі хочаш ведаць...

— Не! — запярэчыла Галя.— Няхай удар будзе моцны, каб адразу збіць з яго гонар! Анатоль старэйшы за нас, камуніст...

— Ён сядзіць у Ялце без грошай! Яму дырэктар адмовіў і не выслаў авансу.

Галя прыкусіла верхнюю губу і падумала: «Вось знайшоў аб чым гаварыць! Не хапала яшчэ, каб па Анатолю галава балела. Выскачка, за лёгкай славай пагнаўся...»

— Ваня,— раптам пачала яна так лагодна, што Іван насцярожыўся.— От скажы, Ваня, мне як сябру... Як ты думаеш, калі дзяўчыне быў даспадобы адзін хлопец, а потым спадабаўся і другі... Ці добрая яна, тая дзяўчына? Га?

— Н-не ведаю, Галачка... Наконт гэтага яшчэ няма навуковага даследавання,— жартам, спрабуючы ўсміхнуцца, адказаў Азарчук.— Калі б, скажам, пакахала такая дзяўчына, як ты, то я не сумняваўся б...

— У цябе пытаюць сур'ёзна...— тым жа тонам прамовіла Галя.— Легкадумная яна, ці...

— Тут закурыць можна? — ухіляючыся ад адказу, спытаў Іван.— Ці лепш выйсці ў калідор?

— Не, не, што ты! Кury! — запярэчыла Ждан.— Я адчыню акно...

Пакуль яна адчыняла акно, ён гаварыў:

— Мне, напрыклад, падабаюцца тры дзяўчыны... Знаёмыя... кахаць жа траіх адразу, я, вядома, не магу і не маю права: другім не астанецца...

— Ты зноў жартуеш...

— Я магу кахаць толькі адну, а дзвюх другіх — паважаць, дружыць з імі. Так, мусіць, прыйдзецца зрабіць і той, што пакахала двух...— ужо сур'ёзна адказаў хлопец.

«Ён мяне толькі паважаў... Дружыў»,— чамусьці адразу за гэтыя словы ўхапілася Галя, і ў яе крыху адлягло на сэрцы. І не думала ў гэтую хвіліну, што Іван прыйшоў сёння якраз дзеля таго, каб прызнацца ў каханні, але не хапіла смеласці гаварыць аб гэтым адразу. Галя апярэдзіла яго, аказалася смялейшай, і ён не стаў навязваць сваёй думкі, а даў волю ёй. Не таму, што спадзяваўся на сваю перавагу, а таму, што па натуры быў дабрэйшай душы чалавек.

— Ты не чуў? Ганя будзе здаваць экзамен для паступлення ў музычнае вучылішча...

«Якая Ганя? Аб чым гэта яна? А-а,— успомніў Іван.— Гэта ж сястра Змітрака...»

— Не, не чуў...

— Будзе канцэрт з яе ўдзелам. У нашым клубе...

— Пойдзеш?

— І ты пойдзеш...

— Чаму і я?

— Абавязкова! Каб ты ведаў, Ваня, што гэта за цудоўная дзяўчынка! — у захапленні гаварыла Галя.— А хлоп-

чык Алік такі кучаравы... Разумны — не кажы! Аднойчы падвёў мяне да партрэта маці і гаворыць: «Наша мама, як і тата, памерла, але ты, цёця, не кажы Дзімку, што я ведаю пра гэта. А то ён будзе плакаць...» Ім так не хапае добрай жаночай ласкі, руплівых рук...

Яна ўзняла галаву і вачамі, поўнымі слёз, зірнула на Іванаў бледны твар.

А неўзабаве, схаваўшыся за фіранкай, убачыла, як, засунуўшы рукі ў кішэні, Азарчук паволі крочыў па тратуары...

19

Асташонак прыйшоў на змену раней за ўсіх. Спыніўся каля дошкі паказчыкаў і задаволена ўсміхнуўся: на ёй ужо было напісана і яго прозвішча.

— Маё прозвішча,— прашаптаў Змітрок.— Маё... Яно не будзе апошняе.

У расчыненых дзвярах цэха раптам заўважыў Петрака, таго рабога хлопца, з якім яны пасля выпускнога вечара паспрачаліся і, не прымірыўшыся, разышліся.

«Ён адзін паступіў... Журналіст!» — без асаблівай зайздрасці падумаў Асташонак і пачаў чакаць таварыша з усмешкай на твары. Той таксама ўбачыў Змітрака і нібы спалохаўся.

— Дзімка! — раптам усклікнуў Пятрок і з распасцёртымі рукамі кінуўся да яго.— Ну, здароў, дружышча! Ты тут? Вось здорава... Ну, малайчына!

Ён не даваў Асташонку разявіць рот, усё гаварыў і гаварыў сам: задаваў пытанні і адказваў на іх.

— Ты ўсё такі ж... балбатун! Памятаеш? — уставіў Змітрок.

— Як жа! У школе называлі цецеруком... А я і не крыўдаваў! Дык тут, значыць... Здо-орава! А я іду сабе і думаю, хто гэта тут за начальніка цэха! — засмяяўся Пятро, аглядаючы рабочую вопратку Асташонка.

— Вось яшчэ! Знайшоў дастойнага чалавека...— таксама смеючыся, адказаў Змітрок.— Гэта ўсё роўна, каб я зблытаў цябе з дэканам факультэта.

— Я ім буду! — падняў угору палец Пятро.— Ты мяне ведаеш. Я — што дзяцел: б'ю ў адно месца — будзе і дупло некалі...

— Тады, можа, і я стану начальнікам цэха! — не здаўся Змітрок. Ён пасадзіў таварыша на скрынку з-пад дэта-

лей, паслаўшы кавалак газеты.— Садзіся, гнілая інтэлігенцыя!.. Якія дарогі прывялі цябе сюды?

Той пакорліва сеў і з гордым выглядам зазначыў:

— Ты разумееш... Стукнула мне ў галаву ідэя для саліднасці напісаць які-небудзь нарыс, як кажуць, мець сваю літаратурную заяўку, ну твор...

— Пра наш завод?

— Пра людзей вашага завода,— з выглядам знаўцы Пятро падкрэсліў слова «людзей».— Прыйшоў пазнаёміцца з імі, папрацаваць тыдзень-другі падсобным рабочым...

— Думаю, мяне ты ведаеш добра...

— Бач ты яго! — усклікнуў Пятро.— Для саліднага нарыса не падыдзеш...

— Чаму ж?

— Ну што я пра цябе напішу? Ты лаўрэат?

— Не.

— Ардэнаносец?

— Не...

— План выконваеш на некалькі сот працэнтаў?

— Зрабіў першую дэталь.

— Вось бачыш... Мне патрэбны людзі вядомыя, так сказаць, тыя, што чытаюць лекцыі для вучоных! Словам, людзі, аднаго аўтарытэту якіх будзе дастаткова, каб мой нарыс надрукавалі, разумееш, галава!

— Ты гэта сур'ёзна? — прыжмурыўшыся на таварыша, спытаў Асташонак.— А звычайныя, радавыя людзі цябе не цікавяць?

— Не,— пацiснуў плячыма Пятрок.— Што з іх узяць? І нарыс рэдакцыя можа не прыняць...

Вочы Змітрака загарэліся гневам.

— А ты знаеш, чаго мне каштавала такая ж няправільная думка?

— Цяпер у цябе іншая думка?

— Больш за ўсё трэба любіць і паважаць простага чалавека! — не адказаўшы таварышу, задумліва пачаў Змітрок.— На яго ніколі не будуць тыцкаць пальцам... Ён дзень у дзень вырабляе свае дэталі, якія ў машынах нават і не прыкметны, і ніхто не даведаецца аб яго існаванні, а ён — волат!

— Ну і што з таго?

Асташонак загаварыў яшчэ больш узрушана:

— Як гэта што! У школе нам гаварылі, што навука зробіць нас вялікімі людзьмі, і мы не разумелі сэнсу гэтага слова! Нам здавалася, што той, хто не можа стаць вучо-

пым,— нішто, бядак, якога варта толькі шкадаваць. Чаму? Хто гэта сказаў?.. Жыццё ствараюць звычайныя, радавыя людзі. Іх — мільёны! Знатных жа — адзінкі. І ў літаратуры чамусьці ўслаўляюць гэтыя адзінкі...

Пятрок з прыемнасцю слухаў шчырую споведзь таварыша, які не так ужо і даўно думаў зусім інакш. Калі Змітрок скончыў, ён паклаў яму руку на плячо і сказаў:

— Малайчына, Дзімка! Ты стаў зусім-зусім іншы. Не крыўдуй па мяне, што пажартаваў. Паспрабую напісаць пра звычайнага чалавека, як ты гаворыш.

Змітрок зразумеў, што заўчасна пагарачыўся, і жартам сказаў:

— Ну, тады пішы пра мяне, халера...

— Пра цябе — нарыс? — ссунуў той бровы.— Ды пра цябе я напішу калі-небудзь цэлую аповесць! Вось толькі скончу вучобу, набяруся ведаў...

— Чорт! — перапыніў яго Асташонак.— Пакуль ты скончыш вучобу, я стану вядомы! Разумееш, буду вядомы! І табе зноў не давядзецца пра мяне пісаць. Не, брат, давай лепш цяпер...

Хлопцы, смеючыся, моцна націснулі адзін аднаму рукі.

— Чакай практыканта! Толькі вазьму дазвол...— сказаў на развітанне Пятрок.

Асташонак, паказаўшы яму ўслед кулак, пачаў рыхтаваць сваё рабочае месца.

І калі загучала рытмічная музыка станка, Змітрок успомніў той першы дзень, калі прыйшоў на гэты завод, прыгадаў першыя сустрэчы з Анатолем, Іванам, Галяй...

Ён азірнуўся туды, дзе віднелася Галіна белая хусцінка, і лёгка ўздыхнуў. Цяпер яна была самым блізкім, самым жаданым для яго чалавекам на зямлі...

Кожны вечар Змітрок сам прыбіраў пакоі і чакаў, чакаў, калі пачуецца на лесвіцы дробненькі стук Галіных лакіраваных басаножак і смуглявы твар яе выгляне з-за дзвярэй, лагодна пытаючыся:

— Да вас можна?

«Мілая, цудоўная Галя! Як ты не падобна на Іну... За цябе я, колькі стане сіл, буду змагацца. І ніхто не здолее адабраць цябе, ніхто!»

Змораны, але шчаслівы ішоў Змітрок дадому. Ля самага пад'езда ён заўважыў Анатоля Кручанюка. Непаголены і схуднелы, у простай вопратцы — сіняй кашулі і шэрых

штапах,— Анатоль цяпер не пагадваў «артыста з опернага». Ён быў звычайны рабочы хлопец...

«Некага чакае... Што з ім здарылася?» — з трывогаї падумаў Асташонак, але крыўда на таварыша яшчэ таілася ў гапарлівай душы. Імкнучыся прайсці незаўважаным, Зміцрок звярнуў за вугал, але Анатоль дагнаў яго.

— Здароў, Зміцер...

— Зміцер — хіцер, але і Саўка не дурань,— непрыязна адказаў Асташонак, не падаўшы рукі.

Кручанюк спахмурнеў.

— Ясна... Злуешся... з-за Іны.

— Чужыя жонкі мяне не цікавяць!

— Яна была тваёй дзяўчынай...

— Ніколі!

— Дык чаму ж не падаеш рукі?

— З-за твайго ўчынку,— не гледзячы на Анатоля, адказаў Зміцрок.— Сам факт...

— Гэта праўда,— перапыніў яго Кручанюк і ўздыхнуў.— Усім я, што называецца, насаліў... Даруй, братка...

Зміцрок павярнуўся і хацеў ісці, але цікаўнасць — што ж здарылася? — і гэтакае «пакаянне грэшніка» зменшылі яго ганарлівасць.

— Дык, можа, зойдзем у дом? — схапіў ён таварыша за руку.— Пагутарым...

— Калі не будзеш трымаць камень за пазухай — зайдзі!

— Вось, глядзі,— усміхнуўшыся, Анатоль расшпіліў гузікі кашулі.— Там нічога няма...

А дома, седзячы на канапе, Кручанюк з агідай расказваў Зміцраку аб сваім кароткім, поўным непрыемнасцей, сямейным жыцці, аб прыгодах няўдалага «мядовага месяца».

— Ты быў душою мацнейшы за мяне, калі выстаяў перад спакусамі асабняка Іны... А я зваліўся ў балота,— гаварыў ён.— Цяпер з дому папрасілі. Маці хоча, каб я вярнуўся да Іны, гоніць назад, у Крым... Вось і прашу цябе... Пакуль уладкуюся дзе, пусці на кватэру.

— Глупства. Ты пойдзеш дамоў...

— Але не сёння!

«Як дзіўна складваецца лёс чалавека,— думаў між тым Асташонак.— У аднаго — няшчасце, гора, невядомасць... У другога — ясны шлях, трывалае становішча, радасць і ўдачы ў жыцці. І раптам гэтыя людзі мяняюцца ролямі... Як у спектаклі! Дзіўна...»

— Адбіваць больш дзяўчат не будзеш? — ужо жартам спытаў Змітрок.

— Урачыста абяцаю...

— Пакляніся!

— Клянуся...

Яны засмяяліся. Потым Змітрок расказаў пра свае поспехі.

— З першага дня даў норму! — пахваліўся ён.

Анатоль спахмурнеў і паківаў галавою.

— Даў норму... Ты гэта сказаў, як некалі я. Не ганарыся, Змітрок. Няхай лепш людзі пра цябе скажуць, што ты добры работнік, сціплы. Сціпласць упрыгожвае нас лепш, чым ганарлівасць, запомні гэта...

— А я даўно запомніў! Яшчэ бацька гаварыў — ганарлівасць, як басы ў раяля, грубая штука... Кране тыя струны, дык яны адразу заглушаць лагодную музыку душы...

— Вось гэта правільна сказана! — павесялеў Анатоль.

Змітрок пайшоў на кухню. Прынёс хлеб, талеркі, лыжкі, паставіў сярод стала эмаліраваную каструлю і зняў накрыўку.

— Чым гэта смачным такім сёння нас Ганя накорміць? — стараючыся пераймаць гаворку Змітрака, сказаў Алік.

— Тым, чаго ты не любіш,— усміхнулася Ганя.— Капустай...

Яна разліла страву ў талеркі.

— Няпраўда! — усклікнуў малы.— Мой любімы суп гарохавы...

У гэты момант адчыніліся дзверы і на парозе з'явілася Галя. Яна была ў чорнай шарсцяной сукенцы з фігурным выразам наперадзе, у сваіх чорных лакіраваных басаножках, з сумачкаю ў руках. Чорныя косы, выкладзеныя на галаве, надавалі твару прыемную строгасць.

— Я так і ведала, што траплю на абед! — весела ўскліпнула яна ад дзвярэй.— А гэта табе, Алік, на трэцяе — дэсерт...

Галя паклала перад малым вялізны чубаты ананас і, заўважыўшы Кручанюка, сумелася.

— Што, не пазнала? — скрывіўшы ўсмешкай вусны, спытаў той.

— Толя?.. Адкуль ты?..

— Я... І не здзіўляйся, і нічога не пытайся: табе ўсё раскажа Змітрок,— папярэдзіў яе Анатоль.

— Размова з табою будзе там, на заводзе,— строга адказала Ждан.

— Правільна! А цяпер садзіся да стала, а то я з раніцы нічога не еў... Не лезла ў горла матчына ежа, перасыпаная папрокамі...

Колькі было радасці Аліку! Ён схапіў ананас, панюхаў яго, а потым укусіў і зморшчыўся:

— Цьфу!.. Як смала...

Усе пачалі смяяцца не таму, што гэта дужа было смешна, а таму, што трэба было змяніць гутарку і настрой. Усе гэта адчувалі...

— Трэба спярша з'есці абед, потым ачысціць...— гаварыла Галя, выціраючы хусцінкай Аліку губы.

Ганя паставіла на стол пятую талерку, а Змітрок мігам прынёс з другога пакоя яшчэ адно крэсла.

— З гэтага дня,— сказаў ён Галі,— крэсла і талерка будуць чакаць цябе заўсёды...

— Мгм,— усміхаючыся, Галя кіўнула галавою ў знак згоды і села за стол...

Паабедаўшы разам, яны пайшлі ў Палац культуры на канцэрт.

Вялізная зала ўжо была поўная. У адным месцы Галя прыкмеціла Азарчука, Арцёма Белага, Забаўскага з жонкаю, Ганну Аляксандраўну...

— Ідзём туды, да сваіх! — пацягнула яна Змітрака.

«Да сваіх!.. Як гэта добра мець сваіх...» — падумаў Асташонак, ідучы за Галяй і Анатолем. Яны прывіталіся з усімі. Іван штосьці шапнуў Кручанюку.

— Пасля канцэрта...— толькі пачулі Змітрок і Галя.

— Я гатоў... Чакаў такой сустрэчы,— адказаў Анатоль.

Іван пазнаёміў Ганну Аляксандраўну з Галяй.

— Галя, улічы — яна добрая свацця! — пажартаваў ён.

Галя зачырванелася і адказала:

— Абавязкова ўлічу...

І вось заслона адкрылася.

Ганя, у доўгай белай сукенцы з ружовай кветкай на грудзях, стаяла на самым краі сцэны, а за ёю размясціўся сімфанічны аркестр. Яна ўскінула да падбародка скрыпку, падняла смычок. Ціха і лагодна паліліся прыгожыя гукі. Канцэрт пачаўся...

Недзе на сярэдзіне канцэрта Галя шапнула Змітраку:

— Няўдзячны брат! Ён заўсёды так слухае музыку сваёй сястры,— і паказала на Аліка, які, паклаўшы галаву

на Галіны калені, салодка спаў. Яго разбудзіў раптоўны гром воплескаў.

— Вось і не праваліліся! — задаволена сказаў Алік, пляскаючы далонямі і соннымі вачамі пазіраючы на сцэну, дзе, па заведзенаму парадку, увесь аркестр віншаваў Ганю...

Назад ішлі ўчацвярых: Галя, Змітрок, Алік, Ганя...

Анатоль памкнуўся ісці за імі, ды Азарчук узяў яго за руку:

— Стой, Толя... Нам сёння яшчэ трэба пагаварыць! — сказаў ён так настойліва, што Анатолю нічога не заставалася, як згадзіцца.

Галя толькі крыкнула ім наўздагон:

— А мы на заводзе пагутарым! Разам, усе...

«Як добра з імі!» — падумаў Анатоль, хоць ведаў, што гаворка будзе строгая, шчырая.

— Чаму ты адзін? — калі яны выйшлі на праспект, адразу спытаў Іван.— Дзе Іна?

— Пакінуў у Ялце... Жыць з ёю не буду,— катэгарычна адказаў Анатоль.

— Чаму?

— Яна зблыталася там з нейкім фізкультурнікам Артурам...

— Ты дзе быў? Назіраў збоку і папракаў? Трэба ж было актыўна выхоўваць жонку: маладая яна ды крыху легкадумная. Бяда не вялікая... А кідаць яе, гэта значыць — штурхаць у бездань... І яна так нічога не напісала табе?

— Прыслала тэлеграму... Паехала да бацькі. І просіць, каб я дараваў ёй...

— Вось гэта іншая справа! — радасна ўсклікнуў Азарчук.— Пішы — няхай хутчэй вяртаецца... Мы ўцягнем яе ў наш калектыў і будзем разам выхоўваць... заадно з табою! Але гэта пакуль пакінем...

Адразу нейкі цяжар быццам зваліўся з Анатолевай душы. Ён успомніў Іну, і вызваленая душа пацягнулася да яе... «Так, яна часам кахала мяне... Значыць, ёсць надзея, што ўсё ўладкуецца... Урэшце, і я не такі ўжо крышталь-на чысты чалавек, а яна, можа, нават і не так вінавата, як думалася мне...»

— Іван! — усклікнуў расчулены Анатоль.— Ты ведаеш, Іван, як я кахаю яе...

Іван не адказаў. Ён быў рады, што першы слабы штуршок накіраваў Анатолевы думкі і пачуцці на правільны шлях...

Быў позні час, калі Змітрок з дзецьмі і Галяй прыйшлі дадому, Ганя радасна гаварыла:

— Валянціна Мікалаеўна сказала, што мяне прымуць у вучылішча! І яшчэ нейкія дзядзькі сказалі, што ў мяне талент... Я так была рада, так рада!..

— Ты будзеш вучыцца, Ганя,— пагладзіла яе па галаве Галя.— Абавязкова...

А потым, калі сястра і брат ляглі спаць, Змітрок падаў Галі яе сумачку і сказаў:

— А можа, застанешся ў нас?.. На канапе пераспіш, заўтра ж нядзеля...

Галя пагражальна паківала каля яго носа пальцам і строга сказала:

— Ты толькі не зблытай мяне з Інай!

Ён сціснуў Галю ў моцным абдымку і пацалаваў.

— Вось! Вось... На злосць табе... З Інай у мяне гэтага ніколі не было! Цяпер можаш злавацца...

Галя адбеглася і прыпала тварам да вушака. Потым азірнулася на дзверы, дзе спалі дзеці, падышла да Змітрака і паклала свае рукі яму на плечы.

— Цяпер я...— аднымі вуснамі, амаль без голасу, прамовіла дзяўчына.— На развітанне. Таксама, першы раз...

І калі на калідоры сціх тупат яе ног, Асташонак пачуў, як ціхенька рыпнулі дзверы спальні. Ён падышоў і тузануў іх. За дзвярамі, апусціўшы галаву, стаяла Ганя.

— Ты-ы? — спытаў Змітрок.

— Я... хацела напіцца...

Змітрок запаліў святло і паказаў на тумбачку, што стаяла каля Ганінага ложка: на ёй быў графін з вадою.

— Бачыла нас?

— Бачыла! Не маленькая ўжо...— смела адказала сястра.

— Дык... кладзіся і спі,— падабрэў Змітрок.

— А Галя будзе ў нас? Яна такая харошая, Дзіма... Ты не пакідай яе, глядзі...

— Кажу — спі! — Ён з удзячнасцю паглядзеў на сястру і, калі тая лягла, накрыў яе коўдрай.— Не пакіну... Ніколі!

— Цяпер буду спаць...

Асташонак зноў стаяў на балконе і не спаў усю ноч, але гэтая ноч была радасная для яго.

1961

# У БАРКОЎСКАЙ ПУШЧЫ

Восень.

Сярод лісця і моху дзе-нідзе яшчэ трапляюцца старыя злінялыя мухаморы, ды ў гушчары, ля замшэлых пнёў, чарнеюць пацямнелыя ад восеньскіх дажджоў апенькі.

З бяроз, што густа растуць між хвой на ўзлессі, ціха і бясконца сыплецца жоўтае лісце. Ад парываў ветру бярозкі ўзмахваюць галінамі, быццам страсаючы з сябе гэтае летняе ўбранне.

Цікавы і прывабны куток — Баркоўская пушча. Тут ёсць балоты, дзе летуюць гусі і качкі, ёсць азёры, поўныя рыбы, ёсць прасторныя паляны з зялёнай сакавітай травой для дзікіх коз і ласёў, ёсць рака Бароўка, на якой даўно пасяліліся бабры. А самае важнае ў Баркоўскай пушчы — бары. Сосны, быццам адлітыя з бронзы, паважна і велічна хістаюць вяршалінамі, і, калі глядзець угору, на белыя воблакі, здаецца, плыве зямля.

Сёлета прыйшлі сюды людзі. Прыйшлі і спыніліся ў гушчары, высеклі яго і на голым месцы паставілі некалькі драўляных будынін.

З таго часу, як толькі ў пушчы прачынаецца дзень, нейкім новым гулам гудзе яна, поўніцца людскімі галасамі...

Прабіраючыся па вузкай сцяжынцы на лесасеку, матарыст Лявон Ліпніцкі па-гаспадарску аглядаў тоўстыя падсечаныя сосны. «Час валіць іх,— падумаў ён,— а то хутка ў адстаўку выйдуць...»

На плячах у Ліпніцкага кароткая электрапіла, якая служыць і сякерай. Ён сярэдняга росту, дзябёлы, павольны ў рухах. І нават дзіву даешся, як гэты цяльпух ухітраецца дзве нормы за дзень даць.

Ліпніцкі спыніўся і паглядзеў навокал сябе. Вось ён,

лес які! Сэрца радуецца, калі глядзець на яго, удыхаць лясны вільготны водар. Ціха так, што чуваць уласнае дыханне. І раптам недзе застукаў матор, быццам хто на матацыкле прыехаў.

«Уключылі ўжо!» — з задавальненнем адзначыў сабе Ліпніцкі і шпарка рушыў на паляну першай эстакады.

Вальшчыкі і трактарысты, стоячы каля вогнішча, весела аб нечым гутарылі. Ліпніцкі прайшоў да будана, дзе хавалі на ноч кабельныя шлангі, і, захапіўшы два скруткі, падключыўся да асноўнага кабеля.

Зазвінела піла. Высокая гонкая прыгажуня-сасна раптам уздрыгнула і, ледзь крутнуўшы вяршалінаю, з працяглым стогнам пачала падаць. Яшчэ не заціхла водгулле, а ўжо ўздрыгнула другая, трэцяя...

І раптам зноў стала ціха-ціха.

— Адбо-ой! — пачуўся гучны бас механіка, і Ліпніцкі аж скрыгануў зубамі. Толькі ў азарт увайшоў, і вось — на табе! «Адбой!» Гэта значыць, электрастанцыя зноў стала на рамонт.

Ліпніцкі адключыў пілу і, ускінуўшы яе на плечы, рашуча закрочыў да станцыі. Там ужо тупаў начальнік лесаўчастка Васіль Барэйка. Як заўсёды, пануры і маўклівы, ён толькі кіўком галавы прывітаўся з Ліпніцкім.

— На доўга сталі? — стрымана спытаў матарыст.

— Відаць, на поўдня...

— Эх, гора-механікі! Якая мама вас толькі на свет парадзіла,— лаяўся маленькі чубаты лесаруб з чорнымі жвавымі вочкамі.— Збягу ад вас... Нарміроўшчыкам у кантору пайду, у сакратары падамся! Не работа, а чорт ведае што.

— Ціха, таварышы. Усё паладзіцца,— міргаў вялікімі вачыма Барэйка.— Да нас едзе яшчэ адзін механік. Праўда, таварыш Ліпніцкі?

— Так, Вера...— задумліва пацвердзіў матарыст і ўздыхнуў.— Едзе. Толькі думаю, што нам ад гэтага ні холадна ні горача не будзе — да Сіліча накіруюць.

— А ты пазмагайся за сястру, каб у нас пакінулі,— прамовіў Барэйка.

Ліпніцкі ўсміхнуўся, бо ведаў прычыну, чаму Барэйка так жадае мець новага механіка. Дзён пару назад ён паказаў Барэйку фотакартку гэтага механіка, і начальнік участка вельмі доўга глядзеў на яе.

— Я пастараюся, таварыш Барэйка,— паабяцаў матарыст і, змяніўшы электрапілу на лучковую, рушыў у лес...

* * *

Маладыя ліпкі ў інеі.

Сонца яшчэ не ўзышло, і яны стаяць, быццам апавітыя белай смугою.

Слухаючы роўны гул трохтоннай машыны, Сініцкая задумліва пазірае ўперад праз цьмянае ветравое шкло. Там, за далёкім борам, амаль на паўнеба ўспыхнула зара. Грузавік імчыць ёй насустрач, абуджаючы грукатам ранішнюю цішыню.

«Бывай, горад! Бывай, родны тэхнікум. Наперадзе — праца, новае жыццё, цудоўнае і заманлівае».

Маўчанне парушыў Пятрусь, малады шафёр у сінім камбінезоне паверх ватоўкі і ў танкісцкім шлеме.

— Значыць, як бы гэта сказаць, едзеце да нас на працу і не ведаеце яшчэ, што такое Баркоўская пушча? Шкада...

Гаворыць ён гучна, расцягваючы кожнае слова. Позірк яго ні на хвіліну не адрываецца ад шэрага бруку, які імкліва бяжыць пад колы машыны.

— Чаму ж шкада?

Вера ўважліва паглядзела на хлопца, на звычцы ледзь прыжмурыўшыся.

— Парадкі ў нас, як бы сказаць, не важнецкія. І жыццё не асабліва вясёлае. А жывём, сапраўды, як у пушчы. Ні кіно, ні лекцый якіх...

— Ведаю. Чула ад Ліпніцкага. Матарыстам у вас працуе...

Пятрусь падазрона глянуў на спадарожніцу.

— А вы адкуль ведаеце яго?

— Мой стрыечны брат.

— Спраўны хлапец. Летась у Чэрвеньскім леспрамгасе ордэн Чырвонага Сцяга за працу атрымаў. А прыйшоў да нас, у Баркоўскі леспрамгас,— на лучковую пілу сеў. Ці многа дасі ёю?

— А механізмы?

— Ат,— махнуў Пятрусь рукою,— не ўкаранілі яшчэ як след.

— Цікава...

Вера гаворыць разважліва. Гэта як бы дадае ёй сталасці, хаця на самай справе Сініцкай яшчэ не поўных дваццаць год. Яна сярэдняга росту, з прыгожым, ледзь загарэлым тварам.

Цёмныя косы, выкладзеныя на галаве каронай, надаюць яе спакойнаму твару строгасць, рашучасць. У яе тон-

кія вусны і прыгожыя чорныя бровы. А ля вачэй ледзь бачны тоненькія маршчынкі, і калі Вера моцна задумваецца, маршчынкі становяцца больш прыкметнымі. Тады ёй можна даць гадоў нават дваццаць пяць, а то і больш.

Набыўшы спецыяльнасць электрамеханіка, Сініцкая сама выбрала працу ў лесе. Яе вабіў лес, яго таямнічы гоман уначы, яго трывожны шум перад навальніцай, яго вясёлы шэлест летнім ранкам...

Машына ўвайшла ў пушчу. Вера не адрывае вачэй ад шурпатых камлёў, на якіх блішчаць жоўтыя падсочкі з бляшанымі, перапоўненымі смалой, прыёмнікамі.

Пасля бор скончыўся. Справа і злева пацягнуўся зялёны малады саснячок. Калі глядзець з кабінкі, здаецца, яму няма канца-краю. Роўнымі радамі сасонкі ідуць да самага небасхілу...

— У вайну яшчэ,— зноў ціха пачаў шафёр,— фашысты выпалілі тут лес. Мы яго ў сорак шостым сеялі. Расце! — Ён памаўчаў крыху і дадаў: — Пасеялі на сто сорак гектараў больш, чым фашысты выпалілі...

Неўзабаве дарога павярнула ў цёмны ельнік, пагоршала. Веру чамусьці стала моцна падкідаць на мяккім сядзенні, а шафёр сядзеў хоць бы што.

Яшчэ з паўгадзіны ехалі па лясной дарозе, збочваючы то ўлева, то ўправа, пакуль машына не спынілася ля доўгай паветкі-гаража. Гэта база ўчастка.

— Таварыш Дубовік! Гаручае прывёз,— крыкнуў некаму Пятрусь. Вера захвалявалася, сяк-так адчыніла кабіну і ступіла на мёрзлую зямлю.

Пятрусь зняў чамаданы Сініцкай і, не ставячы іх, паглядзеў на дзяўчыну дапытліва.

— Куды цяпер мне? — спытала яна.

— У кантору... Калі хочаце, я давяду,— нясмела вымавіў ён.— Дырэктар заўсёды там.

— Калі ласка...

Яны паволі рушылі да канторы, побач з якой стаяў інтэрнат. За ім яшчэ сем будынкаў — і ўсё.

Вуліца перад будынкам была пасыпана жоўтым пяском. На невысокіх слупах віселі электрычныя ліхтары. У будынках таксама электрычнасць. Гэта, відаць, скарысталі перасоўную электраўстаноўку.

— Як жа называецца ваш горад? — усміхнулася Вера, пазіраючы на хлопца сваімі прыжмуранымі вачыма.

— Светлагорск,— не задумваючыся, адказаў той.— Мы так называем.

— Гучпа... Калі-небудзь, можа, тут вырасце сапраўдны горад, хто ведае...

— У гэтай пушчы?

— У пушчы.

Пятрусь прыпыніўся ля дзвярэй канторы.

— Цяпер, прабачце... Вось сюды,— паказаў ён.— Толькі пастукайце, а то ў нас Іван Маркавіч, начальнік, чалавек з характарам, павагу да сябе любіць... А пра горад мы як-небудзь пагутарым.

— Дзякую за параду.

Вера падышла да дзвярэй і міжвольна пачырванела — яна хвалявалася.

Іван Маркавіч Адамчук, мужчына гадоў сарака пяці, апрануты ў вайсковую форму, з шэрым невясёлым тварам і вялікімі залысінамі на лбе, сустрэў Веру суха.

— Сініцкая Вера Паўлаўна,— адкінуўшыся на спінку крэсла, прачытаў ён на паперцы, якую падала Вера.— Добра, добра... Спадзяюся, вы сёе-тое наладзіце ў нас. Толькі абжываемся. Механікаў мала... Валодзька! — раптам крыкнуў ён.— Залічы на Сілічаў участак,— і прасунуў паперку Сініцкай у фортку, якая адчынялася ў суседні пакой.— Галоўным механікам!.. Чуеш?

— Ёсць залічыць на Сілічаў участак галоўным механікам,— пачуўся звонкі голас, і ў фортцы паказалася чубатая галава Валодзькі, які сёння першы дзень займаў пасаду нарміроўшчыка.

Адамчук устаў і, абапёршыся тоўстымі кулакамі на стол, хітравата глянуў на Веру.

— Мець людзей з адукацыяй надзвычай прыемна для нас. Ад гэтага толькі карысць. Так?..

Веры ён не спадабаўся.

Калі яна ішла з канторы на адведзеную ёй кватэру, упершыню адчула сябе адзінокай і засумавала.

* * *

Участак Сіліча, куды прызначылі Веру галоўным механікам, лічыўся лепшым. Ды і сосны тут былі на славу, быццам спецыяльна падабраныя.

Сам Сіліч, высокі, дабрадушны бландзін, прыняў Сініцкую ў свой калектыў ахвотна, нібы даўно чакаў яе.

— Вам тут будзе не цяжка,— паабяцаў ён пры першай сустрэчы.— Механікі і манцёры ў мяне — золата.

Аглядаючы электралябёдкі, пілы і электрычныя ўста-

ноўкі, Вера хутка пераканалася, што Сіліч казаў праўду. Брыгады працавалі дружна, кожны добра ведаў сваю справу і ўмела выкарыстоўваў механізмы...

Была ціхая сонечная раніца, адна з тых раніц, калі прачнуўшыся, адразу ідзеш да акна і доўга глядзіш на свежы снег, на задуменны, у сіняй смузе лес.

Вера ішла на працу вясёлая. Паветра было мяккае, зусім не такое, як учора, калі голая зямля грукала пад нагамі.

Прайшоўшы ў кірунку недабудаванага клуба, Сініцкая азірнулася. У гэты час паблізу загуў трактар, а разам з ім зашумеў над лесам вецер. З хвоі пасыпаўся снег, абсыпаў Верын твар, плечы, хустку.

— Добры дзень! — пачула Вера голас Петруся. Хлопец падыходзіў да яе з цёплай усмешкай на твары, як даўно знаёмы.

— Добры дзень...

— Ну, як вам тут... Спадабалася?

— Сказаць па праўдзе, вельмі спадабалася,— прызналася Вера.— Не чакала нават.

— Вось і добра,— ускінуў бровы шафёр.— Вы ў Сіліча? О, ён можа стварыць умовы такому чалавеку, як вы. Пусціць, як той казаў, дым у вочы.

— Чаму — такому чалавеку, як я?

— А-а, самі зразумееце...

Вера сумелася. Што гэта азначае? На што намякае Пятрусь? Што гэта за «ўмовы» і што за чалавек Сіліч? Але распытваць Петруся пра ўсё гэта яна не адважылася, а спытала пра другое:

— Вы не ведаеце, як ідуць справы на суседнім участку, у Барэйкі?

— Вось аб гэтым хацеў я запытаць у вас, Вера Паўлаўна...

У голасе Петруся адчувалася крыўда.

— Адкуль мне ведаць, што дзе робіцца, я ж тут навічок.

— Навічок — гэта праўда,— сказаў Пятрусь больш лагодна.— Але ўчора новыя дзве пілы атрымалі?

— Атрымала.

— Гэта з участка Барэйкі. Далей — новую электраўстаноўку «ПДС-15» атрымалі? Таксама з яго ўчастка. Адабралі і перадалі вам.

— Нічога не разумею.

— А вы схадзіце да Васіля Барэйкі. Зразумееце...

І Пятрусь, кінуўшы даверлівы позірк на Сініцкую, адышоў.

«А што, калі б, сапраўды, схадзіць да Барэйкі?.. Лявона там убачу»,— падумала яна і рашуча закрочыла на дарогу.

З-за павароткі выехала газагенератарка. Вера ўзняла руку. Незнаёмы шафёр адкрыў кабіну.

— Мне на ўчастак, да Барэйкі,— сказала Вера, стараючыся перакрычаць гул матора.

Калі Вера злезла з машыны і па вузкай сцяжынцы накіравалася на лесасеку, яна адразу заўважыла вялікую розніцу паміж участкам, які яна ўжо лічыла сваім, і ўчасткам Барэйкі.

Сам Васіль, шыракаплечы, дужы, у чорным кажушку і зімовай шапцы, на якой яшчэ было прыкметным месца, дзе пядаўна была зорачка, стаяў ля вогнішча і абыякава загадваў дзяўчатам:

— І гэтую верхавіну сюды, у агонь. Каб хоць чыста было.

Пры з'яўленні Веры ён збянтэжыўся.

— Таварыш Сініцкая?.. Вось нечаканасць!.. Што ж, добры дзень, праходзьце сюды.

Вера падышла бліжэй, абтрэсла з хусткі снег і, азіраючы наваколле, прамовіла з дакорам:

— І то сказаць — нечаканасць. Да людзей — дарога, а да вас — толькі сцяжынка. Ледзь знайшла.

Тут яна заўважыла, што і постаць Барэйкі і яго круглы твар з тупым падбародкам нагадваюць ёй нешта знаёмае, быццам калісьці яны ўжо сустракаліся. На момант Вера задумалася, але так нічога і не ўспомніла.

— Вы прыйшлі пацікавіцца, як мы тут выкарыстоўваем машыны? — з-пад ілба зірнуў на яе Барэйка.— Пойдзем да Прохарава. Гэта мой электрамеханік, ваш калега.

Ён зацягнуў тужэй рэмень на кажушку і рушыў наперад, пракладаючы валёнкамі сцежку па цаліку.

— Як гэта ў вас тут лес валяць? — спытала на хаду Вера.

— Катлом. Спосаб такі ёсць...

Сініцкая не ведала гэтага спосабу, але ўсё ж падумала: «Непарадак які! Ні прайсці ні праехаць».

— Ведаеце,— зноў пачаў Васіль Барэйка,— у нас зусім іншыя ўмовы, не такія, як на Іванаўскім участку, у Сіліча.

— Хіба вы не нашага леспрамгаса?

— Ад гэтага справа не мяняецца. У нас два лагеры,— ён рашуча глянуў на Сініцкую.— Так, так... Лагер Сіліча і — Барэйкі.

— Як гэта?

— Як ёсць. Начальству, відаць, патрэбна. Вось яно і стварыла сабе шыльду — паказальны ўчастак Сіліча. Лепшых спецыялістаў — Сілічу, лепшую тэхніку — Сілічу. Усё яму. Нават маіх лепшых пільшчыкаў забралі. І хваляць яго — герой! А ён зазнаецца, задзірае нос вышэй лесу.

— Я гэтага не разумею...

— І я раней таксама не разумеў... Глядзіце, вунь стаіць наша лепшая станцыя, націкаўцеся ёю.

Механік Прохараў сустрэў іх кіўком галавы і ветлівым «добры дзень, маладыя людзі».

Барэйка дастаў з-пад папружкі рукавіцы і, дапамогшы Прохараву, які каціў да станцыі бочку з бензінам, сказаў:

— Таварыш Прохараў... Тут вось цікавяцца нашай тэхнікай. Пакажыце сваю «ПС-12-200».

Прохараў, немалады чалавек, у чорнай ватоўцы, паглядзеў на Веру сваімі яснымі блакітнымі вачыма і сказаў:

— Вы добра зрабілі, што прыйшлі сюды сёння. Вось наша новая машына. Учора толькі атрымалі...

Сініцкая падышла да машыны і пазнала яе. Тры дні назад па загаду Сіліча гэтую станцыю накіравалі на базу, запісаўшы ў сшытку прафілактыкі: «Замяніць кольцы поршняў і адрамантаваць калектар».

— Вам яе з базы прывезлі? — павярнуўшыся да Барэйкі, спытала Сініцкая.

— Проста з участка Сіліча, ад вас,— пахмурыўшы бровы, сказаў механік.— І кожны дзень так. Лепшае забіраюць, горшае прысылаюць. Пакуль наладзіш — і рабіць няма калі...

— Дык што ж вы маўчыце? Да тэхнічнага кіраўніка ідзіце, да Дубовіка.

Прохараў падышоў бліжэй да дзяўчыны. Яго смуглявы твар пацямнеў.

— Не дапаможа. Яны з Адамчуком рашылі адзін участак трымаць для паведвальнікаў. А нам, Барэйка,— звярнуўся ён да Васіля,— трэба даказаць ім, што сіла таксама і ў людзях. Лес валіць — не грыбы збіраць. Трэба самім вучыцца, людзей вучыць, вось як...

Вера пільна глянула на Барэйку. Ён адчуў значэнне гэтага позірку і вінавата прамовіў:

— Безумоўна... Я многае мог бы выправіць і раней, але няма падтрымкі збоку. Рукі апускаюцца.

— Эх, і панёс, і панёс, як баба,— з абурэннем заўважыў механік.— Сірата няшчасная! А ты як начальнік тут, пакажы, на што здольны... Моладзь трэба вучыць, яна да ўсяго ахвоту мае.

— Правільна! — пацвердзіла Вера.— Я таксама дапамагу вам. Можна?

Яна засаромелася, але Прохараў шчыра працягнуў руку дзяўчыне.

— Будзем вельмі ўдзячны...

Барэйка глядзеў на іх з усмешкай.

— Мы пачнём вучыцца,— сказаў ён.

А калі Вера падалася ў другі канец дзялянкі, Барэйка пакрочыў следам.

— Засталіся б у нас працаваць, Вера...

— Мяне ж прызначылі да Сіліча.

— А вы з братам гутарылі? Не? Тады схадзіце да яго. Ён раскажа, што за чалавек гэты Сіліч.

Вера, нічога не адказаўшы, шпарка пайшла па сцежцы.

Барэйка праводзіў яе позіркам і раптам крыкнуў наўздагон:

— Глядзіце ж, прыходзьце!

Яна азірнулася, махнула рукою.

* * *

Іван Маркавіч Адамчук сядзеў у канцылярыі ў добрым настроі і пыхкаў папяросай. Дым сінім воблакам гойдаўся над яго рабочым сталом і таяў пад столлю.

Тое, што займала Адамчука, што хвалявала,— здзейснілася. Базы ўчасткаў цяпер поўнасцю перавездзены ў лес. Гэта на шмат палегчыць працу лесарубаў, якія раней хадзілі сюды за некалькі кіламетраў з Баркоў. Ніхто цяпер не скажа, што Адамчук не гаспадар. Важкія аргументы. Ёсць і яшчэ чым пахваліцца. Новыя тралёвачныя машыны, якія, як ён казаў на партбюро, «з зубоў вырваў», гэта — раз; цесляры скончылі будаваць клуб — два, і трэцяе — цалкам укамплектавана вядучае звяно лесарубаў паказальны ўчастак Сіліча.

Іван Маркавіч прайшоўся па пакоі, які быў застаўлены мяккімі крэсламі і дубовымі столікамі, прыпыніўся ля нарміроўшчыка, маленькага, з хітрымі вачыма Валодзькі-

Чыжыка, як называлі яго тут за малы рост і непамерна вялікі пышны чуб.

— Значыць, няма ў нас недахопаў, а?

— Кругом адны дахопы! — задаволены добрым настроем дырэктара, пажартаваў той і зноў схіліўся над сваімі паперамі.

У дзверы, пастукаўшы, увайшла Сініцкая.

— А-а, чакаў, чакаў вас, Вера... Э-э, прабачце, забыўся як па бацьку,— запнуўся Адамчук і пацёр лоб.

— Паўлаўна,— падказала дзяўчына. Яна падышла да стала і скінула рукавіцы.— Душна ў вас, Іван Маркавіч, проста дыхаць няма чым...

— Што ж зробіш,— развёў ён рукамі,— стары ўжо я, люблю цяпло. Сядайце, расказвайце, з чым прыйшлі.

Вера села на край мяккага крэсла, якое яшчэ пахла клеем.

— Вось што... Буду прасіць вас, Іван Маркавіч, каб перавялі мяне на ўчастак Барэйкі,— пачала яна з хваляваннем.— Мне здаецца, што я там буду больш карысней. У іх яшчэ дзе-нідзе працуюць звычайнай пілою... Механікаў мала, машыны прастойваюць...

Адамчук насупіўся. Яго шэры, чыста паголены твар пацямнеў.

— Ага! — нарэшце выкрыкнуў ён, уціснуўшы ў кішэні рукі.— Пачынаецца!.. Без году тыдзень як працуеце, а ўжо свае заўвагі — дырэктару. Можа, хутка і артыкул у газету напішаце, а?

— Пры чым тут артыкул? — здзівілася Вера.

— Даў вам самы лепшы ўчастак — не падабаецца. Значыць, хочаце недахопы шукаць, выпраўляць...

Потым сеў, падпёр падбародак рукою і не сказаў больш ні слова.

Вера пакрыўдзілася, але ўспомніла, што яна ўжо не студэнтка, што ў жыцці трэба быць рашучым, каб пастаяць за сябе, набралася смеласці.

— Я, Іван Маркавіч, электрамеханік. У мае абавязкі ўваходзіць абслугоўванне і рамонт электрамеханізмаў. І ў Сіліча мне амаль няма чаго рабіць... Там, як вядома вам, няспраўныя механізмы замяняюць новымі...

— Гэта справа Дубовіка. Дарэчы, ён мой намеснік...

— Вось як? Не чакала...

Іван Маркавіч падышоў да Веры, ва ўпор пазіраючы на яе з-пад навіслых броваў.

— Скажыце шчыра — вы незадаволены нашымі парадкамі? — спытаў ён, сцішыўшы голас.

— Не ведаю, што адказаць. Участак Барэйкі мне не падабаецца.

Вера ўстала. Яе шчокі гарэлі. Зразумела, што пакрыўдзіла дырэктара, але ведала — сказала праўду. І здзівілася сваёй смеласці, якой не было дагэтуль.

— Та-ак! — скрывіўшы набок галаву, сказаў Адамчук.— Я думаў, слаўная вы дзяўчына... А выходзіць, задзірыстая.

Адамчук адвярнуўся, зірнуў на парміроўшчыка і, надзеўшы паліто і шапку, выйшаў.

Настрой канчаткова сапсаваўся. Глянуў Іван Маркавіч направа — налева, прыслухаўся.

— Гм, чорт, непарадкі заўважыла...— прамармытаў ён і шпарка рушыў у механічны цэх, дзе, на яго думку, сапраўды належнага парадку не было.

Вера ж, калі Адамчук выйшаў, запісала на лістку блакнота:

«Неабходна: 1. Наладзіць сур'ёзную тэхвучобу.

2. Размеркаваць на ўчастак правільна рабочую сілу.

3. Ацяпліць механічны цэх.

4. Разгарнуць індывідуальнае спаборніцтва».

Яна ўважліва прачытала напісанае і задумалася.

Валодзька-Чыжык падышоў, нібыта па прэс, затрымаўся каля стала, пазіраючы ў блакнот, хіхікнуў тоненька і сказаў, прыгладжваючы рукою непаслухмяны чуб:

— Гэта для яго, начальніка?

— Ага.

— І не баіцёся?

— Зусім не,— у тон адказала яму Вера.— Я ж як-ніяк тэхнічны кіраўнік лесасекі, таксама начальнік...

— Калі б, скажам, Дубовік, нампаліт...

— Ну, а вы,— нечакана спытала Вера,— супраць такіх мерапрыемстваў?

— Яно, безумоўна, не пашкодзіць,— пачаў выкручвацца Валодзька-Чыжык.— Толькі, як той казаў, на гэта старэйшыя ёсць...— і ён, сабраўшы са стала паперы, накіраваўся ў сваю бакоўку.

* * *

Захапіўшыся працоўнымі буднямі, Вера радавалася, што жыццё яе становіцца такім цікавым. Яна пабывала ў

стрыечнага брата, гутарыла з ім пра справы, пра дом. Але бывалі хвіліны, калі Вера пачынала сумаваць.

Вось, як сёння. Прыйшла з работы, села за стол і, успомніўшы непрыемную размову з дырэктарам, задумалася.

Ёй хацелася дапамагчы Барэйку, але не ведала, як гэта зрабіць. Прохараў вунь таксама вопытны электрамеханік і стараецца не мала, а справы не ідуць на лад. Чым жа дапаможа яна, Вера? Ну, пойдзе, агледзіць машыну, знойдзе няспраўнасць, а далей што? А калі вялікія непаладкі, калі адрамантаваць або замяніць што трэба? Для гэтага час патрэбен і памочнікі, людзі.

«Вось каго не хапае ў Барэйкі,— падумала Вера,— вопытных спецыялістаў. Людзей трэба вучыць. І не толькі манцёраў ды матарыстаў. Трэба, каб кожны лесаруб ведаў электратэхніку».

Успомніла і згадала: на каго Васіль падобны? Шырокія плечы, крыху кірпаты нос, карыя вочы... Гэта ж такі Мікола Мікіцёнак! І Вера аддалася ўспамінам.

...У той змрочны зімовы вечар маці сказала Веры:

— Сёння табе, дачушка, споўнілася адзінаццаць год... Не маю я чаго падараваць табе, чым пацешыць,— і пяшчотна пагладзіла па галоўцы.

Дзяўчынка стаяла ля акна і задумліва глядзела, як даўгахвостая сарока ганялася за рудым катом, рассыпаючы злоснае сакатанне. Раптам сарока спалохана ўзляцела і, кінуўшыся на гарод, села на высокую ігрушу. Руды кот таксама знік за плотам, а Вера пачула цяжкі тупат многа ног. У прадчуванні бяды яна падбегла да маткі.

— Ідуць,— спалохана прашаптала дзяўчынка.

— Хто ідзе?

— Немцы...

У хату сапраўды ўвайшлі эсэсаўцы. Іх было многа. І ад таго, што адно акно было забіта дошкамі, а два другіх засланілі сабой фашысты, у хаце пацямнела зусім.

— Дзе гаспадар? — на ламаной рускай мове спытаў тоўсты немец. Ён асвятліў ліхтарыкам Веру і яе маці.

— Не ведаю... Яго няма даўно,— адказала маці.

І тады пачалося страшнае. Эсэсаўцы выгналі іх на вуліцу. Веры было холадна. Яна, як і маці, стаяла без паліто і хусткі, таму што ім не дазволілі апрануцца. На вуліцу былі выгнаны амаль усе вяскоўцы — старыя, жанчыны, дзеці. Проста на снезе сядзеў паранены мужчына ў шынялі.

— Можа, ты нам скажаш, хто гэта? — узяўшыся ў бокі, спытаў нямецкі афіцэр, калі Вера з маткаю падышлі да мужчыны.

Дзяўчынка адразу пазнала бацьку. Яе сэрца аблілося крывёю. Слёзы падступілі да горла, здушылі яго.

І раптам жанчына кінулася да мужа, але фашыст стукнуў яе прыкладам аўтамата па галаве.

— Мамачка! — роспачна закрычала Вера.— Татулька мой!..

Яна заплакала.

Вера чула, як галасіла маці, як стагнаў бацька. Маленькая і кволая, яна нічым не магла дапамагчы ім. Спалоханымі вачыма пазірала на крыклівых, агідных фашыстаў і цяжка ўсхліпвала.

— Ён страляў у нямецкіх салдат! — крычаў тоўсты немец.

Ён — гэта Верын бацька. Яго падвялі да старога клёна, да галіны якога была прывязана вяроўка, і павесілі на грудзі дошку. На ёй было напісана чорнымі літарамі:

**«Ён страляў у нямецкіх салдат»**

Вера не адыходзіла ад маці ні на крок. Нават і тады, калі эсэсаўцы паставілі іх пад дрэвам побач з бацькам.

— Не плач, Аня... Глядзі дачку...— сказаў глуха бацька.

Раптам суха грымнуў залп,— некалькі эсэсаўцаў упала. Потым дружна і гучна застракаталі аўтаматы. Машына, што стаяла непадалёк, звалілася на бок ад страшэннага выбуху. Людзі пабеглі да сваіх хат.

Эсэсаўцы, кідаючы зброю, падымалі рукі.

Высокі, у кароткім кажушку партызан падышоў да Веры і пацалаваў яе ў лоб, а затым накінуў на яе свой кажушок, цяплейшы за які, мабыць, нічога не было на свеце.

— Павел Пятровіч!.. Жывы...— кінуўся ён да параненага і падхапіў яго пад рукі.

— Дзякую, Коля... Ты малайчына...— прагаварыў бацька.

Мікола Мікіцёнак аказаўся камандзірам партызанскай разведкі. З ім было ўсяго некалькі чалавек, таму ён спяшаўся — эсэсаўцы маглі апамятацца.

Селі на сані, паехалі.

Вера ад стомы і холаду, сагнулася ў кажушку і заснула...

Потым яна жыла ў атрадзе. Мікіцёнак палюбіў яе, як дачку, і кожны раз, вяртаючыся з задання, прыносіў падарункі. То цукерак трафейных, то кнігу якую...

Акрамя Міколы, чалавека вясёлага, з добрым характарам, Вера на ўсё жыццё запомніла яшчэ і медсястру Насцю, прыгожую сінявокую дзяўчыну.

Вось як гэта здарылася.

Мікола вярнуўся з аднаго задання цяжка паранены. Камандзір атрада сказаў яму:

— Навошта зноў увязаўся ў адкрыты бой? Ці ж гэта справы разведчыка?..

Памятае Вера, як прыўзняўся на локцях Мікола, вочы яго гарэлі.

— Біць ворага — заўсёды мая справа, таварыш камандзір...

Ён адкінуўся на падушку, заплюшчыў вочы і ледзь чутна застагнаў, ці то ад болю, ці ад крыўды. Вера тады так спалохалася, думала — памрэ Мікіцёнак, але Насця яе суцешыла:

— Будзе жыць, Верачка...

А сама ўсё выцірала вочы хусцінкай.

Дзе цяпер Мікола, дзе тая сінявокая прыгажуня сястра?..

Ад гэтых успамінаў Вера цяжка ўздыхнула. Потым дастала свой дзённік і дробным почыркам напісала:

«20 снежня. Нарэшце ўспомніла — Васіль Барэйка падобны на Мікіцёнка. У яго таксама добры характар, але Мікола быў больш рашучы і вясёлы. Не ведаю, ці разам яны цяпер з Насцяй? Вось бы даведацца пра іх лёс...»

Вечар ужо даўно сцішыўся між хвой, але Веры спаць не хацелася. Сёння цэлы дзень яна правяла каля новай станцыі «ПДС-15» і вызначыла, што машына можа несці большую нагрузку на дзве пілы. Трэба рэканструяваць падводку, правесці выпрабаванне, а гэта значыць, трэба звяртацца да Дубовіка і Адамчука. Адамчук жа зноў скажа: «Можа, хутка артыкул у газету напішаце?» Чаго ён так баіцца артыкулаў?

Вера была пакрыўджана такімі адносінамі.

Памятае Вера, як бацька гаварыў аднойчы: «Эх, маладосць, нецярплівая, неэканомная!.. Часам кіне малады чалавек сілы свае не ў тым кірунку, б'ецца як рыба аб лёд, а потым спахопіцца — што я раблю! І ў другі бок. Злуецца, не шкадуе здароўя, псуе нервы, а сваю сапраўдную справу, тое, да чаго ён здольнасць мае, абходзіць, не

заўважае. Заўважыць яе — старасць прыйшла, няма сіл і энергіі маладосці...»

Ці правільна яна памеціла сабе шлях у жыцці, ці ў тым кірунку кідае свае маладыя сілы?

Вера падышла да акна, угледзелася ў цемру. І раптам ёй здалося, што ля каржакаватага камля бярозы, якая расла пад акном, хтосьці стаіць.

Накінуўшы хустку на плечы, яна выйшла ў сенцы. Заўважыла, як нейкі чалавек падняў каўнер кажушка і падаўся быў прэч, але спыніўся і павярнуўся да яе.

— Хто гэта? — міжвольна спытала Вера.

— Я, прабачце... Па ўласнай справе хацеў бы...

— Таварыш Барэйка? Заходзьце, якія ў вас там справы,— і хуценька пайшла ў пакой.

Васіль, чырвоны не так ад марозу, як ад няёмкасці, зачыніў за сабою дзверы і стаў у парозе, чамусьці зняўшы шапку. У левай руцэ ён трымаў даволі аб'ёмістую чорную скрынку.

— Праходзьце. Вось сюды...

Вера глянула на Васіля, і задаволеная ўсмешка засвяцілася на яе твары. Так, Барэйка падобны на Мікіцёнка, быццам брат яго. Веры прыемна гэтае падабенства.

— Сядайце, калі ласка.

Яна паставіла да стала лёгкае плеценае крэсла.

— Нічога, пастаю,— ціха адказаў Васіль. Ён моўчкі стаяў сярод пакоя, не адважваўся зрушыцца з месца, не ведаў, як пачаць гаворку. Ён быў як звязаны. І толькі пасля трэцяга запрашэння сеў, паставіў на падлогу скрыначку, выцягнуў з яе прыгожы маленькі радыёпрыёмнік.

Васіль усё рабіў нейк разгублена. Калматая шапка, што ён трымаў у руцэ, апынулася нейкім чынам на стале, побач з вазачкай для кветак. Ён паставіў прыёмнік на самы край стала.

Вера ўпотай пазірала за ўсім гэтым і спагадліва ўсміхалася.

Але вось усмешка знікла, Вера глянула на прыёмнік.

— Гэта што такое?

— Прыёмнічак,— пясмела адказаў Васіль.

— А гэта? Што тут напісана?..

— «Веры Сініцкай,— уздыхнуў ён,— у дзень яе дваццацігоддзя»...

Доўга разважаў Васіль — ісці яму ці не ісці да Сініцкай? Валодзька-Чыжык усім паведаміў, што ў анкеце Веры дзень нараджэння запісан дваццатага снежня. Іншыя,

безумоўна, пойдуць, будуць паціскаць ёй руку, віншаваць, а ён?.. Пайшоў і Васіль. Лепшага падарунка, як прыёмнік уласнай канструкцыі, ён не меў. А цяпер яму здавалася, што ён зрабіў проста глупства, ды і прыйшоў зарана, і калі дазнаюцца хлопцы, абавязкова будуць смяяцца.

Васіль устаў і паглядзеў на Веру, чакаючы яе адказу.

— Дзякую вам,— ціха прагаварыла яна, падышоўшы бліжэй.— Праўда — сёння дзень майго нараджэння.

— Значыць, вы не злуецеся? — зноў сеўшы, спытаў Васіль.

— Я вельмі вам удзячна, Васіль... Ды што гэта я? — раптам схамянулася Вера.— Скідайце кажушок!.. Хвіліначчку...

І хуценька пабегла ў сенцы.

Шчаслівейшага часу, здаецца, не было ў жыцці Васіля. Ён распрануўся і толькі цяпер успомніў пра галошы, зняў іх і паставіў у парозе.

«Як тут хораша!» — у захапленні падумаў ён.

Увайшла Вера з вялікім скруткам у руцэ.

— А я, уявіце, і не збіралася адзначаць гэты дзень,— шчыра прызналася яна.— Гэта ж не дома, і знаёмых тут у мяне мала... А як вы даведаліся, што ў мяне такі дзень?

— Выпадкова,— замяўся Васіль. Ён баяўся глянуць на яе, прыгожую, стройную, каб хаця яна чаго не падумала. У яго дух займала, калі іх позіркі сустракаліся.

У гэты момант шырока расчыніліся дзверы, і ў пакой увайшлі лесарубы. Наперадзе ўсіх — Сіліч, за ім — Лявон Ліпніцкі.

Не заўважаючы Васіля, не вітаючыся з гаспадыняй, Сіліч, як дырыжор, павярнуўся тварам да ўвайшоўшых і падняў рукі. На яго шырокіх плячах заблішчэў гузікамі баян. Зусім нечакана, гучны і дружны хор, ад якога задрыжалі шыбы ў вокнах, праспяваў на матыў прыпевак:

Лес гамоніць і спявае,
Лес наладзіў карагод:
За плячыма Вера мае
Сёння роўна дваццаць год!

Уперад выскачыў Валодзька-Чыжык, узяўся ў бокі, нахіліў галаву, бліснуў чорнымі вачыма з-пад чуба, заспяваў звонка:

Мы прыйшлі павіншаваць...

А тонкі, як званочак, дзявочы голас падхапіў:

Шчасця ў жыцці пажадаць.

Сіліч, быццам закручваючы вусы, падміргнуў Васілю і кіўнуў галавою ў бок Веры:

З гаспадыняй маладою
Весяліцца і спяваць.

Усе дружна і галасна зарагаталі.

— Праходзьце, таварышы,— сказала, смеючыся, Вера.— Вельмі вам рада, Леначка,— надышла яна да белавалосай трактарысткі.— Ты мне дапаможы...

Васіль смяяўся з усімі, жартаваў, але настрой у яго быў куды горшы, чым некалькі хвілін назад. Сілічаў баян рэзаў яму вушы, віхрастая прычоска з прыгожа выкладзенымі пахучымі валасамі калола вочы.

Прынеслі аднекуль крэслы, пачалі рассаджвацца за стол. Гэта ўрачысты час, і ўсе націху гутараць. Толькі Лена час ад часу спявае.

— З песняй нарадзілася я, з песняй і памру,— жартавала яна, адкідаючыся на спінку крэсла. Быццам лён, мяккія валасы яе сабраны ў валік. Ля кірпатага рашучага носа — некалькі драбнюткіх вяснушак, а на твары — здаровы румянец. Калі дзяўчына смяялася, на шчаках вызначаліся ямачкі. Проста не твар, а вясна.

Пятрусь — першы Верын знаёмы — не зводзіў з Лены вачэй, і калі Вера жартаўліва паківала на яго пальцам, весела засмяяўшыся, пачырванеў да вушэй.

Толькі Барэйка адчуў сябе лішнім, засумаваў. А як Сіліч сваім прыемным тэнарам пачаў дапамагаць Лене, аж зморшчыўся. Калі ж Вера пахваліла Сіліча за голас, Барэйка рашуча падышоў да вешалкі і ўзяўся за кажушок.

— Таварыш Барэйка, вы куды? — падбегла да яго Вера. У яе вачах было здзіўленне.

— Васіль Пятровіч,— тоненька працягнуў таксама і нарміроўшчык,— вы нас крыўдзіце...

— Прабачце... Я забыўся, што сёння абяцаў падзяжурыць на электрастанцыі. Хлапец чакае, не магу,— апраўдваўся Барэйка.

— Пусціце яго. Ваўка як ні кармі, а яго ў лес цягне,— іранічна заўважыў Сіліч, і гэта яшчэ больш пакрыўдзіла Васіля.

І вось ён зноў, як гадзіну таму назад, стаіць пад акном, пазірае за Верай. Здаецца, і не быў ён там, у хаце...

Праз акно відаць, як жартуе Сіліч. Вось ён нахіліўся да Веры і шэпча нешта ёй на вуха. Вера смяецца.

— Ну, дружа, сцеражыся! Не такі ўжо ты герой тут,— ціха сам сабе сказаў Васіль.

Ноч цёмная, марозная, і ўсё навокал спіць моцным сном. Толькі надзвычай яркія зоры зіхацяць у чорным небе, быццам падміргваюць. А Васілю здаецца, што ўсе яны падобны на кропачкі ў вачах Сіліча, які сядзіць там, за сталом, у цяпле, пабліскваючы вачыма і круціцца, быццам пад ім іголкі. Няхай.

* * *

Зімовыя дні кароткія — ледзь пераваліць за чатыры гадзіны, глядзіш — цёмна. Асабліва хутка цямнее ў лесе. Тут у пахмурны дзень наогул цяжка вызначыць час. А за працай ён бяжыць непрыкметна.

У Баркоўскай пушчы жыццё лесарубаў павесялела: у клуб пачалі прыязджаць кінаперасоўкі, лектары. Па ініцыятыве Васіля Барэйкі і Веры пачалі працаваць тэхнічныя гурткі.

Адамчук папярэдзіў Веру:

— Глядзіце, Вера Паўлаўна, не сарвіце мне выкананне плана... Учора па вашай віне на ўчастку Сіліча выбыў са строю агрэгат, лепшая электраўстаноўка. Вы адказваеце за кожную гадзіну прастою...

Які ж гэта быў прастой! Проста перагрузілі дынамамашыну і ад гэтага падгарэлі шчоткі. Іх хутка замянілі. Але затое выпрабаванне не прайшло дарма. Вера ўстанавіла, што на кожную машыну можна дадаткова падключыць па дзве пілы. Гэта скарыстаў Прохараў, сканструяваў новую падводку да піл. У выніку была дасягнута даволі вялікая эканомія і зніжаўся сабекошт драўніны.

Неяк стары механік прыйшоў да Веры позна. З ім быў і Ліпніцкі.

— Вы адны? Вось і добра,— задаволена сказаў Прохараў і стаў распранацца.

Ліпніцкі дзелавіта дастаў з кішэні акуратна згорнутыя паперы, таксама распрануўся і падышоў да Веры.

— Вось глядзі, што мы з таварышам Прохаравым змастачылі для газеты. Хіба ж можна так працаваць? — і Лявон працягнуў ёй паперы. Яна недаверліва глянула на Прохарава: праўда гэта ці не?

— Бярыце,— усміхнуўся той аднымі вачыма,— прачытайце і, калі што не так, папраўце... Вы, чуў я, пісалі ўжо ў газеты.

— Ну, што вы,— засаромелася Вера, але паперы ўзяла.— Прачытаць я магу, вядома...

— І сама, калі ласка, пашлі ў газету,— сказаў Ліпніцкі, дастаючы папяросы.— Тут усё ёсць, што трэба. Дубовіка і Сіліча добра распяклі.

— А подпіс? Чый подпіс паставіць пад артыкулам?

— Пастаўце ўсе тры,— параіў Прохараў.

— Правільна! Я так і зраблю.

Прохараў узяў у Ліпніцкага папяросу і, прыпаліўшы яе, звярнуўся да Веры:

— Іх як след трэба падкруціць. Механізмы скарыстоўваюцца слаба, а Дубовік і ў вус не дзьме. Баркоўскія калгаснікі на конях даюць амаль столькі, колькі дае наша аўтабаза. Смех і грэх! І з нас, Вера Паўлаўна, таксама калі-небудзь запатрабуюць адказу, як з актыву.

— Я думала над гэтым, таварыш Прохараў. Наш жа лес ідзе на будоўлі, у шахты. А мы ледзь-ледзь выконваем план. Ды яшчэ ў самы сезон...

— Дык мы пойдзем,— нарэшце ўстаў Прохараў.— Папрацуйце тут над нашым творам.

— Я пастараюся...

Ліпніцкі, адыходзячы, сказаў Веры:

— Сіліча не шкадуй!.. Ты не ведаеш, што гэта за чалавек... Ён умее пад'ехаць...— і паціснуў руку: — Ну, мы пайшлі. Падымай буру, сястра!

Калі Вера засталася адна, яна пачала чытаць допіс, што прынеслі ёй механік і матарыст. «Не трэба пісаць пра Сіліча, не толькі ён тут вінаваты»,— скончыўшы, вырашыла яна і задумалася над апошнімі словамі Ліпніцкага. Няўжо яна не так зразумела Лявона? Няўжо Сіліч гэткі благі чалавек? Гэта ўсё ж, напэўна, няпраўда...

І Вера села за працу.

* * *

Артыкул пра Баркоўскі леспрамгас хутка з'явіўся ў абласной газеце.

Стаяла ціхая раніца, калі ля клуба па-асабліваму ажыўлена зашумелі лесарубы.

— Ціха, таварышы! — суцішаў шафёр Пятрусь, які стаяў на бочцы з-пад бензіну і махаў газетаю.— Чытаю!..

Пехта, відаць, знарок кінуў:

— Бач, дальнабойны. Адкінуўся, як зенітчык.

— Аногі як паставіў. Глядзі, барыню туппе!..

Але тут Пятрусь пачаў чытаць:

«Дырэктар трэста таварыш Качан паведаміў па тэлефоне тэхнічнаму кіраўніку Баркоўскага леспрамгаса таварышу Дубовіку: «Накіроўваем вам дзве аўтамашыны. Прысылайце людзей па іх». Дубовік павесіў трубку, рады, што з трэста не спыталі, як наогул выкарыстоўваюцца машыны і механізмы ў Баркоўскім леспрамгасе. Што адказаў бы ён? Сапраўды, цяжка яму адказаць на такое пытанне, калі з пяцідзесяці машын нармальна працуюць толькі дваццаць сем...»

— Чулі? — не вытрымаў рослы матарыст у чорнай ватоўцы, якая блішчала ад мазуты.— Што ні слова — пуд.

— Ціха! — штурхнуў яго ў бок другі лесаруб.— Дубовік вунь, глядзіце, хацеў падысці, але адчуў, чым тут пахне.

Усе паглядзелі на тэхнічнага кіраўніка, які шпарка крочыў да канторы.

— Чытаю далей! — крыкнуў Пятрусь, і лесарубы сціхлі.

«Бываюць выпадкі,— расцягваючы словы, зноў пачаў ён,— калі самі кіраўнікі, свядома ці міжвольна, становяцца на антымеханізатарскі шлях. Баркоўскі аўтапарк, напрыклад, прастойвае з-за таго, што гаспадары не нарыхтавалі ў летні сезон дабраякасных чурак. Вулканізацыя камер дрэнная, прычэпы не выкарыстоўваюцца. У выніку, тут яшчэ ў хаду так званая звычка «паціскаць» на гужавы транспарт.

Дрэнна працуе і рамонтная база. Часта дробязная няспраўнасць выводзіць са строю цэлы агрэгат...»

— Здорава! — зазначыў хтосьці.— Я таксама казаў...

— Ведаем, што ты казаў,— пачуўся другі голас.— І мы аралі!

— Ці-ха! — зноў крыкнуў Пятрусь, акідваючы позіркам лесарубаў.

Нехта зазначыў уедліва:

— Лену шукае...

— А што... Лена дзяўчына добрая, не роўня табе,— азваўся рослы матарыст у чорнай ватоўцы.

Калі Пятрусь скончыў, лесарубы зашумелі, загаманілі. Кожны выказваў свой погляд, свае меркаванні, і ўсе згаджаліся на адным: артыкул з'явіўся своечасова...

— А дзе ж Прохараў, дзе Сініцкая? — пацікавіўся хтосьці.

І сапраўды, ні Веры, ні Прохарава ля клуба не было. Яны, ледзь пачало днець, ужо былі на лесасецы. Да пачатку работы трэба было пусціць новую станцыю. Разам з Васілём Прохараў распрацаваў канструкцыю кабеля, але на месцы выявілася — яна аказалася яшчэ недасканалай.

Дэфекты сяк-так ліквідавалі.

— Сёння паглядзім, як і што, а там направім яшчэ ў працэсе работы,— сказаў Прохараў Веры, якая з жаночай акуратнасцю чысціла і правярала генератар.

Неўзабаве да іх падышоў Васіль. У яго быў заклапочаны, сур'ёзны твар. Прывітаўшыся з Прохаравым, ён падышоў да Веры, глянуў вінавата.

— Добрай раніцы, таварыш Сініцкая,— і, злёгку паціснуўшы дзяўчыне руку, дадаў: — Вы не злуеце на мяне, што пакінуў вас тады?.. Я не мог глядзець на Сіліча.

— Значыць, вы не дзяжурылі на электрастанцыі?

— Не...

— У такім выпадку недаравальна. Будучы лепшым госцем, узяць і пайсці!.. Гэта нетактычна нават.

— Мне здаецца, там былі госці лепшыя за мяне...

— Ну, няхай так. Забудзем аб тым, што было,— Вера дапытліва глянула ў вочы Барэйку.— Я не злапамятлівая.

— Думаю... Сіліч вам не даваў сумаваць, таварыш Сініцкая.

Вочы ў Васіля, як і ў Веры, прыжмурыліся пры гэтых словах, і голас прыкметна задрыжаў. Барэйка збянтэжана кіўнуў галавою і пайшоў на лесасеку.

Вера глядзела яму ўслед, і твар яе стаў засмучаным. Васілёва «таварыш Сініцкая» прагучала як выклік і папрок.

Не, Веру цяжка было ашукаць. У тоне і паводзінах Васіля яна адразу заўважыла нешта новае, чаго раней не падазравала. І гэта новае ўсхвалявала яе.

«Ён раўнуе мяне да Сіліча. Які дзівак!» — падумала Вера.

— А вы добра зрабілі,— пачула яна голас Прохарава,— што выкінулі з артыкула прозвішча Сіліча. Быццам і няма яго, до-обра! Гэта больш падзейнічае, чым сказаць аб ім што-небудзь. Зазнаўся чалавек.

Смуглявы твар Прохарава заўсёды быў пануры, а тут Вера заўважыла вясёлую шырокую ўсмешку.

Маючы за плячыма трыццаць шэсць год, ён выглядаў значна старэйшым. Валасы, некалі чорныя, пачалі сівець.

У часе вайны Прохараў быў борттэхнікам на бамбар-

дзіроўшчыку далыняга дзеяння. Не раз даводзілася ісці на «вымушаную» пасадку з падбітым самалётам. Тры цяжкія раны атрымаў ён за вайну, але выжыў. Толькі сівізна кранула яго валасы.

Нягледзячы на суровы выраз твару, голас у Прохарава лагодны, мяккі. І хаця механік сярэдняга росту, але, як ні глядзі на яго, усё здаецца, што ён высокі, з шырокімі грудзьмі і моцнымі мускулістымі рукамі.

Не ад ранення, аднак, не ад цяжкіх начных палётаў пасівела галава і заўчасна пастарэў чалавек. Гэта здарылася з ім у адну ноч, калі ён даведаўся, што яго маленькі сын і жонка загінулі ад фашысцкіх бомбаў...

Прохарава Вера хутка палюбіла, як некалі Міколу Мікіцёнка.

Ад Прохарава яна шмат чаго даведалася аб лесе, аб распрацоўках у тайзе...

— Уключай-це-е! — гучна скамандаваў з лесу Васіль, і Вера падышла да пульта.

Знаёмы гул абудзіў лес. І памчалася шматгалосае рэха ва ўсе куткі, абвяшчаючы новую працоўную раніцу.

— Усё ў парадку,— па старой звычцы далажыў Прохараў, падышоўшы да Веры.— Чуеце работу матора? Як на бамбардзіроўшчыку.

Вера засмяялася ад такога параўнання і, пажадаўшы добрай выпрацоўкі, шпарка пайшла на эстакаду, каб з першай машынай паехаць.

Брыгады ўжо распачыналі валку. У самым канцы лесасекі Сініцкая заўважыла, што адна піла, якая лічылася няспраўнай, працавала. Дзяўчына падышла да пільшчыкаў. Тыя прывіталіся і ў жарт прапанавалі папрацаваць.

— А добра піла ў вас рэжа? — спытала Вера ў чарнабровага вусача. Той зірнуў на яе і прыгладзіў свае вусы, на якіх, бадай, можна было палічыць валасы.

— Як масла нажом. Сапраўды...

— Ану пакажыце,— і Вера ўклепчыла ля дрэва.— Хто адрамантаваў?

— Барэйка,— сказаў другі пільшчык.— Уключайце.

— Вось як! Сам адрамантаваў?

— Увесь выходны прасядзеў, абмотку пераматаў, сапраўды,— сур'ёзна сказаў вусач,— а сёння, кажа, каб усе ў сем гадзін у клубе сабраліся на заняткі. Тэхвучоба, значыць.

— Ну і пойдзеце? — спытала Вера, уключаючы матор, які загуў ціха, прыемна.

— Ды мы ўсе згодны. Вучыцца нам не лішне, спатрэбіцца... А вы правільна пілу паставілі, таварыш Сініцкая! — ажывіўся лесаруб.— І рукі ў вас моцныя, як у сапраўднага матарыста.

Вера ўстала і з захапленнем глядзела, як высокая хвоя, ломячы сучча, пракладала сабе ў гушчары дарогу на зямлю.

— Цяпер гэтую...— паказала Вера на другое дрэва.

— О, не-е... Бачыце знак? Гэта, як бы сказаць, матка, на насенне трэба пакінуць. І вось гэтую... І тую,— паказваў вусач. Вера глядзела на дрэвы і смяялася, як дзяўчынка. Яна не заўважала ніякіх знакаў.

— Значыць, будзем вучыцца? А не баіцеся, што адпачываць прыйдзецца менш? Дзень працуй, а вечар вучыся,— ні то ў жарт, ні то ўсур'ёз зазначыла Вера.

— Адпачынку хопіць,— вочы вусатага пільшчыка пакруглелі.— Хіба мы, як толькі прыйшлі з работы і лажымся спаць? Не-е. Час у нас ёсць.

— Гэта добра...

І яна, вясёлая, падалася далей.

* * *

Газетны артыкул абмяркоўваўся на партбюро.

Адамчук, разваліўшыся ў мяккім крэсле, сядзеў ціхі і пануры. Дубовік быў побач з ім. Займаючы пасаду тэхнічнага кіраўніка, ён адначасова выконваў абавязкі намесніка дырэктара па палітчастцы.

Вось Дубовік нахіліўся да дырэктара, шапнуў нешта на вуха. Адамчук дастаў з нагруднай кішэні гімнасцёркі паперку і перадаў яе Дубовіку. Гэта быў лісцік з блакнота Сініцкай.

— Таварышы,— ціха пачаў Дубовік.— Перад тым як прыступіць да абмеркавання артыкула, я хачу звярнуць вашу ўвагу вось на гэтую паперку. Яна належыць нашаму маладому спецыялісту Сініцкай. Тут указаны канкрэтныя пункты па паляпшэнню работы ўсяго леспрамгаса. А хто ўпаўнаважыў Сініцкую ўмешвацца ў справы дырэктара? Хіба мы не ведаем самі, за што перш брацца?..— махаў ён кароткай рукою, адпіўшы са шклянкі вады.— Мы вось... Ага, на чым жа гэта я спыніўся?

— На артыкуле,— катэгарычна ўставіў Адамчук.

— Артыкул...— зноў пачаў Дубовік яшчэ цішэй.— Гэта ўсё правільна, усё неабходна. Крытыка заўсёды ідзе

на карысць. Але не тое, таварышы, у артыкуле, што нас хвалюе на сённяшні дзень...— і зноў адпіў са шклянкі.

Дубовік маленькі, у акулярах, а валасы абапал лысіны зачэсаны акуратна, і сама лысіна, быццам азярцо між лесу, адсвечвае. Пабліскваюць і акуляры. Ён у вышыванай кашулі з жычкай і ў чорных штанах, запраўленых у боты, жвавы, як хлапчук.

— Узяць наша прадпрыемства...— моршчыў нос Дубовік, ад чаго хадуном хадзілі акуляры.— Якое яно ў нас? Наша задача — даць дзяржаве план, і мы спраўляемся з гэтай задачай без шуму. Правільна я кажу?

— Правільна,— стукнуў Адамчук алоўкам па чырвоным сукне.

Раптам пачуўся спакойны голас Прохарава:

— Э, не, таварыш Дубовік. Усё, што ты гаворыш, далёка ад праўды. Ты глыбока памыляешся...

— Гавары, гавары,— паказаў на яго вузлаватым пальцам Дубовік.— Усе свае. Я вось не баюся, гавару, што думаю, і што думае, напэўна, таварыш...

— Адамчук? — Прохараў устаў.— Гэтага яшчэ мала. Мала таму, што наш усім вядомы дзяржаўны план не выконваецца.

— План мы выканалі на сто і тры дзесятых працэнта,— выгукнуў Адамчук, ускінуўшы галаву. І тут жа закурыў папяросу.

— Як вы, таварышы, лічыце,— звярнуўся Прохараў да прысутных,— мы выканалі план згодна з тэхнічнымі магчымасцямі? Улічваючы стопрацэнтную нагрузку і на тыя машыны, што стаяць нявыкарыстанымі? Не, не выканалі. З нас міністэрства спытае. Ды і нам, камуністам, сорамна закрываць вочы на праўду. Вы, таварыш Дубовік,— пацішыў ён голас,— не заўважылі ў артыкуле элементарных ісцін і не прыслухаліся да голасу лесарубаў. Ведаю — цяжка ўсё адразу на належную вышыню ўзняць, але трэба. Гэта наша работа, і за нас яе ніхто не зробіць.

Дубовік, бачачы, што Прохараў пачаў усур'ёз, сеў і, падпёршы кулакамі галаву, нібыта задумаўся.

— Наш лес,— гаварыў далей Прохараў,— ідзе на будоўлі Сталінградскай ГЭС, на Дон, у шахты. Дзяржава дае нам высокую тэхніку. Тэхніку, якой раней ніхто не бачыў у нашым лесе. А як ідзе тралёўка? Раскражаваны лес мы вязём на станцыю ў аб'езд, па стары мост ля млына. А чаму нам не пабудаваць свой мост? Чаму нам не пусціць машыны па зімовай дарозе? Гэта скароціць шлях па трыц-

цаць кіламетраў, і шафёры зробяць у два разы больш рэйсаў. Гэтым і займаецца наша моладзь — вышуквае новыя шляхі, новыя спосабы работы. А Сініцкая — добры спецыяліст, хоць і малады. Яна, як я заўважыў, пядрэнны ініцыятар. Наша задача падтрымаць яе і дапамагчы ёй, як і ўсёй моладзі...

Пасля ўзяў слова Ліпніцкі. Сёння ён быў не ў рабочым адзенні, а ў новым касцюме, і таму адчуваў сябе крыху ніякавата. Яму здавалася, што ціспе шыю гальштук. Тады матарыст круціў галавою або падсоўваў пальцы пад каўнер. На пінжаку красаваўся ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, а вышэй яго — калодачкі баявых узнагарод.

— Я, таварышы, працаваў у трох леспрамгасах,— пачаў ён з лёгкім хваляваннем,— але не аб сабе хачу сказаць — аб людзях. Пад Ленінградам, памятаю, жылі мы далёка ад райцэнтра, далёка ад баз, і ўсе механізмы знаходзіліся і зіму і лета ў лесе, на ўчастках. Іх не хапала там. У нас на брыгаду даюць дзве пілы ды яшчэ на эстакадзе электрапільшчык. А там была ўсяго адна піла... І леспрамгас заваяваў пераходны сцяг міністэрства і ВЦСПС.

Ліпніцкі меў аўтарытэт сярод лесарубаў, але Дубовік і Адамчук чамусьці недалюблівалі яго. Ціхі, гаварылі яны, не можа павесці за сабою людзей. Цяпер жа абодва насцярожыліся: ці не пачне і гэтая «ціхоня» крытыкаваць іх?

— Як камуніст я не магу ўтойваць таго, што таварыш Дубовік бярэ дзяржаўныя машыны для ўласных патрэб,— сказаў далей Ліпніцкі, аслабіўшы гальштук і расшпіліўшы верхні гузік кашулі.— Нават свайму брату ў Панізоўе ён пасылаў машыны перавезці бярвенне на хлеў. Гэта — невыпадак. Тым больш што таварышу Адамчуку факты злоўжывання пасадай вядомы...

— Добра! — нарэшце не стрываў Адамчук.— Усё ясна,— ён узняў над галавою паперку Сініцкай.— А гэта як расцэньваць? Механік Сініцкая паклала мне на стол свой план работы дырэктара. Хто яна — мой работнік ці мой начальнік?

— А што — яна не мае права параіць? — кінуў ужо з месца Ліпніцкі.

— Ведаю я гэтае права,— з абурэннем адказаў Адамчук.— Добра... Мы з Дубовікам улічым свае памылкі...

Але ўлічыць свае памылкі Дубовіку не давялося. На другі дзень з міністэрства прыйшла паперка, у якой было напісана:

«Тэхнічная гаспадарка Баркоўскага леспрамгаса зна-

ходзіцца ў дрэнным стане, тэхвучоба людзей, якія выкарыстоўваюць тэхніку, не наладжана. Улічваючы безгаспадарнасць тэхнічнага кіраўніка таварыша Дубовіка, апошняга ад абавязкаў тэхкіраўніка вызваліць».

Чарговым загадам Адамчука Дубовік быў пераведзен на пасаду начальніка аўтапарка.

* * *

Тэхнічнага кіраўніка міністэрства абяцала з дня на дзень прыслаць, а пакуль гаспадарку леспрамгаса прыняў Прохараў.

Адамчук з'явіўся да Веры на наступны дзень пад вечар. Заўважыўшы Сініцкую, занятую сваім дзённікам, ён на момант нават залюбаваўся ёю. Твар дзяўчыны быў задумлівы і строгі. Цёмныя косы прыгожа аблягалі яе маленькую галаву, якую Вера крыху схіліла набок і падперла рукою.

Закрыўшы сшытак, яна прыжмуранымі вачыма паглядзела на Адамчука.

— Гэта вы, Іван Маркавіч? Праходзьце, калі ласка...

Адамчук падышоў да стала і, не распранаючыся, паважна сеў на табурэт і злосна насупіўся. Потым ускінуў галаву, глянуў на Веру.

— Усё пішам? — сказаў ён іранічна.— Пахвальна, пахвальна...

— Пішам,— адказала Вера з выглядам абыякавасці. Яе не збянтэжыў нечаканы візіт дырэктара. Сініцкая ведала — яго прывёў сюды газетны артыкул. Паклаўшы свой дзённік на этажэрку, яна прапанавала: — Вы б распрануліся...

Адамчук паслухмяна скінуў сваё чорнае пудовае паліто з вялікім каракулевым каўняром. Потым, прыгладзіўшы рукою парадзелыя валасы, загаварыў стрымана, без дакору ў голасе:

— Я непадоўга... Хачу толькі напомніць вам, што, напісаўшы артыкул аб стане нашай вытворчасці, вы не падумалі, з чаго пачала яна расці. Гэта мяне здзіўляе. Чаму б вам не заўважыць лепшае, дасягнутае? Вы, Вера Паўлаўна, не палічыліся з цяжкасцямі, якія нам давялося перадолець, звялі на нішто ўсе дасягненні. І хто так робіць? Чалавек, якога тут усе паважаюць. Так, так,— пацвердзіў ён, заўважыўшы здзіўлены твар Веры.

Яна падняла на Адамчука свае праніклівыя вочы.

— Вы пакрыўдзіліся за артыкул? Вам шкада Дубовіка? — неяк вырвалася ў яе само па сабе.— Артыкул пісалі мы ўтраіх.

— Дубовік — інжынер усё-такі,— сцішана прагаварыў Адамчук,— спецыяліст... А накопт артыкула — толькі ваша гэта работа, мне перадалі.

— Спецыялісты бываюць розныя, Іван Маркавіч. А можа, гэта і к лепшаму, што мы пазбавіліся ад Дубовіка? Не горш за яго вядзе справу Прохараў.

— Гэта яшчэ пабачым.

Адамчук, закурыўшы, падышоў да паліцы з кнігамі, выбраў адну.

— Вы чыталі яе? — нечакана спытала Вера.— Тут сказана, як людзі цяжкасці пераадольвалі.

— «Далёка ад Масквы»,— прачытаў Іван Маркавіч.— Гм, сказана... Вы намякаеце, што ў нас ёсць магчымасці... Згодзен, ёсць. А людзі якія? Тэхніка без адукаваных людзей — мёртвая, галубка. Так! Дайце спецыялістаў, і мы вунь як пойдзем... А вашы артыкулы... яны толькі аўтарытэт падрываюць. Ні больш ні менш...

— Ці так яно, Іван Маркавіч?

— Так,— сурова глянуў на яе Адамчук.— На мінулым тыдні былі ў мяне прадстаўнікі з міністэрства. Я іх павёў да Сіліча, і яны рукі ад задавальнення ўсім паціскалі. Нават тым, хто галлё зносіць у лаўжы. «Мы вас, кажуць, хутка для кінахронікі здымаць будзем...» Аўтарытэт гэта ці не? Агульнае ўражанне небывалае. І раптам — артыкул. Усё паляцела к чорту!..

— Праўдзе трэба глядзець у вочы. Так вучыў мяне бацька,— адказала Вера, папраўляючы ў вазачцы кветкі.

— Вось што! — усклікнуў Адамчук.— Эх, молада-зелена! Ды нічога,— махнуў ён рукою і перайшоў на «ты»,— пажывеш — пабачыш, паразумнееш. У твае гады я таксама гэткі быў. Вось-вось, здавалася, знайду гэтую самую архімедаву апору і павярну зямлю, у які бок мне захочацца...

Вера пачырванела.

— Прабачце мне, Іван Маркавіч... Скажу вам адну горкую ісціну. Самі прызналіся — хто да вас ні прыедзе, вы на ўчастак Сіліча цягнеце. Вось паглядзіце, якія мы! І я спачатку ўзрадавалася. Ну, думаю, разгон тут! А зайшла да Барэйкі — здзівілася. І сорамна мне стала. За вас, Іван Маркавіч, горка. Каго мы гэтым, акрамя сябе, ашукаем? А людзі ў Барэйкі не горшыя, чым у Сіліча. Трэба толькі

да іх бліжэй быць, вучыць. Нельга ж спадзявацца, што ўсё само наладзіцца.

Адамчук спачатку глуха, а потым усё мацней і мацней пачаў смяяцца, праўда, не зусім натуральна. Пры гэтым яго тоўсты нос непрыгожа зморшчыўся.

— Ну, не думаў, што электрамеханікаў можа цікавіць літаральна ўсё: і кіраўніцтва, і план выпрацоўкі, і тралёўка... Што ж, можа быць, я памыляўся. Давайце тады так. Тут, у лесе, школу арганізуем, самадзейнасцю зоймемся, спортам... Не, я не жартую. Я гэта сур'ёзна гавару, рад вашаму энтузіязму. Толькі папярэджваю: не сарвіце мне выкананне плана. Лесараспрацоўкі — цяжкая рэч...

Заклаўшы рукі за спіну, Адамчук пачаў энергічна мераць пакой сваімі важкімі крокамі.

Вера ж, здзіўляючыся сваёй смеласці, адказала:

— Вы ведаеце, што заняткі даўно ўжо ідуць у брыгадах. Людзі з задавальненнем вучацца, набываюць новыя прафесіі. Чым кепска, скажам, вальшчык — ён жа і пілапраў. Або электралябёдчык — ён жа і манцёр. План, між іншым, не зрываецца.

— Я не супраць прагрэсу,— сумеўся Адамчук.— Але на вас я пакрыўдзіўся, што ў абыход мяне вы дзейнічаеце.

— Інакш было нельга.

— Чаму — нельга? Прыйшлі, сказалі: так і так, хочам напісаць у газету пра такія вось справы. І я б дапамог. Прохараў таксама добры. Усе ў абыход дзейнічаеце...— Адамчук зноў захадзіў па пакоі.— Ніхто мяне, чорт вазьмі, не разумее.

— Я разумею вас,— сказала Вера лагодным голасам,— вам цяжка, а вы — усюды адзін.

— Во, правільна! — узняў палец Адамчук.— Адзін, вядома, не разарвешся.

Ён раптам сеў, паклаў нагу на нагу і, дастаўшы другую папяросу, прыкурыў яе ад першай. Вера паставіла на абрус маленькі сподачак — попельніцы яна не мела.

— Нічога,— сказала яна,— у нашых руках усе магчымасці. І я ў прынцыпе з вамі згодна, як і вы са мною, што тэхніка без тэхнічна адукаваных людзей — мёртвая.

Адамчук, пачуўшы свае словы з вуснаў гэтай дзяўчыны, не стрываў, хоць ніякавата, але ўсміхнуўся і падазрона зірнуў на яе. Вера адчувала, што дырэктар нечага недагаварыў.

— Вы ведаеце,— пачаў ён цішэй,— што я быў началь-

нікам будаўнічага трэста, але знайшоўся разумнік, даў артыкул у газету,— і я, што называецца, паляцеў. Стаў галоўным інжынерам трэста. Артыкул — і я апынуўся тут, у Баркоўскай пушчы. Зноў пачынаюць з'яўляцца артыкулы. Вы разумееце, што так жывога чалавека можна ў магілу загнаць? Я ж гэтак стараюся, каб усё было лепш. Сёння Сілічаў участак узмоцнім, а заўтра і Барэйкаў. Не ўсё ж адразу. Мне, чорт вазьмі, усё не шанцуе. Прыедзеш на новы аб'ект, а там — ні кала ні двара. Пачынай спачатку. А вы адразу артыкулы...

— Чаму вы думаеце, што я адна напісала? Дарэмна... Толькі вось што скажу,— насцярожыўшыся, прагаварыла Вера,— ад артыкулаў нідзе не схавацца, ні за цаглянымі сценамі, ні нават у пушчы. Вам жа яшчэ шанцуе...

Адамчук змаўчаў. Апрануўся і, пажадаўшы Сініцкай спакойнай ночы, ён паволі рушыў за дзверы, быццам выносіў на сваіх плячах вялікую і цяжкую ношку.

Вера зноў узяла дзённік, але пісаць не магла.

А за акном ішоў снег.

Вера падышла да акна, задумліва паглядзела на сняжынкі.

«Падаюць сняжынкі, дыяменты росы, падаюць бялюткі за маім акном»,— прыгадалася ёй. І тут яна заўважыла цёмны сілуэт чалавека. Ён стаяў ля бярозы, увесь занесены снегам. Вера прыпала да халоднай шыбіны лбом, потым таропка выйшла за дзверы.

Нідзе нікога.

— Ён, Васіль,— прашаптала Вера.— Няўжо ён?!.

Снег падаў ёй на шыю, а яна, схіліўшыся, усё глядзела на бярозу, ля якой нядаўна стаяў чалавек.

* * *

Пасля размовы з Сініцкай Адамчук доўга хадзіў злосны.

«Навошта гэта я распісаў ёй усю сваю біяграфію?» — шкадаваў ён.

Назаўтра накіраваўся да Сіліча, каб паглядзець, ці так ідуць у яго справы, як гавораць людзі?

Участак гэты знаходзіўся непадалёку ад канторы, і Адамчук не спяшаўся. Разглядаў узоры птушыных слядоў, слухаў шчэбет шчыглоў.

Насустрач, цяжка равучы па выбоінах, ішлі па дарозе машыны з дошкамі для моста.

Адамчук сышоў з дарогі ў глыбокі снег.

— Добрай раніцы, Іван Маркавіч! — прывітаўся шафёр пярэдняй машыны, высунуўшы з кабіны галаву.

«Як жа яго прозвішча?» — намагаўся ўспомніць Адамчук. Яму стала няёмка, што ён не ведае ўсіх сваіх шафёраў.

— Добрай раніцы,— разгублена прагаварыў ён, але яго прывітанне пачуў ужо другі шафёр, Пятрусь. Ён нібыта здзівіўся і, сам не ведаючы чаго, затармазіў.

— Можа, нам у адну дарогу? — спытаў Пятрусь, адчыніўшы дзверцы кабіны.— Паглядзіце, які мост расце! Лялька. У два разы павялічым вывазку.

— Добра, вязі... А мне недалёка.

— На лесасеку?

— Ага...

Пастаяўшы, пакуль прайшлі машыны, Адамчук закрочыў шпарчэй.

«Бач, як яны разважаюць! — узрушана думаў ён.— У два разы павялічым вывазку... Малайцы...»

Яму здалося, што памякчэў мароз і лягчэй стала ісці па скрыпучым снезе. Твар у яго гарэў. Адкінуўшы высокі каўнер паліто, Адамчук адчуў сябе памаладзелым.

Неўзабаве ён заўважыў Сіліча. Той ішоў насустрач, горда ўзняўшы галаву. За ім лесарубы неслі дзве пілы, весела аб нечым размаўляючы.

— Куды ж гэта вы ў такі ранні час? — спытаў, прывітаўшыся, Адамчук.

— Замяніць пілы думаем, Іван Маркавіч... Падводзяць яны нас, часта псуюцца,— дзелавіта растлумачыў Сіліч, выйшаўшы наперад.— Мы вырашылі сёння таксама ўчарашнюю выпрацоўку даць. Хутчэй толькі б вось пілы замяніць!

— Няўжо дадзіце?

— Дадзім...

Слова «ўчарашнюю» прагучала ў вушах Адамчука, як дакор. Яно ніяк не хацела стаць побач са словамі Петруся «ў два разы павялічым вывазку».

— Дык мы пайшлі,— гукнуў Сіліч і падмігнуў лесарубам — моў, усё ў парадку.

— А дзе ж гэта вы замяніце пілы?

Адамчук дастаў з кішэні папяросы, затрымаўся на хвілінку.

— Ведаем такое месца,— загадкава ўсміхнуўся Сіліч, працягнуўшы руку, каб узяць папяросу.— Куры, хлоп-

цы! — прапанаваў ён і астатнім.— Перадавікам ніколі ні ў чым не адмаўляюць. Можна і ў энзэ па адной узяць.

— Значыць, думаеш на складзе ўзяць? Ёсць там, праўда, дзве пілы,— у задуменні прагаварыў Адамчук, пазіраючы, як пусцее яго карабок.— А што, калі б адрамантаваць пілы сваімі сіламі?

— Нічога не выйдзе. Не дадзім учарашняй выпрацоўкі,— настойваў на сваім Сіліч.

— Пілы са склада ўзяў Барэйка...

— І вы дазволілі?

— Вядома, дазволіў. Ён вунь свае няспраўныя пілы сам адрамантаваў. У яго свае піламравы з'явіліся... А табе я што даў, тое і маеш,— злосна сказаў дырэктар. І пайшоў далей, пільна аглядаючы лесасеку.

Сіліч падаўся следам.

— Іван Маркавіч, а кінахроніка? Нас жа хутка прыедуць здымаць, на нас з вамі ўся рэспубліка будзе глядзець. А што ж атрымаецца цяпер...

— Вось што!.. Досыць мне нянчыцца з табою. Нічога ты больш не атрымаеш! Нясі пілы назад, здай Сініцкай.

Ім насустрач ужо ішла Вера. Сіліч першы ўбачыў яе і знарок голасна сказаў:

— Старшаму электрамеханіку здаць няспраўныя пілы? Ды ёй і так працы хапае, без піл. Калі яны будуць гатовы?

— Сёння,— прывітаўшыся з Адамчуком, адказала Вера.

— Добра,— пачырванеў Сіліч,— хлопцы, нясіце пілы назад.

— У рамонтную брыгаду,— падказала Вера, усміхнуўшыся,— і кожны раз так, запамятайце. Будзем пераймаць вопыт у Барэйкі.

Сіліч знішчальна глянуў на Веру:

— Знайшла перадавіка...

— Знайшла. І вельмі рада...

Адамчук, уціснуўшы рукі ў кішэні, толькі пыхкаў папяросай, зрабіўшы выгляд, што гэтая размова яго не датычыцца. На самай справе ён уважліва слухаў і ўсё ацэньваў.

— Рада,— скупа ўсміхнуўся Сіліч,— паглядзім, колькі табе работкі будзе праз гэтага работнічка. Не будзеш заўсёды такой чысценькай хадзіць, не-е.

— Я работы не баюся...

Вера хацела сказаць яшчэ «як ты», але стрымалася: Сіліч яе зразумеў і так. Інакш не глянуў бы на Веру вачыма, не злоснымі, а сарамлівымі.

— Што гэта ў цябе там? — раптам спытаў Адамчук, паказаўшы на вогнішча, дзе грэлася некалькі чалавек.

— Чакаюць піл,— растлумачыў Сіліч,— вунь той, высокі — правая рука. Рэкамендую на месца любога начальніка лесасекі.

— А на маё месца ў цябе нікога не знойдзецца?..

— Ну, што вы,— паспрабаваў усміхнуцца Сіліч,— не дараслі.

«Зазнаўся!» — падумаў Адамчук, абыходзячы дзялянку.

На развітанне Іван Маркавіч сказаў Сілічу:

— Глядзі ў мяне — не правалі плана, а то галлё зносіць пойдзеш...

Сіліч не ведаў, жартуе ён ці ўсур'ёз гаворыць.

* * *

Прыйшоўшы зноў у кантору, Адамчук сеў на сваё крэсла і задумаўся. Цяжка з людзьмі, кожны па-свойму думае. Не падабаецца паказальны ўчастак Сіліча. «А я вось вазьму ды яшчэ ўзмацню яго! Я тут дырэктар»,— падумаў Адамчук і схапіў папяросу з раскрытага карабка, што заўсёды ляжаў на стале, каля прыгожай касцяной попельніцы, прыкурыў.

Сваіх пазіцый ён не хацеў здаваць. Галоўнае, з чым не згаджаўся Адамчук, гэта размеркаванне тэхнічных сродкаў і людзей пароўну, на два ўчасткі.

«Няхай хоць адзін участак будзе ўзорны, трэба ж па кім-небудзь раўняцца...»

Адамчук устаў і прайшоўся па канцылярыі. У гэты час Валодзька высунуў у акенца пышны чуб і спытаў:

— Мне сказалі аб'яву аб партсходзе вывесіць.

— Ага, брат, давай,— дазволіў дырэктар, і думкі яго паплылі ў новым кірунку.

«Вось паглядзім, каго сёння сакратаром выберуць, паглядзім!.. Прохарава ці Ліпніцкага...» Ён заплюшчыў вочы, задумаўся, пакуль не пачуўся зноў голас Валодзькі:

— Я напісаў на шэсць гадзін вечара...

Не адкрываючы вачэй, Адамчук сунуў патухшую папяросу ў рот не тым бокам.

— Добра, добра,— замармытаў ён і раптам ускочыў, выплюнуў папяросу і накінуўся на Валодзьку: — Ты чаго зубы выскаляеш?..

Думкі зноў змянілі кірунак. Адамчук успомніў, што

дачка запрашала яго на імяніны мужа, і што даўно пара збудаваць сабе тут, у пушчы, домік і перавезці ўсю сям'ю.

Сяк-так дзень да вечара дырэктар адбыў, а ўвечары прымаў людзей з выглядам вялікай зморанасці. Слухаў просьбы, скаргі лесарубаў і чамусьці не разумеў іх, быццам трапіў у пушчу першы раз у жыцці.

Прохараў прыйшоў пазней за ўсіх, нават не пераапрануўся. Выгляд у яго быў заклапочаны. Падышоў да дырэктара і ціха сказаў:

— Барэйка там сваіх сабраў у клубе на заняткі, дык і з Іванаўскага ўчастка Сілічавы прыйшлі...

— Што вы кажаце?

Адамчук зрабіў выгляд, што здзівіўся, а сам падумаў: «Няўжо і гэтага цікавіць тэхвучоба?..»

— Толькі сярод гасцей «правакатары» аб'явіліся, хацелі з заняткаў вечарынку арганізаваць. Ну і далі ж ім!

І Прохараў задаволена паківаў кулаком. Адамчук звёў бровы.

— Пабіліся?!

— Бадай што... Заспрачаліся, чый участак лепшы, хто лепш працуе...

Адамчук засмяяўся і пацёр рукі.

— Ах, вось як! Эх, чэрці паласатыя!

У гэты вечар Прохарава выбралі сакратаром партарганізацыі. Нават Адамчук апусціў у скрынку бюлетэнь з невыкрэсленым прозвішчам.

З клуба Вера і Барэйка ішлі разам і ціха гутарылі.

— Вы ведаеце, Адамчук пачынае мяняцца,— сказала Вера, ні то сцвярджаючы, ні то пытаючыся. Барэйка падумаў, схіліў набок галаву і развёў рукамі.

— Гэтага я не заўважыў. Проста крыху прыціх ён...

Вера загаварыла аб іншым.

— Не думала я, Васіль Пятровіч, раней, што тут, у Баркоўскай пушчы, такое бурнае жыццё... А людзі якія!.. Скардзяцца вось, што малая бібліятэка, што зусім няма тэхнічнай літаратуры. А мне страшна,— прызналася Вера нечакана.— Ці спраўлюся я тут...

Барэйка асцярожна ўзяў Веру за руку.

— Вас любіць моладзь, Вера Паўлаўна, а гэта галоўнае.

Барэйка хацеў сказаць «і я люблю», але ў яго заняло дух ад адной такой думкі. Ён расшпіліў свой кажушок і змаўчаў.

Яны ішлі побач — і ён быў рады. Не трэба слоў — сло-

вы лішнія... А чаму ўсё-такі і не сказаць — кахаю? Ён жа так даўно марыць аб гэтым, так высока ўзнёс Веру ў сваіх марах! А вось надышла хвіліна — і баіцца нават падумаць аб гэтым.

Што б ні рабіў Васіль, заўсёды Веру бачыў перад сабою. Яна нібы клікала яго.

«Няўжо я і на рабоце стараюся для яе? — думаў ён.— Каб звярнуць на сябе ўвагу? Каб заслужыць пахвалы? А калі адвернецца яна ад мяне, то, выходзіць, усё закіну? Не! Ніколі ўжо не згаснуць гэтай сіле імкнення наперад, ніколі! Толькі ці знойдуцца ў мяне словы і сілы аддзякаваць табе, Вера?»

Вера як бы акрыліла Васіля. Ён адчуў сілу і свае здольнасці. Ён цяпер зробіць усё, каб быць вартым яе кахання.

На развітанне Вера сказала яму:

— Любіце лыжы?

— Люблю.

Васіль схлусіў. На лыжах ён хадзіў даўно, у дзяцінстве. Увесь свой вольны час Барэйка аддаваў радыёаматарству і заняткам з лесарубамі.

— Паедзем разам на прагулку,— прапанавала Вера.

— Паедзем... Хоць на край свету!

— Гэта вельмі далёкі і, мусіць, сумны шлях.

«Глупства сказаў»,— папракнуў сам сябе Васіль.

Вера пацягнула яго да клуба, дзе ў спартыўным пакоі стаялі новенькія лыжы.

Калі выехалі за апошнюю хату, цемень ужо добра ўляглася між дрэў. Але на зямлі ляжаў снег, і таму быў прыкметны кожны пянёк, кожная галінка.

— Мы вакол пасёлка разок аб'едзем,— сказала Вера, азірнуўшыся. І прыпынілася.

Васіль, высокі, шыракаплечы, стаяў над ёю ў чорным кажушку і калматай шапцы. У параўнанні з ім яна нагадвала хлапчука.

— Пайшлі-і,— працягнуў Васіль, не зводзячы з яе вачэй.

— Ану — даганяйце!

Вера стукнула яму кулачком у магутныя грудзі, шпарка памчалася між дрэў, быццам яе нёс сам вецер. Васіль не адставаў, хоць спраўляцца з Верай было нялёгка. Ён адразу адчуў гэта. Кожны крок павялічваў адлегласць між імі. Барэйка задыхаўся, але настойліва бег за ёю, баючыся згубіць след, бо снег цяпер пайшоў такі моцны, быццам

хацеў заляпіць яму вочы. Усё было б добра, каб не насмешлівы голас Веры:

— Лыж-ні-ік, дзе вы?

Васіль спыніўся. Яму крыўдна было, што ён, такі дужы, гатовы любую аглоблю ў дугу сагнуць, на лыжах хутка выбіўся з сіл.

Пастаяўшы крыху, ён нечакана пачуў за плячыма шорах. Васілёвы лыжы быццам прыраслі да зямлі.

Ён азірнуўся. Ззаду на яго лыжах стаяў чалавек. Другі чалавек віднеўся воддаль.

— Што табе трэба? — зазлаваў Васіль, стараючыся апазнаць чалавека, які наступіў на яго лыжы, але той кійком так штурхнуў Васіля ў спіну, што ён ледзь устаяў на нагах.

— Каб апошні раз бачылі цябе з Верай, чуеш? У апошні раз... Інакш, пашкадуеш...

Чалавек, які стаяў воддаль, паволі пасунуўся ў лес. За ім падаўся і гэты. А Васіль, ашаломлены нечаканасцю, яшчэ стаяў на месцы, ён не пазнаў, хто гэта быў.

«Можа, Сіліч падаслаў? — мільганула думка.— Які дзівак! Хоча запалохаць мяне...»

Вера зноў паклікала Васіля, і ён, зірнуўшы па баках, пайшоў на яе голас. Яна чакала яго.

— Што ў вас там здарылася? Думаю, ці не ваўкі напалі. Хацела ўжо людзей клікаць на дапамогу.

У Верыным голасе адчувалася насмешка.

— Ваўкі? — перапытаў Васіль, пад'ехаўшы блізка.— Амаль што ваўкі. Толькі баяцца іх няма чаго. Іх трэба проста навучыць, як жыць на свеце, і пасаромець добра...

Вера глянула Васілю ў вочы, і ён адчуў яе неспакой.

— Вы пра што гаворыце?

— Яшчэ і сам добра не ведаю... Думаю, што Сіліч таксама любіць вячэрнія прагулкі. Палохаць уздумаў...

— Вы сустракалі яго?

— Гэта трэба высветліць. Іх было двое, не пазнаў. Забараняюць мне з вамі хадзіць.

— Вось як? — здзівілася Вера.— Я пасаромлю яго сама.

— Аднак нам пара дадому,— сказаў Васіль і першым рушыў з месца.

* * *

Над лесам, які пядаўна спаў глыбокім сном, чорнымі хмарамі заклубіўся дым, асядаючы на белыя шапкі сосен. Снег чарнеў, пакрываўся копаццю.

Лес зашумеў. У неспакойным гомане дрэў, у несціханым шуме матораў і машынным гуле чуюцца людскія галасы, ды гучыць у прасторы дзявочая песня, якую дзесяткі звонкіх галасоў, здаецца, узнімаюць вышэй хмар. Усё гэта стварае сімфонію працоўнай раніцы ў лесе. Высока ўзнімаецца сакавіты голас:

...Каб ве-чна цві-лі ў Бе-ла-ру-у-сі
Са-ды ка-ля вё-сак і рэ-эк.

Гэта ўжо Лена спявае. Ёй быццам уторыць усё: і людзі, і вецер, і гул трактара, на якім яна працуе.

Рудая вавёрка і тая здружылася з людзьмі, прывыкла да іх, да ўсяго, што робіцца тут. Вунь яна гушкаецца сабе на галінцы сасны, не зводзіць чорных вочак з Лены: няйначай, цікуе, каб скінуць шышку, калі трактар падыдзе пад сасну.

Раніца ў лесе! З шэрых дрэў падае набрынялы вадою снег. Адліга прыйшла пасля завірух і ветру. Хмары, быццам хто прыпыніў іх вечны рух, павіслі ў небе. Паветра поўнае вільгаці і паху хвоі.

Васіль выйшаў у лес з тварам, цямнейшым за гэтыя хмары.

Адкуль хто што даведаўся? Пятрусь пры сустрэчы сказаў яму:

— Значыць, задумаў, як бы гэта сказаць, трэніравацца на лыжах? Глядзі, не давядуць яны цябе да дабра.

Бачыла, як учора выехалі Васіль з Верай на лыжах і Лена. Васіля яна ведала з дзяцінства. Разам з ім у Баркоўскай школе вучылася. Разам яны і раслі. Лена заўважыла, што як толькі з'явілася тут Вера, Васіль стаў іншым. Пачаў сам хадзіць з пілою, раіцца з дзесятнікамі, правяраць паваленыя лес, пераводзіць выпрацоўку ў працэнты. А раней гаварыў: «Гэта справа дзесятніка, гэта — нарміроўшчыка». Лена радавалася за Васіля, а на Веру крыху крыўдзілася. Як яна здагадвалася, Васілёва дружба з Верай перайшла ў каханне, але каханне няўдалае. Ёй Вера аднойчы сказала:

— Васіль слаўны хлопец. Чалавек, можна сказаць, як дуб...

— Падабаецца? — шчыра спытала Лена.

— Гледзячы ў якім сэнсе. Ён мне нагадвае аднаго чалавека...— сказала Вера і зірнула ў акно, нібы чакаючы, што вось-вось убачыць постаць Васіля.

— А Васіль кахае цябе,— выпаліла Лена.

Вера ўскінула галаву, захваляваласся.

— Што? Як ты сказала?

— Павер мне, Вера, ён сумленны хлопец, не які-небудзь Сіліч. Той хітры і самалюбівы, зазнайка. Ты б ведала, якімі вачыма ён глядзіць на цябе...

— Ну, гэта ты выдумала! — засмяялася Вера.— Хутка скажаш, што мяне кахаюць усе хлопцы з участка!

Лена зрабіла вывад: «Вера не любіць Васіля, не адказа яму ўзаемнасцю». А Васіль дзеля Веры гатоў на ўсё. Ёй вельмі хацелася ўмяшацца ў справу, дапамагчы Васілю чым-небудзь, параіць...

Вось чаму ў часе абедзеннага перапынку Лена, убачыўшы Барэйку, які паволі крочыў між маленькіх пеньчукоў, пабегла і дагнала яго.

— Васіль,— ціха паклікала яна.

— Што?

Ён ішоў, заклаўшы рукі за спіну, нават не паглядзеў на трактарыстку.

— Можна ў цябе нешта запытаць?

Лена па старой звычцы звярталася да Барэйкі на «ты», але з павагай.

— Заўсёды, Лена...

Яна ціха ўздыхнула.

—Скажы, Вера пяройдзе на наш участак ад Сіліча?

Васіль прыпыніўся, павярнуўся да дзяўчыны. Хвараватая ўсмешка застыла на яго твары.

— Выпытваеш?.. Ах ты, чорт, а не дзеўка! Пяройдзе. Усім перадай, не ўтойваю. Кропка!

Ён нахмурыўся, відаць, толькі цяпер абдумваў, што сказаў.

— Не, не,— заківала галавою трактарыстка, круглымі вачыма пазіраючы на Васіля.— Ты, мусіць, аслеп...

— Ты што дазналася? Гавары...

Васіль схапіў Лену вышэй локця.

— Пусці, мядзведзь ты, тады скажу!

— Што, можа, гаварылі пра мяне?

Лена закінула галаву, прамовіла з запалам:

— Не пара ты ёй!.. Ніколі кажушка гэтага не скінеш, шапкі зімовай ды валёнак. Паглядзі на Сіліча. Франт! Заў-

жды пры гальштуку, боты аж гарэць... Адным словам, Веры ён падабаецца, разумееш?

— Яшчэ што? — грозна спытаў Барэйка.— Вось што... Ідзі адгэтуль і не азірайся.

Лена спахапілася, зразумела, што ўсё атрымалася не так, як яна думала.

— Ой, я пажартавала...— усміхнулася яна і пяшчотна глянула на Васіля.— Ведаеш, Вера мая сяброўка. Я не хачу, каб яна мела справу з Сілічам. Не хачу! Сіліч вунь ужо адну пакінуў з дзіцем, у Залессі, ведаеш?

— Ты проста пляткарка,— сказаў Васіль і адвярнуўся.

Лену гэта абурыла.

— Я?..

— Ты!..

— Добра. Няхай будзе так. А ты... ты...— Яна не знаходзіла слоў, каб адпомсціць Васілю.

Адышоўшыся, Лена агледзелася. Яе твар быў расчырванелы, вочы часта міргалі. Васілю здалося, што на вейках дзяўчыны блішчалі слязінкі. Ён глядзеў ёй услед і думаў, што дарэмна пагарачыўся, пакрыўдзіў Лену. «У партыю заяву падаў, а паводзіны, як у хлапчука»,— падумаў ён пра сябе. Прыгадаў той дзень, калі разам з Ленай прыйшлі яны ў пушчу наступаць на працу, абое пасля курсаў. Яна — трактарысткай, а ён — дзесятнікам. Але Адамчук, пазнаёміўшыся з Васілём, сказаў яму: «Дам табе дружыну — ваюй».

Спачатку Васіль сумеўся, нават хацеў адмовіцца. Потым сяк-так асвоіўся. Дзень за днём, што называецца, уцягнуўся, але не паказаў сябе, як Сіліч, і дырэкцыя ў асобе Івана Маркавіча адсунула яго і яго ўчастак на задні план.

Каб не Вера, і дагэтуль жыў бы Барэйка ціха, бесклапотна, ужо на пасадзе дзесятніка або, на горшы выпадак, матарыста.

Цяпер Барэйка адчуваў асалоду працы. Ён прыглядаўся, як Вера цярпліва рамантавала на марозе агрэгаты, як яна цешылася, калі ёй удавалася пусціць машыну хоць на паўгадзіны раней тэрміну.

«Вось гэтым я і абавязан ёй — абуджэннем»,— думаў Васіль.

Але што б ён ні думаў, з галавы не выходзілі словы Лены: «Не пáра ты ёй!..» З прыкрасцю глядзеў Васіль на вялізныя валёнкі, на шапку, якую скінуў. Як лёгка галаве стала! Калі б яшчэ кажушок гэты...

Усё пераблыталася ў галаве. Сіліч, цёмныя сілуэты невядомых лыжнікаў, нават Вера, якую ён так паважае, так любіць,— усе сталі як бы варожымі для яго.

Абудзіў Барэйку ад дум Адамчук. Быццам з неба зваліўся ён, забег насупраць у лёгкім паліто, у летняй шапцы.

— Бачу, як ты працуеш, бачу! Ану — павярніся назад.

Зірнуў Барэйка назад, а там высокі і тоўсты фатограф, нібы двайнік Адамчука, стаіць і ўсміхаецца:

— Гатова!

Зразумеўшы, што яго сфатаграфавалі, Васіль здзівіўся.

— Навошта гэта?

— А на тое, браце мой, што за такую работу тваю — у газету мы цябе. Я вас навучу працаваць! Вы не ведаеце яшчэ, што значыць у абласную газету трапіць,— Адамчук узняў угору палец,— і як трапіць... Ого! Газета і пакараць можа, але можа і...

— Але, але,— пацвердзіў фатограф. І тут ён заўважыў, што валасы ў Васіля — куды каторы, зблыталіся на галаве.— Ой, ліханька! — усклікнуў ён.— Адзеньце хутчэй шапку.

Васіль надзеў.

— Іван Маркавіч...

— Ці-ха! — зморшчыў той нос і паківаў пальцам.— Усміхайся. Вось так...

Фатограф зноў прыцэліўся на Барэйку, камандуючы:

— Жвавасці больш, малады чалавек, жвавасці! А шапку — на лоб. Ах, ліханька, ды не так жа,— ён падбег, паставіў Васіля ў «позу», паправіў шапку.

— Скажыце, навошта? — не крātаючыся, Васіль скасіў на Адамчука вочы.

— Праверылі выпрацоўку,— амаль прашаптаў той.— Твой участак даў сто шэсцьдзесят тры супраць ста дваццаці Сіліча. Гэта за месяц, у працэнтах! Зразумеў?

— Мала, Іван Маркавіч... Больш дам, усе дзвесце.

— Ах, ліханька, зноў сапсаваў! — заенчыў фатограф, падбег і павярнуў галаву Васіля.— Пастойце хоць момант спакойна.

Васіль усміхнуўся.

Фатограф шчоўкнуў апаратам, схаваў яго ў футляр і задаволены пайшоў. Адамчук жа затрымаўся.

— Заўтра сход у нас, ведаеш? Будзем прымаць у кандыдаты...

— Заўтра?

Васіль паглядзеў на дырэктара так, быццам першы раз убачыў яго.

— Ну, ну, толькі не хвалюйся,— супакоіў яго Адамчук, аглядаючы з ног да галавы, як бы прыкідваючы вартасць Васіля на вока. Васілю ж здалося, што Адамчук пазірае на яго валёнкі і, безумоўна, думае: «Не пара ты ёй...»

Ну і няхай сабе думае што хоча, няхай усе думаюць...

— Я гатоў, Іван Маркавіч,—стрымана прагаварыў ён.

— Вось і добра.

Васіль застаўся адзін.

Ужо гулі ў лесе пілы і грукацелі трактары. Падзьмуў золкі вецер, які данёс звонкую песню Лены:

...Я тоскую, любя,
На сердце обида,—
А увижу тебя —
Не подам и вида.

«Добрая песня,— падумаў Барэйка,— павучальная».

* * *

Жыў Барэйка, як і ўсе, хто тут працаваў, у пушчы, у пасёлку. Але перад выходным днём ён хадзіў дадому, у Баркі.

Хата Васіля стаіць на самым канцы сяла, у ліпавых прысадах. За хатай — уніз да ракі, цягнецца малады сад. А навокал сяла, куды ні глянь, сцяной стаяць лясы. Яны раскінуліся на дзесяткі кіламетраў. Калісьці тут знайшлі прытулак першыя партызаны. І сярод іх — Васіль, малады разведчык атрада «Баец»...

У сяле цяпер жылі яго маці і малодшая сястра Зіна.

Старая таксама не сядзіць дома. Яна працуе ў дзіцячым садзе. Добрая і працавітая, цэлымі днямі яна займалася з малымі, прыходзіла дадому позна ўвечары, задаволеная дзённай працай.

Сёння, перад выходным днём, прыйшоўшы на якую гадзіну раней звычайнага, маці паскардзілася Васілю, што яе пакрыўдзілі супрацоўніцы.

— Падумаць толькі... Узяць ды проста ў вочы так сказаць,— гаварыла яна, сядаючы каля стала, на якім стаяў вялікі, прыгожы радыёпрыёмнік.

— Хто пакрыўдзіў! — спытаў Васіль, закрыўшы кнігу, якую чытаў, але так, што за гадзіну не перагарнуў і ста-

ронкі. Ён і цяпер слухаў і не слухаў маці, пачаў энергічна хадзіць з кута ў кут, прыпыняўся, быццам што ўспомніў, і зноў пытаўся, «хто пакрыўдзіў», глядзеў на маці ўважліва, але, відаць, не чуў, пра што яна расказвала.

— Кажу — прагналі мяне сёння, не далі папрацаваць ў ахвоту. Ідзіце ды ідзіце, Кацярына Іванаўна, без вас управімся, маладыя мы... Падумаць, старую знайшлі! — абуралася яна.

Ёй было ўжо за пяцьдзесят год, але была яна жвавай і нават крыху мітуслівай. Як і многія жанчыны Баркоў, яна перажыла вялікае гора ў вайну. Адправіўшы старэйшага сына Аляксея разам з мужам на фронт, Кацярына Іванаўна выехала з Васілём і дачкой Зінай з роднага сяла ў Іванаўскую вобласць да сястры, працавала там у калгасе.

У халодную восень сорак першага года загінуў пад Масквою Аляксей. Варожы эсмінец патапіў у балтыйскіх водах падлодку, на якой матросам служыў Барэйка, муж Кацярыны. А ў дадатак, аднойчы з дому знік Васіль. Хтосьці паведаміў ёй, што хлапца бачылі на станцыі — паехаў у Маскву...

Калі часці Савецкай Арміі вызвалілі Беларусь, вярнулася Кацярына Іванаўна ў Баркі. Прыйшла на папялішча і заплакала. Няма ні сыноў, ні мужа.

Села на камені ля сваіх клункаў і, пазіраючы поўнымі слёз вачыма на абгарэлую ліпу, гладзіла Зіну па галоўцы — адзіную сваю ўцеху... А пад вечар прыйшоў Васіль. З медалём на грудзях, узмужнелы, ледзь пазнала яго Кацярына Іванаўна.

...Сёння Васіль ніяк не мог супакоіцца. Думкі аб заўтрашнім дні, аб тым, што заўтра ён уступае ў партыю, не пакідалі яго. Васіль успамінаў мінулае, ацэньваў. Вядома, мала яшчэ зрабіў для роднай партыі. Але ўсё яго жыццё наперадзе і ён не пашкадуе цяпер сіл...

— Мама,— сказаў ён і прыпыніўся насупраць,— заўтра мяне будуць прымаць у партыю...

Кацярына паглядзела на яго ўважліва, устала з крэсла, моўчкі падышла да сына і пацалавала яго ў шчаку.

— Вось і ён так... бацька твой... аднойчы паведаміў мне. І Аляксейка...— уздрыгнуў яе голас.— А цяпер — ты. Будзь варты іх, Васілёк,— і хуценька пайшла ў другі пакой.

Васіль падумаў, што маці ўспомніла мінулае і плача

цяпер там, і ён пайшоў за ёю. Але маці сустрэла яго спакойным позіркам і, зразумеўшы яго думку, прамовіла:

— Не век жа мне, сынку, плакаць. Няхай ворагі нашы плачуць, тыя, што зноў вайной палохаюць... Мы — бачылі гора. Але яно не зламала нас... У мяне ты, Васілёк, адзіны сын застаўся. Але, калі што, я сама бласлаўлю цябе!

— Правільна, мама!..

Васіль хацеў яшчэ нешта сказаць, ды хтосьці пастукаў у дзверы, і на парозе з'явілася Вера.

— Можна зайсці? — спыталася яна.— Мы тут з Ленай... Але яна пайшла дадому. Хутка будзе.

Вера стала ў парозе і разгублена паглядзела на Васіля.

— Ды вы... распранайцеся,— нарэшце вымавіў ён і хутка падышоў да дзяўчыны.

Кацярына Іванаўна з другога пакоя задаволена сказала:

— Вось і госця бог паслаў...

— Знаёмцеся, мама,— сказаў Васіль, некалькі разгублены і разам з тым узрадаваны.

Вера падышла да старой і падала ёй руку:

— Вера...

— Ага,— паківала галавою Кацярына Іванаўна,— дык гэта вы — Вера?

— Я. А што?

— Мама, досыць вам...— пачырванеў Васіль.— Ідзіце распранайцеся, Вера Паўлаўна.

Пакуль Кацярына Іванаўна ставіла на стол пачастунак, яны прыселі на тапчане.

— Слухайце, Вера,— пачаў Васіль,— я сёння бязмежна шчаслівы,— ён узяў яе за руку, глянуў у твар.— Вы мяне лічыце нясмелым, перашучым. А я вось які... Вера! Мне так добра з вамі, так добра...

Сініцкая слухала яго, крыху схіліўшы ў задуменні галаву, і ў душы радавалася, што Васіль загаварыў аб гэтым.

— І мне з вамі добра, Васіль,— сказала Вера, сарамліва глянуўшы на Барэйку.

— Дзякуй, Вера,— ціха прамовіў ён і тут жа дадаў: — Вы ведаеце? Заўтра мяне будуць прымаць у партыю.

— Нас... і мяне — таксама,— усміхнулася яна.

— І вас? Гэта добра... Разам пойдзем у вялікае жыццё.

— Разам...

— Прашу за стол,— запрасіла Кацярына Іванаўна.

— Ідзём! — адгукнуўся Васіль і пацягнуў Веру за руку.

— Пачакайце,— папрасіла яна.— Хутка Лена прыйдзе.
— А Лена не прыйдзе, ведаю я яе!..
Вера не адказала і моўчкі пайшла першай.
— Дык за што ж нам выпіць? — сказаў Васіль, наліваючы чаркі.
— За дружбу,— прапанавала Вера.
— А я, дзеткі, не п'ю,— устала Кацярына,— але за ваша шчасце вып'ю...
Калі гадзіннік адлічыў восем разоў, Вера паднялася. Моўчкі выйшлі яны на вуліцу.
Правёўшы дзяўчыну дадому, Васіль, шчаслівы і задаволены, пайшоў назад у Баркі.
Цемра была густая, як восенню. Ціха і сумна шумелі хвоі. Рыпеў пад нагамі снег, хаця марозік быў невялікі. На чорным небе калі-нікалі міргалі між хмар зорачкі. Ісці было лёгка.
Васіль выняў з кішэні ліхтарык і ўжо хацеў запаліць яго, каб, асвятляючы, пакрочыць шпарчэй, як наперадзе заўважыў дзве постаці. Адну высокую, другую крыху ніжэйшую. Яны паказаліся на дарозе і зніклі. Васіль схаваў ліхтарык у кішэню і на хвіліну спыніўся.
Барэйку не было каго баяцца, але міжволі набягала думка,— а раптам хто-небудзь п'яны з кампаніі Сіліча ці нават сам Сіліч? Натура ў яго благая. Успомніўся і той выпадак у лесе.
Калі ж непадалёку пачуўся трэск галінкі, Васіль зразумеў, што намер людзей, якіх ён заўважыў раней, не чысты. Яны цяпер не ішлі, а беглі хмызняком проста на яго.
Васіль падрыхтаваўся ўжо абараняцца, але тут да яго данёсся цяжкі стогн.
Адразу зніклі злосць і ваяўнічы запал. Барэйка кінуўся на стогн, на хаду вымаючы ліхтарык. Калі ўбачыў на зямлі чалавека,— асвятліў яго твар. Гэта быў Сіліч. Ён трымаўся абедвух за калена левай нагі і моршчыўся ад болю.
— У-у, пракляты пень... А-а, чортаў зуб...
— Што з табою? — спытаўся Васіль.— Сядзі, не кідайся! — Барэйка ўкленчыў ля Сіліча, выцягнуў з карчэўя яго нагу.— Тут, брат, не пень вінаваты... Э-э, ды ты ці не вывіхнуў нагу. Ану — трымайся за шыю... Хутчэй!
— Ідзі ты!..— вылаяўся Сіліч п'яным голасам.— Мі-іхась! — паклікаў ён.— Дзе ты, шчанё малое? Заб'ю-у!..
— Трымайся за шыю, а то другую выкручу! — крык-

нуў Васіль.— А ты, Міхась, не хаваўся ў лесе, ідзі, хоць нагу будзеш трымаць... Чорт вас гапяе ў такую цемру.

Калі Барэйка ўзваліў Сіліча сабе на плечы, той зноў застагнаў. З цемры высунуўся Міхась, Сілічаў брыгадзір. Яго Васіль пазнаў адразу, па шыпялі.

— А мы з дарогі збіліся,— прагаварыў ён нясмела. Ад яго таксама патыхала гарэлкай.

— Хлусі, шчанё... Ён, думаеш, дурнейшы за нас? О-ой! Не цягні за нагу-у... Балі-іць,— выў Сіліч, трымаючыся за Барэйку. Ззаду плёўся Міхась.

Васіль маўчаў, несучы нялёгкі груз.

Рантам Міхась паваліўся на снег і быццам сам сабе зацягнуў песню, як бы лежачы дзе-небудзь на ложку.

«Відаць, добра налізаліся»,— падумаў Васіль, не звяртаючы ўвагі на брыгадзіра.

Да саннункта ён прыйшоў мокры, як з лазні, і здаў Сіліча дзяжурнай сястры.

— Знайшоў вось на дарозе,— і да Сіліча: — Хутчэй станавіся на ногі ды на лесе не блытайся. На дарозе хадзі, як усе людзі...

Сіліч ускінуў галаву, але змаўчаў. Так і развіталіся — позіркамі.

* * *

Сіліч прахварэў амаль два тыдні. За ўвесь гэты час Барэйка ні разу не зайшоў да яго. Не хацеў бачыць тых вачэй, што пры развітанні бліснулі злосна.

Веру Сіліч наогул папрасіў, каб не хадзіла да яго, і яна, недаўменна паціснуўшы плячыма, выбегла з саннункта. Васіль сказаў з гэтага поваду, што, безумоўна, будзе лепш, калі яна не будзе наведваць Сіліча.

Сустрэліся Барэйка і Сіліч у выхадны дзень.

У клубе моладзь збіралася паслухаць лекцыю аб міжнародным становішчы. Сюды ішлі людзі з двух участкаў леспрамгаса. Да пачатку лекцыі часу было яшчэ многа.

Барэйка толькі ўзышоў на ганак клуба, як насустрач выйшаў Сіліч. Ён коса глянуў на Васіля і хацеў уступіць дарогу, але той спыніўся.

— Здароў, Сіліч!

— Добры дзень...

— Шмат народу ўжо сабралася?

— Ды ёсць...

— Хутка, значыць, пачнуць?
— Лектара яшчэ няма. Кажуць, за Старым млынам «Масквіч» забуксаваў.
— О, гэта па добрую яшчэ гадзіну.— Васіль падумаў і паклаў руку Сілічу на плячо.— А мы — ведаеш што? Збегаем па баян. Дарэчы...
Сіліч чакаў, што ён зараз пачне распытваць аб здароўі, успамінаць і, чаго добрага, будзе кпіць з яго. Але Барэйка ніводным словам не напомніў пра выпадак на дарозе. Гэта расчуліла Сіліча. Яму ўжо самому хацелася папрасіць у Васіля прабачэння, але, самаўпэўнены і фанабэрысты па натуры, ён хутка авалодаў сабою.
— Ты ідзі ў клуб, Васіль... А баян я сам прынясу.
— Добра... Толькі хутка,— папрасіў Барэйка.
Не ўправіўся ён знайсці сярод лесарубаў Веру, як Сіліч прыйшоў з баянам. Сіліч быў у добрым настроі, пераапрануты ў новы касцюм, наадэкалонены. Сабраўшы вакол сябе добрую паўсотню лесарубаў, ён зайграў на баяне.
Перад ім у цесным крузе раптам апынуўся Пятрусь.
— Рэж «барыню»,— заказаў ён.— Гэта мая стыхія!
Яму заапладзіравалі, і Сіліч зайграў, шырока расцягваючы баян.
— Эй, Пятрусь!.. Пакінь яе, сваю стыхію, а то пахудзееш,— заўважыў яму Валодзька-Чыжык.
Гэтыя словы пакрыўдзілі Петруся. Ён падышоў да Сіліча, склаў рукамі мех баяна, загаварыў гучна:
— От Валодзька тут сказаў — кінь сваю стыхію. Глупства сказаў. У кожнага чалавека ёсць свая стыхія... Толькі парміроўшчык наш — сухая лічба, ні пень ні калода. А спытай у яго, колькі будзе два ў два, не скажа — чатыры, а сам спытае спярша: «А колькі вам патрэбна?» Ён, брат, гэта ўмее... Колькі трэба — зробіць.
Вясёлы смех пракаціўся па зале.
Але тут прыехаў лектар, і ў клубе наладзіўся належны парадак. Сіліч, не дабыўшы да канца, чамусьці выйшаў.
А калі Вера і Васіль ішлі з клуба дадому, ён на лыжах пераехаў ім дарогу. Шырокім крокам Сіліч прабег да майстэрні і знік у лесе.
— Вось гэта тэхніка! — з захапленнем сказала Вера.— Ён, безумоўна, зойме першае месца ў лыжных спаборніцтвах.
— Сіліч можа і не пайсці на крос. Ён дужа ганарлівы.
Мароз намацнеў. Сонца, хоць і не свяціла, але адчу-

валася праз светла-шэрую навалачку. Так бывае перад адлігай.

— Дзіўны ён чалавек,— зноў пачала Вера,— і калі б не зазнаўся, цяжка было б вам дагнаць яго. Арганізатар ён добры, але не па той дарозе пайшоў.

— Ён умее іншы раз зусім без дарог хадзіць. Асабліва ноччу,— уставіў шматзначна Барэйка.— Праўда, адзін баіцца, памочніка бярэ.

Вера прыпынілася.

— Аб чым вы гэта?

— Пасля, Вера Паўлаўна... Пасля,— прагаварыў разгублена Васіль і, як тады, дома, узяў яе за руку.

Верына сэрца ўстрапянулася, нібы хто лёгка дакрануўся да яго. Што гэта? Але адказу ў думках Вера не знайшла, хоць чамусьці стала страшна.

Барэйка адчуў няёмкасць, і яму прыйшла думка змяніць гутарку на іншае.

— Вера! — быццам штосьці ўспомніў ён.— Вы да нас на ўчастак загляніце. Электрастанцыя там адна ніяк не слухаецца механіка.

— Добра, прыйду.

Нейкі час яны ішлі моўчкі, і ўжо каля свайго дома Вера сказала Васілю:

— Ну, вось я і дома... Што вы мне на развітанне скажаце?

Барэйка пераняў яе позірк і раптоўна пачырванеў.

— Я хацеў бы, каб вы а шостай гадзіне выйшлі да аўтапарка...

Вера апусціла вочы.

— Не абяцаю...

— Чаму?

— Проста не ведаю...— пацісцула яна плячыма.— Можа, і прыйду...

— Ну, дык я не развітваюся,— сказаў Васіль і пайшоў, а Вера так разгубілася, што зноў падалася ў бок клуба.

Каля дошкі паказчыкаў сустрэўся Валодзька.

— Вера Паўлаўна,— паведаміў ён заклапочана,— прыехаў новы тэхнічны кіраўнік...

— Як яго прозвішча? — спытала яна, насцярожыўшыся.

— Мікіцёнак...

— Мікіцёнак? — перапытала Вера, і твар яе паружавеў.

— Але, Мікіцёнак, завуць Мікалай, а па бацьку не памятаю...

— Ой, як мне яго ўбачыць? Няўжо гэта Мікола? Якая радасць!

Нарміроўшчык здзівіўся:

— Вы яго ведаеце?

— І яшчэ як!.. Калі толькі гэта іменна ён...

Вяртаючыся разам з Валодзькам дадому, Вера папрасіла:

— Прашу вас... Скажыце Барэйку, што ў мяне сёння можа быць дарагі госць. Няхай прабачыць... Разумееце?

— Так і сказаць?

— Ага. Я абяцала яму прыйсці...

— А ён ці не папросіць? Ці, чаго добрага, за такое паведамленне — у шыю?

— Што вы?

— Ну, добра, я растлумачу... Да пабачэння, Вера Паўлаўна.

— Усяго добрага.

* * *

Вечар апускаўся на лес, і вяршаліны хвой выглядалі чорнымі сілуэтамі на фоне сіняга неба. У наваколлі было надзвычай ціха. Толькі здалёк, з лесу, даносіўся слабы гул машын. Працавала другая змена шафёраў на вывазцы.

Вера выйшла на ганак і задумалася. Набліжаўся час, калі яна абяцала Васілю прыйсці. Сэрца ныла ў яе грудзях, твар гарэў. Што рабіць? Не пайсці? Другім разам?

Яна павярнулася, каб падацца ў пакой, як пачула за плячыма крокі. Яго крокі! Снег рыпіць пад нагамі — рып, рып...

Вера азірнулася і... не пазнала.

— Выбачайце, дзе тут Сініцкая жыве? — спытаў яе высокі мужчына ў чорным паліто. Ліхтар ад слупа цьмяна асвятляў яго бледны твар. Вера адразу пазнала Міколу. А ці пазнае яе ён?

— Сініцкая? — перапытала Вера. — Я Сініцкая. А вы хто будзеце? — знарок спытала яна.

Мікіцёнак адным крокам апынуўся побач з Верай.

— Здарова, Верачка!.. Няўжо гэта ты такая стала?.. Не пазнаеш мяне?

Вера засмяялася:

— Што вы, адразу,— і абняла Мікіцёнка за шыю.— Ой, як я рада, чакала вас!..

Яны зайшлі ў пакой. Мікіцёнак распрануўся, сеў на плеценае крэсла. Цяпер, пры святле, ён уважліва паглядзеў на дзяўчыну. Яна ўлавіла яго позірк, падышла, абаперлася локцямі на стол і, прыжмурыўшы вочы, спытала:

— Ну, як — я гэта ці не я?

— Ты,— усміхнуўся Мікола.— Толькі косы падаўжэлі... Кім ты тут працуеш?

— Здагадайцеся...

Ён зірнуў на кажушок, што вісеў ля дзвярэй, на яе рукі.

Асабісты сакратар дырэктара?

Вера адмоўна пакруціла галавой.

— Загадчык аддзела кадраў?

— Не ўгадалі...

— Бухгалтар...

— Тэхнічны кіраўнік участка,— нахіліўшыся да Міколы, сказала Вера,— ваш памочнік...

— Вось як! — Мікіцёнак узяў яе за абедзве рукі і падняў іх далонямі ўгору.

— Не шурпатыя? — спадылба, крыху кпліва, зірнула на яго Вера.— Мазут, масла — нядрэнны крэм...

Яны засмяяліся, сталі побач, і Мікола абняў яе за плечы.

— Значыць, любіш машыны? Я вельмі рады за цябе... Проста не верыцца, быццам учора была такою маленькаю...

— Вось і мне так здаецца. Гады бягуць непрыкметна.

У пакой, пастукаўшы, увайшоў Валодзька.

— Прабачце,— разгубіўся ён,— вас, таварыш Мікіцёнак, просіць да сябе дырэктар. Ён толькі прыехаў. У канторы...

— Я хутка буду,— Мікола зняў рукі з плячэй Веры, але застаўся стаяць побач. Нарміроўшчык бліснуў хітрымі вачыма і выйшаў.

— Хто такі? — спытаў Мікола.

— Наш нарміроўшчык, ён жа і загадчык аддзела кадраў, і сакратар дырэктара, майстар на ўсе рукі.

Яны яшчэ крыху пагутарылі, і Мікіцёнак, паабяцаўшы хутка зайсці, падаўся да дырэктара.

* * *

На другі дзень Вера, як абяцала, прыехала на ўчастак Барэйкі з самай раніцы. Яна адразу накіравалася да электрастанцыі, каб да пачатку работы дапамагчы пусціць машыну.

Нізенькі, з кароткім чырвоным носам механік сустрэў яе радаснай усмешкай і прывітаўся за руку.

— Чорт яе ведае,— шчыра прызнаўся ён,— дзе ёй што баліць... Здаецца, усё як ёсць, праверыш, а завядзеш — пых, пых і стала. Не цягне, бадай яе качкі!

— А мы ўдваіх праверым,— сказала Вера і кінула на дах будана, што быў побач з электраўстаноўкай, кажушок.— Адна галава, кажуць, добра, а дзве яшчэ лепш.

Яна падышла да станцыі і завяла матор. Не ўключаючы дынамамашыны, выключыла яго.

— Ну што? — насцярожыўся механік.

— Вы поршневыя кольцы даўно мянялі?

— Чорт іх ведае, зараз пагляджу ў кнігу,— ён шмыгнуў у будан і выйшаў адтуль з тоўстым сшыткам.— Тут адзначана... дванаццатага красавіка правераны поршні. Пра кольцы нічога не сказана.

— Давайце інструменты,— загадала Вера.— Механізмы трэба не па кнізе правяраць, а па рабоце.

Механік, пануры ўшыся, пайшоў па інструменты, а калі Вера пачала разбіраць матор, сказаў:

— Мы ж так не ўправімся да пачатку работы...

— Ні ў якім разе.

— Дык чорт з імі, з кольцамі.

— А вось пабачым. Дапамагайце лепш...

Гайкі былі закручаны так моцна, што некаторыя прыходзілася адкручваць не ключом, а зубілам і малатком, але Вера настойліва працягвала сваё.

Вось яна вызваліла шатун і дастала з цыліндра поршань. Адразу верхняе кальцо кавалкамі вывалілася з гнязда. Другое, хоць і трымалася, але таксама было паламанае.

— Бачыце? Адкуль тут будзе кампрэсія, адкуль возьмецца сіла ў машыны?

— Чорт яго думаў...

Механік вінавата пасунуў шапку на лоб і пачухаў патыліцу.

— І яшчэ не ўсё... Гляньце ў цыліндры. Масла пад ціскам газаў зганяла ў картэр, а рэштка згарала па сценках. Вось што робіцца. Адна гразь...

— Трэба пачысціць,— сказаў механік.

— Дык вось і пачысціце. Уважліва сачыце за сістэмай змазкі, ад яе залежыць даўгавечнасць машыны.

Яшчэ не скончылі яны зборкі, як прыйшоў Барэйка. На ім было цёмна-сіняе паліто, але тая ж зімовая шапка. Боты, якія ён, відаць, надзеў упершыню, былі наваксаваны да бляску.

— Добрай раніцы, таварышы,— весела прывітаўся ён.— Вы тут, бачу, капітальны рамонт праводзіце.

Вера выцерла анучай рукі, а потым да чырвані нацёрла іх снегам, які тут жа раставаў і чорнымі кроплямі падаў на зямлю.

— Добрай раніцы... Слаба вашы людзі прафілактыкай займаюцца, вось і валтузімся,— сказала яна з дакорам.— Свой рабочы ўчастак трэба добра ведаць як вам, таварыш механік, так і вам, таварыш начальнік...

— Гэта праўда,— згадзіўся механік, заміргаўшы вачыма,— я цяпер за яе вазьмуся!..— І ён, быццам перад ім стаяла не машына, а які непаслухмяны конь, пагрозна, са сціснутымі кулакамі падышоў да рухавіка.

— Што ж гэта ты, цёзка, падкачаў? — кінуў яму Барэйка.— А я на цябе спадзяваўся...

— Трохмесячныя курсы — гэтага мала для механіка,— прагаварыла Вера і пачала апранацца.

— Ага, вось што,— сказаў Васіль да Веры,— вы ведаеце, што сёння нашы тралёўшчыкі селі на новыя трактары? Падарунак мінчан, газагенератарныя. Спецыяльна прызначаны для тралёўкі лесу...

— Ведаю. Цікава б паглядзець іх у працы.

— Пойдзем на эстакаду.

І яны пайшлі побач, на момант абое задумаліся.

— Бачылі новага тэхнічнага кіраўніка? — спытала Вера і заўважыла, як Васіль раптам спахмурнеў.

— Убачу яшчэ. Не раз, як з Дубовікам, спрачацца, можа, будзем.

— Ён — не Дубовік...

— А вам вядома гэта?

— Добра вядома...

Васіль прамаўчаў. Яны ўбачылі, як да эстакады набліжаўся трактар, цягнучы за сабою пяць доўгіх хвой. Машына то кулялася ў выбоіны носам, то ўзнімалася ўгору, высока задраўшы радыятар і неяк нагадваючы тады гарэзлівага каня, які стаў на заднія ногі і вось-вось скочыць наперад. Але трактар паволі апускаўся і настойліва цяг-

пуў дрэвы між пнёў, мяшаючы снег з чорнай зямлёю, з паламаным галлём.

— Глядзіце! Лена за рулём,— весела заўважыла Вера.

Калі трактар усцягнуў на мост эстакады хвоі, трактарыстка злезла з трактара і пайшла насустрач Васілю і Веры.

— Не трактар, а золата! — ганарліва пахвалілася яна.— Пятляе між пнёў, як заяц.

— Добрая, значыць, машына? — спытаў Васіль. Ён падышоў да трактара і залез у кабіну.

Лена, якая стаяла побач, раптам разгублена зірнула на Веру, і твар яе прыкметна збялеў. Яна ўсклікнула і, нічога не сказаўшы, памчалася ў лес.

Яе чакалі доўга. А калі яна вярнулася, твар Лены быў у слязах.

— Што з табою? — спалохалася Вера.— Што здарылася?

— Я... я згубіла пробкі.

— Якія пробкі?

— Ведаеш, рашыла заліць на шасцярні бартавой перадачы масла, пробкі выцягнула з гнёздаў і паклала на гусеніцу... А потым, як заліла масла, паехала адразу.

Трактарыстка дастала хустачку з камбінезона і выцерла твар. Вера падышла да трактара і зірнула на гнёзды. Яны былі забіты зямлёю.

— Разумею...— сказала яна.— Ты доўга так працавала?

— Цэлую гадзіну... Падумаць, дурніца такая! — абуралася сама на сябе Лена.— Галаву згубіла ад радасці...

— Трэба ставіць трактар на прамыўку,— непрыязна заўважыў Васіль, які моўчкі слухаў дзнўчат.— Вось і давай цяпер проста на базу. Разява...

— Сорам які! — Лена залезла ў кабіну, не заводзячы трактара, дадала: — Дня не напрацавала — і ў рамонт. Аж сэрца баліць... Не ведаю, як і даеду.

— Нічога, даедзеш...— зусім зазлаваў Васіль.

Калі трактар адышоўся далёка, Вера вінавата сказала:

— Вы прабачце, Васіль, што не выпала спаткацца ўчора...

Ён зрабіў выгляд, што не пачуў яе, і загаварыў пра ранейшае:

— Мець на руках такую тэхніку — трэба мець і людзей, вартых яе. Быў у мяне Прохараў — забралі, цяпер намеснік дырэктара... А мне не лягчэй ад гэтага...

Вера глядзела на Васіля, не разумеючы яго. Ён не адказаў ёй, не стаў распытваць пра Міколу. І наогул сёння быў хоць і ўважлівы, але нейкі незвычайны. Сухавата-афіцыйны тон яго здзівіў Веру.

У гэты час пехта паклікаў Барэйку, і ён, папрасіўшы прабачэння, пайшоў не развітаўшыся.

Вера пайшла да аўтамашыны, на якую лябёдкаю грузілі лес, і папрасілася ў шафёра пад'ехаць да Іванаўскага·ўчастка.

— Сядайце ў кабіну...— гасцінна прапанаваў шафёр і адчыніў ёй дзверцы.

* * *

Адамчук увайшоў у канцылярыю не так павольна, як бывала раней. Але не добрае надвор'е падзейнічала на дырэктара, а нешта іншае. На яго звычайна невясёлым твары з'явілася задаволеная ўсмешка.

Акінуўшы руплівым позіркам свой стол, ён падышоў да нарміроўшчыка, які сядзеў тут жа, у канторы, і, здавалася, застыў, нахіліўшыся набок.

— Ну, што згорбіўся? — замест прывітання сказаў дырэктар і моцна тузануў Валодзьку за валасы.

— Ой,— усклікнуў той.— Пусціце!

— Сядзі проста, а то гарбатым станеш... Учора ўдзельнічаў у кросе?

— Ды я, Іван Маркавіч, другім прыйшоў!

— Другім?

— А то як жа!.. Першы, што бег за мною, на цэлую хвіліну адстаў — во!..

Адамчук весела засмяяўся.

— Значыць, другім ад хваста? Ну, гэта бліжэй да праўды.— Тут ён стаў сур'ёзны.— Э-э, чаго зноў згорбіўся? Гэтак ты, голубе, сапраўды блізарукім станеш. Вось што... Знайдзі чалавека і здай яму справы аддзела кадраў. Хутка пачнем рубку на трэцім участку, ведаеш?

Нарміроўшчык ускінуў чуб.

— Мне — здаць аддзел кадраў? — і накасіўся на сваю бакоўку.— Ды вы, Іван Маркавіч, хочаце пазбавіць мяне добрай паловы работы. У мяне ж будзе незагружаны рабочы дзень... Сур'ёзна гавару...

— Добра, уважу... Але з умовай — падбяры сабе акуляры і сядзі роўна, чуеш?

— Ды я чую. Толькі акуляры насіць не буду. Боты неяк надзеў, і то ўсе смяяліся — кот у ботах.

— Пачакай, пачакай,— успомніў раптам Адамчук,— ты ў гурток самадзейнасці запісаўся?

— А што мне там рабіць?

— Як — што? Пра цябе вунь якія гаворкі, куды ні зайдзі. Кажуць, вельмі добра высвістваць умееш...

— Гэта вам нехта, сапраўды, насвістаў...— пакрыўджана сказаў Валодзька.— Выдумалі.

— Ну, ты кінь мне...

Нарміроўшчык засмяяўся, потым ціхенька засвістаў па-салаўінаму, змоўк, паглыбіўся ў паперы.

Адамчук нават памаладзеў за гэтыя дні. Атрымаўшы падзяку з міністэрства за перавыкананне квартальнага плана, Іван Маркавіч узбадзёрыўся. А чаму б не заваяваць пераходны сцяг міністэрства?

Ён учора хадзіў да Сініцкай, нават упікнуў яе ў недастатковай ініцыятыўнасці. Гаварыў, што навокал безліч вялікіх спраў, што леспрамгас атрымаў новы заказ — нарыхтаваць крапёжнага лесу для шахт, што трэба выпусціць насценную газету і многа-многа іншага.

Але дакоры дырэктара былі, калі так можна сказаць, умоўныя, бо газета ўжо выйшла... Вісела яна ў чырвоным кутку. У самым цэнтры газеты быў намаляваны Сіліч.

Ішоў ён па крывой дарозе — гэта быў графік выканання плана. Дарога вяла яго ўніз...

Іван Маркавіч успомніў карыкатуру і задумаўся, падпёршы кулаком галаву.

Лёгкі на ўспаміне, у кантору зайшоў Сіліч, злосны і ўзрушаны. Ён моўчкі сеў насупраць здзіўленага дырэктара, перапыніўшы яго думкі.

— Што з табою, голуб? — спытаў Адамчук, устаўшы.

— Досыць! Досыць з мяне,— бліснуў той шэрымі вачыма.— Я не пудзіла, а чалавек, які, можа, усю вытворчасць на ногі паставіў...

— Можа,— нібы згадзіўся Іван Маркавіч, уважліва слухаючы Сіліча.— Але ж толькі — можа.

— А цяпер, што атрымліваецца? Сіліч, выходзіць, зрабіў сваю справу — і ў шыю яго, як лішняга — за борт? Не выйдзе...

Адамчук толькі галавою ківаў ды падтакваў, не перапыняў Сіліча, не пярэчыў, а калі той змоўк, светлыя вочы Івана Маркавіча пацямнелі.

— Не разумею я, чаго ты хочаш?

— Разлічыцца...

Адамчук сеў за стол і моцна стукнуў алоўкам па стале.

— Гэта можна, але шкада! Шкада, вядома, не таго, што такім, як ты, у Баркоўскай пушчы адным менш будзе, а цябе. Шкада,— пойдзеш ты ад нас у другое месца з думкаю, што без цябе мы прапалі... Так, так, ты не круці галавою, слухай мяне... Чаму выйшла так, што Барэйка цябе абагнаў? А таму, што ўчарашняя выпрацоўка здаецца яму пізкай па сёння, а сёпняшняя — на заўтра. І ён не крычыць: я тое, ды я гэта...

Сіліч скрывіўся, як ад зубнога болю.

— Я і сам ведаю, што не ўдасканальваць працэсаў працы — гэта значыць пагаршаць.

— І правільна!

— А вы, вы, таварыш Адамчук, чаму ў апошні час забыліся на мой участак? — памякчэў Сіліч.— Падтрымліваць, дык да канца...

— Не, дружа, прабач... Не толькі ў цябе знатныя лесарубы ёсць і не толькі ты лепшы начальнік участка.

— А ўспомніце, што было спачатку... Колькі было знатных лесарубаў?

— Столькі ж,— не задумаўшыся, адказаў Адамчук.— Толькі мы не бачылі іх... Закуры і супакойся,— працягнуў ён карабок Сілічу.— Памылкі трэба прызнаваць, выпраўляць. Так.

Сіліч узяў папяросу.

— Начальству відней было, што рабіць.

— Слухай, голубе,— даўшы прыпаліць Сілічу папяросу, гаварыў ранейшым тонам Адамчук,— я табе ўсё лепшае даваў: і спецыялістаў, і машыны на вывазку, і ўчасток — бор, як сад чысты, хвоі ў два абхваты... А ты што зрабіў? Зглуміў, як кажуць, дабро. Людзей не вучыў, дысцыпліны — ніякай. Нават таго, што я даў, не маеш. А ў іншых — спецыялісты свае з'явіліся... Ты не разумееш, як здарылася, што Сіліч адстаў ад іншых? А гэта закон жыцця, дружа. На хвіліну спынішся — цяжка тады дагнаць. Так.

— Чуў я і гэта ўжо ад Прохарава, у адну дудку трубіце,— сіпла прагаварыў Сіліч.— А я не маленькі, досыць, што ў школе мяне ў насценгазету працягвалі... Цяпер я не дазволю, каб на мяне пальцам тыкалі, як на апошняга.

— І што ж ты наважыўся рабіць?

— Разлічыцца...

Адамчук зрабіў вялікія вочы.

— Ай-ай-ай, як жа мы тут без цябе гэта, а? — і паднёс палец да правай шчакі, паморшчыў лоб.— Разумею... Ты спалохаўся, што цябе абагналі і, як чалавек прадбачлівы, але слабавольны, хочаш схаваць канцы ў ваду... Вось што, калі не раздумаеш, зайдзі ўвечары.

— Не раздумаю...

— Ну-ну...

Адамчук парывіста ўстаў і падышоў да акна, даўшы Сілічу зразумець, што размова на гэтым скончана.

Ганарыста закінуўшы галаву і заклаўшы за спіну рукі, Сіліч выйшаў.

Адамчуку стала непрыемна, бо ведаў — шмат у чым сам вінаваты. Ён зразумеў, што толькі цяпер пачынае як належыць ставіцца да людзей, думаць разам з імі, хвалявацца і радавацца. Раней гэтага не было, людзі яго не цікавілі. Сіліча таксама шкада. Ён жа не менш і не горш за іншых папрацаваў. Вось чаму нельга адпускаць яго цяпер...

Іван Маркавіч напісаў на паперцы некалькі слоў і перадаў яе Валодзьку.

— Сініцкай! — сказаў ён.— Каб на адной назе...

Валодзька з прыемнасцю схапіў паперку, быццам яна была каштоўным падарункам.

— Я ў момант, Іван Маркавіч!..

* * *

Выйшаўшы на вуліцу і жмурачыся ад сонца, нарміроўшчык пасігаў на Іванаўскі лесаўчастак.

Сонца ўжо не толькі весела свяціла, а і добра грэла. Снег на абочынах дарогі цямнеў. Ступіш у яго — ні следу за табою, ні сцежкі, усё зацягне вадой.

У паветры пахла вясной. Хвоі шумелі весела і гулка.

Прыемна ў такі дзянёк пахадзіць па яшчэ ўцалелай, выкатанай машынамі дарозе.

Не, Валодзька-Чыжык не быў закаханы ў Сініцкую, але яму было прыемна з ёю пагутарыць, раз-другі зірнуць у яе ясныя вочы. Ён паважаў яе прыгажосць, дабрату яе характару.

Не, гэта не было каханнем, гэта была дружба, без якой цяжка жыць яму, Валодзьку, бо змалку ён прывык любіць людзей, быць сярод іх. І ніколі не ведаў Валодзька пачуццяў рэўнасці, зайздрасці, як не ведаў злосці на

людзей, хоць іншы раз, бывала, сёй-той балюча крыўдзіў хлопца, хоць няўдачы ў жыцці і ў каханні сустракаліся даволі часта.

Кахаў Валодзька раней дачку Адамчука, тоўсценькую Анюту, кахаў аж да таго часу, пакуль яна не выйшла замуж. Потым сумаваў па ёй, уздыхаў, але не расчароўваўся.

А калі быў на курсах парміроўшчыкаў, упадабаў адну чарнавокую дзяўчыну з пышнымі каштанавымі валасамі, задумлівую, ціхую і сарамлівую.

Нічога не сказаў ёй Валодзька, калі настаў час расстання...

— Вось, Валюша, і раз'едземся,— прамовіў тады ён з усмешкаю.— А весела мы тут жылі!

— Весела,— згадзілася дзяўчына,— прывыклі так, што шкада расставацца,— дапытліва глядзела ў твар Валодзькі чорнымі пякучымі вачыма, нібы нечага чакала.

— Так-ак... Многа цудоўных сяброў яшчэ сустрэнем у жыцці... А не раз успомнім адно аднаго, Валюша... Ну, бывай!..

Вось і ўсё. Толькі яшчэ сэрца сціснулася, відаць, не жадала расстання...

Па дарозе парміроўшчык сустрэўся з Васілём, які, радасны і ўзрушаны, ішоў на свой участак проста па снегавой кашы — нацянькі.

— Здароў, Валодзька,— прывітаўся Васіль.— Так і запішы — акругляемся. За гэты месяц амаль дзвесце працэнтаў далі...

— Бач ты! Гаворыш, быццам мне не вядома гэта,— пакрыўдзіўся парміроўшчык.— Ды я да адной тысячнаі працэнта вылічыў.

— Добра налічыў?

— Не больш, чым ёсць...— раптам Валодзька стаў сур'ёзны.— Ты чуў — Сіліч зноў пачаў гарэлку смактаць. З гора, кажа. А якое ў яго гора? Ну, Сініцкую, скажам, пакахаў. Што за гора? Яна прыгожая, і кахаць яе не грэх... Толькі ў яе, як вядома, апрача лесарубаў, знаёмыя ёсць.

Васіль падазрона зірнуў на Валодзьку. Ён навучыўся разумець яго з паўслова. А тут востры нос парміроўшчыка зморшчыўся — значыць ёсць непрыемная навіна.

— Гавары далей, калі пачаў...

— Васіль,— прадаўжаў цішэй Валодзька,— скажы як таварышу, кахаеш Веру?

У гэтую хвіліну ён быў падобны не на хлапца-жартаўніка, а на сталага мужчыну. Яму ўсё можна было цяпер даверыць, але Васіль збянтэжыўся.

— Так сабе... Дружым крыху.

— Малайчына! — усцешана ўсклікнуў Валодзька.— А я, брат, думаў, што кахаеш. Ну і добра, што не, а то з імі пагібель нашаму брату. Ой, бедны ты чалавек быў бы, каб пакахаў яе,— сціснуў ён тонкія вусны і пакруціў галавою.— Бледны ты выгляд меў бы...

Васіль нечакана спыніўся, схапіў Валодзьку за руку.

— Валодзька, дружа мой, што ты дазнаўся?

— Пусці спачатку руку. Вось так. Цяпер закурым. Бяры, бяры, Васіль, у такіх выпадках дапамагае... Глядзі мне ў вочы і не міргай. Вось так. Бачу — кахаеш яе. Эх, прапаў хлапец як ніць даць!

Васіль раззлаваўся.

— Гавары, салавей чубаты, а то ў снег утапчу! — і кінуў на зямлю папяросу, нават не прыкурыўшы.

— Гавару,— сказаў Валодзька.— Толькі ты ўсё ж супакойся. Дарослы ўжо...

Васіль спахмурнеў, зашпіліў верхні гузік паліто, быццам яму стала холадна.

— Мне Лена ўжо расказала... Няхай сабе. Што я ёй?.. Валодзя, біць нас яшчэ трэба!..

— Вера дзяўчына харошая і разумная,— сказаў нарміроўшчык.— Не любіць яе нельга.

— Правільна...

— А дзяўчына, Вася, павер мне... дзяўчына — не сонца. Свеціць яна ўсім, а саграе толькі аднаго... Учора Мікіцёнак вось так з ёю стаяў,— Валодзька абняў Васіля за плечы.— А вочы! Як сонца, ззяюць — во! — прадэкламаваў ён.— Увогуле, падобны на цябе, толькі плечы шырэйшыя.

— Ну і што?

— А тое, што наш паважаны інжынер гаварыў Адамчуку, што сустрэў тут, гэта значыць, у Баркоўскай пушчы, старую знаёмую... Адным словам, яна вельмі яму падабаецца. Кажа, што ён даўно закаханы ў яе...

— Так і сказаў? — намагаючыся быць абыякавым, спытаў Васіль. Але хвалявання схаваць не мог.

— Каб мне лопнуць ад... Ну, ад чаго б, а? Во — ад кухеля піва.

— Значыць, ён прыгожы?

— Дэман...

— Валодзька! — пачаў Васіль строга.— А я і сапраўды кахаю Веру... Табе не зразумець гэтага...
— Дзе там! — паціснуў нарміроўшчык плячыма.
— Што ты цяпер параіш?
— Прызнацца ў каханні...
— Зарана.
— У такім выпадку ёсць другі выхад.
— Які?
— Запісацца,— адрэзаў нарміроўшчык.
— Ну, гэта зусім не тое!..

* * *

На другі дзень, увечары, Барэйка пасля доўгіх разважанняў з рашучым выглядам накіраваўся да Веры.

Спярша ён раскажа ёй, як ідуць на яго ўчастку справы, як лесарубы апераджаюць час, а пасля...

Каля самага Верынага дома Васіль нечакана сустрэў Мікіцёнка, які таксама, мусіць, ішоў да Сініцкай. Яны прывіталіся.

— Нарэшце і сустрэліся, таварыш Барэйка,— зняўшы пальчатку, падаў руку Мікіцёнак.— Не здзіўляйцеся. Я з вамі пазнаёміўся па фатаграфіі, што на Дошцы гонару вісіць...

— А я сапраўды падумаў — адкуль вы можаце мяне ведаць?..

— Добрыя працаўнікі далёка відаць, за сотні кіламетраў. Вось,— Мікіцёнак разгарнуў газету,— кранаўшчык Пётр Селязень, мой зямляк, недзе ля Жыгулёў працуе, а сустрэліся.— Ён паказаў на партрэт у газеце.

Васіль саступіў з дарогі.

— Я ў клуб, прабачце,— заспяшаўся ён. У ім загаварылі гонар і самалюбства...

Вера сядзела каля прыёмніка — Васілёвага падарунка — і слухала апошнія паведамленні, калі Мікола ўвайшоў у пакой.

— Добры вечар, гаспадынька. Я не перашкодзіў? — зачыняючы за сабою дзверы, прагаварыў ён і прайшоў да вешалкі.

— Ой, што вы, Мікалай Пятровіч, чакала вас. Дзякуй, што не забыліся.

Вера ўстала і дапамагла Мікіцёнку распрануцца, сама павесіла яго паліто, шапку. Мікіцёнак, усміхнуўшыся, развёў рукамі:

— Хто ж гэта забываецца на старых сяброў? Не толькі не забыўся, а на старой памяці захапіў нават цукерак. Вось, пакаштуй, трафейныя...

Вера весела засмяялася, калі ў яе руках апынулася каробка цукерак.

— О не, гэта не трафейныя!.. А потым,— ужо больш сур'ёзным тонам сказала яна,— я, Мікалай Пятровіч, ужо не маленькая, так што грошы на цукеркі можаце і не траціць.

— Для мяне ты, Вера, маленькая,— сказаў Мікіцёнак і сеў ля стала, закінуўшы нагу на нагу.

Валодзька недарэмна разводзіў рукамі, паказваючы Васілю, якія ў інжынера плечы: яны сапраўды былі шырокія. На смуглявым яго твары ляжаў цень смутку, хоць Мікіцёнак і смяяўся і жартаваў.

— Ну, добра, вып'ем у такім разе з цукеркамі чаю.— Вера дастала з шафы электрачайнік.— А пакуль упраўлюся, вы пакруціце тут,— паказала яна на прыёмнік.

Вера выйшла ў кухню. А калі вярнулася, з хваляваннем спытала:

— Мікалай Пятровіч, а вам не даводзілася сустракаць Насцю? Я так хацела б яе бачыць...— і села насупраць, падпёршы кулакамі шчокі.

Мікіцёнак задумаўся, і твар яго прыкметна спахмурнеў.

— Не даводзілася,— выдыхнуў ён.

— Ну, хоць адрас яе, можа, ведаеце?

— Адрас?.. Здаецца, быў недзе. Я пашукаю ў паперах... У цябе тут цудоўна, не тое, што ў маім пакоі,— перавёў ён гутарку на іншае і акінуў позіркам пакой.

Вера адчувала, што ён пазбягае ўспамінаў. Па яго адказу і паводзінах яна здагадалася, што з Насцяй нешта здарылася. Ці не загінула яна на фронце?

Падаўшыся наперад і шырока адкрыўшы вочы, Вера спытала:

— А яна... не загінула?

— Ну, што ты, не,— паспрабаваў усміхнуцца Мікіцёнак.— Толькі вось убачыць яе мне не давялося. Відаць, не лёс...— Ён раптам пачаў хутка круціць ручку настройкі прыёмніка.— Ведаеш, Верачка... Ты, вядома, не памятаеш, ты была яшчэ птушанём, як кажуць...

— Ну і што? — Вера ад нецярплівасці ўведаць, што скажа ёй Мікіцёнак, прыўстала і пасунула сваё крэсла бліжэй да яго.

— Як мы дружылі з Насцяй, як дружылі! — журботна сказаў Мікіцёнак.— Многае я ўжо прызабыў, а вось яе забыць — не ў сілах. Яна, Вера, абяцала вярнуцца... Паехала з думкай вярнуцца...

І пад сумную мелодыю, што лілася з прыёмніка, Вера ўспомніла ціхія летнія вечары на рацэ Бярозе. Яна ўспомніла, як Мікола з Насцяй гулялі ў «пераглядкі» — садзіліся ў лодку і падоўгу моўчкі глядзелі адзін аднаму ў вочы — хто раней міргне.

Так, яна, Вера, тады нічога не разумела, і цяпер, успамінаючы гэта, думала: «Так, каханне... Харошае, моцнае пачуццё... Дык чаму, паабяцаўшы, не вярнулася Насця? Пакахала другога? Значыць, не кахала Міколу... Не, не можа быць...»

— Чаму яна не вярнулася? — спытала Вера нясмела.

— Чаму?..— сумеўся Мікіцёнак.— Відаць, не пажадала.

— Што, яна выйшла замуж?

— Не ведаю.

— Трэба даведацца... і тады — забыць.

Ад гэтых слоў Мікіцёнак нібы абудзіўся. Ён устаў і, заламіўшы за спіну рукі, прайшоўся па пакоі.

— Твая праўда, Верачка, забыць трэба...

Яму цяжка было гаварыць, і Вера падумала: «Які ён добры, шчыры чалавек».

— Мікалай Пятровіч...

— Што, Вера?

— Дайце мне адрас Насці.

Мікіцёнак, пачырванеўшы, расшпіліў пінжак і дастаў з бакавой кішэні сіні канверт.

— Вось, калі ласка...

Вера ўзяла канверт і прачытала:

— Мястэчка Пясчанае?!. Гэта ж за сорак кіламетраў адгэтуль,— выгукнула яна.— Вы былі там?..

— Не!.. Я раздабыў яе адрас і паслаў толькі адно пісьмо. Гэта было даўно, амаль чатыры гады назад. Тады я выпадкова ўбачыў Насцю...

Мікола змоўк і, пакруціўшы ручку прыёмніка, злавіў вясёлую песню. Пад акампанемент раяля пела незнаёмая спявачка.

— Як гэта здарылася? — спытала Вера.

— Я ехаў з Мінска разам з сястрою. Яна ўжо сядзела ў вагоне, а я выйшаў у тамбур пакурыць. Цягнік вось-вось павінен быў адправіцца. На пероне, як звычайна,

тоўпіліся людзі — хто праводзіў, хто сам ехаў і развітваўся. І ў гэтай мітусні я раптам убачыў Насцю. Яна была з дзяўчынкай на руках... І такая вясёлая. Яна не заўважыла мяне, і ўсё махала рукою некаму ў суседнім вагоне. І дзяўчынка махала. Я не стрываў і выскачыў на перон. Насця ўбачыла мяне і збялела. «Мікола!» — раптам крыкнула яна. Дзяўчынка спалохалася і абхапіла яе рукамі за шыю: «Мама, мама!..» Насця прыціснула яе да грудзей. «Гэта твая дачка?!» — спытаўся я, адчуваючы, як халадзее ў грудзях. У гэты час цягнік рушыў, і сястра пачала клікаць мяне. Я сказаў Насці «бывай» і ўскочыў на прыступку вагона. Яна, здаецца, нават не адказала мне.

— А пасля?

— Мы больш не сустракаліся. Тут усё ясна... Мне і сёння увушшу стаяць гэтыя словы дзіцяці...

— А пісьмо?

— Я напісаў ёй. Але пісьмо прыйшло назад.

У пакой увайшла Лена. Яна глянула на абоіх спадылба, прагаварыла суха:

— Вера, твой чай хутка выкіпіць,— і зноў пайшла.

— Ой, я і забылася!..

Вера хутка пабегла на кухню. А калі вярнулася, не паверыла сваім вачам. Быццам і не было той сумнай гутаркі. Мікола расхаджваў па пакоі і ўпаўголаса спяваў. Твар яго быццам памаладзеў, вочы паблісквалі.

— Дзе ў цябе тут шклянкі? — рупліва сказаў ён і, акінуўшы пакой позіркам, упэўнена накіраваўся да невысокай тумбачкі.— Вось тут, напэўна, а? Ну, вядома, тут...

— Мікалай Пятровіч, я заўтра ж еду ў Пясчанае...

— Ну, ну, не спяшайся, ды і хто цябе адпусціць,— дабрадушна прамовіў ён.

* * *

— Проста дыхаць у лесе няма чым. Дым, дым, дым... Я не згодзен,— гаварыў Мікіцёнак Адамчуку, седзячы ў яго кабінеце.

— Ну, лаўжы паляць,— абыякава адказаў Адамчук.

— Добрыя лаўжы! Цэлыя вяршаліны, дзесяцісантыметровыя сукі... Гэта ж сыравіна для хімічнай прамысловасці, тысячы тон. Разумееце, што нас за гэта не пахваляць. Разумееце?

Адамчук падумаў: «Яшчэ адзін разумны знайшоўся...»

— Дык што ж рабіць?

— Вывозіць.

— На чым? Людзі патрэбны, машыны.

— Вось тыя людзі, што цяпер сцягваюць у лаўжы, будуць і пагружаць на машыны. А машын хопіць. Запросім, калі што...

— Нам трэба выконваць план выпрацоўкі і вывазкі будаўнічага лесу, а не смецця.

— Дарэчы, план у нас яўна заніжаны,— нахмурыўся Мікалай Пятровіч,— і я ўпэўнены, што хутка там, у трэсце, спахопяцца. Жартачкі — па дзвесце працэнтаў брыгады даюць!

— План зацверджаны ў міністэрстве. Вось глядзіце, што ў мяне ёсць.— Адамчук дастаў з нагруднай кішэні гімнасцёркі невялікую паперку.— З трэста прыслалі. Задаволены намі.

У паперы ад імя дырэкцыі трэста была выказана падзяка леспрамгасу і асабіста Адамчуку...

«Прысылайце квартальныя зводкі для вызначэння месца ў спаборніцтве леспрамгасаў,— прачытаў уголас Мікалай Пятровіч.— Вашы паказчыкі задавальняюць. Жадаем далейшых поспехаў».

— А? Што — можа, на першае месца выб'емся? — хітра прыжмурыўшы вочы, спытаў Адамчук, і Мікалай Пятровіч, глянуўшы на яго, падумаў: «Ён менш за ўсё цяпер думае аб тых, хто заваёўвае славу леспрамгаса — аб людзях... Ён — сябелюб».

— Той, вядома, не салдат, Іван Маркавіч, хто не марыць генералам стаць.

— Я б тады «Пабеду» купіў... А-ах, цудоўная машына! — Адамчук устаў.— Добра! Галлё будзем звозіць, зробім пачын!..

«Дзеля славы ён гатоў згадзіцца на што хочаш»,— зноў падумаў Мікалай Пятровіч.

За сцяной у бакоўцы нарміроўшчыка пачуўся штучны кашаль, і акенца адразу адчынілася.

— Добры дзень... Іван Маркавіч, зводкі за сакавік гатовы,— сказаў Валодзька.— А цяпер займуся падрыхтоўкай да камсамольскага сходу — вечарам справаздача.

— Што ён — сакратар камсамольскай арганізацыі? — запытаў Мікіцёнак.

— Але,— усміхнуўся Адамчук. І, калі акенца зачынілася, дадаў: — Шэльма такі... Дадуць яму сёння ў косці. Увесь чуб выскубуць...

Камсамольскія сходы тут збіраліся ад выпадку да выпадку, і таму справаздача Валодзькі выклікала вялікую цікавасць. Што ж за работу ён вёў, гэты Чыжык, акрамя прыёму членскіх узносаў? Што ён будзе гаварыць?

Яшчэ задоўга да пачатку сходу людскія галасы напоўнілі залу.

Але калі стол на сцэне накрылі чырвоным сукном і з-за перагародкі выйшаў з тоўстай папкай Валодзька, у клубе адразу ўстанавіліся парадак і цішыня.

Старшынёй сходу абралі Лену, сакратаром — шафёра Петруся. У прэзідыум таксама ўвайшлі Адамчук, Прохараў і Сініцкая.

Сёння Вера апранула цёмна-сіні касцюм, косы выклала каронай. І ад усяго гэтага твар яе здаваўся асабліва разважлівым і строгім.

Аб'явіўшы парадак дня, Лена павярнулася да Валодзькі:

— Па першаму пытанню слова мае таварыш Міхалёнак...

Валодзька спярша неяк уцягнуў галаву ў плечы, нібы чакаючы ўдару, а пасля ўстаў, імкліва падышоў да трыбуны і стаў побач, бо за ёю ён, напэўна, не быў бы відным. Абцягнуў пінжак ззаду, узяў у левую руку свае паперкі і абвёў залу ўважлівым позіркам. «Прыйшлі ўсе»,— падумаў парміроўшчык і гучна пачаў:

— Вы, таварышы, усе добра ведаеце мяне... Разам з цілой.хадзілі. Гэта, калі яшчэ лучковая ў ходу была. Дык вось, выбраўшы мяне сакратаром нашай камсамольскай арганізацыі, вы, па-першае, усклалі на мяне вялікі абавязак; па-другое, вы чакалі ад мяне дзейнасці. На бюро мы вырашылі сякія-такія пытанні...— відавочна пачаў выкручвацца Валодзька.— Аднак нам мала дапамагалі. Вы ўсе, таварышы, ведаеце, што працаваць мне даводзіцца многа і яшчэ раскіданасць участкаў... зімнія ўмовы. А які з мяне арганізатар? Маленькі. Адсюль і работа. Я прызнаюся...

Каля паўгадзіны Валодзька прызнаваўся ў слабай сваёй рабоце, указваў на прычыны, якія перашкаджалі згуртаваць камсамольскі актыў, гаварыў аб адсутнасці дапамогі з боку партарганізацыі леспрамгаса.

Пасля яго слова ўзяла Лена. Яна гаварыла не многа, але шчыра.

— Наша памылка, што выбралі сакратаром Міхалёнка. Акрамя збору камсамольскіх узносаў, па сутнасці, ні-

якая работа не праводзілася. Лічу работу нездавальняючай,— закончыла яна.

Як меркаваў Адамчук, так і здарылася. Валодзьку крытыкавалі моцна. Ён сам не чакаў гэтага, думаў — добра працуе, з усім спраўляецца, прыкладны ў паводзінах, дбайны, чаго яшчэ? Аказалася, гэтага мала, трэба яшчэ, акрамя добрага прыкладу, умець добра кіраваць людзьмі, выяўляць недахопы, прымаць меры. Бясспрэчна, яму сорамна цяпер, але нічога не зробіш...

Прыступілі да другога пытання — выбары новага складу бюро. Тут прапаноў было многа: назвалі прозвішчы некалькіх матарыстаў, шафёра Петруся, Лепы.

Сініцкая чакала, што вось-вось назавуць і яе прозвішча, але аб ёй нібыта ўсе забыліся. І ўжо, калі Лепа сказала, што ёсць прапанова спыніць запіс кандыдатур, слова ўзяў Прохараў. З месца, абапёршыся кулакамі на стол прэзідыума, ён гучна прамовіў:

— Я, таварышы, хачу прапанаваць яшчэ адну кандыдатуру.

— Веру Сініцкую! — выгукнуў хтосьці з залы.

— Правільна, Сініцкую! — ўстаў маленькі механік, якому Вера адрамантавала электраўстаноўку.

Прохараў падняў руку.

— Вось яе я і хацеў назваць,— цішэй прамовіў ён.— Упэўнен, таварышы, што Сініцкая варта нашага даверу. Яе праца гэтаму парукай.

У зале пачуліся воплескі, і ўсе нават адчулі сябе ніякавата, што Сініцкую прапанавалі апошняй. Вера ж усхвалявана шапнула Прохараву:

— Усё з-за вас... Мяне так мала ведаюць.

Веру ў гэты вечар выбралі сакратаром камсамольскай арганізацыі леспрамгаса.

Ідучы дадому, Вера сказала Мікалаю Пятровічу:

— Вы адчуваеце — вясною патыхае? Вечар, марозік, а патыхае вясною...

— Адчуваю, Вера... Гэта твая вясна! Я сёння, кажучы шчыра, ганарыўся табою.

* * *

З прыездам у Баркоўскую пушчу новага тэхнічнага кіраўніка многае змянілася тут.

Мікіцёнак на свежае вока заўважыў, што, хоць праца ў лесе вядзецца цыклічным метадам, але вывазка драў-

ніны арганізавана дрэнна. Кожны шафёр — сабе гаспадар, колькі захоча, столькі і зробіць рэйсаў. З такім становішчам Мікалай Пятровіч не мог згадзіцца. Ён адразу стварыў з усіх машын чатыры аўтакалоны, назначыў лепшых шафёраў начальнікамі, якія павінны былі несці адказнасць за прастой машын. І, такім чынам, спадзяваўся ліквідаваць непаладкі. А то, бывала, стане якая машына ў лесе, а другім шафёрам і справў да яе мала,— аб'едуць.

З электрамеханікамі Мікіцёнак пазнаёміўся на месцах працы асабіста і быў таксама незадаволены імі.

Аднаго разу ўвечары ў кабінеце дырэктара сабраўся актыў леспрамгаса. Мікалай Пятровіч спытаў у Веры:

— Чаму вы не павышаеце тэхнічных ведаў сваіх механікаў, таварыш Сініцкая? Мала — самому ведаць. Трэба, каб кожны на сваім месцы быў паўнацэнным.

— Мы праводзім заняткі рэгулярна,— адказала Вера. Яна сядзела на крэсле каля акна, і цень ад галавы дырэктара то набягаў на яе, то знікаў у цемені акна. А ад чуба Валодзькі, які сядзеў побач з Сілічам, на сцяну падаў цень, падобны на галаву птушкі з крывой дзюбай. Васіль Барэйка глядзеў на гэты цень, і яму здавалася, што крывая дзюба вось-вось стукне ў галаву дырэктара. Зірнуўшы на Веру, Барэйка пашкадаваў яе. Вера гаварыла канцылярскімі словамі, чамусьці забываючыся на людзей, на факты.

І сама Вера адчувала гэта, але перад ёю быў не проста Мікалай Пятровіч, дарагі ёй чалавек, а яе непасрэдны начальнік, якому яна давала справаздачу аб рабоце, і таму бянтэжылася.

Адамчук толькі пакруціў галавою і прыйшоў на дапамогу Сініцкай.

— Дазвольце, Мікалай Пятровіч, я скажу... Як вядома, пачалі мы тут з азоў. Адна электраўстаноўка і тры пілы — вось і ўсё, што мелі спачатку.

— А далей было так,— падхапіў Мікалай Пятровіч,— не справіліся апамятацца, як у Баркоўскую пушчу пачалі прыбываць машыны, прылады. Правільна?

— Зусім правільна... Каб адразу такую тэхніку пусціць у ход, патрэбны былі вопытныя спецыялісты. Мы пастараліся паслаць на курсы як мага больш людзей, і нам праз тры месяцы іх вярнулі, як кажуць, новаспечанымі спецыялістамі. Іншыя — зусім сыраватыя былі...

— Вось за іх і трэба было брацца перш-наперш.

— Вы гаворыце тое, што цвярдзіла мне ў свой час Сі-

ніцкая,— не хаваючы ўсмешкі, сказаў Адамчук.— Дык вам і лейцы ў рукі, Мікалай Пятровіч! І ў добры час...

Нарміроўшчык стараўся запісаць кожную думку, якую выказвалі дырэктар і галоўны інжынер, але, захапіўшыся спрэчкаю, забыўся на свае абавязкі і вялікімі літарамі толькі вывеў: «У добры час». Затым паклаў аловак на стол і падпёр галаву рукою. Барэйка ўсміхнуўся, бо ў гэты момант птушка з крывой дзюбай стукнула ў галаву дырэктара.

— Далей,— паклаўшы вялікія кулакі на стол і адкінуўшыся ў крэсле, сказаў Мікалай Пятровіч,— у нас ёсць яшчэ аўтамашыны з бензаматорамі. У бліжэйшы час мы абавязаны здаць іх і цалкам перайсці на газагенератар. Тэрмін — тыдзень, дзесяць дзён, у крайнім выпадку.

Адамчук крутнуў галавою і ад нечаканасці аж свіснуў нацiху. Ён — дырэктар і гэта вырашыць сам!

— Ну, тут вы, прабачце, загнулі... Не дам машын.

Валодзька нешта шапнуў на вуха Сілічу, які ўвесь час сядзеў панурыўшыся, і запісаў ніжэй: «Тут вы загнулі».

— Дырэктыва з міністэрства ўжо ёсць, і яе мы абавязаны выканаць.

— Добра,— кіўнуў галавою Адамчук.— У нас, напрыклад, ёсць сорак коней. Для іх трэба нарыхтаваць сена. На чым мы яго будзем вазіць? На газагенератарных машынах? Пажары рабіць?

— Для гаспадарчых мэт пакінем адну-дзве машыны... І коні, скажу вам, будуць у нас не доўга. Іх таксама прыдзецца хутка здаць.

— Добра,— кашлянуў Адамчук,— будзем рабіць так. Толькі, каб не парушыць плана вывазкі.

— Думаю, не парушым,— адказаў Мікалай Пятровіч і звярнуўся да Прохарава: — У вас ёсць што-небудзь?

— У мяне — арганізацыя трэцяга ўчастка.

— Дзе ён намячаецца? — спытаў Барэйка.

— Ты павінен ведаць, за Мядзведжай гарою, ля возера... Добры ўчастак там, хоць і глухі.

— О, там добра! — усклікнуў Васіль.— Памятаю, з бацькам на качак хадзілі. Іх восенню там як вераб'ёў на мякіне.

— Што ж, можна вас, таварыш Барэйка, і назначыць туды, калі так. Вы згодны? — спытаў Адамчук.

— На новы ўчастак? — разгубіўся Васіль.— А тут?..

— Тут другога чалавека паставім.

— А мне — новых людзей, зноў усё спачатку?

— Зноў спачатку,— сказаў Прохараў.— Толькі мы не кінем цябе, дапаможам. Ты ж і сам ужо добрую практыку маеш.

— Я не супраць...

— Ну, вось і справе канец! — узрадаваўся Адамчук.

«Вось і справе канец»,— схапіўшы аловак, запісаў Валодзька.

Далей гутарка пайшла аб арганізацыйных пытаннях, і нарміроўшчыку нельга было ўжо захапляцца спрэчкамі. Ён запісваў прозвішчы, нумары машын, колькасць электрапіл і ўсё, што яму дыктавалі. Калі пачалі разыходзіцца, ён вінавата папрасіў Барэйку:

— Узяў бы ты мяне ў лес, Васіль, а то з сваёй прафесіяй я хутка ў арыфмометр ператваруся. Што такое лес? Хвоі шумяць, птушкі спяваюць, смалою пахне...

Барэйка, ведаючы натуру нарміроўшчыка, жартоўна адказаў:

— Ідзі лепш на рэпетыцыю, салавейка, і не чырыкай, як верабей.

Валодзька зморшчыў нос і падаўся ў сваю бакоўку-кабінет, а Васіль, скасіўшыся на Веру, якая аб чымсьці раілася з Мікіцёнкам, падышоў да Сіліча.

Яны спыніліся ля дзвярэй.

— Пойдзем, ці што, Сіліч?

— Спачатку — ці што, а потым пойдзем,— іранічна адказаў той.— Значыць, і ў цябе не выйшла? — Сіліч кіўнуў у бок Веры.

— Не, чаму? Мы на-ранейшаму сябруем...

— Дзівак ты нейкі, Васіль. Прабач, я адзін пайду.

Барэйка хацеў быў падацца за ім, але Прохараў паклікаў яго.

— Вы, таварыш Барэйка, застаньцеся тут на хвіліну. Не будзем адкладаць справы ў доўгую скрыню і давядзём яе да канца, вось як.

Васіль павалі вярнуўся зноў да стала.

* * *

Ехаць да Насці адразу Веры не выпадала, працы было шмат, і яна пакуль адклала паездку.

Стаўшы на працоўную вахту ў чэсць Першага мая, лесарубы абавязаліся выканаць за месяц палову квартальнага плана.

Намаганні ў мінулыя месяцы далі добрыя вынікі. Бар-

коўскі леспрамгас не атрымаў пераходнага сцяга, але заваяваў другое месца па міністэрству і Ганаровую грамату.

Адамчук нават не чакаў гэтага. У гонар перамогі бліжэйшы выходны дзень быў абвешчаны святам лесарубаў...

У клуб, дзе ўжо сабраліся ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці для рэпетыцыі, забегла Лена. Зірнуўшы на яе, Сініцкая з трывогай адзначыла, што дзяўчына нешта злуецца. Яна паклікала Лену ў бакавы пакойчык, дзе былі рэквізіт і касцюмы «артыстаў», і спытала строга:

— Што з табою, Лена, што здарылася?

— Я не буду спяваць,— замест адказу паведаміла тая, загладзіўшы рукою свае льняныя валасы, што выбіліся з-пад хусткі.— Я буду толькі акампаніраваць хору...— І Лена пайшла да дзвярэй. Моцна штурхнула іх рукою, ледзь не ўдарыўшы імі Петруся.

— Прабачце,— сказала яна і, ні на кога не пазіраючы, хуткім крокам накіравалася да раяля, што стаяў каля сцэны.

— Ледзь не пацалавала... Нішто сабе... Але ад каханай можна цярпець, дзякуй і за гэта,— ні то сарамліва, ні то ў жарт сказаў шафёр.

— А ты не падслухоўвай,— сур'ёзна зазначыў Валодзька і падміргнуў рудавалосай паштарцы, якая ў хоры стаяла бліжэй за ўсіх да раяля. Дзяўчына пачырванела.

Лена разгарнула ноты.

— Пачнем, таварышы...

Вестка аб тым, што з рэпертуара выпадаюць песні Лены, устрывожыла Веру. Яна ведала — гэта выкліча незадавальненне ўдзельнікаў самадзейнасці, бо яны ганарыліся сваёй спявачкай.

Калі праспявалі першую песню, Вера сказала:

— Вось што, таварышы... Лене баліць галава, і рэпеціравацца яна не будзе. А да вечара, вядома, усё пройдзе, і песні свае Лена праспявае. Так, Лена? — павярнулася да яе Сініцкая.

Гэта было сказана з сяброўскім спачуваннем і так шчыра, што Лене стала ніякавата.

— Мусіць, выканаю,— адказала яна. Пальцы яе рук, якія ляжалі на клавішах, ледзь прыкметна дрыжалі.

— Ну, цяпер прадоўжым рэпетыцыю...

Вера стала побач з трактарысткай, і тая ўзяла ўступныя акорды,— упэўнена загучаў раяль.

У перапынку, калі сцэну занялі танцоры, Вера зноў распачала гутарку з Ленай. Размаўляючы, яны пайшлі

поплеч ад клуба ў кірунку аўтапарка, як дзеці, узяўшыся за рукі.

Вера, любуючыся доўгімі, з бліскучымі пазногцямі, пальцамі Лены, сказала:

— Ты маеш такія прыгожыя рукі, што цяжка ўявіць цябе за рычагамі трактара.

Лена спынілася каля тэлеграфнага слупа, захінула хусткаю шчаку ад ветру.

— Будзем гаварыць як сяброўкі...

— Будзем, гавары,— насцярожылася Вера.

— Табе вядома, што паміж Сілічам і Барэйкам няма згоды з-за цябе? Ты ведаеш, што Сіліч пагражаў Васілю? Не, ты нічога не ведала... Ты стаіш ўбаку, а не павінна стаяць!

Вера разгублена апусціла вочы.

— Ты гаворыш праўду?

— Праўду, якую крыху ведаеш і ты...

Веру кранула шчырасць Лены, яе спачуванне Васілю, які за апошнія дні, сапраўды, стаў з усімі афіцыйны, сухі і схуднеў, нібы пасля хваробы.

— Хіба я вінавата ў гэтым,— сказала Вера.

— Ён сумленны чалавек і не хоча быць назойлівым. А ты... ты кахаеш Мікіцёнка!

І слёзы выступілі ў Лены на вачах.

— Не гавары так! — стала сур'ёзнаю Вера.— Мы з ім проста сябры...

— Але ж ён ходзіць да цябе і сядзіць да поўначы...

— Якая хлусня!

Вера закрыла твар рукамі.

— Вось табе і сорамна стала,— быццам узрадавалася трактарыстка.— Сёння ж сустрэнь Васіля і смела скажы яму праўду.

Вера паклала ёй рукі на плечы, і твар яе, шыя, вушы пачырванелі.

— Я кахаю толькі Васіля, Лена...— вырвалася ў яе.— А ты? Можа, таксама Васіля?

— Я... паважаю і шкадую яго,— сумелася Лена і амаль бягом кінулася ў клуб.

Вера пайшла следам, але павольна, глыбока задумаўшыся. Яна так нечакана адкрыла сяброўцы сваю душу! Цяпер Васіль, напэўна, даведаецца. А што тады?..

На бярозах звонка высвіствалі шпакі. Праз белыя, як туман на світанні, хмары сінеў чысты вясновы блакіт. У калдобінах весела журчалі ручаі, і толькі начныя маро-

зікі яшчэ трымалі дарогу. Яна стала цёмнаю, як асфальт, паліты вадою. Усё гаварыла аб тым, што вясна ўбіраецца ў сілу, пачынае гаспадарыць і ў лесе.

Калі Вера ўвайшла ў клуб, да яе слыху данесліся знаёмыя словы песні. Вера глянула на сцэну. Там, злёгку абапёршыся на спінку крэсла, прыўзняўшы галаву, спявала Лена. Яе звонкі голас цяпер гучаў надзвычай прыемна і міла, і здавалася, што спявала сапраўдная артыстка.

Валасы Лены прыгожа ляжалі на плячах, вочы шчасліва свяціліся. А калі яна брала высокія ноты, здавалася, яны свяціліся яшчэ больш зырка.

Харысты, танцоры і яшчэ нейкія людзі, што немаведама калі з'явіліся тут, моўчкі слухалі спявачку.

Вера падышла да лесарубаў, што сядзелі на задніх радах, і стала слухаць.

— Госці ў нас,— паведаміў ёй Пятрусь.— Артысты прыехалі... І яшчэ з трэста.

А сам усё гальштук папраўляе і не зводзіць вачэй з Лены. Непадалёк, побач з Адамчуком сядзеў Мікіцёнак і таксама ўважліва слухаў Лену.

...Волга з Донам
ціхім звонам,—

пела Лена, і Вера бачыла, як Васіль Барэйка, які стаяў адзін ля акна, кіўнуў у знак адабрэння галавою і ўсміхнуўся. Няўжо Лена расказала яму?.. Васіль павярнуў галаву і ўбачыў Веру. Іх позіркі сустрэліся. Вера не вытрымала і адвяла вочы. І тут убачыла, што на яе глядзіць Мікалай Пятровіч і ківае ёй галавою.

Яна зразумела яго і пад Васілёвым позіркам, які раптам стаў халодным і чужым, пайшла да Мікіцёнка, няўпэўнена пераstаўляючы ногі. Калі дайшла, зморана апусцілася на лаву.

— Ну, як справы? — спыталася яна, каб што-небудзь сказаць.

— Не жыццё, а ляснал песня! — адказаў Мікалай Пятровіч.— У гэтай дзяўчыны бясспрэчны талент.

— У яе залатыя рукі,— уставіла Вера.

Лена скончыла, і ўсе запляскалі ў далоні. Саскочыўшы са сцэны, яна хутка прабралася між радоў да Васіля. Чула, як нехта сказаў Адамчуку: «Дзяўчына здольная, яе б падвучыць яшчэ», але не звярнула ўвагі. Пагутарыўшы з Васілём, яна вярнулася назад да раяля і

стомлена села на крэсла. Папрасіўшы прабачэння ў Веры, да яе пайшоў Мікіцёнак, і Вера бачыла, як ён весела загаварыў з трактарысткай, якая свабодна адказвала яму, смяялася.

* * *

Загадам з міністэрства Прохараў заняў пасаду намесніка дырэктара па палітчастцы.

Нягледзячы на вялікае асабістае гора, што цяжарам лягло на яго сэрца, Прохараў не жыў замкнутым жыццём. Наадварот, ён імкнуўся быць там, дзе было неспакойна, дзе кіпела праца.

Не адразу, вядома, стаў ён такім.

Першыя гады пасля вайны, калі ён вярнуўся дадому, былі для яго пакутлівымі. Ён жыў і працаваў, як у сне. Потым з галавою акунуўся ў працу. Ён шукаў яе ўсюды, каб забыцца на ўласнае гора, стараўся заўсёды быць з людзьмі — і палюбіў іх. Яго заўважылі, ацанілі, і ён у хуткім часе заваяваў павагу лесарубаў.

Стаўшы намеснікам дырэктара па палітчастцы, Прохараў не пайшоў адразу ж у наступ на людзей пасіўных у працы і ў грамадскім жыцці. Ён перш-наперш імкнуўся знайсці прычыну іх пасіўнасці і, выявіўшы яе, намагаўся выкараніць...

І вось надышло Першамайскае свята.

Прохараў, Сініцкая, Адамчук, Барэйка занялі ганаровыя месцы ў прэзідыуме.

Матарыст Ліпніцкі, на грудзях якога красаваліся баявыя ордэны, абвясціў урачысты сход лесарубаў адкрытым. Калі да трыбуны падышоў Прохараў, у зале стала ціхаціха. Ён паклаў правую руку з паперкай на трыбуну, глянуў руплівa ў залу і гучна прагаварыў:

— Дазвольце, дарагія таварышы, сёння павіншаваць вас з поспехамі... Не адразу, вядома, наш леспрамгас дабіўся гэтых поспехаў. Былі і зрывы дзяржаўнага плана...

Гаварыў Прохараў аб тэмпах, аб людзях, якія сваёй самаадданасцю служаць прыкладам для ўсяго леспрамгаса. Ён называў лічбы, прозвішчы.

— У нас ёсць людзі сумленныя і бескарыслівыя. Ёсць нават і добрыя працаўнікі, якія з энтузіязмам узяліся за справу. Гэта — энтузіясты. Адным з першых я хачу назваць матарыста Ліпніцкага. З кіраўнікоў участкаў трэба адзначыць...

У гэты момант Прохараў кашлянуў разы два і змоўк. Ён успомніў пачын Сіліча, яго энтузіязм у пачатку арганізацыі ўчасткаў. Усе глядзелі на пераможцу сацыялістычнага спаборніцтва Барэйку, які сядзеў у прэзідыуме каля Адамчука, чакалі.

— Я хачу назваць начальніка Іванаўскага ўчастка Сіліча,— раптам закончыў Прохараў.

Адамчук недаўменна паціснуў плячыма і ўтаропіўся на Барэйку, які ад нечаканасці нават пачырванеў.

А Прохараў не спяшаўся гаварыць далей. Наліў паўшклянкі вады, глынуў крыху, а потым, дастаўшы з кішэні хустачку, старанна выціраў ёю вусны.

Лёгкі шэпт прабег па зале. Людзі паварочвалі галовы, шукалі Сіліча, які, спачатку нічога не зразумеўшы, цяпер разгублена азіраўся.

Калі з прэзідыума заапладзіравалі, калі апладысменты пракаціліся па зале, ён не вытрымаў і, улучыўшы момант, выйшаў з клуба...

Сонца ўжо схілялася над лесам, ахопленым сінявататай смугою. Лёгкія аблачынкі стаялі нерухома на даляглядзе. Сям-там пасля зімовага маўчання спрабавалі галасы птушкі,— няўпэўненыя іх спевы гучалі сярод ляснога шуму дзіўна.

Сіліч бег да ракі, адкуль даносіўся невыразны гул, які не сціхаў і не ўзмацняўся. Сілічу здавалася, што ён чуе не гэты гул, а воплескі — воплескі яму, «аднаму з першых», як сказаў Прохараў. Навошта ён так уважліва паглядзеў на Сіліча? Значыць, варты Сіліч, каб яго хвалілі? А ён думаў...

Сосны ля ракі гудуць на вясеннім ветры. Ільецца незразумелая, але прыгожая лясная песня, закалыхвае пачуцці Сіліча, супакойвае.

Вось і рака. Яе нельга пазнаць. Вялізныя крыгі кружацца на шырокім водным прасторы, стукаюцца адна аб адну, ламаюцца, крышацца.

Ледаход...

Вада бурліць ля берагоў, вырывае з карэннем алешыны, як быццам куды спяшаецца, і лішкі яе, не знайшоўшы месца ў рэчышчы, прабіваюць сабе дарогу ў хмызняк, заліваюць яго ўсё больш і больш.

Хто б сказаў, што неглыбокая рака Бароўка вясною мае такую сілу? Яна залівае лугі на цэлыя кіламетры, і тады заўзятыя рыбакі круглыя суткі шыбуюць на сваіх чаўнах. А рыбы тут у гэты час багата. З азёр і Нёмана

ідуць супраць вады плотка і язь. Вёрткія шчупакі ў такую пару нішчаць апалелую рыбу без асаблівых цяжкасцей. На вадзе не чуваць усплёскаў, як улетку раніцою ці ўвечары,— вада толькі маршчыніцца.

Сіліч, мокры ледзь не па калені, у расшпіленым паліто, без шапкі, спыніўся каля ракі і доўга пазіраў на быструю ваду. Яму было крыўдна за нешта, балюча сціскалі ся грудзі. Гэта быў сорам. Нечаканы паварот спраў, нечаспадзяваная пахвала Прохарава — усё гэта ўзняло ў душы Сіліча сапраўдную буру, закранула яго сумленне і свядомасць.

Не, людзі не зрабілі яго апошнім. Яны толькі клікалі яго за сабою, падштурхоўвалі, а ён упіраўся. Чаму ўпіраўся, калі хацеў ісці? А вось так — зазнаўся і не заўважыў, што адстаў. Здавалася ўсё, што ён наперадзе, што інакш і быць не можа і ніхто не абгоніць яго. Ды абагналі!.. А ён? О, калі б людзі ведалі ўсе яго справы! Напэўна, тады не было б Сілічу ад іх літасці...

Зіна, аднавяскоўка, чарнавокая, з яркімі, нібы прыпухлымі губамі, паўстае ў думках Сіліча. Ці кахаў ён яе? Не? Дык навошта прызнаваўся ў каханні, хлусіў? Навошта праводзіў з ёю час і даваў абяцанні? А пасля, калі ад гэтага «кахання» нарадзіўся сын, навошта ён пакінуў Зіну і сваю адзінокую маці? Спалохаўся ці проста, як самы апошні, агідны чалавек, паехаў у свет, каб зноў быць «вольным халасцяком»?

Сініцкай таксама прызнаваўся ў каханні. Толькі гэта — не Зіна. Паглядзела ў вочы і сказала: «Ты ўсім гэтыя словы гаворыш?.. Ану ўспомні, мо дзе плача хто ад твайго кахання...» Аж сорамна стала, быццам ведала, угадала.

Далей так жыць нельга. Трэба знайсці шляхі да сапраўднага, сумленнага жыцця. Трэба як мага хутчэй зрабіць гэта. Перш-наперш — забраць да сябе з вёскі Зіну. Яна, ціхая і добрая, толькі заплача ўпотай і даруе Сілічу яго ўчынак.

Ад такой думкі лягчэй стала на душы.

Успомнілася дзяцінства, сябры. Тады Сіліч быў завадатарам у вёсцы, аднагодкі слухаліся яго як камандзіра. Бацька, вечна заняты ў сельсавеце, любіў свайго сына і маці часта наказваў: «Глядзі ў мяне, не крыўдзі Кастуся... Ды каб не плакаў ён». Што захоча Кастусь, тое і будзе, патурала маці. А набольшаў, пачаў мудрэйшае выдумляць. Аднойчы суседу стажок сена спаліў. А баць-

ка толькі галавою пакруціў: «Ну і артыст... Адважны! Такі не прападзе ў жыцці, не-е...»

Прыслухаўшыся да шуму ракі, Сіліч не пачуў, як хтосьці падышоў ззаду і прыпыніўся ля яго. Ён адчуў толькі, як на плячо яму лягла рука. Зычлівы дзявочы голас сказаў:

— Ну, чаго вы пабеглі? Там прэмію вам трэба ўручыць.

Сіліч крута павярнуўся. Перад ім стаяла Вера. Яна была без хусткі, у шэрым асеннім паліто і гумавых боціках з шырокімі халяўкамі. На заклапочаным яе твары Сіліч убачыў спачуванне.

— Мне?! — выгукнуў ён. — Прэмію?..

І паківаў адмоўна галавою.

— Хадземце... — прапанавала Вера.— Прастудзіцеся.

— Вера, а што там Прохараў яшчэ пра мяне гаварыў? — ідучы за ёю, спытаў Сіліч.

— Гаварыў, што ты зазнаўся.

— А болей?

— Гаварыў, што гэта вынік тваёй маладосці. Але, кажа, веру ў яго здольнасці, гэта, кажа, моцны хлопец, ён выправіць свае памылкі... Дакараў Адамчука.

У Сіліча адлягло па сэрцы. Але скідка, якую Прохараў зрабіў на маладосць, і апошнія словы Веры былі непрыемнымі яму.

— Можна сляпым і да старасці дажыць,— раздражнёна прамовіў ён.— Сам іншы раз бачу, што не туды гну, але дурная натура прымушае рабіць па-свойму. Людзі, скажам, працу любяць як жыццё, і я таксама люблю, але па-свойму, не так, як усе... Я ў ёй чамусьці заўсёды шукаў гонару...

Вера маўчала, ён гаварыў, гаварыў, як чалавек, якому толькі-толькі становіцца зразумелым сэнс жыцця.

* * *

Вясна з кветкамі прыйшла раптоўна.

Учора яшчэ ля кустоў арэшніку зямля была ўслана чорнымі лістамі, а сёння з-пад іх ужо вылезлі сінія пралескі і глядзяць, глядзяць не падзівяцца, як плывуць па небе воблакі, як паволі гойдаюць вяршалінамі старыя бярозы.

Звонкая песня жаваранка не сціхае ў блакіце.

Думы, па-вясноваму вясёлыя і светлыя, вядуць цябе

да ўспамінаў аб маленстве, калі ты глядзеў на навакольны свет вачыма гэтых пралесак, калі ты быў усяму рады і кожны новы дзень сустракаў воклічам: «Мама, апранацца!»

Маленства! Ці не вясна ты ў жыцці чалавека, сагрэтая клопатамі бацькоў, гэтым нязгасным сонцам дабраты і пяшчоты? Ці не вясна ты, маленства, якая дае мужнасць і сілы чалавеку, рыхтуе яго ў доўгую дарогу жыцця?

Мікалай Пятровіч сядзеў на сівым аброслым камені, слухаў песню лесу аб вясне, а Вера збірала кветкі. Сонца, хаця ўжо схілілася на захад, раскінула свае агністыя промні ў галінах бяроз, яно адчувалася на тварь, на руках. У лесе змоўкла апошняя электраўстаноўка. Толькі гул аўтамашын парушаў ляспую цішыню. Працоўны дзень скончыўся.

Вера крадком кідала праніклівы позірк на задумлівы твар Міколы, і ад смутку яе вочы тумапіліся. Аб чым ён думае? Відаць, цяжкія ў яго думы, хоць і вясна на дварэ. Ведае Вера — не знайшло каханне Мікалая Пятровіча ўзаемнасці, заглухла, і цяжка чалавеку, бо ў грудзях пуста...

Вера падышла, села побач і, прышпіліўшы да пінжака Мікалая Пятровіча кветку, сказала:

— Вы сталі такія маўклівыя. Не трэба так...

Мікіцёнак адчуў спачуванне ў Верыным голасе.

— Мне цяпер не да жартаў.

— Вы пра Насцю ўсё думаеце? А мне ніяк не выпадае з'ездзіць.

— Думаю,— звёў ён чорныя бровы.— Калі б, скажам, загінула яна... Адбалела б сэрца, і ўсё. А то...

Мікола стукнуў сабе кулаком па калене і ўстаў.

— Хіба мала на свеце дзяўчат, харошых, як Лена ці...

— Не, не, Верачка,— перапыніў яе Мікалай Пятровіч і ціха засмяяўся,— не ўгаворыш. Мяне, можа, і здолееш угаварыць, а сэрца — ніколі.

— Ну, добра,— устала і Вера.— Яна не вярнулася. Значыць, усё жыццё і сумаваць?

— Бываюць хвіліны...

— Тады трэба з'ездзіць да яе,— нават са злосцю сказала Вера.— Высветліць. Паедзем разам...

— Усё высветлена, Верачка... Насця выйшла замуж. Я не гаварыў табе. Мне прыслаў пісьмо таварыш, разведчыкам у нас быў. З іхняга сяла хлопец...

Сініцкую гэтыя словы ашаламілі, яна не ведала, што гаварыць далей, чым усцешыць Міколу.

— Ты паглядзі наўкола,— пачула яна яго голас.— Колькі хараства, прастору. І ўсё гэта такія людзі, як мы з табою, Вера, адстаялі ў суровай бітве, усё яно наша... Не буду больш сумаваць! — Мікалай Пятровіч рашуча трасануў галавой.— Глянь вось на гэтую бярозу. Сонца зрабіла яе галіны меднымі, а ствол — чыстае серабро. Бачыш?

Вера пазірала на бярозу і нічога не бачыла. Яна думала аб лёсе Мікалая Пятровіча. Вясна, лес, цёплы дзень расчулілі яго, і ён засумаваў. І дзіўна атрымліваецца, што той, хто зрабіў столькі добрых спраў для людзей, многіх нават выратаваў ад смерці, вярнуў шчасце,— цяпер сам быў нешчаслівы. Якая іронія лёсу! Веры было шкада яго да болю, да слёз. І разам з тым яна думала: «Вось хто ўмее кахаць па-сапраўднаму...»

І, як бы зразумеўшы яе думкі, Мікалай Пятровіч узяў Веру за руку.

— Кожнаму, Верачка, сваё, але сумаваць не варта, праўда? Вось я марыў інстытут пасля вайны скончыць. Закончыў... Можа, і гэта перашкодзіла нам сустрэцца з Насцяй, хто ведае? Лёс чалавека — рэч складаная.

— Гэта праўда,— ахвотна згадзілася Вера.— Вось тады, у вайну, калі б не вы...

Яна змоўкла, бо зразумела, што Мікалаю Пятровічу цяжка ўспамінаць пра вайну. Не пільнуючыся дарогі, яны паволі пакрочылі між дрэў і хутка выйшлі на палянку.

Вясна тут гаспадарыла на поўную сілу. Маленькія прыгажуні елачкі, быццам дзяўчынкі ў пышных зялёных сукенках, пасталі наўкол тоненькай кволай бярозкі, а над імі сіне ад пралесак. Зямля зелянела, здавалася, увачавідкі. Тут амаль не адчувалася ветру, толькі вакол шумела несціхана пушча, а над палянкай, быццам званочкі, звінелі жаваранкі.

Ля мяккіх купін між леташняга папаратніку, як кацібыя лапкі, тырчэлі новыя квола-жаўтаватыя сцяблінкі. З кожнай гадзінай гэтыя лапкі станавіліся нібы шырэй і шырэй, а загнутыя іх кінцікі выпростваліся.

Моўчкі прайшлі Вера і Мікалай Пятровіч гэтую дзівосную палянку. На ўскрайку лесу развіталіся.

Дома Веру чакала навіна. Васіль прынёс ёй ад Прохарава пісьмо. Яна разарвала канверт і хутка прабегла вачыма.

— Вось радасць! — выгукнула яна.— Васіль, угадайце, што гэта?.. Ды, дарэчы, давайце будзем звяртацца адзін да аднаго на «ты», а?

— Згодзен,— ажывіўся Барэйка і, успомніўшы словы Лены, смела дадаў: — Чытай паперку. Між намі цяпер сакрэтаў няма.

Твар Веры радасна засвяціўся.

— Слухай, Васіль, слухай... — І прачытала:

«...Вы накіроўваецеся ў Мінск для прыёмкі новых машын. Тэрмін — дванаццаць рабочых дзён».

— Дык дзе ж тут радасць? — усміхнуўся Васіль.— Быць без цябе дванаццаць дзён. Так? — паклаў на стол свае кнігі (Барэйка рыхтаваўся да паступлення ў завочны інстытут) і беражліва дакрануўся да Верынай рукі.

— Што ж, пасумуй... — гарэзліва сказала Вера.— Кажуць, што пасля расстання людзі лепш разумеюць і адчуваюць адзін аднаго... А цяпер уключы наш прыёмнік.

Несучы ў сабе буру, паволі пайшоў да прыёмніка. «Наш»,— думаў ён і гатовы быў бясконца паўтараць гэтае слова.

* * *

На рацэ Бароўцы рыхтаваліся плытагоны ў далёкую дарогу.

Тут, пакуль гуляла вада, можна было правесці нават цэлыя караваны плытоў на Нёман.

На рум у дапамогу плытагонам кінулі трактары і лябёдкі. Плытагоны аглядалі бусакі, выбіраючы сабе больш надзейныя; з штабеляў скатвалі бярвенне і на вадзе вязалі плыты. Вязалі надзейна, бо шлях далёкі і не лёгкі праплывуць яны.

Лена, як толькі канчаўся рабочы дзень, бегла да Веры. Трактарыстка палюбіла Веру, як сястру. І калі прыходзіў Васіль, яны ўтраіх ішлі на валейбольную пляцоўку, у клуб ці на рэчку. Дружба ў іх завязалася моцная.

Сёння Вера павінна ехаць у Мінск, і таму Лена, ледзь толькі скінула камбінезон, прыбегла да яе. Васіль ужо быў там.

— Пойдзем апошні раз на пляцоўку,— прапанавала Лена.

Яны выйшлі і адразу сустрэлі Петруся, і Лена быццам незнарок адстала.

— Не ідзі на пляцоўку,— папрасіла Лена Петруся,— людзей не смяшы...

— Леначка,— сур'ёзна сказаў Пятрусь,— ну, калі ты нарадуеш мяне? Мы ж, як бы гэта сказаць, вадзіцелі... Як бы гэта сказаць, мазутчыкі. Жыць бы нам, Лена, як людзі жывуць, душа ў душу.

Яна пажартавала голасна, каб усе чулі:

— Эх ты, мазутчык! Малады яшчэ, а пуза разгадаваў — роўна з носам. Не люблю я такіх,— і пабегла да Веры і Васіля.

— Ды я для цябе таней ніткі стану,— кінуўся ўслед Пятрусь,— цераз трактар буду скакаць.

Лена азірнулася, праспявала звонка:

...Я на свадьбу тебя приглашу,
А на большее ты не рассчитывай.

— І толькі? — спытаў, пасмялеўшы, Пятрусь, ужо далучыўшыся да кампаніі.— Дык навошта ж ты сэрца маё ўзяла на буксір, га?

Усе дружна і весела засмяяліся. А неўзабаве да іх далучыўся яшчэ адзін валейбаліст — Валодзька.

На Валодзьку быў новы карычневы гарнітур, у маленькай кішэні якога, звесіўшы свае галоўкі, тырчэлі павялыя пралескі.

— От цяпер ты натуральны Чыжык,— засмяяўся Васіль, прывітаўшыся з Валодзькам за руку.— Ну, хваліся, як жывеш?

— А-а, няма чаго хваліцца,— адказаў той і, зірнуўшы на Веру, дастаў пачак папярос.— Куры, калі ласка.

— Ты ж ведаеш — не куру.

— Не курыш? — здзівіўся нарміроўшчык.— Яна ад'язджае, а ты не курыш? Ды я на тваім месцы люльку нават набыў бы.

— А чаму гэта Чыжык такі злосны сёння? — іранічна спытала Вера.

Валодзька закурыў і, склаўшы губы трубачкай, выпусціў тоненькі струменьчык дыму.

— Чаму? Хіба не ведаеце? Справаздачу пішу. Сяджу, як у клетцы, нават ежу прыносяць, кормяць, як індыка. Э-эх, прафесія, каб ты згарэла!..

Але ніхто і не падумаў, што Валодзька кляне лёс, прафесію. Ого! Ён ганарыўся ёю. Ганарыўся тым, што работа яго звязана з усім прадпрыемствам, з калектывам.

На пляцоўцы Валодзька сказаў Барэйку:

— Васіль, запрашаю вас з Вераю на вяселле.

— Каб ты згарэў!

— А што ж там,— абтрос Валодзька попел з папяроскі.— Я ж ужо, як табе сказаць... Сам ведаеш, гэта самае, як-ніяк, а ўсё-такі, як гаворыцца...— ён паглядзеў у бок пошты, ажывіўся.— Вунь, бачыш, хто ідзе?

Васіль глянуў. Да іх набліжалася паштарка, тая, што спявала ў хоры і станавілася заўсёды бліжэй да раяля. Рудаваласая, з бледнаватым тварам і яснымі, добрымі вачыма. Яна падышла, сарамліва прывіталася з усімі.

— Знаёмцеся, сябры,— сказаў Валодзька,— мая зямлячка.

Бледнаваты твар дзяўчыны крыху паружавеў. Яна сказала «Каця» і далучылася да ігракоў.

Пасля гульні ўсе праводзілі Веру дадому, жадалі ёй шчасліва з'ездзіць, паціскалі руку...

Калі з пакойчыка вынасілі Верыны рэчы, Васіля выклікалі ў кантору атрымаць прызначэнне на новы аб'ект.

Веру паабяцаў праводзіць Прохараў.

— Я вас як належыць, па ўсіх правілах на вакзал падкіну. На дырэктарскай,— сказаў ён,— сам прапанаваў. А то, кажа, пакрыўджуся, шкада, кажа, што часу не маю...

На двары да іх падышоў Сіліч. Пажадаўшы Веры ўсяго добрага, ён перадаў Прохараву тэлеграму. Той прачытаў і задаволена паківаў галавою.

— Нарэшце! К нам едзе малады ўрач, жанчына... Значыць, адну адвязу, а другую прывязу. Сядайце, Вера Паўлаўна.

— Папрашу вас... — ледзь пачырванеў Сіліч.— Там будзе чакаць адна жанчына з малым на руках. Яна к нам, у Баркоўскую пушчу. Прывязіце, калі ласка...

— Ого! Значыць, там дзве жанчыны? Ну, што ж, чым больш, тым лепш. Хто яна?

— Мая зямлячка...

— У госці?

— Назусім.

Прохараў паклаў руку Сілічу на плячо і з дакорам у голасе прамовіў:

— Нарэшце... Я, паміж іншым, чакаў ад цябе гэтага, рад!

Калі машына крапулася з месца, Вера памахала Сілічу рукою. На нейкі момант яна ўбачыла яго вясёлы твар, і па сэрца нахлынула прыязнь.

Зразумеўшы яе настрой, Прохараў заўважыў:

— Вось пабачыце, будзе па ганку стаяць, пакуль не прыеду. А сустрэне, на руках дадому прынясе. Ве-е-даю, от пабачыце...

Вера ад задавальнення закрыла твар рукамі. Ёй прыемна было пачуць гэта ад такога чалавека, як Прохараў...

Неўзабаве машына выйшла на зялёныя разлогі поля. З левага боку, прытуліўшыся да лесу, засталіся Баркі, і Вера доўгім позіркам правяла высокія ліпы ў канцы сяла. Там хата Барэйкі, прыгожы сад, працавітая маці Васіля. Усё гэта цяпер стала родным ёй, дарагім.

Вера ўспомніла, як летась, глыбокай восенню, яна ехала сюды па гэтай дарозе з гарачымі думкамі, але з самым туманным уяўленнем аб Баркоўскай пушчы. Цяпер яна здавалася ёй самым цудоўным кутком на зямлі.

Вось яе першыя знаёмыя — Пятрусь, Сіліч, Васіль...

Як прыемна азірнуцца назад, паглядзець на мінулае, параўнаць з тым, што дасягнута. Жыццё, як гэтая машына, імчыцца наперад і наперад. Вялікае яно і цудоўнае.

Вера ведае, што людзі тут навучылі яе жыць і глядзець на ўсё вокам гаспадара, удзельніка вялікай стваральнай працы, будаўніка светлай будучыні. Тут Вера ўпершыню як бы ўведала свой характар. Не, не баязлівая і не ціхая яна, як казалі ў тэхнікуме, а смелая і рашучая. Такой яе зрабіла праца, асяроддзе добрых, сумленных людзей.

— Вы,— звярнулася Вера да Прохарава,— тады, на сходзе, добра зрабілі, што Сіліча ўспомнілі. Лепш і не прыдумаеш!.. Мы часам прывыклі па старой памяці толькі крытыкаваць адстаючых, нават ганьбаваць іх, як нікуды не вартых... А тут — як добра атрымалася! Я, кажа, як у люстэрку сябе ўбачыў. Людзі, кажа, як са мною абышліся? Замест таго каб біць мяне, кажа, добрым словам успомнілі...

— Значыць, чалавек зразумеў сваю памылку,— сказаў Прохараў.— А я не выпадкова пахваліў яго. Усё-такі ён старанны, хоць і залішне гонар мае. Адамчук разбэсціў яго, а наша справа, таварыш Сініцкая, зрабіць з яго сапраўднага чалавека.

* * *

Да прыходу цягніка заставалася хвілін дваццаць пяць. Прохараў пайшоў шукаць урача, а Вера выйшла ў прывакзальны садзік, села на лаўку пад рабінаю і звярнулася

да дзяўчынкі гадоў шасці, якая ніяк не магла падзець капялюшык сваёй лялькі, не на многа меншай за яе самую.

— Ты куды гэта, малышка, едзеш са сваёй дзяўчынкай?

— Далёка,— адказала тая, схіліўшы набок галоўку. Сонца асвятляла яе смуглявы тварык, але дзяўчынка не жмурыла вачэй.

— Вось як! А дзе твая мама?

— Унь,— паказала дзяўчынка рукою на маладую жанчыну ў шэрым, як і ў Веры, летнім паліто і сінім берэце. Жанчына набліжалася паволі, у глыбокім задуменні.

— А як жа цябе завуць?

— Вера,— адказала дзяўчынка.

— Вера? Вось малайчына. Мяне таксама Верай завуць... На вось табе цукерку. Ты любіш цукеркі?

— Люблю.

Дзяўчынка ўзяла цукерку і падзякавала.

— Мама, мама! — зашчабятала яна, калі яе маці падышла блізка,— цёця Вера мне цукерку дала — во якая!

— Не сумавала ты тут без мяне? — не глянуўшы на Сініцкую, прагаварыла жанчына, папраўляючы хустку на галаве дачкі.

— Мы тут з ёю і пазнаёміцца паспелі,— адказала за дзяўчынку Вера. Яна цяпер не магла адвесці свайго позірку ад заклапочанага твару жанчыны. «Яна ці не яна!» — Ад яе дапытлівага позірку жанчына ўзняла вочы і адразу сумелася. Ціха, няўпэўнена спытала:

— Ве-ра?

— Вера яна, ага! — падхапіла дзяўчынка, і задаволена запляскала ў далоні.— І я Вера, і я Вера...

— Насця! — вырвалася з грудзей у Веры.— Ты куды едзеш, Насця?

Яна хацела кінуцца ў абдымкі, але зірнула на дзяўчынку і...села на лаўку зноў.

— Я адразу пазнала,— ціха сказала Насця, заўважыўшы халоднасць Веры.

— Я — таксама... Але ж ты пасталела як!

— Праўда, нават пастарэла,— згадзілася Насця, таксама сеўшы на лаўку.— Затое дачку — вось якую маю...

Халадок прабег па спіне Веры.

— А татка яе дзе?

— Мой татка ў арміі служыць,— сказала дзяўчынка,— ён хутка прыедзе.

— Ідзі, Верачка, пагуляй, а я пагутару з цёцяй,— прамовіла Насця. І калі дзяўчынка пабегла да кустоў бэзу, куды нечакана прыляцела цэлая плойма вераб'ёў, дадала: — Чакае татку, а ён ніколі ўжо не прыйдзе...

І Насця расказала Веры, што ля Одэра на шпіталь, дзе служыла яна, наляцелі нямецкія самалёты, як параніла там жанчыну, якая туліла да грудзей дзіця. Раны аказаліся цяжкімі, і жанчына памерла, пакінуўшы дзяўчынку...

Вера слухала, глядзела ў вочы Насці і ўспаміпала, як партызаны жартавалі з яе: «Гараць твае вочы, Насця, пякучым агнём, свідруюць душу...» Не дзіва, што Міколу прыемна было глядзець у гэтыя сапраўды агністыя вочы, сінія-сінія...

— Насця, значыць, гэта не твая дачка?..

— Ой, Верачка, адкуль у мяне будзе такая дачка?

— Дык расказвай хутчэй!..

— Ну, скончыла я летась інстытут, працавала крыху ў горадзе. Цяпер у Баркоўскую пушчу накіравалі. Гады цэлыя прайшлі, а на радзіму, у лес, пацягнула...

Вера раптам абняла Насцю за шыю і моцна, некалькі разоў, пацалавала.

— Ну і радасці ж ты вязеш туды, каб толькі ведала!

— Каму?

— Не скажу...

— А ты як жывеш? — у сваю чаргу спытала Насця.

— Працую механікам, жывецца добра.

— А мне помніцца, у лесе працаваць хацела.

— Дык я ў лесе і працую, на лесараспрацоўках у Баркоўскай пушчы!

— Вось як! Значыць, будзем зноў разам?

— Будзем. Усе трое...

— Каго ты маеш на ўвазе?

— Міколу Мікіцёнка! — радасна паведаміла яна.— Ён чакае цябе, Насця.

Насця вялікімі вачыма глянула на Веру.

— Што ты гаворыш? Няўжо? Я аднойчы чула пра яго... Інстытут скончыў.

— Чакае, Насцечка,— Вера прыхілілася тварам да яе пляча.— Эх вы, няшчаслівыя!

— Няшчаслівыя,— ціха паўтарыла за ёю Насця.— А чаму? Я чакала яго, а ён не прыйшоў. Разам са сканчэннем вайны скончылася, знікла смеласць. Колькі разоў я парывалася сама прыехаць, але інстытут, дзіця, клопаты.

А пасля — сустрэча. Думала — жанаты ён, інакш застаўся б тады.

— Дзіця на руках — вось што было галоўнае ў вашым няшчасці,— у задуменні сказала Вера.— А пасля пісьмо...

— Магчыма...

Гучны гудок цягніка, які набліжаўся да станцыі, заглушыў апошняе слова Насці.

З вакзала выйшаў Прохараў. З ім была невысокая маладая жанчына, якая трымала на руках маленькага хлопчыка.

— Вось наш новы ўрач, знаёмцеся,— сказала Вера, калі Прохараў з жанчынай падышоў да іх. І паказала на Насцю.

— Вось гэта цікава...— разгублена прагаварыў Прохараў, пазіраючы то на адну, то на другую.— Знаёмыя?

— Знаёмыя, таварыш Прохараў, і добра знаёмыя...

У гэты час да станцыі падышоў цягнік. Вера хацела ўзяць свае чамаданы, але Прохараў ужо трымаў іх.

— Праводзіць, дык па ўсіх правілах,— сказаў ён і паволі рушыў па пероне.

Насця ўсхвалявана пацiснула Веры руку.

— Хутчэй вяртайся... Мы ж так мала пагутарылі...

— Пагутарым, Насця! Наша ўсё наперадзе,— адказала Вера і, пацалаваўшы дзяўчынку ў шчаку, пакрочыла за Прохаравым.

1956

# НАДЗЕІ І ЗДЗЯЙСНЕННІ

Дзень выдаўся цёплы, вільготны.

Раніцай прайшоў спорны дождж, і дрэвы абапал дарогі яшчэ не абсохлі.

Па размытай дарозе, віляючы між калдобін, імчалася аўтамашына. Учапіўшыся аберуч за барты, у кузаве моўчкі сядзелі каля сваіх клункаў зазерскія жанчыны. Лена Жураўская адчувала па сабе іх дакорлівыя позіркі: яна ведала, чаму Алесь Зыблюк так гоніць машыну.

Яна ўспомніла ўсё да драбніц.

...У калгасным клубе грымела радыёла, моладзь танцавала. Лена стаяла каля стала, мяняла пласцінкі, не зводзячы воч з дзвярэй. Чакала Алеся, хвалявалася. «Няўжо ён зноў папіўся з Віктарам Бадзягам? Слова ж даў...»

Хлопец слова не стрымаў.

Назаўтра, у нядзелю, да Лены завіталі Алесевы пасланцы — сваты. Прыйшоў сам старшыня калгаса, а яна пажартавала ды — выправадзіла няпрошаных гасцей.

Глядзела ўслед, падняўшы ражок фіранкі, выцірала слёзы: «Чаму ж не піша мой Толя? Ці забыўся ўжо? Алесь сватаецца... Грош цана яго каханню, калі зноў п'е, прытворства адно... Няхай сабе як хоча, так і жыве».

Многае перадумала тады Лена.

...Дзяўчына ўпотай зірнула на хмурыя твары жанчын і ціха ўздыхнула: асуджаюць, вiдаць. Ніхто з ёю не пагаворыць як з чалавекам, не распытае аб жыцці, а вось асуджаць кожны можа. Няўжо зайздрасць людзям вочы засціла? Многім у Зазер'і не падабацца, што якраз яе, Жураўскую, прызначылі бібліятэкаркай, а не каго другога.

Але ж у яе спецыяльная адукацыя! Яна праводзіць і клубную работу, ведае ноты, мае добры голас.

— Кніжачкі нябось з нашых працадзён...— зірнуўшы на некалькі важкіх пакункаў у тоўстай рудой паперы, што ляжалі ля кабіны, падкалола Лену каваліха Зося, жанчына малая і пякучая, як крапіва.

— Чужых грошыкаў ёй не шкада,— уставіла і другая, чырванатварая, ёмкая маладзіца Ліда, якую ў сяле ўсе звалі Сарока-варона. Жыла яна пры маці, у калгасе не была ні дня. Усё замуж выходзіла. Разоў дзесяць пакідала яна з музыкай Зазер'е і гэтулькі ж разоў вярталася дамоў адна. Было двое прымакаў, ды і тыя збеглі...

«Такім язычком, як у Ліды, каго хочаш зжывеш... Гандляркі праклятыя! Колькі ў вас тых працадзён...» — даўшы волю злосці, падумала Лена.

Яна ўспомніла сваю маці, заўсёды занятую, ціхую. Ад яе Лена навучылася быць сціплай, праўдзівай. Маці і памерла, як жыла, ціха, непрыкметна. Устала да дня, напякла бліноў ды прылегла адпачыць. І не ўстала...

Паволі коціцца па няроўнай дарозе трохтонка, паволі паўстаюць успаміны. І нейкі невядомы лагодны матыў мроіцца ў абуджаных марах.

То раптам заглухне, астыне ўсё, і тады з'яўляецца аднекуль чужая злая думка: чаму яна не кіне гэтае сяло, чаму не паедзе ў горад, як іншыя? Што яе тут трымае, адну-адзінокую, сярод зайздросных, суровых людзей?

Але ж тут, у Зазер'і пахавана яе маці. Тут прайшло хоць і цяжкае, але непаўторнае дзяцінства. Тут упершыню Лене адкрыўся свет, тут яна спазнала першую радасць і першае гора.

Машына выйшла з лесу, і Жураўская адразу нібы ажыла. Яна ўбачыла здалёк наводшыбе клуб за зялёнымі кустамі бэзу, пасаджанага яе рукамі яшчэ восенню. Той бэз рос пад яе акном. Пакінуўшы бацькоўскую хату, Лена ўсё, што ёй было патрэбна, перанесла і перавезла ў клуб, пасялілася там у невялічкім пакойчыку.

Зазер'е — сяло вялікае. Адзін канец яго ўпіраецца ў возера, а другі хаваецца ў лесе. Двухкіламетровае поле раскінулася паабапал. Як кінуць вокам хвалюецца на ветры збажына...

Машына спынілася далёка ад сяла, дзе дарогу ахінаў густы хмызняк.

Медзведзяваты Алесь высунуў з кабіны непрычасаную галаву і гучна прабасіў:

— Прыехалі, квактухі! Прашу — дваццаць капеек за дарогу — гэта няшмнога! А хто прыбядніцца, з таго — трыц-

цаць! Жыва, грамадзяпачкі, не затрымлівайце дзяржаўны транспарт.

Жанчыны хутка пакідалі праз борт парожнія кашы і вёдры, саскочылі на зямлю, дасталі з-за пазухі хусцінкі і, не спрачаючыся, разлічыліся з шафёрам. Лена сышла апошняю, не пазіраючы на Алеся, працягнула новенькі рубель:

— Дробных няма...

Алесь насупіўся:

— Схавай свае грошы. З працоўнага чалавека не бяру! Садзіся, давязу ў сяло.

Яна села і паехала да магазіна, што стаяў амаль у цэнтры Зазер'я. Занёсшы на ганак нялёгкія пакункі і падзякаваўшы шафёру, Лена азірнулася: няўжо нікога не знойдзецца, хто памог бы занесці кнігі ў бібліятэку. Да клуба ж не меней як паўкіламетра.

Ніхто яе тут не чакаў, не сустракаў: час гарачы, сенакос. Усе на лузе, ад малога да вялікага... «Мог бы давезці ўжо да месца! — у злосці і крыўдзе падумала Лена.— Ці ж я для сябе стараюся?»

Наводшыбе непрыязна цямнеў лес, маўкліва і насцярожана глядзелі на яе расчыненыя вокны хат, а здалёк даносіліся цяжкія ўздыхі возера.

З магазіна выйшаў Віктар Бадзяга, высокі бялявы хлопец у клятчастай кашулі. Быццам не заўважаючы Лены, падміргнуў шафёру:

— Здарова, Алесь! Цукар прывёз? А паркаль? Малайчына!..

— Я-то малайчына,— адказаў Зыблюк і падаў накладныя.— А мяхі свае куляй сам. І так ад іх сярэдзіна баліць...

— Паправім сярэдзіну! Чуеш? Кульнём цукар, а пасля кульнём што-небудзь іншае. Не салодкае, але моцнае...

Алесь адмаўляўся нядоўга. Урэшце махнуў рукою:

— Давай! Змей ты пракляты. Угаварыў.

Лена зразумела — гэта сказана ў яе адрас. «Ну і няхай п'е... Хоць захлынецца!» — узяла цяжкую сваю ношу, звязала хусткаю, закінула на плечы і паціху падалася ў сяло.

— Мамзель, прашу прабачэння! — пачула яна і азірнулася.

Алесь падышоў пеяк бокам, злосны, рукі ў кішэнях. За ім асцярожна, нібы крадучыся, наблізіўся і Віктар. Яго

масляністыя светлыя вочы пасмешліва бліснулі. Лена адвярнулася: вельмі ж нахабны позірк у гэтага «казла», як называлі Бадзягу ў сяле.

— Што ж, дзетачка,— пачаў з-за плячэй таварыша Віктар.— Няўжо мы такія непрыгожыя, што ты нос вернеш? Гарадскога чакаеш? Глядзі, дзетачка, каб у дзеўках не засталася,— выскаліў ён жоўтыя зубы.— Падумай... Пагавары вось з ім.

Алесь, з выглядам пакрыўджанага, надзьмуўся як індык.

Лена перамагла пачуццё непрыязні да гэтага чалавека, адказала стрымана:

— Пра што ж гаварыць? Зноў усё пачынаць спачатку?

— Бачыш, ён зноў запіў! Не з добрага жыцця! — сказаў Віктар.

— Піце, хлопчыкі, труціцеся...

Віктар прыжмурыў адно вока, нібы прыцэліўся на дзяўчыну. Адразу загаварыў лагодна:

— А навошта труціцца? Ты зірні да нас за кулісы... Дальбог, шампанскае п'ём! Пачастуем. Бутэлечку адкаркуем, пра любоў пагаворым. Згода?

Лена зірнула на маўклівага Алеся:

— Пра любоў не гавораць...

Гэта было сказана яму, і ён зразумеў.

— Пайшлі, Віктар! — сказаў злосна.— Я з дарогі зусім засмяг...

Яны пайшлі.

«Пра любоў пагаворым... Кавалеры, каб вас халера! Ні адзін нават не ўздумаў паднесці пакункі». Яна ішла і злавалася, што на вуліцы ні душы. Хоць бы малыя трапіліся. Дык і тыя на возеры.

Выйшаўшы на сцяжынку ля плота, Лена апусціла ношку на траву. Ад цяжару і гарачыні яе твар пакрыўся кропелькамі поту. Яна абцерла твар хусцінкай, перадыхнула.

Насупраць праз вуліцу з сіняй форткі выйшла чарнявая дзяўчына, але яна нават не зірнула ў гэты бок. Малая, быстрая, у лёгкай стракатай сукенцы, яна, здавалася, не пабегла — пакацілася на сваіх кароткіх нагах.

«І Волька нешта злуецца. Усім я тут як бяльмо на воку».

Пакуль Жураўская вучылася, Волька загадвала зазерскай бібліятэкай. Няўжо яна не разумее, што была часова? Ці ж варта з-за гэтага цурацца бібліятэкі і сяброўства?

Лена зноў ускінула пакупкі на спіну, пайшла. Сяло доўгае, а гарачыня нясцерпная. Сонца дасушвала апошнія срабрыстыя хмурынкі і, здавалася, спыніла свой бег, павісла над самай галавою. Вецер улёгся. Цішыня стала такая, што лісце на ліпах абвяла — не зварухнецца. Раскрыўшы дзюбы і раскінуўшы крылы, у пяску пад плотам «купаліся» раскудлачаныя куры.

Вось з-пад варот высунуўся санлявы руды сабака. Гэта кавалёў Гром, вядомы ў сяле як самы заядлы і злосны вартаўнік Зосінай «спадчыны», што знаходзілася за дубовымі варотамі. Але, відаць, і яго размарыла спякота: ляніва гыркнуўшы, Гром знік у падваротні.

Хавалася ў цень усё жывое. Адны вераб'і бадзёра пырхалі ў вішняку за плотам.

А вось і хата старшыні калгаса Караня.

Лена абрадавалася: Корань быў на двары. Ён глядзеў на яе і ўсміхаўся. Гэты шыракаплечы магутны чалавек падабаўся Лене. У яго прыемны адкрыты твар, шчыры пагляд, лагодны голас.

— А-а, прыехала!.. Што новенькага прывезла?

Лена прывіталася, моўчкі падала паперку, копію рахунка на кнігі. Корань зірнуў на рахунак, усміхнуўся ў рудаватыя вусы:

— З гэтым разбяромся пасля, а цяпер зойдзем у хату.

Ён адчыніў шырэй фортку, узяў адной рукой кнігі і пайшоў наперадзе.

«Мусіць, здагадаўся, што за сваю прэмію трохі купіла. Яго не абдурыш, верабей страляны»,— падумала яна. І стала крышку сорамна: ці ж мала ён дае з калгаснай касы, ці мала перадаў кніг са сваёй бібліятэкі? Жураўская не раз выслухвала яго папрокі.

Але сёння старшыня не сварыўся, не папракаў. Паклаўшы пакунак на лаву, ён паківаў галавою:

— Эх, дзеўчанё, дзеўчанё! Ці ж табе такі цяжар насіць? Вось папалуднуем, памагу...

Лена сумелася, пакруціла галавой:

— Ды я не галодная, дзядзька Рыгор!

— Сядай, сядай. Не часта ў нас бываеш. Тэкля! — паклікаў ён жонку.

Тэкля прыйшла з другой паловы хаты, малая, кульгавая. Кіўнула Лене галавой і загрымела засланкай. Хутка на ўсю хату запахла варанай капустай, запраўленай старым здорам.

Лена даўно не ела такой капусты. Пахваліла:

— Смачная. Каб ведала, што капуста,— не адмаўлялася б!..

— А я па другое і не запрашаў бы,— усміхнууся Корань.

Заўсёды маўклівая, Тэкля таксама разгаварылася:

— І чаму ты, Гэлька, такую хату кінула? Чаму ад сяла адракласся ды ў тым клубе жывеш? Няўжо не боязна там адной? А людзі ж чорт ведае што падумаюць і што нагавораць...

Што на гэта сказаць?! Не можа Лена ў хаце сваёй жыць — і ўсё! Там кожная рэч напамінае аб мінулым, а яго не вернеш. Дык навошта мучыць душу? Ледзь дачакалася, калі скончыўся полудзень.

Ішла за старшынёю і думала:

«Чаму, чаму? А чаму такі дужы, такі прыгожы чалавек узяў сабе ў жонкі самую непрыгожую ў сяле, кульгавую Тэклю?»

Ля самага возера, дзе набягалі на жоўты жвір срабрыстыя хвалі, стаяў новы клуб — даволі прыгожая будыніна з вялікай верандай і светлымі вокнамі.

З аднаго боку клуба зіхацела жоўтай фарбай невялікая прыбудова. Там нядаўна і пасялілася Лена. Абапал дарожкі, што вяла з дарогі да ганка, ужо не буяла пустазелле, як раней. Цяпер тут густа раслі рамонкі, півоні, астры і незабудкі. Руплівая жаночая рука адчувалася на кожным кроку.

— А жыць магла б і ў мяне. Хата на дзве палавіны,— калі падышлі да будыніны, сказаў Корань.— Ведаеш жа — не пашанцавала мне з дзяцьмі. Двое было і абое...

Ён не дагаварыў, уздыхнуў.

Лена маўчала. Яна ведала, што двое сыноў старшыні не вярнуліся з вайны. Яны загінулі ў тым партызанскім атрадзе, у якім быў і яе бацька.

— Вы мне прышліце каго-небудзь у дапамогу, дзядзька Рыгор... Трэба добра клуб памыць ды і вокны...— ужо на ганку сказала Лена.— Адной цяжкавата...

— Ну, а вечарамі як — людна? — нібы не звяртаючы ўвагі на просьбу дзяўчыны, спытаў старшыня.

— У чытальню нешта зусім не ходзяць. Больш на танцы ў клуб.

Корань прамаўчаў. Ён ведаў, што ў бібліятэцы заўсёды было пуста, не палюбілася яна чытачам. І калі было! Якія дзве сотні кніг з падрапанымі вокладкамі, заслінепыя дзетварой, не вельмі ахвотна чыталіся дарослай пу-

блікай. Калгасная бібліятэка, можна сказаць, толькі-толькі пачынала сваё жыццё.

— Бібліятэка нам таксама патрэбна,— у роздуме сказаў старшыня.— Чым яна будзе большая, тым мы будзем багацейшыя, ці не праўда?

Жураўскай па душы былі гэтыя словы старшыні, і яна падтакнула:

— Праўда, дзядзька Рыгор!

Бібліятэчнае памяшканне было даволі прасторнае. За бар'ерам стаяла некалькі паліц з кнігамі. Убаку, між грубкай і вялікім фікусам — невялічкія столікі, крэслы. Злева, на стэндзе, была вітрына з фотаздымкамі перадавікоў калгаснікаў.

— Цікава, а пры школе вялікая бібліятэка? — распакоўваючы новыя кнігі, спытала Лена.

— Здаецца, нішто сабе,— адказаў старшыня, праглядаючы навінкі.— Ды ты не зайздросці. Набудзем! Усё набудзем, калі гэта на карысць пойдзе...

— Ды ўжо ж... Буду старацца, каб толькі на карысць ішло,— зразумела старшыню дзяўчына.

На развітанне Корань сказаў:

— А памочніцу табе прышлю...

Усю дарогу Корань думаў, што нарэшце пры клубе працуе чалавек, які здолее наладзіць работу. Трэба прыслаць сёння ёй у дапамогу дзяўчыну. Хоць і карцела спачатку адмовіць: дзень суботні, падлогу ў клубе можна было б і не мыць! Усё роўна пасля першай полькі яна стане, як зямля. Але ж няхай памыюць, калі Лена так паважыла.

Ішоў Корань, разважаў.

Бібліятэкарка нагадала яму даўняе, забытае. Яна вельмі падобна да маці. Як гэта даўно было!

Корань прыслухаўся: ад клуба далятала песня. Яе спявала Лена. Нават голас дзяўчыны, лагодны, задушэўны, навяваў успаміны аб далёкіх днях маладосці...

* * *

Пад вечар прыйшла Волька. Стала сярод веранды, закапыліла малы кірпаты нос:

— Я дык усё сама рабіла...

— І раз на тыдні клуб адчыняла,— адказала Лена. Так яны прывіталіся.

«Чаму старшыня прыслаў Вольку?» — незадаволена падумала Лена. Яна прынесла вядро, дзве анучы, кіўнула:

— Пайшлі на возера...

— Сёння можна было б і не мыць...— памякчэла Волька.

— Можна... Але заўсёды трэба так сустракаць гасцей, каб часцей хадзілі.

— Добрай прыкідваешся... Ведаем мы цябе! — Волька ўзялася за вядро.— Стараешся, каб хвалілі, каб пры клубе і трымалі. Кароў, нябось, не ахвота даіць...

Круглатварая, поўненькая, з малой, нібы ў дзяўчынкі, галавою, з дужымі загарэлымі нагамі, Волька мела сваю непаўторную прыгажосць. І малы, па-дзіцячаму прыпухлы, ярка акрэслены рот, і дзве малыя коскі з заплеценымі чырвонымі стужкамі, і простая квяцістая сукенка — усё ў Вольцы было прывабнае.

«Цікава, якая чорная кошка прабегла між намі»,— думала Лена і ніяк не магла дадумацца. Цягаючы з возера ваду, яны ішлі разам і маўчалі. Моўчкі мылі ў клубе падлогу, выціралі вокны.

«Калі мы сталі дарослымі? — згадвала Лена. — Ці даўно тое было, што разам бегалі ў школу, гулялі ў хованкі? А вечарамі, сабраўшыся ў адной з сябровак, абгаворвалі хлопцаў і ўпотай адна ад адной хавалі першыя запаветныя пачуцці да тых жа абгавораных і абсмяяных?»

З узростам мяняліся погляды, ідэалы. І не заўважылі, як апярэдзілі сваіх хлопцаў-аднагодкаў у росце. Ім амаль у адзін час спадабаўся малады выкладчык фізкультуры, і таму яго ўрок быў для дзесяцікласніц самы жаданы. Якое ж было балючае расчараванне, калі аднойчы да маладога выкладчыка прыехала жонка.

— Памятаеш, Волька, як мы з табою кожную раніцу сварыліся, а вечарам зноў беглі адна да адной,— загаварыла Лена.— Давай і цяпер жыць мірна.

Волька выкруціла над вядром анучу і абыякава паглядзела на сяброўку.

— Некалі мне цяпер ні сварыцца, ні мірыцца,— адказала непрыязна, суха.— Працы хапае і дома, і ў калгасе...

— Але ж мы заўсёды сябравалі...

Волька паціснула круглымі плячамі:

— Даўно гэта было. І мы тады былі не такія, усё шчыра гаварылі, адносіліся адна да адной... Не так, як цяпер.

— А хто цяпер не шчыры?

— Ды ўсе! Вой, вой, і чаго гэта ты прычапілася: сябравалі, сябравалі. Знаю я, якое табе цяпер сяброўства трэба.

— Дык скажы!

— І скажу! Каб пражыць лягчэй ды жаніха ў каго адбіць! — загарэлася Волька.— Няпраўда, можа?

— Адкуль ты гэта ўзяла? — збянтэжылася Лена.— І як у цябе язык варочаецца казаць такое? Хіба тут лёгка пражыць? Колькі працы! — яна акінула позіркам вялізную залу, зняможана абаперлася на падаконнік.— Я, калі хочаш ведаць, не толькі сілы, а і грошы свае...— не дагаварыла, ускінула галаву: — А жаніх у мяне свой ёсць! Не сніць табе такога! Навошта ж мне чужы?..

Волька насцярожылася, падышла да Лены, шэптам спытала:

— Праўда? Гэта праўда?.. Чаму ж ты раней мне не сказала!

Лена адчыніла акно і зірнула на возера. Яно было спакойнае і, здавалася, нібы адлітае са шкла. «Каго яна мае на ўвазе — Алеся ці Пятра, гэтага смуглявага настаўніка?» — думала Лена.

— Пойдзем купацца,— у голасе Волькі адчувалася прымірэнне. Лена згадзілася. Яна зразумела, што прычынай Вольчынай непрыязні быў зазерскі новы настаўнік, той Пётр Жывіца, які часта прыходзіць на возера лавіць рыбу...

Дзяўчаты выйшлі да возера. У канцы сяла, за пагоркам, віднеўся комін крайняй хаціны. Над ёю, пад цяжарам сваіх незлічоных год, схілялася старая бяроза, амаль да зямлі звесіўшы доўгія косы-галіны.

Моцна-моцна затухкала сэрца ў Лены, калі яна зірнула на тую бярозу. Ды і як было дзяўчыне не хвалявацца, калі цэлыя дні тая бяроза была для яе добрай нянькай! Бывала, маці звязвала ўнізе тонкія зялёныя галінкі, і атрымлівалася добрая гушкалка. Лена залазіла ў зялёны вянок і, напяваючы свае любімыя песні, гадзінамі ціха гушкалася ў ім, удыхаючы свежую вільгаць возера.

Задумалася дзяўчына, забылася па сяброўку.

— Што ты глядзіш туды? — спытала Волька, беручы Лену за руку.— Шкадуеш сваю хату?

— Не, не шкадую... Успомніла, як гушкалася на бярозе. Маму прыгадала...

Лена цяжка ўздыхнула і хутка пайшла наперадзе.

Волька ўжо шкадавала, што пачала такую гаворку.

Яна прапіклася жалем да сяброўкі, да яе цяжкага лёсу сіраціны...

Моўчкі распрануліся, зайшлі па калені ў ваду. Волька з зайздрасцю і захапленнем глядзела на высокія грудзі, на прыгожую белізну рук і ног, на тонкі стан Лены, і яшчэ не зусім згаслая рэўнасць зноў ажыла ў яе сэрцы: а што будзе, калі Пятро, прыйшоўшы аднойчы да возера лавіць рыбу, убачыць Лену вось такую, у адным купальніку? І чаго гэта яна пасялілася тут? І чаму, як яна стала жыць каля возера, Жывіца дужа часта пачаў прыходзіць сюды з вудамі?..

Што толькі можа не прыйсці ў Вольчыну галаву! Аб сваёй рэўнасці, як і аб каханні да Пятра, дзяўчына нікому не гаварыла, гэта была таямніца яе душы. Так, ва ўсякім выпадку, здавалася асепленай каханнем Вольцы. Яна, амаль штодня сустракаючы Пятра каля школы, не была ўпэўнена, што хлопец здагадваецца аб прычыне гэтых штодзённых сустрэч, хоць усё сяло ўжо з паўгода гаварыла ёй услед — настаўнічыха! Яна ж жыла аднымі надзеямі...

Воддаль прайшоў паўз бераг рудавалосы высокі хлопец, і дзяўчаты прыселі ў вадзе.

— Хто гэта? Нешта я не пазнала...— жмурачыся ад сонца, спытала Лена.

— Цалавальнік... Васіль,— адказала Волька.

Лена спахмурнела. Яна не любіла сустракацца з Васілём дзе б там ні было, тым больш — на возеры. Як ні старалася пераканаць сябе, што сын за бацьку не адказвае, усё роўна з непрыязнасцю думалася пра Васіля — сын здрадніка. Успамінаўся свой бацька. Лена вельмі добра памятае яго, чарнабровага, яснавокага, заўсёды вясёлага.

Моцна, да болю, сціснулася сэрца ў Лены. І ёй трэба жыць тут, сярод гэтых цяжкіх успамінаў, зусім адной. У яе няма сваякоў, няма сапраўдных сяброў, яна нікога не кахае. Ці ж не кахае? А той чубаты артыст, кіраўнік мастацкай самадзейнасці курсантаў? Хто ён ёй, сінявокі весялун з залатым зубам наперадзе? Забраў бы хоць да сябе, у горад. Не раз жа абяцаў пры спатканні...

«Трэба сёння напісаць пісьмо, нешта ён доўга маўчыць»,— падумала Лена, акунаючыся ў ваду.

Купаліся пядоўга, бо змарыліся, пакуль вымылі клуб. Апрапуліся і пайшлі ў сяло.

Але не прайшлі яны і паўдарогі, як напаткалі Віктара Бадзягу і Алеся. Яны, відаць, ішлі на возера купацца.

— Гэтым злыдням заўсёды з дарогі саступі,— нахмурылася Волька і яшчэ бліжэй пайшла каля Лены, нібы хаваючыся за яе. І хавалася нездарма. Ледзь толькі яны параўняліся, як Віктар зрабіў крок наперад і загарадзіў дарогу.

— Ой, Волечка ты мая, ластаўка вясенняя! — зацягнуў ён сіпатым голасам і, схапіўшы дзяўчыну за руку, пачаў абдымаць яе. Волька крутнулася раз, другі, але яшчэ больш завязла ў моцных абдымках.

Лена разгубілася. Яна з нянавісцю глядзела на п'яную ўхмылку Бадзягі.

— Пусці-і ты, п'янчужка! — закрычала Волька, усё яшчэ імкнучыся вырвацца, а Віктар толькі жмурыўся і скаліў зубы.

— Га-га-га, не толькі настаўнікам абдымаць цябе, мая лас...

Ступіўшы крок наперад, Лена раптам штосілы ляснула Віктара па шчацэ. Той змоўк і выпусціў Вольку.

— Што? Што ты мне сказала, гнілая інтэлігенцыя? — націраючы рукою чырвоную шчаку, Віктар наблізіўся да Лены, грозна зірнуў на яе зверху ўніз. Але яна не адступіла. Смела глядзела ў адказ, ледзь прыжмурыўшы халодныя, як ільдзінкі, вочы.

— Я сказала тое, што ты пачуў,— задыхаючыся, вымавіла дзяўчына.

— Вось як! Алесь, чуеш? Дзе ты, мядзведзь, прапаў? — моцна вылаяўся Віктар і адвярнуўся.

Волька скарыстала момант і, схапіўшы Лену за руку, пацягнула яе на дарогу, абмінаючы Алеся. Той памкнуўся быў за імі, але спыніўся і махнуў рукою:

— Ану іх...

Віктар паўздагон пракрычаў:

— Ты, інтэлігенцыя... Не хадзіць мне па зямлі, калі ты не адплаціш мне за гэта! Недатыкнентая!..

— Ха-ха-ха, недатыкнентая! Святая Інеса Хосэ ды Рыбера!..

«Божа мой! — з жахам думала Лена.— І гэты мядзведзь да мяне сватаўся... Чытае, бач, нямала, Хосэ ды Рыбера ведае, а культуры ні на грош...»

— Ты добра зрабіла, што ад варот дала паварот гэтаму таўсцяку... Кавалер знайшоўся! Цьфу!..

Нейкі час дзяўчаты ішлі моўчкі. Пасля такой сустрэчы ім зусім не хацелася гаварыць.

— Ты не думай, Волька, што Алесь заўсёды гэтакі,—

нарэшце парушыла маўчанне Лена.— Усё праз Віктара ліха гарыць. Ён і ў школе, бывала, зводзіў яго. Чула, як бедная Каця пакутуе?

— Дык чаго ж усе маўчаць?

— Каця маўчыць, не хоча смецця з хаты выносіць — вось і ўся прычына.

— А суседзі? — неяк са злосцю спытала Волька, хоць сама добра ведала тых суседзяў, якія не раз баранілі і мірылі Віктара з Кацяй.— Куды яны ўсе глядзяць?

— Куды глядзяць... Як прыціснуць Віктара, дык ён авечкай прыкідваецца і абяцае выправіцца. Ну і верацъ чалавеку...

— Верацъ... Каму, скажы, баліць чужая болька? Каго гэта хвалюе?

— Я, Волечка, і сама не раз так думала, з людзьмі гаварыла: ён жа ў магазіне працуе, пратаргуецца, прап'е ўсё. Як грошы такому давяраць? Нічога, кажуць, хлопец свой, раней ён такім не быў, выправіцца.

— А ліха яго ведае,— ужо спакайней сказала Волька.— Можа, і перап'е нарэшце сваё. Тавару дастаць усякага ён спец. І ніколі не пратаргаваўся яшчэ. Нядарам кажуць, што кінь Віктара ў возера з каменем на шыі, дык ён выплыве з рыбінай у зубах...

«Чужая бяда... Гэта праўда. Яна нікога не турбуе. А гэта ж эгаізм, злачынства»,— з горыччу думала Лена.

Яна прыкінула — хто можа ў Зазер'і ўздзейнічаць на такіх, як Віктар? Настаўнікі заняты сваімі справамі, старшыня вельмі добры, ён любому даруе любыя грахі. Застаецца адно — моладзь. Трэба давесці моладзі, што такія, як Віктар, не павінны блытацца пад нагамі, што грамадству ад іх вялікая шкода.

Лена ўспомніла сваю першую спробу выдаць сатырычную насценгазету «Калючка». Правісела тая газета ў клубе роўна гадзіну, пакуль прыйшлі тыя, хто трапіў у яе першы і апошні нумар. Прыгадала Кацю, Віктараву жонку, якая сама прыбегла сварыцца за тое, што пакрытыкавалі яе мужа. Няўжо Каця, калісьці баявая дзяўчына, цяпер баіцца яго? Ці так моцна кахае? Сама ж гаварыла ўсім, што з Віктара не будзе чалавека...

Віктара Лена не любіла заўсёды. Ледзь давучыўшыся да восьмага класа, ён кінуў школу і не пайшоў працаваць. Адзіным заняткам яго былі вечарынкі. Ён іх збіраў штодня, арганізоўваў настойліва, заўзята. А пасля ўсю энергію аддаваў полькам ды вальсам, да знямогі даводзячы

дзяўчат. Адна Каця не паддавалася першаму заэерскаму танцору. Лёгкая як пярынка, яна, здавалася, не датыкалася нагамі да падлогі, лётала, быццам матылёк вакол полымя. «Ці не згарэла яна, нібы матылёк, кінуўшыся ў полымя тых танцаў?» — міжволі падумалася Лене...

Пакуль дайшлі да сяла, дзяўчаты зноў памірыліся. Лена расказала Вольцы пра Анатоля, пра сваё з ім каханне. Волька зусім павесялела.

— Пажыві пару дзён у мяне! — запрасіла яна Лену.— Ведаеш жа — хата на тры пакоі, а жывем утраіх...

Лена згадзілася. І пражыла больш як два дні...

* * *

Кожную раніцу дзяўчаты разам выходзілі з дому, развітваліся на вуліцы. Лена бегла да сваёй блібліятэкі, а Волька — на луг.

Прымірэнне з Волькай і асабліва добрыя адносіны старшыні акрылілі Лену. Яна вырашыла, карыстаючыся момантам, напомніць старшыні аб яго ранейшых абяцаннях «адпусціць сродкі на культуру». У першую чаргу яна вырашыла арганізаваць свой хор. А для хору патрэбен баян.

Да пачатку работ старшыню можна было штодня знайсці каля кузні. На тым вялізным двары, паміж кузняй, гаражом і канторай, заўсёды а шостай гадзіне збіраліся брыгадзіры, механізатары. Там яны атрымлівалі заданні на дзень і адтуль ішлі на работу.

Хоць Лена ведала, што старшыня не адмовіць, як не адмаўляў дагэтуль, але сэрца трывожна забілася, калі падыходзіла да кузні. На тое яно і сэрца. Няхай тахкае. Не хавацца ж дзяўчыне толькі ў бібліятэцы, калі ёй даручан яшчэ і клуб, які пабудаваны не толькі дзеля вечарынак. Больш за ўсё непакоіла думка: а што, калі Толя, для якога яна хоча купіць баян, не прыедзе?..

Ідучы на калгасны двор, Лена надзела новую сукенку, на галаву ўскінула блакітную, з вялікімі жоўтымі ружамі касынку, завязаўшы ражкі каля шыі. Касынка прыгожа акрэслівала крыху бледны, але такі прывабны твар, што мужчыны, калі Лена падышла да іх, спынілі сваю гаворку і, нібы ўпершыню бачылі дзяўчыну, з цікавасцю праводзілі яе позіркамі. «Марыля! Уся ў маці...» — ціхім шэптамданеслася да Лены. Яна спынілася каля жанчын, спытала:

— Скажыце, калі ласка, ці яшчэ старшыні не было?

— Не. Сёння ў яго раённае начальства. Дык у канторы,— адказала старшыніха.

Побач з ёю спрачаліся дзве кабеціны: рэзаць цяля для агульнага катла на сенакос ці не.

— На луг дык на ўвесь дзень ідзі, а цяляці ім шкада! — даказвала адна.

— Цяля вырасце — карова будзе! — пярэчыла другая. І за ёю была большасць калгасніц.

«Як добра,— думала Лена, паволі ідучы да канторы,— што людзі гавораць пра калектыўнае, як пра сваё, клапоцяцца...»

— А-а, Кацярына, як цябе лоўка абсеклі! — сказаў якісьці дзед, Лена нават не памятала яго.— Папрывыкалі цялят есці, а не сена грэбці!..

— Я ж за вас б'юся, злыдні! — агрызнулася жанчына.

Лена адчыніла дзверы і спынілася на парозе.

— Божа, як тут накурана! — замахала яна перад сабою рукамі, разганяючы сіні дым, што воблакам вылятаў на волю.— Дзень пасядзець і — сухоты нажывеш. Добрай раніцы вам...

— Ах, гэта ты? Добрай раніцы! — старшыня чамусьці адразу падняўся з-за стала. Высокі, ледзь не да самай столі, ён працягнуў дзяўчыне сваю шырокую далонь і вінавата дадаў: — Прабачце нам за такія грахі, ды без папярос мы не кіраўнікі. Ну, што ў вас там, як работа?

— Ды ў нас усё ў парадку. Толькі адна я, дзядзька Рыгор!

— Ведаю... Казала ж, што хутка памочнік прыедзе. Дзе ён?

— Будзе...

— Што ж, пачакаем... Сядай тут. Васіль, падай крэсла!

Лена глянула на бухгалтарскі стол і сумелася: там сядзеў Васіль Цалавальнік. «Вось дзе ён працуе ўжо! Пранырлівы, як і бацька...» — падумала і зноў загаварыла да старшыні:

— Дзядзька Рыгор. Кніжак у нас пакуль што хапае, а вось іншая работа... Карацей кажучы, я зайшла па грошы. Вы, памятаеце, абяцалі купіць баян...— напомніла яна.

Васіль моўчкі паднёс крэсла, паставіў ля стала і гэтак жа нячутна пайшоў на сваё месца, яшчэ ніжэй схіліўся над паперамі.

Старшыня райвыканкома, два заатэхнікі і аграном, што прыехалі з раёна, праглядалі з сакратаром калгаснай

партарганізацыі Віктарам Зыблюком, братам шафёра, племянную кнігу.

— Што ж, таварыш Корань! — весела зазначыў старшыня райвыканкома.— Ваш калгас можа быць вопытнапаказальнай гаспадаркай. Каровы — чыстапародныя кастрамічкі. Ураджай лепшы ў раёне...

— Мы таксама згодны,— пацвердзіў адзін з заатэхнікаў.

Лена села на край крэсла і настойліва пачала чакаць адказу на сваё пытанне. «Няўжо не дасць? Пры чужых людзях адмовіць?»

І дачакалася. Корань адпусціў спачатку гасцей з раёна, а потым звярнуўся да Цалавальніка.

— Можа, мы ёй што-небудзь выкраім?

Васіль, не падымаючы галавы, адказаў:

— Там на двара мяса просяць, а тут грошай. Калі ўсім толькі даваць, то...

— Васіль, змоўкні! — груба перабіў яго старшыня.— Зрабі Гэльцы дзве сотні рублёў, і ніякай гамонкі! Ды не забудзь выпісаць квіток на ферму.— Ён павярнуўся да Лены і спытаў: — Табе два літры малака ў дзень хопіць? Гэта ў лік авансу...

Лена ўсміхнулася:

— Хопіць... Але галоўнае не малако. Баян! Ці ж без яго што зробіш?

— Дык вам грошы на баян? — ажывіўся Цалавальнік, ускінуў рудаваты чуб, бліснуў залатым зубам — усміхнуўся.

— Няўжо ж на капронавыя панчохі! — абыякава адказала Лена, а сама падумала: «Які прыгожы хлопец... І зуб залаты наперадзе, як у Анатоля».

— Дык адразу б так і сказалі! Я ў момант. Вы толькі, калі ласка, не злуйцеся на мяне... Пачакайце.

Лена ўсміхнулася: яна ведала, што Васіль трохі рыпаў на баяне. Але каб ён ды іграў у клубе — гэтага яна, пакуль жыве тут, не дапусціць. Хоць не ён вінаваты ў смерці яе бацькі, але ж дужа падобен да сапраўднага віноўніка: такія ж светлыя вочы, такія ж рудаватыя валасы, барада з ямінкай пасярэдзіне, бледны твар. Сын здрадніка. Сэрца не мірылася з гэтым.

З канторы Лена выйшла, трымаючы ў руках грошы. Сэрца яе поўнілася радасцю: з ёю лічацца, яе слухаюць і паважаюць!

«Дзвесце рублёў! Гэткую суму я яшчэ ні разу не тры-

мала ў руках. Цяпер я сама куплю для клуба звонкі баян!» — думала яна.

Вольку яна сустрэла ля хаты.

— Ты глянь, што мне старшыня даў! — пахвалілася.— Я сёння ж паеду купляць баян.

— Вой, дзіва! — усклікнула Волька.— Ён жа ў нас такі скупы, што рубля на што якое не выпрасіш. Кажа, як станем мільянерамі на новыя грошы, тады прасіце. Ціка-ава...

Яны зайшлі ў хату і абедзве сумеліся: каля акна з кнігаю ў руках сядзеў чарнявы хлопец. Яго жвавыя карыя вочы і прыгожы, з ледзь прыкметнай гарбінкай нос надавалі твару строгі выраз.

Заўважыўшы дзяўчат, хлопец устаў. Лену, самую прыгожую ў сяле дзяўчыну, ён бачыў не ўпершыню. Яны сустракаліся ў бібліятэцы, ля возера. Усміхнуўся і, звяртаючыся да Волькі, сказаў:

— Прабач, гаспадынька, што зайшоў без дазволу... Але ў хаце нікога не было...

— А я не адна. У абедзвюх прасі прабачэння! — усклікнула Волька. Лена заўважыла, як круглы твар яе заружавеўся, вочы заззялі шчасцем. Цяпер яны былі нейкія светлыя, хоць звычайна здаваліся цёмнымі.— Пазнаеш, хто гэта? Знаёмся...

Хлопец уважліва зірнуў на Лену і, працягнуўшы моцную руку, сказаў:

— Пятро... Жывіца.

— Лена,— адказала дзяўчына і шырока ўсміхнулася — Нарэшце пазнаёміліся па ўсіх правілах!

Яна нібыта заваражыла хлопца сваёй усмешкаю, сваімі вялікімі яснымі вачамі, якія, нібыта азёрцы, паблісквалі блакітным холадам між цёмных доўгіх вейкаў і валілі.

Пятро міжволі затрымаў яе руку даўжэй, чым таго вымагала звычайнае знаёмства, і Лена ад такога шчырага поціску зачырванелася. Усім траім стала ніякавата.

Волька глянула на Пятра злосна, хоць усмешка не сыходзіла з яе твару.

— Вельмі добра, што вы сюды прыйшлі! — загаварыла Лена.— Нам з вамі ёсць аб чым пагаварыць. Давайце сядзем...

Пакуль Волька, наўмысля пакінуўшы іх адных, прыбіралася ў суседнім пакоі, Лена расказала Пятру аб сваіх планах. А іх было нямала.

— Памажыце вы, настаўнікі, мне. Наш калгасны клуб павінен стаць культурным цэнтрам, а не месцам вечарынак і аўдыторыяй для праслухвання лекцый, а раз у тыдзень — кіназалай... Трэба арганізаваць гурткі, зацікавіць моладзь, выявіць таленты і размахнуцца так, каб наш голас загучаў не ў адным сваім сяле...

Пятро слухаў дзяўчыну вельмі ўважліва. Калі яна скончыла, сказаў:

— Ваша праўда. Я пастараюся што-небудзь прыдумаць, як дапамагчы вам. У нас ёсць некалькі вучняў з добрымі галасамі. Няхай яны выступяць перад калгаснікамі, заахвоцяць. І гімнастычная секцыя неблагая... А хор арганізуем разам з вамі...

— Гэта было б вельмі добра! Хоць для пачатку. Старшыня мяне падтрымлівае.

— Толькі наш старшыня крыху скупаваты,— задумліва прамовіў Пятро, устаючы з крэсла. Ён, як гаспадар тут, адчыніў акно і вярнуўся на месца.

— Я б так не сказала! Сёння на баян даў. Вось!

Лена паказала яму грошы. Жывіца здзіўлена падняў чорныя бровы.

— Заваражылі! Вам, Лена, нават гэты суровы чалавек і то не здолеў адмовіць,— зусім сур'ёзна сказаў ён.

— Чаму?

— Гэта няцяжка зразумець... У вас такія вочы, быццам вы ўсё дзяцінства глядзелі на возера,— пажартаваў Пятро.

— Ваша праўда, я жыла каля самага возера,— усміхнулася Лена.— А яшчэ чаму?

Жывіца не адказаў. Ён падышоў да вялікага люстэрка, што вісела на сцяне, і пальцам паклікаў Лену. Яна мігам стала побач. Яе бялявы матавы твар з ярка акрэсленымі ружовымі вуснамі і загарэлы твар Пятра ўразілі абаіх рэзкімі кантрастамі. Моўчкі пастаялі яны і моўчкі вярнуліся кожны на сваё месца.

— Хутка ты там, Волька? — гучна спытала Лена, беручы са стала кнігу, якую раней трымаў Пятро.

Волька стаяла каля дашчанай перагародкі, што раздзяляла пакоі, і, ледзь стрымліваючы хваляванне, адказала:

— Ужо іду...

Яна акуратна закрыла кавалачкам адарванай шпалеры маленькую адтуліну між дошак...

На вуліцы, калі развіталіся з Пятром, Лена спытала:

— Чаго ён прыходзіў?

— З бацькам на рыбу збіраюцца,— холадна адказала Волька.

* * *

Васіль вяртаўся дадому позна. Ён сёння налічваў калгаснікам аванс і не хацеў гэтай справы адкладваць на заўтра. Цяпер жа думкі яго мелі другі кірунак: хлопец успомніў старое, вечна балючае і крыўднае... «А твой бацька паліцай! А твой бацька паліцай!» — так дражнілі яго малыя, і гэтыя словы глыбока паранілі дзіцячае сэрца на ўсё жыццё. Васіль ужо тады разумеў, што паліцай — благі чалавек, што яго бацьку ненавідзіць усё сяло. І Васіль не сябраваў з хлапчукамі-аднагодкамі. Ён жыў і рос у адзіноце, цэлымі днямі бадзяючыся па лесе ці праседжваючы з вудамі ў самым глухім кутку возера.

Старэйшая сястра, у якой пасля таго як памерла маці, жыў Васіль, шкадавала брата і не раз, бывала, калі ён прыбягаў дадому са слязамі, гаварыла:

— Не журыся, Васілёк. Што дзеці разумеюць? Ты вырасцеш добрым, сумленным, і людзі палюбяць цябе. Вось убачыш!..

Васіль вырас. Ён стаў шчыры і сумленны, але тая дзіцячая скаванасць, нясмеласць асталіся. Працуючы бухгалтарам, Васіль, як ніхто іншы, ведаў эканоміку свайго калгаса, адчуваў штогадовы рост даходаў і спадзяваўся, што надыдзе час, калі яму не давядзецца так, як сёння, шкадаваць нейкіх дробязных выдаткаў на баян, так патрэбных многім. Скупы да таго, што гатоў быў адмовіць Лене, калі б на то яго воля, адмовіць той, хто ні разу не папракнуў бацькам-паліцаем.

Цяпер Васіль не мог дараваць сабе тых злосных слоў, што самі сарваліся з языка. Прыгнятала кплівая ўсмешка Лены, яе непрыязны позірк, грубы адказ: «Няўжо ж на капронавыя панчохі!» Ён адчуваў, што хоць дзяўчына адкрыта ніколі не папракнула яго бацькам, яна ўсё ж таіла ў душы злосць. Адно, што суцяшала хлопца, гэта надзея на будучыню. Ён увесь час жыў марамі, што надыдзе час і аб ім людзі загавораць, яго нарэшце палюбяць. Што такое асаблівае зробіць — не ведаў, але верыў, што зробіць! Да ўсяго прыглядаўся, прыслухоўваўся. Быў

уважлівы з людзьмі, дапамагаў кожнаму ў бядзе як мог.

Ад высокіх ліп, што вартаўнікамі стаялі ўздоўж вуліцы, разносіўся саладкаваты водар квецені. Васіль міжволі збавуляў пад імі крок і на поўныя грудзі ўдыхаў густы настой. Не адчувалася зморанасці, хацелася зрабіць яшчэ штосьці, зрабіць вялікае. Клікаў і вабіў да сябе далёкі Млечны Шлях, здавалася, што за спіною выраслі крылы...

Убачыў, як моладзь кіруецца да клуба, пашкадаваў: «Э-эх, баян бы ў рукі! Да рання іграў бы...»

Раптам Васіль спыніўся: за плотам у густым вішняку ён убачыў Алеся і Віктара. Яны сядзелі на лаўцы і, гаворачы адзін аднаму «будзь здароў», дзынкалі шклянкамі.

— А ты плюнь на яе, чуеш! — пачуўся хрыплы Віктараў голас.

— Не магу я, Віця, гэтага зрабіць. Кахаю. Як піць даць! Ой, пякучая, халера, чысты спірт!

— Добра! Калі не пойдзе за цябе, то я ёй такое зраблю, што пасля ўжо ні адзін браць не захоча. Ха-ха-ха!

— І зрабі! Налі яшчэ, пяруп хай яе спаліць...

Васіль зразумеў, пра каго ідзе гутарка, і стаіўся, прыслухаўся.

— Раз бачыў — позна каля возера хадзіла. Падпільнаваць бы калі і коўдру на галаву, чуеш? Ну, будзь... Спіш, Алесь?

І зноў дзынкнулі шклянкі.

Слухаць далей не хацелася, і Васіль пайшоў.

«Калі гэтыя два цмокі згаварыліся, то дабра не чакай. Прыдумаюць пакасць. Ад іх, Леначка, не так лёгка адчапіцца», — заклапочана думаў хлопец.

І замест таго каб ісці дадому, ён звярнуў у вулачку, што вяла да клуба.

* * *

У куце прасторнай залы, на высокім вузкім століку, надрывалася радыёла. Рытмічна шоргалі па падлозе ногі.

Не знайшоўшы тут Лены, Васіль пайшоў у бібліятэку. Ля стала, за якім схіліўшыся сядзела Лена, стаяў Пятро і ціха гаварыў:

— Прызнайцеся, колькі сваіх грошай аддалі на кнігі, што ў вашай бібліятэцы?

Лена ўзняла на яго ласкавыя хітрыя вочы:

— За ўвесь час я купіла сабе на дзесяць рублёў.

— Ай-я-яй! Аж на дзесяць рублёў? — прыжмурыўся Пятро.— А чаму гэта вы паставілі свае кнігі на агульную паліцу?

— У мяне пакуль што няма дзе ставіць...

— Зразумела. Уласнае — агульнае, калектыўнае...

— Хоць бы сабе і так.

Пятро паглядзеў на свае чаравікі, на сляды, якія ён пакінуў на чыстай падлозе, і паківаў галавою.

— Нічога асаблівага,— пераняла яго позірк Лена.— Пакуль што не часта слядзяць тут, launder...

Нечакана яна ўбачыла Васіля, спахмурнела. А ён стаяў ля дзвярэй і не кранаўся з месца. Пакуль Пятро разглядаў паліцы з кнігамі, Лена хуценька прайшла за перагародку, выбрала кнігу і спытала:

— Чыталі гэтую? Даведаецеся, як нарадзілася атамная бомба...

— «Ярче тысячи солнц»,— прачытаў Пятро.— Гэткія не люблю. Я вазьму што-небудзь мірнае...

— Тады вось гэтую! Тут усё, што ні пажадаеце, ёсць...

Васіль прайшоў да аднаго са столікаў, якія стаялі ў невялікім, але такім утульным пакоі, што ён здаваўся залаю. На століку былі газеты, часопісы. Прысеўшы ў крэсла, Васіль разгарнуў часопіс.

Выбраўшы нарэшце дзве кнігі, выйшаў у чытальню і Пятро.

— Вось вам і наведвальнік! — ажывіўся ён, убачыўшы Васіля.— А вунь, чуеце, яшчэ ідуць...

З вуліцы даносіліся п'яныя галасы Віктара і Алеся.

— Сапраўды... Ідуць ужо тыя танцоры,— незадаволена адказала Лена.— Пагналі б вы іх...

— Баіцеся? Віктар бяды не зробіць...

— Вы ўпэўнены? — падаў голас Васіль.

— Чаму ж... Гэта такі чалавек, што шкодзіць толькі свайму здароўю.

— А жончынаму здароўю? — спытала Лена.— Ой, глядзіце, каб не шкадавалі пасля... А Зыблюк?

— Ну, гэты — іншая гаворка, цялё цялём! Яго крыху Віктар збівае...— Пятро ўзяў кнігі пад паху.— Вы, Лена, цяпер, здаецца, у Волькі?

— Ага.

— Яна ваша равесніца. Але дзяўчына капрызная.

— Чаму вы так думаеце?

— Сёння скардзілася мне, што вы хоць і сяброўка ёй,

але робіце нешта такое не па-сяброўску. Што вы не падзялілі?..

— Не ведаю... Здаецца, нічога не дзялілі.

— Вось як! Тады, папэўна, яна нешта выдумляе. Ну, я пайшоў. Калі тыя пачнуць выраблядь не тое што трэба, Васіль навядзе тут парадак! — сказаў Пятро і выйшаў.

Лена села за кнігу, але чытаць не магла: яе прыгнятала прысутнасць Васіля, клікала музыка. Хацелася ж і ёй патанцаваць разам з усімі, павесяліцца. Але могуць знайсціся і чытачы, бібліятэку зачыняць яшчэ рана.

Неўзабаве ў калідоры пачуўся дружны тупат ног, і Лена міжволі папраўіла рукамі свае пышныя валасы. «Ідуць... Лёгкія на ўспамін!» — падумала яна. І як жа шкадавала, што не зачыніла бібліятэку! Дзверы адчыніліся, і на парозе з'явіўся, як заўсёды, непаголены Алесь, за ім зайшоў Віктар.

Сэрца яе адразу абарвалася. Сяк-так аваладаўшы сабою, прамовіла:

— Прашу, заходзьце...

Хлопцы моўчкі прайшлі да стала і, як па камандзе, адбілі нізкі паклон, хорам прывіталіся:

— Добры вечар!

Лена адчула, што яны нездарма так спеліся, але адказала на прывітанне стрымана і шчыра:

— Вам тут пачытаць ці з сабою?

— Нам з табою,— падхапіў Віктар і падміргнуў Алесю.— Дайце, калі ласка, што-небудзь гэткае касмічнае, незвычайнае!

— І каб у тым незвычайным — каханне, канешне... Пацалункі, ясныя ночы...

— І вось такія вочы! — паказаў на Лену Віктар.

— Ці нельга, таварышы, лагодней, без рук? — умяшаўся Васіль з месца.

«Добра, што хоць гэты ёсць»,— падумала Лена і ўстала.

— Вам, відаць, выспацца трэба, а не кнігі,— сказала яна, з агідай пазіраючы на Алеся.— Эх, Алесь, Алесь... Лепшых сяброў табе ў Зазер'і няма!

— Бачыў, заступнік у яе знайшоўся! Ха-ха-ха...— Віктар памкнуўся да Васіля, але Зыблюк схапіў яго за каўнер.

— Яго не руш... Прыйшоў па кнігі — бяры,— стараючыся не хістацца, Алесь адцягнуў Віктара далей ад стала.

— А я і бяру, але мне не даюць,— вызкаліў той жоў-

тыя зубы.— Вось дай мне «Жахлівыя ночы» ці «Танец шкілетаў»!

— Падбяры яшчэ такога, як сам, нанаі яго — гэта і будзе тое, што патрэбна: і жахлівыя ночы, і танец шкілетаў...— смела адказала Лена.

На хвіліну ў бібліятэцы ўсталявалася цішыня. Нават чуваць было, як цікае насценны гадзіннік. А потым раптоўны дружны смех аглушыў Лену. Алесь ударыў свайго «духоўнага настаўніка» ў плячо, ад чаго той ледзь утрымаўся на нагах.

— Што, з'еў, шкілет нумар адзін? Казёл двуногі... Га-га-га... І ты, Васіль, ідзі сюды. Устроім танец шкілетаў. Вось будзе відовішча як ніць даць! — І ён, закасаўшы рукавы клятчастай кашулі, падаўся да Васіля.

— Мяне ты не блытай з гэтым! — грозна адказаў Цалавальнік.— Мы з Ленай будзем гледачамі...

Лена заўважыла, што Алесь сумеўся ад такога напярэджання, хоць і быў п'яны. Ён адразу перакінуўся на Віктара. Злавіў яго і загадаў:

— Танцуй адзін!..

— Ой! — закрычаў Віктар.— Пусці жывога...

— Паўлітэрку паставіш — пушчу.

— Дык жа грошай няма...

— Тады будзеш танцаваць!

Лена падзадорыла Алеся:

— Правільна! Раз няма грошай — хай танцуе...

Алесь выпусціў Віктара і здзіўлена зірнуў на дзяўчыну. Каштанавыя валасы яго прыліплі да лба касмылямі. Няёмка ўсміхнуўшыся, наіўна, як дзіця, Зыблюк глядзеў на Лену і не ведаў, што адказаць.

«Цялё цялём»,— успомніўшы словы Пятра, падумала Лена і таксама ўсміхнулася. Алесь наскроб патыліцу і, махнуўшы рукою, хуценька выпхнуў Віктара за дзверы...

«Яму стала сорамна!» — задаволена падумала Лена. Але, застаўшыся з Васілём, яна засумавала, зайшла за паліцу, ледзь стрымаўшы наплыў пякучых слёз. Ёй стала вельмі балюча: з яе здзекуюцца. І не было з кім падзяліцца сваім горам. Яна адна, зусім адна. Волька зноў стала яе пазбягаць. Брала некалькі спыткаў, кнігі і ішла да Пятра. Вярталася позна, калі Лена ўжо спала.

«Праўда Пётр казаў — капрызная»,— падумалася ёй.

Васіль устаў і паклікаў Лену. Яна падыішла да стала. Ён прынёс сваё крэсла і, стоячы, загаварыў хутка, нясмела:

— Вы прабачце... Я не з такіх, як тыя. Ужо хутка

дванццаць год, як мы, жывучы ў адным сяле, не перакінуліся і словам.

— На гэта ёсць важкія прычыны,— перабіла яго Лена і смела зірнула хлопцу ў твар. Яна ўбачыла ясны адкрыты позірк і сумелася.

— Ведаю! — адказаў Васіль.— Асабіста вам я нічога благога не зрабіў і не збіраюся.

— Яшчэ гэтага не хапала! А я не збіраюся слухаць вашу споведзь! — ледзь вымавіла ад гневу Лена. Ён спалохана адхіснуўся, апусціў галаву, ад чаго рудаватыя, як салома, валасы закрылі твар.

— Вы... не можаце даравацъ мне з-за бацькі...

— Не магу. Праз яго... тата загінуў.

Узмахам галавы Васіль адкінуў доўгія валасы назад.

— Толькі я тут ні пры чым. Ён жа за гэта паплаціўся жыццём.

«У яго такі ж, як і ў бацькі, крыху кірпаты нос»,— падумала дзяўчына і прамовіла:

— Жыццём паплаціўся не толькі ён...

Васіль апусціўся ў крэсла і сціснуў кулакамі скроні.

— Сын паліцая! — сказаў ён з горыччу.— Але ж я не паліцай! Я сам ненавіджу таго, каго вы называеце маім бацькам!

«Гэта праўда... І я яе ведаю. Дык чаго ж мне яшчэ трэба ад хворай душы? Якога прызнання? Трэба даравацъ...»

Яна больш лагодна зірнула на Васіля, на яго сінюю кашулю і ціха сказала:

— Даруй мне, Васіль... Думаю, што з цягам часу крыўда пройдзе...— Потым уздыхнула, дадала больш сур'ёзна: — Увогуле — якое гэта мае значэнне? Мы абое сіроты...

— Не! — устаўшы з крэсла, Васіль ускінуў валасы назад, строга зірнуў на дзяўчыну.— Вы — не сірата! У вас цэлае сяло бацькоў і матак. А я — зусім адзін, бо я — сын паліцая! Ад мяне ўсе адвярнуліся. І вы...

Васіль недагаварыў і выбег на вуліцу.

Лене стала шкада яго. «Навошта прыйшоў, расхваляваў... І без таго на душы цяжка»,— падумала яна.

Потым устала з-за стала і, выключыўшы святло, выйшла ў клуб.

Хоць і ёсць там дзяжурныя, але ўсякае можа здарыцца, калі прыходзяць такія, як Віктар ды Алесь.

Адчыніла дзверы і на парозе сустрэла Вольку.

— Ты не ў чытальню? — спытала.

Волька зірпула непрыязна і, не адказаўшы, выскачыла.

«Што з ёю робіцца? — не здагадвалася Лена.— Зноў нейкая муха ўкусіла. Не пайду больш да яе».

Лену заўважылі адразу, пацягнулі ў круг танцаваць. Ёй тут рады быў кожны.

* * *

Аднойчы Лене давялося пазнаёміцца з Пятром бліжэй. І каб яна ведала загадзя, што з гэтага знаёмства атрымаецца, то лепш не пайшла б тады на возера, лепш бы замкнулася ў сваім пакойчыку.

Дзень быў сухі, гарачы. Усё жывое хавалася ў цень. Сядзець за сталом было пакутліва. Лена ўстала, падышла да акна і адчыніла яго. Вецер і над возерам дыхаў гарачынёю, нібы з вялізнай печы.

Вабіла да сябе вада. Белыя пеністыя хвалі адна за адною набягалі на жоўты жвір, аб чымсьці лагодна пашэптваючы соннаму берагу. А за возерам, далёка на небасхіле, вісела чорная хмара. Час ад часу яе прарэзвала маланка, і праз момант далятаў глухі, працяглы гром.

«Будзе навальніца!» — падумала Лена. Села на падаконнік і залюбавалася трывожным небам. Паволі наблiжаючыся, хмара бясконца мяняла сваю форму і адценне.

А возера перад навальніцай! Яно, нібы змарыўшыся за дзень, паступова цішэла. І нарэшце ўляглося зусім, насцярожылася...

Звечарэла. Хмара запоўніла сабою ўсю прастору ад зямлі да неба. І не відаць ужо супрацьлеглага берага, і не чуваць за раскатамі грому роспачных крыкаў кнігавак. Раптам сцішылася прырода, замерла. Нават вяз не варухнецца на беразе, нават паветра застыла. Анямела і чорная хмара.

Але не! Вось праз усё неба паласнула бліскавіца, і здалёк, нібы конніца, імкліва імчыць-шуміць жывая шэрая сцяна дажджу. Наперадзе — вецер! Скалануў возера драбнюткімі хвалямі, сыпануў у сцяну пяском ды буйнымі кроплямі. І вось ужо сапраўдны лівень забарабаніў па даху, па зямлі — усюды.

Калі Лена зачыняла акно, ёй здалося, што сярод шуму дажджу і грымоты пачуўся чыйсьці крык. Яна прыслухалася: так і ёсць! Прыгледзелася і ўбачыла, як у тумане дажджу далёка ад берага плыў човен. Ён гойдаўся на

хвалях і, здавалася, вось-вось схаваецца пад імі паза ўсёды.

«Вывернецца, утопіцца!» — падумала Лена. Хуценька забегла ў свой пакоічык, зняла з цвіка дзвярэй белы капронавы плашч і пабегла на возера.

Дождж бязлітасна сцёбаў па твары, моцны вецер збіваў з ног, а над галавою несціхана грымела. Лена стаяла на беразе і не ведала, як памагчы чалавеку.

А човен плыў сабе і плыў да берага, падхоплены ветрам, узняты хвалямі.

— Го-го-ого-го-о! — данёсся знаёмы голас Пятра.

Неўзабаве Лена ўбачыла і яго самога. Хлопец усміхаўся і з усёй сілы налягаў на вясло. Калі нарэшце човен уткнуўся носам у пясок, Пятро спытаў:

— Чаго вы мокнеце?

— Вы лепш скажыце, чаго крычалі,— адказала яна.

— Рыба сплыла... Увесь улоў. Вось я і крыкнуў ад роспачы!

Мокры з галавы да ног, ён хуценька сабраў вуды, прывязаў да вярбы човен і пад праліўным дажджом пайшоў за Ленай.

— Чаму вы ездзіце на рыбу ў такім маленькім чоўне? — ужо ў сенцах спытала яна. Тут было зацішна ад ветру і дажджу.

— Ён лёгкі,— адказаў Пятро.

— Але лёгка і перакульваецца на хвалях...

— Ці ж гэта відаць?

— Скідайце ўсё мокрае тут. Я прынясу крэсла...

— Калі ласка...

Яна прынесла крэсла, і Пятро пачаў скідаць гумовыя боты. Лена зноў вярнулася ў пакой.

«Што б яму даць такое, каб трохі прасушыў сваю адзежу? — думала яна, не заўважаючы, што сама вымакла да ніткі.— Хіба летняе паліто».

І яна прынесла паліто. Сама надзела другую сукенку, крыху прыбрала ў пакоі і паклікала Пятра.

Ён увайшоў не адразу. Яшчэ выкруціў кашулю, павесіў на вяроўку ў сенцах.

— Як добра, што вы тут жывяце! Загінуў бы зусім,— сказаў Пятро, заходзячы ў пакой. Паліто нязграбна вісела на ім.

— Летам яшчэ не бяда, а вось калі б такое восенню...

— Бывае і восенню. Нездарма ж кажуць, што ахвота горш няволі. І перамерзнеш, і перамокнеш, а прыемна!

— Трэба будзе паспытаць гэтага рыбацкага шчасця,— смеючыся, адказала Лена. Яна падсунула Пятру крэсла, а сама ўзяла электрычны чайнік, наліла ў сенцах з вядра вады і паставіла на стол. Пятро моўчкі назіраў за ёю. Калі ж яна зноў падышла нарэшце, сказаў:

— Якая вы здагадлівая. Цяпер за шклянку чаю я заплаціў бы, як за добрае віно.

— Я не шынкарка і грошай не вазьму.

Відаць было, што жарт ёй не спадабаўся.

— Тады я вып'ю дзве шклянкі,— адказаў Пятро, зачэсваючы мокрыя валасы. Захінуў ямчэй паліто і задумаўся.

— Вам холадна? — спытала Лена.

— Не тое што холадна. Неяк няёмка ў вашым паліто.

— Няўжо?

Лена глянула на Пятра і ўсміхнулася: яе адзежыны яму хапала толькі да каленяў.

— Ой, наш чай зусім выкіпіць! — ускліквула яна і выключыла чайнік.

«Наш чай! Наш...» — чамусьці з прыемнасцю падумаў Пятро. Яшчэ ён падумаў пра другую, што сустракае штодня, што раптам захацела вучыцца і задае сотні пытанняў, абы толькі быць разам. Ён чытаў у Вольчыных вачах пакорлівасць, нявыказанае каханне. Дзвалі... прыходзіць да яго штодня і лавіў сябе на думцы, што, калі б аднойчы Волька не прыйшла, ён сумаваў бы без яе.

«Тая — прывычка, а гэтая... Ці ж толькі мне яна падабаецца? Лена такая цудоўная, што з ёю прыемна быць кожнаму, прыемна гутарыць, вось так сядзець за сталом...» — думаў Пятро. І хоць ад Волькі ведаў, што ў Лены ёсць «свой» у горадзе, гэта ніколькі не засмуціла яго.

Лена дастала з шафы дзве шклянкі, цукар і пачак пячэння. Потым выйшла на ганак, памыла твар. А заадно забегла ў чытальню, дастала з шуфляды стала сваё маленькае люстэрка і толькі раз зірнула на сябе. І дзіва! Побач са сваім бледным тварам яна яскрава ўявіла смуглявы твар Пятра. Як тады, у Волькі, ён і цяпер нібыта быў побач. Схавала люстэрка, азірнулася, быццам яе злавілі на месцы злачынства. Але ў чытальні нікога не было. Прычасала валасы, падфарбавала вусны і схамянулася: «Ой, навошта я прыбіраюся перад ім?»

Вярнуўшыся ў пакой, Лена заўважыла, што Пятро нібыта чымсьці ўзрушаны.

— Лена,— сказаў ён, наліваючы ў шклянкі чай.— Якая вы прыгожая, Лена! Каб вы толькі ведалі...

Яна спалохалася гэтых слоў, адступіла крок назад.

— Калі ласка, не гаварыце так.

— Чаму?

Лена сарамліва ўсміхнулася:

— Дзяўчыне вельмі шкодна ведаць аб тым, што яна прыгожая ці непрыгожая. Ой, вы накідалі поўную шклянку цукру!

— Вось бачыце, нават не заўважыў. Што ж, давайце будзем піць, а то сухі язык намеле столькі мукі, што пасля не абярэшся.

На двары яшчэ грымела, нібы там хто варочаў каменне.

У пакоі ж было ціха, утульна. Калі напіліся чаю, Лена прынесла з сянец Пятрову кашулю і пад прасам высушыла яе.

— Вось ваша, аддайце маё! — трымаючы перад Пятром кашулю, сказала яна.

Пятро ўстаў, нізка пакланіўся дзяўчыне.

— Шчырае дзякуй, Лена. Я вельмі ўдзячны вам і гэтай навальніцы...

Тут Лена заўважыла за акном чыйсьці твар. Ад нечаканасці аж адхіснулася, схавалася за Пятра.

— Што з вамі? — зірнуўшы на яе, спытаў той.

— Нічога. Здаецца, нехта ходзіць ля акна!

— Гэтага яшчэ не хапала! — крутнуўся на месцы Пятро.— Я вось пагляджу, каго там чэрці носяць...

Хуценька пераапрануўшыся ў сенцах, Пятро выйшаў. Але нідзе нікога не знайшоў. Грымота пайшла далёка на поўнач. Дробны дождж ціха сыпаў з цёмнага неба.

Лена выйшла ўслед за ім, моўчкі стала побач.

Пятро зірнуў на дарогу і сказаў:

— Пайду. Можа, дaганю каго.

Лена неспакойна паглядзела яму ўслед, зайшла ў пакой і зачыніла дзверы на засаўку.

* * *

Хвалявалася Лена дарма. Праз некалькі дзён, ідучы на луг са свежымі газетамі, яна даведалася, што ў сяле аб ёй загаварылі па новы лад.

Па дарозе захацелася зайсці на калгасную ферму, якая стаяла не дужа далёка ад клуба, у канцы возера, за хмызняком. Праз той хмызняк прабягала невялічкая рэчка Азярынка. Вясной Азярынка разлівалася так шырока, што вада залівала ўвесь зазерскі луг па той бок фермы. З гэтага боку было невялічкае ўзвышша, на якім і стаяла некалькі будынін фермы.

«Жанчыны яшчэ не бачылі Германа Цітова... Няхай запомняць нашага другога разведчыка космасу! Пачытаю даяркам аб палёце...» — думала дзяўчына, а выйшла зусім не так, як хацелася...

Каля фермы сустрэла Віктара. Ён усміхнуўся ёй і, развёўшы рукі, загарадзіў дарогу.

— Тпр-ру. Можа, крыху пагамонім? — спытаў, па-зладзейску азірнуўшыся назад.

Лена рашуча адвяла яго руку і пайшла далей.

— Глядзі ты! З Вольчыным жаніхом паспала, дык і не да носа! — кінуў ёй паўздагон Віктар.

Жураўская спынілася, нібы ёй у спіну стрэлілі.

«Вось яно, сяло... Нехта падгледзеў, кума — куме, а кума — па ўсім сяле», — узрушана падумала яна. І пасля, п'ючы з вядра сцюдзёную ваду і пазіраючы ўпотай на Віктараву Кацю, сціплую на выгляд, бялявую, з прыгожымі ружовымі вуснамі і хударлявым тварам жанчыну, Лена не магла супакоіцца. Каця здалася ёй чужою, вельмі сталай, хоць яны лічыліся аднагодкамі. Такое ўражанне было ад глыбокіх, не па гадах, маршчын, што спаласавалі лоб, ляглі пад вачамі.

— Бач, сасмягла як... Не адап'ецца! — кінула Каця да другіх даярак.— Мусіць, смачна наелася...

— Ты чаго гэта? — паставіўшы вядро на зямлю і насцярожана зірнуўшы на Кацю, спытала Лена.

— Ды так...

— А ўсё-такі! Ясней...

— Што ж можа быць ясней? Калі мой Віктар і то цябе кожан вечар успамінае. З чаго б гэта, га?..

А ў вачах — хітрынкі. Бачыць Лена тыя хітрынкі, і яе разбірае злосць.

— Эх, Каця! І ты паверыла?

— Усе паверылі, дык і я...— памякчэла Каця.— Але ж мой Віктар нешта з кожным днём горшае...

— Твой Віктар проста п'яніца і бабнік! Зусім разбэсціўся... Дык прычым тут я? — ледзь не плачучы, прагаварыла Лена.

— Як гэта разбэсціўся? — Каця ўперлася кулакамі ў бакі.— Утрымай цяпер гэтага казла, калі добрая козачка падвярнулася! Бачыла я, як ты яго на дарозе перапяла...

— Я... перапяла?

— А хто ж? Не спыніўся ж ён каля слупа.

Лена зразумела Кацю. Значыць, уся віна яе ў тым, што яна прыгожая і ходзіць па зямлі, дзе ёсць яшчэ такія Віктары.

— На твайго Віктара я і глядзець не хачу, не тое што размаўляць з ім! — сарвалася ў яе з языка. — Ты гэта добра ведаеш, Каця!

Лена павярнулася і паволі пайшла ад фермы ў кірунку да лугу. Жанчыны глядзелі ўслед і маўчалі. Відаць, яны крыху шкадавалі, што Каця пакрыўдзіла дзяўчыну, а яны не заступіліся.

Лене ж зусім не хацелася чытаць ім гэтае незвычайнае паведамленне. Яна адчувала, што па сяле разнеслася другое «паведамленне», крыўднае і бязлітаснае...

Але на луг пайшла. Ёй цяпер не так патрэбна было пачытаць тыя газеты, як даведацца ўсё, выпіць гэтую горкую чашу да дна.

Ледзь толькі наблізілася да пракосаў, дзе завіхаліся зазерцы, як адразу заўважыла, што дзяўчаты пачалі збірацца каля Волькі.

«Пайду проста да яе. Няўжо і яна паверыла?» — вырашыла Лена і, падышоўшы, гучна прывіталася:

— Дзень добры, таварышы!

— Гусь свінні не таварыш! — адразу аглушыла яе Волька сваім падрыўным голасам.— І ў мяне каб тваёй нагі больш не было... Вось прыгрэла гадзюку на сваю галаву! — заенчыла тая на ўвесь луг.

— Гэта ж няпраўда, Волька... Я табе ўсё раскажу!

— Мне ўжо і так расказалі. Гарэлку разам пілі, ведаю... Цалаваліся. А той нястыднік на калені станавіўся! Вось да чаго давяла, гадзюка...

— Мы пілі не гарэлку, а чай... Пятро трапіў пад дождж...

— Дык ты сагравала? — здзекавалася Волька пад смех жанчын.— Бачыла я вас яшчэ тады, як мілаваліся ў маім пакоі каля люстэрка. Сваімі вочкамі!

— Каб яны табе павылазілі, Волечка! — не стрывала Лена.— Ну, мілавалася! Хацела так. Вось вазьму і адаб'ю твайго жаніха... Што, забароніш?

Волька ад злосці аж пасінела. Як трымала граблі, так і кінулася на Лену.

— А от біцца вы тут не будзеце! — стала між імі старшынёва жонка.— Кінь, Волька, граблі. Кінь, кажу!..

Лена апусцілася на мяккую капу, горка заплакала.

Тлум адразу ўняўся. Волька спалохана адышлася назад, пачала апраўдвацца, гледзячы на нядаўнюю сяброўку, на яе плечы, якія часта ўздрыгвалі.

І адразу знайшлося многа заступнікаў, асабліва сярод старэйшых жанчын.

— Ну, чаго вы прычапіліся да чалавека, саромніцы? Думаеце, як самі, так і ўсе? — больш за ўсіх навалілася на дзяўчат старшыніха. Яна памагла Лене падняцца, абтрэсла з яе сукенкі пацяруху.

— Дзякуй,— ціха сказала ёй Лена і паволі пайшла ў сяло.

— Вось вашы газеты! — кінула наўздагон Тэкля, але тая нават не азірнулася.— Гэта ж яна хацела пачытаць вам, а вы... Гляньце, якая ракета! «Усход-2»... Ды гэта ж, што па радыё перадавалі! А вось і партрэт. Эх, сучкі бясхвостыя, наплявалі дзяўчыне ў самую душу!

Лена чула ўсё гэта, і боль у грудзях узмацняўся. «Паеду! Калі яны такія — няхай. Паеду ў горад, пражыву...» — падумалася адразу. Ёй успомнілася старая прымаўка: сярод варон жыць — варонаю каркаць. Яна так не можа. І шкадавала, што паддалася на зман, што не хапіла вытрымкі ў спрэчцы з Волькай. Ведала — праўда пераможа. І ўсе яны, хто абражаў яе, пашкадуюць аб гэтым пасля. Важна, каб яны самі зразумелі сваю памылку.

Такія думкі крыху супакоілі.

Ісці назад каля фермы не хацелася, і Лена ўзяла правей.

Мясціны тут ёй былі добра вядомы, выхаджаны ў дзяцінстве мо тысячу разоў. Вось вытаптаныя каровамі сцежкі між купін. Далей — узгорак. Ён аддзяляе ад фермы сяло і цягнецца далёка да лесу.

Каля самага ўзгорка, на раўніне, зарослай бярозамі,— зазерскія могілкі. Яны відны адусюль, нават з пізіны.

Лена міжволі прыбавіла кроку. «Пайду зірну на магілу»,— падумала яна.

Чым бліжэй падыходзіла да могілак, тым цяжэй станавілася дзяўчыне. І насмешкі дзяўчат, і папрокі Каці, і Вольчыны нападкі — усё, што перажыла яна некалькі хвілін назад, узмацняла боль душы. І нездарма Лена падума-

ла, што не хапае ёй добрага і моцнага таварыша, які б заступіўся за яе, суцешыў. Яна ведала такога чалавека, чакала штодня вестачкі, а яе ўсё не было.

Дзе ж ён, Анатоль, чым заняты, што не можа ліста напісаць? Хіба не кляўся ў каханні, не абяцаў прыехаць? Калі забыўся так хутка, то каму ж болей верыць? А можа, ўгнявіла яго чым, не дагадзіла?..

Думкі, думкі...

Выйшла на сцяжынку між жыта, пайшла яшчэ цішэй.

Неба ад пылу пацямнела. Густы вецер даносіў з лесу цёплы прэлы пах лісця і грыбоў. Ад нагрэтай сонцам зямлі струменілася паветра. Ісці было цяжка, быццам ногі налiліся свінцом. Прыгнятала і цішыня...

Але гэта толькі так здавалася. Варта было прыслухаццa да наваколля, і адразу вуха ўлоўлівала мноства розных гукаў. У траве, у жыце цвыркалі конікі; над галавой чыстым ручаём звінелі жаўранкі; недзе далёка-далёка заціхаў і ўзмацняўся гул трактара, быццам машына імкнулася вырвацца з якойсьці пасткі на волю; у хмызняку, што быў каля лугу, хадзілі авечкі, чулася аднастайнае і бясконцае «мм-ма-а-а»; а з сяла далятала шматгалосае кудахтанне курэй.

Ступіўшы ў змрочную засень могілак, Лена спынілася. Ёй чамусьці стала страшна. Яна ніколі не хадзіла сюды ў дзяцінстве: баялася. Гэты густы бярозавы пералесак, устаўлены старымі, аброслымі доўгім зялёным мохам крыжамі, цяжкімі каменнымі помнікамі заўсёды веяў холадам, студзячы ў жылах кроў.

Перасіліўшы страх, Лена паволі пайшла па сцяжынцы, што вяла праз могілкі. У тым месцы, дзе сцяжынка абгінала даволі вялікі роў, зарослы хмызняком, Лена заўважыла знаёмы вялізны дуб на краі могілак, спынілася, перавяла дух.

Побач з дубам была зялёная агароджа. У канцы яе стаяў жалезны крыж. Гэта і была матчына магіла...

Як цяжка адчыніць жалезную фортку! Як цяжка наогул крануцца з месца! Перасільваючы млявасць, падышла да форткі, адчыніла яе і ступіла за агароджу. Адразу адчула сябе маленькай, пакрыўджанай. Увесь боль душы, усю крыўду яна прынесла сюды. І не стрымалася, упала на густую шаўковую траву, якой зарасла магіла, дала волю слязам.

— Матуля... родная,— шапталі перасохлыя вусны.— Нашто ты пакінула мяне адну? Навошта...

Колькі часу Лена праляжала на матчынай магіле, яна не памятала. Калі высахлі слёзы і боль прытупіўся, яна пачула, як хтосьці падышоў. Яна не спалохалася, не ўсхапілася, а павolі ўстала, абедзвюма абтрасла сукенку. І толькі тады ўбачыла, што гэта старшыня. Ён стаяў, абапёршыся аб агароджу рукамі, і з жалем глядзеў кудысьці ўбок, міма яе...

— Вы? — здзівілася Лена.

— Я, Гэлька... гэта я,— паківаў ён галавою.— Ішоў на луг ды цябе ўбачыў. Чаго, думаю, звярнула сюды. Даруй...

І ў патухшым яго позірку, і ў голасе адчувалася, што ён тут доўга стаяў. Яна сумелася, паказала на магілу і прамовіла, нібы ў апраўданне:

— Даўно была тут, вось і зайшла.

— Гэта добра, Гэлечка...— уздыхнуў старшыня.— Маці твая была вельмі харошы чалавек...

— Яна столькі пакутавала праз сваю дабрату! — сказала Лена, і слёзы пырснулі з воч.

Каб суцешыць дзяўчыну, старшыня загаварыў пра многіх, хто аддаў жыццё і ў вайну, і пасля, хто згубіў сваё здароўе ў балотах, у бясконцых паходах і баях, у пастаянным голадзе і холадзе, у нягодах ваеннага часу...

— Усім было нялёгка,— закончыў ён і тут жа дадаў: — Затое вам, дзеці, добрае жыццё адстаялі...

— Адстаялі, ды не ўсе! — Лена падышла да агароджы і шчыра глянула на старшыню, а ён няшчотна пагладзіў сваёй цяжкай рукою яе густыя каштанавыя валасы.

— Нічога, дачка, здрадніка народ і пакараў...— І весела: — А вось сын вырас на славу! Дужа харошы чалавек Васіль, проста золата!

Лена адвяла позірк, паціснула плячамі:

— Не ведаю я Васіля... Не магу звыкнуць: вельмі на бацьку падобен...

— А ты — уся маці... І твар, і вочы...

Лена выйшла з-за агароджы, узяла старшыню пад руку і павяла яго назад, на сцяжынку.

— Раскажыце мне што-небудзь пра маму,— папрасіла яна, калі мінулі могілкі.

Корань маўчаў. Яму цяжка было гаварыць пра Марылю. Ды і пра што расказваць? Пра тое, як у іхнім сяле пасяліўся прыезджы каваль з дачкой Марыляй, белатварай, сінявокай прыгажуняй, да якой сваталіся ледзь не ўсе зазерскія хлопцы? Сватаўся і ён, Рыгор Корань. Ці сказаць пра тое, як Марыля разам з дыпломам агранома прывезла

сабе з горада мужа, а калгасу — новага старшыню? Напэўна ж не скажаш цяпер Лене пра тое, як ён, Рыгор, пасля няўдалага сватаўства напіўся гарэлкі ды, не раздумваючы, ажаніўся з самай непрыгожай у сяле дзяўчынай.

Памятае старшыня, што неяк пасля вайны Марыля сказала яму:

— Гарачая твая галава, Рыгор. Цяпер ужо нічога не паправіш, позна...

Глыбока ў сэрца запалі тыя словы Рыгору. Цэлымі вечарамі праседжваў ён пад бярозай, што стаяла каля Марыльчынай хаты. Іншы раз выходзіла і Марыля, але гэта было так рэдка! А пасля пад свіст і гігіканне аднавяскоўцаў, пад лямант раз'юшанай Тэклі вяртаўся Коранinformal з апушчанай галавою дамоў.

І не гаварыць жа цяпер дзяўчыне, як аднойчы ён не прыйшоў дадому, а застаўся ў Марылі да раніцы, сказаўшы Тэклі, што ад яе ён ідзе ўпрочкі.

Пасля гэтага выпадку давялося кінуць сваё сяло і з'ехаць у горад на заработкі, з сякерай за поясам. Марыля пайшла працаваць у суседні саўгас, а Тэкля, пажыўшы месяц адна, пусцілася шукаць мужа. І знайшла яго, і прывезла дадому.

— Чаму вы маўчыце, дзядзька Рыгор? — спытала Лена.

Ён спыніўся, паглядзеў у яе ясныя халаднавата-строгія вочы і адказаў:

— Цяжка мне гаварыць, Гэлька. Твая маці была добрая жанчына, прыгожая... Яна тут у мяне, у сэрцы! — І, як бы спахапіўшыся, што сказаў лішняе, рэзка змяніў гаворку: — Вось успомніў! Сёння я гутарыў з Пятром, настаўнікам. Ты яго чаем частавала, абагрэла, а гэты ржавы цвік Віктар чорт ведае чаго набрахаў! Ох і язычкі ў людзей! Прыйдзецца таму-сяму крыху падкараціць.

— Дык гэта Віктар лазіў каля акна? — задумліва спытала Лена, як бы нешта згадваючы.— Ну, усё роўна, няхай пабрэшуць. Людскія языкі не завяжаш. Я цвёрда вырашыла — паеду адсюль...

Корань аж спыніўся ад нечаканасці.

— Як гэта вырашыла? Куды паедзеш?

— У горад...

— А ў каго ты дазвол спытала?

— Спытала. У свайго сэрца, дзядзька Рыгор... Вы ж не ведаеце, як мяне сёння на лузе абразілі, на ферме! Колькі ж я магу цярпець? За што абражаюць? Ці я ка-

му благое зрабіла, ці жапіха ў Волькі адбівала? Падгледзелі, выдумалі, а цяпер усё сяло пасміхаецца...

— Дык вось як справа павярнулася! — у роздуме сказаў старшыня.— Толькі ехаць, дзеўка, табе цяпер нельга. З'едзеш — падумаюць, што праўда ўсё гэта, вінаватая ты... Нельга, Гэлечка.

— Што ж рабіць?

— Застацца. Жыццё пакажа ўсім, дзе праўда, а дзе крыўда! Гэта старая ісціна... А злосных брахуноў мы на ланцуг пасадзім.

Лена падумала і згадзілася пакуль што нікуды не ехаць. Калі ж нічога не пераменіцца і яе па-ранейшаму будуць абражаць, то шлях у горад ёй вельмі добра знаёмы.

— Мне, дзядзька Рыгор, патрэбна не толькі ваша падтрымка, а і дапамога.

— А як жа! — адказаў старшыня.— Толькі ты не бойся плётак і парайся з Пятром. Ён табе таксама многа паможа. А тыя, хто сёння брэшуць, пасля будуць хадзіць ля цябе, як сабакі, хвост падтуліўшы. От пабачыш!

— Праўда? — ажывілася Лена, радасна зірнуўшы на старшыню, які так удала выказаў яе ранейшыя думкі.

— Дзіва што!

— Дзякую вам, дзядзька Рыгор. Вы адзін мяне разумееце...

— Ты не прыбядняйся. Цябе многія разумеюць, але ты іх не заўважаеш. Крыўда вочы засціць...

«Гэта ж праўда... Варта мне з'явіцца ў клубе, як моладзь ажывае, усе мне рады. Такіх, як Віктар ды Волька, нямнога знойдзецца...»

Развіталіся каля фермы. Пасля доўгіх горкіх хвілін, якія перажыла Лена, яна сёння ўпершыню адчула сябе шчаслівай. Хіба гэта не шчасце, што маеш нарэшце такіх надзейных заступнікаў, як старшыня і Пятро Жывіца. Яны заўсёды памогуць, калі трэба будзе: свая ж, не чужая ў сяле! Яшчэ і Каця і Волька стануць ёй сяброўкамі. А цяпер — няхай гавораць што хочуць.

* * *

Дапамога, на якую разлічвала Лена ў сваёй нялёгкай працы, прыйшла не хутка. У гэтым была не яе віна. Вельмі ўжо непаваротлівымі аказаліся памочнікі, у якіх былі свае клопаты. Не ўсе, напрыклад, настаўнікі, што вучылі

дзяцей у зазерскай школе, жылі летам дома. Тыя ж, што засталіся, не ладзілі між сабой. Аб гэтым Лена са здзіўленнем даведалася ад Пятра зусім нядаўна.

Неяк раз, ідучы паўз школу, яна пачула спрэчку. Спрачаліся трое: жанчына і два мужчыны. Сярод іх чуваць быў голас і Пятра. Лена зацікавілася. З-за высокага плота да яе даляталі словы:

— Не, Іван Савіч, гэта, прабачце, не політэхнізацыя, а нешта горшае! — гаварыў Пятро.— Такая пасяўная плошча школе не патрэбна. Тым больш што ўраджай вы рэалізуеце, як кажуць, налева...

— Як гэта налева? — піскляві̇ла дырэктарава жонка Ліпа.— Мы вартаўніка трымаем, парты фарбуем, лыжы купляем...

— І ўсё ж я вам раю шчыра,— стаяў на сваім Пятро.— Прапалкай займіцеся самі.

Ён выйшаў на вуліцу і, заўважыўшы Лену, прывітаўся.

Ёй стала няёмка. Атрымалася так, быццам яна падслухала чужую размову. Але Пятро выручыў яе:

— Чулі? Кожны раз даводзіцца выяўляць, калі спатрэбіцца правесці збор ці арганізаваць паход. І гэта — дырэктар! Куды глядзяць кіраўнікі!

— Велікаваты ўчастак для школы,— згадзілася Лена.— Навошта вам такі?

— Не нам ён патрэбен, а яму, дырэктару,— нахмурыўся Пятро.— Скляпы на зіму трэба насыпаць, жывёлу трэба карміць...

— Школьную?

— Больш уласную.

— Я чула, вам дырэктар на дзень нараджэння матацыкл падарыў. Усе лічаць яго добрым чалавекам.

— Той матацыкл я перадаў школе, бо ён куплены на школьныя грошы,— адказаў Пятро.

Так Лена даведалася пра школьныя справы, пра спрэчкі настаўнікаў. Пятро расказаў ёй, што гады тры назад дырэктар зазерскай дзесяцігодкі Круцько пасяліўся ў школьным памяшканні і адразу праявіў сябе як заўзяты політэхнізатар. На прышкольным участку ва ўсю сілу і магутнасць разгарнулася яго кіпучая дзейнасць. З шасцідзесяці сотак зямлі Круцько давёў плошчу да двух гектараў, на якіх кожны год расло ўсё, ад ранняй радыскі да памідораў. Кожны вучань прыносіў на той гарод трохі ўгнаенняў, расады, насення. Даволі малады сад з трыцца-

ці яблынь прыносіў школе немалы прыбытак. Пад бульбу быў адведзены таксама немалы ўчастак, лепшая зямля каля ручая. Там яна радзіла ў любое засушлівае лета.

Не забыўся Круцько і па жывы куток. Каля сотні трусоў розных парод таксама даглядалі дзеці.

Лена слухала і не верыла сваім вушам.

— Чаму ж вы маўчыце? — спытала яна ў Жывіцы.

— Я не маўчу. Гаварыў у райana, але там у Круцько, як кажуць, рука. Пабачыце, ён яшчэ будзе скардзіцца на мяне...

Гэта была праўда. Дзейнасць дырэктара падтрымлівалі ў райana. Сказалі: «Няхай вучні набываюць працоўныя навыкі. Гэта ж добра».

Круцько не шкадаваў сіл і старання. «Дзеці набываюць практычныя веды! Чым гэта кепска?» Так думалі і бацькі. Яно і сапраўды няблага, калі, скажам, аднойчы прыйшоўшы са школьнага ўчастка, хлопчык ці дзяўчынка раптам паказвалі сваё ўменне засолкі гуркоў, памідораў. Каму з бацькоў не прыемна, што яго дзіця заўсёды пры справе, не бадзяецца абы-дзе ды яшчэ набывае веды. Разлік дырэктара быў дакладны. Яго абаранілі ад «нападкаў зайздроснікаў», якімі былі Жывіца і малады выкладчык фізкультуры. Хіба ж маглі ведаць зазерцы, што дырэктар злоўжывае іх даверам?

Іван Круцько, нягледзячы на свае трыццаць пяць год, набыў выгляд далёкі ад узросту. Амаль заўсёды аброслы рыжай шчацінай, апрануты абы-як, з дабрадушна-бесклапотным тварам і даволі аб'ёмістым жывоцікам, Круцько нагадваў заўзятага гаспадара-аднаасобніка. Яго беражлівасць межавала са скваппасцю. Ён забараняў дзецям, якія працавалі ў школьным садзе, зрываць сабе спелыя яблыкі, а дазваляў браць толькі тыя, што ляжалі на зямлі. Тады дзеці ўхітраліся так патрэсці маладыя дрэвы, што на зямлі станавілася больш яблыкаў, чым на дрэве. За ўсе гэтыя страты Круцько пёс поўную адказнасць перад ціхай, як ласкавая кошка, і драпежнай, як рысь, жонкаю. Ні адна душа не знала, што дырэктарам Іван Савіч стаў дзякуючы сваёй жонцы, у якой усемагутная радня працягнулася ланцужком ад райана да міністэрства, як ніхто ніколі не падазраваў, якой сілай валодала дырэктарыха і кім яна была ў жыцці Івана Круцько.

Адразу пасля спрэчкі з Пятром яна строга сказала мужу:

— Ад гэтага Жывіцы трэба пазбавіцца...

— Як гэта зрабіць? — пацікавіўся Круцько. Ён глядзеў на курэй, што пацягнуліся праз плот у калгасны ячмень, і вочкі задаволена масляніліся.

Яго цалкам задавальняла школьная сяліба наводшыбе, між двух сёл, у прыгожым кутку ля ціхага ручая і шчацiністага хвойніку.

— Як... А звычайна! Амаральны ён чалавек. Хіба ты не чуў, што хлапчукі гаварылі? Волька — раз, бібліятэкарка — два, добра складзеная паперка ў раён — тры...

Усміхнуўся дырэктар:

— Хітрая ты ў мяне, Ліпа! А не будзе ўсё гэта ліпай?

— Інспектар — свой чалавек...— быў яе строгі адказ.

— Не буду пісаць... За гэта цяпер, ведаеш...

— Іван! Я сказала — будзеш...

І неўзабаве ў раён паляцела паперка. Круцько пастараўся дагадзіць жонцы. Больш тыдня вышукваў тыя «сучкі і шурпатасці» ў паводзінах Пятра, за якія можна было б зачапіцца, каб хоць крыху было праўдападобна.

І вось што «здабыў» дырэктар: «Жывіца ашукаў даверлівую дзяўчыну В., якой абяцаў жаніцца, а потым, пакінуўшы яе, ашуканую, сышоўся з бібліятэкаркай Л. Ёсць чуткі — дзяўчаты ледзь не пазабівалі адна адну. І калі б у іх справу не ўмяшаўся старшыня, то вынік быў бы зусім трагічны. В. труцілася, але яе выратавалі. Завуч п'е гарэлку, гуляе ў карты і ўсіх шальмуе...»

Дні праз тры пасля таго, як запіска была накіравана ў раён, адтуль на ўласным матацыкле прыехаў інспектар райана, нізенькі хударлявы чалавечак у акулярах, у шэрым плашчы, які вісеў на ім як на коліку.

Інспектар адразу зайшоў да В., якой аказалася вядомая зазерцам Волька, і без усякіх лірычных адступленняў спытаў:

— З настаўнікам Жывіцам Пятром знаёмы? — і ўставіўся акулярамі, як кобра, на дзяўчыну.

— А навошта гэта? — разгубілася тая, хоць у хаце, апрача іх, нікога не было.

— Для вельмі важнай справы.

— Ну, знаёма, а што?

— Ясна... Ён у вас часта бываў?

— Часта, а што?

— Вы яго кахалі, праўда?

— Праўда...

— Ён абяцаў вам, што будзе вашым мужам, а цяпер... круціць з другой?

— Абяцаў... Круціць! — сярдзіта падхапіла Волька.— Каб яна там галаву ля возера скруціла!

— Яс-сна! Вы былі з ім... э-э, як бы гэта...— інспектар скасавурыўся на дзяўчыну, спахмурнеў.— Ясна! Вы чакаеце, ці не так? Ясна!

Волька цяжка ўздыхнула і, не зразумеўшы інспектара, па сваёй наіўнасці, адказала:

— Вам-то ясна, а мне пакуты... Даверлівая была, сляпая...

— Ясна! Усё! — інспектар закрыў свой блакнот і паехаў да возера «дапытваць» Лену.

Проста з парога інспектар падышоў да стала з першым пытаннем на вуснах, якое, на яго думку, павінна было адразу ўсё высветліць:

— Скажыце, таварыш Жураўская, што лепш — ратаваць чалавека, калі ён топіцца, ці тапіць чалавека, які ратуецца?

— Лепш ратаваць,— з усмешкай адказала Лена.— А вы, прабачце, хто будзеце, адкуль?

— Я?

— Ага...

— Ясна! Я — інспектар Дзеравяга. Будзем знаёмы і пагаворым па душах. Адкажыце мне яшчэ на два-тры пытанні...

«Хоць бы прывітаўся, Дзеравяга ты, адкуль толькі ўзяўся такі?» — падумала Лена і прамовіла:

— Калі ласка, што вас цікавіць?

— Вам вядома, што адна грамадзянка, якую завуць Волька, была ў цеснай сувязі з пастаўнікам Жыніцам?

— Жывіцам,— падказала яму Лена.

— Гэта не мае значэння! — абурыўся інспектар.— Вам было вядома, што тая дзяўчына праз тую сувязь хутка стане маці?

— Не,— ледзь стрымліваючы хваляванне, адказала Лена.

— Ясна. Вы, значыць, не ратуеце, а топіце!

— Прычым тут я?

— А пры ўсім астатнім! Можаце быць свабоднымі. Адзью, як сказаў бы на маім месцы француз...

Лена не паспела ўцяміць, што тут да чаго, як інспектар выбег на вуліцу, сеў на свой матацыкл і знік...

* * *

Дзеравяга спяшаўся са сваімі вынікамі «следства» да дырэктара.

Круцько, як звычайна, быў у гародзе, калі ля школьнага ганка спыніўся матацыкліст. «Гэта ён!» — адразу здагадаўся Круцько і бягом кінуўся насустрач, пакінуўшы свае гурочкі, якімі ён толькі што так міла любаваўся.

— А-а, таварыш Дзеравяга! — распасцёршы рукі, нібы збіраючыся лавіць інспектара, прагаварыў дырэктар і, схапіўшы маленькую далонь, аберуч паціснуў яе так шчыра, што госць аж прысеў.

— Але ж... Нічога сабе здароўечка! — крыва ўсміхнуўся інспектар.— Ледзь касцей не патрушчылі.

— Ад вялікай радасці я... Такі госць! — грукнуў сябе кулакамі ў грудзі Круцько.— Заходзьце ў хату, даражэнькі, заходзьце!..

Яны зайшлі ў прыбудову, дзе жыў Круцько, і спыніліся ў першым пакоі, з адзіным акном у сад. Селі за стол, шчыльна прыстаўлены да перагародкі. Круцько цяжка ўздыхнуў і акінуў сваё сутарэнне сумным позіркам. Дзеравяга — да чаго разумны! — адразу заўважыў і зразумеў дырэктарскі позірк.

— Цеснавата,— зазначыў ён, услед за дырэктарам агледзеўшы пакой.— Цесна...

— Яшчэ як! — згадзіўся Круцько і грукнуў у перагародку локцем.— Ліпа! Ліпачка... А ў нас госць...

— Хто-о? — пачулася адтуль.

— Угадай!

— Не ведаю...

Праз некалькі хвілін з другога пакоя выйшла поўная, круглатварая жанчына з заспанымі вачамі. Убачыла Дзеравягу, ляніва ўсміхнулася.

— Казіміравіч! Душачка...— пляснула рукамі.— Вы тут пагаманіце, я хутка...

Калі жонка выйшла, Круцько не стрымаўся.

— Ну? — коратка спытаў ён з застыглым тварам і выцягнутай, як у гусака, шыяй.

— Ам-кгм,— кашлянуў Дзеравяга і паціснуў плячамі: маўляў, не зразумеў дырэктара.

— Не муч...

— А што?

— Ездзіў жа. Ведаю цябе...

— Факты... э-э, як бы гэта...

— Рэжаш! Без нажа!..— Круцько ўстаў, сціснуў кулакі.

— Пацвердзіліся.

Зваліўшыся ў крэсла, дырэктар аж знямог. Ледзь аддыхаўся.

— Дзякуй богу! Пацвердзіліся... Фу ты-ы, пракляты... Давёў...

— Што?

— Давёў, кажу, мяне той Жывіца...— выцершы хусцінкай потны лоб, з палёгкай уздыхнуў.— Ха-ха-ха! Дырэктару трэба ўсё ведаць! Усё!..

— Вось паказанні абедзвюх,— інспектар дастаў з кішэні плашча свой блакнот.

— Бач ты, паганы! Значыць, праўда? Абаіх зводзіць?

— Калі ты напісаў, то павінна быць праўда...

— А ты правяраў!

— Бо ты напісаў...

— І што цяпер яму будзе?

— Усыплюць па самыя зашмаргі. Так яму і трэба! — махнуў кароткай рукой Дзеравяга.

— Так яму і трэба...

— Няхай пачухае цяпер патыліцу.

— Няхай паскрабе! — паківаў галавою Круцько.— А то такі, ведаеш, стаў, што нельга было і жыць. Заядаў...

— Іш ты? Заядаў?

— За-я-да-аў!

У хуткім часе на стале з'явілася закуска, бутэлька гарэлкі.

Дзеравяга ажыў. Ён хуценька скінуў плашч, зняў акуляры і нешта такое замурлыкаў, як кот, сабе пад нос. Ад задавальнення і асалоды пачаў церці рука аб руку. Зноў пачапіў акуляры і агледзеў закусь, ад маласольных гурочкаў да вяндліны. Потым зірнуў на шчаслівы твар гаспадара.

Круцько наліў чаркі, Ліпа паклала на талерку смажаную трусяціну. Дзеравяга аж зажмурыў вочы.

Калі былі выпіты першыя чаркі, інспектар запытаў:

— От скажы, Іван э-э...

— Савіч,— падказаў Круцько.

— Савіч... Скажы, як табе ўдалося ўсе гэтыя інтымныя падрабязнасці выведаць?

— Ха! Проста... У мяне ў садзе і ў гародзе кожны дзень дзеці.

— А прычым тут дзеці? Дазволь, ты нешта не тое вярзеш...

— Дзеці, мілы мой, самы цікаўны народ! — падміргнуў Круцько.— «А скажыце-тка мне, дзеці, што новага ў вас чуваць»,— пытаю я, напрыклад, у іх, і яны — о, цяпераштнія дзеці! — усё ведаюць. Асабліва адзін хлапчук ёсць, чорны такі шальмец. Ён мне пад вялікім сакрэтам пра Пятра паведаміў. І што, і як, і чаму... Заўважыў! І казаў, што Волька труцілася! — зноў наліваючы чаркі, закончыў Круцько.

— У-ух-ха... Тэк, тэк,— перакуліўшы чарговую порцыю, Дзеравяга выцер вусны рукою, хітра прыжмурыўся і працягваў: — У цябе, Іван э-э-э...

— Савіч!

— Савіч! У цябе дакуменцікі на дзяляначку, на ўраджайчык, на такі-сякі даходзік — усё ў парадку? Можа, якія цяжкасці?

— У мяне парадак! А цяжкасці... яны бываюць. Вось лыжы зімою купіў, парты фарбаваў, музыкальныя там інструменты для самадзейнасці — усё за грошы з дзялянкі!

— І лыжы, і ўсякія там інструменцікі ты купляў летась...

— Старое спісваем, новым замяняем...

— Ясна. Са спісваннем цяжкасці... Бульбу летась ты як прадаваў?

— Як усе... Але дробная была і... і пагніло шмат. Ізноўтакі — спісалі. Яшчэ за машыну заплаціў, што ў раён завезла, яшчэ...

— Ясна! — Дзеравяга сам наліў сабе гарэлкі і выпіў.— Ясна...

— Што ясна? — насцярожыўся Круцько, падстаўляючы новую бутэльку, якую лоўка падсунула яму Ліпа.

— А тое,— адказаў інспектар,— што я таксама маю пр-рава спісаць частку ўраджаю.

— А як жа! — ажывіўся Круцько.— Спішам. Удвух яно яшчэ лягчэй. Спішам, ліха яе матары! Нам бы толькі вось разлічыцца з гэтым прайдзісветам і авантурыстам Жывіцам! Дабіраецца да горада,— цішэй дадаў дырэктар.

— Пазбавімся! Гэта я табе кажу, Дзеравяга. Ты толькі налівай не па поўнай. Дос! Дос, кажу...

— Будзь здароў!

— Жэ ву пры, як сказаў бы француз!

Дзынкнулі чаркі, хрумснулі гуркі, і гутарка зноў ажыла.

— Хто такі Жывіца! Хлапчук! Ён падрывае мой заслужаны аўтарытэт! Згодзен?

— Згодзен...— гледзячы на Круцько шкляпымі вачамі, паўтарыў на свой лад інспектар.— Абавязкова...

— Ён можа мяне з месца... гэтага самага... пагнаць! Згодзен?

— Згодзен, дарагі мой І... Іван э-э-э...

— Савіч.

— Савіч! Я з усім гэтым згодзен!

— І яшчэ... Во, трусяціна ў смятане, пакаштуй,— падсунуў Круцько інспектару талерку са смажаным мясам.— Ліпа мая гатуе, як у рэстаране — ого!

Дзеравяга ўзяў кавалак на відэлец і, паклаўшы яго ў рот, гнусава прамовіў:

— І мая Вераніка — ого! І сам, можа, ого! А што датычыць дзяцей, то старэйшы, Светазар, жаніўся на гарадской, а малодшы, Любамір, той яшчэ дома, але — галава! І жонка — галава... І я — галава...

— Дзіва што! — згадзіўся Круцько.— Х-ха! Каб нашы дзеці, ды мы, ды жонкі...— Ён змоўк, намагаючыся нешта ўспомніць, але не ўспомніў і спытаў: — Аб чым гэта мы толькі што гаварылі, га?

— А чорт яго ведае,— махнуў рукой інспектар і пачаў па кішэнях шукаць папярос. Не знайшоўшы іх, ён устаў і, хістаючыся, паплёўся да дзвярэй. Круцько — следам.

І толькі гэта яны адчынілі дзверы, як нос у нос сустрэліся з Пятром. Ён быў узрушаны, вочы яго палалі рашучасцю.

Абмінуўшы інспектара, Жывіца спыніўся каля Круцько.

— Іван Савіч! — пачаў ён.— Што гэта робіцца? Я дачуўся...

— Усё праверана і ўстаноўлена,— перабіў яго дырэктар.— Вось інспектар з раёна, ён можа пацвердзіць...

— Ясна! — выпаліў Дзеравяга, ткнуўшыся плячом у спіну Пятра.— Тапельцы і вісельнікі разверзлі вусны свае. І жывём мы на свеце, каб зпішчаць пядолю і з ёю ўсё, што дастойна быць знішчана...

Ён паказаў Жывіцу язык і, зацягнуўшы «Маруся отравилась», падаўся на двор.

Пятро зачыніў за ім дзверы і кіўнуў на стол:

— Ці ён ад гарэлкі такі, ці ад прыроды?

— Гарэлкі я не пі-і-іў,— ікнуўшы, адказаў Круцько.— Проста па-алуднавалі...

— Тады — ад прыроды,— усміхнуўся Пятро.— Дык я дачуўся, што ваш інспектар Дзеравяга вёў нейкі допыт. Што гэта ўсё значыць?

Круцько прыжмурыўся на завуча, нібы нешта ўспамінаючы.

— Ах, вось што цябе цікавіць! Хвалюе! Ха-ха-ха! — рассмяяўся ён і строга дадаў: — Вось што, Жывіца, ці не хопіць табе тут ля мяне жывіцца?

— Што такое? — не зразумеў Пятро.

— А тое, што ты пойдзеш пад суд!

— Я?

— Ты...

— За якія грахі?

— А што ты думаў, галубок... Пакінуць жанчыну з дзіцем, а другой круціць галаву ў нашай дзяржаве нешта дазволена? Не! Не і яшчэ раз — не! Ад Жураўскай, бач, прыбег. Днюе і начуе ўжо там...

— Гэта мая справа, Іван Савіч Круцько! — падступіў да яго Жывіца.— Я ведаю — вы здольны на любую подласць, але папярэджваю: не капайце яму другому! Вам у ёй ляжаць, таварыш дырэктар!

Пятро выбег на двор і наткнуўся на інспектара. Той схапіў яго за руку і ледзь здолеў вымавіць:

— Я — што? Абавязкі! Шкада мне вас, але я што? А-ба-вяз-кі!

— Добра, добра, заканчвайце свае абавязкі і выспіцеся,— проста параіў Пятро. І выйшаў на дарогу...

Яму стала ясна, што дырэктар штосьці задумаў нядобрае, задумаў іменна супраць яго. Але Пятру нават і ў галаву не прыйшла б думка, што на другі дзень, падбадзёраны дырэктарам, Дзеравяга будзе дакладваць у райапа аб выніках сваёй праверкі ў зазерскай дзесяцігодцы.

* * *

У тым, што «Волька труцілася», вінавата была сама Лепа. Выпадак, які мог бы і не быць.

Неяк адпоічы, зачыніўшы чытальню, Лепа апранула лепшае, што мела, падфарбавала крыху губы і пайшла ў сяло. Яна мела намер забраць на пошце свежыя газеты ды па дарозе забегчы ў краму.

Там былі толькі дзэці. Яна запрасіла іх часцей хадзіць у бібліятэку і ўжо хацела ісці, як адзін чорнагаловы хлопчык спытаў:

— Цёця, гэта праўда, што вы з Волькай біліся па лузе?

«І гэтых цікавіць... Вось паглядзім, што заўтра выдумае сяло, калі я дам новую тэму для плётак!» — з горыччу падумала Лена і адказала:

— Ад каго ж ты чуў?

— Кажуць...

— Раз кажуць, значыць, праўда.

— От здорава! І хто перамог?

— Вядома, я перамагла! А пасля Волька труціцца хацела — ты не ведаеш?

— Не...

— Ну дык ведай.

Размовы гэтай не чуў нават Віктар, бо быў на складзе. Ці ж думала Лена, што той чорнагаловы блазнюк панясе гэтую навіну Івану Савічу, як кажуць, зусім цёпленькай? Калі б яна ведала, то не стала б жартаваць з агнём.

Цяпер, успамінаючы пра гэта, Лена папракала сябе ў легкадумстве. Злавалася, што жартавала тады на карысць тых, хто супраць яе і Пятра.

Як ніколі, адчувала сябе адзінокай. Пасля — апанавала журба. Хацелася з некім падзяліцца думкамі, ды не было з кім.

Тады Лена паспрабавала прыбіраць у клубе, але праца валілася з рук.

Зайшоўшы ў бібліятэку, яна села за стол, узяла аркуш чыстай паперы і акуратна зверху напісала: «Дарагі Толя...»

Напісала і задумалася: «Дарагі Толя... Ці дарагі ён мне цяпер? Два месяцы — ніякай вестачкі... Ды і там, на курсах, я да яго больш звярталася, чым ён да мяне. Бо — дарагі. А цяпер — асабліва...»

І Лена напісала ліст. Напісала шчыра, адкрыта. Ёй надакучыла адной, далёка ад таго, каго ў душы лічыць сваім... Лічыць па праву, бо яны ж даўно знаёмы, прызналіся адно аднаму ў каханні. Лена абяцала зберагчы тое каханне, зберагчы сваю маладосць і дзявочую вернасць.

Лена ўспомніла, як напярэдадні выпуску Анатоль Ліхавец зайшоў да яе ў пакойчык, які наймала яна ў адзінокай бабулі на ціхай, у садах вуліцы. Лена не чакала тады яго, разгубілася. А ён, расчырванелы, вясёлы больш

звычайнага, злавіў яе ў моцныя абдымкі, апаліў гарачым пацалункам.

Пасля адчыніў паходны чамаданчык, што прынёс з сабою, і з усмешкаю паставіў на стол бутэльку добрага віна, насыпаў дарагіх цукерак...

— Табе, Леначка! Каханне маё, радасць мая... Адна ты, каб ведала, трымаеш мяне на свеце! Нічога больш не міла, не люба!..

І слёзы, і смех, і журба...

— Вось ты паедзеш, а я застануся... Адзін са сваім горам, са сваёй бядою...

І абняў Лену за плечы. Высокі, з вялікімі яснымі вачамі, з кучаравай светлай галавою, Анатоль здаваўся дзяўчыне надзвычай прыгожым. Пры ім Лена, заўсёды смелая, рашучая, станавілася сарамлівай і пакорлівай.

Яна піла віно, смяялася і не заўважыла, як над зямлёю апусцілася шэрая ноч, як прагрукацеў на апусцелай вуліцы апошні трамвай.

Галава прыемна кружылася ад выпітага, а губы аж балелі ад моцных пацалункаў.

Апамяталася дзяўчына тады, калі, на момант выпусціўшы яе з абдымкаў, Анатоль хутка выключыў святло і, гарачы, узрушаны, зноў абхапіў яе.

Яна спакойна і шчыра прытулілася да яго, пацалавала, а потым, выкаўзнуўшы, уключыла святло. Не сказала ні слова. Глядзела на яго расчырванелы твар халодным дакорлівым позіркам.

Анатоль адвярнуўся.

— Што ж... Я магу пайсці,— глуха вымавіў ён.— Магу пайсці.

Лена баялася яго, прамаўчала.

І ён пайшоў.

Лена кінулася на ложак. Ад крыўды цесна было ў грудзях, не хапала паветра. А потым знемаглася, заснула...

З таго вечара Ліхавец хоць і кожны дзень прыходзіў да яе, але расставаўся завідна. Ён стаў нейкі разгублены, задумлівы. Нават на сцэне ў яго не хапала ранейшага задору, весялосці. Каханне іх пайшло на спад. Яны не знаходзілі слоў пры сустрэчах, маўчалі пры развітанні...

Толькі ў той апошні дзень Ліхавец зноў быў вясёлы, гаварыў ёй аб сваім вялікім да яе каханні, моцна цалаваў Лену...

— Пішы мне. Да запатрабавання. Я заеду да сваіх,

а пасля магу працаваць дзе хочаш. Мусіць, я вырвуся нарэшце з гэтых абцугоў...

— З якіх? — не зразумела Лена.

— Ёсць такія, дарагая. На жаль...

Ён заўсёды нешта недагаворваў. Лена прывыкла да гэтага і лічыла проста звычкай чалавека.

— Лепш ты мне пішы... — сказала.

— Добра. Заўсёды буду рады з табой быць разам... Працаваць.

Гэта было сказана шчыра, і Лена радавалася, што іх адносіны зноў наладзіліся пасля нядобрага вечара. Непакоіла адно: пісаць да запатрабавання. І яна спытала — чаму? Анатоль растлумачыў: пакуль што яму самому невядома, дзе будзе жыць, бо старую кватэру ён, напэўна, пакіне.

Занёсшы пісьмо на пошту, Лена забегла да старшыні. Сёння меўся адбыцца вечар пытанняў і адказаў.

Старшыня сустрэў яе ля парога:

— Як жывеш, Гэлечка? Нешта не чуваць, каб хто іграў на новым баяне...

— За баян — дзякуй, дзядзька Рыгор,— ухілілася ад далейшай гутаркі Лена.

Старшыня зразумеў яе.

— Нешта сёння невясёлая... Можа, зноў хто пакрыўдзіў?

— Ды так... Ездзяць розныя Дзеравягі. Не ведаю, што ім трэба. Толькі новыя плёткі пойдуць...

— Ты не хвалюйся! Збяром сёння ў клубе людзей, каму трэба — укароцім языкі,— сказаў старшыня, па-бацькоўску паклаўшы важкую руку дзяўчыне на плячо.— Мужчын сам запрашу да цябе, а жонкі ўслед прыбягуць — пажартаваў ён.— Толькі сустрэчу ім падрыхтуй як след, па-гаспадарску...

— Ды ўжо ж, пастараюся... Ведаеце, дзядзька Рыгор... Я хацела вас папрасіць вось аб чым... Напісала я свайму знаёмаму, каб прыехаў. Без мастацкага кіраўніка нам ніяк не абысціся...

Старшыня схіліў галаву, падумаў. Пасля з усмешкай спытаў:

— А сам ён спяваць умее?

— Не толькі спяваць... Ён і музыкант, і танцор, і хорам кіраваць можа...

— Такі няхай едзе. Чалавекам быў бы толькі. А то вунь у суседзяў з'явіўся адзін кіраўнік такі, спакуснік...

Устроіў ён канцэрт у Бараўлянах! Век помніць будуць. Кіямі з сяла гналі...

— За гэтага я магу паручыцца,— пачырванела Жураўская.

— То добра! Згодзен... Няхай прыязджае.

Не ішла — ляцела дзяўчына ў клуб. Яе ўжо менш за ўсё хвалявалі вясковыя плёткі, Віктары ды Алесі. Вось прыедзе яе Анатоль — усе змоўкнуць! Будзе ў яе свой заступнік!..

Да вечара час праляцеў — не заўважыла. Пакуль прыбрала ў клубе, у бібліятэцы, пакуль змяніла фіранкі, паліла вазоны, пакуль падмяла дарожку ды пасыпала жоўтым пяском — звечарэла. Ледзь справілася замяніць старыя плакаты новымі, азірнулася, а па дарозе ўжо ідзе хтосьці...

Забегла ў свой пакойчык, узяла гладыш з ружамі — ды ў чытальню. І тут пастукалі ў дзверы.

— Заходзьце! — звонка прамовіла Лена і ўстала. На твары — радасная ўсмешка, вочы свяціліся тым няўлоўным халодным агеньчыкам, у якім было столькі прывабнага, чароўнага і яснага, што той, хто хоць раз зірнуў у іх глыбіню, ужо не ў сілах быў стрымаць свайго захаплення.

Так здарылася гэты раз і з Віктарам. Ледзь толькі ён пераступіў парог і глянуў перад сабою, як лёгкі, міжвольны вокліч вырваўся з яго грудзей:

— Ух, Лена!.. Як ты тут... і наогул, да чаго ж я быў раней сляпы! Прыгажосць і хараство... — ён не мог падабраць яшчэ цяплейшых слоў, каб выказаць сваё захапленне, і таму, парывіста падышоўшы да стала, працягнуў руку: — Клянуся, я не заўважаў, што ты такая. Вось мая рука, Лена.

Але ім перашкодзілі: у дзвярах паказаўся Алесь. Чыста паголены, у новым шэрым касцюме, ён шумна ўваліўся ў памяшканне і раптам застыў на парозе: Лена глядзела на яго і ўсміхалася.

Яго цяпер нельга было пазнаць. Каштанавыя валасы былі акуратна зачэсаны. Нават круглы твар не здаваўся такім тоўстым, а быў радасна-здзіўлены, расцягнуўся.

Падышоўшы да стала, Алесь стрымана прывітаўся з Ленай і павярнуўся да Віктара з застылым пытаннем на твары.

— Віктар хоча выбраць кнігу,— зразумеўшы Алесеў позірк, сказала Лена.

— Ага,— падхапіў той.— Дайце, калі ласка, пра маладагвардзейцаў.

— Х-ха! Маладагвардзейцаў... — не стрымаў Алесь.— «Жахлівыя ночы» табе ўжо не трэба?

— Што было, пра тое забыўся. Ясна? — непрыязна адказаў на гэта Віктар, нават не зірнуўшы на Алеся.

— А жонку дома ты, выпадкова, не забыўся? — зноў спытаў Алесь, наступаючы грудзьмі на Віктара.— Чаму прыйшоў адзін?

Той з незалежным выглядам узяў з Лепіных рук кнігу і пайшоў за столік.

Алесь сеў за другі, у самым куце, надзьмуты як індык. «Вось прынесла нялёгкая,— думаў ён, гартаючы старонкі новага часопіса.— Не, брат, я цябе больш слухаць не буду. Дудкі! Старшыня сказаў, што Лена не хоча са мной і гаварыць праз цябе».

Лена злавіла сябе на думцы, што ёй прыемна глядзець на Алеся. «Калі ён не п'е, ён прыгожы і добры».

Хацелася глядзець на Алеся, хацелася знаходзіць у ім толькі добрае.

Сёння зазерцы збіраліся асабліва дружна.

Увайшло адразу двое мужчын, за імі — яшчэ адзін, гэткі ж прыбраны, як і ўсе.

Убачыўшы, што яны тут не першыя, мужчыны весела віталіся з астатнімі, з ахвотай браліся за газеты і часопісы. У кожнага раптам з'яўлялася цікавасць да міжнародных падзей, да жыцця краіны.

— Бач! — гаварыў адзін.— Турысты! Нашы вайсковыя аб'екты фатаграфавалі... Шпікі праклятыя!

— А ракета «Атлас» зноў узарвалася! — смяяўся другі.— Не дагнаць амерыканцам нашых касмічных караблёў!

Як прыемна было глядзець Лене на гэтых «зацікаўленых»! Яна спачатку здзівілася, што зазерцы ўпершыню з'явіліся як на свята, усе прыбраныя. Калі ж у новым касцюме зайшоў і каваль Мікола, Жураўская зразумела, што старшыня, відаць, не жартаваў, калі гаварыў, што збярэ мужчын.

Але цішыня і парадак культурнага адпачынку зазерцаў раптоўна былі парушаны. З надворку даляцеў спачатку невыразны гоман. Ён раз-пораз узмацняўся і ўзмацняўся. І вось ужо можна было пачуць асобныя ваяўнічыя воклікі жанчын:

— Рабіць ім няма чаго — у клуб цягнуцца! Мы ёй пакажам той клуб! Вокны павыбіваем...

— Правільна! Досыць з ёй нянчыцца. Лялька...
— Зачыні дзверы, Насця, каб ніхто не ўцёк! Мёд абнюхалі...
— Не адставайце там, бабы!
— Ну, чаго вы глупства гаворыце? Што з таго, што мужчыны сталі лепш апранацца. Значыць, культурнейшымі сталі! Багацей жыць пачалі... А што — у чытальню трэба ў рабочай вопратцы хадзіць? Правільна яны робяць...
Мужчыны насцярожыліся. У зале стала ціха. Не чуваць было нават шэлесту старонак. Ніхто не вымавіў слова нават і тады, калі, узрушаныя і адважныя жанчыны ўварваліся ў памяшканне. Уварваліся... і заціхлі. Яны ўбачылі незвычайную карціну: Лена рабіла ў сшытку нейкія запісы, схіліўшы задуменны спакойны твар. Мужчыны ўткнуліся насамі ў газеты і часопісы.
— Заходзьце, калі ласка,— з добрай усмешкай сказала Лена, і ніхто не мог здагадацца, якога намагання, якога напружання нерваў каштаваў ёй гэты спакойны выгляд.— Каця, Зося... Заходзьце.
Пачуўшы сваё імя, Каця ганарова, незалежна падышла да Віктара, ад чаго той яшчэ ніжэй сагнуўся над кнігаю.
— Ха!.. Глянь, Каця, на гэты малюнак,— як ні ў чым не бывала, сказаў Віктар, узняўшы на жонку позірк, поўны гневу і нянавісці.— Бачыш, дар-рагая? Ты бачыш, я цябе пытаю?!
— Ціха, дурань...
Каця зразумела, што тут надта не разыдзешся, і пакорліва села побач з мужам.
Затое каваліха Зося падляцела да свайго як аса. Сыкнула, ушчыпнула:
— Ідзі дамоў, кажу! Прыфранціўся... Без цябе тут жаніхоў хапае!
— Здурнела ты, кабеціна, ці што? Зірні вось лепш сюды. Бачыш, да чаго чалавек палізаўся той гары?
— І цябе малюнак цікавіць? — пад агульны смех Зося зноў ірванула мужа за пінжак.— Ты ж у Ніўкі збіраўся пайсці!
— Ішоў! Але спаткаў вось хлопцаў, і забеглі сюды,— гучна апраўдваўся каваль.
Лена глядзела на ўсё гэта і хавала ўсмешку.
— Гэта табе сюдой дарога ў Ніўкі? Га? — не здавалася Зося.— Выходзь, кажу!

І тут пачуўся голас старшыні:

— Ану, бабы, крыху цішэй! Раз сабраліся — садзіцеся, будзем весці гаворку... Не стойце на праходзе! І ты, Насця, садзіся да свайго Януся, не саромейся, не першы год замужам!..

Пад смех і гоман старшыня ўвёў з калідора за руку немаладую ўжо, разгубленую жанчыну ў пышнай квяцістай спадніцы, у фартуху, з закасанымі рукавамі, відаць, ад печы.

Жанчына ўпіралася і размахвала пад самым носам старшыні вялізным кулаком:

— Я табе не маладзёшанька, што цягнеш, як воўк авечку!

— Ну, ідзі, ідзі, мая галубка, да мяне,— распасцёр магутныя рукі Янусь, калгасны трактарыст.— Я табе пачытаю апавяданне, як паспрачаліся два Іваны. Ці — як чорт месяц украў. Хочаш? Тут і не такія жахі ёсць...

— Пачакай, галубок, будуць табе жахі! — прыгразіла Насця.— Прыйдзеш дамоў...

Корань мігам рассадзіў усіх і пастукаў костачкамі пальцаў па стале.

— Ціха, таварышы! Спрачацца будзеце дома. А тут, калі ўжо прыйшлі па сваёй добрай волі, паслухайце і адпачніце.

У пакой увайшоў лектар, нізенькі лысы чалавек у чорным і, здавалася, цесным касцюме. Людзі адразу перайшлі ў клуб, расселіся.

Лектар зайшоў быў за трыбуну, але выявілася, што тая трыбуна зроблена не па яго росту. Куды зручней стаяць побач з ёю.

У зале нехта хіхікнуў. Чалавек павярнуў у той бок галаву і даволі басавіта сказаў:

— Мяне завуць Самсонам... Самсон Кірылавіч Кныш...

Цяпер ціхі смех пачуўся з другога боку. Кныш павярнуў галаву на гэты смех і, як нічога не было, гаварыў далей:

— Я вам, таварышы, раскажу не пра атамы і зоркі, не пра падарожжа на Месяц і Венеру, а пра людзей, якія жывуць на зямлі, сярод нас, але жывуць не так, як мы...

У зале адразу стала ціха.

Лектар расказваў пра сектантаў, пра тое, як у суседнім раёне з-за іх загінула маладая жанчына.

Чалавек гаварыў, не заглядаючы ў канспект.

Калі Кныш кончыў лекцыю, на сцэну выйшла Лена

Жураўская. Яна была ў светлай сукенцы. Тугая каса, закручаная ў куклу, надавала твару строгасць.

— Цяпер, таварышы, пачнём наш традыцыйны вечар пытанняў і адказаў,— крыху схіліўшы набок галаву, сказала Лена. Адказы будзе даваць доктар філасофскіх навук Самсон Кірылавіч Кныш...

Каваліха Зося штурхнула мужа локцем і ціха спытала:

— Чаму гэта — доктар, а гаворыць пра рэлігію? Хай бы лепш пра хваробы...

— Чула ж, што казаў... Сектанты — гэта самая небяспечная і цяжкая хвароба,— усміхнуўся ў адказ каваль.

— Ат, дуры галаву... Спытай лепш, чаму цяпер маладыя ды вучаныя, а ў царкву бегаюць...

— Ты ж сама казала, што ў Бараўлянах малады, прыгожы поп заявіўся, спявае, як артыст. Вось дзяўчаты і бягуць паслухаць ды паглядзець на таго папа...

Першае пытанне, як заўсёды, задаў барадаты і сівы дзед Гаўрыла, калгасны пчаляр. Малы, жвавы, ён прайшоў да сцэны і, павярнуўшыся тварам да людзей, акінуў залу хітрым прыжмураным позіркам. Тыповы літаратурны дзед. Напішы пра гэткага, дык скажуць, што ён запазычаны з другой кнігі. А такія шустрыя, разумныя дзяды ёсць у кожным сяле!

— Вось такое маё пытанне будзе,— пачаў Гаўрыла, звяртаючыся да ўсіх.— Кажуць, бога няма... А нам вядома, што здаўна бог вёў вайну з д'яблам. Дык ці не здарылася ў іх там такое, што д'ябал перамог бога? Чаму я, мілыя людзі, так думаю... А таму, што па ўсім відаць — бога няма, а д'ябал існуе! Гэта ж ён даў людзям розум зрабіць атамную бомбу, каб пасля ўсё чалавецтва спяклося ў тым д'ябальскім агні, як прусакі. Ці не праўда, га?

І пайшоў на месца, задаволены сваім хітрым пытаннем.

Кныш зразумеў жартаўлівага старога, усміхнуўся і правёў яго позіркам аж да месца.

— Добра, я адкажу,— прамовіў ён, калі стары ўсеўся.— Магчыма, усё ў гэтым пытанні было б правільна, калі б не ўлічваць трэцюю сілу — чалавека. Як вядома, чалавек заўсёды вёў вайну і супраць бога, і супраць д'ябла. Калі ўжо, як тут казалі, бог адолены, то з адным д'яблам справіцца будзе лягчэй. Ды і з усім, што звязана з гэтым д'яблам. Ну хоць бы з тымі атамнымі бомбамі.

— Іэ-эт, лоўка выкруціўся! — задаволена выгукнуў Гаўрыла і першы запляскаў у далоні.

Пытанняў было шмат, адказы былі цікавыя, дасціпныя. Жанчыны смяяліся, мужчыны жартавалі. Нарэшце сцішыліся. Слова ўзяў старшыня.

Лена зірнула на яго і чамусьці захвалявалася. Яна адчувала, што Корань нездарма памог ёй сабраць столькі народу.

— Перш-наперш,— спакойна сказаў старшыня,— прашу прабачэння, што пачну не з вясёлага. Прашу, шаноўныя, прыняць да ўвагі, што ў нашым сяле ёсць людзі, якія крыўдзяць адзінокую дзяўчыну. Вы ўсе ведаеце, пра каго я кажу. Ці ж можна думаць толькі благое пра таго, хто жыве адзін, без бацькоў, без радні? У Гэлькі тут нікога няма... Дык на яе ўсякае можна і выдумляць? Сорам!..

— Брахалі ж не ўсе,— нясмела ўставіла Зося.

Старшыня паківаў на яе пальцам.

— А чаму ж вы не спынілі брахуноў? Маўчыце? Дык я скажу. Бо зняважылі чужога чалавека, не вас асабіста. Адзін п'янчужына сватаўся, а другі, каб абразіць дзяўчыну, настаўніка ў яе пакоі ўбачыў і нагаварыў усялякае, навыдумваў. А вам і весела! Не пра вас плёткі пускаюць, няхай ляцяць... Дрэнна! У Гэлькі ёсць жаніх, ён хутка прыедзе, а вы такую славу нядобрую пра яе разносіце. Яшчэ горш! — махнуў ён сваёй вялізнай рукою і змоўк. Маўчалі і зазерцы. Толькі Зося ціха сказала:

— Хай бог сцеражэ...

— Трэба, каб людзі сцераглі! Каб ахоўвалі, біліся за праўду, а не хаваліся ад яе... Жураўская сумленны работнік, чэсны чалавек... І не было б нашай Вольцы жаніха, калі б яна была такою, як вы думаеце! — зноў сказаў Корань.

Не глядзела Лена на Алеся ў гэтую хвіліну! Калі б яна зірнула на яго хоць раз, то заўважыла б, як нізка схіліў ён сваю галаву, як гарэлі яго вушы.

— Ці праўда гэта? — спытаўся каваль у Алеся.

— Праўда! — не ўзнімаючы галавы, ціха адказаў той.— Усё мы з Віктарам выдумалі. Лена ж і Вольцы казала, што ў яе ёсць гарадскі нейкі. А што ў дождж настаўнік трапіў да яе, дык кожнага з нас яна не прагнала б! Як піць даць...

— Смалы вам з Віктарам піць даць! — з'едліва кінула Каця.— Знюхаліся, брацікі, каб вас...

— Разлучым! Калі ўсе возьмемся за іх, то шаўковымі стануць,— прыгразіў старшыня.

Усе засмяяліся і адразу павесялелі. Пачаліся тыя вяс-

ковыя жарты, ад якіх любы не вытрымае, каго яны закрануць.

Віктар першы выскачыў з залы, быццам з гарачай лазні. Добра прапарылі. Алесь жа толькі закрыў твар газетаю, усё да канца выслухаў.

Лена радавалася. Не чакала, што іменна сёння пачнецца гэтая гаворка. Ёй таксама было ніякавата. Яна чырванела і не ведала, дзе схаваць вочы ад сораму. Старалася думаць пра што іншае.

«Алесь малы быў вельмі худы. Віктар — наадварот. А цяпер яны памяняліся,— успаміпала Лена.— Вось толькі Зося такая ж, як і была, малая, злосная, калючая. Бедны каваль, ён пакорліва церпіць усе яе здзекі, як дзіця! А Віктар і малы быў нягодны».

Быў у клубе толькі адзін чалавек, нібыта лішні, нікім не заўважаны. Задумёны і маўклівы, ён сядзеў у самым куце. Бачыла яго адна Лена. Яна адчувала, што прыйшоў ён не проста так, што ў яго ёсць свае нейкія прычыны маўчаць, быць непрыкметным. Што гэта за прычыны? І чаму ён увесь час глядзіць на яе? То збялее хлопец, як папера, то зальецца чырванню. І не хапае адвагі сказаць свае слова. Бедны Васіль!

Калі ўсе ахвотнікі выгаварыліся, Лена зачытала план работы клуба на наступны месяц.

— Нам трэба будзе неўзабаве арганізаваць свае гурткі мастацкай самадзейнасці,— сказала яна нарэшце і ўжо зусім неспадзявана для ўсіх дадала: — Васіль, склаў бы ты спісы, хто ў які гурток хоча...

Васіль страпянуўся, як птушка, напалоханая знянацку.

— Гэта можна,— сказаў ён прыглушана.

— Гурткі — гурткамі, але глядзіце, каб і кнігі на паліцах не пыліліся! Хадзіце сюды часцей, таварышы,— сказаў, звяртаючыся да ўсіх, старшыня.

— Запрашаеце-то вы ўсіх, Рыгор Пятровіч, але ці ўсіх мне сюды пускаць? — заўважыла на гэта Лена.

Старшыня здзіўлена зірнуў на яе:

— Пра што гэта ты?

— Я зноў пра Алеся. Брат — парторгам у калгасе, сам — камсамольцам быў, а такое сабе дазваляе, што проста сорам! Падумайце, ці варта давяраць яму калгасную машыну? Ён жа нап'ецца калі-небудзь ды мала таго, што сам скалечыцца ды людзей пакалечыць, а і машыну паломіць, спаліць.

— Падумаем пра гэта,— сказаў старшыня.— Справа правільная...

— І яшчэ... — зноў пачала Лена.— Цяпер людзі ўсім цікавяцца, да ўсяго імкнуцца. Ім, акрамя хлеба надзённага, нешта трэба і для душы! Людзі хочуць жыць весела. А тут у клуб нельга парога пераступіць з-за двух-трох п'яніц.

— Правільна! — падняў руку каваль.— Усып яму па самую пятніцу! Хто ж яшчэ можа прыструніць Алеся...

— Ты лепш маўчы! — паківаў па яго пальцам старшыня.— І тваю Зоську прыструніць варта. Каб курэй на базар не вазіла...

— А я не курэй, а яйкі! — агрызнулася Зося.— Сама не ем, дзецям не даю, каму якая справа? Мне трэба хату перасыпаць...

— Хлусі, ды меру знай! Дачушцы пасаг збірала, а дачушка — шусь замуж ды на цаліну! Цяпер сама грошы прысылае ды просіць, каб яе той пасаг на легкавушку сабе я ўзяў! — адказаў каваль.

— Так ужо і просіць!

— А навошта пісьмо тое схавала, не дала пачытаць? Ве-е-даю... Кажы, Гэлька, далей...

— Ну, што казаць? — паціснула плячамі Лена.— У нас і клуб ёсць, і баян нядаўна набылі, але што мы маем, апрача танцаў? Вось людзі хочуць у драмгуртку займацца. Хутка свой аркестр будзе, а дзе наш рэквізіт, дзе музычныя інструменты?

— Ты мне спярша свайго мастацкага кіраўніка пакажы! — пахмурыўся старшыня.— А то здарыцца такое, што дарма толькі грошы патрацім.

Лена зачырванелася і махнула рукой:

— Яшчэ не ўсё! Пры клубе павінна быць і спартыўная зала. Лыжы, гарнітуры, валейбольная сетка, мячы. Бачыце, колькі нагаварыла!

— Можа, і рэстаран свой адкрыць! — звёў бровы трактарыст Мікола, які дагэтуль маўчаў.— І джаз завесці...

— Джаз — гэта ідэя! — падхапіў старшыня.— Я, дальбог, сам удзельнічаў бы. Першым кларнетам калісьці быў! Даўненька тое дзынкала... А рэстаран нам не патрэбен. Усё ж астатняе, таварышы, абмяркуем як небудзь. Не толькі Зазер'е — наш калгас. І Ніўкі, і Баркі, хоць не вялікія, але вёскі. Там народ таксама культурна жыць хоча...

Разыходзіліся позна, калі ўжо садзілася за лес сонца і з возера пацягнула прыемным халадком. Многія неслі

дадому кнігі. Але не гэта было галоўнае для Лены. Яна зразумела, што з гэтага дня зазерцы ўжо не будуць касавурыцца на яе з-за фіранак. Яны адкрыта выйдуць на вуліцу і шчыра павітаюцца. Яна зразумела, што пераадолен той рубеж, які доўгі час перашкаджаў ёй размахнуцца ў сваёй рабоце, як касцу на лугу, дзе зрэзалі кусціны.

Усё цяпер будзе залежаць галоўным чынам ад таго, як здолее паказаць сябе «новы», наколькі хопіць у яго цярпення і вытрымкі, умення прыладкавацца да звычаяў, да вясковых людзей. Лена ведала, што Анатоль сам каласьці жыў у вёсцы, але ўсё ж непакоілася за яго. Зазер'е — вялікае сяло, тут любяць моцную, валявую натуру. Тут аўтарытэт аднои прабіўной сілай ды моцным горлам не заваюеш: любую сілу скруцяць у барані рог зазерцы, калі яна насуперак дарогі стане. Зазерцы любяць сціпласць, добрасумленнасць. Нават будзь чалавек немаведама ў чым вінаваты, а калі ён скарыўся, папрасіў прабачэння — яму даруюць любую віну, падтрымаюць. Ці не таму працуе Віктар у магазіне, што заўсёды ў час раскайваецца і пускае слёзы? Вось і цяпер ён «раскаяўся», хоць і выскачыў з чытальні злосны.

Калі Лена выйшла разам з Кацяй, ён падышоў моўчкі, вінавата, як пабіты сабака.

— Ты даруй, Леначка, што я тады на ферме... — пачала Каця, але Віктар перапыніў яе.

— Абое апраўдвацца будзем на судзе! — сказаў жартам.— А цяпер бяжы да Волькі і вытры ёй слёзкі. Алесь! — гукнуў ён шафёра.— Пайшлі, зробім па радасці па адной...

Алесь злосна зірнуў на Лену і адрывіста кінуў:

— Пайшлі!

Каця пляснула далонямі.

— Каб вы ўжо атруты якой напіліся, смаўжы! — сказала яна рашуча і пакрочыла за мужам.— Не-е, галубок, не дазволю! Досыць табе ўжо кроў маю піць!..

— Але-эсь,— ціха паклікала Лена.

Ён спыніўся, недаверліва павярнуў назад галаву і паглядзеў на дзяўчыну.

— Клікала?

— Ага. Пакатай мяне на лодцы. Помніш, як мы малыя ездзілі?

Алесь разгублена зірнуў на яе, на Віктара і раптам стукнуў сябе кулаком у грудзі.

— Са мной? І табе цяпер, пасля ўсяго, што пагаварыла, не страшна?



9 Зак. 2733

—Ніколечкі,— усміхнулася Лена. І ўсмешка тая выpашыла многае.

Алесь быў памкнуўся за Віктарам, потым спыніўся.

— Тады вось што, Віктар... — знайшоўшы нарэшце сілы, сказаў Алесь.— Будзь здароў! Кульнеш там за мяне і не памінай ліхам...

Яны стукнуліся кулакамі, нібы шклянкамі, адрэзалі разам «будзь здароў» і разышліся.

І вось Лена засталася з Алесем адзін на адзін. Яна зрабіла гэта не толькі дзеля таго, каб хоць на сёння разлучыць сяброў. Лена адчувала сваю віну перад Алесем, хацела ўпэўніцца, ці сапраўды добры характар у хлопца, ці зразумеў ён — чаму яна так жорстка абышлася з ім?

— Ты пачакай, я хутка,— папрасіла яна Алеся, забегла ў свой пакойчык, надзела жакет і выйшла да возера. Алесь ужо выліваў коўшыкам з лодкі ваду.

— Паедзем так, а то сцямнее,— сказала яна.— Ужо дзесяць гадзін.

— А сцямнее толькі ў адзінаццаць, гэта як піць даць...

— А калі не даць піць — выжывеш? — усміхнулася Лена.

Алесь крыху пачырванеў і не адказаў. Ён зразумеў гэты недвухсэнсоўны намёк. І ўжо калі садзіўся ў лодку, сказаў:

— А пра машыну ты дарэмна... Нікому яе не аддам. Словы на вецер кінула...

— А ты? Не абяцаў больш не піць? Вось гэта — сапраўды словы на вецер...

— Думаеш, мне дужа хочацца гарэлку піць?

— Дык чаму ж вы жлукціце яе?

— Сітуацыя...

— Прычым тут сітуацыя?

— Сумна... Жыць не цікава.

— Вось жа няпраўда! — запярэчыла Лена.— Проста не навучыліся жыць як людзі, нікога не паважаеце...

Алесь успомніў усе свае паводзіны. Як заракаўся піць гарэлку, як няўдала сватаўся і, быццам бы камусьці на злосць, зноў здружыўся з Віктарам. Радасці ад гэтай дружбы не было, хутчэй наадварот. Кожную раніцу ён прачынаўся з думкай парваць хаўрусніцтва, а пад вечар ішоў да Бадзягі, і ўсё паўтаралася спачатку. Чаму ён так рабіў, наперакор сваёй волі і жаданню? Няўжо і праўда «мазгі адпіў», як казала яму Волька? Цяпер вось прыйшлося катацца разам з той, каго не раз крыўдзіў і абра-

жаў. І Лена, як наліха, села на самую карму, тварам проста да яго. Не падняць вачэй, не зірнуць шчыра, адкрыта.

Лена раптам засмяялася:

— Як гэта ў цябе добра выходзіла: па дваццатцы за дарогу — гэта нямнога, а хто прыбядніцца — з таго — трыццаць! — грубым голасам прадэкламавала яна і дадала: — Помніш? І цяпер возіш «квактух»?

— Бывае...

Энергічнымі рухамі ён так разагнаў лодку, што толькі хвалі разляталіся ў бакі. Дубовыя вёслы аж гнуліся ад напору тугой вады.

— Я не вазіла б... — Лена апусціла руку ў ваду, сарвала вялікую белую кветку гарлачыка.— У нядзелю — калі ласка, а ў будні — нізашто! Цяпер жа і сенакос, і жніво падаспела...

Алесь спадылба зірнуў на Лену. Яна пераняла яго позірк цёплай усмешкай, ад якой пацяплела ў грудзях шафёра.

«Што гэта? — думаў ён.— Са мной такога не здаралася нават тады, калі сватаўся. Цяпер ведаю, што ў яе ёсць сваё каханне, а вось сэрца не ўтаймую... Баліць... Кахае...»

— Чаго маўчыш? Павязеш «квактух»? — зноў спытала Лена.

— Няхай чакаюць! — нейк са злосцю раптам выпаліў Алесь.— І каваліху, каб на яе ліха, і Сароку-варону, і астатніх... Пракачу як піць даць!.. Цьфу з гэтым піць! — яшчэ больш нахмурыўся ён і змоўк.

Лена засмяялася. Яна адчувала, што душа ў Алеся чыстая, чалавечая. Гэтай душы патрэбна звычайная падтрымка друга. «Яму б строгую жонку, каб у руках трымала. Хлопец прыгожы, здатны. А характар — мяккі, што той воск!»

— Во што я скажу, Алесь: Віктар табе не таварыш,— проста назіраючы на яго, сказала Лена.

— Гэта праўда,— уздыхнуўшы, згадзіўся Алесь. — Толькі і я... таксама добрая цаца...

— Ты яшчэ акрыяеш, да цябе дзяўчаты прыглядаюцца. Усё думаюць-гадаюць: ісці за такога ці не.

— Няўжо так думаюць? — з наіўным здзіўленнем спытаў Алесь. — Ну, ці нельга за такога, як я, цяпер замуж пайсці?

— Не-е,— пакруціла галавой Лена.— Цяпер — нізашто! Які цяпер ты жаніх?

— Няўжо ніякі? — нібы папярхнуўся Алесь, зноў налягаючы на вёслы.

— Ніякі! — хітравата кіўнула Лена.— Дзяўчаты ж бачаць, як за п'яніцам Каця жыве...

— Я ж не п'яніца...

— Лепш памаўчы. Колькі разоў абяцаў кінуць піць, а ўсё не кідаеш. Эх, Алесь, Алесь. Яшчэ свата́ўся...

— А той, гарадскі? Ты яго дужа чакаеш? Ён не такі просты, як я?

— Ён — просты... Зусім просты,— ухілілася ад прамога адказу Лена.— Чым, напрыклад, чалавек працейшы, тым ён лепшы...

Алесь заўважыў, што Лене вельмі падабаюцца гарлачыкі. Ён увесь час ехаў бліжэй да берага, дзе асабліва многа было гэтых пахучых кветак. Быццам незлічоныя чароды белых гусей услалі прыбярэжную ваду — такімі здаваліся яны здалёк. А ружовы небасхіл падфарбаваў ваду, пазалаціў кусты ракітніку. Такога прыгожага вечара Алесь не бачыў даўно. І ці бачыў калі наогул?

«Паглядзім, што ён за гусь, той яе артыст! — думалася хлопцу.— Калі будзе добры — няхай жывуць, а не — дык я не аддам цябе, Лена, прайдзісвету!..»

Неўзабаве яны вярнуліся назад.

— Ну вось і цудоўна! — сказала Лена, працягваючы на развітанне руку.— Спакойнай ночы... І не крыўдуй на мяне.

— А я не крыўдую! — Алесь махнуў рукой і шчыра пацiснуў малую яе далонь.— Я ведаю — ты пачала націскаць на мяне «з пазіцыі сілы». А, як вядома, гэтая палітыка нікому не прыносіла поспеху! — і калі позірк яго сустрэўся з позіркам дзяўчыны, дадаў: — Эх, і нап'юся ж я сёння! Ад вялікай радасці, Лена. Як піць даць пап'юся! — і шпарка пайшоў у сяло, нават ні разу не азірнуўшыся.

«Ну вось,— думала Лена, зачыняючы за сабою дзверы.— Угаварыла, называецца. Як піць даць...»

* * *

Папера, пушчаная з лёгкай рукі адгароджанага ад навакольнага свету дырэктара, падпісаная інспектарам Дзеравягай, паступова пачала абрастаць рэзалюцыямі. У гэтую непрывабную справу быў уцягнуты нават райком.

І добра, што на сваёй асабістай справе Пятро Жы-

віца якраз зайшоў да сакратара ў той дзень і час, калі, прачытаўшы ўсю «справу Пятра Жывіцы», Аляксей Аляксандравіч Заронак ламаў галаву над тым, якую кару прыдумаць новаяўленаму лавеласу.

— А-а, даражэнькі, дачуўся! — ледзь толькі Пятро ступіў за парог кабінета, як адразу пачуў голас сакратара.— Садзіся тут!

Ці злаваўся Аляксей Аляксандравіч, ці быў у добрым настроі, ён заўсёды называў людзей «даражэнькімі».

— Што — дачуўся, Аляксей Аляксандравіч? — не зразумеў Пятро.— Слухаю...

Заўсёды спакойныя, з лёгкім адценнем зморанасці, добрыя вочы сакратара райкома цяпер гарэлі гневам. Заўсёды бадзёры і энергічны,— хоць і нялёгка чалавеку ў пяцьдзесят год захоўваць юначы задор і жвавасць,— цяпер Аляксей Аляксандравіч быў павольны ў рухах. Ён нават руку падымаў, здавалася, з вялікім намаганнем. Выгляд у яго быў такі, нібы ў чалавека, які соладка спаў, а яго разбудзілі з-за нейкага там глупства.

— Слухаю... Табе — слухаю, а мне, даражэнькі, клопатаў хапае і без інтымных спраў завуча. Вось, чытай! — непрыязна зазначыў сакратар і падсунуў Жывіцу паперу, дзе чорным па беламу значылася, што «праведзенае следства непрыстойных паводзін настаўніка Пятра Жывіцы цалкам пацвердзілі факты, аб якіх паведамлялася ў пісьме дырэктара Зазерскай школы Круцько Івана Савіча...

Даведаўшыся аб тым, што ашуканая і пакінутая ім Волька не атруцілася, а Лена Жураўская «ўчыніла на лузе грамадскі скандал», Жывіца не рассмяяўся. Ён глыбока задумаўся, звёўшы чорныя шырокія бровы.

— Ну што, даражэнькі, будзем рабіць? — парэшце спытаў Аляксей Аляксандравіч, паклаўшы абодва кулакі на стол і ва ўпор пазіраючы на Пятра.

— Сам не ведаю,— паціснуў плячамі,— што з ім трэба рабіць...

— З кім гэта?

— З Іванам Савічам! — Жывіца смела глянуў Аляксею Аляксандравічу ў твар.— У нашым кодэксе, здаецца, ёсць такое права — прыцягваць да крымінальнай адказнасці шантажыстаў і паклёпнікаў... Калі такога права і няма, то для Круцько можна знайсці іншае абвінавачванне! Я сёння хацеў якраз весці размову аб яго непрыстойнай дзейнасці як дырэктара. Але цяпер вы падумаеце, што я загадзя падрыхтаваў контрудар. Адно скажу вам, Аляк-

сей Аляксандравіч, што ў Зазер'і ніхто не труціўся. А калі хто яшчэ можа ўчыніць грамадскі скандал, то гэта будуць Круцько і Дзеравяга!

— Пачакай, пачакай... Нешта ты вельмі цікавае гаворыш,— прамовіў сакратар. Ён жвава адсунуў сваё крэсла, падсеў бліжэй да Жывіцы: — Гавары ўсё, начыстату! Мусіць, усё ж давядзецца ехаць да вас...

— Тым лепш,— усміхнуўся Пятро.— Прысуд знойдзе сапраўднага злачынцу... Там сёння, здаецца, збіраюцца пакараць мяне.

— А ў сяле нічога не здарыцца, што б магло падарваць твой аўтарытэт? Калі ты сапраўды не вінаваты...

— У сяле, апрача канцэрта, якім парадуюць сялян Дзеравяга і Круцько, нічога не здарыцца...

— Тады — на конях!

Праз якую гадзіну яны імчаліся на райкомаўскім «газіку» ў Зазер'е, хоць Аляксей Аляксандравіч ужо мог спакойна адпачываць дома: было каля васьмі гадзін вечара. Аднак тое, што ён пачуў ад Жывіцы, усхвалявала і насцярожыла яго. Можна было паслаць і другіх людзей, нават цэлую камісію, але Заронак ведаў, што ніякія камісіі не заменяць яму ўласных вачэй і вушэй. Чуць і бачыць самому — такі ўжо прынцып у Заронка.

І вось ён едзе за трыццаць кіламетраў, каб прысутнічаць на той камедыі, аб якой гаварыў завуч.

* * *

А на калгасным двары ўжо сапраўды збіраліся людзі. Дзеравяга і Круцько без усялякіх аб'яў дамагліся таго, што сюды самі калгаснікі ішлі з ахвотаю і цікавасцю. «Настаўніка будуць судзіць!» — з вуснаў у вусны перадавалі сенсацыйную навіну жанчыны. Сам старшыня пацвердзіў, што гэта будзе смешны суд. Ён таксама прыйшоў, але ад прэзідыума адмовіўся.

З канторы вынеслі стол, некалькі крэслаў. Дзеравяга і Круцько занялі месца ў цэнтры, а Васіль Цалавальнік, як нязменны сакратар сходаў і пасяджэнняў, прымасціўся збоку.

Здагадвалася аб незвычайным такім зборы і Волька. Яна ўбачыла таго дзіўнага старога з раёна і зразумела, што справа тут будзе датычыць Лены, Пятра і яе. Таму яна загадзя схавалася за спіны сяброўак і старалася не нападацца на вочы дырэктару і Дзеравягу. Краем вуха

Волька чула, што адбывалася там, ля возера, і што гаварыў зазерцам старшыня, і што адказвалі людзі. Цяпер жа ёй стала сорамна, яна адчула сваю віну перад Ленай. І толькі трэба ўявіць, як яна здзівілася, пачуўшы наступнае:

— Та-ва-ры-шы! — раздзельна, пісклявым голасам, нібы выціскаючы з сябе апошнія сілы, ад чаго адразу надуліся на тонкай шыі вены, пачаў Дзеравяга. Было такое ўражанне, што гаварыў ён, па крайняй меры, гадзіны дзве.— Мы, гэта значыць я, інспектар райана, і дырэктар школы Іван э-эм-э...

— Савіч,— ціха падказаў Круцько.

— Савіч! — узняў угору ўказальны палец інспектар.— Дакладна вызначылі наступнае: а — што завуч школы Пятро Жывіца сваімі непрыстойнымі паводзінамі падрывае аўтарытэт савецкага педагога і чалавека наогул, чалавека, які павінен ісці ў светлае заўтра ў першых шарэнгах, без адзінай радзімае плямы праклятага намі і нашымі бацькамі мінулага, без тых перажыткаў, якія таму і называюцца перажыткамі, што перажылі наш век і нас з вамі, таварышы, і яшчэ сям-там сустракаюцца на нашым велічным шляху ў выглядзе, самі ведаеце, розных пнёў і купін, якія трэба руйнаваць, вырываць з карэннем і зразаць іх у гнілой аснове...

Закончыўшы гэтую глыбакадумную тыраду, Дзеравяга задаволена абвёў прысутных цёмнымі шкельцамі акуляраў.

— Аб чым ён? — спытаў, падышоўшы, Алесь у сівога дзядка. Ён дачуўся пра сход і таксама прыбег пацікавіцца. Пачуў толькі апошнія словы.

— Ды зноў пра сухадол, відаць,— адказаў яму стары.— Пні, кажа, трэба рваць ды купіны рэзаць. А дзе ў нас тыя пні, калі не ў Рудачках, на тым сухадоле?

— А-а, вось яно што,— махнуў рукою Алесь і хацеў ужо ісці, як пачуў нешта больш цікавае.

— Бэ,— загнуўшы на левай руцэ яшчэ адзін палец, прадаўжаў інспектар.— Жыхарка вашага сяла, ашуканая гэтым адсталым элементам, чакаючы, самі ведаеце, прыбытку ў хаце, ледзь не выпіла атруту, і такім чынам, ледзь не загубіла сваё маладое жыццё, так патрэбнае і ёй, і яе нашчадкам, і нам з вамі, таварышы! І вэ — яшчэ адна ахвяра. Гэта бібліятэкарка, таксама маладая, нявопытная, ды затое прыгожая, жыццярадасная, спакушаная зноў жа тым нягоднікам...

І толькі ён гэта сказаў, як сярод напружанай цішыні пачуўся залівісты дзявочы смех. Усе адразу павярнулі галовы на той смех і ўбачылі Вольку. Яна чырванела, як наліўны яблык на сонцы і, закрыўшы рот рукою, ніяк не магла суняцца ад смеху.

Раптам твар яе пачаў траціць сваю фарбу. Вочы з блакітных сталі шэрымі, пацямнелі. Энергічна падышоўшы да стала, Волька спынілася насупраць збянтэжанага інспектара і падперла бакі рукамі.

— Дык хто гэта чакаў прыбытку ў хаце і труціўся?! — грозна спытала яна.— Ці не я, тая няшчасная, га? Хіба я падобна на няшчасную ахвяру? Вось я зараз вам абскубу пух на лысіне, дык будзеце ведаць, як паклёп на людзей узводзіць!

І Волька на самай справе ўчапілася Дзеравягу ў валасы, ад чаго той закрычаў казлом. Зазерцы загалёкалі на розныя галасы, яшчэ больш падахвочваючы дзяўчыну. Тлум стаяў такі, што чуваць было аж у другім канцы сяла.

— ...Здаецца, мы прыехалі на самы кірмаш,— паказваючы Пятру сцэну каля стала, сказаў Аляксей Аляксандравіч. Каб не звярнуць на сябе ўвагі, яны спыніліся каля дастаршынёвай хаты і сюды прыйшлі пехатою. Моўчкі далучыўшыся да астатніх, Пятро і сакратар райкома пачалі назіраць за падзеямі зводдаль. Аднак дырэктар школы заўважыў іх і не на жарт захваляваўся. Хоць і па рашэнню райана ўстроілі яны гэтае зборышча — вынесу факты на суд грамадства,— але страх перад адказнасцю за тыя «факты» адняў у дырэктара мову.

«Ч-шорт!.. Уліп, мусіць, я з гэтай гісторыяй... Навошта толькі і звязаўся з ім, Дзеравяга няшчасная! Не мог усё шыта-крыта зрабіць!» — падумаў Круцько, наступаючы інспектару на нагу. Той войкнуў і зноў пачаў адбівацца ад вострага язычка дзяўчыны:

— Ты ж сама гаварыла, што чакаеш! — ківаў ён вузлаватым пальцам на Вольку.— Можаш цяпер прызнацца перад усімі, га?

— Дык я ж чакала Пятра,— схіліўшы галаву і склаўшы на грудзях рукі, цішэй адказала тая.— Адкуль жа мне ведаць, якія думкі былі ў вашай галаве? Пятра я чакала, і ён прыйшоў, дапамог мне з матэматыкай разабрацца... Я ж у інстытут хачу паступіць... Эх вы, Шэрлак Холмс!..

Яна крута павярнулася і пайшла ад стала. Гром апладысментаў праводзіў яе, і разам з калгаснікамі біў у далоні Аляксей Аляксандравіч.

Крудько зноў, яшчэ мацней, наступіў на нагу інспектару. Той аж падскочыў, зірнуў нездагадліва на дырэктара ды са злосцю выпаліў:

— Што ты мне ўсё на ногі лезеш? Там у мяне і так балючыя мазалі!

Дырэктару нічога не засталося, як устаць і, кланяючыся, павітацца з сакратаром.

— Вечар добры, Аляксей Аляксандравіч! — расплыўся ён ва ўсмешцы.— Просім сюды... Вось вам крэсла, Аляксей Аляксандравіч...

Дзеравяга хацеў нешта гаварыць, падняў абедзве рукі ўгору і раскрыў рот, але, пачуўшы гэтыя словы дырэктара, раптам застыў на месцы. Потым страпянуўся, як певень, і такім уладарным вокам зірнуў на прысутных, што здавалася, вось-вось падасць каманду «зважай».

— А-а, прыехалі і вы! — натуральна ажывіўся Дзеравяга.— Я ж казаў — зацікавіцеся! Я ж казаў...

— Ваша праўда, я зацікавіўся! — Аляксей Аляксандравіч, вясёлы і энергічны, стаў прабірацца да стала.— І трэба сказаць — дужа! Растлумачце, калі ласка, што ў вас тут?..

— Зачытайце пратакол! — загадаў Васілю Дзеравяга.

Васіль падняўся і паднёс да воч паперыну.

— Тут вось я запісаў амаль даслоўна тое, што было сказана інспектарам... Праўда, крыху апрацаванае выступленне,— ціха пачаў Васіль і зусім нечакана прадэкламаваў, набіраючы голас: — А — адсталы элемент, завуч безгаловы, адарваў аўтарытэт ад гнілой асновы. Бэ — жахлівая падзея...

Ніхто не пачуў астатніх радкоў гэтага незвычайнага пратакола. Усё патанула ў суцэльным гуле воплескаў і смеху. Трос плячамі і сакратар райкома. Толькі інспектар з дырэктарам не смяяліся: аднаму з іх было не да смеху, а другі яшчэ нічога не зразумеў. Ён зняў акуляры і ўвабраў галаву ў вострыя плечы, нібы хаваючыся ад удару.

— Што тут можа быць за смех? — звярнуўся ён да сакратара райкома, які, схіліўшыся над сталом, праглядаў паперы.

— Спытайце ў дырэктара Івана Савіча,— адказаў той, не ўзнімаючы галавы.

— Ціха! Ціха вы там! — раптам насмялеўшы, Дзеравяга падняў руку ўгору.— Працягваем нашу размову...

— Размовы больш не будзе, таварышы! — звярнуўся да ўсіх Аляксей Аляксандравіч.— Прабачце, даражэнькія,

за непаразуменне, віноўцаў якога, я думаю, мы зпоідзем. А цяпер ідзіце адпачываць, пачытайце лепш цікавую кніжку ў сваёй бібліятэцы, дзе, як я даведаўся з пратакола, працуе маладая, прыгожая, жыццярадасная дзяўчына. Вось і ідзіце да яе. Пратаколам хай займецца ваша самадзейнасць: ён якраз падыдзе для смешных нумароў. А вы,— звярнуўся ён да Дзеравягі і Круцько,— зайдзіце ў кантору. Там і пагутарым...

Людзі разыходзіліся задаволеныя: такіх вясёлых сходаў у іх, бадай, не было ніколі. І не дзіва, што многім захацелася сапраўды прайсціся да возера. Вечар быў прыгожы, цёплы і надзвычай ціхі.

Волька дагнала Васіля і пацягнула яго за рукаў сіняй кашулі:

— Вася, пачакай... Слухай, Вася, што ж мне цяпер рабіць?

Хлопец наморшчыў нос і пакруціў галавою:

— Н-не ведаю, Волька, што б табе хацелася рабіць у такі вечар.

— З Ленай я, дурніца, пасварылася... Абразіла яе ні за што.

— Вось гэта ўжо грэх! — Васіль падхапіў пакорлівую дзяўчыну пад руку і загаварыў: — Волечка, якая яна харошая! Хто з хлопцаў ні зірне на яе — загіне. Вось і я так — глядзеў бы і глядзеў. І нават сваёй грубай рукою не дакрануўся б! Эх, Волечка-а...

— Не тваім носам маліны клявадь, Васіль...

— Гэта праўда...

— Дык чаго ж ты радуешся?

— Што ёсць такія харошыя людзі на зямлі!

— А што ж мне рабіць? — думаючы аб сваім, зноў спытала Волька.— З Пятром я паладжу, раскажу яму ўсе, што выпытваў у мяне той лысы. Пасмяецца і даруе, а вось Лена...

Без усякай на тое патрэбы, яна пачала пераплятаць свае тонкія касічкі. Добрыя быстрыя вочы яе цяпер патухлі. Васілю стала шкада дзяўчыны...

— Падыдзі да яе, пагавары...— параіў ён.

— А ты?

— Я не пайду... Не хачу мазоліць вочы...

Волька махнула на яго рукою і хуценька пайшла да Лены.

Хвалявалася яна дарэмна. Лена сустрэла яе, нібы між

імі ніколі нічога не здаралася. Падышла сама, загаварыла:

— Бачыш? Хутка ўсім кніг не хопіць! Але старшыня абяцаў, што яшчэ купіць. А Жывіца дакляраваў аддаць сваю ўласную бібліятэку...

Лена спахапілася, але ўжо было позна: сказала пры Вольцы лішняе. Тая пачырванела і апусціла галаву. Тады Лена падняла яе галаву за падбародак і глянула ў твар:

— Глядзі людзям заўсёды шчыра ў вочы, Волька!

— Вой, маўчы ты лепш! Мне так сорамна перад табой, што не ведаю, як і апраўдацца... Вой, вой!

— Калі не баліць, то і не войкай,— зазначыла Лена і, узяўшы сяброўку за руку, пацягнула па вуліцу.— А памятаеш, як мы малыя на дзень разоў па пяць сварыліся і мірыліся? Пойдзем да мяне, пагутарым, каб больш так не рабіць, як малыя...

У пакойчыку было ўтульна. Стол ля акна, накрыты цяжкім габеленавым абрусам, драўляны ложак у куце з дзвюма падушкамі пад белым карункавым пакрываллам, новая люстраная шафа ля дзвярэй, два крэслы і белыя як снег фіранкі на вокнах — усё надавала пакою строгі, сціплы выгляд. Адно толькі псавала ўражанне — старая скрынка для посуда, на сцяне побач з печкаю. Лена ўсё збіралася яе выкінуць, але пакуль не было куды дзяваць талеркі ды каструлі.

Так і вісела тая шафа-скрынка, завешаная фіраначкамі...

Волька падышла да стала, зірнула ў акно і, павярнуўшыся, сустрэлася са строгім позіркам Лены...

— Лена...— пачала Волька, ідучы да яе.— Табе тут не страшна адной ноччу?

— Не ведаю,— паціснула тая плячамі.— Ноччу я сплю, а завалы тут моцныя, пастараліся нашы будаўнікі.

— Я нізашто не заснула б! Тут, кажуць, ноччу над возерам здані блукаюць...

Лена засмяялася:

— Вось гэта праўда! Адну здань я аднойчы ледзь чаем адагрэла, а другая ў акно паглядзела і нагаварыла невядома што...

Волька зноў пачырванела. Лена заўважыла, што яна нешта хоча сказаць, але чамусьці ніяк не адважыцца. І яна вырашыла памагчы дзяўчыне. Нібы між іншым заўважыла:

— Калі чалавек сам няшчыры, дык ён і другім не верыць, падазрае, хавае не толькі свае ўчынкі, а і думкі... Гэта дрэнна! Я так думаю: цяжка на душы — падзяліся сваім горам, лягчэй стане. Можа, табе і параяць што... Часам збоку відаць лепш.

— Гэта праўда! — ажывілася Волька.— Сядзем, Лена, я табе нешта такое скажу, што бяда, дый годзе...

Яны селі каля стала. Лена паправіла кветкі ў гладышыку, абарвала некалькі звялых лістоў.

— Ну, гавары...

— Як бы гэта сказаць прасцей... Ашукала я Пятра, падвяла, і цяпер не ведаю, як прасіць прабачэння.

— Як гэта ты яго ашукала? — не зразумела Лена.

— Так, так, я ашукала яго! Я сказала, што паступаю ў політэхнічны інстытут, накупляла падручнікаў і папрасіла памагчы мне падрыхтавацца. Ён добры, ён любому паможа... І хлусіла, што мне вельмі цяжка самой вучыцца... Вось ён і пачаў прыходзіць да мяне. Я думала, што ён прывыкне, пакахае... Што я нарабіла! Столькі непрыемнасцяў яму з-за мяне, а я ж так яго моцна кахаю...

Волька выхапіла з рукава хусцінку і прыклала яе да вачэй.

— Нічога страшнага...— Лена строга зірнула на Вольку.— Ты не кідай сваю вучобу і хадзі да яго...

— Колькі ж можна цягнуць тую вучобу, не вечнасць жа...

— Цягні, пакуль не паступіш у інстытут.

— Да ты што? — спалохалася Волька.— Думаеш, я сапраўды магу паступіць?

— Чаму ж не? Пятро зразумее, што ты напорыстая, што вучылася не толькі дзеля яго, і пакахае! От пабачыш!..

— Каб гэта ды праўда! — у шчырым захапленні ўсклікнула Волька.— Я б кожную вольную хвіліначку за кнігай сядзела...

А пасля, калі ў чытальнай зале нікога не засталося, Лена правяла сяброўку да дарогі, вярнулася ў свой пакойчык і падумала: «Значыць, ён прыходзіў да Волькі дапамагчы ёй у вучобе! Відаць, яна моцна любіць Пятра, а ён, можа, і не...»

Яна злавіла сябе на гэтай думцы і дакорліва паківала галавою. Узяла люстэрка і, гледзячы на свой бледны твар, прамовіла:

— Ай, Лена, Лена, як табе не сорамна! У цябе ж свой

жаніх ёсць. Хутка прыедзе... Прыедзе? А калі не? Так і засохнуць дарэмна мае мары...

Ёй успомніліся словы адной сяброўкі, якая нізашто не хацела ехаць у вёску працаваць: «У сяле нават замуж выйсці — праблема... Хлопцы як падрастуць, у армію адразу. А з арміі кожны ў горад пнецца, сяло ўжо яму, бач, не падыходзіць. А нам што, дзяўчатам, у сяле адным рабіць? Не паеду я туды...»

І дабілася, каб накіравалі ў абласны цэнтр.

Усё гэта Лена па-сапраўднаму ацаніла толькі цяпер. Нават у Зазер'і дзяўчат непараўнаўча больш, чым хлопцаў. І такой дзяўчыне, як тая яе сяброўка, цяжка было б тут знайсці сабе жаніха. А колькі хлопцаў з Зазер'я, механікаў розных ды інжынераў, пажаніліся ў гарадах ды жывуць там! Гэта несправядліва, шкодна для сяла...

«Трэба ў сёлах ствараць такія ўмовы для жыцця, каб кожны, дзе б ён ні быў часова, дадому хацеў,— падумала яна, рассцілаючы ложак.— І не толькі матэрыяльна зацікавіць... Трэба, каб кожны тут, у сяле, знайшоў сабе працу па спецыяльнасці. Старшыня казаў, што яму ўжо не шкодзіла б свайго інжынера-будаўніка мець, інжынера-механіка... Расце трактарны і машынны парк! А калі яшчэ сцэна ажыве, тэлебачанне прыйдзе! Вялікая бітва за культуру сяла пачалася правільна... Трэба толькі на месцах умела паставіць справу...»

Гэтыя не новыя думкі мелі для Лены асаблівы сэнс: яна, можна сказаць, не толькі думала пра новую вёску, яна бачыла яе ў сваіх марах летуценных, у снах дзявочых.

І Лена імкнулася зрабіць усё магчымае, каб яе роднае Зазер'е стала сялом вялікай культуры. Дзеля такой задумы варта недаспаць, варта паспрачацца! Ды не так ужо і цяжка цяпер ёй працаваць: моладзь у сяле дружная, усе маюць сярэднюю адукацыю. Калі яшчэ сустракаюцца вылюдкі накшталт Віктара ды Алеся, то гэта ўжо не вялікая бяда. Самі аднавяскоўцы іх паставяць на месца...

* * *

Больш тыдня Алесь працаваў на трактары: такое пакаранне прыдумаў яму старшыня. І ўсё ж, нарэшце, зміласцяваўся, зноў даў яму трохтонку.

— Глядзі, блазнота! Яшчэ раз нап'ешся гэтай гары — праганю і з трактара! — пагразіў ён кулаком.— І каб спекулянтаў не вазіў...

— Ды ну іх...— махнуў рукою Алесь. І цыркнуў праз зубы на зямлю.— Квактух больш не павязу. Як ніць даць! Ды не стрымаўся...

Кожную сераду, пятніцу і нядзелю да Алеся ў хату прыбягалі зазерскія хлапчукі, каб даведацца, ці паедзе ён у раён і калі. Так павялося здаўна. Каб ніхто не бачыў, ён падбіраў квактух за сялом, дзе абапал дарогі рос густы хмызняк.

Так здарылася і ў гэтую пятніцу...

З акна сваёй хаты Алесь налічыў ужо каля дзесяці жанчын і, як заўсёды, быў задаволены: будзе добры магарыч! Каго баяцца?

Адно толькі крыху непакоіла — Лена. Перад ёю ён вінаваты. Абяцаў жа больш не вазіць, а возіць! Калі дазнаецца — больш ніколі не паверыць.

Зыблюк часта лавіў сябе на думцы, што возіць жанчын ён выключна дзеля таго, каб быў лішні рубель у кішэні, за які потым можна будзе з Віктарам выпіць. Не аднаму, а іменна — з Віктарам! Выпіць без Віктара для яго не мела ніякага сэнсу. Без Віктара ён, напэўна, і не панюхаў бы гарэлкі. Уся бяда ў тым і была, што яны часта сустракаюцца. А сыдуцца, і нібы чорт за язык пацягне: «Адну на дваіх? Давай!»

І клаў на прылавак Алесь сваю выручку ад чарговай паездкі, і зноў яны напіваліся. Дык ці варта дзеля гэтага парушаць абяцанне? Нап'ешся, накурышся папярос, а раніцою да таго брыдка, хоць воўкам вый. Галава цяжкая...

Разважаючы такім чынам, Алесь падышоў да сваёй машыны, моўчкі, у душы, прывітаўся з ёю. Завёў матор, паехаў. Спыніўся каля канторы, узяў у Васіля пуцёўку і выехаў на дарогу.

Хутка і хмызняк. Там ужо бялеюць між зелені хусткі. «А цяпер жа і сена, і жніво падперла! — успомніў ён словы Лены.— Дам газ — і будзьце здаровы, кабеты...» — нарэшце вырашыў Алесь.

Але задума гэтая не доўга цешыла хлопца, не доўга мела сваю сілу. Убачыў Ліду, Сароку-варону, адразу выключыў хуткасць. А нага сама націснула на тормаз...

— Хутчэй, хутчэй, квактухі! — прывычна скамандаваў жанчынам.

Але тыя свае абавязкі ведалі добра. Як патрэніраваная пажарная каманда, яны мігам разгнездзіліся ў кузаве, кожная ля свайго паўнюткага каша ці клунка.

— Паехалі! — гучна і неяк асабліва ўрачыста ўсклікнула кавалiха Зося.

Машына рванулася з месца, нібы прышпораны конь. Але седакі, прывыкшыя да такой язды, нават не зварухнуліся.

У кабіне Алесю было душна. Непакоіла адна неадступная думка: «Які ты цяпер жаніх? Дзяўчаты ж бачаць, як за п'яніцам Каця жыве...» Значыць, людзі называюць яго п'яніцам, хоць сам ён у душы не згаджаўся з такім бязлітасным прысудам, смяяўся над ім. П'яніца, вядома, чалавек кончаны, лішні і непатрэбны ў нашым грамадстве. Чаму ж яму, Алесю, быць гэткім, калі яшчэ ўсё жыццё наперадзе? Дык навошта ж радавацца той драбязе, што збярэ ён з зазерскіх кабет? Чаму ў яго не стае сілы раз і назаўсёды расквітацца з гэтай слабасцю натуры? Няўжо ён проста хапуга? Хапуга, адзін з тых, пра каго пішуць у фельетонах, высмейваюць... Ці сапраўды... п'яніца?!

Алесь выцер з ілба рукавом пот і высунуўся, каб асвяжыцца. Гэта яму ўдалося, а вось думкі не выдзьмула ветрам. Яны толькі спыніліся на слове «п'яніца» і, нібы тая сапсаваная пласцінка, бясконца паўтараюць яго, назойліва, упарта. І не ўцячы яму ад сваёй думкі нават на чацвёртай хуткасці...

Вось наперадзе вымытая дажджамі каляіна. Тут хутка не паедзеш. Алесь зменшыў імклівы бег машыны і паволі наехаў левым колам у яміну. Матор заглух. Алесь уключыў стартэр і рыўком тузануў машыну. Ад раптоўнай перагрузкі матор зноў заглух.

— Заселі! — адчыніўшы дзверы, крыкнуў Алесь.— Трэба трохі падштурхнуць! Вылазьце, а то прастаім да вечара як піць даць!

Жанчыны нехаця пачалі перакульвацца цераз борт. І пакуль яны хадзілі па галлё ды падтыкалі яго пад колы, Алесь выйшаў на прыдарожны мурог, сеў і закурыў. Калі б цяпер хоць адна з жанчын зірнула на яго, дык яна заўважыла б вясёлы, крыху насмешлівы твар і хітрыя газэзлівыя вочы. «Я вас сёння, здаецца, падвязу! Век не паедзеце, квактухі!..» — думаў Алесь, сам здзіўляючыся, як гэта будзе ўсё ясна і проста, калі ён возьме ды пакіне тут жанчын з іх кашамі і клункамі. Трэба толькі не падаць выгляду, не засмяяцца. Няхай зразумеюць, што гэта не жарт, а сур'ёзнае рашэнне, да якога не так лёгка было прыйсці, а яшчэ цяжэй — адважыцца...

Сплюнуўшы папяросу, Алесь хутка ўскочыў на сядзен-

пе, моцна ляпнуў дзверцамі. Потым зноў адчыніў іх і сказаў:

— У каго там яйкі ці што такое — здыміце, а то яечня будзе.

Грамавога голасу і ўпэўненага рашучага твару было дастаткова, каб кузаў у момант апусцеў. Толькі два кашы, абвязаныя старымі хусткамі, заставаліся там.

— Чые кашы? — спытаў ён.

— Мае! — выставіўшы поўныя грудзі, усміхнулася Ліда.— А што? Перашкаджаюць?

— Што ў іх?

— Пеўні...

— Леташнія ці сёлетнія?

— Леташнія.

— Дык ты не ведаеш, што ад перапуду старыя пеўні могуць здохнуць? — паківаў галавою Алесь.

— Ды ну? Вось ліха!

Ліда, хоць і тоўстая, але вёрткая дзяўчына. Нібы адлітая з гумы. А шчокі, як пафарбаваныя, аж гараць. Скочыла па зямлю з кашамі, усміхнулася шафёру:

— Дзякуй за параду...

— Трымай на здароўе! А цяпер крыху падпіхніце... Толькі дружна!

Алесь зачыніў дзверцы. Машына загула. Вось яна тузанулася раз, потым — другі... Потым — яшчэ раз! Матор весела загуў, і пад моцны тлум жанчын, трохтонка паволі пакацілася ўперад, на роўную дарогу, штораз набіраючы хуткасць...

Спачатку жанчыны знямела глядзелі на зялёны борт, яшчэ на нешта спадзеючыся, а потым, калі гэты борт быў ледзь бачны, загаманілі разам, гучна, са злосцю.

— У-у, злыдзень тоўсты, каб ты лопнуў! — пагразіўшы кулаком наўздагон, вылаялася Зося.— Чула маё сэрца, што нездарма ён сказаў кашы зняць. Ой, чула!..

— А мяне як падвёў... Пеўні здохнуць! Ха-ха-ха! — залілася задорным смехам Ліда.— Паверыла ж, дурніца! І дзе ў мяне тады мазгі былі...

Яна не бедавала. Дужая, вясёлая, энергічная, падхапіла сваю ношу ды падалася назад, у сяло.

Самая кволая сярод квактух, бледнатварая Хрысця, зірнула на свае клункі і спалохана спытала:

— Колькі ж мы ад'ехалі, га?

— Кіламетраў з дзесяць... А то і пятнаццаць,— сказала ёй Зося, і Хрысця, здавалася, яшчэ паменшала ад гэтых

слоў. Яна падышла да клункаў, падняла іх і паставіла зноў.

— Не данясу,— пачуўся яе слабы голас.— Буду чакаць падарожнай машыны...

— От жа!.. І якая муха, які авадзень укусіў яго так, што аж зазыкаваў? З глузду ён з'ехаў, ці што? — уставіла немаладая жанчына з чырвоным як бурак носам, адзінокая і скваппая Аўгіння, якая замест грошай кожную суботу расплачвалася з Алесем паўлітэркай добрага першаку і пры гэтым кожны раз бажылася: «...дальбог, не сама гнала. Пазычыла ў добрых людзей».

Колькі яны ні вохкалі, а ісці трэба.

І вось незвычайная працэсія — дзесятак жанчын з кашамі, вёдрамі і клункамі — паволі рушыла назад, праклінаючы звар'яцелага шафёра, які ўпершыню ашукаў іх...

— Я-то знаю, які авадзень укусіў нашага Алеся! Знаю! — хітра страляючы ў жанчын сваімі вочкамі, Зося шапнула штосьці Лідзе. Тая аж спынілася і паставіла на зямлю свае кашы.

— Ды ну? Ды не можа быць!.. Ды ён жа сам смяяўся з яе, калі быў у мяне...— развяла яна рукамі, яшчэ з дзесятак успомніўшы розных «ды».

— Кажу — яе навука! — стаяла на сваім Зося.— Пачакай, галубіца, яна яшчэ не адно ліха нам падсуне. Пачакай!..

— А калі я... ёй падсуну ліха? Чула — хутка жанішок прыкоціць! Гарадскія яны порсткія! Ха-ха-ха!..

Смех у Ліды задорны, свавольны, як яна сама.

З гэтых слоў жанчыны зразумелі, што гаворка ішла пра Лену. І ўсе, як адна, пагадзіліся на тым, што авадзень, які ўкусіў Алеся, была гэтая «інцілягенцыя», якой толькі тых і спраў, каб «пасаліць» па зайздрасці тым, хто шукае «сваю капейку» не ў калгасных працаднях.

Гадзіны праз тры пасля гэтага здарэння ў Зазер'і пазіралі незвычайнае відовішча: з лесу, ледзь перастаўляючы ногі, адна за адной цягнуліся стомленыя жанчыны. Выгляд іх быў далёка не кірмашовы: з галоў паз'язджалі хусткі, валасы раскалмаціліся...

Добра пасмяяліся зазерцы з таго Алесевага жарту. Гаварылі, як заўсёды, з'едліва, з тым гумарам, ад якога хутчэй заплачаш, чым засмяешся, з новымі падрабязнасцямі, якіх у сапраўднасці ніколі не было, але якія куды цікавейшыя і больш калючыя.

А каваль, якога жонка ніколі не баялася і не слухала,

добра не падумаўшы, пачаў папракаць і смяяцца з яе. І застаўся без полудня. Ледзь сам справіўся выскачыць з хаты. Вялізны, дужы, што мядзведзь, ён ужо не раз збягаў гэтак ад раз'юшанай Зосі да суседзяў. І як смешна ім было слухаць яго скаргі на цяжкі характар жонкі і свой горкі лёс, на тое, што кіпцюры ў Зосі, як у рысі...

Дазналася пра Алесеў учынак і Лена. Яна радавалася гэтаму ад душы і верыла, што прыйдзе час і Алесь стане добрым хлопцам, якіх нямала ў Зазер'і.

* * *

Міналі дні, поўныя хвалюючага чакання. Ад Анатоля ліста ўсё не было.

Увесь гэты час Лена не сядзела без справы. З дапамогай Пятра яна правяла два вечары любімай кнігі. На адным вечары зазерцы былі суддзямі рамана вядомага сталічнага аўтара, які быў сярод іх, слухаў заўвагі, дзяліўся сваімі думкамі. Гэта быў незабыўны вечар...

Памог Пятро і пры падборы артыстаў для драматычнага і харавога гурткоў, а кіраваць гэтымі гурткамі, як выявілася, не было каму. Паспрабавала Лена сама расставіць харыстаў — зацягнулі «Рэчаньку», засмяяліся. Нічога не выйшла: хто ў лес, хто па дровы.

І зноў узяліся круціць кіно ды танцаваць...

«Ці прыедзе Толя? Чаму ён нічога не піша? Няўжо так хутка забыўся?»

Пра Анатоля думалася штодня. Асабліва цёплымі летнімі вечарамі, калі шчаслівая моладзь разыходзілася з клуба дадому, калі ледзь віднеліся на ўзгорку каля сяла апошнія пары, а яна заставалася на клубным ганку зусім адна...

І часта — ой, як часта! — сніўся ёй кучаравы Анатоль! Не раз прачыналася Лена з адчуваннем гарачых пацалункаў на вуснах. Неаднойчы, бывала, у бясконцых марах-летуценнях да рання не заплюшчвала вачэй. Смуткавала. Ды ніхто не бачыў яе дзявочага смутку, ніхто не чуў тужлівых уздыхаў. На людзях яна трымалася бадзёра, хоць надзею на прыезд Анатоля траціла з кожным днём усё больш і больш...

Ды людзей не ашукаеш, не прыкінешся вясёлай штодня...

Неяк раніцай Лена забегла на пошту. Там, як заўсёды ў такі час, быў Алесь. Яны сустрэліся на ганку. Ён нёс да

машыны нейкую скрыпку. Зірнуў на Лену хмурна, нават не прывітаўся, толькі саступіў з дарогі.

Лена спыніла хлопца.

— Чаго гэта ты, Алесь, воўкам глядзіш? — усміхнулася, схіліўшы набок галаву.— Ці не выспаўся добра, ці пераспаў трохі?

Выгляд у яго, сапраўды, быў як у вераб'я пасля добрай бойкі — надзьмуты.

— Хочаш — скажу...

— Гавары.

— А крыўдзіцца пасля не будзеш?

— Не.

Алесь паклаў скрыпку на ганак і дастаў з кішэні маленькае люстэрка:

— Зірні на сябе.

— А што? — зірнуўшы ў люстэрка, насцярожылася: не зразумела нічога.

— Не пазнаць цябе — вось што! — Алесь уздыхнуў, забраў люстэрка назад і падняў скрыпку.— У сухоты загоніць цябе твой артыст... Эх, Лена!..

І шпарка пайшоў да машыны. Лена прыкмеціла: вялікі смутак адбіўся на яго твары. Ёй стала сорамна за сябе, за сваё недарэчнае чаканне, за тое, што пакахала яна на сваю бяду.

«Не пазнаць... Калі заўважыў Алесь, то, напэўна, бачаць і другія, як схуднела... Што ж гэта я зусім раскісла? Так, сапраўды, і да сухотаў недалёка. І чаму гэта я ўзяла сабе ў галаву, што Анатоль абавязкова павінен прыехаць? За гэты час ён мог пакахаць другую. А можа, у яго даўно была свая, сэрцу любая дзяўчына, а я так сабе...»

Думкі, думкі, думкі...

Як бы яно ні было, Лена вырашыла, што называецца, узяць сябе ў рукі.

Далей так нельга: хутка ўсе стануць пальцамі на яе паказваць...

Пошта была ў праўленні калгаса. Раней Лена здзіўлялася, што кожны раз, калі яна сюды прыходзіла, нязменна ківаў ёй праз акно залацістым чубам Васіль. «Няўжо яму цэлымі днямі няма чаго рабіць?» — думала яна тады. Цяпер зразумела, што ён, мусіць, ведаў, чаго яна сюды ходзіць, і сачыў за ёю — ці атрымала ліст.

Лена перастала сюды хадзіць, пазбягала выпадковых сустрэч з Коранем, які таксама цікавіўся, ці хутка прыедзе той мастацкі кіраўнік.

Аднойчы Лепа сказала яму:

— Відаць, баіцца, што мала грошай тут заробіць, вось і не едзе!

Сказала жартам, але падумала сур'ёзна. І перастала чакаць зусім...

Толькі дарэмна.

Сустрэць гэтага чалавека першаму выпала Алесю. Было гэта неяк пад выхадны дзень...

Пагрузіўшы ў спецыяльную скрыню свежы хлеб для сваёй крамы, Алесь выехаў на зазерскую дарогу. Дзень стаяў гарачы. Шчодра прыпякала сонца. Ненадоўга знікаючы за белыя воблакі, яно нібы гуляла з зямлёй у хованкі. На выгане, што быў недалёка ад райцэнтра, нязменна пасвіліся сытыя коні. Іх Алесь бачыў тут штодня. Цяпер яму здавалася, што гэта вялізная карціна, намаляваная на сінім палотнішчы неба. Алесь успомніў, як у маленстве любіў сесці на добрага рысака ды прамчаць наўскач па сяле, усім людзям на дзіва.

Многа тады ў іхнім калгасе было коней. А цяпер, напэўна, не больш трох дзесяткаў. Затое амаль столькі ж аўтамашын і трактараў... «Няўжо так і звядуцца на зямлі коні, няўжо іх з'ядуць сталёвыя машыны?» — журботна падумалася хлопцу.

Думкі перарваў высокі хлопец з прыгожымі кучаравымі валасамі, якія роўнымі хвалямі ляжалі на высока ўзнятай галаве. Ён бадзёра крочыў па абочыне з лёгкім чамаданам у правай руцэ. Цераз плячо быў перакінуты шэры пінжачок. Сіняя шоўкавая тэніска трапяталася на ветры.

Не ведае сам Алесь, чаму затармазіў, чаму зазірнуў, высунуўшы галаву з кабіны, невядомаму ў твар. Спытаў, усміхаючыся:

— Далёка тупаць? Мо падвязу...

Хлопец прыжмурыўся ў адказ, правёў рукою па валасах.

— А сам куды едзеш?

— Адсюль не відаць.

— А я...— Хлопец прыемна ўсміхнуўся, паказаў рукою наперад.— Шукаю сваё шчасце... Недзе ёсць сяло Зазер'е. Там, кажуць, ёсць каля возера добры клуб. А ў клубе жыве жар-птушка. Хачу злавіць яе, і калі не ўдасца ўтрымаць усю, вырваць, хоць крылца, хоць пярынку...

«Ён!» — Алесь мігам выскачыў з кабіны, схапіў у разгубленага хлопца чамадан,

— Прашу! — паказаў на кабіну.— Дастаўлю да самай жар-птушкі. Я — з Зазер'я...

— Вось гэта супадзенне! — усклікнуў незнаёмы, спрытна ўскочыўшы на падножку.— Скажы, мілы, многа такіх Іванаў-царэвічаў туды вазіў?

— Першага...

— Тады ўсе пакуты і радасці дастануцца мне! — засмяяўся, паказаўшы два рады белых зубоў.

— Ды ўжо ж...

Алесь раптам засумаваў. А новенькі сыпаў без перадыху:

— Мне прапанавалі ў горадзе пасаду кіраўніка мастацкай часткі пры Палацы культуры! Адмовіўся ў карысць перыферыі. Прытым, прызнацца, у сяле я адпачываю і душою, і фізічна. Перспектыва звіць сямейнае гняздо таксама садзейнічала рашэнню пакінуць шумлівую сталіцу, сохнуць без талентаў,— ціхім манатонным голасам, быццам які нудны дакладчык, гаварыў Анатоль Ліхавец, не зводзячы позірку з Алесевага каменнага твару.

«Няўжо ў той сталіцы ўсе так гавораць? Гэта, відаць, ад таго, што праз меру чытаюць газеты...— са злосцю думаў Алесь.— Перспектыва... садзейнічала рашэнню. Чаму не сказаць прасцей, па-нашаму: кахаю Лену, не магу без яе — вось і еду».

Першыя хвіліны радасці за Лену, якая — ведаў Алесь — дужа чакала Анатоля, змяніліся злосцю на дзяўчыну. Знайшла каго пакахаць! Фігляр нейкі, пустальга...

Ён ужо шкадаваў, што спыніўся на дарозе. І калі ў думках, бывала, не раз хлопец пагаджаўся са сваім становішчам «адстаўнога жаніха», то цяпер невядомае пачуццё рэўнасці ўскалыхнула душу, падняло буру пратэсту. Ды хіба ён, Алесь Зыблюк, горшы за гэтага вышчараку? Пакруціў бы дзянёк вось так баранку ці паглытаў пылу на трактары — паглядзелі б тады на яго! Адпала б ахвота і зубы выскаляць...

— Значыць, вырашылі загубіць свой талент у глухім кутку,— асцярожна пачаў Алесь спачувальным тонам.— Шкада...

— Мастацтва патрабуе ахвяр! — мігам выпаліў завучанае Анатоль, не перастаючы ўсміхацца.— Буду шчыры: мэтазгоднасць такога кроку прадыктавана яшчэ і складанасцю абставін, у якія іншы раз трапляюць нават геніі...

«Проста заблытаўся ў якой-небудзь непрывабнай гі-

сторыі і застаўся без грошай»,— вырашыў у думках Зыблюк.

Сказаў з хітрынкай у голасе:

— Бывае, асабліва з маладымі!..

— Хіцёр хлопец! Бач куды мазгой дапяў...

— Не лыкам шыты...

— Ну, а Лену ты добра, відаць, ведаеш? — раптам крута спытаў Анатоль.

— Чаму ж не! Свая дзяўчына, вясковая...

— Дзяўчына вясковая! Чайная ружа вырасла сярод дзядоўніку! Ці не праўда?

— Вырасла сярод руж...

— Цікава. Як яна там? Амурыць?

«Амурыць... Думае, што, я не зразумею. Прыжмурыўся і ўсміхаецца... Абмежаваны, відаць, чалавек...» — падумаў Алесь і, не зводзячы з дарогі позірку, адказаў:

— Калі ружу зрываюць, яна вяне... А Лена цвіце! Бо ёю толькі любуюцца. Жыве, не сумуе...

— Бач ты! Цікава! — усклікнуў Анатоль і змоўк. Потым ціха-ціха заспяваў «Зорку Венеру».

Алесь заслухаўся, і ў яго паволі адлягло на сэрцы: да чаго чароўную сілу мае добрая песня!

Пастунова голас спевака мацнеў, узлятаў усё вышай, вышай. І звінеў задорны тэнар, плылі ўслед за ім лагодныя мары.

Алесю ўявілася ціхая яркая ноч. Зіхаціць на небасхіле амаль блакітная зорка Венера. З-за белай хмурынкі выплывае месяц-поўня. На ўзгорку, асветленыя дзіўным ззяннем, схіліўшы галовы, стаяць двое. Хвалюючае спатканне. Трапяткія сэрцы...

— Ух ты, чорт! Здорава...— сказаў Алесь, калі Анатоль змоўк.— Дык вось чым ты прываражыў нашу Лену!

— Дзівак! — усё гэтак жа ненатуральна ўсміхнуўся Анатоль.— Можам і не гэткае...

Зноў засумаваў Алесь, забалела хлапечае сэрца. Каго ён вязе, навошта? На пагібель сваю. Апошнія надзеі рухнулі. І ніхто не дапаможа цяпер, ніхто не дарадзіць. Не адумаецца Лена, не пакахае яго: позна!

Імчыць па дарозе машына, сумуе шафёр. Абапал залатым абрусам жаўцее збажына, даспявае. Хутка жніво, а там і восень. Зазвіняць галасістым гармонікам, прагрукочуць бубнамі ды стукам капытоў шумлівыя вясковыя вяселлі. Толькі ён, Алесь Зыблюк, будзе сумаваць, як цяпер, глыбока ў душы затаіўшы сваё каханне...

Гудзе сталёвае сэрца матора, дрыжыць.

— Не гані! — чуецца чужы далёкі голас.— Збаў на павароце!

Налева хвоя, направа таксама хвоя. Рэзка крутнуў баранку — тр-ррах! Грукнуў кузаў па хвоі, трэснулі дошкі. Скрыгатнулі тармазы. Пярэднія колы паволі спаўзлі ў прыдарожную канаву...

— Ч-шорт! Пракаціў! Ці не п'яны? Яшчэ момант і... прывёз бы Лене мой малады прыгожы труп!

«Ідыёт... Яшчэ жартуе! — Алесь адчыніў кабіну, скочыў на зямлю.— Добра, што кузавам, а не крылом. Быў бы табе труп...»

— Не разлічыў... Задумаўся...

— Даўно пара адвыкнуць думаць! Не маладзенькі ўжо...

Алесь адламаў пашчапаныя дошкі, адкінуў прэч. Паехаў паволі, каб не скінулася скрыня з хлебам. І так невядома яшчэ — што прывязе на месца: хлеб ці бліны...

І дзівіліся зазерцы, кідалі ўслед:

— Даездзіўся, п'янчуга...

Алесь чуў гэтыя словы і да болю ў руках сціскаў баранку. Каля будынка праўлення стаялі брыгадзір, Пятро Жывіца, старшыня і Лена. Яны здзіўлена, моўчкі глядзелі на Алесеву машыну, чакалі.

«Ну і няхай глядзяць, няхай лае старшыня, няхай адбірае машыну! Напляваць...» Першы да машыны падбег старшыня.

— Дыхні, паразіт! — кінуў ён шафёру.

Той, не спяшаючыся, адчыніў дзверцы, стаў насупраць:

— Не браў ні слязінкі...— і дыхнуў. Не дыхнуў — уздыхнуў, цяжка, самотна.— Вось, знаёмцеся, артыста прывёз...

Анатоль выйшаў з-за машыны. Лена, убачыўшы яго, збянтэжылася, разгубілася, збялела і ціха сказала:

— Толя... Прыехаў!

І адразу заружавела, ажыла. Паліліся чырванню вушы. Кінулася да хлопца, пацалавала пры ўсіх.

Старшыня звёў густыя светлыя бровы, злосна кінуў Алесю:

— Адвязі хлеб і гані машыну да майстэрні! Няма чаго табе тут вочы мазоліць.

Ехаў Алесь да майстэрні, думаў: «Адрамантую за свае грошы! Сам вінаваты...»

* * *

Надзеі, здзяйсненні...

Многае перадумала Лена з таго часу, як прыехаў Анатоль. Кожную раніцу яна прачыналася са светлай радасцю: «Прыехаў! Значыць, кахае...» І ад гэтай думкі настрой не мяняўся цэлы дзень. Добры, вясёлы. Розныя дробязі больш не хвалявалі яе, не псавалі настрою...

Ліхавец па просьбе Лены часова пасяліўся ў Вольскі. Два-тры дні ён знаёміўся з сялом, з людзьмі. Прыглядаўся да кожнага чалавека, як бы мяркуючы, чаго варты той ці іншы зазерац. Вечарамі ён прыходзіў у клуб, іграў на баяне і ўсё прыглядаўся. А потым, развітаўшыся з Ленай каля яе пакойчыка, ішоў у сяло.

«Сумуе... Мусіць, яму тут не спадабалася. Ці я не вельмі ўважліва да яго...» — разважала Лена пасля. Разважала і чакала новага дня, новай сустрэчы...

Так было і на гэты раз. Чакала Анатоля, а першы прыйшоў Пятро. Ён, здавалася, быў вельмі ўзрушаны, але, як заўсёды, стрыманы і маўклівы. Такі ён не падабаўся Лене.

Прывітаўшыся, Пятро доўга і засяроджана разглядаў новы нумар «Вожыка». Лена, чакаючы, пакуль ён нарэшце загаворыць, займалася сваёй звычайнай справай: наводзіла парадак у чытальні, на паліцах. Яна не любіла першай пачынаць гаворку.

— Аказваецца, таварыш Ліхавец — артыст! — зусім не адпавядаючым настрою голасам нарэшце прамовіў Пятро і, устаўшы з-за стала, падышоў да Лены. Яна раскладвала на сваім стале кнігі-навінкі.

Пятро быў у палатняных белых штанах і светлай тэнісцы. Лена бачыла яго адкрытыя загарэлыя рукі і здзіўлялася: так загарэць можна было толькі на поўдні. «Гэта, відаць, ад таго, што на вадзе загарае, у чоўне...» — падумала яна.

Расклала кнігі, прайшлася між сталамі і, сеўшы на крэсла, узяла ў рукі газету. «Чаму прыйшоў ён, а не Анатоль?» — непакоіла думка, а спытала другое:

— Дык чаму Анатоль — артыст? Што ён там, у сяле, такое паказваў ці дэкламаваў?

— Ён спяваў...

— І што ён спяваў?

— «Зорку Венеру»...

— Ну і як слухачы... спадабалася ім?

— Яшчэ як! Ліда ў вас такая ёсць... Дык яна аж праслязілася, дзівачка. Добрыя воплескі сарваў! А пасля сыграў на трубе ды без трубы. Пацеха! Таленавіты, чорт...

Гутарка не клеілася: Лена думала сваё, Пятро — сваё. Ён моўчкі назіраў за дзяўчынай. Па сутнасці, яму не абавязкова было што-небудзь дадаваць да сказанага, бо Лене, вядома, гэта не навіна. Яна ведае здольнасці Анатоля больш за яго, за ўсіх... Ён жа сёння прыйшоў, каб сказаць зусім не тое, з чаго пачаў. Трэба было не хваліць Анатоля, а зусім наадварот: яго паводзіны Пятру не падабаюцца. Але з чаго пачаць гаворку? Можа, няхай усё так і застаецца? Але ж гэта было б злачынствам...

Лена адчувала, што Пятро павінен ёй сказаць нешта важнае. А што? Ці не кахае ён яе? Лена ведала, што ў гэты самы час, можа, нізка схіліўшыся над кнігай, цярпліва чакае сваё каханне Волька. Чаму ён не пайшоў да яе? І ці толькі дзеля таго, каб дапамагчы ў вучобе, ён хадзіў не адзін дзень і месяц? Тут штосьці не так...

Лена ўважліва паглядзела на разгубленага настаўніка. Ён маўчаў, зачараваны яе позіркам, чакаў яе слоў. І яна сказала:

— Чаму вы без Волькі?

— Таму, што з вамі...

— А ці добра гэта?

— Думаю, не блага... Я пачакаю Вольку тут.

Тады Лена рэзка змяніла гутарку.

— Ці хутка перасяляць Круцько?

Ён незадаволена насупіўся, адказаў ціпэй:

— Сяліба пайшла пад калгаснае поле, як і было раней. Тых паўгектара для школы хопіць...— І, памаўчаўшы, дадаў: — Сёння дырэктара выклікалі ў райком...

— На бюро?

— Не ведаю.

І зноў настала цяжкая цішыня. Лена баялася гэтай цішыні. Яна не магла аваладаць сабою, не магла падняць вачэй і гаварыць з Пятром гэтак жа лёгка і проста, як яна гаварыла з ім тады, у дождж...

«Хоць бы хутчэй прыйшоў Анатоль!» — у каторы раз падумала яна.

Як бы ў адказ на яе думку, у калідоры пачуліся таропкія крокі, і неўзабаве ў дзвярах з'явіўся Васіль.

У адной руцэ ён трымаў кнігу, а ў другой — вялікі букет руж.

Васіль заўважыў Пятра і пачырванеў.

— Ой, ці не мне столькі кветак? — выручыла Лена, і Васіль, з палёгкай уздыхнуўшы, перадаў букет.

Лена прыхінула кветкі да грудзей.

— Падабаюцца? — ціха спытаў Васіль.

— Ты быццам ведаў, што я вельмі люблю ружы,— адказала Лена.

Васіль паціснуў плячамі і адказаў:

— Ведаць, яно канешне, не ведаў, але помню, дзеля каго растуць на свеце кветкі.

Лена ўсміхнулася і паківала пальцам:

— Ой, мусіць, ведаў! Ці раз я цябе ганяла з нашага гародчыка... Там заўсёды раслі ружы. Ты помніш, Васіль?

— Помню, Лена.

— Пойдзем паставім іх у ваду. Яны хочуць піць...— Лена і Васіль выйшлі, пакінуўшы ў чытальні Пятра.

— Я неяк казаў, што для цябе, Лена, жыцця не пашкадую,— пачаў Васіль, ідучы побач.— Дык вось, памятай, што гэтае абяцанне застанецца ў сіле, пакуль б'ецца маё сэрца... Можа, залішне ўзнёсла я гавару?

— Нічога, нічога, Васіль, гавары...

— Алесь і Віктар неяк згаворваліся супраць цябе. Не ведаю, як адносіцца цяпер Алесь, але Віктар — агрэсіўна... Ды і Лідка нешта круціцца ля Анатоля. Не к дабру ўсё яно...

«Добра, што хоць гэты — шчыры. Без усякіх прызнанняў...» — з палёгкай уздыхнула Лена.

— Што яны мне зробяць? — спытала яна.

— Ліха іх ведае! Толькі напаскудзіць могуць. Ліда, тая бясхвостая Сарока-варона, увіваецца ўюном... І ніхто хлопцу не скажа, што гэта за птушка...

— А ты? Хай бы ты сказаў...

— Дык я і сказаў...

Лена адчыніла пакой, зайшла першая і прапусціла Васіля. Паставіла кветкі ў гладыш з вадою і спытала зноў:

— Як ты сказаў?

— Ну, ён пытае ў яе — як завуць? Ліда, адказвае яна. Засмяялася і пабегла, як гарэзлівая дзяўчынка. Не Ліда, кажу я Анатолю, а Сарока-варона. Чаму, пытае. А таму, кажу, што ёсць такая казачка: Сарока-варона кашку варыла, на прыпечку студзіла... Не зразумеў твой Анатоль, а я кажу: не па першай палове яе Сарокай-воронай празвалі, а па другой. Задумаўся, а пасля давай смяяцца. Зразумеў... Паганае, кажу, стварэнне, а не дзяўчына. Дзякуй, сказаў...

— І я скажу — дзякуй, Васіль, за перасцярогу...

У пакойчыку было душна, і Лена адчыніла акно. Не хацелася ні аб чым думаць. Было балюча і крыўдна...

Калі яны зноў вярнуліся ў чытальню, Пятро па-ранейшаму гартаў часопіс. Васіль скоса зірнуў на яго і, падаўшы Лене кнігу, сказаў:

— Памяняйце...

Лена заўважыла між старонак кнігі белы аркуш паперы і адразу здагадалася, што там нешта такое напісана, чаго Васіль не мог перадаць вусна. Моўчкі паклала кнігу ў шуфляду стала. А калі ён пайшоў, падумала, што вельмі цяжка ёй з Васілём, хоць ён і добры, шчыры хлопец. Нават гэты пераказ пра Сароку-варону, з усімі, не для дзяўчыны, падрабязнасцямі, Лена слухала і злавала: «Навошта ён гэта гаворыць? Не будзе ж Анатоль глупства рабіць, ды яшчэ — на людзях...»

І яшчэ Лена ніяк не магла згадзіцца з тым, што Васіль невінаваты, што ён і сам быў нешчаслівы праз той бацькаў учынак...

Пятро скончыў гартаць часопіс і падышоў да століка. Лена спалохана падняла на яго вочы і дапытліва глянула на рашучы твар. Прадчуваючы, што нарэшце хлопец адважыўся сказаць ёй штосьці асаблівае, загаварыла сама:

— Васіль няшчасны чалавек... Праўда, Пятро? — і ўстала.

Ён пераняў яе позірк, усміхнуўся:

— Чаму вы, Лена, так насцярожана сочыце за мной? Калі вы думаеце, што я легкадумны, то ведайце — не ў каханні прызнацца я прыйшоў сюды, а перасцерагчы вас...

— Ад каго? — перабіла яго Лена, раптам знясілена апусціўшыся на крэсла. Упэўненасць пакінула яе.

— Ёсць адзін такі чалавек...

— Ведаеце, Пятро... Ліхавец прыехаў у Зазер'е як мой даўні знаёмы,— толькі і здолела прамовіць Лена.

— А калі Анатоль, якога вы называеце сваім даўнім знаёмым, пазнаёміцца з другой? — з нейкай злосцю спытаў Пятро.

«Ён-то маніць не будзе... Значыць, гэта праўда, што Анатоль там у сяле паводзіць сябе непрыстойна»,— падумала Лена, але тут жа адкінула гэтую думку як недарэчную.

Не, яна ніякім плёткам не паверыць, пакуль не ўпэўніцца сама!

— Калі ён пазнаёміцца з другой,— усміхнулася Ле-

па,— то ў гэтым яго ўчынку крышачку будзеце вінаваты і вы, Пятро... Усё нядобрае трэба знішчаць у зародку.

— Так-то яно так, але...

— Але ж вы, Пятро, так мала ведаеце мяне...— перабіла яго Лена, і ўпэўнена сцепнувшыся да яе.— І яшчэ. Ніколі ў жыцці я не стану на чужой дарозе! Вольнаму — воля...

Загарэлы твар Пятра стаў шэрым. Хвіліну хлапец стаяў моўчкі.

— Так... Я разумею, Лена,— нарэшце вымавіў ён.— Толькі помніце: я ваш сябар і... сёння нічога не гаварыў! — нешта накшталт усмешкі з'явілася на яго скамянелым твары.

— Нічога! — задуменна паглядзела на яго Лена.

Паволі наблізіўшыся да дзвярэй, Жывіца павярнуўся і ледзь пахіліў галаву — развітаўся. Ды спакою дзяўчыне ўсё ж не было: чаму ўсе так спачуваюць ёй? Што робіць у сяле Анатоль?

Лена сядзела за сталом, не зводзячы воч з дзвярэй: чакала, што Ліхавец вось-вось зойдзе і ўсё высветліцца.

Прыйшлі новыя наведвальнікі, хлапчукі з Нівак. Яны атрымалі кожны па кніжцы, гарталі на сталах часопісы, размаўляючы, весела смеючыся. Якая цудоўная пара дзяцінства: ніякіх турбот, ніякіх клопатаў! Лена і сама павесялела з імі. Выбрала некалькі газет, адзначыла некаторыя артыкулы алоўкам і папрасіла старэйшых, каб яны абавязкова пачыталі іх дома ці людзям на працы. Хлопцы абяцалі, што ўсё выканаюць дакладна.

Анатоль так і не прыйшоў...

* * *

У Зазер'і з'явіўся талент!

Гэтая вестка абляцела сяло з маланкавай хуткасцю. Анатоль Ліхавец стаў вядомым чалавекам. Сяло загаварыла пра яго дружна, як пра самую незвычайную і радасную з'яву года. У першы ж вечар, на які сышліся ўсе, ад малога да старога, Анатоль зачараваў залу сваім прыемным тэнарам, заліхвацкай ігрой на баяне, агністымі танцамі. Ён умеў выключна ўсё, і выконваў свае нумары з небывалай лёгкасцю, запалам. Гледзячы на яго, здавалася, што і спяваць, і танцаваць так здолее кожны.

Людзей прывабіла сцэна. За адну рэпетыцыю Анатоль выпусціў на падмосткі Вольку і Ліду. Яны сапраўды за-

душэўна і цёпла выканалі «Дзявочую лірычную». Без усялякай падрыхтоўкі выступіў з чытаннем урыўка з паэмы Твардоўскага «За далеччу далеч» Васіль. Спявала Лена...

Многім захацелася выступаць, іх асляпіла яркае, прывабнае святло самадзейнай рампы. Лік «артыстаў» усіх жанраў катастрафічна рос. Хутка Ліхавец і Жураўская заўважылі, што слухачоў у Зазер'і засталося менш, чым выканаўцаў, і яны спынілі раздуваць сцэнічныя штаты, а пачалі гэтак жа энергічна, як і запісвалі, выкрэсліваць тых, у каго, апрача жадання выступаць, ніякіх талентаў больш не было.

Нарэшце гурткі былі ўкамплектаваны, спісы зацверджаны. Заняткі пачаліся...

Лена і не прыкмеціла, як у бясконцых рэпетыцыях, у віхуры танцаў Анатоль адыходзіў ад яе ўсё далей і далей. Ён быў з ёю стрыманы, уважлівы, але... халодны. «Нарэшце Анатоль стаў сур'ёзным чалавекам. Легкадумнасць прайшла!» — думала дзяўчына. Цяпер яна зайздросціла Вольцы, для якой гэтыя дні былі днямі суцэльнай радасці. Яе намаганні стаць студэнткай-завочніцай інстытута народнай гаспадаркі завяршыліся паспяхова. Але — нікому Волька ў гэтым не прызнаецца! — больш за ўсё радавала дзяўчыну тое, што Пятро стаў з большай увагай і павагай адносіцца да яе, да яе заняткаў. Вольга ж была ўпэўнена, што ні яе звонкі голас, ні маладосць, ні чысціня кахання, ні нават інстытут не вярнулі б ёй каханага, калі б у Зазер'е не прыехаў Анатоль. Яна малілася на яго, як на бога, які прынёс ёй шчасце, хоць і сам той «бог», і Лена добра ведалі, што каханне да кожнага чалавека прыходзіць само, без чужой дапамогі. І не заўсёды яно прыносіць шчасце.

Усё сяло ўжо гаварыла, што Анатоль — гэта той, якога даўно, яшчэ ў горадзе, пакахала Лена. Яго зазерцы палюбілі, прызналі сваім. Усе зазерскія жаніхі, у тым ліку і Алесь, зразумелі, што сапернічаць з Анатолем — значыць, марна траціць час і падрываць свой уласны аўтарытэт. Для Волькі прыезд Анатоля меў асаблівую радасць: цяпер Лена не была адзінокай.

Нарэшце яе рукі развязаны! Яна верыла, што яе пакутам прыйшоў канец. Волька ведала, што Пятро малады хлопец. А дзе маладосць — там і каханне. Яно не чакае, не хаваецца, не гасне. Яно разгараецца ўсё ярчэй і ярчэй. Для яго спяваюць птушкі, гудуць пчолы, свеціць ноччу поўня — цудоўны ліхтар!

Летнія вечары! Што можа быць больш цудоўнае ў прыродзе! Вось у адзін з такіх вечароў і ўзышла Вольчына зорка: дзяўчыну праводзіў дадому Пятро. Яны апошнія выйшлі з клуба, нават не згаворваючыся. Залітыя малочна-ружовым святлом месяца, ішлі наперадзе хлопцы і дзяўчаты. Лупала ў прасторы іх песня, рэхам разляталася над возерам, над палямі. Сцішылася жнівеньская ноч, заслухалася. Сівым туманам улёгся ў лагчынах вецер. Самкнулі сухія вусны спелыя каласы — не варухнуцца. Бяжыць з дарогі сцяжынка, губляецца ў жыце...

— Пойдзем сцежкай! — нясмела ўздымаючы галаву, сказала Волька.— Я так люблю ісці жытам...

Пятро збочыў, узяў дзяўчыну пад руку, сказаў жартам:

— А труціцца больш не будзеш? Тады пайду...

Добра, што Волька стаяла спіною да месяца, і Пятро не ўбачыў, як зачырванелася яна ад сораму! Волька ўткнулася гарачым тварам яму ў грудзі, хацела засмяяцца, ды раптам заплакала. Гарошынамі пасыпаліся няпрошаныя слёзы. Не схаваць іх, не стрымаць, бо з набалелых дзявочых грудзей яны, з самага сэрца...

— Навошта ты так, Пятро... Што таіць мне цяпер? Не магу без цябе — і ўсё!.. Далібог, атручуся, калі...

— А я не дазволю!

Ён абняў яе, малую, і пацалаваў у вільготныя вочы, у гарачыя вусны. І ўжо не адчувала дзяўчына зямлі. Паляцела пад лёгкімі белымі хмурынкамі. Пад высокімі зорамі. Доўга ляцела. І спынілася не на зямлі, а на іншай планеце. Не жыта расло на ёй — залатое калоссе. Месяц быў блакітны. Неба — ружовае-ружовае. Паветра напоўнена п'янючым водарам...

— Як тут хораша! Праўда, Пятро?

— Хораша...

— Так будзе заўсёды?

— Так будзе заўсёды...

«Так будзе заўсёды... Не разгледзеў я за чужым бэзам сваёй чаромхі, прабач, любая... Ты, аказваецца, знайшла сваё месца ў маім сэрцы — і гэта было не сёння, не ўчора. Даўно».

Узняў яе, як пушынку, на рукі і панёс над залатым калоссем. Зноў паляцела Волька. Паляцела назад, на зямлю...

...Зямля была росная. Волька адчула гэта, шукаючы рукамі па сцежцы маленькую брошку-жучка. Пятро са-

гнуўся, таксама пашукаў. Знайшоў яе малыя рукі, лёгенька націснуў.

— Заўтра зноўдзем,— сказаў ён ціха, уздымаючы за рукі Вольку.— Прыйдзем завідна...

Пятро змоўк і прытуліў дзяўчыну да сябе: па сцежцы ішлі двое.

Пачуўшы звонкі смех дзяўчыны, Волька і Пятро адышліся ў жыта, сталіся. Неўзабаве яны ўбачылі, як па сцежцы, цесна абняўшыся, прайшлі Ліда і... Анатоль!

— Табе гэта падабаецца? — пачулі Пятро і Волька.— А як такія радкі... З грудзей каханне маё рвецца, і кроў бурлівая кіпіць. Я прыхіну цябе да сэрца і буду вусны твае піць! — узнёсла дэкламаваў Ліхавец, ціскаючы Ліду. Яна ўскрыквала, смяялася. На хвіліну яны змаўкалі, і зноў чуўся голас Анатоля. Усё цішэй, цішэй...

— Вой, што ж гэта? Га? — нясмела спытала Волька, зноў выйшаўшы на сцяжынку.— Як жа гэта ён?..

— Не магу ўцяміць: ці то яны што развучваюць, ці... проста жартуюць...

— Жартуюць? Ліда ніколі яшчэ не жартавала. Не з першым яна так! Трэба абавязкова сказаць Лене!.. Каб глядзела за сваім.

«Як у цябе ўсё проста, дурненькая! За сваім... Чаму гэта Лена зноў адна засталася? Нешта трэба будзе высветліць... А што? Хіба мне не ясна ўсё і так?» — падумаў Пятро.

...Лена сустрэла іх стрымана:

— З Лідай пайшоў? Вершы чытаў? Дык ён гэта нешта развучваў сам... Іншы раз і не ўгадаеш, як пачне чужымі словамі гаварыць, ці ён гэта сур'ёзна, ці жартам... Артыст!

«Артыст... у ролі здрадніка!» — падумаў Пятро, але не сказаў гэтага Лене: прыйдзе час — сама ўпэўніцца.

— Пойдзем, Волька! — сказаў ён і ўзяў дзяўчыну пад руку.

Яны адышліся далёка-далёка, а Лена ўсё глядзела на дарогу, усё думала: «Падзе... Да чаго ж вы зманлівыя! Адзін спадзяецца, ды нічога так і не дачакаецца, а другі, не спадзеючыся, мае...»

* * *

Лена адчыніла акно. Ад гэтага ў пакоі не стала халадней. Хутчэй наадварот: ноч была цёплая. Спаць не хацелася. У такую ноч хацелася марыць. Адной. Анатоль ска-

заў, што яму пакуль трэба трымацца далей ад яе, каб людзі не мелі падстаў гаварыць лішняе. Можа, дзеля гэтага і з Лідкай пайшоў, каб людзі не гаварылі, што застаецца ў яе? Калі гэта так, то трэба пачакаць. Ён надзвычай пастарэў за час, які яны не бачыліся. І Лена пачала ўспамінаць сённяшні вечар...

Атрымалася замінка з выступленнем драмгуртакоўцаў. Сцэнка-жарт, якую яны развучылі слаба і паставілі без натхнення, нагнала на гледачоў сум. Гэта быў апошні нумар праграмы. Людзі пачалі разыходзіцца. Лена хвалявалася: няўжо Анатоль нічога так і не прыдумае, каб выправіць становішча? І ён прыдумаў.

— Хвілінку ўвагі, таварышы! — стаўшы на сцэне, Ліхавец ірвануў баян, прабег спрытнымі пальцамі па гузічках.— А польку зусім закінулі? Польку-трасуху! На прыз першага танцора!..

— Давай польку! Да ўпаду! — адгукнуўся Алесь і, ухапіўшы адразу некалькі крэслаў, панёс іх да сцяны.

Людзі ажылі. Яны спяшаліся ачысціць залу для сваёй любімай полькі. Было нібыта сорамна, што за самадзейнасцю ўсе забыліся на польку, і таму, калі Анатоль зайграў, у зале адразу стала цесна. Закружыліся ў віхры імклівыя пары, застукалі-загрукалі па падлозе абцасы. Паддай, музыка, не шкадуй мяхоў!

Пачаўшы танец паволі, Анатоль з кожнай хвілінай набіраў хуткасць. Шалёны гэта танец — полька, заліхвацкі! Не ўсякі вытрымае яго, не ўсякі адужае. Ды не перавяліся яшчэ танцоры ў Зазер'і, жывуць!

— Кр-руг злева! — скамандаваў Алесь.

На момант спынілася зала, дзяўчаты перайшлі да новых кавалераў, і зноў закруцілася-завярцелася мяцеліцай усё навокал.

Лене здавалася, што над ёю круціцца столь, люстра, што сцэна, крэсла і Анатоль на ім — носяцца кругам...

— Не магу, Саша, пусці...— папрасілася яна.

Алесь выпусціў Лену, усклікнуў неяк сярдзіта:

— Круг злева!

Круг паменшаў напалавіну. А праз хвіліну засталося некалькі пар. Потым — Алесь з Волькаю. Яны датанцаваліся аж да апладысментаў і не чулі знорапасці. Ногі самі насілі Алеся. Ён стаў лоўкі, спрытны. Адкінуўшы кучаравую галаву і ёмка падхапіўшы дзяўчыну дзвюма рукамі за стан, Алесь то насіў яе ў рытм музыкі па прасторнай зале, то ваўчком круціўся з ёю на адным месцы...

Вольку змяніла Ліда, Сарока-варона. Музыка зайграў яшчэ весялей. Вёрткая, моцная, Ліда, здавалася, сама насіла пад рукі Алеся. Але змаглася і яна. Тады Алесь падхапіў наступную дзяўчыну.

Музыка абарвалася. Танцы спыніліся.

— Здаюся! — паставіўшы баян на крэсла, Анатоль падняў рукі ўгору.— Пераможца — Алесь Зыблюк... Віншую.

Аднекуль з-за куліс Анатоль вынес пляшку дарагога віна і, дабраўшыся да Алеся, сказаў:

— Трымай, чэмпіён!

Алесь адвёў яго руку.

Расчырванелы, узрушаны, ён знайшоў яшчэ сілы дабрацца да дзвярэй і выйсці на вуліцу.

«Да чаго схуднеў хлопец — не пазнаць!» — пашкадавала яго Лена. Яна выйшла на ганак і ўбачыла, як Алесь стаяў ужо адзін зводдаль і курыў. Моладзь разыходзілася. Пятро трымаў Вольку за абедзве рукі і шчасліва глядзеў ёй у твар.

— Больш двух кругоў я польку не пракручу! — гаварыў ён з запалам. Калі выйшла Лена, яны разам пайшлі на дарогу.

«Значыць, Волька свайго дачакалася... Ён кахаў яе»,— думала Лена.

Апошнім з клуба выйшаў Анатоль. Лёгка паціснуў Лене руку, усміхнуўся і сказаў:

— Да заўтра! За табой сочаць сотні воч! Пайду, каб не падумалі чаго благога... Пра цябе...

І пайшоў...

...Лена зачыніла акно, выключыла лямпачку і лягла. Не думала, не гадала, што над яе шчасцем збіралася чорная хмара бяды...

Мінула некалькі дзён. Анатоль забягаў да Лены ў пакойчык, цалаваў рукі, называў яе пяшчотна птушанём. Пра каханне яны больш не гаварылі. «Ясна і так, што ён кахае мяне»,— супакойвала сябе Лена.

Ды раптам...

Зачыніўшы клуб, Лена пайшла ў свой бэзавы сад каля клуба. Яна любіла адпачыць там, на лаўцы, сярод зелені бэзу, памарыць...

На лаўцы сядзела дзяўчына.

— Ты, Ліда? — аж жахнулася Лена.— Каго гэта тут чакаеш?

Тая ўстала, рукі ў бокі, засмяялася:

— А таго чакаю, хто прыйдзе! Ха-ха-ха!

І пабегла да возера, нядобра бліснуўшы па Лену круглымі, як у савы, вачамі.

«Таго чакаю, хто прыйдзе... Зусім неразумна — хто прыйдзе! Анатоль даўно пайшоў у сяло...»

І толькі так падумала, як заўважыла Ліхаўца. Ён ішоў аднекуль збоку, з дарогі. Стаілася. Нядобрыя думкі ўскалыхнулі грудзі. «Няўжо сюды?»

Анатоль расхінуў кусты рукамі.

— Пайшлі,— ціха прамовіў, убачыўшы на лаўцы сілуэт дзяўчыны.

Скамянела. Адняўся розум: ні думак, ні пачуццяў. Толькі цямнейшаю стала ноч.

— Чуеш, пайшлі...

«Лідку... кліча! Які сорам! Ліду, Сароку-варону...»

Лена ўстала, скінула хусцінку з плячэй, разагнала камароў, быццам яны засцілі вочы, перашкаджалі.

— Ліда пайшла да возера,— сказала меладычным голасам.

— Лена? — Анатоль прасунуўся праз куст, стаў побач.

— Я.

— Значыць, ты... Што ж, гэта яшчэ лепш. Я даўно хацеў табе сказаць, але адкладваў...

— Мне ўсё ясна і так.

Яна здзівілася, што здолела перамагчы свой душэўны боль і цяпер гаворыць так спакойна.

— Не ясна, пойдзем, раскажу...

— Бяжы лепш да возера, не трымаю. Мусіць, паскардзіўся, дык цябе і пашкадавалі. Не першага Ліда шкадуе...

Лена павярнулася, пайшла. Яна ішла шпарка, нібы хацела ўцячы ад Анатоля, ад самой сябе. Ды ён дагнаў яе на ганку. Сілай упіхнуў яе ў пакой, зачыніў за сабою дзверы.

— Стой! — заўважыўшы, што Лена хоча выйсці назад, Анатоль схапіў яе за руку.— Стой і слухай... Я кахаю цябе, Лена. Даўно...

— Не кажы такія словы! — прамовіла яна і адышлася ад акна, адвярнулася.— Ты не кахаў мяне і тады...

Анатоль зноў падышоў да яе, стаў побач.

— Гэта было спачатку — захапляўся... Памятаеш? Мы разышліся. Цяпер я прыехаў зусім не з тымі намерамі! Я зразумеў, што кахаю цябе па-сапраўднаму, але ж зразумеў і іншае — ніколі не прынясу табе шчасця: у мяне ёсць жонка...

Лена спалохана зірнула на Анатоля і адсунулася.

— Жо-онка? — перапытала, яшчэ не верачы яго словам.

— Так, жонка... Ты маладая, і я не хачу губіць твае мары... І ў мяне яны былі і ёсць, мары. Толькі да здзяйсненняў далёка... Вось і ўсё, Лена. А на Ліду не крыўдуй, яе віны тут няма... Усё здарылася не так, як бы хацелася, ды соллю рану не загоіш. Даруй, Лена...

Анатоль падышоў да дзвярэй і ўзяўся за ручку, як пачуў за плячамі:

— Чакай!.. Як жа гэта? Ты ніколі не гаварыў мне пра жонку..

— Ты ж не пыталася...

— А цяпер — дзе яна? Чаму ты яе кінуў?

— Зіна кінула мяне сама. Была са мною, пакуль вучылася ў медыцынскім. Скончыла — паехала на цаліну, да свайго першага мужа... І сына забрала, нашага сына! Колькі цяпер там прабудзе, не ведаю.

— І ты прымеш яе зноў?

— У нас жа сын расце...

Лена не апраўдвала Анатоля, але і не вінавaціла яго. Яна проста па-чалавечы шкадавала ўсіх: і няўдачніка жаніха, і малога, якому, вядома ж, жывецца не вельмі соладка.

— Ідзі, Толя...

Ліхавец ірвануў дзверы, адвярнуўся і выгукнуў:

— Я напішу табе, Лена!

Ён пайшоў. Пайшоў, каб больш ніколі не вярнуцца сюды, да вясёлай грамады зазерцаў...

* * *

На другі дзень Анатоля ў Зазер'і ўжо не было. Аб ім пагаварылі хлопцы, пажурыліся дзяўчаты і забыліся. «Лена прагнала. З-за Ліды...» — так вырашыла сяло.

Ды адна бяда ніколі не ходзіць. За ёю следам цягнуцца новыя беды, яшчэ большыя і злейшыя.

Захапіўшыся працай і самадзейнасцю, зазерцы зусім забыліся на Віктара Бадзягу. А ўсё якраз і здарылася з-за яго...

Неяк адвячоркам у клуб да Лены забеглі Волька і Каця. Прадчуваючы нешта нядобрае, Лена хуценька ўстала з-за стала.

— Што з вамі? — насцярожана спытала яна.

— Са мной — нічога, а вось з ёю,— пачала Волька,— бяда...

— Сядзем, Леначка, я ўсё табе раскажу. Бандыт ён — вось хто! Ці ж добры чалавек так зробіць? — Каця падняла хусцінку да сваіх вільготных воч і ціха заплакала.

Лена пасадзіла дзяўчат побач з сабою, прынесла шклянку вады і паставіла на стол. Каця глынула са шклянкі і, крыху супакоіўшыся, прамовіла:

— Зусім звар'яцеў мой Віктар... Во, паглядзі! — і агаліла ўсё ў сіняках плячо.— І спіна гэткая ж... Жывога месца не пакінуў, п'янчужына.

— За што ён? — ціха спытала Лена.

— Каб жа я ведала! Прыйшоў п'яны як зямля. Спытала, дзе ён так набраўся. І ўсё... А п'е ж кожны дзянёк. Ой, чуе маё сэрца, што з касы бярэ ён грошы. І, відаць, нямала набраў...

Лена строга зірнула на Кацю:

— Бачыш, да чаго давяла твая пакорлівасць! Абы ціха... Цяпер хоць не хавайся ад людзей, кажы праўду. Даўно ён рукам волю дае?

Памаўчаўшы, Каця як бы нехаця адказала:

— З год ужо... Але я думала — пройдзе ліха, а ён звярэе з дня на дзень. І не толькі звярэе — вар'яцее. Учора вунь прыйшоў дадому ды рагоча без дай прычыны, нечы язык паказвае. Во да чаго дапіўся! А сёння яму здалося, што я некага ў шафе схавала. На трэсачкі пакалоў, злыдзень! Дзіця тое так перапужаў, што аж пасінела ад страху. Дык я малую да Волькі занесла, а мы вось да цябе ўцяклі... Што мне рабіць, Леначка, што рабіць? Як бы хоць збавіцца ад яго, злыдня...

Волька адмоўна пакруціла галавою і цяжка ўздыхнула:

— Што ты гаворыш, Каця! Дзіця — без бацькі, а ты — удава? Падумаем яшчэ, можа, знойдзем іншы выхад...

— Які ён бацька? Чорту лысаму ён бацька. А я дык ужо даўно ўдава. Каб вы ведалі, як ён мне абрыд. Але каму раскажаш такое, што і самой балюча ўспомніць? А на людзях Віктар — ого як трымацца ўмее! Пашкадаваць толькі! Гэта я ўсё вінавата...

Каця змоўкла і прыкусіла верхнюю губу. Яна хацела расказаць пра ўчарашняе, але не змагла. Ёй было сорамна, Віктар прыйшоў п'яны, здзекаваўся з яе... Як жа расказаць такое людзям, адкрыць перад імі рану сваёй душы?

— Збавіцца б ад яго...— паўтарыла Каця і з надзеяй зірнула на Лену.

— Я ведаю, што рабіць... Трэба перш-наперш перавесці яго на іншую работу! — сказала Лена.— Схадзіць да доктара, узяць даведку аб пабоях. Тут, у клубе, пры ўсіх людзях, устроіць грамадскі суд — пацішэе!

— Хаця б не пашкодзіць! — паківала галавою Волька.— Яму ж цяпер законы не пісаны, абы-чаго натворыць.

І ўсё ж Каця згадзілася з'ездзіць у раён, расказаць аб здзеках людзям, старшыні.

На развітанне яна параіла сёння больш нікога не пускаць і дзверы заваліць, бо Віктар п'яны не раз гаварыў, што ён яшчэ дабярэцца да «недаткнёнай». Што пад гэтым разумець, здагадацца было няцяжка. Не было яшчэ ў сяле той жанчыны, да якой Віктар не прыставаў бы.

Застаўшыся адна, Лена ўявіла сабе п'янага Віктара і пабегла замыкаць дзверы. Сустрэча з ім адзін на адзін цяпер, калі яна столькі перахвалявалася, была зусім непажаданай.

Перад тым як запаліць святло, Лена стала на падаконнік, каб завесіць акно коўдрай. Міжволі глянуўшы на цёмны куст лазы каля возера, яна жахнулася: там, за кустом, ёй уявіўся чалавек. Можа, гэта толькі здалося, але на нейкае імгненне яна ясна ўбачыла, як хтосьці расхінуў рукамі галлё. Ёй упершыню стала тут страшна. Акуратна завесіўшы акно, Лена скочыла на падлогу і, адхінуўшы ражок коўдры, яшчэ раз зірнула на куст. Вецер калыхаў галлё. Нікога там цяпер не ўбачыла.

«Глупства, здалося»,— супакоіла яна сябе, але страх не прапаў. Зірнула на дзверы, і ёй уявілася, што яны вось-вось з грукатам адчыняцца і хтосьці ўварвецца ў пакой.

Лена села за стол, засланы белым абрусам, і ўбачыла на ім кнігу, якую прынёс Васіль. Успомніла пра ліст, што быў у кнізе. Як жа яна забылася па яго? Чаму не прачытала раней? Лена злавіла сябе на думцы, што раней ёй было не да Васілёвых лістоў, раней у яе былі іншыя клопаты і інтарэсы. Цяпер жа ўсё тое адышло, мінула...

Дастаўшы з кнігі акуратна складзены ліст, Лена, каб адцягнуць увагу, забыцца на страх, села каля грубкі і падумала-загадала: «Што ж ён мог напісаць?» Зажмурылася і разгарнула паперу. А калі расплюшчыла вочы, убачыла акуратна выпісаныя словы...

«Лена, даруй! Гэта не любоўнае пасланне, а душэўная споведзь... Мы абое сіроты. Твой бацька загінуў героем, маці памерла чалавекам. Ты не адна, Лена, у цябе шмат бацькоў і матак у Зазер'і.. У нас жа дома быў кат. Сваім

дзецям, жонцы, а пасля — усім людзям... Бедная мая маці! Колькі перанесла яна гора — ні адна жывая душа не стрывала б. А сёстры! Заўчасна пастарэўшы, яны і цяпер жахаюцца ў сне, ім і цяпер сняцца п'яныя фашысты, якім кінуў іх пад ногі бацька-звер, хатні кат...»

Тут Лена спынілася, яе ўразіла гэтая споведзь. Яна спярша нават не паверыла, што гэткае мог вытвараць родны бацька, але Васіль прымусіў яе паверыць сваімі наступнымі радкамі, дзе гаворка ішла пра тыя факты, якія, нібы далёкае водгулле, дакаціліся да яе яшчэ недзе ў сорак пятым... У гэтым пасланні-споведзі была адна просьба, каб Лена не пазбягала сустрэч з ім, Васілём, не адварочвалася, а шчыра, як сястра, глядзела яму ў вочы...

Лена не цярпела розных пісьмаў-прызнанняў. Гэтае ж схавала, як самае дарагое. І не таму, што нарэшце ёй адкрыліся вочы на гаротнае жыццё Васіля. Лена адчула душою — Васіль пакутуе яшчэ і з-за яе, з-за яе халоднасці. Цяпер ён пакутаваць не будзе. Лена сама скажа яму пра гэта...

Ведала яна, што ў сяле многія любілі Васіля. Пры кожным выпадку жанчыны не праміналі сказаць, што Васілёвым сястрычкам жывецца лепш, чым іншым за бацькамі. І гэта была праўда. Васіль любіў сваіх сясцёр, дапамагаў ім, як толькі ставала сілы, каб яны не ведалі гора, нястачы.

Шчыры працаўнік, ён жыў марай аб лепшай будучыні, радаваўся, калі з году ў год раслі тыя простыя лічбы, за якімі ён, звычайны бухгалтар, бачыў багацце сваіх аднавяскоўцаў.

«Ты не адна, Лена... Яму цяпер цяжэй, чым мне»,— падумала Лена. Ёй хацелася адкінуць прэч рэшткі старой злосці, што перашкаджалі раней разгледзець гэтага прыгожага душою чалавека. Ад такіх дум стала лягчэй на сэрцы. І прайшоў усякі страх...

Лена хацела ўжо нават скінуць з акна коўдру, як адразу адскочыла назад: у гэтае імгненне хтосьці моцна забарабаніў кулаком у раму. Зазвінелі шыбы. Лена адышлася да дзвярэй. Востры халодны боль прапізаў усю істоту. Інстынктыўна выключыўшы святло, Лена хацела схавацца за шафу, як пачула за акном знаёмы Васілёў голас:

— Бяжыце ў сяло, клічце людзей! Кароўнік гарыць!..

* * *

Што ж было да гэтага?

Перад Віктарам дзень за днём уставалі ўспаміны. Так, ён цяпер адзін, зусім адзін. Нават Алесь адвярнуўся ад яго. Спярша ён саромеўся свайго ўчынку, тады-сяды забягаў яшчэ ў краму выпіць «маленькую на дваіх», потым заявіў адкрыта:

— «Квактух» не важу, грошай няма. Будзь здароў, Віктар, я табе не кампаньён!

І Віктар пачаў частавацца сам. Раз яго не разумеюць — не трэба. Ён-то сябе разумее, і ён сябе не пакрыўдзіць. Колькі таго жыцця — нуль? А без гарэлкі, разважаў ён, нават жаўранкі не пяюць, а рыпяць, як непадмазаныя калёсы. Віктар штодня «цалаваў белую галоўку». Ён прыкладваўся да яе ў дзень разоў дзесяць, да вечара быў з пакупнікамі вясёлы, жартаўлівы. І ніхто не задумваўся над тым — адкуль у Віктара бярэцца весялосць. А Каця баялася яго і маўчала. Яна яшчэ смутна спадзявалася на цуда, што Віктар прыйдзе аднойчы дадому цвярозы, і ўсё пачнецца спачатку. Ён жа калісьці быў добрым хлопцам...

І вось настаў дзень, калі маўчаць больш не было сілы. Каця паскардзілася суседзям. Ён за гэта «палічыў ёй рабрыны». Пасля — зноў. І нарэшце ён абрыд ён наогул. Каця заявіла аб гэтым Віктару — той азвярэў зусім. «А-а, спадабаўся табе загадчык фармы, той таўсцюк Гаўрыла! Я ўжо табе не патрэбны? Вось, атрымай!..»

Ён пачаў раўнаваць яе да кожнага, хто хоць слова гаварыў Каці на вуліцы. Яна баялася спыніцца, пастаяць са знаёмымі і суседзямі. Яна была як запалоханая вавёрка, якая ўрэшце пачынае баяцца свайго ўласнага хваста...

І вось ён зноў пабіў сваю жонку...

Спярша яшчэ тое-сёе разумеючы, Віктар прыкідваў у галаве, на колькі ён напіў. Потым, зірнуўшы ў «чорную кніжку», куды ён запісваў растрату, Віктар убачыў страшную лічбу. Каб пагасіць яе, каровы ўжо было мала. Гэта сапсавала настрой. А тут падвярнулася Каця...

Застаўшыся адзін, Віктар агледзеўся. Дома нікога не было. Уся падлога закідана кавалкамі пасечанай шафы, адзежай. А той, каго, як яму здавалася, Каця там схавала, недзе знік. «Мусіць, пабег з ёю»,— мільганула ў галаве вострая, хваравітая думка. Віктар адчыніў дзверы і выйшаў. Ён знойдзе жонку, дзе б яна ні схавалася.

У суседзяў Каці не было. Віктар папрасіў у іх праба-

чэння за турботы і пайшоў далей. І суседзі не спыталі ў яго, навошта ён шукае Кацю, не спынілі: бяда была чужая, не свая! Навошта ж і клапаціцца, умешвацца ў суседскія справы. Муж з жонкаю паб'юцца, а потым і памірацца...

Абышлі п'янага і на вуліцы па дзедаўскай прымаўцы: «Дзіцяці ўступі, а п'янаму сваступі». Так ногі і занеслі Віктара на ферму...

— Знайду, сучка!.. Ты ад мяне нідзе не схаваешся, нідзе! — спыніўшыся каля кладоўкі, Віктар тупа зірнуў на невялічкі замок. Знайшоў камень і збіў замок. Шукаючы жонку між бітонаў, ён перакульваў іх — і рэшткі вячэрняга ўдою цяклі па нахіленай падлозе да дзвярэй.

У кароўніку, куды ён трапіў пасля, было цёмна, як у склепе: на ноч там выключалі святло. Віктар вобмацкам дабраўся да супрацьлеглых дзвярэй, дзе ў куце, за дошкамі, ляжаў падрыхтаваны раніцы рацыён, чыркнуў запалкай. Там было з пуд сена, у засеку — крыху аўса.

Віктар сеў на сена і заплакаў. Ён плакаў ад свайго бяссілля, ад злосці і больш — ад гарэлкі. Ого, папалася б цяпер яму пад гарачую руку жонка! Але яе, на шчасце, не было, і Віктар толькі моцна скрыгануў зубамі. Закурыў...

Потым, пыхкаючы папяросай, ён зноў аблазіў гэты куток, зазірнуў у засек. Віктар не бачыў, як папяроса вывалілася з перасохлых вуснаў у сухі, нібы порах, авёс.

Ён адчуў гэта толькі пасля, калі едкі дым паплыў па кароўніку, але не ведаў — адкуль той дым. Калі ж Віктар знайшоў палаючую скрыню, то зрабіць што-небудзь ён ужо не мог...

«Чаго гэта я там поўзаў у кароўніку? Як я апынуўся там наогул?» — успамінаў пасля Віктар, калі пажар вярнуў яму розум. І ніяк не мог успомніць. Ён проста здзіўляўся, і нічога больш. Але сваім здзіўленнем ні з кім не падзяліўся: ні з Васілём, які прабег воддаль ад яго, ні з Ленай, ад якой шаснуў у хмызняк, калі яна стрэлася на дарозе...

Віктар прыбег дадому жытам, загуменнямі. Прабраўся ў адчыненую хату і, распрануўшыся да сподняга, лёг на ложак. «Добра хоць, што яшчэ вартаўніка не было... Ён з дванаццаці. Пройдзе!» — суцешыў ён сябе думкаю і неўзабаве пачуў, што да яго ідуць. Моцна-моцна заплюшчыў вочы і нават крышку захроп. Яго «разбудзілі». Віктар адкрыў вочы і ўбачыў поўную хату людзей.

— Гэта не ён,— сказаў адзін.
— Ён нават падняцца не можа,— сказаў другі.
Так яны сталі сведкамі таго, што Віктар быў моцна п'яны і спаў дома...

* * *

Спярша Лена падумала, што Васіль пажартаваў. Грукнуў у раму, крыкнуў бегчы ў сяло і знік. Чаго ён тут блукаў наогул? І ці не яго гэта яна бачыла за лазовым кустом?

Лена адчыніла дзверы і выглянула на двор. Вечар быў даволі відны, нейкі ружовы. На фоне цёмнага неба з дзіўнай пазалотай віселі нейкія празрыстыя, лёгкія і далёкія воблакі.

Але вось Лена заўважыла нечы сілуэт, які паволі знікаў за ўзгоркам. А далей Лена ўбачыла, як падымалася з зямлі чорная хмара. «Гэта пажар! Агонь толькі разгараецца»,— падумала яна і кінулася за Васілём. Не пабегла ў сяло, бо туды было далей, чым да фермы. Лена бегла на пажар, хоць сама страшна баялася пажараў. Праўда, бачыла яна іх даўно, калі на гэтай зямлі грымела вайна. Але ў памяці недзе глыбока-глыбока захаваўся жах гэтай стыхіі...

Бегчы цяжка-цяжка. Спатыкнуўшыся аб купіну, Лена ўпала. А калі падымалася, убачыла, як хтосьці пабег ад яе праз кусты. «Гэта ж Віктар!» Але разважаць, чаму ён уцякаў ад яе, не было часу, і яна зноў прыбавіла ходу.

На ферме гарэў крайні кароўнік, стары. Лена ўбачыла, як з доўгай будыніны Васіль выводзіў кароў і, моцна б'ючы іх доўгім кіем, адганяў далей.

— Чаму вы тут?! — неяк грозна спытаў Васіль, убачыўшы Лену каля сябе.

— Я памагу... Мы ўдваіх хутчэй справімся,— адказала яна і пабегла за Васілём у адчыненыя вароты, з якіх паволі вярнуў густы едкі дым.

Унізе яшчэ можна было дыхаць. Сагнуўшыся, Лена падбегла да стойла, адвязала карову. Жывёліна ўставілася на яе чырвонымі ў цемені вачамі і цяжка, трывожна дыхала. Яна дрыжала ўсім целам, баялася крануцца з месца! Лена хацела вывесці яе, але тая — ні з месца.

— Вы за рогі бярыце, за рогі! — данёсся адкульсці Васілёў голас.— Яны баяцца адны ісці!..

За рогі браць рукамі Лена сама баялася. Яна зняла з сукенкі пояс і накінула яго на рогі.

— Пайшлі, мілая! Пайшлі... Згарыш тут... Ну! — ледзь не плачучы, прамовіла Лена, і карова, гучна чмыхнуўшы колькі разоў, пайшла рыўкамі, хутка.

Пакуль Лена вывела каля двух дзесяткаў кароў, у кароўніку стала горача, нібы ў печы. Дашчаны дах ужо гарэў, як свечка. Наўкола стала відна. Ні Лена, ні Васіль не думалі, што па даху полымя можа хутка перакінуцца на другі канец будыніны. Яны маглі яшчэ, закрыўшы ад гарачыні твар, тое-сёе зрабіць. І яны выводзілі адну карову за другой. Шмат дапамагала ім адзіная бочка вады, што стаяла побач з варотамі...

Калі Лена выводзіла апошнюю карову, яна заўважыла ў куце нешта чорнае. Яна яшчэ вярнулася і вобмацкам устанавіла, што гэта цяля. Яно было блізка, проста за варотамі, але як яго ёй вывесці, калі такім жарам дыхае ў твар. Лена ўпала каля цяляці, блізка прытуліўшыся да яго...

Васіль, выйшаўшы з кароўніка, закрычаў:

— Усё! Лена, усё...— Агледзеўся наўкола і, не знайшоўшы Лены, гукнуў: — Ле-ена!!!

Адказу не было. Тады Васіль апошні раз намачыў свой пінжак і, накінуўшы яго на галаву, праскочыў за вароты, якія, нібы пашча дракона, дыхалі агнём.

— Ле-ена! — як з-пад зямлі, данёсся да дзяўчыны Васілёў голас. Яна хацела адказаць, але не здолела. Закашлялася і страціла прытомнасць. Той кашаль і пачуў Васіль.

— Лена! Жывая... — трывожна прамовіў хлопец. Скочыў убок і, нахіліўшыся, абкруціў сваім пінжаком яе галаву. Потым падняў дзяўчыну на рукі, моцна прыціснуў да сваіх грудзей і яшчэ раз зірнуў, куды ісці. Зірнуў — і адчуў пякучы боль у вачах, у галаве, ва ўсім целе. Зрабіў крок, другі, трэці...

Ён задыхаўся. Яму здавалася, што нешта гарыць у яго ўсярэдзіне, але крок за крокам ён нёс сваю непамерна цяжкую ношу. Васіль нёс, а выйсця ўсё не было. Кругом было полымя і ноч...

Ён не ведаў, што ўжо даўно выйшаў з палаючага кароўніка, што гэта вопратка гарыць на ім. Ён нёс дзяўчыну насустрач шумлівай грамадзе, якая набліжалася з сяла, і не чуў яе гулу. У вушах толькі аддаваўся трэск ды

шум пажару. Нарэшце Васіль зваліўся, так і не выпусціўшы з анямелых рук выратаваную дзяўчыну...

На ім разарвалі вопратку, адкінулі прэч. Васіль не стагнаў. Яго паклалі на разасланыя хусткі, нікім не пазнанага, з апухлым чорным тварам і закрытымі вачамі. Побач з ім сядзела Лена і курчылася ад болю. Хтосьці падаў ёй вады. Яна напілася проста з вядра, абмыла твар. Волька дала ёй сваю хустку, і Лена перавязала ёю абпаленую руку.

— Завяжы, Волечка. Агнём пячэ...— папрасіла Лена.

Волька нахілілася над ёю і асцярожна завязала ражкі.

Падышоў сюды і Корань.

— Вас трэба хутчэй адвезці ў раён... Дзе ж гэта машына? — занепакоіўся ён і стаў азірацца навокал.

Лена падняла галаву, хацела ўстаць, але толькі застагнала. Аказалася, што ў яе абпалена яшчэ і нага.

Старшыня падхапіў яе пад рукі і сказаў:

— Малайчына ты, Гэлька... Вы ж,— кіўнуў ён на Васіля,— столькі зрабілі! Удваіх...

Лена павярнула галаву і, зірнуўшы на Васіля, закрыла вочы рукою.

— Яму цяпер не выжыць, дзядзька Рыгор,— сказала яна і ціха, стрымана заплакала. Услед за ёй загаласіла каваліха Зося, зачмыхалі насамі кабеты. Яны стаялі над Васілём, як над нябожчыкам. Васілёвы сёстры асцярожна прыкладвалі да твару мокрыя хустачкі і плакалі. А ён маўчаў. Толькі часта-часта ўздымаліся грудзі...

Воддаль, дзе дагараў кароўнік, было тлумна, чуліся каманды і воклічы. Людзі расцягвалі драўляныя сцены бусакамі, і полымя гасла. Чорны дым расплываўся над фермай. Здалёк ён быў падобны на вялізную навальнічную хмару.

Толькі тады, калі пажар быў патушаны, а Васіля і Лену павезлі ў бальніцу, людзі загаварылі аб прычыне пажару.

— Вось вам і вынік! Я казаў... Я многа раз казаў, што трымаць статак у драўляным кароўніку небяспечна,— гаварыў калгасны пастух Язэп, чалавек у гадах, але шустры і вясёлы бабыль.

Людзі пачалі ўспамінаць, хто з мужчын быў вечарам на ферме. Першым назвалі Алеся. Шафёр сапраўды падвозіў туды віку і заходзіў у кароўнік. Але Каця, з якой Алесь размаўляў, сказала, што яны пастаялі каля варот і ён пайшоў да машыны, ні разу не закурыўшы. Аб тым,

што Алесь кінуў курыць наогул, ніхто яшчэ не ведаў, бо хлопец саромеўся пра гэта гаварыць.

— Хто ж яшчэ мог запаліць, ад чаго такая бяда? — згадваў старшыня. Ён да таго змарыўся, што ледзь плёўся ў сяло.

Каця зірнула на яго і схапілася за грудзі рукою. «Бяда... Чужая бяда... Мусіць, ён тут быў, Віктар, мяне шукаў...» — падумала яна.

— Ой, мусіць, гэта Віктарава работа! Яго, дзядзечка! — сказала ціха старшыні. Той паглядзеў на яе ўважліва.

— Ты што гаворыш? Ён вунь спіць без задніх ног, які чорт панясе яго ноччу на ферму?

— Вось тое і яно, што Віктара даўно чорт носіць, а вы не бачыце! Ніхто не бачыць... Бяда чужая, нікому да яе і спраў няма. Пачакайце, дарага абыдзецца вам гэтая бяда!..

Корань ведаў, што жыццё ў Каці не клеіцца, але не мог здагадацца, чаму яны не ладзяць. Таму, што Віктар п'е гарэлку? Ці таму, што ён заляцаецца да другіх жанчын? Так, прынамсі, думаў ён і добрая палова сяла. І зусім не ведаў Корань, што самае паганае ў Віктару — яго натура. З чужымі ён быў абыходлівы і проста смешны добры дзядзька, а дома станавіўся зверам. Аб гэтым ведала толькі Каця, аднак доўгі час яна не магла вынесці тое смецце на людзі. Яны, праўда, слухалі, спачувалі, але былі далёка ад веры ў тое зло, аб якім іншы раз гаварыла жанчына...

«Чорт яго ведае, можа, і праўда Віктар запаліў? Калі жонка гаворыць, нешта ж яна знае»,— падумаў Корань. І як ён ні быў змораны, вырашыў зайсці да Віктара.

Як толькі ляпнулі дзверы, Віктар усхапіўся і сеў на ложку. Калі б у старшыні была хоць кропля назіральнасці, то па гэтым нервовым, неспакойным сне п'янага ён зразумеў бы многае.

Пры яркім электрычным святле Віктар выглядаў мерцвяком. Худы, сіні ад гарэлкі, непаголены, з глыбока запалымі вачамі, ён спалохана пазіраў на старшыню, які паволі прайшоў да стала і сеў на крэсла.

— Дакаціўся! Да ручкі дабіўся, галубок! — ён паказаў на абломкі шафы, што валяліся на падлозе.— Сёння ж буду званіць участковаму і ў раён! Як жа з табою жыць Каці, га?

Віктар маўчаў, тупым позіркам глядзеў на падлогу і думаў зусім аб іншым. У яго працверазелай галаве з'яві-

лася адна неадступная думка: бачыла яго каля фермы Лена ці не? Ён ляжаў і думаў толькі аб гэтым.

Сеў — і зноў тыя ж думкі. Што там здарылася на пажары — пагарэлі ўсе каровы ці толькі частка,— яго зусім не цікавіла і не займала. Яго страшыла толькі адказнасць. Цяпер нават растрата ў магазіне і «чорная кніжка» здаваліся мізэрнай вінoю перад той, што так нечакана зваліласяна яго галаву. Віноўнікам сябе ён не лічыў. Ён быў толькі пакутнікам ад розных няшчасцяў, якія неадступна ідуць за ім усё жыццё...

— Ты ведаеш, што гавораць людзі? — раптам спытаў старшыня і толькі цяпер пільна зірнуў на Віктара, шукаючы на яго твары збянтэжанасці. Але яе не было, Віктар на момант узняў галаву і спакойна спытаў:

— Што?

— Цябе бачылі каля фермы да пажару...

Віктар усміхнуўся. «Трасцу ты мяне зловіш на гэтым! Да пажару мяне ніхто не бачыў. Лена бегла, калі ўжо гарэла»,— падумаў ён і адказаў:

— Не маглі людзі бачыць чалавека там, дзе яго не было. Гэта хлусня...

— Трэба будзе праверыць — ці хлусня...

— Правярайце... А што, каровы пагарэлі? — проста спытаў Віктар.

— Людзі пагарэлі,— устаўшы, адказаў старшыня.— І якія людзі! Васіль, Лена...

— Лена і Васіль? — узняў галаву Віктар.— Што з імі?

— Ты вось адкажы мне — што з Кацяй, дзе яна? Дзе тваё дзіця? Нашто ты пабіў шафу? Ох, прагледзелі мы многае! Усё верылі, давяралі... не-е ўжо! Цяпер я вазьмуся за вашу скуру! Ой, вазьмуся!..

Корань грукнуў па стале кулаком і выйшаў.

Віктар хуценька сабраў на падлозе абломкі шафы і вынес іх на дрывотнік. Потым злазіў на гару, дзе ў яго было напасена каля дзесяці бутэлек гарэлкі, усунуў адну ў кішэню і вярнуўся ў хату. Сеў у цемнаце каля стала, паставіў перад сабою паўлітра, з палёгкай уздыхнуў.

— За тое, што ўсё шыта-крыта, не грэх і выпіць! — наліваючы ў шклянку гарэлку, захіхікаў ён.— Лена згарэла? Тым лепш: а раптам яна бачыла? Га? А што б тады было рабіць?.. Ох, якая горкая гарэлка, бадай яе пяруп! Але ж і без яе...— На хвіліну Віктар задумаўся.— Што ж гэта без яе? Ага, во — жаўранкі рыпяць, як непадмазаныя

калёсы! Колькі таго жыцця? Нуль! А раз нуль, то буду піць! Варона салаўём здасца! Здасца... Трасца... Га? Чаму гэта я адзін? А дзе ж Каця? — у хаце... Вось вып'ю яшчэ і тады...

Рэвізор, што прыехаў раніцою з раёна, застаў Віктара за гэтым жа сталом і ў тым жа стане. Каля стала валяліся парожнія бутэлькі. На стале — разбітая шклянка, кавалак чэрствага хлеба, зялёная цыбуля.

— Ісці з вамі? Калі ласка,— не маючы сілы падняцца, Віктар зваліўся на падлогу, захроп...

* * *

Лена зусім не магла спаць. І хоць ёй строга загадалі не падымацца з ложка, яна падыходзіла да дзвярэй суседняй палаты і ціха пыталася:

— Сястра, ну як ён?

— Крыху лепш... Спіце.

Васілю не было лепш. Твар яго быў забінтаваны так, што калі б не чорныя, запечаныя вусны, якія ярка вылучаліся між белай марлі, то наогул цяжка было б здагадацца, што гэта твар.

Васіль аслеп адразу, раптоўна. Цяжкія раны ад апёку на руках і спіне, ад болю якіх ён страціў прытомнасць, цяпер, здавалася хлопцу, перасталі ныць. Гэта яму далі штосьці выпіць, каб зменшыўся боль. Васіль ціха паклікаў:

— Доктар...

— Я тут, ля вас,— адказаў галоўны ўрач бальніцы, здзіўлены незвычайным цярпеннем чалавека.

— Гэта... няпраўда, што... Лена згарэла? Не? Гэта сон?.. Скажыце, доктар...

— Паклічце Жураўскую! — раптам загадаў доктар сястры.— Хутчэй, калі ласка!..

Лена сама чула гэты загад. Яна адчыніла дзверы і, стараючыся не кульгаць, падышла да ложка, на якім ляжаў Васіль. Хвіліну глядзела на яго і ад хвалявання не магла вымавіць ні слова.

— Гаварыце да яго,— шапнуў доктар.

— Васіль! — вымавіла Лена, і сама не пазнала свайго слабага голасу.

Вусны Васіля задрыжалі, левая рука зварухнулася.

— Добра...— нарэшце выдыхнуў ён.— Цяпер-то ты мне даруеш...

— Мне няма чаго даравацъ табе, Васіль,— выціраючы слёзы, адказала яна.— Ты ніколі не быў вінаваты...

Рука Васіля ўзнялася і павісла ў паветры.

— Шкада... Больш ніколі я не ўбачу... Там, пад тваім акном, я пасадзіў кветкі... ружы. Яны застаюцца з табою, Лена...

Гэта былі яго апошнія словы. Васіль паклаў руку на грудзі і заціх. Лена зірнула на доктара. Той толькі паціснуў плячамі і правёў яе да дзвярэй.

— Калі да раніцы вытрымае, то застанецца жыць,— сказаў ён.— Вялікая плошча апёку, перасадку рабіць нельга...

Яна гэта ведала.

Лягла на ложак такая зморапая, быццам цяжка напрацаваўшыся. «Калі да раніцы вытрымае... Няўжо яму няма як памагчы, няўжо ўся надзея на сэрца?» — падумала яна. І гэтая думка не давала спакою да самай раніцы. Лена лічыла хвіліны, гадзіны. Яна не зводзіла воч з насценнага гадзінніка. І ён падвёў яе. Ён раптам расплыўся на сцяне і знік...

У тую ж хвіліну Лена ўбачыла, як адчыніліся дзверы суседняй палаты і медсястра вывела за руку Васіля. Ён усміхаўся ёй. Моўчкі падышоў да яе ложка і, нахіліўшыся, пацалаваў у вусны. Лена абвіла яго шыю рукамі і спытала:

— Усё ўжо? Не баліць табе, Васіль?

Ён пакруціў галавою.

— Доктар так і казаў, што калі да раніцы вытрымаеш, то будзеш жыць! Але ж яшчэ не раніца...

Лена зірнула на акно, на электрычнае святло і паднялася з ложка. Працягнула руку, каб дакрануцца да Васіля, але ён неяк плаўна адсунуўся ад яе. І паплыў, паплыў, махаючы рукою і ўсміхаючыся. Усё далей, далей, пакуль не ператварыўся ў чорную кропку. Потым тая кропка пачала расці, расці і вырасла ў насценны гадзіннік...

Лена расплюшчыла вочы.

...У акне палаты свяціла сонца. Гадзіннік паказваў роўна восем. «Божа! Гэта ж я заснула»,— падумала Лена і, ускочыўшы з ложка, крыкнула:

— Сястра!..

Дзяжурная сястра стаяла каля белых фіранак адчыненага акна. Яна нават не зварухнулася, нібы і не чула воклічу.

— Сястра.— Лена падышла да яе.— Скажыце, што з ім? Я так неасцярожна заснула...

— А што б вы маглі зрабіць, калі б і не спалі? Што?..

Медсястра павярнулася. Лена ўбачыла на яе твары слёзы і збялела...

Пасля з Ленай рабіліся жахлівыя праявы: прыходзілі Васілёвы сёстры, мітусіліся па палаце каровы, шугала полымя. Цямнела і развіднівала...

То бачыўся Віктар. Худы, аброслы. Лена глядзела на яго і гучна гаварыла: «А за смерць Васіля хто адкажа? А кароўнік хто падпаліў?» — «У смерці Васіля вінаваты ўсе»,— спакойна адказваў Віктар. «Як гэта ўсе?» — «Усё сяло... Гэта вы не трымалі мяне, вы спойвалі гарэлкай, вы!..» Віктар замахнуўся на Лену, але аднекуль з'явіўся Пятро, схапіў яго за руку і крыкнуў: «Стой, хопіць! Па цябе прыйшлі!..»

Лена адкінула коўдру: было душна. Не хапала паветра.

— Да вас прыйшлі! — раптам пачула яна. Узняла галаву і зноў апусціла яе: у дзвярах стаяў Пятро. У руках ён трымаў пакунак. Тым імгненным позіркам прыкмеціла, што хлопец яшчэ больш загарэў, ад чаго твар стаў смуглявым. Але сёння, цяпер, пасля стольких пакут, Лена не хацела б сустракацца з Пятром. Яна зноў узняла галаву і паказала на крэсла каля ложка. Перасіліўшы сябе, сказала:

— Праходзьце, сядайце.

Падбіла вышэй падушку, села, абапёршыся плячамі.

Пятро павольна падышоў да Лены і моўчкі пацісну яе хударлявую руку. Паклаўшы на тумбачку пакунак, ён нарэшце загаварыў:

— Я пра ўсё даведаўся толькі сёння раніцою... І вось прыехаў на веласіпедзе. Скажыце, калі ласка, як вы сябе адчуваеце?

— Нічога сабе, дзякую... Мне няма на што скардзіцца. Крыху апяклася, пройдзе, а вось Васіль...

Яна не дагаварыла: слёзы набеглі на вочы.

— Васіля шкада,— уздыхнуў Пятро.— Ён аказаўся добрым салдатам: не кінуў таварыша ў бядзе...

Гэты напамін непрыемна ўкалоў Лену. Яна нахмурылася і сказала:

— Лепш бы хай я сама...

Лена лічыла, што ў смерці Васіля і яна вінавата.

Пятро не ведаў, які непамерна вялікі цяжар ляжаў на яе сэрцы. Ён мог думаць толькі аб тым, што яна бязмежна

ўдзячна Васілю, але ўдзячнасць сваю ўжо няма каму выказаць. Таму і туманяцца яе ясныя цудоўныя вочы...

Раптам Лена ўспомніла свае ранейшыя думкі і мроі пра Віктара, ціха спытала:

— Вы ведаеце, хто запаліў кароўнік?

— Пакуль яшчэ не. А што?

— Ва ўсім вінаваты той чалавек, пра якога ўсе забыліся. І вы ў тым ліку...

Пятро запытальна паглядзеў на Лену.

— Віктар... падпаліў кароўнік,— растлумачыла яна.— Я сустрэла яго, калі бегла на пажар...

— Вось яно што! — усклікнуў Пятро.— Вы аб гэтым нікому не гаварылі?

— Не...

— Віктара арыштавалі. Праўда, за растрату. А тут яшчэ гэтая віна!.. От чалавек.

— Вы ведалі гэта даўно. І маўчалі. Як усе...

— Я ж у Зазер'і чужы,— паспрабаваў апраўдацца Пятро.— Быў у нас інспектар раёна нехта Дзеравяга... Дык пакуль справа да райкома не дайшла, мне на слова ніхто не хацеў верыць, што інспектар злоўжывае сваімі абавязкамі. А за Віктара было ўсё сяло...

І хоць з гэтым довадам Лена пагаджалася, цяпер чамусьці ёй не хацелася даравацъ Пятру нават самую малую частку яго віны ў чым-небудзь. Ёй не хацелася, каб ён нагогул тут быў. Не таму, што ў яе былі крыху абпалены бровы і нават доўгія прыгожыя вейкі, што рука і нага былі забінтаваны, што яшчэ кружылася ад слабасці галава. У яе душы яшчэ не ўлягліся хвалі перажытай буры.

Пятро адчуваў яе настрой, устаў і на развітанне прамовіў:

— Я буду прыходзіць да вас часта. Вы не пярэчыце?

— Калі вы будзеце прыходзіць разам з Волькай,— адказала Лена.

— Згодзен! Папраўляйцеся хутчэй. Памятайце — вас чакаюць у Зазер'і.

І пайшоў.

Так вось і пацяклі для Лены цяжкія дні бальнічнага жыцця. За гэты час яе наведвалі многія, і самым частым госцем быў Алесь. Толькі гэта быў ужо не той Алесь, якога Лена ведала раней. Цяпер перад ёю быў сарамлівы, немнагаслоўны хлопец, чыста апрануты. Замест папярос яго кішэні былі заўсёды поўныя цукерак. З ім Лене было куды вальней і прыемней, чым з Пятром.

Неяк аднойчы яна сказала:

— Пэўна, зноў квактух возіш? Адкуль у цябе цукеркі?

Алесь азірнуўся на суседнія ложкі і ціха прызнаўся:

— Курыць адвыкаю... Дык смакчу замест папярос.

— Праўда? — здзівілася і ўзрадавалася Лена.

— Як піць даць!..

Яны абое засмяяліся. Аднак ёй стала не да жартаў, калі Алесь паведаміў, што ў Віктара вялікая растрата, што Каця з дзіцем перайшла да каваля жыць, а Віктар, якога адпусцілі, пакуль ідзе следства, раз напіўся і ледзь не спаліў сваю хату. Тады яго зноў арыштавалі...

— Якое там яшчэ следства, калі я сама бачыла, як ён уцякаў з фермы, калі быў пажар? Хто яго праводзіў, тое следства? — абурылася Лена.

— Прыязджалі з раёна... Пагутарылі са старшынёю і паехалі. Цяпер-то ўжо не выпусцяць! Як піць даць...

Алесь крыху пачырванеў пры словах «як піць даць», ды цяпер Лена не звярнула на гэта ўвагі.

— А памятаеш,— сказала яна,— ты з ім хаўруснічаў. Ты ж тады не лепшы быў за Віктара...

Алесь упершыню асмеліўся папікнуць Лену:

— Навошта чапаць тое, што мне самому брыдка ўспомніць?

— Гэта праўда, Алесь, прабач...

— Прабачаць тут няма чаго,— пачаў ён, апусціўшы галаву.— Я перад табою вінаваты куды больш, чым ты думаеш...

— Чаму ж?

Алесь паглядзеў на яе сумнымі, даверлівымі вачамі і ўстаў з крэсла, на якім сядзеў.

— Н-не магу я сказаць... Бывай, Лена, другім разам як-небудзь! Цяпер — не магу!..

Але яна схапіла яго за рукаў і зноў прымусіла сесці.

— Ты мне скажаш сёння...

Алесь узняў галаву і сустрэўся з халодным рашучым позіркам Лены. «Такім вачам не зманіш ніколі і не схаваеш ад іх нічога»,— падумаў ён і сказаў:

— Толькі ты не злуйся на мяне. Па-дурному ўсё вельмі выйшла. Сардэчная лінія, як кажуць, заела! — і, памаўчаўшы, дадаў: — Віктара тады пад вокны я паслаў... Калі ты Пятра абсушвала. Дужа ж мне тады крыўдна было... Я хацеў...

— Давесці, што Пятро са мною быў нездарма, як потым казалі. Але які ж ты пягоднік, Алесь! Волька кахае Пятра па-сапраўднаму, у іх ужо і да вяселля недалёка,— у задуменні прамовіла Лена.— А чаго сам дабіўся? Сораму...

— Што ж мне цяпер рабіць?

— Быць чалавекам... Не такім, што чакае, калі гэта можна будзе не рабіць, а есці...— адказала дзяўчына.

— Чалавекам я буду... Але што цяпер мне рабіць? — зноў паўтарыў ён сваё пытанне, падаўшыся наперад і застыўшы ў нямым чаканні, быццам яна, гэтая хворая душою дзяўчына, магла раптам вырашыць тое адвечнае пытанне.

— Жыві, Алесь, сумленна, любі людзей, рабі для іх усё, што можаш зрабіць, а шчасце само прыйдзе. Не ганяйся за ім, а то адпудзіш,— разумеючы хлопца, проста параіла Лена.

Алесь шчыра паціснуў ёй руку і сказаў:

— Дзякую, Лена... Ну чаму ў цябе ўсё так ясна, проста? З табою так лёгка, так хораша на душы, што не ведаю, як і дзякаваць, што не гоніш мяне...

— І не трэба! — строга прамовіла Лена.— Я — зазерская, свая. Чаму не параіць добраму добрае? Ды, урэшце, не вялікая і не мудрая гэта парада...

Алесь уважліва паглядзеў Лене ў твар, на яе прыпухлыя вусны і малы просты нос.

— Марыльчына Гэлька... Як ты вырасла! Вышай за ўсіх нас...

— Праўда? — усміхнулася яна.

— Праўда... Малая Марыльчына Гэлька была непрыгожая, непрыкметная...

— І над носам у яе заўсёды было што выцерці! — з усмешкаю дадала Лена.— А цяпер?

Алесь стукнуў кулаком сабе па калену.

— Эх, чорт, а не дзеўка! Кавяліху, язву тую, і то прымусіла на поле пайсці! А за той — усе кватухі папляліся. Я абяцаў іх бясплатна вазіць у раён кожную нядзелю! — сказаў ён.— Ну, трымайся, Лена, бягу... цалую цябе, Лена! Моцна!..

Медсястра, што ўвайшла ў палату, здзіўлена паглядзела на такога ўзрушанага наведвальніка.

— Не падумайце чаго...— прамовіла Лена, калі дзверы за Алесем закрыліся.— Ён — закаханы... Скажыце, мілая, ці доўга мяне яшчэ тут будуць трымаць, зусім здаровую?

— Дні два,— адказала дзяўчына, паволі набліжаючыся да Лены.— Вось гэта... пачытайце.

І, паклаўшы на тумбачку газету, выйшла.

Лена ўзяла газету і прывычна прабегла па загалоўках позіркам. Краіна, увесь народ, абмяркоўвалі праект новай Праграмы КПСС. Гонар за нашу партыю, якая дала людзям такую Праграму, веліч падзей, радасць і натхненне працоўнага чалавека — вось што было зместам газеты. І раптам... На апошняй старонцы, усярэдзіне, была невялічкая карэспандэнцыя пад загалоўкам «Геройскі ўчынак». Лена захвалявалася, перавяла дыханне, зажмурылася: душою адчула — пра іх гэта, пра Васіля і яе...

Нарэшце прачытала. Там лакапічна паведамлялася, што ў калгасе «Ленінскі шлях» нечакана ўспыхнуў на кароўніку пажар, што калгасны бухгалтар В. Цалавальнік, які быў непадалёку, і бібліятэкарка Л. Жураўская самаадданa і мужна кінуліся на месца здарэння і выратавалі калгасны статак. Лену ўзнагародзілі медалём «За адвагу», а Васіля, пасмяротна,— ордэнам Чырвонай Зоркі.

Лена прыціснула газету да грудзей, усё-ўсё перажыла спачатку, паплакала ўдосталь. А потым падумала: «Вось як гэта ясна і проста! Самаадданa і мужна... А колькі цяпер жыццёвай горычы, душэўных пакут! Ну няхай бы Васіль застаўся жыць!..»

Яна, можа, у соты раз абдумала ўсё спачатку, ад загаду Васіля бегчы ў сяло да таго цяляці, якое дорага каштавала ім абаім. І ўсё, што было б там, на пажары, без яе, Лены ўяўляла на розныя лады.

* * *

«...І яшчэ паведамляю вам, што вышэйупамянуты П. Жывіца, маючы на ўвазе захоп поўнай улады над школаю, дабіўся-такі змяшчэння маёй асобы з пасады дырэктара, якім стаў часова сам, не ў карысць агульных інтарэсаў, а з карыслівымі поглядамі на гэтую пасаду...» — нізка схіліўшыся над паперай, Іван Савіч Круцько пісаў скаргу ў вобласць. Яго пакрыўдзілі. Знялі з пасады, далі вымову і прапанавалі перасяліцца далей ад школы... Такога краху Круцько не пацерпіць...

Мякка крэкнуўшы, ён з асалодай пазяхнуў і, прыкрываючы шырокі рот далоняю, сказаў сам сабе:

— Я ўжо дам задачу! Не на таго парваліся,— і, пагразіўшы камусьці вузлаватым пальцам, дадаў: — Да міністра

дайду! Па інстанцыі, па інстанцыі, галубкі... Субардынацыя, парадак і закон — у першую чаргу. Так-то, мае дарагія і шаноўныя, трасцу б вам на вячэру!..

Каля акна, на старым расшатаным крэсле, чырвоная і санлявая, сядзела Ліпа. Яна абірала бульбу. На падлозе з аднаго боку стаяў кош з бульбай, а з другога — чыгун.

— Што ж там у сяле за жыццё будзе, га? Жыць дзе будзем? — кідаючы бульбіну ў чыгун, жаласлівым голасам пыталася яна і, не атрымаўшы адказу, зноў брала з каша бульбіну.

Жонка перашкаджала думаць, пісаць. Яе радня не дапамагла. Уся надзея цяпер на гэтую паперку, якую так цяжка напісаць...

Іван Савіч заткнуў вушы рукамі, задумаўся. Ліпа крычала мацней бясконцае «што ж там у сяле за жыццё будзе, га?». Круцько ўсклікаў «зарэзала» і «атруціла», але жонка настойліва, як аўтамат, паўтарала сваё пытанне. Напісаўшы ў сваёй скарзе ўедлівы сказ «што ж там у сяле за жыццё будзе, га?», Іван Савіч нарэшце не стрываў. Як толькі жонка зноў падала голас, адказаў:

— Раскулачаць цябе, заядзь! Ава... Авадніца ты! Саранча!..

Не знёсшы такой абразы, Ліпа перабралася на ганак. Іван Савіч задаволена ўздыхнуў і прыняўся перапісваць усё спачатку. Ледзь толькі ён дайшоў да сказа «што ж там у сяле за жыццё будзе, га?», як пачуў на ганку крокі. Хуценька ўткнуў галаву ў паперыну і выставіў на дзверы хвігу.

Дзверы адчыніліся. І раптам Круцько пачуў, што хтосьці смяецца. Узняў галаву і сумеўся. На парозе ўбачыў адразу трох чалавек: старшыню, Жывіцу і Алеся Зыблюка.

— Першы раз у жыцці мяне так сустракаюць! — звярнуўшыся да Жывіцы, з ухмылкай зазначыў старшыня.

— Гэта не я! Гэта — Ліпа — жонка,— шырока раскрыўшы свае маленькія палахлівыя вочкі, апраўдваўся Іван Савіч.— Праз яе ўсё ліха гарыць. Праз яе адную... Заела яна мяне, зарэзала! Давяла да сораму такога, купчыха!..

— Дык, можа, дазволіш у хату зайсці? — перабіў яго старшыня.— Апраўдвацца будзеш на судзе...

— Га? На судзе? На якім судзе, завошта? — яшчэ больш спалохаўся Іван Савіч, пацiху збіраючы напісаную

паперыну ў кулак.— Ці ж я злодзей? Ці забіў каго? У мяне ўсё ў парадку, закон!..

— Гэта жарт... Прымаўка такая ёсць,— растлумачыў Алесь і дадаў: — Дык зайсці да вас можна?

— Ах, калі ласка!

— А зайшлі мы, Іван Савіч, параіцца з табою,— сказаў Пятро, спыняючыся каля вялізнай шафы. Старшыня сеў да стала, а Зыблюк застаўся ля дзвярэй.

— Параіцца? Са мной? — здзіўлена спытаў Круцько.— А што я магу параіць, калі мяне з дырэктараў. Гэта самае... У мяне самога бяда, баба засла... Што ж там у сяле за жыццё будзе, га?

— Вось аб тваёй бядзе мы і прыйшлі параіцца,— адказаў яму старшыня.

— Ну, дык сядайце ўсе да стала... Ліпа! Дзе ты, Ліпа? — гукнуў жонку Круцько.— Прынясі нам тут чаго-небудзь...

— А несці нічога не трэба! — гучна прамовіў Пятро.— Размову з гэтага «прынясі чаго-небудзь» мы і пачнём... Згодны ўсе, таварышы? — ён абвёў прысутных суровым позіркам, дадаў: — У нас гэтае пытанне даўно трэба было паставіць першым.

— Што праўда, то праўда,— пацвердзіў старшыня.— Ёсць яшчэ людзі, якія скардзяцца на майго брыгадзіра Зыблюка так: чорт, а не чалавек! І гарэлкі не бярэ, і каня не дае... Мала такіх, але ёсць! Да вас не заходзілі такія людзі, таварыш Круцько?

— Былі... Заходзілі,— уздыхнуў той.— Ды я і сам не лепшы, бо прымаў. Але гэта не я! Ліпа ўсё, праз яе ліха...

— Ну, досыць вініць жонку,— перабіў яго Пятро.— Давайце падумаем пра тое, дзе вам лепш будзе. Можа, у хату Жураўскай пераедзеце. Пустуе... Трэба, каб школа была падобна на школу, а не на хутар які ці птушнік... Хутка пачнуцца заняткі...

— Сапраўды, мнагавата курэй развёў ты, Іван,— па-свойску заўважыў яму Корань.— Калгаснікі па стольki не трымаюць... А твае трое парсюкоў? Што ты — гандляваць сабраўся ці сам будзеш спажываць гэтулькі?

Пачуўшы, што гаворка ідзе пра тое, дзе ім жыць, Ліпа падкралася ззаду і шапнула Івану на вуха:

— Няхай пабудуюць каля ручаіны хату... За хвойнікам. Там цэлая паляна зямлі...

— Трасцу! — крута павярнуўшыся, гыркнуў Круцько.— Кукіш з маслам табе, а не хату! Заела! Зарэзала! До-

сыць!.. Гэта ты нагаворвала: грукай — адчыняць. Грукнулі мы! Зачынілі! Чаго табе яшчэ? Зямелькі?.. Трасцу!

Ліпа стаяла, нібы аглушаная громам з яснага неба, і здзіўлена глядзела па свайго «ціхага» і «пакорлівага» Івана. «Адкуль узялася такая смеласць?» — думала, не ў сілах вымавіць слова. Потым павярнулася і пайшла да дзвярэй.

— Дзе тут у вас можна знайсці халоднай вадзіцы? — спытаў Алесь і ўслед за Ліпай выйшаў на ганак.

Корань падміргнуў Івану Савічу і таямніча сказаў:

— Яшчэ скажы дзякуй, што ў вобласць не пісаў. А то ўздумаў бы туды напісаць — прапаў бы зусім! За паклёпы ды хлусню моцна б'юць. А тут толькі з Пятром месцамі памяняліся. Калі ў культурную работу ўключышся ды сваіх свіней кінеш — добрую хату дам...

Круцько непрыкметна ўсунуў скамечаную паперыну ў кішэню і з упэўненасцю адказаў:

— А які гэта дурань будзе пісаць у вобласць? Са сваімі... яно лепш палаяцца. Ды ну яе, гэтую работу, да д'ябла! Пісаць! Я сам ніколі не думаў нават. Жонка!..

— Табе сказалі — не валі ўсё на жонку,— заўважыў Корань.— Сам жа не лепшы. Не яна надпісвала паперку ў раён... Ну, дык гавары — едзеш у сяло? Можаш і да мяне. Цэлая палавіна хаты пустуе!..

Зірнуўшы на школьны двор, дзе стаяла калгасная машына, Іван Савіч махнуў рукой, як адрэзаў:

— Грузіце! Пераеду да вас...

* * *

Шмат падзей адбылося ў гэтыя дні ў Зазер'і.

Зноў прыязджаў сюды сакратар райкома, пракурор, следчыя... Каця расказала ў сяле, што Віктара абвінавачваюць у пажары.

— Во гад, што натварыў! — абураліся жанчыны.— Няйначай, кончыць ён шыбеніцай...

Аднак самай важнай навіной быў усё ж той роздум людзей над сваім жыццём, над сваёй роляй у жыцці.

Як выхад на арбіту першага спадарожніка зямлі, як палёт чалавека ў космас, авалодаў думкамі людзей праект Праграмы. Прызвычаеныя да небывалых, амаль фантастычных навін, зазерцы і гэтую навіну, што яны будуць жыць яшчэ лепш, прынялі як звычайную, заканамерную. Упэўненасць прыходзіла штодня. Аднойчы вечарам стар-

шыня гаварыў зазерцам, што трэба зрабіць ім канкрэтна, каб наблізіць той вялікі дзень. Ён давёў, што толькі прыбытак ад возера, калі па ім пабудаваць птушкаферму, намнога памножыць багацце калгаса. Нямала дасць і сад, калі палеткі пакрыюцца дрэвамі. Надзеі — здзяйсненні!

Да позняй ночы гаварылі тады зазерцы, меркавалі...

Не прымала ўдзелу ў той гутарцы адна толькі Каця. Ёй было нявесела. Застаўшыся адна, яна раптам востра адчула адзіноту. Ёй здавалася, што жыццё спынілася, застыла: адна! Надта ж страшна пускацца ў жыццё адной! Як выгадуе яна сваю дачку? Ці хопіць у яе сілы? Адна... На ўсё жыццё. Каці часам думалася, што варта было Віктару хоць захварэць на тыдзень, і ён бы змяніўся. А цяпер надзеі няма...

Жанчына сядзела адна ва ўсёй хаце і ні за што не хацела брацца. Дзеля якой мэты наводзіць тут парадак? Дачку яна пакінула ў маці, каб хоць трохі ачуняла там, супакоілася. А сама засталася. Ёй трэба пабыць адной і падумаць над сваім лёсам. Калі было весела — Каця гуляла весялей за ўсіх. А здарылася гора — яна сумуе і перажывае больш, як хто другі. Нават па чужой бядзе яна загалосіць першая. Такая ўжо ў яе натура...

Кацю нават не ажывіла, не абудзіла навіна, якой жыло ўсё сяло. Яна чакала Лену. Лена адна можа ёй памагчы, навучыць, як жыць далей. І не памылілася.

Ледзь толькі Лена вярнулася ў сяло — адразу пайшла да Каці.

Каця заўважыла Лену на сваім двара зусім неспадзявана. Яна забегала па хаце. Але дзверы адчыніліся так хутка, што яна нічога не справілася зрабіць. Нават ложак быў не засланы.

— Ну, здарова, Каця, як жывеш? — ступіўшы цераз парог, прывіталася Лена і, не стрымаўшыся, кінулася да яе, як да сваёй сястры, абняла за плечы.— Ах ты, савулягрызуля! Чаго нос павесіла? Жыццё толькі пачынаецца, Кацька!..

Тая так расчулілася, што не магла вымавіць ні слова. Адзінае, на што яна была здатна ў гэтую хвіліну, гэта — пусціць слёзы. І яна заплакала бязгучна, з душэўным надрывам, з ліўнем буйных слёз.

— Ты не зважай, Леначка... Не зважай на мяне, дурную. Я заўсёды была дурніца,— выціраючы ражком квяцістай хусткі, што была на плячах, свае чырвоныя ад плачу вочы, гаварыла Каця. Яна абняла Лену, і тая не стры-

малася, таксама заплакала. Так стаялі яны сярод хаты і плакалі, паддаючы адна адной ахвоты...

А на двару ўжо сабраліся суседзі. Былі тут і Волька, і каваліха, і Алесь.

— Паглядзі, Алесік, што яны там робяць,— не вытрымала дапытлівая Зося.— Трэба прывітаць Гэльку, пажадаць ёй, даражэнькай, здароўя...

Алесь асцярожна зазірнуў у акно праз куст бэзу і, панурыўшыся, адказаў:

— Плачуць...

— Што? — насцярожылася каваліха.

— Плачуць. Стаяць сярод хаты і плачуць...

Зося скрывіла вусны, часта-часта заміргала вачамі і раптам загаласіла на ўвесь двор так, што аж суседскія дзеці, якія прыйшлі з імі, спалохана падаліся за вароты.

— Волечка, уключайся і ты, цэлая сімфонія будзе,— сказаў дзяўчыне Алесь.

Лепш бы ён так не гаварыў! Волька павярнулася да яго і дакорліва заківала галавой:

— Бервяно ты бяздушнае! З чаго жартуеш? З чужой бяды?..

—І са сваёй бяды, Волька! — звёўшы бровы, сказаў Алесь.— Нічога ты не бачыш, авечка сляпая...

— Што? — ціха спытала Волька. Падышла да Алеся і здзіўлена паглядзела на яго, зусім не падобнага на бервяно, як сказала ў злосці, схуднелага.

Алесь паглядзеў на яе зверху ўніз і, глыбока ўздыхнуўшы, прамовіў:

— Ты шчаслівейшая за мяне... Трэці год, як няма спакою майму сэрцу! Ці ж здолее яно трываць далей? Ці ў возера галавою, Волечка!..— і, махнуўшы рукою, шпарка пайшоў з двара.

«Што ж гэта ён мне нагаварыў? — пазіраючы ўслед Алесю, падумала Волька.— Лену любіць... А яе ж кучаравы можа вярнуцца. Дык, чаго добрага, яшчэ сапраўды ўтопіцца хлопец... Адважная ён галава!..»

З суседкамі пайшла ў хату і Волька. Там ужо было многа народу. Яна прабралася каля печы ў кут і адтуль пазірала на Лену. А тая ўжо расказвала жанчынам пра сваё жыццё ў бальніцы, пра тое, як пакутаваў і памёр Васіль...

Зося зноў загаласіла, а ўсе астатнія схапіліся за свае хусткі.

«Няўжо Лена не пакахае беднага Алеся? — думала

Волька.— Яна ж такая добрая, чулая... Як тут быць? Трэба спярша даведацца, ці праўда, што Лена сама прагнала Анатоля, і тады...»

Волька вырашыла памагчы Алесю.

* * *

Жыццё ніколі не стаіць на месцы. У тым яго сіла, у тым яго магутнасць. Што б там на свеце ні было, што б ні здаралася, а жыццё бяжыць сваім парадкам...

Ужо на другі дзень Лена з самай раніцы панасіла з возера вады і паліла ружы пад акном, якія той страшнай ноччу пасадзіў Васіль. «Кветкі застаюцца з табою»,— успомніла яна яго апошнія словы. Лена чакала чытачоў, без якіх так сумавала ў бальніцы. І да яе ішлі ўвесь дзень. Ішлі дзеці, старыя, маладыя...

«Ну, вось... прайшло ўсё, забылася. Быццам нічога і не было. Засталіся кветкі. Кветкі і ўспаміны. І дзеці, як нашы кветкі... І ўсе людзі, што прыходзяць сюды па кнігі... Жыццё імчыць, імчыць...» — думала Лена, зусім не падазраваючы таго, што мінулі яшчэ не ўсе нягоды, якія выпалі на яе долю, што лёс падрыхтаваў ёй новае суровае выпрабаванне...

Быў звычайны летні адвячорак. У чытальнай зале было людна. Волька цяпер штодня займалася ў бібліятэцы, чакаючы свайго Пятра. Алесь прыходзіў адразу пасля працы, садзіўся да Волькі і моўчкі назіраў за выразам яе твару, чакаў навін. Навін не было. Волька ўздыхала і калючым позіркам глядзела на Лену.

Седзячы за сваім сталом з раскрытай кнігай, Лена ўлаўлівала іх позіркі, здагадвалася, што садзяцца яны побач не так сабе, не выпадкова. «Нешта, мусіць, уздумалі. Чым яны не задаволены? І няўжо не можа зразумець Алесь, што яшчэ вельмі жывыя ўспаміны аб Анатолю, яшчэ не згасла маё каханне?..»

Як толькі ў чытальню ўвайшоў Пятро, Волька адразу ўпілася ў яго сваімі маленькімі вочкамі. Лена аж усміхнулася: як моцна кахае яна свайго настаўніка! Быццам на агні сядзіць дзяўчына, адразу забылася па Зыблюка.

— Пятро! — гукнула Лена.— Ці не здаецца вам, што прыходзіце вельмі позна? У зале вас даўно чакаюць драмгуртkоўцы...

— Ведаў, спяшаўся, але вось што затрымала...

Пятро вярнуўся ў калідор і прынёс прыгожую палічку-шафу. Паставіў каля стала і сказаў:

— Прыміце, Лена, падарупачак ад нашых хлопцаў-майстроў. Самі зрабілі! — і ўжо цішэй дадаў: — У вас, я там бачыў аднойчы...

І хітра зірнуў на Вольку. Іх позіркі сустрэліся. Усе, хто быў тут, засмяяліся, а Волька пачырванела, як бурак.

— Я там бачыў,— працягваў Пятро,— па сцяне нейкую скрынку. Для посуда. Гэта будзе лепш...

— Дзякую,— смеючыся, адказала Лена.— Перадайце вашым майстрам, каб яны часцей наведваліся ў бібліятэку, а то некаторыя па два тыдні кнігі трымаюць.

І ніхто тады яшчэ не думаў, што гэтая паліца для посуда будзе мець і для Лены вельмі важнае значэнне, апрача посуда...

А пакуль што Волька пазірала за Ленай і думала: «Яна ніколі не пакахае Алеся. Яна вельмі многае перажыла за апошні час, страціла дарагога чалавека. Чаму? Няўжо з-за той паскуднай Ліды?»

Пятро падняў палічку, каб занесці яе ў пакойчык да Лены, але яна раптам схамянулася і жартам загаварыла:

— Пакіньце гэта нам з Алесем, а самі, калі ласка, дапамажыце Вольцы справіцца з задачамі...

Пятро засмяяўся. Ён дзівіўся сваёй сарамлівасці перад Ленай, сарамлівасці, неадоленай да гэтага часу. Як падысці да Волькі — не ведаў. Цяпер жа, падбадзёраны Ленай, рашуча падсеў да каханай...

Алесь узяўся дапамагчы Лене з ахвотай. Ён схапіў аберуч тую палічку і хуценька выйшаў за дзверы. У пакой яны ўвайшлі моўчкі, не запальваючы святла.

— Стаўляй тут, пойдзем,— сказала Лена.

— Запалі святло...

— У мяне не прыбрана.

— Дарма...

— Дык мне ж будзе сорамна!

— Гэта здарыцца першы раз...

Лена запаліла святло, прыбрала са стала раскіданыя кнігі. І ўсё. Гэта яна называла «непрыбраным». Алесь засмяяўся:

— Калі за гэткае табе сорамна, Лена, то ў маім пакоі мне трэба счарнець ад сораму на вугаль! Дзе ў цябе малаток?

Лена падала яму малаток. Алесь разбіў ім на сцяне старую скрынку, якую зняць аказалася не зусім проста:

кожная дошка была прыбіта да сцяны вялізным цвіком. Павесіўшы новую паліцу, Алесь хацеў вынесці старыя дошкі на двор, але дзяўчына махнула рукою і сказала:

— Няхай ляжаць ля грубкі. Я іх заўтра раніцою спалю...

Калі ж яны вярнуліся ў чытальню, то ні Волькі, ні Пятра там ужо не было. Збіраліся дадому і другія наведвальнікі.

— Што ж рабіць мне? — спытаў Алесь, калі яны нарэшце засталіся адны.

— Я прыдумала.

— Што?..

— Адну хвіліначку...— Лена стала на крэсла і зняла з паліцы кнігу апавяданняў Чэхава.— Вось... На два-тры вечары хопіць. Прачытаеш — прыйдзеш па другую...

— І ўсё?

— А што ж ты яшчэ хацеў? — прыжмурылася ва ўсмешцы Лена.

— Твая праўда,— згадзіўся Алесь.— Іншага выйсця няма...

— Як піць даць! — падхапіла Лена.

Раптам Алесь угледзеўся праз акно на дарожку, што вяла паўз возера, і шпарка выбег на двор. Вярнуўся з ухмылкай на твары.

— Што здарылася? — насцярожана спытала Лена, нічога не разумеючы.

— Цалуюцца...— аднымі вуснамі вымавіў Алесь.— Волька вісіць у Пятра на шыі, і яны... цалуюцца!

Лена засмяялася:

— Зайздросціш?

— Дзіва што! — і стукнуў кулаком у грудзі: — Эх! Навошта растравілі душу! Напіцца б... халоднай вадзіцы...

Лена падала яму шклянку вады і, пазіраючы знізу, ціха прамовіла:

— Прыгожы ты, Алесь, ды нешчаслівы! Як і я... Адна ў нас зорка, відаць.

— Гэта праўда?— зірнуўшы ў адкрыты позірк блакітных воч, спытаў Алесь.— А той, гарадскі?

— Ты ж бачыш — праўда. У гарадскога сваё жыццё, у нас — сваё... Цяжка, але я забудуся. Праўда, Алесь?..

Алесь пахіснуўся, нібыта п'яны, схапіў яе руку і прыціснуў да сваіх вуснаў. Лена паклала другую руку яму на галаву і лагодна сказала:

— Ідзі... Заўтра ж рана падымацца...

— А ты? — узняў ён твар.

— А я застануся.

Лена правяла Алеся да дарогі, вярнулася ў пакой, распранулася і лягла ў ложак, нават не запальваючы святла. Адразу адчула сябе вельмі зморанай. Ні аб чым стараючыся не думаць, Лена пачала ўжо засынаць, як халодны дотык чыёйсьці рукі пранізаў яе ад плячэй да самых пят.

— Хто тут?! — ускочыўшы з ложка, ускрыкнула Лена. Яна схапіла коўдру і забілася ў кут. Халодным потам пакрыўся твар, млявасць разлілася па ўсім целе. Няўжо яна не зачыніла дзвярэй на засаўку?

— Хто тут?! — паўтарыла яна, адчуваючы, што чалавек не выходзіць.

— А той, каго кінулі ў возера з каменем на шыі, а ён выплыў з рыбінай у зубах! — пачуўся ў адказ хрыплы Віктараў голас.

— А-ай-і-і! Людзі-і!!! — закрычала Лена, скочыла на падлогу, але Віктар схапіў яе за руку.

— Я не бандыт... Не заб'ю цябе ні за данос, ні за тую аплявуху...— Ён моцна пацягнуў Лену да сябе, але яна ўперлася ў яго худыя грудзі рукамі.

— Пусці-і, нягоднік! — зноў закрычала Лена. «Божа... Што ж гэта такое? Нікога тут не засталося... Прапала я...» — не маючы сілы абараняцца, падумала яна. Але гэтае раптоўнае здранцвенне хутка прайшло. Дзяўчына крутнулася і адчула, што падае. Моцна ўдарылася спіною аб край ложка. Віктар, дыхаючы проста ў твар перагарам, кінуў яе на ложак, схапіў аберуч за горла і сціснуў з усёй сілы.

— Будзеш крычаць — задушу! — прыглушана і страшна вымавіў ён. Потым адпусціў рукі і, ірвучы яе кашулю, драпаючы вострымі ногцямі грудзі, зарагатаў, як вар'ят:

— Данесла-а, га-га-га! Трапіла ў мае рукі, гадзюка!

Сагнула ногі ў каленях як магла і, сабраўшы ўсю сілу, штурхнула Віктара ў жывот. Як пярынка, адляцеў ён і грымнуў спіною на дошкі...

— А-а-а!!! — цяпер ужо немым голасам зароў Віктар, лежачы на падлозе.

Лена выкаўзнула з ложка і ў момант апынулася на ганку. Яна імчалася нібы віхор. Нават і не заўважыла, як прабегла каля першых хат. І толькі, калі ўбачыла на лаўцы пад рабінаю хлопцаў і дзяўчат, спынілася.

— Там... у маім пакоі... Віктар...— задыхаючыся, прамовіла Лена і заплакала ўголас.

Алесь, які толькі што падышоў да лаўкі, падхапіў Лену на рукі, зірнуў на падраную кашулю і ўсклікнуў:

— Заб'ю гада!..

Праз момант за ім пабеглі ўсе, хто быў на вуліцы. Але вярнуліся яны ні з чым, Віктар збег, і яго нідзе паблізу не знайшлі...

Усю ноч прасядзеў Алесь каля ложка Лены. У яе паднялася тэмпература. Яна трызніла, кідалася з боку на бок і зноў засынала.

Волька клала ёй на галаву кампрэсы і ўздыхала. Яна найшла спаць толькі пад раніцу.

* * *

А Віктар, застаўшыся адзін, ледзь падняўся. Заклаўшы руку назад, ён з цяжкасцю, сцяўшы зубы, адарваў ад спіны дошку, зірнуў на вялікі ржавы цвік і кінуў яе вобземлю. Сеў на ложак, скрыгануў зубамі. Перад ім цьмяна паўсталі ўсе яго злачынствы, ад першага чужога рубля да гэтага бандыцкага налёту. Ён, зморапы і разбіты, сядзеў у чужым пакоі і ніяк не мог уцяміць — чаго апынуўся тут? «Пачакай... Пачакай, зараз успомню»,— думаў Віктар, тручы далоняй лоб. І ён успомніў...

...Яго адвялі ў камеру папярэдняга зняволення і пакінулі там да вечара. Увечары ён папрасіўся выйсці з канваірам на двор. Ён прыкінуўся такой няшчаснаю авечкай, што міліцыянеру стала шкада яго. Нават адпусціў яго на слова. А Віктар, адышоўшыся, пералез праз высокі плот і, з вуліцы ў вуліцу, выбег за мястэчка.

Воддаль на выгане пасвіліся коні. Ён распутаў добрага каня і мігам прымчаў у зазерскі лес. Адтуль прабраўся на свой двор, залез на гару, захапіў там добры кавалак вяндліны, дастаў з саломы ў куце поўны партфель гарэлкі і занёс усё гэта ў роў ля могілак. Там ён і напіўся...

«Не варта было звязвацца з ёю, толькі паказаў сляды...» — злаваў на сябе Віктар.

Ён нахіліўся і падняў акрываўленую дошку. Цвік вытыркаўся сантыметраў на дзесяць. «Дзіва што так баліць спіна...»

Ён падняўся і, хістаючыся, выйшаў. Наўкол было ціха. Толькі лагодна шумеў між ракітніку вецер ды глуха ўздыхала хвалямі возера.

Але вось да яго слыху данесліся няясныя далёкія гукі.

«Дабегла ўжо, відаць»,— падумаў Віктар і, не спяшаючыся, пайшоў у напрамку могілак. А спіна ад болю аж дубянела...

Сышоўшы ў роў, Віктар знайшоў сваю гарэлку і з ёю падаўся ў лес. Ён вырашыў пакуль што хавацца. Растрата ў магазіне, напал кароўніка, дзе згарэў чалавек, уцёкі і гэтае апошняе злачынства — усё абяцала яму добры тэрмін...

Алкагалізм яго ўжо межаваў з вар'яцтвам. Вочы глядзелі страшна, як у дзікуна, рукі дрыжалі, галава калацілася, нібы ў стогадовага дзеда.

«Вып'ю тут і пасплю»,— прайшоўшы каля трох кіламетраў, вырашыў Віктар. Ён паслухаў ціхі шум лесу, апусціўся на мяккі мох і крыху паляжаў.

Дзесьці далёка-далёка праспявалі пеўні. «Гэта ў Асінаўцы. Я ўзяў дужа ўлева»,— падумаў Віктар, устаючы. Дастаў з партфеля паўлітэрку, пералічыў астатнія. Было яшчэ чатыры. Гэта надало бадзёрасці.

Калі выпіў, здалося, што боль у спіне крыху суняўся. Глынуў яшчэ з пляшкі некалькі разоў і праз момант заснуў...

* * *

Аб усім, што здарылася ў бібліятэцы ноччу, сяло загаварыла ўжо раніцою, як толькі сабраліся на калгасным двары зазерцы. Разгневаныя і абураныя мужчыны толькі курылі, хмурыліся і маўчалі. Жанчыны ж судачылі без перадыху. Яны войкалі і ва ўсім вінавацілі мужчын.

— Дадому ён не пойдзе,— упэўнена гаварыў у канторы старшыня.— Пакуль яшчэ цёпла, ён будзе сядзець у лесе. Трэба пільнаваць на нівецкай дарозе і ў Паддуб'і. Там яго сястра замужам.

Алесь, які толькі што прыйшоў і стаяў каля расчыненых дзвярэй, нарэшце ўмяшаўся ў гутарку:

— У Віктара характар цвёрды! Што хоць раз у жыцці задумаў — выканае... Злавіць яго можна будзе і каля возера...

— Што ж, можна будзе зрабіць засаду і там. На такую прынаду нападаліся і больш вопытныя злачынцы,— здагадзіўся ўчастковы.

Было вырашана не шукаць Віктара ў лесе, як спярша прапанаваў лейтэнант міліцыі з раёна, а пачакаць яго дзенебудзь тут, паблізу вёсак. Для таго каб апамятацца і па-

смялець, Віктару спатрэбіцца не больш двух-трох дзён. Тэрмін невялікі...

Алесь, калі пачалі разыходзіцца, зноў вярнуўся да Лены.

Было восем гадзін, а яна спала так моцна, што ён не адважыўся яе турбаваць, і сам прыклаў галаву на спінку крэсла...

Першай прачнулася Лена. Яна ўбачыла каля свайго ложка Алеся і здзівілася: няўжо ён так усю ноч спаў? Асцярожна скінуўшы коўдру, Лена працягнула руку і дастала з білкі новую кашулю і сукенку. Гэта пастаралася прыдбаць Волька. Апранулася і ступіла на падлогу. «Пакуль ён спіць, прыбяруся трохі»,— падумала Лена і падышла да люстэрка. Жахнулася — да таго змяніўся твар. На шыі заўважыла два сінякі. Яны напомнілі ёй мінулую ноч, пакуты. Ледзь дайшла да крэсла каля акна. Толькі села, як адчула, што баляць грудзі, млеюць ногі, не слухаюцца рукі. «Больш не пайду жыць да возера...» — вырашыла. Заўважыла на стале запіску. Пазнала Вольчын почырк, падышла і прачытала: «Леначка! Мама прыйдзе ў дванаццаць. Усё стаіць на стале пад абрусам. Бліны ў печы... Я цябе люблю, як сястру, Лена! Не ідзі ад мяне больш нікуды. Я цяпер самая шчаслівая...»

«Самая шчаслівая... Гэта добра...»

Склаўшы паперку напалам, яна спынілася каля крэсла, на якім спаў Алесь. Нягледзячы на бяссонную ноч, твар шафёра ледзь ружавеўся. Каштанавыя валасы звісалі на пасінелую руку. «А ён прыгожы... У яго цудоўная душа... Ды нешчаслівы, як і я. Анатоль таксама нешчаслівы...»

Ступіўшы крок, яна нахілілася і пацалавала Алеся ў шчаку.

Той адразу прачнуўся. Нічога яшчэ не разумеючы, убачыў Лену і здзіўлена спытаў:

— Ты ўжо ўстала?

— Не... Яшчэ сплю,— усміхнулася Лена.

— Табе ўжо лепш? — тручы левую руку, спытаў ён зноў.

— Лепш...

Алесь падняўся і стаў насупраць. Якую хвіліну ён разглядаў яе твар, з якога паступова сыходзіла чырвань. Потым, наблізіўшыся так, што ледзь не дакрануўся вуснамі да яе твару, сказаў:

— Лена. Не жыві больш у клубе. Лепш — у мяне...

Яна пакруціла галавою.

— Н-не ведаю, Алесь... Тут мне будзе спакайней, у Волькі.

Ён моўчкі адышоўся і стаў глядзець у акно. Усё было ясна. Яна не кахае. Яна чакае яшчэ свайго гарадскога...

— Пайду... Трэба ехаць у раён. Можа, што табе прывезці з горада? — сказаў, не паварочваючыся.

— Прывязі...

— Зноў кнігі?

— Кнігі...

Крута павярнуўшыся, Алесь зірнуў на спакойны і строгі твар Лены.

— Не жартуй, Лена...

— Я не жартую... Ідзі сюды,— ціха паклікала яна.

Ён падышоў.

— Аддай мне мой пацалунак...

— Значыць, ён не прысніўся мне?! — усклікнуў Алесь.— Гэта было?..

— Было...

Ён асцярожна абняў Лену, закінуў яе галаву і нязграбна пацалаваў у вусны.

— Значыць, сватоў можна пасылаць зноў?

— А навошта? Куды спяшаешся?..

— Ды я... Сто год магу чакаць, Лена! Леначка!.. Любая мая Гэлечка... Будзе так, як ты скажаш!

...Увечары ў клубе зноў гарэлі агні, чулася музыка.

А ў маленькім пакойчыку, зусім апусцелым і няўтульным, стаялі двое — Алесь і Лена. Яны ўсё перагаварылі і цяпер маўчалі...

Хлопец наблізіўся да акна і зірнуў на дарожку, што вяла ўздоўж возера. Па ёй, абняўшыся, ішлі Пятро і Волька.

— Што там? — спытала Лена і таксама падышла да Алеся.

Яны стаялі маўклівыя і глядзелі праз акно на чужое шчасце.

За расчыненым акном шумела на ветры нахіленая вярба, цяжка ўздыхала возера. Недзе далёка за лесам чуліся глухія раскаты грому.

1963

1 Зак. 2733

# НА ДЗІКАЙ ПАЛЯНЕ

Паляна была непрыгожая, зарослая дробнымі кусцікамі, уся на ямах і купінах. Пасярэдзіне расла адна камлюкаватая, невысокая бярозка, пахіленая да зямлі так, што, здавалася, яна вось-вось зваліцца зусім. Крыху зводдаль, ад лесу, шчацініўся маладны хвойнічак. Ён узбягаў на пагорак і зліваўся з высокімі гонкімі соснамі. З другога боку, ад ракі, паляну аддзяляў густы хмызняк. Віктару яна здалася зусім дзікай.

— Вось мы і дома! — скідаючы з плячэй туга набіты рукзак, сказаў Каляда, выкладчык фізкультуры, а цяпер проста кіраўнік невялічкай групы дзевяцікласнікаў, мужчына гадоў пад трыццаць, у меру высокі, крыху чарнявы.

Хлопцы — іх пакуль што прыйшло трое — таксама паскідалі свае ношы і нездаволена агледзеліся. На такой дзікай паляне будаваць лагер ім зусім не хацелася. Сюды ж хутка прыедуць на вясёлым рачным трамваі ўсе дзевяцікласнікі разам з класнай Палінай Іванаўнай. Засмяюць...

Віктар заўважыў ля аднаго кусціка шырокі пень, падышоў і зморана сеў на яго.

— Паляна, трэба сказаць, не дужа...— Загладзіў рукою непаслухмяныя русыя валасы і зірнуў на Каляду.— Дзікаватая. Ад ракі не так блізка...

— Што дзікаватая, то не бяда. Прыбяром, падчысцім. А што далекавата ад ракі, то добра, менш будзе камароў! — адказаў на гэта Каляда. Ён адразу пачаў развязваць вялізны цюк з палаткамі.

— Вось іменна — менш камароў! — падхапіў прыгажун Міхась. Ён адразу наладзіў свой фотаапарат і паглядзеў у вочка.— Можна, Іван Барысавіч? Шчоўкну на ўспамін...

Каляда толькі махнуў рукою:

— А-ат, другім разам. Цяпер у нас не зусім фотагенічны выгляд. Пачакаем астатніх і адразу за справу. Самі ж кажаце, што паляна дзікая...

Астатнія нешта доўга не ішлі. Яны засталіся на пераправе і павінны былі прыйсці следам.

Міхась нездаволена схаваў фотаапарат зноў у футарал і прысеў на сваю ношу. Там таксама былі палаткі.

— На той хліпкай лодачцы яны не скора пераедуць, тоне яна дужа,— сказаў ён, ні да каго не звяртаючыся.— Дзяўчаты дык зусім баяцца.

Выгляд у яго быў заўсёды спраўны. Валасы аж прылізаны, зялёны спартыўны гарнітур чысты, адпрасаваны. Не тое што Сарокін. Высокі, нязграбны, усё на ім тырчком. Вось і цяпер, як быў у чыстай кашулі, кінуўся пад куст, разлёгся.

— Э-эх, асалода якая! — аж пакачаўся. І вядома ж, кашуля адразу месцамі пацямнела. Ды яму і клопату мала. Зноў усхапіўся на ногі і да Каляды, як да камандзіра: — Дазвольце, Іван Барысавіч, памагчы дзяўчатам груз прынесці!

— А ці варта? — Віктар устаў з пня і дастаў з рукзака біклагу з квасам. Глынуў разы два, смачна прыцмокнуў.— Самі справяцца, не маленькія.

Каляда падтрымаў яго:

— Вось іменна. Усе дарослыя, няхай прывыкаюць і да работы. Кожны адказвае за сябе.

— І каб ніякіх распарадкаў,— падхапіў Віктар, перадаючы біклагу Сароку, як называлі Сарокіна ў школе. Хлопец ён быў неблагі, спакойны. Міхась жа наогул лічыўся прыкладам паводзін і вучобы, эталонам культуры. І невядома, чаму толькі адзін Віктар недалюбліваў яго. Лічылі — ад зайздрасці.

— Прыедзе Паліна Іванаўна — дасць яна табе распарадак — усё па-свойму пераверне,— Міхась сказаў гэта не столькі Віктару, колькі для Каляды. І паглядзеў на яго — ці адкажа што?

Ды адказаў Віктар:

— Што значыць — па-свойму? Раіцца ж яна будзе, як нам тут жыць...

— Ні з кім яна не будзе раіцца! Зробіць як захоча,— і канцы ў ваду. Падкрэсліваю — як захоча...

— Ты ж, здаецца, яе самы любімы вучань,— ціхэй, каб не чуў Каляда, упікнуў Віктар.— А так гаворыш...

— Бо так яно ёсць. А я ва ўсім люблю парадак...

— І я люблю парадак! — падхапіў Сарока, ледзь адарваўшы губы ад біклагі.— Свабода ва ўсім! Што хачу, тое і варачу...

— Кінь, кінь, Сарокін,— умяшаўся ў гутарку Каляда.— Анархіст знайшоўся.

— Дык я ж, Іван Барысавіч, па Віктаравай тэорыі...

Спрэчку перапыніла невысокая, даволі кругленькая дзяўчына з кучаравымі русымі валасамі, што закрывалі ўсе плечы, у блакітнай сукенцы з кароткімі рукавамі. Яе вялікія круглыя вочы міргалі, як заведзеныя.

Хвалюючыся і збіваючыся, яна паведаміла, што Алесь і Андрэй, двое неразлучных сяброў, перакулілі лодку. Увесь хлеб сплыў.

— Толькі хлеб? — спытаў Каляда, адразу спахмурнеўшы.— Ты, Алена, не ўсё, відаць, сказала...

— Ага, не ўсё... Яшчэ кілбасы,— адказала Алена, чырванеючы.— Цукар размяк. А крупы і кансервы патанулі... Нічагуткі не засталося. Той вясковы хлопец нырае, нешта ловіць, а нашы стаяць як слупы...

Сарока засмяяўся так гучна і нечакана, што ўсе адразу зірнулі на яго.

— Дазвольце, Іван Барысавіч...— пачаў ён і асекся.

— Не дазвольце, а шагам марш! — сказаў Каляда.— Пайшлі на падмогу. Ты, Віктар, застанься...

Засталася яшчэ і Алена. Нейкі час яна ўсё адварочвалася ад Віктара, і ён чуў, што дзяўчына ледзь стрымліваецца, каб не зарагатаць. Смех душыў яе. Сеўшы на пень, Алена сказала:

— Шкада, Віктар, цябе там не было. Пацеха! Буханкі плывуць, рыбкі іх з усіх бакоў акружылі, цэлы карагод. Алесь крычыць: «Чэрпайце ваду з цукрам, яна салодкая!» Андрэй бегае па беразе, за галаву хапаецца, уся адзежа на ім мокрая, аж прыліпла...

— Весела пачалося,— у тон ёй сказаў Віктар.— Абы хлеб выратавалі. Рыбы тут хапае. Яшчэ ягады. Пажывём рабінзонамі на дзікай паляне, а то набралі ўсяго, як дачнікі.

— І мне нічагусенькі не шкада.

— Бо ў нас з табой аднолькавыя характары,— падкрэсліў Віктар, падыходзячы да яе.— Такія ў жыцці ніколі не прападуць, не згінуць!

Алена паківала галавою:

— Ой, прападуць! Яшчэ як. Не сур'ёзныя мы, Віктар, а гэта дрэнна.

Віктар паклаў ёй руку на плячо і ціха ўздыхнуў. Ён ведаў, што яна гаворыць няпраўду. Больш сур'ёзнай дзяўчыны, як Алена, наўрад ці знойдзецца ва ўсёй школе. Не пярэчыў, а толькі жартам заўважыў:

— Сур'ёзнымі і сталымі, Аленка, мы яшчэ будзем, а вось маладымі і вясёлымі — дудкі!

— Не век жа дзяцініцца...

Яна адразу задумалася. Твар стаў строгі, прыпухлыя вусны самкнуліся. Віктар любіў глядзець на такі яе твар. Міжволі нахіліўся і зазірнуў у вочы.

— Твая праўда...— Ён раптам падышоў да рэчавага мяшка і дастаў з кішэнькі, што наверсе, маленькую кніжачку ў старой сіняй вокладцы.— Вось, паслухай, што іншы раз бывае. Прачытаць?

— Чытай...

Ён набраў у грудзі як мага болей паветра, пачаў ціхім трагічным голасам:

— «Сцяпан ведаў, што Валя ніколі ўжо не будзе з ім вось так, як было нядаўна, жартаваць, бегаць басанож па расе, цягаць яго за вушы. Позна! За нявіннай гульнёй ён прагледзеў сваё каханне. Валя пайшла з гэтай гульні ў жыццё, пайшла за разважлівым, строгім Сяргеем...» Чуеш, Аленка?

— Угу.

— Цяпер я ведаю, чаму ты так сказала — не век дзяцініцца. Ведаю, што падумала... Добра. Я буду сур'ёзным. І павяду цябе з гульні ў жыццё. Мы пабудуем сваю цытадэль і ні разу не ўсміхнёмся. Будзем самыя сур'ёзныя людзі на зямлі...

Алена паглядзела на яго добрым спагадлівым позіркам. Заўсёды ён так, жартам. Хоць бы раз сур'ёзна. Хоць бы слова пра свае пачуцці да яе. Адно — вочы выдаюць. Дужа яны ласкавыя, яго вочы.

Сказала знарок:

— Вярзеш абы-што...

Віктар падсеў да яе, на самы край пня, блізка-блізка. Загаварыў больш ціха:

— Усё гэта, безумоўна, глупства. Я проста не магу быць сур'ёзным па сваёй натуры. Ну, скажам, як наш Міхась не можа быць вясёлым. Іншы раз мне здаецца, што яму не менш, як тысячу год.

— Міхась удумлівы.

— Ён ніколі нічога сур'ёзнага не думае, дробязь розную...

— Чаму ты яго не любіш?

— Досыць таго, што ён сам сябе любіць. Імператар Нерон, насіць не твар, а маску глыбакадумнасці. І прыкідваецца добрым...

Нейкі час яны памаўчалі, услухоўваючыся ў далёкія галасы аднакласнікаў. Ці выратавалі яны там што?

Вакол іх цэлым роем кружыліся, гулі авадні. Сонца ўжо высока ўзнялося над лесам, пякло нясцерпна. Нават у цяні было душна.

Віктар устаў з пня, зламаў галінку і разагнаў ёю аваднёў.

Алена спытала ў яго:

— А ты, Віктар, якую маску носіш?

Ён адказаў адразу, быццам чакаў гэтага пытання:

— Яшчэ сам не ведаю. Раблю вопыт. Ведаеш які? Калі я стаў чалавекам. Так, так, не смейся. Мне здаецца, што чалавек адышоў ад жывёлы тады, калі навучыўся...

— Працаваць і будаваць жыллё,— падказала Алена.

— Не. Жыллё будуюць сабе звяры і птушкі. А каб ты бачыла, як працуюць бабры, калі ўзводзяць плаціну! Чалавек стаў самім сабою, калі навучыўся хітраваць, прыкідвацца не такім, які ён на самай справе. Бачыла, як наш Міхась перад класнай сцелецца? «Паліна Іванаўна! Паліна Іванаўна!» Чула б ты, што ён аднойчы перад намі, хлопцамі, сказаў пра яе... Вонкава ён выглядае вельмі прыстойным, разумным, уважлівым, а на самай справе... У вочы адно, а за вочы другое. А я хачу, каб усе людзі жылі з адкрытымі сэрцамі. Тады было б усё так ясна, так проста. А пакуль нічога не ясна, усё вельмі складана.

— Выдумляеш ты...

— Не! Аленка, рабі, як я. Што думаю, тое і гавару, што думаю, тое і раблю.

Алена засмяялася:

— Дзівак! А яшчэ член камітэта камсамола... Вось скажы, якія думкі ў цябе цяпер? Што б ты хацеў зрабіць, скажам, для мяне?

Захапіўшыся, яны і не прыкмецілі, як з-за бярозы паказаўся Міхась. Моўчкі паклаў на зямлю рэчавы мяшок і захінуў твар галінкаю. Схапіў было свой фотаапарат, з якім ні на хвіліну не разлучаўся, але чамусьці зноў павесіў на плячо. Проста стаяў і пазіраў.

— Што я думаю? Што б хацеў зрабіць? — Віктар зноў прысеў побач, абняў Алену і зазірнуў у твар.— Прыгожая

ты...— І ўжо зусім нечакана пацалаваў яе ў шчаку.— Вось што хацеў...

Нібы ён укусіў дзяўчыну.

Алена ўсхапілася, прыкрыла далоняй шчаку і, ледзь стрымліваючы дыханне, сказала:

— Як табе не сорамна, Віктар! Май на ўвазе — гэтага я табе ніколі не дарую. Ніколі...

Яна адбеглася ад яго, спынілася каля ляшчынніку, не ведаючы, што рабіць далей. Ёй было сорамна, бо ў той момант, як усё гэта здарылася, яна заўважыла Міхася.

Цяпер ужо і Віктар убачыў яго.

— А-а, ясная справа,— сказаў ён.— Міхася спалохалася. Спадзяюся, ён не справіўся нас сфатаграфаваць.

— І вельмі шкадую! Навошта гэта я ўсю плёнку патраціў на рацэ, здымаючы нашу трагедыю? — Ідучы да Віктара, Міхась увесь час глядзеў на Алену.— Гэта быў бы незвычайны эцюд для любога часопіса. «Каханне». Альбо: «На дзікай паляне», «Дзеці прыроды»... Тысячы загалоўкаў! — Паклаў рэчавы мяшок, падбег да Алены. У руках ён ужо, як той факір, трымаў невялічкі букецік кветак.— Гэта табе... Не хвалюйся, я нічога не бачыў...

І пайшоў да Віктара зноў. Алена глядзела на кветкі і не бачыла іх. Слухала хлапечую гаворку і думала, што калі б хто іншы іх убачыў тады, то была б непрыемнасць. Міхась жа, думалася ёй, умее трымаць язык за зубамі...

— Усё сплыло, амаль нічога не ўхапілі,— гаварыў Міхась, быццам ужо забыўшыся на здарэнне.

— Дык чаго ж ты прыбег раней за ўсіх?

— Спяшаўся, каб не звялі кветкі.

— Яны ўсё роўна звянуць.

— Не думаю.

— Каб думаць, трэба спярша мець чым...

Міхась гучна засмяяўся, ляпнуў Віктара па плячы.

— Брава! Адзін мудрэц сказаў, што калі з цябе кпяць, смейся першы! — І ўжо цішэй: — Каб гэта бачыла Паліна Іванаўна! Яна б адразу вытурыла цябе з лагера дамоў. Падкрэсліваю — адразу. Для дзяўчыны асабліва вельмі важна, каб сведкаў не было, ясна? Падкрэсліваю — для дзяўчыны...

Міхась гаварыў, а Віктар нібыта думаў штосьці сваё. Нарэшце плюнуў праз зубы на зямлю і з ухмылкай сказаў:

— Кінь ты сваю старую песню! Я ўсё ведаю на памяць — вельмі карысна быць важным і вельмі важна быць

карыспым. Гэтак? — і ўжо мацней: — Алена! Пайшлі на раку, Міхась тут без нас напільнуе дабро.

— Але ж, напільную...

Ды Алена нават не зварухнулася з месца, не адказала. Тады ён усунуў рукі ў кішэні штаноў і пайшоў у кірунку ракі, насвістваючы вясёлы, просценькі матыў старой песні вадавоза...

* * *

Міхась паволі, ціха, як кот, падкраўся да Алены. Азірнуўся, кашлянуў. Яна рэзка павярнулася тварам да яго. Твар быў замкнуты, сухі.

— Чаго падышоў?

— Дзікун ён, твой Віктар...— папракнуў яе Міхась.— Ніякай этыкі... Вось гэта — ведаеш што? — паказаў на кветку.— Анюціны вочкі. Гэта браткі.— І ўзяў яе за руку.— Табе... непрыемна было, Алена?

— Пусці руку.

— Калі ж яна такая халодная.

Руку ён пусціў адразу ж. І нават на крок адступіў ад яе, бо пачуў, што на паляну выходзяць. Неўзабаве тут з'явіліся Каляда, Ніна, Ігар і Сарока. Скінулі ў груд рэшткі грузу. Ніна, дзяўчына высокая, з кароткай хлапечай стрыжкай, падышла да Алены, паскардзілася:

— Ты проста шчаслівая, Аленка! Табе і кветачкі і ўвага. А мне ўсё, як хлопцу. І груз цягай, і ніякай увагі.

Міхась заступіўся за яе:

— Гэта ў нас хлопцы такія пяўважлівыя. Казлы... Пра цябе-то я не забыўся.

Адкуль ён узяў другі букецік кветак — для дзяўчат засталося таямніцай. Ніна аж заззяла ад шчасця. А Ігар, той Ігар, які вечна спазняецца з модай, які ўсё чуе і бачыць, падышоў, упікнуў:

— Не крыўдуй, Ніна, але ў штанах ходзяць хлопцы...

Ніна не пакрыўдзілася. Не з'явіўся яшчэ той чалавек на свет, які змог бы яе пакрыўдзіць. Ды і за словам у кішэню ёй не трэба лазіць. Яны ў яе на кончыку языка.

— Ведаеш, Ігар...— Ніна знарок памаўчала.— Не ўсе тыя хлопцы, што носяць штаны. Смешны ты нейкі чалавек...

— Ого! — Ігар залыпаў вачыма.— Не язычок, а джала. Хай цябе качкі...

Ігар і сапраўды выглядаў дзікавата, смешна. Ніхто ўжо такіх стракатых кашуль, як ён, не носіць. Ды і штонікі ўжо шырэйшыя пачалі шыць. Усё на ім старамоднае, з замежнага набору, як сам кажа,— «мадэ ін уса».

Каляда ўладкаваў каля куста палаткі і падышоў да хлопцаў. Яны чакалі яго каманды і таму адразу змоўклі.

— Вось што я думаю,— сказаў Каляда, адганяючы авадпёў галінкаю.— Самі нарабілі клопату, самі і выкручвайцеся. Паглядзім, на што вы здатныя. Тупайце. Ваўка ногі кормяць. Хто ў рыбу, хто па ягады, а хто, можа, і на сена...

Ігар паскроб зараслую патыліцу і махнуў на ўсё сваёй доўгай рукою:

— Жылі калісьці людзі з вуды, але не ўсе і не ўсюды,— сказаў завучанае.— Я магу двое сутак і не еўшы паспаць.

Ён тут жа адышоўся за куст, пад якім былі складзены палаткі, і кінуўся на зямлю.

— Дзе ж гэта вінаватыя, Алесь і Андрэй? — Каляда нібы толькі цяпер заўважыў, што іх няма.

Алена паказала ў бок ракі.

— Як выскачылі на бераг, то і пайшлі ўздоўж ракі. Напэўна, сушацца недзе.

— А дзе Віктар?

Тут ужо адказаў Міхась. Падляцеў да Каляды, захіхікаў:

— Віктара авадзень укусіў, збег недзе.

Потым адышоўся да Сарокі і штосьці шапнуў яму на вуха. Той схапіўся за галаву і вылупіў ад здзіўлення вочы.

Алена ўсё зразумела — не стрымаў тайны Міхась. Кінула яму пад ногі кветкі і паволі пайшла па паляне, пакуль не схавалася зусім. Міхась нібы незнарок стаў нагою на кветкі і паспрабаваў жартаваць. Але жарту не атрымалася.

— Што ў вас тут было? — строга спытаў Каляда.

Тады Міхась пачаў хітраваць:

— Віктар практычна выказаў сваю тэорыю свабоднай думкі і пачуццяў.

Сарока растлумачыў больш зразумела. Стаў, як перад камандзірам, і адрапартаваў:

— Дазвольце далажыць! Віктар пацалаваў...— і кіўнуў галавою ў той бок, куды пайшла Алена.

— Я так і думала. Я так і думала. Я так...

Міхась перапыніў Ніну:

— Досыць, досыць! — і штосьці шаппуў ёй.

— Нахабнік! — як прысуд, са злосцю выгукнула Ніна.

— Хто гэта бачыў? — Каляда, здавалася, не зазлаваў, а зацікавіўся здарэннем.

— Выпадкова — я,— пахваліўся Міхась.

— Ага... Вось ты і застанься. А вы, таварышы, бярыцеся за справу. Вуды ляжаць каля бярозкі...

Калі ўсе, пашаптаўшыся, разышліся, Каляда стаў насупраць Міхася.

— Расказвай...

Міхась на хвіліну задумаўся. Хутчэй за ўсё, зрабіў выгляд, што задумаўся,— прыклаў указальны палец левай рукі да лба, прыжмурыў вочы.

— Значыць, так...— глыбакадумна пачаў ён.— Нарваў я на лузе красак...

— Карацей,— кінуў Каляда.

— Іду я сюды і думаю...

— Запомні: ты ўжо тут.

— Ага. Прыйшоў я сюды і бачу, што Віктар цалуе Алену...

— Вось гэта ўжо добра!

— Што... добра? — разгубіўся Міхась, не ведаючы, чаму так зарадаваўся Каляда.

— Добра, кажу, пачаў. Ну, а што Алена?

— А яна хоць бы хны!

— Цудоўна! — Каляда пляснуў далонямі і абышоў вакол здзіўленага Міхася.— А што потым?

— А потым прыйшлі вы...

— Стоп! Цяпер схадзі ў лес і паліжы на сасне зачосы. Ведаеш, што гэта?

— Не...

— Смала, жывіца. Паліжы, каб язык прыліп да зубоў. Бачыў і маўчы. Непрыгожа навушнічаць. Сур'ёзны хлопец, а мелеш абы-што. Непрыгожа...

І пайшоў рыхтаваць месца пад першую палатку будучага лагера. А Міхась задумаўся. Бура пратэсту ўзнялася ў яго грудзях. Каго абвінавачваюць у пляткарстве? Гэткага яшчэ ніколі не было. Міхась прывык толькі да пахвальбы. Каляда з ім не лічыцца. Няхай. Усё гэта будзе вядома Паліне Іванаўне...

А тут яшчэ з ракі прыбег Віктар. Відаць, толькі пакупаўся. Валасы гладка зачэсаны, мокрыя. Амаль уся адзежа ў руках. Паглядзеў на разгубленага Міхася, які адразу пачаў хаваць позірк, спытаў ціха:

— Расказаў?
— Не ўсё,— агрызнуўся Міхась.
— Што яшчэ?
— Сакрэт...
— Сакрэт? То і хавай яго, нікому не паказвай. Хвалько. Сакрэты ў яго...
Каляда гукнуў здалёк:
— Хлопцы-ы, пайшлі па жэрдкі.
Міхась быў памкнуўся ісці, але затрымаўся. Кінуў незадаволена, злосна:
— Чуеш? Клічуць, дык і бяжы, а я пайду лавіць рыбу, жэрдкамі сыты не буду.
Віктар пайшоў, а ён яшчэ доўга збіраўся з думкамі — куды кінуцца, што рабіць. Ужо наважыў узяць вуду, як з-за куста, дзе былі складзены палаткі, знянацку высунулася кудлатая Ігарава галава. Вочы не глядзяць, твар у лапіках — адлежаў. А мо спаў. Міхась аж зжахнуўся, тры разы плюнуў.
— Каб ты спух!
Ігар соладка пацягнуўся, адказаў:
— Пухнуць ад голаду. Калі пойдзеш лавіць, то цапні што і на маю долю. Хоць маленькую рыбку. Памалюся я тут за тваю грэшную душу. І смалу лізаць не трэба будзе.
Міхась прыклаў правую руку да сэрца.
— Ігар, дарагі, рад бы злавіць табе рыбку, але ж, сам ведаеш, прынцып: адзін не на ўсіх, а за ўсіх, а ўсе не па аднаго, а за аднаго.
— Э-э, прынцып... Калі б усе яго прытрымліваліся...
Ён доўга яшчэ разважаў наконт гэтага прынцыпу, але слухаць не было каму, бо Міхась ужо апынуўся, мабыць, аж ля ракі. У яго там быў свой сакрэт, пра які ён нікому і не заікнуўся. Адзінае, што ўстрывожыла Міхася,— гэта тое, што з рукі знік гадзіннік. Ці не паклаў ён яго дзе на беразе? Потым успомніў: яшчэ ў дарозе ён аддаў свой гадзіннік Сароку. Так, на час...
У хуткім часе Ігара ўсё ж пачулі. Гэта былі Алесь і Андрэй, двое бялявых невысокіх хлопцаў, пастрыжаных пад «вожыка». Роўненькія, як брацікі, яны спыніліся зводдаль і стаіліся.
— А што датычыцца працы,— разважаў Ігар,— то не-е! Я гультай справядлівы. Мяне, можа, за гэта паважаюць і любяць. Ого! Не хвалюся, не хаваюся, не апраўдваюся, што жывот баліць ці паясніцу ломіць. Не хачу працаваць — і ўсё! Бо я філосаф. Ляжу сабе і думаю. Пра што

думаю? Ды ні пра што. Гэта таксама трэба ўмець — думаць ні пра што.

Хлопцы не стрывалі, выскачылі з засады са смехам. Толькі Ігар нават не схамянуўся. Ці ён сапраўды такі санлівы ды лянівы, ці проста ведаў, што яго пехта слухае.

— Думаць ні пра што. Здорава! — усклікнуў Андрэй, размахваючы гаспадарскай сумкай, якую прынёс з сабою.

— Ён проста геній! — падхапіў Алесь.— На свет нарадзіўся новы геній...

Ігар адказаў усё гэтак жа лена і абыякава, тонам прапаведніка:

— Запомніце, лайдакі, святую ісціну: геніі ніколі не нараджаюцца, яны толькі паміраюць.

— А есці ім іншы раз хочацца?

— Есці?!

Ігар падхапіўся так спрытна, быццам яго там, пад кустом, укусіла гадзюка. Паспрабаваў зазірнуць у сумку, але Андрэй захінуў яе за сябе.

— Чакай, філосаф...

— Што ў вас ёсць, браткі Андрэй і Алесь? Не крыўдзіце бліжняга свайго брата Ігара. Я раскажу вам дзіва дзіўнае, грэх найвялікшы, які чорнай хмарай зваліўся на наш стан. Хутка будзе канец свету...

Хлопцы пераглянуліся. Яны адразу падумалі, што гутарка пойдзе пра іх ганебны ўчынак. Нават сюды яны прыйшлі, калі нікога, апроч Ігара, не засталося. І таму, каб дазнацца ўсё, што тут гаварылася пра іх, Андрэй дастаў з сумкі вялікага смажанага шчупака і адламаў кавалак Ігару.

— На, лайдак, пашчыся!

Ігар схапіў пачастунак аберуч. Сеў на пень і моўчкі пачаў есці, прыцмокваючы і аблізваючыся. Хлопцы моўчкі пазіралі за ім, а калі ад ладнага кавалка ў Ігаравай руцэ застаўся голы хрыбет, Андрэй спытаў:

— Ну, гавары, якое тут дзіва дзіўнае здарылася?

— На нашага Віктара сёння моцна ўздзейнічаў закон прыцягнення двух целаў,— загадкай адказаў Ігар і дадаў: — Другое цела было Алёнчына. Дайце яшчэ кавалак, скажу чым гэта скончылася...

Яму зноў далі рыбы, але больш, колькі ні пыталіся, Ігар не вымавіў ні слова. Нічога ён не ведае, нічога не бачыў, а калі хто што і гаворыць, то ці трэба таму даваць веры. Андрэй ажно зазлаваў і схапіў Ігара за каўнер стракатай кашулі. Ды толькі не памагло і гэта.

— Ну, а пра нас, пра натоп — ці гаварылася што? — дапытваўся Алесь, цягнучы хлопца за кашулю з другога боку. Гэта, нарэшце, надакучыла Ігару, ён вырваўся, адбегся і крыкнуў:

— Нічога не ведаю, я спаў! Не падыходзь каторы, а то так стрэлю, што нечая маці будзе потым аплакваць свайго любімага сына!

І даў драла, толькі пяткі замільгалі.

* * *

Што там ні кажы, а голад не цётка. Ігар сабраў усю дробязь, якая знайшлася ў хлопцаў, і прынёс з бліжэйшай вёскі вядро бульбы.

Яшчэ не звечарэла, як паляна набыла жывы выгляд. Гэта Каляда і Віктар пастараліся паставіць некалькі палатак, змайстравалі з дошак стол, дзве лаўкі. Добра, што на беразе некалі стаяла бакеншчыкава хатка.Там і цяпер рознай непатрэбшчыны хапае. Цяпер ужо ёсць дзе паставіць і вядзерца з вадою, і такі-сякі посуд. Гэта на той лаўцы, што ля палаткі. Другую прыставілі да стала, на якім нехта з дзяўчат паставіў у кубку букецік палявых красак.

Вецер млява калыхаў лісце арэшніку, каля якога над нябачным на сонцы агнём гатавалася пахучая юшка. Каляда вырашыў згатаваць адразу абед і вячэру.

— Сем плотак, пяць акунёў,— лічыць ён,— трыццаць яршоў, дзесяць бульбін, цыбуліна і вядро вады. Юшка для бедных. Пах рыбы і смак цыбулі. Падыходзьце, пакаштуйце, нічога не згубіце і нічога не знойдзеце...

Сам пакаштаваў, скрывіўся. Як раптам нехта незнаёмы хрыплым басам з-за куста:

— Брэшаш, знойдзем. Хоць вушамі не дачую, але нос маю, не раўнуючы, як у сабакі.

З-за куста паказаўся высокі стары ў гумавых ботах, у цёплай (гэтак жа смаліць сонца!) фуфайцы і злінялай міліцэйскай фуражцы. Ён неяк асцярожна, бязгучна пратэпаў да лаўкі ля стала і сеў. Не ўседзеў, прайшоў да вядра і зазірнуў туды.

Каляда моўчкі назіраў за ім. І калі стары падышоў да агню і зірнуў у вядро з юшкай, сказаў:

— А я думаў, што наша юшка пахне толькі тады, калі ўсунуць у вядро нос...

— Што-о? — недачуў стары.— Не сунуць у вядро нос? А я, епта, усуну. Крадзенае не спажывеш...

— Што крадзенае? — насцярожыўся Каляда, адчуваючы, што стары прынюхваецца да ўсяго нездарма.

— Вядома што. Рыбка. Мая рыбка. Хто, ента, тут будзе за начальніка, га?

— Старшы — я.

— Які старшыня?

— Кажу, я — старшы.

— А-а, старшы. Старшы не страшны. Добранька-а...— Цяпер дзед абышоў палаткі, не прамінуў зазірнуць у кожную. І надзіва знайшоў тую сумку са смажанай рыбай, аб якой Каляда нічога не ведаў. Наблізіўся да кастра, тыцнуў старшаму печаным шчупаком проста ў нос.— Панюхай! Вось яно, ента, і знайшлося. Папяклі. Маіх шчупакоў папяклі. Ну-у, старшыня!

Што тут адкажаш. Каляда глядзеў на таго шчупака, як на дзіва.

— Адкуль што ўзялося? — паціснуў ён плячыма.— Мы налавілі адной дробязі...

— У маім садку было — вось адкуль. Раніцай былі, а цяпер зніклі. Бачыў ты гэта? — і зноў шчупака пад нос.

— Нішто сабе рыбіна.

— Што абрыдала? Красці?

Стары і праўда быў глухаваты. Амаль кожнае слова ён тлумачыў па-свойму. Калі шчупакі яго знайшліся, ён, здавалася, падабрэў, нават пажартаваў над няўдалымі зладзеямі, якія не ўмеюць хаваць канцы.

— Хто ж гэта зрабіў? — не ведаючы на каго і падумаць, спытаў Каляда. Яму было непрыемна перад старым, што так здарылася.

Стары сеў да стала, паставіў сумку сабе на калені.

— Хто зрабіў? — перапытаў ён.— Там па беразе хадзілі два хлопцы. Я іх добра прыкмеціў. Абодва такія роўненькія, шустрыя, як брацікі. І яшчэ галёкалі: «за-стануц-ца па-шы сляды-ы». Вось і засталіся. Цапнулі чужое. Ці, ента, можна так рабіць?

«Ды гэта ж Андрэй з Алесем!» — адразу здагадаўся Каляда. Дзеду ж сказаў:

— Я дазнаюся, хто цапнуў...

Стары толькі махнуў рукою:

— А мне што з ентага? Ты мне, начальнік, грошы гані. Уразумеў?

Грошай было не дужа багата. Каляда думаў прыдбаць на іх што-кольвечы з правіянту, і таму не раскашэліўся. Пачаў гуляць у хованкі. Спярша пюхнуў рыбіну.

— Хвацка засмажылі, гады! Аж слінкі цякуць. Проста чарадзеі хлопцы...

— А хто ж вінаваты, што зладзеі хлопцы? — быў папрок.

— Я ўжо ім усыплю! — Каляда рашуча адламаў кавалак рыбы, пакаштаваў.— І дзе яны навучыліся так смажыць?

Рыбак скінуў шапку, прыгладзіў лысіну, на якой дзе-нідзе тырчалі сівыя валосікі.

— Хе! — ямчэй усеўся ён.— Смажыць — навука не вялікая. Убачыў, што дрэнна ляжыць,— цап! — і ў торбу. Даўней, ента, мы гарбузы цягалі. От, брат, цягалі! — захапіўся стары.— Мяхамі. А ўсё з-за гарбузікаў. На пацэльні іх сушылі. А палавінкі па рацэ сплаўлялі. Паце-еха! Неяк раз, помніцца, залезлі мы ў Панасаў агарод, усё да апошняга абабралі, сплавілі, а Панасіха ніжэй бялізну паласкала. Палавіла тыя «караблікі» і прыцягла дамоў. Радуецца. Будзе што парсюку напарыць. А потым — зірк у гарод і ўголас... Паце-еха!

Ён змоўк, дастаў з кішэні капшук, люльку і задыміў.

— Ну, ну,— падбадзёрыў яго Каляда, рады, што пра грошы той больш не заікаецца.— Што яшчэ цікавага было раней? Люблю паслухаць,— і прысеў на лаву побач.

— Шмат чаго было,— папыхкаў люлькай стары.— Неяк арцель тут лавіла невадам самоў. Два вазы нацягалі. Узважылі ўсё, як след, здалі нарыхтоўшчыку яшчэ жывенькіх. І пачалі ў цяні харчавацца. А нам, малым, хочацца самяціны — аж зубы рыпяць. І што думаеш? Ухітрыліся-ткі. Каменняў назбіралі, падкраліся да вазоў ды тым самам у пашчы, у пашчы! З пуд напіхалі. А ў замен двух самянкоў спляжылі. І сена цэла, і козы сыты. Паце-еха!

Абодва засмяяліся. Каляда ў тон яму адказаў:

— А я помню, як мае хлопцы ў аднаго рыбака двух шчупакоў сцягнулі. Паце-еха!

Стары адразу спахмурнеў, устаў.

— Ну-ну! Ты не блытай ранейшае з цяперашнім. Яшчэ, ента, ні камсамолу, ні піянеры не вадзілася. Калі-то было-о!

— А калі яшчэ гэткае будзе-е,— зноў засмяяўся Каляда.

Стары пачаў адразу збірацца. Націсну на лысіну фуражку, адышоўся.

— Зазірну да вас заўтра,— сказаў ён і сам сабе забурчаў: — То калі было, а то цяпер...

«Адны непрыемнасці,— падумаў Каляда, здымаючы вядро з агню.— Няўжо праўда за Палінай, якая лічыць, што хлопчыкаў трэба трымаць моцна ў цуглях?» Яму ж хацелася давяраць, выхоўваць у юнакоў пачуццё ўласнай адказнасці, самастойнасць. Аж яно вось як выйшла. Лодку перакулілі, а цяпер пайшлі на нядобры промысел. «Заганю-ткі я ўсіх на сена, няхай зарабляюць, калі так! — падумаў у злосці.— Няхай адробяць усё...»

Потым злосць адышла. Зноў адламаў сабе рыбіны. Астатак загарнуў у газеціну, а сумку перакуліў і вытрас костачкі. І сярод тых костачак знайшоў стары, з аблезлым цыферблатам, ручны гадзіннік. Паслухаў — цікае. Паклаў яго ў кішэню. Гаспадарчая сумка была Сарокіна, але ж ён гадзінніка не насіў...

Агонь дагарэў, а ў лагеры ўсё яшчэ нікога няма. Прыслухаўся — аж ідуць. То была Алена. Следам за ёю, з вудай у руцэ, на канцы якой трапятаўся малы калючы ёрш, ішоў надзьмуты Міхась. Шчокі аж пашарэлі.

— Іван Барысавіч! — адразу загаварыла Алена.— Альбо — ён, альбо — я. Нехта павінен ехаць дамоў вячэрнім параходам.

— Што яшчэ здарылася?

— Ходзіць па беразе і разносіць плёткі,— паказала на Міхася.— Ды яшчэ б'ецца...

— Якія гэта плёткі? — абурыўся Міхась.— Я толькі сказаў Алесю, што яна ні ў чым не вінавата. Дык у чым жа я вінаваты, калі вінаваты зусім другі... Падкрэсліваю...

— Кінь ты, дзядзька! — перапыніў яго Каляда.— Вінаваты, невінаваты... Сорам! Дзе яны басцяюцца, Алесь і Андрэй?

— Не ведаю,— са злосцю адказаў Міхась.— Я за імі не хаджу,— і па звычцы зірнуў на левую руку. Гадзінніка там не было. Толькі яскрава вырысоўвалася белая палоска на загарэлай руцэ.

«Дык вось чый гэта гадзіннік!» — здагадаўся Каляда, але змоўчаў, бо і Міхась нешта не кінуўся шукаць свой гадзіннік. Спытаў у Алены:

— З кім яны там біліся?

Адказаў сам Міхась:

— Я хацеў заступіцца за яе, мы паспрачаліся, а Віктар і замахнуўся... Ці ж я вінаваты?

— Хто замахнуўся?

— Я... А Віктар ударыў першы. Вось сюды,— паказаў на твар Міхась.

— І больш нікуды?

— Не...

— Шкада...— Каляда абышоў вакол Міхася, як бы прыкідваючы, чаго ён варты, потым, ужо больш спакойна, дадаў: — Я думаў, гэтая хвароба ў цябе пройдзе, аж не. Сёння ж папросіш прабачэння. І ў Віктара, і ў Алены. Пры ўсіх...

— Падкрэсліваю — ні за што! — успыхнуў Міхась.

— Тады — збірайся ў дарогу,— гэтак жа спакойна сказаў яму Каляда.

Міхась сумеўся. Нібы яшчэ не зразумеў сэнсу гэтых слоў. Змяк. Галаву ўцягнуў у плечы, адразу нібы паменшаў ростам.

— Вы... мяне ганіце? — спытаў глуха.— За што? — І пасмялеў.— Я буду скардзіцца. Я раскажу, што вы іх падтрымліваеце. Іх! Яе, вось. І таго...

Яшчэ Міхась гаварыў, што ён самы чэсны і справядлівы, што ўсе гэта ведаюць. Яго, Міхася, усюды і заўсёды ставілі ў прыклад. А цяпер няма Паліны Іванаўны. Ён жа, Каляда, не разумее, што гаворыць, падтрымлівае толькі Віктара.

Калі ж Міхась скончыў, Каляда звярнуўся да Алены:

— Чаму гэта так бывае? Аднаго чалавека слухаць — усё роўна, што кветкі збіраць, а другога — што смецце з двара месці?

— Не ведаю,— сумелася Алена.

— А я ведаю. Вам гэта непрыемна,— яшчэ больш разышоўся Міхась.— Бо вы — з імі. Вось з ёю. Нас вам не зразумець...

— Хто гэта «яны», а хто — «вы»? Артыст! — Каляда паківаў галавой.— Бачыла ты, Алена, гэткага? І хто яму ўбіў у галаву, што ён нейкі асаблівы? Ці не тыя некалькі ўдалых эцюдаў, якія змясціў, на жаль, часопіс?

Міхась паспешліва збіраўся ў дарогу. Узяў рукзак, скідаў туды свае пажыткі, падхапіў на плечы і падаўся ў хмызняк.

На душы было цяжка, брыдка. Чамусьці зноў прыгадалася гэтая апошняя размова з Аленай. Непрыемная размова. Што такое крыўднае ён сказаў? Нічога. Сказаў, што цалавацца антыгігіенічна. Яна засмяялася:

— Я гэта чула ад цябе тысячу гадоў назад.

Тады ён ускіпеў:

— А-а! Вось чаму ты і падсела да Віктара! Дужа цалавацца захацелася.

— А чаму ж...

Ён выказаў усё, што думаў. Што яна заўсёды была гэткая — то ёй у кіно білецік купі, то марожанае. А Віктар не скупіўся.

— Не гэтак, як іншыя,— адказала яна і зноў засмяялася. Чаго яна смяялася? З каго?

— За грошы ты заўсёды вясёлая! — не стрываў ён.— Задарма і кроку не ступіш.

— А табе з тваёй сур'ёзнасцю ведаеш што? На грамадскіх пачатках працаваць у пахавальным бюро. Суцяшаць сваякоў памёршага...

Гэта быў той рубеж, за якім здарылася самае горшае: ён назваў яе непрыгожым, брыдкім словам. Яна збялела і пляснула яго па твары. Яшчэ і цяпер гарыць тое месца, пячэ...

Хвойнік не скончыўся, як чакаў Міхась, а перайшоў у чысты стромкі бор. Шумлівы, вясёлы, як сад. Сонца заблыталася ў бліскучых іголках вершалін. Аддаючы апошнюю падзяку дню, наперабой славілі яго птушкі.

А Міхась усё ішоў і ішоў, нават не думаючы над тым, што ўжо даўно збіўся з дарогі, што нават сцяжына недзе знікла. Пад нагамі пругка ўгінаўся ўсланы ігліцай дол...

* * *

Дні пайшлі сваім парадкам, жыццё пакрысе наладжвалася. Адно абурала Каляду — гісторыя з крадзенымі шчупакамі. Ён не сварыўся на Алеся і Андрэя, не пагражаў ім расправаю. Проста, як таварыш, параіў:

— Калі вы гэткія спецы, то злавіце не меншых рыбін, занясіце дзеду і пакланіцеся яму ў ногі.

Хлопцы выслухалі свайго старэйшага таварыша ўважліва. Потым гэтак жа спакойна адказалі:

— Шчупакоў мы знайшлі на сцежцы ля ракі...

Гэта ўжо выглядала фантастыкай. Рыбак гаварыў, што ўзялі з садка.

— Вось што, даражэнькія, хопіць! — Каляда сеў да стала і ўважліва паглядзеў на хлопцаў, якія стаялі насупраць са здзіўленымі тварамі.— Сарокін і той зарабіў свой хлеб потам, цэлы дзень насіў копы з балота. Віктар адпрацаваў за людзей дзве радоўкі, дык і сала і яек прынёс. А вы...

Хлопцы стаялі па сваім — не бралі рыбы, і ўсё тут. Вельмі ж ужо ўпэўнена яны гавораць. Можа, і праўда невінаватыя. Здагадка, якая спярша здавалася неверагоднай, цяпер не давала спакою Калядзе. «Значыць, гэта Міхасёва работа!» — намацаў ён у кішэні гадзіннік. Але нічога не сказаў.

— Ідзіце, клічце ўсіх на нараду,— загадаў ён, і хлопцы з радасцю кінуліся да ракі.

Сабраліся не хутка, бо разышліся па беразе, як гусі. У Віктара на спінінгу целяпаўся вялізны, кіло на два, шчупак. Усе крычалі «ў-ю-юй» і браліся за жылку павяжыць. Віктар задаволена жмурыўся і хваліўся, што злавіць яшчэ не гэтакага. Тут ён, як кожны заўзяты рыбак, крыху перабольшваў свае магчымасці і здольнасці, бо і гэтага ледзь выцягнуў, ледзь не спусціў.

Шчупака абклалі крапівой-пякучкай і схавалі ад мух у вядро. Да вечара, калі зноў забулькае ў тым жа вядры штодзённая пахучая юшка.

Калі ўсе сышліся, калі паселі, хто дзе, Каляда сказаў:

— Як гэта ні дзіўна, але рыбу ў старога ўкраў Міхась. Вось гэта ён забыўся ў сумцы...

І паказаў гадзіннік. Яго ўсе пазналі, бо ўсё Міхасёва вельмі добра ведалі вучні. Загаварылі ўсе адразу. Хто абураўся, хто патрабаваў сурова пакараць вінаватага. Адзін Сарока маўчаў. Глядзеў на гадзіннік, на Каляду так, нібы для яго гэта было найвялікшым адкрыццём на свеце.

— Ды я яго... у бараны рог скручу! — гарачыўся Ігар, размахваючы рукамі.— Гэта ж такая пляма на наш лагер. Прывесці яго сюды і павесіць на асіне...

— Ціха, ціха, Ігар, не псуй нерваў, беражы сваё здароўе,— супакоіў яго Каляда.

— Навошта? У мяне здароўя хопіць на дваіх. Вось на гэтых,— паказаў на Алеся і Андрэя.— Не верыце?

Каб паказаць сваю сілу, Ігар схапіў хлопцаў за каўняры. Ды толькі Алесь і Андрэй лёгка закруцілі яму рукі назад. Дужы з выгляду Ігар прысеў і заенчыў, папрасіў спагады.

— Дзе ж тваё здароўе? — засмяяўся Каляда.

— Засталося ў спартыўнай -зале,— пакорліва адказаў Ігар, апусціўшы рукі і схіліўшы галаву.

— А каб яно сюды прыбегла, табе трэба папрацаваць. Сёння нарыхтуеш дроў, бо ўвечары ў нас павінна быць відна і весела. Сякера ведаеш дзе...

Нарада цягнулася не доўга. Вырашылі Міхасёвы па-

водзіны абмеркаваць пазней, калі прыедзе ўвесь клас. А цяпер зноў кожны павінен узяцца за сваю справу.

Ігар і не апомніўся, як застаўся ў лагеры адзін.

Нейкі час ён хадзіў ад палаткі да палаткі, не ведаючы, за што ўзяцца. «Накаркаў сабе, як стары крумкач,— падумалася нявесела.— Жартачкі — панасіць дроў на вечар. Колькі ж іх трэба?» Кінуў позірк на свае рукі, на адзежу. Куды яму ў такой стракатай кашулі цягаць дровы. Паспрабаваў прынесці — штаны аж трашчаць, вузенькія задужа. «Нагрэецеся вы ў мяне і павесяліцеся. Вось хіба што спінінг... Вясковыя за яго прыцягнуць увесь лес!» — спакусіла думка. Узяў у рукі ёмкі бамбукавы спінінг з бліскучай катушкай, пакруціў. Страшнавата. Паставіў на месца. Пачуў чыесьці крокі, азірнуўся. У лагеры невядома адкуль з'явілася сціпла адзетая вясковая дзяўчына. Што вясковая, ясна — босая. Яна гарэзліва зазірнула ў палатку, падбегла да стала і панюхала кветкі. А заўважыла Ігака — сумелася. Паглядзела на яго, як на дзіва. Твар строгі, а вочы ўсміхаюцца. Невысокая, зусім беленькая. Толькі бровы і вейкі цемнаватыя, быццам падфарбаваныя. Цярэбячы ў руках жоўты рамонак, загаварыла разгублена:

— Мяне сюды... паслаў тата.

Не менш здзіўлены незнаёмкай, Ігар адказаў:

— А я сюды сам прыехаў,— і падышоў да дзяўчыны блізка.

Яна нібыта спалохалася, адступіла крок назад. Вочы перасталі ўсміхацца.

— Мой тата працуе лесніком,— не ведаючы чаму, сказала яна і пачырванела.

— А мой тата навуковы супрацоўнік Бел-дзяржні-сельгас-маш-пра-екта,— па складах выгаварыў Ігар.— Будзем знаёмы. Ігар Драмлюга,— і працягнуў руку.

— Ай! — дзяўчына схавала свае рукі за спіну і пакруціла галавой.— Мяне завуць Алеся...

— Алеся? — нібы не паверыў Ігар.— Вось гэта загаловачак! У лесе жыла Алеся, дачка лесніка...

— Я прыйшла не знаёміцца! — перапыніла яго Алеся.— Я не такая, як вашы гарадскія. Некалі мне знаёміцца...

— І я не такі, як вашы, вясковыя...

Гэта забаўная гульня, мабыць, спадабалася абаім, бо Алеся адразу засмяялася і, сарамліва адвярнуўшыся, сказала:

— Бачу, што не такі, як нашы...

— Горшы ці лепшы?— пакруціўся перад ёю Ігар.

— Ты артыст? Іграў на сцэне стылягу? — шчыра спытала яна, паказваючы на яго адзежу.

— Ага!

— Ой, пекалі мне! — спахапілася Алеся.— Мяне прыслаў тата...

— Ведаю.

— На паляне была наша сырадэля, не дужа многа. Яе нехта з вашых знёс...

Ігар адказаў не адразу. Па разгубленым твары можна было здагадацца, што нечага ён не зразумеў.

— Як ты сказала? Што ў вас там знеслі з паляны? — перапытаў ён насцярожана.

— Сырадэлю.

— Сырадэлю? Здаецца, ніхто не прыносіў,— паціснуў ён плячыма.— Шукай, калі хочаш...

Яна азірнулася на лагер.

— Дзе шукаць?

— Дзе хочаш. У вёдрах, у сумках, у місках...

— Сырадэлю?! — Вочы ў Алесі акругліліся, таўставатыя вільготныя вусны расплыліся ва ўсмешцы.

— Ага... Я не браў. Сардэлькі я еў. Яшчэ — сардзіны і нават сасіскі, а сырадэлі... не нюхаў.

Зноў Алеся забылася на свой абавязак, з якім паслаў яе сюды бацька. Яна смяялася, як малая дзяўчынка. А Ігар, здаровы дзяцюк, можа, упершыню не ведаў, з чаго смяецца гэтая малая, ад якой чамусьці ніяк не адвесці поўнага невядомым захапленнем позірку. Яму было проста радасна на душы ад яе прывабнай усмешкі, ад мяккага, лагоднага голасу.

— Гэта ж трава такая! — растлумачыла нарэшце Алеся.— Яе сеюць для жывёлы.

— А-а... Навінка культуры? — запытаўся ён.— Адкуль жа яе нам падкінулі?

Яшчэ раз зірнуўшы на яго кашулю, на штонікі, аздобленыя замкамі-маланкамі, Алеся пачала кпіць:

— Вядома ж, з-за мяжы.

— Мадэ ін уса! — Ігар падняў угору вялікі палец і потым тыцнуў ім сябе ў грудзі.— Усё моднае адтуль. Культура! Страшэнная культура...

— Яшчэ якая страшэнная. Незвычайная,— зусім сур'ёзна падтакнула Алеся.— А сырадэля, ведаеш, у чым была?

— Ну?

— У рэзгінах.

Ігар кіўнуў пальцам убок.

— І гэта — адтуль?

— Адтуль. Незвычайная прылада — рэзгіны.

— І ты незвычайная. Мадэ ін уса. У мяне ёсць для цябе дарагі падарунак! — Ігар кінуўся ў палатку і неўзабаве выйшаў адтуль з невялічкай тонкай пляшачкай у руках.— Вось, духі «Святая Марыя». У аднаго тыпа выменяў ля гасцініцы на сталічную гарэлку.

Алеся асцярожна, як нешта жывое, узяла пляшачку ў рукі і, не адкаркоўваючы, панюхала. Адразу спахмурнела, зірнула на этыкетку. Вусны ледзь улоўна ўсміхнуліся.

— Тонкі водар! — сказала яна.

— Мадэ ін уса! — Ад задавальнення Ігар заплюшчыў вочы і гучна пацягнуў носам паветра.

У той жа момант Алеся адкаркавала пляшачку і лінула яму пад нос. Ён схапіўся за твар рукамі, закашляў.

— Вой! Што гэта такое? Якой брыдотай ты мяне абліла? — залямантаваў Ігар.

— Мадэ ін уса! — засмяялася Алеся і паказала на пляшачку. Ігар выхапіў, панюхаў.

— Бензін,— разгублена вымавіў ён.

— Але ж... Бензін для запальнічак. Канцэрна эсо. Вось тут напісана. Трэба ўмець чытаць.

«Уліп! Сорам на ўсю вёску. Нават больш. Раскажа!» — мільганула ў галаве, але ён не падаў выгляду. Смяяўся разам з ёю, жартаваў.

— Махляр! Вып'е ён у мяне сталічную. Я ўсуну яму дыстыляваную ваду...

— Адзін аднаго варты...

— Ага,— згаджаўся Ігар.

— Чым больш стракатая птушка, тым яна горш спявае,— Алеся паказала на яго кашулю.

— Ага... Як ты сказала? — спахапіўся.— Здорава! Сіла!

— Дык дзе ж гэта наша сырадэля і рэзгіны?

Смех прапаў. Гэтая дзяўчына ўмела надзвычай хутка ад жартаў пераходзіць да сур'ёзных спраў.

— Знойдзем! — сур'ёзна паабяцаў Ігар.— Пойдзем спытаем у нашага Івана Барысавіча. Ён усё ведае. Усё на свеце. Вы не ведаеце нашага Івана Барысавіча?

Адкуль столькі энергіі, столькі жадання памагчы? Ігар жа быў самы ціхі, самы абыякавы да ўсіх. Ён не цярпеў ніякіх абраз, ніякіх насмешак. А тут, нейкая ма-

лая з вёскі, фактычна высмеяла яго, як хлапчука. А ён нават нібыта і рад. «Артыст, стылягу іграю»,— нявесела падумалася яму. Цяпер ён саромеўся сваёй кашулі, надзвычай яркіх шкарпэтак і штонікаў з замкамі. Ён быў як голы. Адчуванне няёмкасці не пакідала яго ні на хвіліну.

* * *

Набліжаўся дзень, калі павінны былі прыехаць галоўныя сілы на чале з Палінай Іванаўнай. Да гэтага дня «разведчыкі», як называлі групу Каляды, рыхтаваліся асабліва дбайна.

Вакол лагера сабралі ўсё ламачча, засыпалі ямкі, паставілі ўсе палаткі, зрабілі сапраўдную кухню з доўгім сталом з абчасаных бярозавых жэрдачак. Адным словам, базу наладзілі сапраўдную. Дзікую паляну стала не пазнаць.

За гэты час Алеся пасябравала з Аленай і Нінай. Яна ўгаварыла свайго бацьку, і ён прывёз у лагер два вазы сухіх вершалін і пнёў. Дрывотнік выбралі ў хмызняку, паводшыбе.

Неяк дзяўчаты шчыра загаварылі пра Віктара. Апошнім часам ён пацішэў, нібыта замкнуўся. Сядзелі яны каля агню, над якім было падвешана невялічкае вядзерца з бульбай. Яна ўжо згатавалася, і прыемны пах разносіўся наўкола.

— От скажы, Алена... Якое ў цябе было адчуванне, калі Віктар пацалаваў? — чырванеючы, спытала Ніна. Алеся толькі хіхікнула. Яе хітраватыя вочкі цікаўна бліснулі. Алена пацiснула плячыма. Яна не ведала, што адказаць.

— Я ледзь не памерла ад страху,— ні то жартам, ні то сур'ёзна адказала Алена.— Гэта было так нечакана. Ты ж ведаеш Віктара.

— Ведаю! — Ніна махнула рукой.— Ну, а потым? Што потым?

— А потым ледзь не плакала. Мяне ж — падумай толькі! — яшчэ ніхто-ніхто не цалаваў...

Ніна спачувальна ўздыхнула.

— І мяне — ніхто-ніхто,— прызналася яна.— Я б яму за гэта, ведаеш што... Я б яму проста ў вочы сказала: «Эх ты, звер, а не чалавек! Калі яшчэ хоць раз пацалуеш, то атрымаеш... Адразу...»

Алена падумала.

— А ці прыстойна гэта будзе?

— Што? — спытала Ніна.

— Ну... атрымаеш...

— Няма чаго з гэтымі хлопчыкамі цырымоніцца! — махнула рукой, як адсекла, Ніна.— Не шкадуй іх. Праўда, Алеся?

— Не ведаю...

— А я ведаю! Другі раз так і зраблю! — У Алены шчокі паружавелі, з'явілася хітраватая гарэзлівая ўсмешка.— Ён мяне пацалуе, а я яго назад... пацалую. Ой...— і залілася звонкім ненатуральным смехам. Потым усхапілася з месца, узяла Алесю за рукі і пачала кружыць з ёю вакол разгубленай Ніны.

— Алена... Што ты сказала? — Ніна не магла вымавіць гэтыя словы спакойна, голас яе дрыжаў.

— Я нічога не гаварыла! Зраблю так, як ты раіла. Зраблю! Ніна, Ніначка, ён жа нічога благога... Ён харошы!

У гэты час аднекуль з ракі пачулася:

— Але-е-еська-а!

Ігараў голас. Алеся нібыта ўздрыганулася, насцярожылася, як дзікая каза. Не стрывала, вінавата зірнула на сябровак, вырвала рукі, пабегла. Алена толькі памахала ўслед.

А Ніна засумавала.

— Я, мусіць, самая нешчаслівая...— Яна села да стала.— Вось скажы, Алена, чаму я такая ўрадзілася? Мусіць, язык мой нікому не падабаецца.

Гэта была праўда. На кожны хлапечы жарт яна магла адказаць вострым слоўцам. І таму Алена проста параіла:

— І яшчэ прычоска не для дзяўчыны. А штаны пакладзі на выпадак паходу. Яны так псуюць твой знешні выгляд. У іх ты як даўганогая чапля. Бяры прыклад з Алесі...

— Дык яна ж вясковая.

— А наш самы модны Ігар аж млее. Не пазнаць стала чалавека, папрыгажэў, паразумнеў.

Так яны, дзве зязюлькі, закукаваліся, што не ўгледзелі, як пачала падгараць бульба. Спахапіліся, калі ўжо запахла гарэлым. Ніна памкнулася зняць вядро, але толькі апякла рукі. Добра, што ў гэты час нанесла Сароку. Ён адсунуў вядро на край кія, зморшчыўся.

— Эх, мухі-сакатухі! Спсавалі гэтулькі бульбы, якую я здабываў кроўю і потам, сваімі мазалямі! — і працягнуў доўгія, як вёслы, рукі. Рыжыя валасы ў яго аж гарэлі на сонцы, а твар быў сумны-сумны. Не твар, а мокрая ануча.

Сарока сеў проста на зямлю, узяўся аберуч за галаву, нібыта забалела яна.

Ніна спытала:

— Што з табою, Сарока? Ці не з пахавання ты прыйшоў? Ці, можа, таксама закахаўся?

— Горш! — Сарока стукнуў кулаком па зямлі.— Сакрэты трымаць умееце?

— А што? — загарэлася Ніна.

— Дазвольце далажыць! — адразу падхапіўся Сарока.— Рыбку ў старога я сцягнуў.

Неверагодна! Тым больш што Сарока лічыўся самым чэсным у гэтых адносінах. Было неяк у школе. Прапала чыясьці аўтаручка. Выпадак непрыемны. Усе захвалявaліся, занепакоіліся — хто б гэта мог? Ужо на апошнім уроку, калі не засталося ніякай надзеі знайсці прапажу, Сарока раптам пытае: «А якая яна была, ручка, якой маркі?» — «Ленінградская,— кажуць,— чорная». А Сарока: «Вось, я ля парты знайшоў»,— і падаў, чырванеючы пад хітравата-недаверлівымі позіркамі таварышаў, чорненькую ручку ленінградскай вытворчасці. Нехта нават упікнуў: «Знайшоў — сякеру пад лавай». За злодзея палічылі. А назаўтра высветлілася, што аддаў ён сваю ручку, бо ручка таго вучня знайшлася дома. Проста забыўся ён яе...

Так тады задумаў Сарока абараніць чэсць класа. А цяпер...

— Як жа гэта ты, Сарока? — Алена ад спачування аж заміргала вачыма, быццам сабралася заплакаць.

— А вось так! — Ён усунуў рукі ў кішэні, крутнуўся на каблуку.— Сем донак, тры вуды, дзве старожні, спінінг — і гэта на аднаго! Ці ж дазволена аднаму столькі прылад? Ці спартыўная гэта лоўля?

— Чакай, чакай,— перапыніла яго Ніна, стала побач, склаўшы на грудзях рукі, прыжмурылася.— А гадзіннік-то ў сумцы быў Міхасёў! Ці не надумаўся ты яго выручыць?

— Не! — Сарока апусціў рукі, пакруціў галавою.— Гадзіннік... Я ў яго купіў. За дзесятку. Думаў вярнуць потым... Вось як усё нясκладна выйшла...

— Няскладна,— згадзілася Алена.— Горш не прыдумаеш. Трэба ва ўсім прызнацца Івану Барысавічу. Так і сказаць, як нам. Што той рыбак хапуга, жмот.

— Але ж браць чужое, нават і жмотава, усё роўна нельга,— уставіла Ніна.

Нейкі час яны памаўчалі, напружана думаючы, як выйсці з такога цяжкага становішча.

Раптам Сарока ўсміхнуўся.

— Ёсць! — усклікнуў ён.— Пайду наймуся да таго рыбака памочнікам. Адраблю.

— І не думай! Вось так і кулакі выраслі. Адзін ішоў адрабляць, другі. Батрак яшчэ знайшоўся,— кпліва прагаварыла Алена.— Лепш атрымаць вымову, але быць чэсным, трымацца свайго погляду. Правёў рэквізіцыю ў браканьера — і ўсё!

— На другое нам нічога не застаецца,— развёў рукі Сарока.— Так і запішам.

* * *

Мінуў яшчэ дзень, і на дзікай паляне чырвоным агеньчыкам затрапятаў на ветры вымпел. Вакол стала з'явіліся парусінавыя складаныя крэслы. Недзе ля ракі чуўся шматгалосы гоман, смех. Гэта прыехалі галоўныя сілы.

А за сталом, засланым квяцістай цыратай, Каляда і Паліна Іванаўна пілі сапраўдны чай і вялі мірную гаворку.

Паліна Іванаўна жанчына такога ўзросту, калі ўжо і не ўспамінаюць пра гады, а толькі кажуць: «Вы зусім яшчэ маладая». Альбо: «У вас вельмі маладжавы выгляд». Бывае. Усякае. На выгляд дваццаць, а на самай справе — трыццаць. І наадварот. Усё залежыць ад таго, як чалавек сочыць за сваім знешнім выглядам. Паліна Іванаўна толькі тым і жыла, тым і займалася ў вольныя ад работы хвіліны.

— Месца мне падабаецца,— гаварыла яна тонам старэйшага, патрошкі адпіваючы са шклянкі сваім маленькім роцікам.— Суха, зацішна, рака не блізка. І палаткі размясцілі не блага. А як усё астатняе?

— Ды так сабе...— Каляда не дужа хацеў гаварыць пра ўсё астатняе, але так ужо выйшла.— Вядомая справа — молада-зелена. Адразу яно і пачалося...

— Што пачалося? — Дапытлівыя, насцярожаныя Паліпіны вочкі застылі, сталі нібыта са шкла.— Што пачалося?

— Ды гэта самае... Тое не гэтак, гэта не так,— пачаў выкручвацца Каляда.

— Што — не гэтак, а што — не так?

— Усякае...

— Не слухаліся хлопчыкі?

— Ды як сказаць...

— З імі трэба — ого! — як строга. Трымаць у цуглях. Не ўсіх, вядома. Скажам, Міхась...

— Не верце яму! — перапыніў яе Каляда.— Выдумаў. Не так ужо і страшна ўсё, як здаецца.

— Пра што вы гаворыце, Іван Барысавіч? — Паліна паставіла шклянку і зноў, як кобра, уставілася на сваю ахвяру.

— Як пра што? Вам жа, відаць, Міхась чорт ведае чаго нагаварыў, наплёў...

Паліна аж устала.

— Ды я яго тут проста яшчэ не бачыла...

Вось яно што! Значыць, Міхась не зайшоў у школу, нічога не расказаў. Дарэмна толькі ён, Каляда, баяўся, дарэмна гаварыў абы-што. Падумаўшы, сказаў:

— І не ўбачыце цяпер свайго Міхася! Вырваўся звер на волю — не зловіш. Горад яму ў лесе падавай!

— Дык Міхась у горадзе?

— А то дзе ж яшчэ.

— Не прыходзіў ён на збор,— зноў села Паліна.— Ой! Утапіўся! — Схапіла шклянку, глядзіць у яе.

— Такі не ўтопіцца.

— Камар, кажу, у шклянцы ўтапіўся...

Каляда ў душы рассмяяўся. Знаёмая звычка! Паліна можа аднолькава спакойна гаварыць пра розныя рэчы. І пераскокваць з аднаго на другое без усялякага пераходу. Помніць ён, як на педсавеце яна дакладвала пра адзін выпадак у восьмым, дзе была тады класнай. Справа звычайная — двое паспрачаліся. Адзін, больш нявытрыманы, і засадзіў другому ў шчаку пяро. Давялося адправіць яго на «хуткай». «Іван, кажуць, першы пачаў біцца,— спакойна гаварыла Паліна, а Пятро ў адказ крыкнуў... Зачыніце, калі ласка, вокны, а то дужа равуць машыны. Зачыніце, кажу...» Потым сама прайшла і зачыніла вокны на вуліцу. Бачыў Каляда, што ўсе міжволі ўсміхнуліся.

Так і цяпер. Узяў з рук Паліны шклянку, крыху адышоўся, выкінуў лыжачкай камара і вярнуўся назад.

— Вось, свежага чаю наліў...

— Дзякую,— узяла з рук шклянку, глынула аж два разы.— Дык чаму ж гэта Міхась не прыйшоў на збор?

— Хто яго ведае.

Праз нейкі час, як на ліха, у Палініну шклянку зноў уваліўся камар. І зноў Каляда выкінуў яго, бо ў чайніку амаль нічога не было.

— Так я адна ўвесь чай вып'ю! — усміхнулася Паліна, калі ён зноў прынёс яе шклянку.

— Увесь! — адказаў Каляда, маючы сваё на ўвазе.— Усё да дна, на здароўе...

І сам узяўся за шклянку.

— Трэба будзе па яго паслаць,— праз нейкі момант загаварыла зноў пра Міхася.

— Ды ну яго! — махнуў рукою Каляда.

— Іван! — з націскам над «і».— Як гэта ты... вы...

— Ты! — падказаў ён.— Мы ж старэйшыя на свеце сябры, Поля... Былі...

— Былі,— згадзілася яна.— Як гэта ты так гаворыш? Адпусціў аднаго хлопчыка ў горад і не хвалюешся.

— Ось, паслухай, як гарцуюць хлопчыкі...

Яны ўслухаліся. Бясконцы гул галасоў далятаў ад ракі, са скошанага лугу. Аж зямля гула там у іх пад нагамі. Футбольны мяч бухаў, як бубен. Аж звінеў.

А тут, запыхаўшыся, забег Ігар.

— От дае! От дае! — Шчаслівы адкрыты позірк, чырвоныя вушы, раскудлачаныя валасы.— Вы б толькі паглядзелі, як дае!

Паліна ўстала са шклянкаю ў руцэ. Здзіўлена, як на незнаёмага, паглядзела на Ігара.

— Хто дае? Што дае?

Каляда схаваў сваю ўсмешку, звесіўшыся над шклянкай. Ён-то ведаў, пра што гаворыць ачунялы гультай Ігар.

— Алеська...

— Якая яшчэ Алеська?

— Ды гэта, што сырадэлю з рэзгінамі шукала...

— Якую сырадэлю? З якімі рэзгінамі?

— Іван Барысавіч ведае! — Пад позіркам класнай Ігар адступіў на крок, асеў.

— Ведаю, ведаю,— загаварыў Каляда.— Вясковая дзяўчынка. Мале-енькая такая. Вось тачкая,— паказаў ён ледзь вышэй стала.

Ігар весела зарагатаў:

— Яна ўсіх нашых пабіла...

Каляда нібыта абрадаваўся:

— Алеська? Маленькая? — Ён падаў Ігару знак, каб той бег ад іх, але Ігар не зразумеў. Затое Паліна адразу здагадалася, у чым справа.

— Ігар, што там за Алеська? — нахмурылася яна.

— Во — валейбалістка! — паказаў ён вялікі палец.— Дзяўчына што трэба. Не праходзьце міма! Ясна?

Шкляпка выпала ў Паліны з рук і разбілася на кавалачкі. Трэба ж было трапіць якраз на каменьчык. Каляда падбег, сабраў ашкалёпкі.

— Што з вамі? — занепакоіўся ён.

— Ой! — Цяпер Паліна глядзела на Ігара са страхам.— Хто гэта перада мною?

— Ігар Драмлюга. Наш Ігарочак...— зноў замахаў яму рукою Каляда.

— Як ты сказаў, Ігар?! — зноў пачала наступаць на яго Паліна. Ігар задам пайшоў ад яе.— Паўтары, як ты сказаў!

— Я сказаў... харошая валейбалістка.

— А міма? Што — міма?

— Міма... не прапусціць ніводнага мяча. І наогул — во якая дзяўчына! Сіла! — І ён памчаўся з паляны, як падстрэлены лось, ламаючы галлё сваімі дужымі нагамі.

Паліна зморана апусцілася ў падстаўленае крэсла. Каляда на гэты раз быў больш чулым да сваёй даўняй сяброўкі.

— Іван,— праз момант сказала яна.— Што здарылася з Ігарам? Ён звар'яцеў, га?

— Ды не-е.

— Значыць, я звар'яцела.

— Ды не-е.

— А хто?

— Аніхто...

— Ён жа быў такое цяля, Ігар. Хадзіў як у ваду апушчаны, як санлівы. Што здарылася?

— Што здарылася? — Каляда ўсміхнуўся, туды-сюды прайшоўся.— Можа, тая, вясковая, абудзіла яго душу. Бачыла — заскакаў, як малады козлік.

Паліна пакрыўдзілася:

— Іван! Як табе не сорамна, яны ж яшчэ дзеці...

— Якія вырастаюць у юнакоў. І абуджаюцца ў іх душы, як у нас некалі.

— Было-о...— Паліна паглядзела на Івана.— Не, не дазволю! Без мяне — няхай... А пры мне... Вось я ўтаймую іхнія душы! Яшчэ, чаго добрага, пачнуць тут, на гэтай дзікай паляне любоў круціць?! Не дазволю! Не дазволю ўсякім вясковым прыходзіць у лагер і спакушаць нашых хлопчыкаў. Можа, распуста якая...

Яна шмат чаго яшчэ не дазваляла, шмат гаварыла,

а Каляда маўчаў. І так яшчэ добра, што Паліна не ведае большага. Што, напрыклад, у апошні час з лагера сёе-тое пачынае знікаць невядома куды.

Гэтую непрыемную размову перапыніў рыбак. Той самы, у якога ўкралі шчупакоў. Ён з'явіўся так дарэчы і так недарэчы. Спыніўся зводдаль, зняў шапку.

— Вітаннне вам, людцы.

Каляда адразу памкнуўся насустрач, паціснуў старому сухую, як дошка, руку.

— А-а, Рыгор Прохаравіч! Прабачце, даражэнькі, у нас тут маленькая нарада...

— Га? Чаму гэта паненка не рада? — скрывіў той галаву.

— Нарада, кажу.

— А-а, нагрда. Ды ўжо ж, за такіх шчупакоў і награда, ента, павінна быць адпаведная.

Стары азірнуўся, як бы выбіраючы, куды яму сесці. Стаяла вакол столькі крэслаў, што аж разгубіўся. Але госця, як відаць, не спяшаліся запрашаць.

— Прыйдзіце, калі ласка, заўтра. Нам некалі,— ужо лагодней папрасіў старога Каляда.

— Што?

— Паслязаўтра! — зазлаваў і адвёў рыбака ўбок, хоць той і ўпіраўся, як вол.

Нарэшце зразумеў:

— Калі прыйсці?

— Заўтра... Паслязаўтра. Пасля дожджыка ў чацвер,— ужо весела жартуючы, сказаў Каляда, спадзеючыся, што рыбак усё роўна нічога не пачуе. Але ён усё добра пачуў.

— Ты мне не чмуры — пасля дожджыку! Я, здаецца, сваімі рукамі...

— Колькі ў вас донак, жэрліц і іншых прылад? — спытаў Каляда.

— Іншым разам — дык іншым разам,— зноў недачуў, але супакоіўся стары і пайшоў з лагера. Бо адчуў у сваёй руцэ знаёмы хруст паперкі, якую падсунуў Каляда.

Калі стары пайшоў, Паліна спытала:

— Іван, што ён гаварыў?

— Ат, абы-што...

— Што тут было яшчэ, Іван?

— А халера яго ведае. Па-мойму, дык нічога не было. Ціхае месца.— Ён азірнуўся ў той бок, куды пайшоў рыбак.— Жывём, як на іншай планеце... Я так люблю, калі ты гаворыш на мяне Іван. Ах, Поля...

— Гэта я люблю, калі ты кажаш — Поля. Але справа...
— З таго часу, як я хацеў цябе пацалаваць...
— Іван!
— Не буду...
— Пойдзем на луг і ўсё высветлім.

Статная, у меру поўная, у вясёлай стракатай сукенцы, якая ладна аблягала яе стан, Паліна ўладарна пакрочыла наперадзе. Каляда, як пакорлівы вучань, паплёўся ззаду.

«Не, з ёю нельга жыць у згодзе. З ёю трэба, як з ліхой скулой. Дагаджай і падтаквай. А сам сваё знай. Незразумелы характар. Незразумелы і цяжкі»,— думалася яму тым часам...

* * *

Лагер на нейкі час апусцеў. Але ненадоўга. Не справіліся далёка адысціся Каляда і Паліна, як між палатак злодзеем пракраўся абрэслы, пячэсаны, у пакамечанай бруднай адзежы невядомага колеру чалавек. Калі б хто з дзевяцікласнікаў уважліва да яго прыгледзеўся, то пазнаў бы ў ім яшчэ нядаўна чысценькага прыгажуна Міхася. Гэта быў ён. І прыйшоў Міхась з нядобрай мэтай. Нешта ўкінуў у вядро з вадою, схапіў са стала пачак цукру, хлеб у цэлафанавым мяшэчку. Забег у палатку, вынес адтуль вядзерца, усё склаў у яго, прыслухаўся.

— Яшчэ і праўда нічога страшнага не здарылася,— ціха сказаў сам сабе.— Але хутка здарыцца. Вы ў мяне яшчэ паскачаце і паплачаце, запомніце вы мяне, Іван Барысавіч.

Падбегшы да стала, Міхась дастаў з кішэні сіні запячатаны канверт і паклаў на самае віднае месца — перад кветкамі. Зноў азірнуўся. Нікога. І тады яму захацелася пакінуць след. Пашастаў у кішэні запалкамі. Не, падпаліць палатку — гэта занадта адказна, гэта страшна. Падумаў. Потым пачаў бегаць ад палаткі да палаткі і зрываць іх з колікаў. Скінуў з лаўкі чысты посуд, параскідаў па лагеры набітыя сенам падушкі. Што ж яшчэ? Ага, вунь стаяць вуды. Раскідаў і іх. Папрацаваў як мае быць. Няхай цяпер шукаюць вінаватага. Іван Барысавіч скажа: «Яшчэ адна непрыемнасць!» Вось ужо ён, Міхась, напсуе крыві ўсім. За сваю крыўду, за абразу...

Пачуўшы, што нехта ідзе ад ракі, Міхась схапіў вядзерца і знік у хвойніку. Нібы і не было яго...

Першы ўбачыў гэты вэрхал у лагеры Андрэй. Стаў як слуп, падзівіўся:

— Бацюхны! Што яны тут парабілі! Я ж казаў — Паліна Іванаўна ўсё перайначыць.

— І няхай! — падхапіў Алесь.— Мы ёй паможам. Люблю, калі вось так. Рэвалюцыя-я!

Толькі дзіву даваліся Ігар і Алеся, як яны з Андрэем лоўка пачалі падбіваць нагамі мяккія падушкі. Як футбольныя мячы. Яны звонка шапацелі сенам, быццам падзадорвалі хлопцаў.

Андрэй спыніўся, выцер пот рукавом.

— Алеся, Алеся, бачыш, як тут весела! Заходзь да нас кожны дзень, сумаваць не будзеш!

— Некалі мне кожны дзень.

Алеся прыжмурылася на сонца, і твар яе, здавалася, прасвяціўся наскрозь. Такі ён быў чысты, свежы...

— Мы будзем чакаць, сумаваць,— пакінуўшы нарэшце гэтую гульню, падышоў да яе Алесь. Яны стаялі побач.

— А вы займіцеся працай — некалі сумаваць будзе, таварыш Алесь! — Алеся зыркнула на Ігара, і ён задаволена ўсміхнуўся ёй. Адбрыла!

— Алеся і Алесь! — падхапіў Андрэй, зводзячы іх рукі.— Як гэта здорава. Цэлая Алісея!

Ён павярнуўся да Ігара і, набліжаючыся да яго, пачаў фальшыва насвістваць матыў песні з кінафільма «Шлях да прычала».

— Разумееш? Трэці павінен пайсці,— растлумачыў таварышу Алесь.— Гэта датычыцца цябе, Ігар!

Ігар ірвануўся да іх, нібы яго ўкалолі.

— Што?! Я павінен пайсці? — Ён схапіў Алеся і Андрэя за каўняры, развёў, як малых, у бакі.— Адказвайце, хто з нас пойдзе, а то грымну!

Алеся запляскала ў далоні і засмяялася.

— Бач, сіла вярнулася,— паспрабаваў вырвацца Алесь, але гэта яму не ўдалося.

— Аджыла! — гыркнуў Ігар.— Яна да пары да часу спала пад маёй кашуляй. Ясна?

Лепш бы ён не ўспамінаў пра сваю кашулю! Андрэй, які пачаў ужо злаваць, ухапіўся за гэтае слова.

— Эй ты, кашуля мадэ ін уса, паціху! — агрызнуўся ён.— Папугай, пудзіла гарохавае!

Ігар выпусціў Алеся і стаў насупраць Андрэя. Кулакі яго сціснуліся.

— Паўтары, недаростак!

Андрэй, мабыць, здаў. Павярнуўся да Алеся і з кепікамі прамовіў:

— Цярпець не магу крыўляння гэтай стракатай малпы. Калі ён хоча біцца, то няхай здыме кашулю. Барахольшчык...

— Кашулю я магу зняць! Змяніць. Але вось як ты зменіш сваю паганую фізіяномію?

Ігар зноў схапіў Андрэя загрудкі і ўдарыў па твары. Потым падхапіў і зваліў на зямлю. Яны пачалі тузацца, перакачвацца адзін цераз аднаго, як двое задзірыстых катоў. Ігарава кашуля затрашчала.

Алеся падбегла да іх, крыкнула:

— Ігар! Я думала — вы жартам!..

Алесь супакоіў яе:

— І я думаў — жартам. Няхай паабдымаюцца, лагаднейшымі стануць! — І ўбачыўшы, што Андрэй ужо ляжаў на лапатках, пачаў лічыць: — Раз... Два... Тры...

Ніхто і не заўважыў, як з'явіліся Каляда і Паліна. Пры такім відовішчы яна ўскрыкнула і схапілася за грудзі:

— Ой, што гэта?

Алесь узяў Алесю за руку, і яны шаснулі за бліжэйшую палатку. І добра зрабілі, бо ў тую ж хвіліну пачалося самае непрыемнае. Паліне Іванаўне стала дрэнна. Яна цяжка апусцілася ў крэсла і ледзьве вымавіла:

— Што гэта? Іван, куды я трапіла?

— Хлопчыкі-і! — крыкнуў Каляда.

Хлопцы, цяжка сапучы, узняліся. Але не пабеглі. Стаялі, як пеўні, гатовыя зноў схапіцца за чубы.

— Іван... Вады, калі ласка,— папрасіла Паліна. Яна не знаходзіла слоў ад абурэння.

Каляда зачэрпаў у вядры кубкам і падаў ёй вады. Яна заплюшчыла вочы, глынула. Чагосьці зжахнулася, зірнула ў кубак. І раптам, усклікнуўшы, зноў схапілася за грудзі. Вочы заплюшчыліся.

Каляда ледзьве справіўся падхапіць кубак.

— Што з вамі? — нічога не зразумеў ён.

Паліна павольі адкрыла вочы і дзіка ўскрыкнула:

— Кракадзі-іл!

— Хто — я?

— У кубку-у!

Каляда зірнуў у кубак і супакоіўся. Нават крышку ўсміхнуўся.

— Ніякі не кракадзіл,— як мог, лагодна прамовіў ён.— Гэта апалонічак з ножкамі.

— Апа-апа-лоні-іча-ак?! — усхапілася Паліна.— Яны падкінулі! Усё яны-ы...

— Хлопчыкі, гэта вы? — чамусьці лагодна спытаў Каляда.

— Не мы,— буркнуў Андрэй.

— А гэта? — Ён паказаў на палаткі, на падушкі.— У што вы гулялі, хлопчыкі?

Ігар, якому ўся гэтая камедыя надакучыла, адказаў злосна:

— У братоў-разбойнікаў.

— Чуеце? — звярнуўся Каляда да знямелай Паліны.— Яны гулялі... у братоў гулялі. Брацікаў. І трэба сказаць, гэта ў іх пядрэнна атрымалася.

— Проста здорава! — падтакнуў Ігар, захінаючы парваную кашулю. Каляда гэта заўважыў.

— Падыдзі сюды, Ігар,— паманіў ён пальцам.— Што ты там хаваеш ад нас, га?

— Кашулю ў лесе парваў, зачапіўся...

— А навошта ты чапляўся?

— Каб парваць. Абрыдла...— Ён тут жа скінуў кашулю, зняў яркія шкарпэткі, кінуў пад ногі.— Хопіць. Пагуляў крышку і хопіць. Абрыдла...

Тут жа Паліна зноў ачуняла. Сціснутыя кулакі ўзляцелі ўгору, твар аж зайшоўся сінню.

— І мне абрыдла! — грымнула яна.— Хопіць! Я паскідаю вам не толькі кашулі, але...

Яна недагаварыла, бо, па-першае, чамусьці ніхто не спалохаўся (падумаць, як выраслі хлопчыкі — нічога не баяцца!), а па-другое, Каляда схапіў яе за руку, пачаў угаворваць:

— Не хвалюйцеся, Паліна Іванаўна, супакойцеся. Усё ўладкуецца, абыдзецца. Разбяромся ціха...

— Цяпер-то я ўжо ніколі не супакоюся. Ніколі...

* * *

Недзе ў вялікім лесе захавалася маленькая, пяць крокаў ушыркі і дзесяць удоўжкі, палянка. З пядаўняга часу на ёй іншы раз віўся ўгору дымок, патрэсквала ў агні сучча.

Пад маладой елачкай, што стаяла ледзь не па сярэдзіне палянкі, вырас будапок. Яловыя лапкі шчытна ўкрыва-

лі яго, і толькі вузенькі ўваход цямнеў пад навіслымі бярозавымі галінкамі. Усё-такі прыемней, калі пры ўваходзе не калючыя іголкі, а мяккія пахучыя лісцікі.

Побач з буданом, у грудку, ляжала крыху дроў, сухога галля. Каля вогнішча стаяла вядзерца, пакрытае яловай карынкою. Па ўсяму было відаць, што месца тут абжытае. Толькі цяпер на палянцы нікога не было...

Цішыня.

Але вось недзе трэснула галінка. Пачулася ледзь улоўнае: «Цс-с!»

Цікаўная шэрая птушачка, скрывіўшы чубатую галоўку, насцярожылася, пачула небяспеку. Скочыла з галінкі, ціўкнула, нібы падала сігнал іншым.

Але небяспекі для птушкі не было. На яе проста ніхто не звяртаў увагі. Віктар і Алеся, якія асцярожна выйшлі на палянку, уважліва назіралі за буданом — ці ёсць хто там, ці акажацца. Буданок маўчаў, бо ў ім нікога не было...

— Вось тут жыве ваш Міхась,— паказала на буданок Алеся.— Я падпільнавала яго, як бег у крыніцу па ваду.

Віктар абышоў будан, зазірнуў усярэдзіну.

— Кудысьці сцёгся на паляванне, лайдак.

Алеся ціха:

— А можа, ён стаў бандытам?

— Такі не стане,— упэўнена адказаў Віктар.— Такі хутчэй ператворыцца ў гадзюку, каб кусаць спадцішка. Нездарма ж ён пасяліўся ў такім месцы. Адно пісьмо чаго варта...

Трэба сказаць, што Міхась у апошняе наведванне лагера падкінуў на стол пісьмо. Быццам ад маці. У ім было: «Дзень добры, сыночак. Як табе там, у лагеры? Ці не крыўдзіць, часам, хто? Пішы нам...» І гэтак далей. А ў канцы подпіс: маці.

— Навошта ён падкінуў той ліст? — спытала Алеся.

— Эх ты, малая! — уздыхнуў з дакорам Віктар.— Усе ж думаюць, што ён паехаў дамоў. А тут — пісьмо. Значыць, яго там няма. Вось і кінуцца шукаць, нервавацца, строіць розныя здагадкі. Дзе Міхась? Што з ім? Дзяшовы трук. Добра, што я першы ўбачыў...

Віктар дастаў з кішэні сіні канверт і ўкінуў у будан. Зазірнуў глыбей і паклікаў Алесю.

— Зірні, там твае рэзгіны...

Алеся падбегла.

— Рэзгіны? — Прысела, зірнула.— Ага, яны! Вось хто, аказваецца, іх сцёг. Што будзем рабіць?

— Пачакаем,— устаў Віктар.— Ты яго, малая, толькі не бойся.

Яна пакрыўдзілася:

— Сто раз казала — не малая, не малая, не малая...

— Хоць тысячу. На цэлую галаву меншая за мяне,— стаў з ёю побач Віктар. Алеся неспадзеўкі схапіла яго за плечы і пачала падскокваць.

— Вот і не меншая, роўныя. Роўныя!..

Віктар падхапіў яе пад пахі. Таксама неспадзеўкі. Крышачку патрымаў. Нейкую хвілінку. Ды абое адчулі няёмкасць, сарамлівасць. Паціху паставіў яе на зямлю. Асцярожна, нібы яна была са шкла.

— Роўныя,— сказаў прымірэнча.— Дык... будзем чакаць таго чмура ці не?

Алеся паціснула плячыма, узняла на яго даверлівыя вочы.

— Лепш пайсці, а то спахопяцца ў лагеры, што цябе доўга няма, яшчэ адна бяда будзе. А вінаватая — зноў я...

Не дужа хацелася Віктару ісці назад, не пабачыўшы Міхася. Ды і лагер цяпер стаў не ў радасць. Пасля таго здарэння дужа жорсткія законы завяла ў ім Паліна Іванаўна. Але ж доўга чакаць таксама не выпадала.

— Пайшлі.

І забыліся нават на рэзгіны.

Не справіўся астыць іх след, як з-за дрэва высунуўся Міхась. У руках ён трымаў свой неразлучны фотаапарат. Хлопца нельга было пазнаць. Схуднелы, здзічалы як лясун.

— Вось гэта стрэл! Вось гэта ўдача! — Прабег у кірунку Алесі і Віктара, вярнуўся.— Ледзь не напароўся на іх. Але затое здымак будзе хвацкі...

Міхась, як той Рабінзон Круза, размаўляў сам з сабою. Ён радаваўся, што падлавіў свайго ворага ў самым крытычным моманце. Віктар трымаў Алесю ў руках, здымак будзе ў профіль, твары відаць.

Падышоў да пакінутых рэзгін, усміхнуўся.

— Гэтая штука, аказваецца, ім непатрэбна. Ну і Віктар! Ну і тып! Праслаўлю...

Гаварыў едка, помсліва. Зайшоў у будан і ўбачыў сваё пісьмо. Здагадаўся, што Віктар раскрыў яго сакрэт. Усюды ён стаіць на дарозе. Стала ніякавата, аж засмактала пад лыжачкай. Успомніў — ад голаду гэта. Есці так хочацца, хоць ты кулакі грызі, а нічога няма. Ля будана,

пад лісцем, ляжала некалькі бульбін, і Міхась падумаў іх спячы.

Папрaвіў на халодным вогнішчы галлё і хацеў яго запаліць, як пачуў вясёлы смех. Віктар і Алеся вярнуліся знянацку. Ён нават не справіўся схавацца.

— Ой! — збянтэжылася дзяўчына.— Хто гэта?

Міхась падняўся, навэдлях абтрос калені.

— А-а, злавіўся, бандзюга! — усклікнуў Віктар, падыходзячы да Міхася.

— Гэта вы... злавіліся! — Ён хітравата ўсміхнуўся, дадаў больш мірна: — Я тут жыву, калі ў лагеры месца не знайшлося. І ніякі не бандзюга...

— А гэта што? — Віктар падняў рэзгіны.— Скажы яму, Алеся, хто іх украў у вас?

Алеся ад разгубленасці ледзь вымавіла:

— Ага... Укр... узяў.

— Дык гэта ваша сена было на паляне ля крыніцы? — Міхась — ён умее быць кавалерам! — прыклаў руку да грудзей, папрасіў прабачэння.— Каб я ведаў, што ваша...

— Ага, наша. Мой тата працуе лесніком.

Віктар толькі дзівіўся — куды зніклі Алесіна смеласць, упэўненасць? Дзяўчыну не пазнаць.

А Міхась разышоўся:

— Ляснік! Цудоўная пасада. Вось я пажыў тут і думаю таксама вучыцца на ляснічага. А ты... сапраўдная Алеся. Лясуначка...

— Ну, ну, лягчэй на паваротах,— падышоў і стаў паміж імі Віктар. Міхась хуценька ўсунуў руку ў кішэню і дастаў два пакамечаныя рублі.

— Я павінен разлічыцца з ёю за сена і за гэтую вось сетку. А твая справа тут малая. Падкрэсліваю...— І да Алесі: — Вось, дзетка, вазьмі на цукеркі...

Алеся пакрыўджана падалася за Віктара, які адразу ўдарыў па працягнутай Міхасёвай руцэ. Грошы вываліліся. Міхась моўчкі згроб іх і зноў усунуў у кішэню. Сказаў пагрозліва:

— Вы гэтак? Добранька...

— Баялася кошка старога пацука ды з'ела ад страху,— усміхнуўся Віктар.— Біцца я не буду. Лепш пайшлі з намі ў лагер і там пагаворым як след. Купец, гадзіннік выкупіць грошы спатрэбяцца...

Амбіцыя знікла. Міхась памякчэў:

— І купец. Усё ў мяне ёсць.

— Гэта праўда,— у тон яму адказаў Віктар.— Усё

ёсць, аднаго розуму бракуе. Але гэта дробязь. Пайшлі, кажу, з намі, лепш будзе...

— Мне і тут не блага.— Ён памаўчаў.— Набрэшаш у лагеры?

— Сабакі брэшуць, людзі гавораць.

— Можаш гаварыць. Лес вялікі, перайду на новае месца, не знойдзеце.

— Хоць у вір галавой. Гэткая бяда. Пайшлі, Алеся.

І калі яны ўжо зрабілі некалькі крокаў, Міхась не стрываў. Яму, відаць, цяжка было зноў заставацца аднаму.

— Чакай! — міжволі вырвалася ў яго.

Віктар павярнуўся тварам да яго. Міхась пакорпаўся ў кішэні і дастаў складзеную ў некалькі столак паперку. Падаў яе Віктару, гаворачы:

— Вось чаго ты варты. Чытай...

Віктар узяў паперку. Толькі зірнуў на почырк, як адразу пазнаў яго. То пісала Алена. Вось што прачытаў здзіўлены хлопец: «Пляваць я хацела на твайго Віктара, калі ён такое табе гаварыў. І наогул — мне ўжо абрыдлі твае падазрэнні і папрокі. Ты ж сур'ёзны хлопец і павінен сам разабрацца ў нашых адносінах...»

Віктар усміхнуўся, аддаў паперку назад. Кінуў Міхасю проста ў твар, як прысуд:

— Правакатар!

— Так думаеш? — не разгубіўся той.

— Думаю. Што ты ёй нагаварыў ад майго імя? Калі казаў што брыдкае, то трымайся, рабінзон няшчасны! — і ўзяў Алесю за руку.— Пайшлі адгэтуль. Тут пахне цвіллю...

— Стой! — Міхась хваравіта ўсміхнуўся, няёмка патаптаўся на месцы.— Я невінаваты, што яна так напісала. Ды чорт з ёй! Лепш раскажы, як там у лагеры...

— Як у казцы. Ігар сядзіць пад арыштам, Алесь і Андрэй атрымалі па тры нарады, устаноўлена каменданцкая гадзіна. Працуюць гурткі: спевы, танцы, вязанне на прутках і гэтак далей.— Віктар растапырыў усе дзесяць пальцаў.

— Так вам і трэба.

— Дык ты не пойдзеш з намі?

— Цяпер — не. Пасля...— Адчувалася, што Міхась спакваля здаецца.— Толькі... як гэта зрабіць? Як з'явіцца ў лагеры?

Віктар паківаў галавою.

— Хто б казаў... Вопыт маеш. Дай тэлеграму такога зместу: «Еду, сустракайце, цалуйце, любіце... Міхась». І атрымаецца, быццам прыехаў.

— А куды пісаць? — ухапіўся за думку Міхась.

— Вось ёй,— паказаў на Алесю Віктар.— А яна прынясе ў лагер. Прывітанне, лясун! Я нікому на свеце не скажу, што меў шчасце гаварыць з табой.

Алеся і Віктар пайшлі.

Міхась доўга глядзеў ім услед, як бы штосьці мяркуючы. Хвілінная заклапочанасць азмрочыла твар. Толькі на час. Вось ужо твар прасвятлеў, на ім з'явілася нешта накшталт усмешкі.

— Меў шчасце, кажаш, гаварыць са мною? — У вачах з'явіліся хітрынкі.— Будзеце мець шчасце. Не так лёгка мяне пакінуць у дурнях. Падкрэсліваю... Адным стрэлам уходаў трох. Яго, Алену і Алесю. Пакруціцеся яшчэ ў мяне...

Міхась рашуча падышоў да будана, узяў вядзерца і пакрочыў у крыніцу па ваду. Ён надумаў неадкладна праявіць стужку. А потым пайсці да адзінокага бакеншчыка ў яго маленькую хатку і зрабіць фотакарткі. Дарэчы, там хлеб заўсёды ёсць. Іншы раз і рыба застаецца...

* * *

У лагеры панаваў парадак і спакой. Адчувалася, што якаясьці ўладарная рука добра пагаспадарыла тут.

На стале, у новай бліскучай вазе, красаваўся вялікі, як памяло, букет палявых кветак. На коліку, убітым непадалёк ад стала, на бярозе, на палатках — усюды віднеліся плакаты, якія заклікалі не кідаць пад ногі косткі ад рыбы, не смяяцца вельмі гучна, строга выконваць распарадак дня. І ўсё гэта, відаць, мела сілу.

Вось і цяпер дзесьці зводдаль ад лагера глуха гучаў хор. Спявалі зладжана, аднатонна, як у царкве.

— Зацягнулі ўжо сваё «алілуя»,— нездаволена зморшчыўся дзяжурны па лагеры Сарока. Ён стаяў, прыпёршыся спіною да бярозы, і глядзеў, як Алесь і Андрэй глумілі бульбу. Яны абіралі яе па-свойму... Выразалі кубікі, піраміды і іншыя геаметрычныя фігуры.

Раптам з бліжняй палаткі данёсся жалобны Ігараў голас:

— Беднаму вязню, ні ў чым не вінаватаму, падайце што-небудзь для падтрымкі штаноў і духу.

— Заткніся, даўбня! — Андрэй кінуў бульбінай у палатку.— Праз цябе мы тут бульбу знішчаем...

— Вось імепна! — падышоў Сарока.— Знішчаеце... Няўжо нельга без фокусаў, па-людску?

— І ты заткніся,— агрызнуўся Алесь.— Ходзіш па лагеры як прыдурак і ўяўляеш, што вельмі вялікі начальнік.

Сарока апраўдаўся:

— Пасля таго як усё пачало прападаць... Закоп ёсць закон. Вось вазьму і данясу Паліне Іванаўне.

Алесь непрыкметна падміргнуў Віктару:

— Давай уважым закоп, абыдзем яго, каб не зваліць з ног. Зловім варону?

Сарока зразумеў іх намер, адышоўся.

— Сунься толькі — разаб'ю каторамў вазу. Не змеціш...

У тую ж хвіліну хлопцы кінуліся на дзяжурнага, звязалі яму рукі, упіхнулі ў палатку, дзе сядзеў Ігар. А самі, як ні ў чым не бывала, зноў узяліся за бульбу.

— Адвяжы, мы іх ураз уходаем! — папрасіў Ігара Сарока.

— Шукай дурняў! Давай лепш сваю павязку...

Праз нейкі час з палаткі выйшаў адзін толькі Ігар з павязкай дзяжурнага на руцэ. Сарока лаяўся і пагражаў, але яго не слухалі.

Ігар падышоў да Андрэя і Алеся. Цяпер ён быў у простай белай кашулі і светлых штанах. У руцэ трымаў нейкі кій.

— Дзякую вам, рэвалюцыяй выхаваныя! — узняў ён кій у знак прывітання.— За маё вызваленне з гэтай цямніцы пасвячаю вас у рыцары! — і паціху паляпаў кіем кожнага па плячы.

— Якое вызваленне? — здзівіўся Алесь.— Мы цябе адвязвалі? Не? Дык і бяры ўсю адказнасць на сябе, ясна?

— Ага-а,— у роздуме сказаў Ігар,— адказнасці спалохаліся. Добранька. Гэта я Сароку ўпіхнуў у турму і прывязаў. Згодзен. А цяпер... ведаеце, што ён зрабіў? — Ён падбег да стала і ўдарыў па вазе кіем. Ваза разляцелася на ашкалёпкі.— Вось што ён зрабіў. Так і скажам Паліне Іванаўне. А мы яго злавілі, арыштавалі, загадалі пашпарт паказаць...

Хлопцы паглядзелі на Ігара, як на вар'ята. Такое ў іх планы пе ўваходзіла.

— Ды ты... ды ты з глузду з'ехаў? — усклікнуў Алесь.

— Ніколечкі. Чулі ж, як Сарока гаварыў — разаб'ю вазу. Вось і разбіў...— Ігар паволі наблізіўся да хлопцаў.

— Не надыходзь, а то...— Андрэй замахнуўся.— Ведаем мы цябе. Звернеш на нас, а сам у кусты. А нам сядзець у гэтай палатцы...

— Сядзець! — крыкнуў з палаткі Сарока.— Усім сядзець як піць даць! Точна!

Ён чамусьці так развесяліўся, што пачаў дзіка рагатаць.

Ігар падышоў да палаткі і супакоіў:

— Вінаваты, дык сядзі! Ніхто табе не даваў права знішчаць дзяржаўную маёмасць...— Заўважыў Каляду і Паліну Іванаўну, падбег да іх, далажыў: — Дзяжурны па лагеры Ігар Драмлюга. За час майго дзяжурства адбылося здарэнне. Сарока вазу разбіў — во! Мы яго і пасадзілі. Здарава?

Паліна ўскліквула і кінулася да стала.

— Такая ваза! Як ён мог!

— Не мо-ог,— застагнаў у палатцы Сарока.

— Маўчы, варвар, людаед! — заглушыў яго Ігар.

Паліна ўважліва паглядзела на дзяжурнага.

— Чакай, чакай... Ці не ты сядзеў у палатцы?

— Было,— згадзіўся Ігар.— Але ж, калі мы ўсе ўтрох пасадзілі туды Сароку, у лагеры не засталося дзяжурнага.

Пакуль ён так гаварыў, Алесь і Андрэй паціху панеслі бульбу на кухню, далей ад граху. Ігар прыкмеціў гэта і пабег услед.

— Гэта ўсё тваё выхаванне, Іван,— ціха папракнула Паліна, паказваючы ў напрамку, куды пайшлі хлопцы.

— Маё,— уздыхнуў Каляда.

— Кісель!

Паліна паволі пайшла да лаўкі ля стала і села. Паглядзела на Івана сумна.— Чаму гэта ты заўсёды згаджаешся са мною?

— Не заўсёды...— Ён сеў побач.

— Дык гэта тваё выхаванне ці не?

— Не маё!

— Правільна. І хто іх так разбэсціў?

— Не я.

— Правільна.— Яна падумала.— Чакай, чакай... А хто ж? Можа, скажаш — я? Га? Ты на нешта намякаеш. Іван, нягожа так.

— Мы ўдваіх разбэсцілі хлопчыкаў,— усміхнуўся ў адказ Каляда.

Паліна ўскіпела:

— Што-о?! Удваі-іх?!

— Я адзін іх разбэсціў,— хуценька згадзіўся Іван.— Адзін, зусім адзін...

— Тое ж і яно...

Яна ўстала, адышлася да сваёй палаткі, у самы куток лагера, села на крэсла. Нешта абдумвала. Абыякава пазірала адтуль, як прыйшлі хлопцы, нешта гаварылі з Калядою. Той ківаў на іх пальцам. Потым прыбег Ігар, і Паліна пачула:

— Там рыбак стаіць. Хоча вас бачыць...

— Ніякіх рыбакоў! — катэгарычна адказаў Каляда, і Ігар хуценька пабег у хмызняк.

Потым з палаткі пачулася жаласлівае:

— Я невіна-а-ава-аты-ы!

Паліна нібы ачнулася. Таропка падышла да палаткі, спытала строга:

— Разбіў Сарокін вазу ці не?

Андрэй пачаў выкручвацца:

— Не тое, што там — адразу. Але, калі памеркаваць, то ўсё ж кідаўся. Спярша на нас, потым — на дзяжурнага.

— На дзяжурнага? Значыць, на сябе? — спытала Паліна.— Тут нешта не тое. Давайце Сарокіна сюды...

Андрэй прывёў Сароку. Той быў такі разгублены, што не заставалася і сумнення — вінаваты. Твар хавае, вочы бегаюць.

— Ну, што скажаш? — Паліна ўзяла яго за падбародак, прымусіла ўзняць галаву, адпусціла. Рукі ўперла ў бакі, чакала адказу.

— Я толькі сказаў...— пачаў быў Сарока, ды Алесь перабіў яго.

— Сказаў! — усклікнуў ён.— Уставіўся на мяне і кажа: «Хочаш, разаб'ю вазу!» Спытайце ў яго...

— Я не тую вазу хацеў разбіць,— пачаў апраўдвацца Сарока. Ён проста не ўмеў гаварыць ясна.

— Другой жа ў нас няма,— пацiснула плячыма Паліна.

— Гэта так гаворыцца — вазу разбіць. А на самай справе я меў на ўвазе галаву разбіць.

Сарока недарэчы засмяяўся, а Паліна аж сапраўды схапілася за галаву.

— Што-о?! — Яна адступіла ад Сарокі.— Каму ты хацеў разбіць галаву, Сарокін?

Ён заблытаўся яшчэ больш:

— Ой, прабачце, Паліна Іванаўна! І галавы я не хацеў разбіваць, а толькі так, трэснуць у нюхаў-ку... у вазу, значыць. Ваза — гэта нюхаўка, а нюхаўка — ваза, якая называецца нюхаўкай... Прабачце, нюхаўка называецца вазай...

— Божа, што ён вярзе? — Паліна паглядзела на Каляду.— Іван Барысавіч, ці не патрэбен нам псіхіятр?

— Думаю, не патрэбен. Пройдзе...— Каляда змераў Сароку насмешлівым позіркам.— Часовае нервовае расстройства.— І да ўсіх: — Ідзіце, хлопчыкі, адпачывайце...

Калі яны засталіся ўдваіх, Паліна прыгразіла:

— Я, як класны кіраўнік, магла б паскардзіцца на цябе дырэктару, але, улічваючы, што з табой пайшлі самыя непаслухмяныя вучні, спачатку падумаю...

— А за што скардзіцца дырэктару?

— Лічы... Давай спярша сядзем. Вось так... Значыць, харчы ўтапілі — раз. Распусціліся — два. Рыбака пакрыўдзілі — чатыры.

— Тры,— паправіў Каляда, але Паліна працягвала лічыць, як ёй уздумаецца.

— Лесніка — пяць, Міхася пусцілі немаведама куды — сем. Кракадзіла ў ваду падкінулі. Бойка. Ваза. Адны непрыемнасці...

— Адны непрыемнасці,— згадзіўся Каляда.

— І ўсё пад чыім кіраўніцтвам?

— Пад нашым... Маім, маім, маім! — Каляда пераняў яе пагрозлівы позірк.— У хлопчыкаў пераломны ўзрост, вось і ломяць усё. Энергіі лішкі, а разгон маленькі. На волю просяцца, у паходы! Ды яшчэ трэба ўлічыць характары. Яны ў іх розныя, як неба і зямля. Як у нас з табою — во!

Нейкі час пасядзелі моўчкі, бо, мусіць, адразу абое ўспомнілі далёкае мінулае. Дзесяцігадовай даўнасці, калі ўпершыню пачалі вучыць дзяцей у адной школе, упершыню пазнаёміліся. Потым шмат яшчэ чаго было ўпершыню — словы, усмешкі, поціск рук. Не было ўпершыню таго, што збліжае людзей больш за ўсё. Вельмі строгай і жорсткай была маладая Поля. Як і цяперашняя. А Іван быў крыху легкадумны. Як і цяпер. Не сышліся яны характарамі, як кажуць, ачарсцвелі душою адно да аднаго. Не расцвіло іх каханне, на корані завяла...

— Дык хто з нас неба? — асцярожна спытала Паліна.

— Ты. Я — зямля.

— А хіба можа зямля існаваць без неба? — У голасе

не надзея, а хутчэй безнадзейнасць.— Без сонца, без зорак...

— Зямля і неба існуюць для людзей,— ухіліўся ад прамога адказу Каляда. Ён-то разумеў Паліну! Непаўторная прыгажосць прыроды, ласкавае сонца, шчодрасць фарбаў і гукаў абудзіла і яе душу, прымусіла азірнуцца назад, на пражытае, калі вольнага часу было так мала. Вучоба, урокі, спыткі, семінары. Вечна не хапала таго часу, і ён прайшоў непрыкметна. Быў і ў яго свой рубеж, свае адлічаныя хвіліны для маладосці...

Паліна заспявала жартам: «Мы з табой два берагі — неба і зямля». Ім стала крышку лягчэй, вальней.

— Парадачак! — весела сказаў Каляда, устаў і прайшоўся.— Дзеткі на лузе, як авечкі тыя, загараюць. І ніякіх турбот. Вось толькі б зняць гэтыя забароны,— паказаў на плакаты.

— Не дазволю! Неба і зямля...

І тут проста да іх, запыхаўшыся, падбегла Алеся. Лёгкая, як каза, быстрая. Вочкі аж гараць.

— Вось... Тэлеграма ў лагер.

— Тэлеграма? Ад каго б гэта? — Паліна ўсхапілася, узяла тэлеграму, прачытала: — «Вяртаюся ў лагер. Прабачце. Міхась». Калі ж ён вяртаецца? Якім транспартам?

— Можа, вячэрнім параходам,— падказаў Каляда.— А можа, і аўтобусам...

— Хутчэй за ўсё аўто-босым,— засмяялася гарэза Алеся.— Голад не цётка, хутка будзе парасё ў хляве...

— Што? — не зразумела яе Паліна.

— А нічога... Успомніла, што парасяткі галодныя. Трэба бегчы карміць!

І яна, пераскокваючы пні і купіны, памчалася назад, нешта весела заспявала.

— Блудны сын вяртаецца,— зазначыў Каляда.— Адна бяда з плеч. А ўсё таму, што акрыяла ты крыху, прывыкла да нашага дзікага жыцця, да паляны.

— А-ат! — махнула рукой Паліна. — Неба і зямля... Сам гаворыш. Даўно ўжо, Іван, ты не глядзіш нават у мой бок. Чаго гэта ты цяпер усміхаешся? Чаму стаў такі ўважлівы? Га?

— Успомніў, як мы былі маладыя, як я ледзь цябе не пацалаваў, а ты збегла...

— Збегла. Мне было так сорамна. Такое строгае выхаванне... Не тое, што цяпер, у шаснаццаць цалуюцца і не чырванеюць.

— Калі б не збегла...

Яна перабіла яго:

— А цяпер? Ці ж нельга нам выправіць сваю памылку?

У голасе хутчэй жартаўлівасць, чым сур'ёзнасць.

— Цяпер? Старыя мы ўжо, няёмка неяк...

Каляда засмяяўся і асцярожна, як сын маці, пацалаваў Паліну ў шчаку. І ад гэтага дотыку твар яе ўспыхнуў ружай.

— Ах, Іван!..

Нехта кашлянуў за палаткай. Яны спалохана азірнуліся, разышліся ў бакі.

Да стала, як пабіты сабака, падышоў Міхась. Скінуў рукзак, паставіў побач вядзерца. Валасы нячэсаныя, калісьці зялёны гарнітур пачарнеў. На нагах адны шкарпэткі, ды і тыя падраныя.

Паліна сціснулася ўся, насцярожылася. Потым працягнула руку і ціха спытала:

— Ты? Міхась?

— Я...

— Прыехаў?

— Ага...

— Што ў вас дома здарылася? Ты зусім босы...

— Тапачкі нейкі сабака ўкраў. Як ехаў.

— Божа! Ён быццам з малатарні вываліўся. На чым жа ты ехаў, дазволь ведаць?

— На сене,— зманіў Міхась.— На самым версе машыны. А яна потым перакулілася, халера, і я пайшоў пешкі.

Як лёгка, аказваецца, маніць! Варта толькі пачаць, і тады ўжо не стрымацца. Ідзе, як па маслу.

Усе пaглядзелі на яго ногі, на брудныя, падраныя шкарпэткі.

— І што там у горадзе чуваць? — спытаў Каляда.

— У горадзе? — Міхась падумаў.— Шмат чаго чуваць. Кругом землетрасенні, ліўні бушуюць. Неспакойна ў прыродзе. Гарачыня, шум. Яшчэ гэта...— Раптам ён схапіўся за шыю рукою.— Упіўся, зараза! Клешч...

— Гарадскі? — усміхнуўся Каляда.

— Ага. З вёскі іх туды навезлі. Страхоцце. І тут ёсць?

— Здараюцца...

— Ну, вось што,— перапыніла іх размову Паліна.— Ты тут адпачывай з дарогі. Пагаворым з табою потым.

* * *

Міхась яшчэ не здагадаўся, што яго «раскусілі». Ён агледзеўся, пасмялеў. Падышоў да дошкі распарадку, прачытаў: «Пад'ём у сем... Бег на месцы... Чай. Паход у ягады. Абед... Гурткі... Вячэра... Адбой».

— У мяне і то цікавей было,— сказаў па звычцы рабінзона.— Касцёр да поўначы, бульба печаная круглыя суткі. Кігіканне савы. Потым сон да дня. Дзве гадзіны паляванпя на кляшчоў...

Нехта засмяяўся. Зірнуў — Алеся. Яна прынесла яго тапачкі.

— Наш Пірат прыцёг,— растлумачыла.— Адразу пазнала, што твае, бяры...

— Дзякую.

Ён узяў тапачкі. Здагадаўся, што ёй яшчэ нічога не вядома пра фотакарткі, якія аддаў сёння малым у лесе. Тыя паглядзелі, здзівіліся: «Алесю гарадскі цалуе!» І пабеглі, панеслі ў вёску небывалую навіну...

— Хітры ў вас сабачка, сапраўдны пірат,— сказаў з папрокам.— Мне з-за яго чырванець давялося.

— Ён у нас заўсёды нешта цягне з лесу. А то і ад ракі,— апраўдалася Алеся.

Міхась сеў на крэсла, пачаў абувацца. А дзівачка Алеся ўсё гаварыла і гаварыла пра сабаку, пра яго праявы.

Сама не памятала, як дастала з галавы грабеньчык і пачала прычэсваць зблытаныя, прасмаленыя Міхасёвы валасы.

Вось у такіх інтымных абставінах і заўважылі іх дзяўчаты на чале з Ігарам. Ніна, што бегла наперадзе, сумелася, стала. Папярэдзіла Алену. Тая схапіла Ігара за руку: «Цс-с!» Ды Ігар не стрымаўся:

— Глядзіце, Міхась прыехаў! Ур-ра!..

Міхась ад нечаканасці аж падхапіўся з грэбенем у галаве, бо Алеся цяпер не магла дацягнуцца да яго. Падскочыла, выхапіла свой грабеньчык і зачырванелася.

— Дарога вельмі цяжкая была,— сказала яна з ухмылкай.— Як з неба зваліўся...

Схавала грабеньчык у сваёй густой кудзелі, падышла да Ігара, бо ўбачыла, што ён сярдзіта надзьмуўся.

— Дзе гэта ты ўжо з ім пазнаёмілася? — не хаваючы сваёй непрыязні, спытаў Ігар.

— У лесе.

Міхась удакладніў:

— Як ішоў у лагер, то заблудзіўся. Добра, што яе спаткаў.

Ні слова больш не гаворачы, Ігар узяў Алесю за руку і пацёг ад Міхася далей. Паволі яны адышліся далёка. Алеся ўвесь час гарэзліва глядзела цераз плячо назад, на дзяўчат. А вачаняты аж гарэлі ад шчасця.

— Дзевачкі, пайшлі купацца! — кінула яна ўжо здалёк.— Я вам нештачка смешнае раскажу-у...

Міхась насцярожана зірнуў на Алену.

— Вы ўжо ведаеце?

— Што? — спытала яна.

— Віктар вам нічога не гаварыў? — Убачыў, што Алена нічога не ведае, дадаў: — А на мяне ён яшчэ злуецца? І ты злуешся?

— Ат! Сядзеў бы лепш там, адкуль прыйшоў,— адмахнулася ад яго Алена.— Гаворкі табе больш ніякай няма.

Яна крутнулася і пабегла ўслед за Алесяй і Ігарам. Засталася толькі Ніна. Яны калісьці добра сябравалі. Ды Міхась не дужа даражыў тым сяброўствам, усё часцей пазбягаў яе, цягнуўся больш да Алены.

— Усе ўцякаюць ад мяне, адна ты засталася...— у роздуме сказаў Міхась.— Як яны тут?

— Хто? — Ніна абыякава глянула на яго.

— Віктар і Алена.

— Як мае быць!

— Зноў цалуюцца? — спытаў яхідна.

— Ці ж гэта грэх? Асёл ты з доўгімі вушамі, хіба не бачыш, што ў іх усё так хараша, так прыгожа... Не легкадумна, як ты гаворыш... Сапраўды, не прыязджаў бы ты лепш, не чмурыў бы Алене галаву.

— А я хачу яе папярэдзіць! — Ён наблізіўся да Ніны, загаварыў у самае вуха.— Як таварыш і друг... Гэты Віктар умее пыл у вочы пусціць. Слепнеце вы тут ад яго, як совы на сонцы. Во! Глядзі, хто такі Віктар. Любуйся! Ён з усімі гэтак... сур'ёзна.

Міхась не адшпіліў, а так ірвануў гузік на кішэні, што ён аж адскочыў. Дастаў некалькі фотакартак. Адну аддаў Ніне.

Тая зірнула і адразу змянілася ў твары. Аж пабялела.

— Алеся?! Ён яе абдымае? Жах! — І зірнула на Міхася строга.— Дзе ты гэта ўзяў?

Міхась адвёў позірк:

— Быў тут у мяне свой чалавек.

— Хітры ты...

— Яшчэ які. Пакажы гэта Алене, няхай не дужа ганарыцца сваім Віктарам...

Падняў з зямлі свой рукзак і паволі пайшоў па лагеры, прыглядаючыся да палатак. Ён-то добра ведаў, у якой з іх ёсць лішняе месца.

Ніна яшчэ нейкі час глядзела на фотакартку. Заўважыла Сароку, паклікала яго.

— Дзівіся, Сарока! — і паказала здымак.

— Мяне ўжо нішто не здзівіць,— абыякава зірнуў той.— Што ў нас тут робіцца? Ніхто мне не верыць. Я назваў галаву вазай, бо так гаворыцца. І не вазу хацеў разбіць, разумееш? І галаву не хацеў разбіць. А цяпер-то ўжо ўсё паб'ю, пакрышу, калі ніхто не верыць! Дзе яны? Дайце мне іх! — Ён энергічна, пад здзіўленым позіркам Ніны, абышоў вакол стала.— І Паліна Іванаўна таксама добрая. Паверыла тым гарлапанам. А я вот не баюся, нічога не баюся і нікога! Вось пакліч мне дзяжурнага...— І ўжо на ўвесь лагер: — Дзяж-урны-ы! Дзе дзяжурны-ы?

«Звар'яцеў. Усе звар'яцелі на гэтай дзікай паляне. Іван Барысавіч і той пацалаваў нашу класную!» — думала Ніна, паволі крочачы да ракі...

* * *

Дзяжурны з'явіўся адразу. Ім аказаўся Віктар. Чырвоная зліпялая павязка ледзь прыкметна на бронзавай ад загару руцэ.

— Хто тут мяне клікаў? — спытаў ён у Сарокі.

— Я...

— Што хацеў?

— Як — што хацеў? — пакрыўджана спытаў Сарока.— Хіба ты не ў курсе? Я ж нікога не крануў нават пальцам. Цяпер, выходзіць, што я бандыт!

— Каб жа ты мог даказаць...

— Вось у тым мая і бяда — не ходзіць гладка мой язык, як пісаў Пушкін...

— То пісаў Купала.

— Усё роўна вялікі чалавек. Зусім заблытаўся. Чорт мяне пацкаваў назваць галаву вазай. Вось што выйшла з жарту...

Тут яны ўгледзелі Ігара. Ён пёр праз хмызняк напралом, ломячы сучча. Кашуля расхрыстаная, валасы, як калючкі ў вожыка, тырчком.

— Братцы! Здарылася! Самае вялікае ў маім жыцці здарылася. Кропка...

— Ціха, ціха,— паказаў на плакат Віктар.— Што здарылася? Ды не калаціся ты, садзіся і расказвай.

Ігар, як конь, матнуў галавою:

— Не ўседзець мне цяпер! Я сказаў ёй. Намякнуў. Адным словам, мы пагаварылі як трэба!

— З кім пагаварылі, пра што? — нічога не зразумеў Віктар.

Сарока аж засмяяўся:

— Яшчэ адзін вар'ят!

— Не вар'ят! — падступіў да яго Ігар.— Я сказаў Алесі вось як табе... Алеся, сказаў я, давай наблізім вёску да горада. Давай, кажа яна, толькі наадварот, горад наблізім да вёскі. Разумееце, аслы цара Саламона?

— У цара Саламона былі вярблюды,— з усмешкай зазначыў Віктар.

— Тым горш для вас! Слухайце і маўчыце. Дык вось... Сэрца маё ад тых яе слоў кудысьці правалілася. Зноў намякаю. Давай, кажу, Алеся, сатром грані паміж горадам і вёскай. Давай, кажа, ідзі пастрыжыся па-людску, і не будзе ніякіх граней. Тады я сціснуў яе руку і больш нічога-нічога не сказаў. Яна, ведаеце, усміхнулася, як тысяча сонцаў, глядзіць мне ў вочы і таксама маўчыць. Не верыце?

— Ну, ну, гавары далей,— сказаў Сарока.— Дужа ўжо цікава ў вас было.

— Далей было так... Мала, кажа Алеся, у цябе фантазіі, выдумкі. Для цябе, кажа, месца толькі на Месяцы. Палячу і на Месяц, кажу я, калі спатрэбіцца, калі ты загадаеш. Вершы, кажу, для цябе напішу. Напішы, кажа яна са смехам, хоць адзін. Тут я набраўся смеласці і... пабег ад яе. Напісаў на беразе верш і прыкапыцеў вось сюды.

— Як ты сказаў? — спытаў Віктар.

— Прыкапыцеў...

— Вось цяпер веру — наблізіўся да вёскі. Лупі свой верш!

Ігар стаў сур'ёзным, выцягнуў з глыбокіх кішэняў нейкія паперкі, склаў іх разам і зірнуў на хлопцаў.

— Верш называецца «Натхненне». Вось ён,— і прачытаў:

Буйны дождж кроіць неба ў палоску,
На асфальце звіняць раўчукі.

А мне хочацца ехаць у вёску,
Дзе жывуць басанож хлапчукі,
Дзе палеткі гамоняць за садам,
Дзе пастушкі авечак пасуць,
Дзе старыя дымяць самасадам
І чубаткі ячкі нясуць...

Ён глыбока ўздыхнуў і зірнуў на Віктара.

— Здорава! — пахваліў той.— Асабліва мне падабаецца канцоўка. Яечкі... Сала... Патэльня... Устаў у верш якнебудзь патэльню, га?

— А ці добра будзе?

— Выдатна! Ты толькі паслухай, як гэта загучыць. Патэльня! Якое ёмістае слова.

— Ёмістае,— згадзіўся і Сарока.

Яны селі проста на зямлю і пачалі прыдумваць рыфмы да свайго ёмістага слова.

— Патэльня, някельня, ельня,— мармытаў узрушаны Ігар.

Але гэты іх мірны занятак быў нечакана спынены самым звычайным чынам.

З-за кустоў выйшлі змрочныя, як ноч, Алена і Ніна. Спыніліся каля хлопцаў. Ніна катэгарычна сказала:

— Ігар, ты яшчэ сядзіш з гэтым вужам? — і паказала на Віктара.

— Што здарылася? — Віктар адразу ўстаў, бо адчуў, што дзяўчаты не жартуюць.

— Убачыш,— паабяцала Ніна.— Вось твая праўдзівасць, артыст! — і паказала яму фотакартку.

Алена дэманстратыўна адвярнулася. Ігар і Сарока таксама зірнулі на здымак.

— Ну, што скажаш, прынцыповы чалавек? — не зводзіла з Віктара злых вочак Ніна.— Аказаўся самы беспрынцыпны...

Віктар крануў Алену за плячо:

— Алена, гэта праўда? Я — беспрынцыпны?

— Адкуль я ведаю? — перасмыкнула яна плячыма.

— Дык я ведаю! — Віктар выхапіў з Ніiных рук здымак.— Там, дзе нас так лоўка падлавілі ў аб'ектыў фотаапарата, я чытаў, што нехта хацеў пляваць на Віктара. Нават почырк пазнаў. І ўсё роўна не паверыў, не пакрыўдзіўся, бо пераканаüы — гэта была правакацыя. Так ці не? Што табе, Алена, гаварыў Міхась ад майго імя?

Алена адышлася на крок, рукі прыціснула да грудзей, вінавата заміргала вачыма.

— Мне Міхась казаў, што ты... што ты назваў мяне ліпучкай-мухалоўкай,— ледзь вымавіла яна. Усе засмяяліся.

— Як? — перапытаў Віктар..

— Ліпучкай...

— І слова ж прыдумаў па сабе! — аж слёзы ад смеху.— Ліпучка... Не ведаў я гэтага рапей. Даў бы яму такую ліпучку...

— Дык ты не гаварыў гэтага? — Рукі ў Алены самі апусціліся, павіслі.

— Я гэта чую ўпершыню ад цябе.

— А фота?

Ігар, які моўчкі слухаў дагэтуль, узяў у Віктара з рук фотаздымак і тыцнуў у яго пальцам?

— А фота, мы ў цябе пытаем, гэта таксама невядомка?

— Фота цудоўнае,— усміхнуўся Віктар.— Нас сфатаграфавалі з засады. Бывае і ў злосці людзі не-не ды і зробяць дабро.

— Гэта — дабро?! — зароў Ігар.— Што вы рабілі? Ну, Віктар, абараняйся. Я спачатку знішчу горад, а потым — вёску!

Ігар пайшоў на Віктара, набычыўшыся. Віктар стаў у баксёрскую паставу.

— Пачалі! — весела скамандаваў Сарока.

— Чакай, яшчэ зірну,— зноў пад самыя вочы паднёс фотаздымак Ігар.

— Толькі не лопні ад злосці...

Віктар расказаў, як гэта здарылася, чаму ён падхапіў Алесю пад рукі. А Міхась з-за елкі іх сфатаграфаваў.

— Дык... Міхась увесь час і жыў у лесе? — спытала Ніна.— Ну, цяпер мне ўсё ясна... Мне-то ён гаварыў, што тут, у лагеры, у яго быў свой чалавек.

— Ты — яго чалавек! Ён і цябе ўтравіў! — Віктар схапіў Ніну за вуха і падвёў да Алены, якая, слухаючы гаворку, паволі адышлася далей.— Гэта яна прынесла табе Міхасёву фальшыўку?

— Пусці-і! Бі яго, Аленка-а! — заенчыла Ніна, і Алена адразу накінулася на Віктара, пачала грукаць у спіну кулакамі.— Так яго, так! Ігар, памажы-ы!

Ігар усё глядзеў на фота. Абыякавым голасам адказаў:

— Няма больш Ігара, памёр ён...

Потым сеў на зямлю і звесіў галаву.

Віктар выпусціў Ніну і паказаў на Ігара.

— Глядзіце! Якім ён быў, такім і застаўся. Вось што я вам скажу... Не паддавацца на правакацыю! Не правакатары страшны людзям. Страшна тое, што людзі лёгка патрапляюць пад іх уплыў і становяцца фактычнымі памочнікамі. Правакацыя, як і здрада,— аднаго поля ягады.— Ён паступова наблізіўся да Ігара.— Гэтыя фатаграфіі вельмі нагадваюць адну хусцінку, якую падкінулі Мавру. А ты, Атэла, ужо гатоў задушыць сваю Дэздэмону...

Ігар узняў вочы.

— Гэта не хусцінка, а дакумент.

— Вось і пакінь яго сабе на памяць, даўбешка! Пасля дзякаваць будзеш. Памяць першага кахання. Ну, як — быць ці не быць?

Ігар усхапіўся на ногі, замахнуўся здаравенным кулаком. Віктар аж адхіснуўся.

— Маўчы ты, прынц дацкі! Так, я — Атэла. А ты проста дзяжурны па лагеры. Дык давай знішчым гэтыя забароны-плакацікі. Цяпер-то я ўжо нікога не баюся. Я скажу Паліне Іванаўне, што думаю! Кліч яе, дзяжурны. Я ўсё ёй скажу, мы ўжо не хлопчыкі...

І раптам, як яна тут была, пачулася:

— Ціха, ціха, Ігар! — Паліна Іванаўна наблізілася.— Чаго гэта ты раскрычаўся на ўвесь лес? Што хочаш мне сказаць?

Ігар разгубіўся. Яна выплыла з-за бярозкі, як здань, у сваёй стракатай сукенцы з кароткімі рукавамі. Ад загару скура на руках пачала лупіцца.

— Я... я хацеў вам сказаць...— Ігар падбег да распарадку дня, тыцнуў пальцам.— Што трэба ўсё гэта... усё гэта трэба перапісаць чырвонымі літарамі. Каб лепш было відаць здалёк...

Хлопцы і дзяўчаты ледзь стрымліваліся, каб не зарагатаць. Да таго смешным і бездапаможным быў Ігар у гэтую хвіліну. Твар пашарэў, вочкі забегалі, як злоўленыя мышы ў клетцы.

Паліна Іванаўна падумала.

— Можна і чырвонымі,— згадзілася яна.— Што яшчэ?

— І яшчэ... Запішыце мяне ў гурток па вязанню на прутках...

Тут ужо не мог бы стрымацца любы. Дружны смех выбухам разлёгся па паляне.

— Што? — нібы недачула Паліна.

— Па вязанню,— скосіў на сяброў вочы Ігар і дадаў, нібы ён увесь час гаварыў жартам: — Гэта будзе здорава!

Я звяжу сваёй бабульцы цёплыя шкарпэткі, а яна мне купіць магнітафон. І будзем квіты...

— Ідзіце лепш да ракі,— як ад мух адмахнулася Паліна.— Там Іван Барысавіч паладзіў спаборніцтвы па плаванню.

— Па плаванню?! — Ігар хуценька пакруціў галавой.— Не-е... Я магу толькі спаборнічаць — хто больш прабудзе пад вадой. Толькі трэба загадзя зрабіць трубу.

— Пайшлі, пайшлі,— пацягнуў яго Віктар.— Трэба ж калі-небудзь навучыцца плаваць і табе.

— Не трэба! Я і так па ўсіх прадметах плаваю! — упіраўся Ігар, але сам рады быў хутчэй пакінуць паляну.

* * *

Паліна падышла да стала і зморана апусцілася ў парусінавае крэсла. Цяжка было на душы. Хоць і ясны дзень, хоць так прыгожа навокал. А вось цяжар. І не ад таго, што пачула апошнія Ігаравы словы пра плакаты. Дысцыпліна, якую, як ёй здавалася, навяла ў лагеры, аказалася кругом вонкавай. Цяпер, як і раней, кожны робіць што хоча, але ў падполлі, за яе спіной. А Каляда ім патакае, як роўным. Ды ён і сам не супраць пагуляць з вучнямі. Ніяк не зразумець Паліне гэтага перастарэлага хлопца. Ці кахаў ён яе раней? Невядома. У яе быў тады свой жаніх, яна прагледзела тады той момант. А пасля, калі жаніх раптам з'ехаў, было позна. Каляда ўжо нібыта замкнуўся. Ды і яна, Паліна, яшчэ жыла першым сваім каханнем. Так, паступова, яны сталі чужымі...

Паліна ўзняла галаву і аж зжахнулася: непадалёк стаяў стары рыбак. Калі ён так падышоў, што яна нават не пачула?

— Дзяньдобры вам,— здымаючы шапку, прывітаўся стары.

— Добры дзень. Сядайце, калі ласка.

Паліна ўстала, паднесла крэсла.

— Можна сабе і сесці...— Рыбак пакруціў у руках крэсла, паглядзеў, ці моцнае.— Мяккае, халера на яго. Разгладзіў рукамі лысіну, крэкнуў.

— Можа б, вы, госць, чаю выпілі? — прапанавала Паліна.

— Ага, усе як ёсць, выпалі,— на свой лад зразумеў яе рыбак.— А быў калісьці кучаравы — ого! Такой бяды. Лепей, ента, галаву мыць.

— Я пра чаї, а не пра валасы...

— Гучаць галасы! На ўвесь бераг. Вясёлая ў вас, ента, кумпанія.

Стары дастаў з кішэні акуратна складзеныя тры рублі і паклаў на стол.

— Што гэта? — здзівілася Паліна.

— Перадайце вашаму Івану...

— Завошта?

— За рыбу. Хлопцы мне двух шчупакоў прынеслі. Вялізных, як бярвенні.

«Вось як! — падумала Паліна.— Хлопцы ловяць, а Іван прадае. Яму грошы...» Спытала ціха:

— Ён вам прадаў? Гэтак?

— Ніхто не прадраў сетак. Арцельную дык выдра прагрызла. Панадзілася, халера, гатовенькую цягаць ды ўчора ўблыталася ў сець, трасца па яе. А думалі ўжо, што і там вашы хлопцы пахадзілі.

— Дык нашы хлопцы не награшылі? — парадавалася Паліна.

— Што-о? Вашы хлопцы з грашыма? А мне што з ентага? — Стары нахмурыўся, далей адсунуў траяк.— Чужое я не вазьму, не-е. Даўней, бывала, малы, мог. Гмм... Помню, неяк выправілі мяне старыя суседкі па святую вадзіцу аж у Загацце, за блізкі свет. Па рубліку далі, каб на святы амбон паклаў. Перахрысцілі, ента, і пайшоў я. Ды, мусіць, не ў добры час перахрысцілі. Іду, ента, а чорт так і падмывае: «Вазьмі сабе грошы, Рыгор, ды купі чаравікі-самаходы». У лапцях тады мы ўсе... Та-ак... І ведаеце, звалэндаў мяне д'ябал. Схаваў рублікі ў шапку, набраў поўныя пляшкі крынічнай вады і пацёснуў у лес. Цалюткі дзень, ента, вавёрак ганяў ды па гнёздах лазіў. А потым, як кароў прыгналі, заходжу дамоў, ледзь на нагах трымаюся. Аддаў вадзіцу і спаць...

— І што — не агледзелі? — пацікавілася Паліна. Яна радавалася, што прыйшоў гэты дзед і разагнаў самотныя думы.

— Дзе там! — махнуў ён рукою.— Назаўтра, ента, совесь мяне адолела. Думаю, аддам грошы, грэх. Аж забягае тым часам суседка Тэкля і гаворыць маці: «Памазала я святой вадзіцай жывоцік сваёй дачушцы — ён у яе балеў,— дык як рукой зняло». Смех мяне разабраў, стаю, рагачу, як дурань. Пакуль не выгналі. Паце-е-ха!

Рыбак і Паліна гучна засмяяліся. І не таму, што дужа смешнае расказаў стары. Проста пад настрой.

«Усё, калі добры настрой, здаецца дабрэй і прыгажэй». Паліна зірнула на свае плакаты, перастала нават усміхацца. Яны здаліся проста недарэчнымі тут, у гэтым лясным лагеры, на дзікай паляне. Загаварыла зноў:

— Нічога дзіўнага. Лячэнне ўнушэннем даказана на практыцы. А вашы кабеты паверылі, што вада святая...

— То калі ж было-о! Яшчэ пры цары Гароху. Гм... Ох і жулік жа я тады быў!

— А гэта хвароба... не прычапілася?

— Не-е! Усё забылася, прапала.— Стары паківаў галавою.— Дзіцяці, ента, заўсёды карціць што-небудзь адкалоць. Калі ў каго душа чорная, то як яго ні выхоўвай, хоць маліся на яго, а злодзеем астанецца. Ды і які вясковы хлопец не злазіў у чужы сад або агарод? А ці многа вырасла злодзеяў?

— Значыць, вы за поўную свабоду такім, як нашы? — асцярожна пацікавілася Паліна. Ёй хацелася пачуць ад старога добрую параду. Ён адказаў проста:

— Няхай бегаюць па волі. Прырода, яна вучыць мудрасці жыцця. Усё ў ёй моцна зроблена, нічога лішняга...

— Ваша праўда! — Паліна ўспомніла сённяшні выпадак і дадала: — Я вось бачыла, як маці птушка выганяла з гнязда сваё птушанё. Божа, як яно ўпіралася, як пішчала, прасілася. А птушка-маці ўсё ж вытурыла яго з гнязда. І што вы думаеце? Спярша птушанё і ляцела, як малое ходзіць, бокам-скокам. Потым асвойталася, пачало ганяцца за мухамі ды матылямі. Набралася смеласці і паляцела аж за раку. А як весела зацiўкала!

— Дзіва што! Бо адчула волю. Усякаму, што падрастае, лішнія клопаты аб ім шкодзяць. Самастойнасць трэба шанаваць. Каб кожны, ента, адчуў сваю сілу, навучыўся жыць без нянькі. А то і праседзіць у гняздзе да старасці няўмекам, за чужой спіною. Гмм. А другая дзеўка — хе-хе! — і маладосць праседзіць. Гмм... Ну, то я пайшоў.

Стары устаў, пачаў набіваць люльку.

— Заходзьце.

— Ды ўжо ж. Так, ведаеце, прыемна пагаварыць з вучоным чалавекам. Гмм... Выхавацелем людскіх душ.

Ён асцярожна і хуценька, як кот, патэпаў да хвойнічку. І ўжо няма яго. Ці быў ён наогул, гэты дзіўны стары? Прыйшоў непрыкметна і пайшоў нячутна.

Паліна зноў зірнула на свае плакаты. Усярэдзіне штосьці нібыта кальнула. Аж пядобра стала. «Выхавацель людскіх душ»,— пагадаліся словы старога. А ці доб-

ры яна выхавацель? Ці так як трэба выхоўвае моладзь? Ці, можа, Каляда бліжэй да ісціны? Нездарма ж вунь цягнуцца да яго, як да бацькі. А яе — сама бачыла! — пазбягаюць...

Паліна рашуча падышла да першага плаката, сарвала яго і кінула на зямлю. Туды паляцеў і другі, трэці. «Ва ўсіх абмежаваннях бываюць перагібы. Менш абмежаванняў — менш памылак». Так гаварыў ёй Каляда. І цяпер — праз колькі год! — яна паддалася. Толькі б ніхто не надышоў.

Паліна не ведала, што ў гэты час, непадалёк ад дзікай паляны, у хмызняку, радасна ўсміхаўся Каляда. Ён святкаваў сваю перамогу, радаваўся за яе, Паліну...

* * *

Заплаканая, прыбегла з вёскі да ракі Алеся. Гэта ж трэба было Міхасю так зняславіць дзяўчыну! Вясковыя хлопцы проста не даюць праходу: «З гарадскім цалавалася!» А старыя толькі ківаюць галовамі: «Распуста!» Сказала, што дамоў больш не вернецца. І пабегла немаведама куды. На беразе ўсе ўстрывожыліся.

А ў гэты час Каляда гаварыў Паліне:

— Няхай нашы хлопчыкі цяпер смяюцца на ўвесь лес. Ты ўспомні сваё юнацтва, Поля!

— Успомніла ўжо! — махнула рукой Паліна.— Я і цяпер яшчэ не старая. Увечары ўсё гэта і спалім,— паказала на груд.

— Пасля адбою, Поля. Неба ты наша...

— Не хачу быць небам! Запомні! Іван! — Падышла да яго блізка.— Няхай гэта будзе не педагагічна, але я здаюся,— і падняла рукі.

Каляда падхапіў яе пад рукі і закружыў на месцы. Паліна смяялася, як дзяўчынка. А калі зноў апынулася на зямлі, то ледзь устаяла на нагах. І не таму, што кружылася галава. Адплюшчыла вочы і зноў заплюшчыла іх.

— Іван, круці ў другі бок, а то мне здаецца ўваччу...

— І мне здаецца,— засмяяўся Каляда.— Зірні!

Яна зірнула. Іх цесна абступалі хлопцы і дзяўчаты.

— Ну, вось... Нарэшце і я здзяцінілася,— прамовіла Паліна.

— Што ж,— дадаў Каляда,— пабудзем крыху вучнямі, а яны — настаўнікамі. Хто першы? Ты, Алена?

— Не, я вельмі легкадумная,— усміхнулася яна.— Лепш няхай хто іншы.

Наперад выйшаў Віктар. Твар яго быў хмуры, вочы гарэлі.

— Дайце мне слова... Усе мы, як раней вучылі папы, авечкі боскія,— пачаў ён.— І што ж нам цяпер рабіць, калі сярод авечак зачасаўся воўк?

— Пабіць і прагнаць воўка,— смеючыся, адказала Паліна гэтаму «настаўніку» на пытанне.

І раптам пачулася насмешлівае:

— Ты, Віктар, вельмі хітры настаўнік.

Гэта сказаў Міхась. Ён ужо недзе паспаў, набыў свой ранейшы выгляд. Гарнітур памыў і пад бокам адпрасаваў, валасы прылізаў, як і раней, цераз плячо павесіў фотаапарат.

Віктар паказаў на Міхася пальцам:

— Хто гэта? Ігар, ты яго ведаеш?

— Першы раз бачу,— адказаў той, паціскаючы плячыма.

— А вы, Андрэй і Алесь? — зноў спытаў Віктар.

— Недзе бачылі, але не помнім — дзе,— за двaіх адказаў Андрэй.

Міхась засмяяўся:

— Вы што, хлопцы, ачмурэлі?

Віктар паволі наблізіўся да яго.

— Мы не ачмурэлі,— сказаў ён.— А вось — што ты? Нам ужо ўсё ясна, нам прасцей было разабрацца. Алесі ж у вёсцы куды горш...

— Я ўжо нічога не разумею,— развяла рукі Паліна.— Гэта хіба не гульня?

Каляда адвёў яе крыху далей.

— А вось паслухай — ці гульня! — шапнуў ён.

Яны стаялі зводдаль і слухалі, як Віктар расказваў пра Міхасёву подласць з фотаздымкам, называў яго чалавекам у масцы.

— Сур'ёзная, разумная, удумлівая маска,— гаварыў ён Міхасю ў вочы.— А здымеш яе і ўбачыш агідны хцівы тварык... Вось так, падчас ходзіць такая маска сярод людзей, вярэдзіць душы, а людзі па дабраце сваёй прыкідваюцца, што нічога не бачаць, не разумеюць. А трэба адразу...

Віктар махнуў рукою і адышоўся ад Міхася. А той стаяў і нахабна ўсміхаўся.

«Праўда гэта! Праўда! — думала Паліна.— У Міха-

ся — маска, а не твар. Інакш ён бы хоць засаромеўся, а то хоць бы што. Быццам гаворка пра каго іншага...»

— Ён і дзе не быў, жыў, як злодзей, у лесе і краў нашы харчы. Ён запляміў брудам наш лагер, зганьбаваў таварышаў, няхай яны і думаюць, як пакараць яго! — гаварыў Віктар, і ўсе згаджаліся з ім. Раптам загаварылі ўсе адразу. І ўсе абвінавачвалі Міхася ў подласці. Патрабавалі выключыць яго з камсамола.

Нарэшце Міхась паказаў, на што яшчэ здатны.

— Добра, няхай так! — Усунуўшы рукі ў кішэні, ён плюнуў праз зубы на зямлю.— Калі я тут лішні, то магу пайсці. Не дужа напалохалі. Я магу даказаць. Падкрэсліваю...

Ён крутнуўся, каб ісці, але Ігар моцна схапіў яго за каўнер.

— Не-е, брат, цяпер ужо ты тут не ўцячэш! Садзіся! — Міхась, надзіва пакорліва, сеў, звесіў галаву.— Словы твае нам не патрэбны! Пойдзеш спярша ў вёску, станеш перад леснікам на калені і будзеш прасіць спагады да таго часу, пакуль ён табе не даруе. Алеся-то ўжо ніколі...

— Ніколі ў жыцці! — данеслася ад бярозкі. Усе зірнулі туды і ўбачылі Алесю, яе строгі, напружаны твар.

Ігар кінуўся да яе.

— Алеська! Не бядуй. Мы пойдзем у вёску ўсе і раскажам людзям праўду. Нам павераць...

— Вось бачыш, Поля, яны ўжо не дзеці, як ты думала! — гучна сказаў Каляда.— Што нам застаецца дадаць, га?

— Што дадаць? — Паліна падышла да ўсіх, расчулена загаварыла: — Я проста не ведала, што тут, на прыродзе, так ярка прасвецяцца вашы душы. І не толькі вашы... Але, хлопчыкі... Пабудзьце крыху дзецьмі. Хоць адзін яшчэ годзік. Не ўсе вы здатны самастойна ляцець у вялікі палёт. Згодны? А з ім,— яна паказала на Міхася,— мы пагаворым дома, у горадзе...

Увечары на дзікай паляне ярка гарэў касцёр і аж да світання гучалі задорныя, вясёлыя песні.

Лагер жыў сваім жыццём. Моладзь заўсёды моладзь. Яна любіць жыць весела. Яна ўмее любіць, але і ўмее моцна ненавідзець. Усёй душою.

1968

# РЭХА

## ШТО БЫЛО РАНЕЙ

Тое, што здарылася сёлета, мае сваю даўнюю гісторыю. Цяпер не бяда, цяпер на нашым двары хлопцаў многа. А летась я спачатку соўгаўся вакол дома зусім адзін. Сяброў у мяне не было. Потым нечакана з'явіўся Сяргей. Мы з ім, можна сказаць, старажылы на нашым двары. Калі мы пазнаёміліся, яшчэ не было ніякага двара. Проста па пустцы стаяў адзін цагляны дом на пяць паверхаў, а вакол дома валяліся розныя старыя дошкі, гнілыя бярвенні, бітая цэгла і, як помнікі, тырчалі белыя грубкі. Тут калісьці была вуліца, самая крайняя вуліца горада. Яна так і называлася — Загародняя. Маленькія драўляныя хаткі разбурылі і кудысьці звезлі. Дрэвы, больш-менш маладыя і прыгожыя, перанеслі і пасадзілі бліжэй да нашага дома. Для іншых дамоў, як мне здаецца, пакінулі самую непатрэбшчыну. Тут, як мы даведаліся, хутка вырасне цэлы мікраараён. Вось будзе здорава! Тады нас, такіх, як я з Сяргеем, збярэцца цэлае войска.

Але спачатку раскажу, як мы пазнаёміліся з Сяргеем.

Я хадзіў воддаль ад дома па маладзенькім вішняку і, задраўшы галаву, пільна ўглядаўся ў запыленае лісце, між якога сям-там чырванелі ягадзіны. Месца тут было самае што ні ёсць дзікае — былая сядзіба, закіданая розным ламаччам. Толькі зазявайся — адразу ці ногі паламаеш, ці нос разаб'еш.

Вішанькі раслі купкамі. А каб ягад, то не вельмі што. І хоць былі яны яшчэ кіслыя, мне здаваліся вельмі смачнымі, лепшымі на свеце. Я першы раз у жыцці сам ірваў з дрэва вішні. Занятак даволі прыемны. Нагнеш галінку, возьмеш у руку цёплую вішню — і ў рот! Смаката!

І раптам у мой уласны сад урываецца даволі дужы з выгляду, у меру загарэлы, з, відаць, пядаўна астрыжанай

белай галавою хлопец. На ім сіні спартыўны гарнітур і белыя тапачкі. Вочы так і шнырараць па баках, крок шырокі, упэўнены.

— Шмат знайшоў? — не вітаючыся, не знаёмячыся, пытаецца ён і з ходу лезе на самую высокую вішню. Я на ёй яшчэ раней прыкмеціў некалькі чырвоных кропак.

— Знайшоў,— непрыязна адказаў я, ад злосці праглынуўшы костачку.— А табе што?

— Тое, што і табе...

Ён у адзін міг абабраў дрэўца і спрытна саскочыў на зямлю. З гэткай вышыні я, напэўна, пабаяўся б скакаць.

— Табе тры і мне тры! — раптам сказаў хлопец і працягнуў вішні.— Бяры, якраз пароўну. Здорава, га?

Я ўзяў сваю порцыю і падзякаваў. Злосці маёй як і не было, нават стала сорамна, што сам гэткі скнара. Хлопец адразу спадабаўся мне сваёй шчырасцю.

— Ты калі сюды пераехаў? — як даўні знаёмы, спытаў ён.

— Тыдні два.

— А мы толькі ўчора... Эх, і жытуха ў нас будзе! — раптам ажывіўся ён, выціраючы рукавом запыленую вішню.— Хутка і яблычкаў паспытаем. Цяпер усе сады тут нашы!

— Паспытаем,— згадзіўся я, не ведаючы, што б такое прыемнае сказаць яму.

Ён паглядзеў на мяне, быццам змераў вачыма. Відаць, і я яму спадабаўся, бо, ніколечкі не задумваючыся, стрыжаны прапанаваў:

— Давай сябраваць. Мяне завуць Сяргеем, а як цябе?

Я адказаў.

— Добра, запомню, хоць і не лёгкае імя. Да ўсяго трэба прывыкнуць. Да новага месца, да новых сяброў. Аднаму сумна. Удвух мы можам сёе-тое прыдумаць. Во — ідэя! — раптам ажывіўся мой новы знаёмы Сяргей.— Як яблыкі паспеюць, наабіраем некалькі мяхоў і прададзім.

Гэта была зусім нечаканая прапанова. Я аж засмяяўся:

— Навошта іх прадаваць?

— Дзівак! Навошта прадаваць... Каб мець грошы. А будуць грошы, купім футбольны мяч, расчысцім пляцоўку, зробім вароты, набяром каманду, пачнём трэніравацца і зоймем першае месца ў нашым горадзе.

Вось гэта нагаварыў!

— Дзе ты яе набярэш, тую каманду?

Цяпер ужо я сарваў чатыры вішні і падзяліў пароўну, выбраўшы Сяргею самыя лепшыя.

— Ну, калі не набяром каманды, то можам знайсці іншы занятак. Захочам — развядзём трусоў. Ведаеш, якія яны пладавітыя? Жах! Іх можна падгадаваць, а потым...

Адным словам, гэта была няўрымслівая натура. За якую гадзіну нашага знаёмства Сяргей выклаў перада мною столькі ўсялякіх «ідэй», што яны не мясціліся ў маёй галаве. Мы з ім неўзабаве былі ведаеце на якіх пасадах? Дырэктарамі звярынца. Разважце самі. Падгадаваўшы і здаўшы дзяржаве трусоў, на выручаныя грошы мы паехалі ў такую глухмень, дзе вельмі лёгка налавілі зайцаў, вожыкаў, маленькіх лісаў (вялікія моцна кусаюцца), парачку баброў, вавёрак і розных гадзюк з вужамі. Усё гэта мы зачыняем у клеткі, прывозім і аддаём нашай школе. За гэта нас прызначаюць дырэктарамі...

Дзіўная рэч! Сяргей гаварыў так упэўнена, з такім пераканаппем, што я верыў кожнаму яго слову. Мне падабалася, што ўсе махінацыі, якія рабіў Сяргей у сваіх планах з грашыма, мелі на мэце не асабістую славу і нажыву. Не-е! Перш за ўсё ён клапаціўся аб школе, а значыць — аб усіх.

— Ты ведаеш, дзе наша школа?

Гэта я ўжо ведаў. Яна стаяла недалёка ад дарогі. Там жа, насупраць, была дзіцячая бібліятэка. Гэта ад нашага дома метраў трыста, не болей.

— Дык вось, за школьнай майстэрняй ёсць месцейка. Гэта будзе не жывы куток, а сапраўдны звярынец. Здорава, га? — натхнёна гаварыў Сяргей, і яго ясныя сінія вочы ззялі шчасцем.

Але нашы мары лопнулі, як прыгожая бурбалка.

Да восені амаль усе яблыкі на пакінутых дрэвах, яшчэ зусім малыя і зялёныя, абсыпаліся. Мы бачылі між лісця толькі гнёзды вусеняў. Маленькія цёмна-паласатыя вусені абляпілі ўсе сукі і галінкі, наплялі вакол лісця нейкіх сетак і грызлі, грызлі. Проста дзіўна, што вусені не з'елі ўсю расліннасць на пустцы, хоць мы, праўда, як маглі змагаліся з гэтым нашэсцем. Палілі вусеняў агнём, аблівалі газай, абсыпалі зямлёй.

— Без птушак нічога не будзе,— махнуў рукою Сяргей.— На той год трэба нарабіць шпакоўняў.

Ён доўга і падрабязна расказваў, якія шпакоўні мы будзем рабіць. Абавязкова шматпавярховыя, цёплыя і ўтульныя. Каб птушкам жылося як след.

Нарэшце надышла пара і ў школу.

Мы з Сяргеем селі за адну парту і правучыліся зіму без усякіх прыгод. Ён быў першым вучнем у нашым пятым класе, рыхтаваў урокі заўсёды вельмі старанна. Так што на выдумкі не хапала часу.

Неўзабаве побач з нашым домам, якраз насупраць, вырас другі няціпавярховы гмах. Так у нас з'явіўся свой двор. А калі ўжо ёсць двор, то спраў на ім, вядома, хапае. Трэба ўпрыгожыць, азеляніць, падчысціць. Само па сабе нічога не робіцца.

Вось за гэтымі заняткамі мы і здружыліся з новымі хлопцамі. З імі мы пазнаёміліся раптоўна, у адзін ясны вясновы дзень, калі бадай усе дзеці з абодвух дамоў гулялі на двары. Сяргей гукнуў мяне і сказаў:

— Удвух мы нічога не вынайдзем і не зробім. Сіла ў калектыве — гэта факт. Бачыш вунь таго высокага, як жардзіна, хлопца? І вунь тых пузаноў? Я зараз збяру іх, і мы пазнаёмімся.

— Як ты іх збярэш? — пацікавіўся я.

— А вось як.

Сяргей залівіста свіснуў у чатыры пальцы. І ўсе адразу звярнулі на яго ўвагу. Гэта яму і трэба было.

— Гэй! — гукнуў ён і памахаў над галавой рукою.— Давайце ўсе сюды! Будзе важная размова...

Я моўчкі пазіраў за «жардзінамі» і «пузанамі». Хто адразу, а хто бачком, быццам нехаця, падаліся да нас. І неўзабаве ўжо ўсе хлопцы нашага двара стоўпіліся вакол Сяргея.

— Дык вось...— сказаў ён, абводзячы ўсіх вачыма.— Мы жывём на адным двары. А раз так, то трэба знаёміцца. Мяне завуць Сяргей.

І пайшло! Поціскі рук, усмешкі, ледзь не абдымкі. Аказваецца, «пузаны» і «жардзіны» ўжо даўно хацелі гуляць разам. Таму прапанова Сяргея адразу была прынята з вялікім задавальненнем. Так мы пераэнаёміліся. А да гэтага ж цалюткую зіму кожны трымаўся паасобку, ніхто нікога не ведаў. Было нават раз дайшло да бойкі. Тоўсты хлапчук так стукнуў цыбатаму, якога Сяргей назваў жардзінай, што ў таго на пераноссі і цяпер сядзіць гуля.

Вось што было раней.

## ГАСПАДАР І ХЛОПЦЫ

Пастунова наш самы вялікі ў горадзе двор стаў і самым прыгожым. У нас ужо ёсць дворнік дзядзька Харытон. Ён вясёлы і смешны. Вясёлы таму, што за працай заўсёды нешта ціхенька напявае сабе пад нос, мурлыкае, як той кот, у вусы. А вусы ў дзядзькі Харытона, трэба сказаць, прыгожыя. Іх задраныя ўгару кончыкі вострыя, як шыла. Здаецца, крані пальцам — уколешся. А смешны Харытон з выгляду. На ім сінія шырокія штаны, тупаносыя чаравікі і чырвоная ў палоску кашуля. А зверху надзеты белы халат. Белым ён толькі называецца. Мыты і перамыты, той халат каляны, нібы з бляхі. На галаве ў Харытона руды саламяны капялюш. Твар смуглявы, маршчыністы. Не проста маршчыністы, як у іншых пажылых людзей. Яго маршчыны надаюць твару выраз добрай, радаснай усмешкі.

Дзядзька Харытон — гаспадар нашага двара. Яго ўсе слухаюцца. А мы дык проста не можам без яго жыць.

Часам дзядзька Харытон нас абараняе ад ворагаў, пра якіх я раскажу пасля. Гэта ён першы памірыў Ігара тоўстага з Ігарам-жардзінай, у якога, як я ўжо казаў, гуля ўпрыгожвае пераноссе. Яго мы так і завём — Гуля. Ён самы высокі сярод нас, але, напэўна, і самы баязлівы. Аднойчы ён адышоўся на пустцы ад нас метраў на сто, і там на яго раптам напаў нечы казёл, зусім невялічкі, з авечку. Але Гуля ляцеў ад яго з хуткасцю ракеты. Пасля яшчэ прыдумаў, што той казёл звар'яцелы, і рогі ў яго ў крыві, і што ў звар'яцелага казла сілы больш, чым у ваўка. Мы пасмяяліся з гэтай казкі, якую Гуля выдумаў у сваё апраўданне.

Увогуле дзяцей у нас на двары шмат. Але ўсё малеча. Ад іх помачы мала. Больш рознай шкоды. Бо перад кожным домам ужо ёсць і кветнік, і садзік, і ўсялякія збудаванні для гульняў. За ўсім пазірае наша баявое звяно. Яно не дужа вялікае: два Ігары, тры Сяргеі, Грыша, Андрэй і Гарык. Гарыка мы ўсе клічам Гаўрык. Ён малы і вельмі пацешны. Што б ні трымаў у руках, заўсёды згубіць, што б ні ўзяўся зрабіць, усё зробіць шыварат-навыварат, не так, як людзі. Сказалі яму неяк паперкі на двары пазбіраць, дык ён пачаў класці іх у шапку. А кветкі паліваў з кубка лыжкай. Што тут зробіш, калі ён самы меншы сярод нас ды ў дадатак такі пяўмека.

Сяргеі хлопцы добрыя, але вельмі розныя. Першы мой

знаёмы, як вядома, дужы і знаходлівы. Ён стаў пібы галоўным сярод нас. Другі — меншы, кірпаты, заўсёды з бруднымі рукамі. Гэты — недаверак. Нікому і нічому не верыць, пакуль сам не ўпэўніцца. Мы завём яго Сярожам. А трэцяга — Сяргейкам. І выходзіць, што кожнага паразнаму: Сяргей, Сярожа, Сяргейка.

Сяргейка самы кволы. Ён рэдка бывае на вуліцы, часта хварэе. Але затое і самы чысценькі. І нагрузку мы даём яму, можна сказаць, вераб'іную. Напрыклад, ганяць галубоў з пасеваў. У нас між дрэў пасеяна трава. Дык галубы зусім замучылі яго. З аднаго месца прагоніць, а яны ў другім апусцяцца. Бегае, бегае, аж пакуль не паваліцца.

Пра Грышу і Андрэя дык проста гавары не перагаворыш. Сёння яны футбалісты, заўтра — вучоныя, паслязаўтра — муляры і гэтак далей. Летуны нейкія, кожны дзень у іх новая прафесія. А неяк прыдумалі сабе дзікі занятак — лячыць кацянят. Назбіралі іх штук дзесяць. Падслепаватых, брудных, аблезлых. Абсыпалі іх дустам і ўкруцілі ў нейкія анучы. Ну, вядома, тыя кацяняты і паздыхалі. А то ў пошуках карысных выкапняў адзін раз перарылі двор, як добры статак дзікоў. Праўда, каб не заўважыў гаспадар — дзядзька Харытон, яны тут жа ўсё зараўнялі, загладзілі, быццам нічога і не было.

Грыша меншы за Андрэя, але больш рухавы. Галава ў яго малая, а вушы — хоць ты падстрыжы! Тырчаць угору, як у зайца. Клічам яго далікатненька — Зайчыкам. Хлопец ён смелы, не тое што, скажам, Гуля. З ім, Зайцам, расказвалі дарослыя, аднойчы здарылася цікавая гісторыя. Неяк раз насупраць іхняга дома, дзе яны жылі раней, спынілася грузавая машына з прычэпам. Дык Грыша націху залез у той прычэп і схаваўся пад брызент. А машына раптам узяла ды паехала. Грыша высунуў галаву толькі тады, калі горад застаўся далёка ззаду. Адчуўшы нядобрае, ён выбраў мясціну, дзе машына сцішыла ход, і саскочыў на дарогу. Азірнуўся. Навокал усё незнаёмае. Рэчка, лес, лугі за рэчкай. Патэпаў Грыша назад, але ісці, вядома, было не блізка.

Ноч застала Грышу ў лесе, але ён усё крочыў і крочыў, як скараход які.

Нездарма кажуць, што ноччу ўсе дарогі аднолькавыя. Грыша заблудзіўся. Потым згубіў усякую дарогу, бо звярнуў на прасеку. За ноч зайшоў у такі гушчар, што не ведаў, як і выбрацца. Але і тут не разгубіўся. Ішоў, куды ногі вялі. І на другі дзень усё-такі выйшаў на шлях, дзе

яго і падабралі людзі, бо сам ён ужо не мог трымацца на нагах. Вядома, дамашнім страху было больш, чым яму...

Вось і ўсё наша звяно. Пра сябе я лепш памаўчу. Хлопцы клічуць мяне і Папрок і Пакроп, хоць на самай справе я Пракоп. Гэта дзед мой прыдумаў такое старасвецкае імя. Казаў, у гонар яго даўняга сябра, з якім яны служылі ў арміі, а потым разам партызанілі ў варожым тыле. Дзед вярнуўся ў горад пасля вызвалення, а Пракоп загінуў смерцю героя. У яго гонар і назвалі мяне Пракопам. Гэта, вядома, вялікі гонар, але ж не будзеш кожнаму тлумачыць тую гісторыю. Вось так я і цярплю розных Папрокаў ды Пакропаў...

## ЛЮЦІК, МІШКА-ДУБЕЦ І ПІРАЦІК

Ёсць у нас і ворагі. Гэта высокі лысы стары з бялявымі, як у рыбы, вачыма і малады хлопец Мішка-дубец. Старога ўсе называюць Люцікам і крыху пабойваюцца. Ён нідзе не працуе і на ўсіх піша скаргі, што яго крыўдзяць, не даюць жыць. Ён пенсіянер, але дзядзька Харытон кажа, што каб яму Люцікава здароўе, то ён зрабіў бы з нашага двара квітнеючы сад.

Дык вось — Люцік сядзіць дома і піша скаргі. Ён пісаў скаргі нават на гракоў, якія вясною ўздумалі будаваць свае гнёзды на высокай ліпе, што расла сярод двара. Гракі, бачыце, крычаць, не даюць яму адпачыць як след. Смешна? Нікольні: стары ўсё-такі дабіўся свайго, тое дрэва спілавалі...

Нас Люцік называе не інакш, як «каларадскія жукі», і заўсёды цікуе са сваіх акон. Ледзь хто ступіць, каб падняць на газоне мяч — бывае ж, заляціць,— як Люцік выскаквае на балкон і крычыць на ўвесь двор:

— Зноў вы траву дратуеце, жукі каларадскія! І куды толькі глядзяць бацькі!

Нашы бацькі таксама выходзяць на балконы і глядзяць на Люціка з ухмылкай:

— Дзеці ж гуляюць...

Тады Люцік крычыць яшчэ мацней:

— Вось я напішу куды трэба, дык усе патанцуеце!

Пры гэтых словах нашы бацькі хаваюцца. Яны не хочуць, каб Люцік пісаў. Не хочуць, каб праз нейкае глупства прыходзілі на праверку ўсялякія камісіі, выпытвалі падрабязнасці, прасілі не турбаваць старога Люціка.

Вось такі ў нас вораг нумар адзін.

Высокі і танклявы Мішка-дубец, які жыве побач з нашай кватэрай, вораг нумар два. Бацькі ў яго няма, а маці кожны дзень прыходзіць з работы позна. Мішка, хоць і вялікі ўжо, нідзе не працуе. Швэндаецца па двары і ўдзень, і ўвечары, як здань. Не дае нам гуляць. То гарадкі пабурыць, то каму шалбаноў надае — аж лоб гарыць. А ўжо што на двары натворыць — жах! І галін паламае, і на траве пакачаецца, як конь,— усё яму з рук сыходзіць. Лысы Люцік на яго не піша скаргаў. Мабыць, баіцца. Між імі нібыта заключана нейкае сакрэтнае пагадненне...

Зараз канікулы, дзень сёння выдаўся цудоўны, і наш двор гудзеў, як вулей. Асабліва шмат было малых — і паўзуноў, і верхалазаў, за якімі на пляцоўку нам не паткнуцца. Таму мы сабраліся каля лаўкі, што стаіць перад нашым пад'ездам, і пачалі раіцца.

— Што будзем сёння рабіць? — пазіраючы ўгору на чыстае неба, задумліва сказаў Гуля.

Гарык шморгнуў носам і нясмела прапанаваў:

— Давайце майстраваць змея.

Раілі хто што, але ўсе ведалі, што вырашаць будзе Сяргей. А ён, як па тое, маўчаў. І толькі калі ўсе выгаварыліся, сказаў:

— Пойдзем на пустку, на нашу пляцоўку! Там знойдзем занятак для ўсіх.

У мяне чамусьці ніхто не пытае, што нам рабіць, быццам я нічога людскага не магу прыдумаць. Крыўдна, але я прывык.

Мы пайшлі за Сяргеем без адзінага слова. Наша пляцоўка — наша радасць і шчасце. Яна невялічкая, але на ёй можна і ў футбол гуляць, і спаборніцтвы наладжваць, і проста адпачываць. Не ведаю чаму, але нас сюды нібы магнітам цягне.

— Пайшлі вышэй! — падаў новую каманду Сяргей, і ўсе рушылі за ім на пустку, дзе раней стаялі драўляныя хаты. Гэта крыху вышэй нашай пляцоўкі. Адтуль відаць далёкая вёсачка, заўсёды сіні лес, а ўнізе — невялікае возера сярод лугу.

Па тым лузе працякае серабрысты ручай. Тата казаў мне, што ў хуткім часе ўвесь луг будзе затоплены, і на месцы невялікай азярыны разальецца сапраўднае возера. І возера тое будзе называцца морам. Яно вось-вось заплюскоча сінімі хвалямі, работы ўжо вядуцца.

Я часта глядзеў уніз, на луг, але ўявіць сабе мора ніяк не мог, бо ніколі яго не бачыў. На малюнках мора заўсёды бурлівае, з караблямі і чайкамі. А над азярынай ніякіх чаек не было.

Няўрымслівы Грыша вырваўся наперад і, абабегшы некалькі кусцікаў, раптам спыніўся і закрычаў:

— Ай-я-яй, які звер тут жыве!

Мы, як па камандзе, кінуліся да яго.

— Дзе жыве?

— Які звер?

«Зверам» аказаўся малы пузаты шчанюк з абвіслымі рудымі вушамі і доўгім тонкім хвастом. Ён ляжаў на нейкай анучыне пад агрэставым кустом і калаціўся як у ліхаманцы.

— Зусім маленькі, яму холадна,— сказаў тоўсты Ігар і засмяяўся. Ён заўсёды смяецца — ёсць з чаго ці няма. Такая ўжо прывычка. Аднойчы, памятаю, прыбег да нас увесь паабдзіраны, у разарванай кашулі і кажа: «Я лазіў па трубе на свой паверх!» І смяецца, хоць, па-мойму, яму трэба было плакаць. Ды яму і давялося-такі ў той дзень паплакаць...

Кірпаты Сярожа хацеў пагладзіць «звера», падняў над ім руку, а сабачка як ускіне галаву ды як гыркне.

— Ай, ай! — закрычаў Сярожа, хаваючы руку пад кашулю.— Ён мяне ўкусіў!

Мы абступілі яго з усіх бакоў.

— Пакажы, дзе ўкусіў!

Сярожа спачатку адварочваўся, потым паказаў руку.

— Вось... Маленькая кропачка, а балі-іць...

— Можа, гэты сабачка шалёны? — прашаптаў Гуля.— Кажуць, ад шалёнага сабакі можа звар'яцець і чалавек. І ўжо не вылечыцца.

Сяргей уважліва агледзеў руку і катэгарычна заявіў:

— Гэта ты накалоўся на калючкі агрэсту. Малога шчаняці спужаўся.

Ён нагнуўся і ўзяў шчаня на рукі. Яно і апамятацца не паспела. А на руках завіляла хвастом і паспрабавала лізнуць Сяргея ў нос. Потым жаласліва заскавытала.

Сяргей гладзіў яго па галаве і гаварыў:

— Ах ты, піскунок маленькі! Напалохаў нашага Сярожу...

— Піскун! Піскун! Так яго і назавём,— падхапіў Гарык.— Давайце прынясём яму чаго-небудзь паесці.

Пераганяючы адзін аднаго, мы кінуліся дадому. Толькі Сяргейка застаўся пільнаваць Піскуна, каб той куды не збег.

Вярнуліся мы хутка. І пачалося частаванне.

Ігар прынёс місачку з малаком. Сяргеі дасталі тварагу і каўбасы. Грыша і Андрэй прыцягнулі поўную шапку розных прысмакаў. Былі там абгрызеныя піражкі, некалькі кавалачкаў піражнага, пячэнне, нават цукерка. У мяне ў кішэні ляжаў толькі хлеб, і таму, каб хлопцы не смяяліся, я яго нават не даставаў. І добра зрабіў, бо, як толькі вылажыў на траву свае пачастункі Гарык, узняўся такі вэрхал, што перапалоханага Піскуна потым ледзьве дагналі. Падцяўшы хвост, ён дзгаў ад хлопцаў у крапіву, якая густа расла каля паваленых старых платоў.

Недарэка Гарык, аказваецца, прынёс тры сырыя бульбіны. За гэта хлопцы, вядома, і паднялі яго на смех.

— Ці ж сабака грызун які? — павучальна гаварыў Сяргей.— Сабака — самая разумная жывёліна ў свеце. Піскун ніколі не даруе табе такой абразы.

А самая разумная жывёліна ў свеце тым часам знаёмілася з нашымі пачастункамі. Перш за ўсё яна тыцнула носам у міску і перакуліла яе. Потым папюхала сыр, лізнула каўбасу і пачала брахаць на цукерку. Ухапіла ў рот адну пячэніну і пусцілася падскокваць вакол нас. Мы і не думалі, што шчаня такое шустрае.

Знаёмства адбылося.

Перастаўшы смяяцца, Ігар дзелавіта сказаў:

— Мы навучым яго браць след.

Недаверлівы Сярожа пакруціў галавою.

— Такі сабака след ніколі не возьме,— запярэчыў ён.— Адразу відаць, што не тая парода...

— Сам ты не той пароды! — асадзіў яго Гуля.— Бачыш якія вушы ці не? Бачыш лапы? Ён будзе вялізны і дужы...

— Каб быць вялізным, трэба расці. А каб расці, патрэбен час, ежа і хата. Пра тое, дзе Піскун будзе жыць, вы і не падумалі. Мы пабудуем яму сапраўдную маленькую хатку. Навучым яго прыбягаць на свіст, адшукваць сляды, спяваць...

Гэта сказаў Сяргей. Яму верылі да апошняга слова. А вось на апошнім...

— Спява-аць? — хітра прыжмурыўся Сярожа.— Можа, і свістаць у адказ?

— І свістаць будзе! — стаяў на сваім Сяргей.— Хіба вы не бачылі ў цырку, як сабачкі спяваюць? Гэта вельмі проста. Трэба толькі мець губны гармонік, прывучыць Піскуна стаяць на задніх лапах і...

— Дык дзе ж мы пабудуем яму хатку? — каб пера-весці гутарку на другое, перабіў я Сяргея. А то, чаго добрага, нагаворыць якога глупства, і хлопцы перастануць паважаць яго.

— Я думаю, што ў вішнячку,— сказаў Сяргей.

— Лепш у падвале,— параіў Гуля.— У вішнячок можа прыйсці хто хочаш і забраць нашага вучонага барбосіка. Дарэмна толькі патрацім час.

І тут я ўбачыў, што з-за дома, пераскокваючы цераз ламачча і ямы, да нас шыбуе на сваіх доўгіх нагах-хадулях Мішка-дубец.

— Хавайце Піскуна! Мішка! — папярэдзіў я хлопцаў, а сам як трымаў у руках пінжак, дык адразу і накінуў яго на сабачку. Ці то ад страху, ці то ад нечаканасці, але шчаня адразу сцішылася, прылегла.

— Гэй, падшыванцы! — яшчэ здалёк пачаў Мішка-дубец.— Ці не бачылі дзе тут майго Піраціка?

— А хто ён такі, Пірацік? — спытаў Сяргейка і схаваўся за мяне.

— Сабачанё...

— Не бачылі,— падміргнуўшы нам, з усмешкай адказаў Сяргей.— А якога яно колеру?

— Цёмна-рудое,— нічога не падазраючы, адказаў Мішка.

— Пабегла вунь тою цёмна-рудой дарожкай,— махнуў рукою Сяргей.— Шукай!

Мішка рвануўся да яго:

— Вось я табе...

Раптам ён спыніўся, усміхнуўся.

— А чаму гэта ў вас тут розныя кілбаскі-булачкі на зямлі валяюцца, га? — лагодненька і разам з тым здзекліва загаварыў Мішка-дубец. І пры гэтым падфутболіў нагою міску.

Сяргей прыняў удар на сябе.

— Мы тут абедалі,— сур'ёзна адказаў ён.

— І Піраціка не бачылі?

— Не бачылі ніякага Піраціка і не хочам бачыць, як і яго гаспадара.

Я зірнуў на свой пінжак, і ў мяне пацямнела ўваччу: ён не ляжаў на месцы. Ён паволі, але настойліва наблі-

жаўся да Мішкі-дубца. Той таксама глядзеў на мой пінжак і ўсміхаўся. Усмешка гэта была страшная.

— А чаго гэта пінжак аднаго майго знаёмага сам паўзе па зямлі? — яшчэ больш з'едліва спытаў Мішка і моцна цапнуў мяне за левае вуха.— Адкажаш ты, Пракопіпа, ці не? А то праз два тыдні, калі вернешся з бальніцы, усе празавуць цябе аднавухім.

— Пусці-і! — заенчыў я, як мага выцягваючы шыю, каб не так балела. І тут мне прыйшла ў галаву шчаслівая думка. Упэўнена, як Сяргей, я сказаў: — Я кінуў пінжак ля куста! Можа, там спаў твой Пір-рацік...

Мішка выпусціў з рукі маё беднае вуха і гучна чмыхнуў:

— Ч-чухонцы!

Сяргей прыжмурыўся на Мішку, цыркнуў слінай праз зубы і спытаў:

— А што гэта такое — чухонцы?

— Чухонцы — гэта... чухонцы і ёсць, хто ж яшчэ! — агрызнуўся Мішка-дубец, схапіў свайго Пірацiка і пайшоў ад нас прэч. Ён, пяйначай, адчуў, што мы ўжо сіла. І не малая! Бо нікога больш не зачапіў.

Мы ўсе засмяяліся яму ўслед.

— Чухонцы — гэта, мусіць, тыя, хто чухаюцца,— нясмела выказаў здагадку Гарык і залыпаў рыжымі вачыма.

На тым мы і пагадзіліся.

## РЭХА

Мы стаялі на пустцы і не ведалі, што нам рабіць далей. Раптам Сяргей усклікнуў:

— Ідэя! Мы пойдзем слухаць рэха.

— Дзе слухаць?

— Якое рэха? — адразу зацікавіліся хлопцы.

Сяргей паказаў рукою ўніз, туды, дзе за азярынай, крышку лявей, сінеў лес. Ён быў не дужа вялікі, не такі, як сапраўдныя лясы далёка ад горада. Але ўсё-такі гэта быў лес. Там ёсць і паляна, і птушкі на ёй, і нават, калі верыць, адпойчы нехта бачыў у ім вавёрку.

Мы пайшлі.

Дарога была нікуды не варта. Голае, пядаўна ўзаранае поле. А на ім нейкія равы ды ямiны. Пакуль мы яго перайшлі, у чаравікі набралася поўна зямлі. Давялося, як толькі пачалася мурашына, усеяная высокімі, як вярблюджыя гарбы, карычневымі купінамі, на якіх густа рос

зязюльчын лён, сесці на гэтыя купіны і высыпаць з абутку зямлю.

Калі мы шыбавалі ўжо не па мурагу, а па добрай брукаванай дарозе, Сяргей раптам вырваўся наперад і стаў паціху, як кот, падкрадвацца да моста. Потым спыніўся зусім і папярэдзіў нас рукою, каб і мы падыходзілі ціха.

Мы наблізіліся.

— Глядзіце, вунь, ля травы... Бачыце? — шэптам спытаў Сяргей, паказваючы з моста ўніз.— За слупкамі! За слупкамі! Колькі там ры-ы-бы-ы!

Мы зірнулі ўніз на невялічкую затоку, дзе між высокай травы плавалі чырвонапёрыя плоткі. Некаторыя рыбіны грэліся на сонцы, зусім не кратаючы плаўнікамі.

— Дзе рыба? Дзе рыба? Я не бачу! — высунуўся наперад Гарык.

— Ціха ты, сляпеча! — адштурхнуў яго Грыша. Але ўжо было позна. Пачуўшы шум, плоткі ў момант шмыганулі куды каторая.

— Вечна ты ўпхнешся! — накінуўся на Гарыка і Гуля.— Не бачыш сваімі рыжымі вачыма...

Гарык вінавата паміргаў вейкамі і ціха, з папрокам сказаў:

— Калі ж за табой ніколі нічога не ўбачыш.

— Акуляры купі ды начапі...

— Ціха! — Сяргей строга зірнуў на сяброў і загаварыў з патхненнем.— Гэта што-о! Гэта драбната. Можа, удасца ўбачыць іншае...

— Што? — спытаў Сяргейка.

Сяргей прайшоў на мост і зірнуў у ваду.

— Тут ёсць вялізныя шчупакі і акуні,— нібы па сакрэту паведаміў ён.— Усякай рыбы поўна, а вось на вуду не бярэцца. Мне наш Алесь гаварыў. Ён рыбак — во! — Сяргей паказаў вялікі палец.— А чаму не бярэцца? Бо ўсялякай ежы хапае. От каб якой сеткай яе налавіць...

— Сеткай няможна! Сеткай толькі дзяржаўныя арцелі ловяць,— сказаў Сярожа і шморгнуў носам.

— Гэта я ведаю без цябе...— Сяргей зноў пайшоў па дарозе наперадзе.— Толькі ўсё роўна рыба тут доўга не пражыве, загіне.

— Чаму загіне? — пацікавіўся Гарык, які верыў кожнаму слову Сяргея.

— Бо хутка рэчка стане па калена. Тут будзе плаціна,— растлумачыў Сяргей.

— Шкада рыбак,— уздыхнуў Сяргейка. Ён заўсёды ўсіх шкадуе — жучкоў, чарвячкоў, матылёў, птушачак. Ён наогул падобны на дзяўчынку. І абліччам, і характарам. Калі часам хто расказвае страшную гісторыю з кнігі, Сяргейка аж бляднее.

Вось і ўзлессе.

Сяргей склаў рукі рупарам і моцна гукнуў:

— О-го-го-го-о-о!

— Го-о-о! — адказала рэха.

— Тру-ту-ту-р-р-у-у-у! — зноў, яшчэ мацней гукнуў Сяргей.

— Ту-у-ру-у! — пачулася ў адказ.

Тут і мы ўключылі свае рупары. Крычалі на ўсе лады. Гукі, крыху скарочаныя і перайначаныя, адразу ж вярталіся назад.

Лес наш хоць і не дужа вялікі, але прыгожы. Дрэвы таўстаствольныя, стройныя стаяць у нізіне. А за лесам уздымаецца высокая гара. Мусіць, таму і рэха тут такое гучнае, галасы грымяць, як у пустым школьным калідоры.

Хутка мы асіплі ад крыку. А Гарык, які стараўся больш за ўсіх, перайшоў на шэпт.

— Я ўжо больш не магу,— нарэшце сказаў ён і спрытна, як малпа, палез на дрэва. Як гэта заўсёды бывае, мы не засталіся абыякавымі назіральнікамі. Мы ахвотна падхапілі новую забаву. За Гарыкам палез па густую елку Грыша Заяц. Ён узабраўся на самую верхавіну і пачаў шпурляць уніз шышкі.

— Што ты робіш! — закрычаў на яго Гуля.— Так можна і ў галаву пацэліць. Чуеш ты ці не? Злезеш ты адтуль ці не? Будзеш ты мяне слухаць ці не?

Але тут ён перастаў «ціпекаць», бо ўжо і Сяргей шкрабаў нагамі па тоўстым камлі прысадзістага дубка. Павіс, учапіўшыся за сук рукамі, як на турніку, і ніяк не мог падцягнуцца вышэй. Гледзячы на яго, і Сярожа падбег да елкі, палез угору між калючых лапак. Крыху падняўся і адразу ж закрычаў:

— На маёй елцы гняздо-о!

— До-о! — адказала яму рэха.

— Дык паглядзі, ці ёсць у ім птушаняты,— параіў з суседняй елкі Грыша Заяц.

Цяпер яны перагаворваліся, як па тэлефоне.

— А дзе яны павінны быць, тыя птушаняты?

— Дзе, дзе... Ды ў гняздзе!

— Калі ж яно нейкае круглае. З сівога моху... І ніdзе ані дзірачкі.

— То, мусіць, гэта вавёрчына. Мне тата казаў, што вавёрка робіць круглае.

— А як жа яна туды залазіць?

— Недзе ёсць дзірка.

— Не бачу.

— Пашукай лепш! Калі вавёркі адыходзяць далёка, яны затыкаюць дзірку ў гняздзе мохам...

— Зараз праверу!

Тэлефонная сувязь абарвалася, бо ўсе мы раптам пачулі, як моцна войкнуў Сярожа, як затрашчалі сухія сукі і штосьці гулка грымнула на зямлю.

Гэта быў Сярожа. Мы ўсе, хто не паспеў узабрацца на дрэвы, кінуліся да яго, абступілі і не ведаем — жывы ён ці не. Ляжыць і не варушыцца.

Ды вось паціху прыўзняў галаву, палахліва зірнуў угору і, паказваючы пальцам на гняздо, дрыготкім голасам прагаварыў:

— Т-т-там... в-в-о с с ы. Адна мяне ўкус-с-іл-ла. В-в-во. За нос укусіла...

— Не ўкусіла, а джгнула,— направіў яго Сяргей, які ўжо злез на зямлю і падышоў да нас. — Ану пакажы мне! Так, ясна. Джгнула...

— Укусіла ці джгнула — ад гэтага яму не лягчэй,— пашкадаваў таварыша Сяргейка. Ён, чысценькі, акуратненькі, глядзеў на Сярожу так жаласліва, што, здавалася, вось-вось заплача сам.— Трэба бегчы дамоў і заліць ранку ёдам. А то нос можа ўспухнуць.

— Што ўспухне — гэта факт,— пацвердзіў Грыша Заяц. Ён таксама ўжо быў на зямлі.— Не трэба было соваць нос у чужую хату.

— Ты ж сам сказаў, каб я паглядзеў птушанят,— тручы кулаком кірпаты нос, папракнуў Сярожа.

— Дык усё трэба з розумам...

Недагаварыўшы, Грыша энергічна махнуў ля свайго вуха рукою і крыкнуў:

— Вось яны! Вось яны, восы праклятыя! Ты раздражніў іх!

— Уцякайце! Уцякайце ў гушчар! — падаў каманду Сяргей.— У кусты-ы!

Мы ўжо беглі, беглі, як слапы, мнучы нагамі высокую зялёную траву, прадзіраючыся праз густыя зараснікі. Беглі аж да паляны. Там спыніліся, крыху ачомаліся.

Зноў сабраліся разам. Паслухалі, пачакалі — ціха, вос не чуваць.

— А дзе ж Сяргейка? — азіраючыся па баках, трывожна спытаў Гарык.

Сяргейкі і праўда не было. З перапуду мы на яго зусім забыліся. Цяпер усім было ніякавата: самага слабага пакінулі ў бядзе.

Калі мы нарэшце знайшлі яго, то ледзьве пазналі: рукаў белай кашулі парваны, на грудзях чорныя плямы, увесь твар падрапаны, чаравік на левай назе з адарванай падэшвай.

— А от на мяне не будуць сварыцца! А от не будуць! — нібы з кім спрачаючыся, лапатаў Сяргейка.— Я ўсё раскажу, як было, і не будуць...

— А што было? — занепакоена спытаў Сяргей.

Сяргейка крыва ўсміхнуўся, пачаў страсаць з грудзей гразь, але толькі яшчэ больш забрудзіў кашулю.

— Я ўзяў ды паваліўся,— сказаў Сяргейка і ненатуральна засмяяўся.

— Дзе?

— Вунь за тым дрэвам, ля елачкі. Спачатку зачапіўся кашуляй за сучок, а потым нешта трапіла пад ногі. Я і паляцеў, а там — лужына.

— А твар?

— Абдзёр аб елачку, як падаў.

Сяргей ажно рукамі развёў. Гэта ж трэба! Можна сказаць, на ўвесь лес адна лужына, і ў тую трапіў наш Сяргейка.

Занятыя Сяргейкавай бядою, мы зусім забыліся пра Сярожу. А калі глянулі на яго, дык аж жахнуліся: нос у яго распух і быў з добрую грушу.

— Вось табе і рэ-эха,— паківаў галавою Грышка Заяц.

— Рэха тут ні пры чым,— скоса зірнуў на яго Сяргей.

Мы пайшлі дадому з гэтага цудоўнага лесу, нават ні разу не гукнуўшы на развітанне.

## НЕЧАКАНАЕ АДКРЫЦЦЁ

Дні два мы хадзілі злосныя і сумныя. Дарога ў лес нам была закрыта. Дазвалялася адыходзіцца ад дому не далей азярыны. На той бок — ні кроку. А якраз цяпер, калі мы адчулі хараство прастору, нас з небывалай сілай пацягнула далей ад двара.

Мы стаялі на пустцы і не ведалі, чым заняцца, як раптам Гуля ўскліюнуў:

— Глядзіце, дзядзька Харытон ідзе!

Дзядзька Харытон сёння быў не ў звычайным сваім адзенні, а ва ўсім новым. Мы яго ледзь пазналі. Лёгкі светлы касцюм і вышываная кашуля быццам амаладзілі яго. Нават маршчыны на твары былі не так прыкметны, як заўсёды.

Убачыўшы нас, дзядзька Харытон таксама зарадаваўся.

— Ну, верхалазы,— сказаў ён, спыніўшыся крыху зводдаль, мусіць, каб мы лепш разгледзелі яго, — што насы павесілі? Не знойдзеце сабе занятку? Ясна. Ану сядайце на гэтае ламачча, я вам нештачка раскажу. Каб помнілі...

— Пра што? — націкавіўся нецярплівы Гарык.

— Пра мінулую вайну, пра далёкае рэха,— загадкава адказаў дзядзька Харытон. Ён ужо, напэўна, дачуўся, як мы хадзілі слухаць рэха.

Не шкадуючы свайго светлага касцюма, дзядзька Харытон першы сеў на вялікі камень. Мы паселі хто дзе: на дошкі, на слупкі, проста на траву, якая расла тут густа і буйна. Ведама — паўкол былыя агароды.

Калі мы сцішыліся, дзядзька Харытон працягнуў перад сабою руку, нібы на каго паказваючы.

— Вунь там,— сказаў ён,— дзе яшчэ, бачыце, некалькі старых вішань, была мая хата. Звычайная драўляная хата. З падмуркам. Жылі мы тады ўсе разам. Два сыны, я, жонка Зося... І жыў у мяне яшчэ адзін хлопчык. Звалі яго Андрэйка. Ён прыйшоў да нас зусім слабы. Левая рука была перавязана, на шчацэ, пад правым вокам, крывавы рубец. Стаў на парозе і кажа: «Тату і маму забілі... Нас бамбілі на дарозе... Мне асколкам адарвала два пальцы на руцэ і вось, у шчаку...» Сказаў і паваліўся на падлогу, самлеў...

Тут дзядзька Харытон дастаў з кішэні пачак папярос, закурыў і, абвёўшы ўсіх нас вачыма, спытаў:

— Хочаце ведаць, што потым было з Андрэйкам?

— Хочам! Хочам! — у адзін голас закрычалі мы.

— Тады давайце пройдзем да маіх вішань. Там ёсць дзе схавацца ад сонца,— прапанаваў дзядзька Харытон і падняўся з каменя. Мы ахвотна пайшлі за ім, бо сонца і сапраўды смаліла па ўсю моц.

У вішняку было ўтульна. Там яшчэ стаяла пад дрэўца-

мі даволі вялікая лаўка, валялася некалькі скрынак. Так што мы ўладкаваліся як мае быць. І вось што расказаў нам далей дзядзька Харытон. Я пераказваю ўсё тое трошкі па-свойму.

...Мінула некалькі дзён, пакуль Андрэйка ачуняў. За гэты час фашысты захапілі наш горад.

— Дзядзечка,— сказаў на другі дзень, пасля таго як падняўся на ногі, Андрэйка, звяртаючыся да маладога яшчэ тады дзядзькі Харытона,— назычце мне крыху хлеба і солі. Я некалі вярнуся і ўсё аддам. Чэснае піянерскае, аддам.

— Навошта табе хлеб і соль?

— Я пайду на ўсход, да сваіх. Я павінен ваяваць.

— Ты яшчэ малы і слабы,— спахмурнеў дзядзька Харытон.

— Мне ўжо чатырнаццаць год...

— Чатырнаццаць! — Дзядзька Харытон уздыхнуў і пакруціў галавою.— У такія гады за партай сядзець, а не ваяваць.

— Дык вы... не дасце хлеба? — зірнуў спадылба Андрэйка.

Адчувалася, што ён можа пайсці і так. Трэба было сказаць нешта такое пераканаўчае, каб ён зразумеў усю сваю бездапаможнасць перад цяжкімі выпрабаваннямі. І дзядзька Харытон сказаў шчырую праўду, сказаў што думаў:

— Хлеба я табе дам, хлопча, з радасцю, але з адным хлебам цяпер не дабярэшся да сваіх. Пачакай крыху тут, залячы раны. Пасля падумаем, што нам рабіць.

Доўга маўчаў Андрэйка.

— Разумею. Каб прайсці цераз фронт, патрэбна зброя,— кіўнуў ён.— А дзе яе ўзяць?

— Мы разам падумаем, пажыві ў нас, Андрэй, не спяшайся. Глядзіш, удвух што-небудзь і прыдумаем!

Андрэйка згадзіўся жыць у дзядзькі Харытона.

Вечарамі ён выходзіў на двор і падоўгу глядзеў на ўсход, дзе яму, напэўна, яшчэ чуліся далёкія грымоты вайны, бачыліся начныя зарніцы выбухаў.

З Харытонавымі сынамі Андрэйка не сябраваў, яны былі зусім малыя. Ім што? Гуляюць сабе з іншымі малымі то ў хованкі, то ў лапту. На ўскраіне горада немцы бывалі рэдка.

Ды вось аднойчы і на ціхую вуліцу Загародную нахлынулі фашысты. Трыста ці чатырыста варожых салдат, якія рухаліся на фронт, часова затрымаліся ў горадзе. Іх расквататаравалі ў школе, непадалёку ад Харытонавага дома.

Загародняя вуліца адразу нібы вымерла. Нават самыя малыя не патыкаліся на двор — баяліся. І было чаго баяцца. На слупах, на варотах дамоў, на платах з'явіліся награзлівыя аб'явы. У іх гаварылася, што ў кожнага, хто з заходам сонца выйдзе на вуліцу, будуць страляць без папярэджання. Нават удзень збірацца больш чым утрох было забаронена. Фашысты пагражалі адным — расстрэл, расстрэл, расстрэл...

Дарослыя хадзілі на працу, маючы спецыяльныя прапускі. Дзядзьку Харытона гітлераўцы прымусілі паліць у школе ў грубках, бо ўжо было халаднавата. Наглядаць за грубкамі трэба было ўвесь дзень: іх у школе нямала. І Андрэйка папрасіў у дзядзькі Харытона, каб ён і яго ўзяў з сабою на працу. Камендант, тоўсты сіпаты афіцэр, дазволіў.

— Зын, зын — можно! — сказаў ён.

Так Андрэйка ўпершыню зблізку ўбачыў забойцаў яго бацькоў. У хлопчыка былі свае планы, пра якія ён нікому не гаварыў. Планы рызыкоўныя, небяспечныя, але страху перад фашыстамі Андрэйка не адчуваў. Нават і тады, калі яны абшуквалі яго з галавы да ног пры ўваходзе ў школу і пры выхадзе. Гітлераўцы нярэдка давалі дзядзьку Харытону ў каршэнь за тое, што марудна падымае рукі. А з яго, Андрэйкі, кожны раз здзекаваліся і смяяліся. Гэта і была ўся іх плата за работу.

— Сядзеў бы ты, Андрэйка, дома. З гэтымі вылюдкамі і да бяды недалёка,— часам гаварыў дзядзька Харытон, калі трапляўся асабліва жорсткі дзяжурны.

Андрэйка сціскаў зубы і круціў галавою:

— Не, дзядзька, я павінен памагаць вам...

Ён нароўні з Харытонам насіў дровы, наглядаў, каб усё добра выгарала, а потым закрываў юшкі. Стараўся як мог, і не толькі каб памагчы дзядзьку Харытону. Андрэйка хацеў дагадзіць фашыстам, каб яго стаканне ўбачылі, каб пахвалілі. Паступова хлопец так уцягнуўся ў работу, што пачаў падоўгу затрымлівацца ў школе. Ужо дзядзька Харытон і кліча яго, і чакае ўпізе, а ён усё не ідзе.

— Трэба, каб добра выгарала, каб не было чаду,— крычаў у адказ Андрэйка.

— Гут, гут! — бубніў камендант.— Не трэба чад...

Адпойчы, затрымаўшыся даўжэй звычайнага, Андрэйка хуценька збег уніз. Яго чорныя вачаняты аж гарэлі, твар расчырванеўся. На шчасце, толькі дзядзька Харытон заўважыў гэтую ўзрушанасць малога. Але тады ён нічога не сказаў, не спытаў. Моўчкі ўзяў за руку і падвёў да кантрольнага пункта, што быў пры выхадзе. Іх, як звычайна, абшукалі і выпхнулі за дзверы — ідзіце. І ўжо толькі на вуліцы дзядзька Харытон спытаў:

— Што з табой сёння? Што здарылася? Яны могуць падумаць нядобрае.

Андрэйка спахмурнеў і маўчаў усю дарогу. А каля дома прызнаўся:

— У адным пакоі пісталеты нейкія ў скрынках... І патроны. Вось бы набраць! Пайшлі б тады да сваіх.

— Ціха, ціха, Андрэйка! — спалохана прамовіў дзядзька Харытон.— Як жа ты набярэш тых пісталетаў, калі кожны рубец прамацваюць, кішэні выварочваюць, каб іх...

— А калі набяром зброі — пойдзем да сваіх? — узняў на Харытона вочы Андрэйка. У іх былі і надзея і чаканне.

— Са зброяй, сынку, куды хочаш можна пайсці,— уздыхнуў дзядзька Харытон.— Толькі і думаць пра гэтую зброю не варта. Я ўжо, браце, не такія думкі пахаваў...— Ён памаўчаў і раптам са злосцю дадаў: — Узарваць бы ўсё ці спаліць, ліха іх матары!

На гэтым іх размова і скончылася.

А на трэці дзень на Загароднюю вуліцу прыйшла бяда.

Фашысты сагналі ўсіх жыхароў на невялікі пляц перад школай. Салдаты з аўтаматамі напагатове хадзілі вакол і сачылі, каб ніхто не адышоўся. Чуліся каманды, крык. І страшна ўдвайне было ад таго, што ніхто не ведаў прычыны — чаму іх выгналі з дамоў.

Нарэшце на высокі школьны ганак выйшаў афіцэр у акулярах. Бліснуў шкельцамі і, скажаючы і перакручваючы словы так, што іх цяжка была зразумець, загаварыў:

— У нас прапал зброй. Много зброй! І вы стояць тут, покут мы не знайсці! А потым мы вас будзем мал-мал страляйт. Пах-пах...

Афіцэр гаварыў быццам жартаўліва, але ўсе ведалі, чым пахне той жарт. Жанчыны і дзеці, старыя і маладыя — усе маўчалі. Тады ніхто не ведаў, што салдаты ў гэты час пераварочваюць усе хаціны на Загароднай уверх дном. Трашчалі вароты і форткі, выляталі дзверы, звінелі разбітыя шыбы.

Людзі стаялі адвячорак, вечар і ноч. Пакутавалі ад

смагі, ад голаду, але ніхто не плакаў, не прасіў літасці. Салдаты з аўтаматамі змяняліся кожныя дзве гадзіны, а людзі ўсё стаялі.

— Усё ж нехта ды ўзяў зброю,— ціха сказаў хтосьці побач з Андрэйкам.— Не ўпільнавалі...

— І не знайшлі! — гэтак жа шэптам задаволена адказаў дзядзька Харытон.— Інакш даўно пусцілі б...

Ноч цягнулася пакутліва доўга. Было холадна, ногі здранцвелі, не хацелі трымаць людзей. Але садзіцца забаронена. Хто сядзе — расстрэл. Такі загад.

Малых падтрымлівалі пад рукі. Яны таксама за ўсю ноч не звялі вачэй.

Адпусцілі дадому толькі пад раніцу, нічога так і не паведаміўшы. Многіх мужчын, што стаялі наперадзе, збілі шампаламі. Двух чалавек забрала гестапа.

— Дзякуй богу, што хоць не пастралялі,— цешыліся людзі.

Ды цешыцца не было чаго: хаты сустрэлі іх сіратліва. Фашысты абрабавалі ўсіх да ніткі.

— Выдумалі яны ўсё пра зброю! — абуралася Харытонава жонка.— Проста парабаваць захацелі, гады праклятыя! Не бачыць бы ім свайго дома роднага, нелюдзі!

Доўга яшчэ лаялася кабеціна, укрываючы сыноў нейкімі лахманамі і ўкладваючыся спаць сама.

Андрэйка сядзеў каля халоднай грубкі. Яму здавалася — так цяплей. Калі малыя і цётка Зося заснулі, ён устаў і абапёрся на грубку плячыма.

— Гэта я ва ўсім вінаваты,— ціха сказаў Андрэйка і глянуў на дзядзьку Харытона.— Зброю ўзяў я...

Харытон, які знямогана сядзеў за голым сталом, усхапіўся і падышоў да яго.

— Не блюзні, хлопча,— загаварыў ён.— За такое могуць і да сцяны паставіць.

— Я праўду кажу.

Харытон падышоў да дзвярэй, адчыніў іх і зазірнуў у сенцы. Потым шчыльна прычыніў дзверы і вярнуўся да Андрэйкі.

— Якую зброю ты ўзяў?

— Два пісталеты, шапку патронаў, яшчэ гэты аўтамат з ражком... Потым тры ражкі асобна і гранаты з драўлянымі ручкамі. Ну, яны, як таўкачыкі, з белымі вечкамі зверху...

— Божа мой! Што ты вярзеш! — захадзіў па хаце Харытон.— Столькі зброі! Ды з гэтага пекла іголкі не выне-

сеш. Нас жа гэтак правяраюць. Ты думаеш, што гаворыш, Андрэйка?

— Думаю. І няхай сабе правяраюць,— разважліва, як сталы, прамовіў хлопец.— Я ўсё схаваў там, у школе, у тым самым пакоі, дзе ляжыць зброя. Там, ведаеце, за грубкай ёсць дзірка ў сцяне, закладзеная цаглінай.

— Стары стаяк? Дымаход?

— Можа, і дымаход, бо ўсярэдзіне пуста і чорна. Я ўсё гэта кінуў у тую дзірку. Каб ім менеї было. Потым паклаў цагліну на месца. Вось і ўсё, а вы кажаце...

Нейкі час дзядзька Харытон няўцямна глядзеў на Андрэйку, затым моцна абняў яго.

— Калі гэта праўда, то яны ніколі не знойдуць сваю зброю. Унізе сабралася столькі сажы, цэлая гара! І як гэта я сам не дадумаўся да такога — схаваць там? Ды гэта ж цудоўна! Дзякую, сынку, ты памог нам больш, чым спадзяваліся атрымаць ад мяне сябры. Мне далі заданне — дастаць хоць адзін пісталет...

— Вось толькі як мы возьмем тую зброю? — заклапочана спытаў Андрэйка.

— Не век жа тут будуць стаяць салдаты. Паедуць — тады і возьмем.

— І пойдзем на ўсход?

— Можа, і пойдзем...

Фашысты пакінулі Загародную вуліцу ў тую ж раніцу. Яны сабраліся надзіва хутка, нават паспешліва. Пагрузіліся на машыны і паехалі. Школа зноў апусцела. Яе зачынілі на замок, і мясцовы паліцай Грыц Пярун, якога ўсе ведалі да вайны як злодзея, пасяліўся ў невялічкай прыбудове. Раней там жыў дырэктар школы. Грыц як бы ахоўваў памяшканне.

— Ну, з гэтым мы як-небудзь справімся,— даведаўшыся аб усім, сказаў Харытон.— Абдурым нарэшце. А калі што якое, дык дамо рады...

Але абдурыць хітрага здрадніка было не так лёгка.

Грыц нікога і блізка не падпускаў да школы. Яна ўжо лічылася казармай для салдат. У пакоях стаялі жалезныя ложкі, сталы.

Толькі пасля таго як дзядзька Харытон сказаў Грыцу, што другі раз ён ужо ні за што не будзе паліць у грубках, бо казарма можа загарэцца, той завагаўся.

— Ты толькі пачысціш коміны? — спытаў паліцай.

— Вядома. І неяк трэба было б дастаць машыну, каб

вывезці з падвала сажу. Гэта ж, ведаеце, чым пахне? Сажа тая, як порах...

— Машыны не будзе, сам вывезеш на тачцы.

— Дык жа вецер разнясе...

— У мяхі насыпай.

Пасля Андрэйка назіраў, як дзядзька Харытон лазіў на даху школы і на доўгай вяроўцы апускаў у коміны хваёвае памяло, да якога была прывязана гіра. А потым на тачцы-аднаколцы вывозіў на поле сажу. Выносіў яе з падвала ў мяхах, грузіў на тачку і паціху вёз далей ад школы.

Больш за ўсё Андрэйку хвалявала пытанне — знайшлі фашысты зброю ці не? Паліцая Грыца ён баяўся больш, чым немцаў. Гэты хітры, агідны і вельмі небяспечны, бо ведае людзей. Можа, ой можа нарабіць бяды гэты паганы Грыц!

Калі пад вечар, забруджаны і змораны, дзядзька Харытон прыйшоў дахаты, Андрэйка запытальна зірнуў на яго. Нічога не спытаў, толькі зірнуў. І дзядзька нічога не адказаў. Толькі ўсміхнуўся.

Пасля ўжо, калі клаліся спаць, дзядзька Харытон ціха шапнуў Андрэйку:

— Усё ёсць, што ты казаў... А з гранатамі рызыкнуў ты... Яны маглі ўзарвацца, упаўшы з гэткай вышыні. Шчасце, што там сабралася сто пудоў сажы.

Так Андрэйка памог падпольшчыкам здабыць першую зброю — два пісталеты, аўтамат з чатырма ражкамі патронаў, чатыры гранаты і некалькі сотень патронаў.

•

— Вось які ён быў, наш Андрэйка! — скончыў свой расказ дзядзька Харытон.

Мы сядзелі ціха, як мышы пад венікам. Усе былі ўражаны смеласцю і знаходлівасцю, па сутнасці, нашага аднагодка. Потым, калі дзядзька Харытон падняўся, мы папрасілі яго паказаць тую мясціну, дзе быў падвал, у якім Андрэйка схаваў зброю.

— А ці жывы той хлопец? — раптам спытаў хтосьці.

Мы азірнуліся. За намі стаяў прысадзісты чарнявы мужчына ў сінім касцюме, з фотаапаратам, які вісеў на тоненькім раменьчыку, нібы вайсковы бінокль, на самых грудзях. Калі ён падышоў, гэты незнаёмы чалавек з ледзь прыкметным шрамам пад правым вокам? Хто ён? Мы гэ-

тага не ведалі. Не ведаў, мабыць, і дзядзька Харытон, бо тут жа спытаў:

— А вы, даруйце, хто будзеце, малады чалавек?

— Каго ж яшчэ могуць цікавіць даўнія гісторыі? Я карэспандэнт газеты, журналіст,— адразу адказаў незнаёмы, нібы чакаў такога пытання.

— У вайну было шмат усялякіх гісторый,— уздыхнуў дзядзька Харытон.— Вось, калі б расказаць вам, як наш атрад выконваў аперацыю «Соль» ці «Баржа»!

— Бачыце...— задумліва пачаў журналіст.— Гісторыя з Андрэйкам мяне цікавіць больш за ўсё таму, што я ўжо сёе-тое чуў і хачу напісаць пра таго хлопчыка. Ды вось не ведаю канца...

— Каб жа я яго ведаў!

Дзядзька Харытон дастаў з кішэні пінжака пачак папярос, зноў закурыў.

— Нават не ведаеце, ці жывы Андрэйка?

— Скажу адно... Загінуў ён. І загінуў, як сапраўдны герой. Але гаворка пра тое будзе іншым разам. Вось з імі,— паказаў на нас дзядзька Харытон.— Цяпер, прабачце, мне трэба ісці.

Па ўсім было відаць, што дзядзьку Харытона вельмі расхвалявалі ўспаміны.

— Калі ж да вас зайсці? — пацікавіўся журналіст, дастаючы з кішэні запісную кніжку.

— У нядзелю, гадзіны ў дзве. І вы, верхалазы, не забудзьце — прыходзьце абавязкова.

## ПОШУКІ

На другі дзень з самай раніцы да мяне забег Грыша Заяц. Яго вострыя вушы аж палалі, твар расчырванеўся.

— Пракоп, мы ідзём на пошукі слядоў! — урачыста паведаміў ён і скасавурыўся на маю маму, якая падавала на стол снеданне.

— Якіх слядоў? — адразу зацікавілася яна, з усмешкай пазіраючы на Грышу Зайца.

— Слядоў... рэха,— загадкава і незразумела для мамы адказаў ён.

— Рэха?

— Ага. Дык чакаем цябе, Папрок, у вішнячку!

Грыша выбег з кватэры, а мне давялося растлумачыць маці, што дзядзька Харытон назваў свой расказ пра Андрэйку «Рэхам вайны».

— Вось гэта ўжо цікавы занятак,— сказала мама, наліваючы мне ў кубак чай.— Гісторыю свайго двара трэба ведаць.

Чай быў гарачы як ніколі. Пакуль я яго выпіў, у роце ад апёкаў не засталося жывога месца. Хлеб з сырам і маслам засядаў у горле. Сяк-так пракаўтнуўшы ўсё гэта, я схапіў шапку і мігам апынуўся ў вішняку.

Там ужо былі ўсе мае сябры. Не хапала толькі Сяргейкі. Хлопцы казалі, што ён ні то захварэў, ні то яшчэ збіраецца захварэць і маці не пусціла яго на вуліцу, бо ў яго вельмі гарачы лоб і чырвоныя вочы. Ды яшчэ і драпіны на твары не зусім зажылі. Адным словам, наша баявое звяно пасля прыгод у лесе панесла некаторыя страты.

Калі я прыйшоў, хлопцы накінуліся на мяне, як сабакі на старца.

— Пакроп! — крычаў Ігар тоўсты, смеючыся на ўвесь рот.— Ты снедаеш, як буржуй.

— Нічога не як буржуй,— пачаў апраўдвацца я.— Хлеб з маслам і сырам ядуць усе.

— Але ж не ў дзесяць гадзін! — падхапіў Ігар Гуля.

Хоць бы ўжо ён маўчаў! Сам устае ў дзевяць і заўсёды цягнецца на двор не снедаўшы. А пасля маці адчыняе акно і тоненька крычыць: «Ігаро-о-очак! Сне-едаць бяжы...»

А што я сёння паснедаў у дзесяць, няма нічога дзіўнага. У мамы выходны. Я так і сказаў хлопцам, але яны і слухаць не хацелі.

— Трэба з гэтым скончыць раз і назаўсёды,— упершыню асмеліўся выступіць супраць мяне Андрэй.

Андрэй наогул самы ціхі сярод нас, нейкі непрыкметны. І я здзівіўся: чаму гэта ён так пасмялеў? Чапаць-то я яго не буду, але магу расказаць хлопцам нешта такое, ад чаго Андрэю не паздаровіцца! Напрыклад, пра тое, як ён аднойчы «знайшоў» на двары мяч. А потым — цацачны грузавік. Андрэй, як я заўважыў, любіць падбіраць тое, што ляжыць без нагляду. У гэтым я перакананы. І ён гэта ведае, бо неяк раз, калі Андрэй хацеў падхапіць цацачную стрэльбу на лавачцы, я паківаў пальцам і сказаў, што гэта стрэльба Сяргеевага брацікa. Ён прамармытаў, што толькі хацеў «пульнуць» па вераб'ях, але пры гэтым пачырванеў.

— Снедаць трэба, і праўда, у восем,— падтрымаў іх і мой першы і лепшы сябар Сяргей.

— А я дык ніколі не снедаю! — як заўсёды, тручы свой кірпаты нос брудным кулаком, прызнаўся Сярожа.— Набяру чаго-небудзь у кішэні і бягу на двор.

Я ніяк не мог зразумець, чаго гэта яны ад мяне хочуць. Калі куды спяшаюцца, то чаму ўжо хвілін дзесяць лаюць мяне, чапляюцца абы да чаго? За гэты час можна было чорту галаву скруціць і зноў прышыць на месца.

Нарэшце мне гэта надакучыла. Я адышоўся і ўзняў руку ўгору.

— А я заўсёды снедаю! — як выклік гукнуў я хлопцам.— Снедаю калі хачу і колькі хачу!

— Не, ты будзеш снедаць тады, калі захочам мы,— запярэчыў Гуля, пазіраючы на мяне зверху ўніз.

— Хто ідзе супраць калектыву, той яго вораг! — як прысуд кінуў мне ў твар Сярожа.

Яны цяпер джгалі мяне, як тыя восы. Хоць бяры ды ўцякай...

— Добра, я буду снедаць тады, калі захочаце вы,— здаўся я.— І давайце ж шукаць сляды рэха,— сказаў я, сам не ведаючы, дзе тыя сляды і як іх шукаць.

Спрэчка адразу спынілася. Усе навыперадкі кінуліся да пляцоўкі, дзе раней была школа. Цяпер тут гэтак жа пяўтульна, як і на ўсёй былой Загародняй вуліцы. Крыху ніжэй ужо грукочуць бульдозеры, раўняючы пляцоўку пад новы будынак. А сюды яшчэ не дайшла чарга.

— Тут недзе павінен быць уваход у падвал,— пісклявіў Гуля, калі мы мо ўжо трэці раз абыходзілі гару цэглы, перамешанай з каменнямі і старымі дошкамі.

Усе засмучана пaглядалі на гэтую груду друзу. Няўжо яе давядзецца раскідваць?

Сяргей зрабіў рашучы крок, падняў цагліну. Вочы яго свяціліся.

— У падвал трэба пранікнуць абавязкова! Там могуць быць сляды Андрэйкі. Можа, і якая зброя знойдзецца,— натхнёна сказаў ён.

— Вось бы тады пастралялі! — адразу падхапіў Сярожа.

Але асцярожны Гуля запратэставаў супраць такога свавольства.

— Страляць няможна. Гэтак і параніць каго нядоўга,— важна сказаў ён.

— Не паранім, не маленькія,— запярэчыў Сярожа.

— А параніш — не бяда! — засмяяўся Ігар.— У нас тут паліклініка недалёка.

Ён што ні гаворыць, дык смяецца. І вочы заўсёды ўсміхаюцца, дужа ўжо неякія смяшлівыя яны. Прывычка. Як у Андрэя прывычка насвістваць сабе пад нос праз рэдкія

зубы. Ці што робіць, ці куды ідзе — усё насвіствае. Абы-што. Без ніякага складу і ладу. Вось і цяпер. Услед за Сяргеем ён нахіліўся і кідае ўбок цаглінy за цаглінай. І насвіствае.

Гледзячы на іх, і мы пакрысе захапіліся работай. Дошкі сцягвалі, а бярвенні скочвалі, наваліўшыся ўсёй грамадой, як мурашкі. Праз якія дваццаць хвілін нас нельга было пазнаць, нельга было адрозніць аднаго ад другога — так усе перапэцкаліся. Куча друзу ўвачавідкі меншала. Над пляцам стаяў такі пыл, што, здавалася, тут працуе, па крайняй меры, экскаватар. Асабліва завіхаліся, падахвочваючы адзін аднаго, Грыша і Андрэй. Мы, па-іхняму, то былі геолагамі, якія шукаюць карысныя выкапні, то вучонымі-археолагамі, то раптам сталі камандай, якая ратуе заваленых у шахце рабочых.

— Хутчэй, таварышы-ы! — крычаў Грыша Заяц.— Праз гадзіну ў іх скончыцца кісларод, і яны загінуць...

— Кіслароду хопіць яшчэ на дзве гадзіны,— папраўляў сябра Андрэй.— Але справа ў тым, што разам з кіслародам яны ўдыхаюць іншыя газы, якіх багата ў шахце. Чуеце — зусім ціха. Яны, мусіць, ужо ляжаць непрытомныя...

І дзіўная рэч. Змораныя, з паабдзіранымі рукамі, мы пачыналі працаваць шпарчэй, хоць пэўна ведалі, што ніякіх шахцёраў пад намі няма і быць не можа. І я падумаў: усё ж добра, калі людзі ўмеюць выдумляць цікава. Скажам, Сяргей. Ужо такога нагаворыць, такога іншы раз напляце, што аж галава пухне. А слухаеш — і верыш. Праўда, калі другія пускаюць сваю фантазію ў ход, то ён і сам умее паслухаць, перашкаджаць не будзе.

Я дык ніколі нічога не выдумваю. Раблю, што загадаюць, гавару толькі, што трэба, каб не маўчаць, добра памятаючы бацькаў наказ — не балбатаць пустога. І вось тут мне здалося, што ў нечым тата крышку памыляецца. Андрэй і Грыша за якую гадзіну намалолі-напляпі столькі, што другому хапіла б на тыдзень. І ўсё на карысць, і ўсё прыгожа! Няхай сабе і няма пад намі засыпаных народай шахцёраў, ды яны ўяўляюцца, хочацца іх вызваліць.

— Яшчэ гадзінка, і выратаванне прыйдзе! Пацярпіце, сябры! — папляваўшы на рукі і ўхапіўшыся на нейкую жардзіну, усклікнуў Заяц.

Недаверак Сярожа ўсё сапсаваў.

— Ніякіх там шахцёраў няма. Гэта ж звычайны падвал, як і пад нашым домам,— сказаў ён і плюнуў чорнай слінаю.— Досыць ужо гэтую атруту глытаць.

— Яшчэ некалькі хвілінак! — падбадзёрваў яго Заяц.— Мы... мы...

Грыша мыкнуў і змоўк. Спярша мы нават не сцямілі, што здарылася. І тут, зусім нечакана, як гром сярод яснага неба, прагучаў пагрозлівы голас яго маці:

— Дык вось дзе вы знайшлі сабе занятак! — Яна пляснула далонямі.— Божа мой! Каб адмыць цябе ад гэтага бруду, не хопіць і двух кавалкаў самага лепшага мыла!

Асцярожна, быццам нешта брыдкае і страшнае, яна ўзяла сына за вуха і павяла дамоў. Мы глядзелі ўслед і шкадавалі беднага Зайчыка. Сяргей нават ціхенька праспяваў: «Раз, два, тры, чатыры, пяць, выйшаў зайчык пагуляць. Раптам мама прыбягае і дадому праганяе...»

— Вось чаму ў яго гэтак вушы тырчаць! — прамармытаў Гуля.

— Выдумаеш! — абсек яго Ігар.— Выходзіць, цябе цягаюць за галаву, што вырас пад неба!..

Вядома ж, Гуля пакрыўдзіўся на свайго цёзку, але нічым не паказаў гэтага. Ён яшчэ добра памятае той дзень, калі яны пабіліся. Знак ад той бойкі, відаць, застанецца на ўсё жыццё.

Раптам Гарык неяк уважліва паглядзеў на ўсіх, быццам першы раз убачыў.

— Якія ж вы чорныя! Як негры! — са смехам усклікнуў ён і правёў левай рукой пад носам.

Зрабіў ён гэта знарок ці выпадкова, толькі ўсе мы ўбачылі, як у яго адразу выраслі чорныя вусы. Каб хацеў, такія не намалюеш.

Ігары засмяяліся. Сярожа і Андрэй адразу сталі мастакамі, накінуліся на Гарыка і пачалі размалёўваць яго твар сваімі не менш брудпымі рукамі. На лбе намалявалі рожкі, на шчоках кружочкі, а на барадзе наставілі пальцамі кропак. Гарык не пярэчыў, смяяўся разам з усімі. Ведама, самы малы. Радуецца, што пацешыў старэйшых. Неўзабаве на Гарыкавым твары чыстымі засталіся толькі рыжыя вочы. І тут мы заўважылі, што яны зусім невясёлыя.

Мы перасталі смяяцца і пагля дзелі адзін на аднаго, нібы пытаючы: «Ну, што цяпер будзем рабіць? Як мы такімі камінарамі пакажамся дома?»

— Трэба пайсці да возера і памыцца! — знайшоў выхад Сяргей.

Ён трымаў рукі разведзенымі ў бакі, каб не забрудзіць яшчэ больш свайго сіняга спартыўнага касцюма. Белыя тапачкі яго сталі чорнымі, а стрыжаная галава была прыпудрана патрушчанай цэглай.

Я паказаў на тапачкі і спытаў:

— Будзеш ваксай чысціць ці адразу выкінеш?

— А я і тапачкі намыю! — весела адказаў Сяргей.

— А я сам намыю кашулю! — пахваліўся Гарык.

— Мы ўсе намыем кашулі! — падхапіў Сярожа. Яго кірпаты нос быў не проста брудны, а чорны як вугаль. Аж сіняваты. Рукі — што дзве галавешкі. Сярожу чамусьці падабалася прыбіраць самыя чорныя цагліны, ад комінаў.

— І самі накупаемся, і ўсё перамыем,— падскокваючы на хаду, завёў, як песню, Гуля.

Мы адразу забыліся на сваіх пакутнікаў-шахцёраў, ішлі за Сяргеем і хваліліся адзін перад адным, хто лепш намые сваю кашулю. Урэшце надумалі папаласкаць у возеры і штаны. Быць чыстымі — дык чыстымі. Каб дома нават і не здагадаліся ні аб чым. Надвор'е спрыяла нашаму плану: горача прыпякала сонца, дыхаў невялікі ветрык.

Мінулі поле і, пераганяючы адзін аднаго, выбеглі на луг. Вядома, цяпер наперадзе быў Гуля. З ім ніхто не збяжыцца, нават добра натрэніраваны Сяргей. Калі глядзець збоку, як бяжыць Гуля, то здаецца, што ён не датыкаецца да зямлі.

Там, дзе ў возера ўпадае невялікі ручаёк, мы спыніліся. Гэта было самае лепшае месца. Бераг пясчаны, воддаль — хмызнячок. Мый адзежу і вешай сушыць.

Перш за ўсё вырашылі накупацца. Скінулі адзенне і рынуліся ў ваду.

Сяргей усё адыходзіў далей ад Гарыка і крычаў:

— Гаўрык! Не каламуць ваду! Каля цябе яна, як чарніла.

Каб паказаць, што вада ля яго чыстая, Гарык адразу пачаў мыць твар.

І тут хітры Андрэй непрыкметна сунуў сваю кашулю пад ваду і пачаў яе там церці і шараваць, каб справіцца раней за ўсіх, пакуль вада не стала бруднай. Пры гэтым ён, як звычайна, насвістваў праз зубы, спадзеючыся, што ніхто нічога не бачыць і ён нас абдурыць. Ды не выйшла.

Неўзабаве ўсе мы стаялі даволі шырокім фронтам уздоўж берага азярыны і шчыра працавалі. Што мы толькі не рабілі са сваімі кашулямі. Мы іх камячылі ў вадзе,

церлі, шаравалі, пляскалі імі па вадзе, выкручвалі, паласкалі і зноў пачыналі ўсё спачатку.

Потым мы развесілі адзенне сушыцца ў хмызняку, а самі леглі на траву загараць. Ды і адпачыць пасля ўсяго не шкодзіла. Каб падняць у хлопцаў настрой, я сказаў першае, што прыйшло ў галаву:

— Тут хутка будзе мора...

Здавалася, Сяргей толькі гэтага і чакаў. Ён адразу ўсхапіўся, сеў, раскінуў рукі.

— Тады мы пабудуем сапраўдны параход і паплывём у падарожжа. Я думаю, што ўрэшце наша мора злучыцца з акіянам.

— Яшчэ што прыдумай! — засмяяўся Гуля.

— І прыдумаю! Не так далёка адсюль працякае рака Бяроза. Яе злучаць каналам з возерам. Мне брат паказваў на карце. Дык вось... Бяроза ўпадае ў Дняпро, Дняпро — у Чорнае мора. Здорава, га? І мы на сваім караблі падымем высока-высока наш піянерскі сцяг...

Мы маўчалі. Мы ўжо ўяўлялі свой параход, свайго капітана, сваю каманду.

— Я за штурвалам буду стаяць! — загарэліся вочы ў малога Гарыка. Ён такі адмыўся лепш за ўсіх.

Два Ігары адразу напалі на яго:

— Ты ў падарожжа не паедзеш!

— Малы яшчэ!

— А от паеду, а от не малы! — стаяў на сваім Гарык.

— Цябе маці не пусціць...

— А от пусціць.

— Яшчэ звалішся за борт, утопішся...— Гуля падумаў і дадаў: — Потым адказвай за ўсякага там... Не возьмем.

— А я сам паеду... Пракрадуся ў трум, як вы будзеце стаяць на рэйдзе!

— Мы на рэйдзе стаяць не збіраемся,— сказаў Гуля.— Мы будзем вечна ў моры, у плаванні, бо рухавікі ў нас атамныя...

— Дзе ж мы возьмем рэактар! — спытаў Сяргей, які ўважліва слухаў спрэчку.

І сапраўды, дзе яго ўзяць? І што такое рэактар? Пра яго хлопцы толькі чулі.

— Пакуль тут будзе мора, мы ўсе станем вучонымі,— выкруціўся Ігар.

— Ага, вучонымі! — падхапіў Гуля. Цяпер абодва Ігары былі заадно. Гэткае здаралася рэдка.

І раптам хтосьці гукнуў:

— Гэй, вучоныя, вашу адзежу прымяраюць козы!

Мы азірнуліся і знямелі. Кусты, на якіх сушыліся нашы кашулі і штаны, аж варушыліся ад коз. Усхапіліся, кінуліся туды, прагналі коз... Лепш бы мы іх не праганялі! Хай бы яны з'елі нашу вопратку! Яе нельга было пазнаць. Нельга было разабраць, дзе чыё. Тут не знайшлося ніводнай белай кашулі, ніводных белых тапачак, ніводных светлых штаноў. Усё мела аднолькавы колер — шэры. Шэры, з больш-менш светлымі плямамі, з палоскамі і кропачкамі. Мы вырывалі вопратку адзін у аднаго з рук і тут жа кідалі яе.

— Гэта маё! — крычаў хтосьці.

— Маё!

— Тваё вунь дзе!

І так бясконца — тваё-маё, маё-тваё. Як мне здалося, хтосьці надзеў маю кашулю, бо тая, якую я з вялікай цяжкасцю на сябе нацягнуў, аж трашчала па швах. Рукавы былі кароткія, гузікі не зашпільваліся, каўнер тырчаў, як драўляны.

Нарэшце сяк-так разабраліся.

Ішлі дадому сумныя. Кожны ведаў, што за гэткае мыццё нам пападзе ўдвая. І мы шчыра пазайздросцілі Зайцу, якога маці збавіла ад непрыемнасцей. А больш за ўсё мы зайздросцілі Сяргейку, які збіраўся захварэць...

— Заўтра выхадны,— сказаў на развітанне Сяргей.

Гэта нас крыху суцешыла. Значыць, і ён, наш камандзір, не спадзяецца, што вырвецца на двор пасля ўсяго, што здарылася.

Мы развіталіся і разышліся.

## ПІСКУН І КАЛЯСКА МАЙГО БРАЦІКА

Калі я, Гарык, Заяц і Гуля нарэшце змаглі выйсці на пустку, каб дакапацца да падвала былой школы, то ў вішняку зноў знайшлі Пірацiка. Шчаня ляжала ў нейкай ямцы як нежывое. Гарык падняў яго і дзьмухнуў у чорны бліскучы нос. Сабачка расплюшчыў вочы, вільнуў хвастом. Ён быў такі худы, што шкура коўзалася па рабрынах, як быццам хто спадыспаду яе намыліў. Па ўсім было відаць, што Піскун галодны, ледзь жывы. Яго тонкі хвосцік зноў павіс дубцом.

— У-у, пракляты Мішка! — пагладзіў між вушэй сабачку Грыша Заяц.— Замучыў беднанькага.

— Не аддадзім яму больш нашага Піскуна! — рашуча сказаў Гарык.— Давайце схаваем яго дзе-небудзь так, каб Мішка ніколі не знайшоў.

— А дзе ты яго схаваеш? — азірнуўся навокал Гуля.— Вось калі б прабрацца ў падвал...

Мы рушылі да ўжо напалову разабранай кучы друзу працаваць, а Гарыка паслалі клікнуць астатніх і прынесці чаго-небудзь сабачку паесці.

— Сёння мама гатуе капусту з баранінай,— пахваліўся ён,— дык я яму самую лепшую костачку выцягну! А маме скажу, што сам з'еў!

Да былой школы прыйшлі ўсе, нават Сяргейка, як заўсёды, чысценькі, акуратненькі. Ён дастаў з кішэні пячэніну і паклаў яе перад Піскуном на паперку. Той пракаўтнуў пячэніну, як муху. А пасля схапіў Гарыкаву костку, на якой было, можа, з паўкіло мяса, і забурчаў. На іншыя пачастункі нават не зірнуў.

Сяргей сказаў:

— Астатняе схаваем на пасля.

Хлопцы прыйшлі хто ў чым. Апрануліся як на самую брудную работу. Вось што значыць навука!

Справа адразу наладзілася. У нас ужо быў вопыт. Не прайшло і гадзіны, як мы сапраўды дабраліся да ўвахода, які быў прыкрыты дошкамі. Іх тут, відаць, пехта паклаў знарок, калі бурылі дом. Гэта выратавала падвал ад завалу. Мы ведалі, што школа працавала ад самага вызвалення да нядаўняга часу, калі пабудавалі новую, і таму спадзяваліся на цікавыя знаходкі.

Першы па сходках рынуўся Ігар. Збег уніз і спыніўся, ісці далей не хапіла смеласці.

— Ну, што там? — спытаў Сяргей, які ўсё яшчэ адкідваў дошкі, каб пабольшыць праход.

— Цёмна, як у яме! — адгукнуўся Ігар, падаючыся крыху назад.— Нічагуткі не відно...

— Вось каб запалкі,— сказаў Грыша і, абмінуўшы Ігара, пайшоў у глыбіню падвала. Спусціўся ўніз і Сяргей, і мы следам, паручыўшы сабачку Сяргейку.

Гэта была ўрачыстая хвіліна. Агледзеўшыся ў цемнаце, Сяргей катэгарычна сказаў:

— Запалкі нельга паліць. Бачыце, колькі там паперы? Трэба знайсці ліхтарык. У каго ёсць ліхтарык?

— У нас! — крыкнуў Грыша Заяц.

Ён тут жа збегаў дамоў і прынёс цудоўны ліхтарык з новай батарэйкай.

І вось мы ў падзямеллі. Яно ўсё завалена паперай. Сшыткі і кнігі звязаны шпагатам і складзены роўнымі штабелямі.

— Вы ведаеце, што гэта? — сказаў Сяргей.— Гэта ж цэлае багацце!..

— Мы ўсё праверым! — рашуча сказаў Гуля.— Можа, даведаемся што пра Андрэйку.

Каб выявіць, колькі ўсё ж у падвале той паперы, выбралі камісію. У яе ўвайшлі Сяргей, Заяц і Гуля. Бо калі ўсе ў падвале, дык толькі замінаем адзін аднаму.

Я разам з астатнімі вылез наверх.

Тым часам наш Піскун, з'еўшы бараніну і абгрызшы костку, адразу павесялеў. Як прыкмеціў Гарык, нават хвосцік у сабачкі пачаў задзірацца ўгору.

— Мы зробім яму з гэтых дошак будку і будзем карміць кожны дзень,— гаварыў Андрэй, тыцкаючы сабачку носам у сподак з малаком.— Пі, пі, дурань! Ад малака ўсе малыя хутчэй растуць.

— А от не ад малака, а ад мяса! — заспрачаўся Гарык.— І яшчэ ад сала.

— Што каму,— паціснуў плячыма Ігар.— Я дык вельмі напраўляюся ад рознай гароднiны. Мама кажа, што ў ёй шмат вітамінаў, а яны вельмі карысныя. Бачыце, які я здаровы! — і ён пастукаў сам сябе ў грудзі.

— А мая мама...

Я слухаў і маўчаў. Пустыя спрэчкі. У горадзе вунь на кожным кроку шыльды: «Гароднiна — смачная і карысная для здароўя ежа!», «Піце кефір!», «Сасіскі...» і гэтак далей. Усё карысна, усё на здароўе.

Ды тут з'явіліся разведчыкі. Яны неслі столькі паперы, што за ёю не было відаць іх галоў.

— Дайце праход! Дайце праход! — соп, як той паравоз, Сяргей. Ён набраў больш за ўсіх.

— Уй-ю-юй, колькі-і! — здзівіўся Гарык. І мы ўсе сказалі «уй-ю-юй», падхапілі ў камісіі паперу і звалілі ў кучу.

— Там яе пудоў сто, не меней! — растлумачыў Заяц.— Пайшлі ўсе выносіць сюды.

Паперы і праўда было шмат. Уздоўж сцяны ляжалі такія цюкі, што аднаму і падняць было цяжка.

Калі па прыступкі нанасілі столькі паперы, што яе недзе было класці, Сяргей раптам пачухаў сваю стрыжаную галаву і ўголас прамовіў:

— А што, калі гэтая папера каму патрэбна? Можа, яе там хто схаваў?

— Дык... дык мы паглядзім, што тут ёсць і занясём назад,— прапанаваў Грыша Заяц. Ён тут жа разарваў тонкі папяровы шпагат, якім быў звязаны цюк.— Вось... «Сшытак па дамашніх практыкаваннях Яўсейчык Святланы»,— прачытаў Грыша.

— Нікому такое непатрэбна! — перапыніў яго Гуля.— А вось, глядзіце, класны журнал! Ну, паглядзім, як вучыліся таварышы...

— А ў гэтай Яўсейчык адны двойкі,— паведаміў Заяц і прачытаў: — «Мы хадзілі ў лес і збяралі грі-бы...» Ха-ха-ха!

Мы ўжо не слухалі Зайца. Мы, як ашалелыя, пачалі трыбушыць тыя цюкі, спадзеючыся знайсці сярод рознай непатрэбшчыны штосьці незвычайнае. Мы ўжо забыліся на ўсё, нават на Піскуна. Цюкі, цюкі, цюкі... Яны распадаліся на асобныя сшыткі і кнігі. З'яўляліся новыя. І, як на злосць, нічога цікавага не трапілася нам на вочы, а каб прагледзець усё як след не ставала цярплівасці.

— Я думаў, што хоць якую запіску пра Андрэйку знойдзем,— першы прызнаўся Андрэй і расчаравана кінуў на зямлю сшытак.

— І я таксама думаў...

Я паглядзеў на Сяргея, які сказаў гэтыя словы. Шчыра кажучы, і я спадзяваўся, што хоць адзін чалавек ды ўспомніць у сваіх хатніх заданнях пра таго, хто ў гэтай школе калісьці пачаў барацьбу з захопнікамі і загінуў.

— Што цяпер будзем рабіць? — ціха спытаў Сяргейка.

— Дзе Піскун?! — крыкнуў у адказ Ігар.— Эх, разявакі! Забыліся... Шукай цяпер ветру ў полі... Цю-цю-цю! — паклікаў ён.

Але сабачка не абазваўся.

— Знойдзем! — упэўнена сказаў Сяргей.— Нікуды ён далей тых вішанек не пабяжыць.

І праўда, як і гаварыў Сяргей, Піскун быў у той самай ямінцы ля вішань, дзе мы яго знайшлі.

— Чакае ён тут каго, ці што? — спытаў Гуля, беручы Піскуна на рукі.— Хворы ён, ці што? Можа, аб'еўся?

І пайшоў, і пайшоў. Пытанне за пытаннем. Калі б Сяргей яго не спыніў, ім, напэўна, не было б канца.

А як вярнуліся назад, да падвала, Сяргей сказаў:

— Трэба будзе ўстанавіць дзяжурства ля яго. Каб зусім, чаго добрага, не збег. Ты падзяжурыш сёння, Зайчык?

— Сёння — не,— пакруціў галавою Грыша.— Сёння

будзе дзяжурыць Сяргейка, бо паперу назад ён усё роўна пасіць не зможа.

— Добра, я падзяжуру,— ахвотна згадзіўся Сяргейка.

— Хлоп-цы-ы! — раптам закрычаў Сяргей.— Во — ідэя! А навошта нам паперу цягаць назад? Яе можна здаць і добра зарабіць. Я ведаю, куды трэба несці.

Гэтую прапанову падтрымалі ўсе. Здаць і купіць марожанага!

Тут жа набралі поўныя ахапкі паперы і рушылі за Сяргеем, які ведаў, дзе знаходзіцца прыёмны пункт. Але далёка мы не прайшлі. Папера цяжэла з кожным крокам. Яна распаўзалася, выслізгвала з рук, як жывая.

— Не, так не данясём,— сказаў Сяргей і кінуў паперу на зямлю.— Трэба нешта прыдумаць. Дарэмна мы распакоўвалі цюкі.

Мы спыніліся, пакідалі свае ношы ў адну кучу і пачалі думаць. Але нічога пэўнага не прыходзіла ў галаву. Былі розныя прапановы. Хто раіў збегаць дадому і прынесці сетачкі-авоські. Але ў іх дома носяць хлеб, а папера брудная, так нельга. Гэта мы цяпер разумелі. Нехта параіў пашукаць дзе-небудзь мяшкоў. Ды дзе ты іх знойдзеш! Гарык прапанаваў паздымаць майкі, завязаць унізе шпагатам і пакладаць туды сшыткі і кнігі.

Мы моўчкі пераглянуліся. Усе адразу ўспомнілі, як мылі свае кашулі. Ці не паўторыцца тое ж з майкамі?

Можна было б пашукаць тыя шпагаціны, якімі былі звязаны цюкі, але для гэтага давялося б перарыць усе, як казаў Грыша, сто пудоў паперы.

І тут мне, можа, упершыню прыйшла ў галаву шчаслівая думка. Гэта была ідэя, да якой я дайшоў сваім розумам.

— Ведаеце што? Я прыцягну каляску! — палохаючыся ўласных слоў, выпаліў я і сам здзівіўся такой смеласці.

Як прыцягну? Што скажу дома? Ці дазволіць мама? Пра гэта я не думаў. Галоўнае, я ўспомніў, што ў мяне ёсць маленькі брацік. Такі маленькі, што ўсё яго жыццё звязана з той каляскай. Толік у ёй спаў, гуляў, еў. На высокіх колах, з цыратовым адкідным верхам, каляска магла змясціць усю тую паперу, якую мы цяпер неслі здаваць.

Хлопцы зарадаваліся і пачалі мяне хваліць кожны пасвойму.

Заяц проста ўсклікнуў:

— Правільна, Пакроп! Цягні каляску.

Ігар ляпнуў мяне па спіне так, што я аж угнуўся.

— Малайчына! — сказаў ён.

Андрэй ушчыпнуў мяне за бок і зазначыў:

— У такой справе шкадаваць нічога не трэба!

— А я і не шкадую,— сказаў я, а сам падумаў: «Хітранькі! У самога таксама дома каляска ёсць».

— Бяжы па каляску,— згадзіўся і Сяргей.

Чым бліжэй падыходзіў я да нашага дома, тым павольней станавіліся мае крокі. У нагах адчувалася нейкая млявасць. На свой паверх я ледзь падняўся. Адчыніў дзверы і адразу прайшоў у малы пакойчык, дзе заўсёды стаяла каляска.

Раскінуўшы ружовыя ручкі, у ёй соладка спаў Толік. Што рабіць? Маці — я гэта прыкмеціў па дарозе — на кухні штосьці смажыць.

Як гэта заўсёды бывае, за адной ідэяй прыходзіць другая. Я зняў са свайго ложка ватовую коўдру і падушку, акуратна паслаў на падлозе. Потым асцярожна выцягнуў з каляскі брацікa разам з яго падсцілам-гняздом. Ён нават не чмыхнуў.

Потым, як злодзей, ціхенька пакаціў каляску за дзверы. І тут маё сэрца ёкнула.

— Пракопік,— пачулася з кухні.— Можа б, ты што з'еў?

— Не-е! Я нічога не хачу,— хуценька адказаў я. А потым зноў загаварыў, бо гаворачы смялей каціць каляску, не чуваць яе грукату.— Вось хутка прыйду — тады і з'ем чаго-небудзь. Усё, што ні дасі, з'ем. Да апошняга каліўца...

Каляска апынулася за дзвярамі. Яна лёгкая. Узняў над галавой і скаціўся ўніз. А на двары так ірвануў, што толькі пыл закурэў.

— Вось! — засопшыся, перадаў я хлопцам каляску.

Каб праверыць яе трываласць, даўгалыгі Гуля падскочыў угору і гэпнуўся на сядзенне. Каляска скрыгатнула пружынамі, захісталася, але ўтрымала.

— Кладзі-і! — скамандаваў Заяц, і ў каляску паляцеў наш груз.

Сяргей ціха, каб не чулі хлопцы, спытаў:

— А не нападзе табе?

— Не-е!

— Ну, калі так...

І Сяргей таксама пачаў шпурляць у каляску паперу. Наклалі пад самы верх. Ехалі асцярожна, бо адна вось адразу скрывілася і колы пачалі віхляць у бакі.

Другі рэйс зусім дакапаў «хатку» майго брацікa. Яна

ўжо не калілася па колах, а сунулася. Скасабочаная, перакрыўленая, каляска жаласліва рыпела, нібы прасіла літасці. Я глядзеў на яе, і сэрца маё сціскалася ад нядобрых прадчуванняў.

— Будзе табе, Напрок! — нібы пачуў мае думкі Сярожа і тыцнуў брудным кулаком сабе пад нос. Ну, што за паганая прывычка ў чалавека. І так нос бульбінай...

Ігар засмяяўся:

— Хі-хі-хі! Яшчэ як нападзе!

Дурны смех. Ды такі ўжо Ігар — з усяго смяецца. Нават з таго, што зусім не смешна.

Адзін малы Гарык паспачуваў:

— Калі б мы здалі ўсю паперу, то купілі б новую каляску, яшчэ лепшую.

— Во — ідэя! — усклікнуў Сяргей.— Мы здадзім усю паперу і абавязкова купім Пакропу для брацікa педальную машыну!

Яго прапанова ніколечкі мяне не парадавала. Моўчкі падхапіўшы каляску пад воські, я падаўся да свайго дома.

## КАНЕЦ АДНОЙ ГІСТОРЫІ І ПАЧАТАК ДРУГОЙ

Калі я адчыніў дзверы, то пачуў у меншым пакоі шумную гамонку. Там былі тата, мама і некалькі суседак. Стаіўшыся, я прыслухаўся.

— Толічак прачнуўся і запоўз пад ложак,— расказваў тата.— Мы яго адтуль цягнем, а ён крычыць, упіраецца. Спадабалася яму там!

— І куды гэта хлопец каляску сцягнуў — розуму не дабяру,— гаварыла маці.

— Гэткага яшчэ ніколі не было,— сказаў тата.

Я грукнуў дзвярыма і апусціў каляску на падлогу. Няхай глядзяць. Я не баюся.

— А вось і ён! — выглянуў з пакоя тата.— Лёгкі на ўспамін, доўга жыць будзе.

Спачатку ўсе моўчкі пазіралі на мяне, як на якое дзіва. Я таксама маўчаў: «Паглядзім, хто каго перамаўчыць». Тата асцярожна, як да якой міны, падышоў да каляскі, пакратаў яе рукою.

— Божа! — усклікнула мама і пляснула далонямі.— Што з яе стала!

— А была неблагая рэч! — чамусьці весела сказаў тата і зрабіў крок да мяне.— На якім гэта фронце ты змагаўся?

Я ўпарта маўчаў. І толькі калі суседкі пайшлі, расказаў усё як ёсць. Маці пляскала ў далоні і войкала, а тата слухаў вельмі ўважліва. Потым паказаў на каляску і павучальна пачаў:

— Вось бачыш... Шкоды атрымалася больш, чым карысці. Таму што не раіцеся з дарослымі, а ўсё самадумам. Так у нас з табою справа не пойдзе. Каляску я паладжу, але скажы, што рабіць з табою?

Як быццам ён не ведаў, што са мною рабіць. Аднойчы, помню, я нейкую вазу разбіў, дык тата збіраў у вядро чарапкі, а маці старым цыратовым рэменем нарабіла поўную хату пылу. Перад гэтым я гуляў з хлопцамі ў футбол і стаяў, як заўсёды, на варотах...

На гэты раз бацька зліtаваўся.

— Адлупцаваць цябе — сорамна неяк, вялікі ўжо,— сур'ёзна сказаў ён.— Самае лепшае — пакараць хатнім арыштам. І набалей даваць рознай работы, каб не лезла ў галаву ўсялякае глупства. Спярша ідзі на балкон і пачысці нам увесь абутак. Усё роўна табе ў ванну трэба.

Пад дамашнім арыштам я прабыў рэшту дня і ўсю суботу. За гэты час да мяне, вядома, наведваліся хлопцы. Але іх далей парога не пускалі.

Калі нарэшце я вырваўся на двор, сябры адразу ж павялі мяне да свайго падвала.

За сходкамі, на невялікай пляцоўцы, была ўжо збудавана будка. Ля яе на пахучым сене сядзеў Піскун, прывязаны да будкі кароткай аборынай. На гнілаватых дошках валяліся скарынкі хлеба, кавалачкі сыру і абгрызеныя косткі. У алюмініевай місцы было трохі малака. Сабака, як здалося мне, пасыцеў. Цёмна-бурая поўсць яго аж блішчала. Хвост шабляй загінаўся ўгору.

Калі мы апынуліся ў падвале і Сяргей уключыў ліхтарык, я ўсклікнуў:

— А дзе ж папера?!

— Той лысы Люцік вывез! — са злосцю адказаў Сяргей.— На другі ж дзень.

— А хто бачыў?

— Дзядзька Харытон. Ён жа заўсёды прыбірае двор, калі мы яшчэ спім.

— У-у, жадзюга! Столькі папацелі, пакуль дакапаліся. А ён забраў гатовенькае,— абурыўся я.

— Гатовенькае, як дурное,— падхапіў Гарык. Гэта, вядома, былі не яго словы.

— А мы нештачка яшчэ тут знайшлі! — здзівіў мяне Гуля.

Сяргей асвяціў ліхтарыкам нейкія дзверцы ў сцяне, адчыніў іх і выцягнуў сінюю пляшку з-пад чарніла. У пляшцы была паперка з трыма словамі: «Эдуард Пярун — здраднік». Словы былі напісаны хімічным алоўкам, і хлопцы «праявілі» іх вільготнай анучкай. Усё было ясна. Вось толькі яны не ведалі каму паказаць гэтую паперку.

І тады я прапанаваў:

— Аддадзім яе дзядзьку Харытону.

Не паспеў я дагаварыць, як знадворку пачуўся хрыплаваты голас:

— Брацікі-салдацікі, вы ўжо тут?

— А от і дзядзька Харытон,— сказаў Сярожа.— Пайшлі!

Як толькі мы падняліся наверх, дзядзька Харытон — ён толькі што кончыў падмятаць двор — дастаў з кішэні хусцінку і выцер Сярожу нос і шчаку.

— Бачыш, які ў цябе твар? — паказаў ён усю ў курадыме хусцінку.— Калі ўжо ты будзеш хадзіць чысты?

— Н-не ведаю,— разгубіўся той.

— А я ведаю,— адказаў дзядзька Харытон.— Ты будзеш хадзіць чысты тады, калі пачнеш трымаць у чыстаце рукі. А пакуль яны ў цябе вечна брудныя, адвыкай хоць ад прывычкі церці нос і шчокі. Памятаю, Андрэйка заўсёды хадзіў чысценькі, нават у тыя цяжкія часы...

Пры гэтых словах наперад выпхнуўся, нібы незнарок, наш Сяргейка.

— Як ён вось,— пахваліў Сяргейку дзядзька Харытон.

Сяргейка засаромеўся і, мабыць, падумаў, што не варта яму было лезці наперад. Каб апраўдацца, хуценька скорагаворкай выпаліў:

— Мы тут у падвале знайшлі нейкую паперку. Была схавана ў пляшцы.

— Якую паперку? У якой пляшцы? — зацікавіўся дзядзька Харытон.

— У пляшцы ад чарніла,— цяпер наперад вылез Гуля.

Мы паказалі паперку.

Дзядзька Харытон надзеў акуляры, прачытаў яе і зусім не здзівіўся. Хаваючы акуляры зноў у кішэню, ён сказаў:

— Гэта, хлопчыкі, даўно вядома. Толькі вось, дзе ты яго знойдзеш, здрадніка. Каб жа хоць у твар хто яго ведаў...

— А хто мог напісаць гэтую запіску? — раптам спытаў наш самы малы таварыш.

Вельмі правільнае пытанне — хто? Мы ўжо не раз заўважалі, што Гарык часам выказвае вельмі цікавыя думкі. Вось табе і малы.

Гарыкава пытанне прымусіла дзядзьку Харытона задумацца.

— Хто? — як бы спытаў ён у нас.

— Можа, Андрэйка? — падказаў Сяргей.

— Не, яго почырк я ведаю добра. Ды і адкуль Андрэйка мог што-небудзь знаць пра нейкага Эдуарда Перуна?

На ўсякі выпадак дзядзька Харытон узяў паперку, паабяцаўшы нам, што, калі дазнаецца, хто яе напісаў, то абавязкова прыйдзе і скажа.

— А вы нам раскажыце цяпер, як Андрэйка загінуў,— папрасіў Гарык.

Мы аж зазлавалі на яго. Малы, а забягае наперад. Тут жа, здаецца, ёсць старэйшыя.

— А як жа! — ахвотна згадзіўся дзядзька Харытон.— Раскажу. Я ж абяцаў. Толькі пачакаем журналіста.

Чакаць доўга не давялося: чарнявы мужчына ў сінім касцюме ўжо ішоў да нас па яшчэ незабудаванай вуліцы. Ён прывітаўся з усімі за руку, як даўні знаёмы, і, зірнуўшы на сонца, весела сказаў:

— Ану станавіцеся ўсе ля куста! На гэтым фоне выйдзе добры здымак на памяць.

Стаць было не так проста. Кожны пнуўся наперад, і таму карэспандэнт расставіў нас сам. Дзядзька Харытон быў якраз пасярэдзіне, а злева ад яго — так захацеў карэспандэнт — пакінулі крыху свабоднага месца.

— Сюды не лезце, тут я стаю! — смеючыся, сказаў ён. Затым скамандаваў: — Увага, здымаю! — і нацэліўся фотаапаратам.

У гэты час забрахаў Піскун.

— Давайце і яго! — усклікнуў Сяргей і кінуўся ў падвал.

Піскун глядзеў з яго рук на ўсіх так весела, што мы заўсміхаліся. Такімі ўсе і выйшлі пасля на здымку.

А потым, калі сфатаграфаваліся і мы панеслі сабачку назад у падвал, дзядзька Харытон і карэспандэнт спусціліся следам за намі.

— Гэта яны дакапаліся да падвала, шукаючы сляды Андрэйкі,— гаварыў дзядзька Харытон. Ён паказаў, дзе была зброя, яшчэ раз паўтарыў расказ пра тое, як яе потым вывозіў. І ўрэшце падаў карэспандэнту нашу паперку.

Той доўга разглядаў яе, потым вярнуў назад.

— Запісцы не больш як дзесяць — пятнаццаць год,— сказаў ён.— Гэта відаць па колеру паперы. Хутчэй за ўсё яе напісалі такія ж хлапчукі, як вось яны,— паказаў на нас карэспандэнт.

— Але ж недзе тыя хлапчукі ўзялі гэтыя словы,— запярэчыў дзядзька Харытон.

Карэспандэнт узяў з Сяргеевых рук ліхтарык і прайшоў да пачарнелай сцяны. Светлы зайчык забегаў па ледзь прыкметных літарах, надрапаных на сцяне.

— Вось вам і арыгінал! — урачыста прамовіў карэспандэнт.

Мы зірнулі і прачыталі: «Эдуард Пярун — здраднік».

От гэта адкрыццё! Мы гатовы былі за локці сябе кусаць, што не першыя заўважылі самае галоўнае і цікавае. Запіс на сцяне быў арыгіналам. Значыць, яго ўжо напэўна напісаў...

— Гэта магла быць рука майго Андрэйкі,— расчуліўся дзядзька Харытон, пільна ўглядаючыся ў літары.

— Так... Магла быць... Усё гэта было...— у задуменні прагаварыў карэспандэнт.— Раскажыце нам, Харытон Іванавіч, што здарылася з Андрэйкам пасля?

— А як жа... Раскажу. Хадземце наверх,— заспяшаўся дзядзька Харытон.

Неўзабаве мы зноў сядзелі хто дзе папала і слухалі канец гісторыі.

Вось ён.

...Паліцай Грыц Пярун, які жыў пры школе, аб чымсьці здагадваўся. Да яго іншы раз забягаў і нават часам заставаўся начаваць нейкі падазроны тып у доўгім рудым шынялі без пагонаў і ў зялёнай вайсковай шапцы. Чорныя акуляры, высока падняты каўнер шыняля хавалі яго твар ад людзей.

Неяк пад вечар паліцай сустрэў дзядзьку Харытона каля школы.

— Зайдзі на хвілінку да мяне,— загадаў ён.

— Няма калі, спяшаюся дадому,— адчуўшы нядобрае, паспрабаваў адгаварыцца Харытон.

Паліцай усміхнуўся:

— А ты не спяшайся. Вайна толькі пачалася... Трэба памагаць здабываць перамогу...

Харытон спытаў нібыта зацікаўлена:

— Каму?

— Тым, хто дае працу і хлеб.

— Калі і праўда, што нехта дае працу і хлеб, то варта пагаварыць.

Як толькі дзверы за імі зачыніліся, паліцай крута павярнуўся да Харытона і спытаў:

— Ты чаму гэта з такой ахвотай узяўся за брудную работу?

— Бо цяпер зручна, я ж гаварыў,— адказаў Харытон.— Школа пустуе, а коміны даўно не чышчаны. Калі давядзецца зноў паліць у грубках, дык яно смялей будзе...

— Смялей? — яхідна ўхмыльнуўся Грыц Пярун.— А ты чалавек смелы?

— Ды як сказаць...

— Не ведаеш, як і сказаць? Падумай. Да мяне працаваць пойдзеш? Памагаць, каб усё вакол трохі відней было. Удвух — не адзін.

— Вось да цябе-то я не пайду, не мая спецыяльнасць. Лепш коміны чысціць,— рашуча прамовіў Харытон і хацеў выйсці, але паліцай затрымаў яго.

— А хто ў стаяку цагліну даставаў? І для чаго? Хто яе зноў так прыладзіў, што я ледзь знайшоў? І яшчэ адно. Там, на полі, куды ты вывез сажу, я знайшоў вось гэта. Што ты цяпер скажаш, нясмелы камінар?

Пярун паклаў на стол тры аўтаматныя патроны.

Харытон зразумеў: трэба выкручвацца. Інакш правал.

— Дык пойдзеш цяпер да мяне ў памочнікі, га? — зноў здзекліва ўхмыльнуўся паліцай.— А то я магу расказаць каму трэба, куды знікла тая зброя.

— Ніякай зброі я не ведаю,— пачаў Харытон, але Пярун груба перабіў яго:

— Маўчаць, партызан! Затое я ўсё ведаю. У мяне ёсць спіс тваіх таварышаў. Ён ужо там... Ясна табе ці не? І не для таго я цябе пераняў, каб упрошваць. Мне вядома, што на гэтай вуліцы збіраюцца твае памочнікі. Што ты і хлопец, які хадзіў з табою ў школу, схавалі зброю, а потым забралі. Што... што... Што ты?! Ой, не трэба так, таварыш Пракопчык. Я жартую...

Тут бялявыя вочы паліцая ад страху ледзь не выскачылі на лоб: у грудзі яму ўперлася дула чорнага нямецкага пісталета.

— Так, я партызан. І зброя ў мяне. А ты задужа многа ведаеш, паганец,— ціха, але цвёрда прамовіў Харытон.

— Але ж я пра цябе нікому нічога не казаў. Прымі гэтую цацку. За мною сочаць, ты не выйдзеш адгэтуль...

Гэта былі апошнія словы здрадніка. Прагучаў прыглушаны стрэл.

Новенькі карабін, што стаяў у куце, таксама зброя. Захінуўшы яго ў коўдру, якой быў засланы ложак паліцая, Харытон адчыніў дзверы і выглянуў на вуліцу. На ёй — ні душы. Значыць, хітры Пярун проста палохаў. Але і спадзявацца на цішыню нельга. Фашысты драмаць не будуць. Дый можа прыйсці той тып у рудым шынялі...

Так разважаючы, Харытон паволі ішоў дадому. Хоць нікога і не відаць, але спяшацца не варта, бо, калі хто трапіцца і заўважыць, як ён узрушаны... А тут яшчэ карабін у коўдры. Харытон стараўся здавацца спакойным, а думкі адна за другой скакалі ў галаве. Трэба як мага хутчэй папярэдзіць усіх... Дома самае неабходнае, па ўсякі выпадак, даўно сабрана. Пара падавацца ў лес.

Толькі на сваім двары Харытон заспяшаўся.

— Збірайцеся! — крыкнуў ён з парога.— Нас высачылі. Я забіў Грыца... Андрэйка! Хуценька бяжы і перадай нашым, каб ішлі да мяне са зброяй!

Сваіх Андрэйка ведаў. І ведаў, дзе хто жыве. Гэта былі людзі, з якімі дзядзька Харытон падзяліўся зброяй.

На шчасце, усе былі дома. Так што праз якую гадзіну ў Харытона сабраўся як бы невялічкі атрад. Пакуль збіраліся і раіліся, Андрэйка дзяжурыў на дарозе. Ён павінен быў падаць сігнал, калі б заўважыў якую небяспеку. Сігнал просты: падкінуць угору шапку, нібы гуляючы. За Андрэйкам назіралі з хаты, у якой цяпер былі толькі мужчыны. Астатнія з клункамі пайшлі ўніз, нібыта на рэчку мыць бялізну.

Паволі ідучы па вуліцы, Андрэйка і не заўважыў, як апынуўся ля школы. А калі схамянуўся, было позна: з-за павароту вуліцы выскачыў невялікі грузавік з дзесяткам узброеных людзей. Ён каціў проста да школы.

Андрэйка падкінуў угору шапку і шмыгнуў за рог школы.

...— Мы пачулі выбух, калі ўжо збеглі ў лагчыну, дзе пачынаўся хмызняк,— скончыў расказ дзядзька Харытон.— Потым да нас данеслася страляніна, і ўсё сціхла. На дамоўленае месца Андрэйка не прыйшоў. За намі па-

гоні не было, бо, як мы пасля даведаліся, Андрэйкава граната трапіла ў самы кузаў машыны. Трое забітых, астатнія паранены — такі быў яго першы і апошні лік... Гэта здарылася вось тут, па вуліцы...

Дзядзька Харытон змоўк, а мы, як адзін, паглядзелі ў той бок, куды ён паказаў. Якая цяпер тут вуліца! Пустка!

— Больш вы нічога не ведаеце пра тыя падзеі? — ціха спытаў карэспандэнт, па якога мы ўжо забыліся. Ён кожны раз выбіраў месца дзе-небудзь збоку, каб быць непрыкметным.

— Амаль нічога,— адказаў дзядзька Харытон.— Праўда, хадзілі чуткі, што машына ішла да мяне па данос, што ў ёй ехаў той невядомы ў чорных акулярах, як я думаю, Эдуард Пяруп, але гэта ўжо іншая гісторыя, на жаль, неразгаданая...

— Чаму ж іншая? Вось ён, той данос! — усклікнуў журналіст і паказаў невялічкую рудую паперку.— Данясенне роднага брата паліцая Грыца. Толькі часу прайшло шмат — дзе яго цяпер знойдзеш, таго брата.

— Так, часу мінула шмат. Але нішто і ніхто не забыты. Ні мой большанькі, які загінуў пасля ў блакадзе, ні Андрэйка...

— ...які зрабіў усё, што мог, каб прыкрыць ваш адыход! — падхапіў карэспандэнт.— Ён трымаўся, як мог. Уявіце сабе — схапілі параненага, дапытвалі. А потым... Колькі жаху давялося яму перажыць потым!

— Не-не,— пакруціў галавою дзядзька Харытон.— Яго, напэўна, забілі адразу.

— Маглі і не забіць.

Дзядзька Харытон пільна паглядзеў на карэспандэнта.

— Няўжо? — ледзь чутна спытаў ён.— Няўжо вы што-небудзь ведаеце пра яго?

— Крыху ведаю. Сляды засталіся. Як вы не раз казалі — рэха далёкіх часоў. Яно заўсёды вяртаецца да таго, хто гукнуў.

— Гэта праўда. Дык раскажыце вы...

— Добра,— адразу згадзіўся журналіст.— Раскажу, але крышку пацярпіце, як-небудзь пасля. А цяпер пройдзем да вас, бацька, нам трэба параіцца наконт вельмі цікавай справы. Тут аднаго чалавека пакрыўдзілі...

— Пойдзем.— Дзядзька Харытон не зводзіў вачэй з журналіста.

Мы паўсхопліваліся са сваіх месц, абступілі іх і наперабой пачалі пытацца:

— Фашысты злавілі Андрэйку?
— Ці жывы ён?
— Такія, як Андрэйка, не паміраюць,— упэўнена сказаў Сяргей.

Але гэта нас не задаволіла. Мы ўсе ведалі, што пра герояў, нават пра тых, якія загінулі, гавораць так, як пра жывых.

Зноў пашанцавала Гарыку, хоць гаварыў ён цішэй за ўсіх.

— Дзядзечка,— спытаў ён,— а пасля Андрэйка ўцёк ад фашыстаў?

— Пасля ўцёк,— адказаў карэспандэнт.— І яшчэ звёў на той свет не аднаго гітлераўца.

— Я так і думаў! — задаволена выдыхнуў Гарык.

Дзядзька Харытон сказаў, каб мы адчапіліся, не тлумілі чалавеку галавы. Мы паслухаліся і адышліся.

А яны, аб нечым ціха размаўляючы і ўжо, відаць, забыўшыся на нас, рушылі па вузкай сцяжынцы, што вяла да нашых дамоў.

## ПРЫЙШЛА БЯДА

— От здорава! — першы апамятаўся Грыша Заяц.— Андрэйка кінуў гранату. От малайчына!

— Бо ён смелы,— сказаў расчулена Гарык.— Ён сапраўдны герой. Пра яго калі-небудзь гэты журналіст усёўсё напіша. Нездарма сюды ходзіць...

Гуля прамармытаў нібыта сам сабе:

— І я смелы.

— Я таксама кінуў бы гранату ў фашыстаў,— проста сказаў Сяргей.

І мы яму паверылі больш, чым Гулю. Такі, як Сяргей, кіне, не задумаўшыся.

За Сяргеем шпурлялі гранаты ў ворага і мы ўсе, за выключэннем Сяргейкі. Ён шчыра, ледзь не са слязьмі на вачах прызнаўся, што не ўмее далёка кідаць, але з гэтага дня пачне трэніравацца, каменняў тут хапае. Цэлую гадзіну гаварылі мы пра сваю смеласць, адвагу і знаходлівасць, а потым падаліся на двор. Услед нам пачулася жаласлівае скавытанне. Гэта наш непаседа Піскун не хацеў заставацца адзін. Мы спыніліся і паглядзелі назад.

— Давайце возьмем,— жаласліва прапанаваў Сяргейка.— Ён такі разумны, такі харошы.

— А Мішка-дубец,— кіўнуў убок Ігар, і яго смяшлівыя вочы сталі занепакоенымі.

Сяргей махнуў рукой:

— А-а, возьмем! Мішка ж сам адрокся ад Піскуна. А будзе чапляцца, скажам дзядзьку Харытону.

Адным словам, Піскун атрымаў волю. Нам з ім было весялей. Ён скакаў вакол нас ад радасці, стараючыся кожнаму лізнуць руку.

Сяргей пажартаваў:

— Цяпер Сярожу не трэба мыць рукі, Піскун выручыць.

Мы засмяяліся, а Сярожа пакрыўдзіўся.

— Я ўжо больш не тру кулаком нос,— хаваючы рукі ў кішэні, сказаў ён.

— А куды ж яго больш церці? — засмяяўся Грыша Заяц.— Ён у цябе і так як бульбіна.

— А ў цябе вушы маці адцягнула! — не стрываў абразы Сярожа.— Таму і доўгія.

Адчувалася, што можа пачацца сварка, а ад сваркі недалёка і да бойкі. Мне гэта не спадабалася.

— Калі вы будзеце спрачацца, я пайду дамоў,— рашуча прамовіў я.

— Пракоп кажа праўду. Нам цяпер, як ніколі, трэба згуртавацца разам. Можа, давядзецца весці бой з Мішкам,— падтрымаў мяне Сяргей.

— А вунь, глядзіце, Люцік на балкон выйшаў! — папярэдзіў усіх Гуля.

— У-у, шпіён пракляты! — Вочы ў Гарыка пацямнелі.— Вечна цікуе за намі. Хоць на двор не выходзь.

І трэба ж было, каб у гэты самы момант, як на тое ліха, проста перад намі, узняўшы поўсць дыбам, прабег паласаты, як тыгр, шэры коцік. Піскун гаўкнуў і з усіх ног прыпусціў за ім. Коцік шмыгнуў у кветнік, сабака — следам. А за сабакам — Гарык.

У гарачцы Гарык, пакуль злавіў Піскуна, крыху патаптаў кветнік, а адну галінку ружы зламаў зусім. Але ката ён не ўратаваў. Шэры клубочак джгаў да пад'езда, неяк смешна падскокваючы і трасучы галавою. З левага вуха, разарванага вострымі зубамі, капала кроў...

Тут вось і здарылася самае страшнае.

— Ну-у-у, жукі каларадскія!!! — на ўвесь двор раўнуў лысы Люцік.— Дагуляліся! Цяпер вы ўжо адкажаце за ўсё-о-о! Вы і вашы бацькі, якія, замест таго, каб трымаць вас у руках, каб выхоўваць як належыць, дазваляюць ва-

лэндацца абы-дзе і рабіць абы-што-о! І гэта, называецца, наша змена! Ніякая вы не змена, жукі-і-і...

І так — без канца.

Мы стаялі як слупы і маўчалі. Толькі неразумны Піскун, які вырваўся ад Гарыка, стаў насупраць балкона, задзёр галаву і адбрэхваўся адзін за ўсіх.

— За кветнік і за ката я падам у суд! Я напішу ў газету, што ў гэтым доме нельга жыць!..

Доўга яшчэ крычаў разгневаны Люцік. І як толькі яму не абрыдне вечна лаяцца? «Напішу, напішу...» Няўжо яму няма чаго больш рабіць? Сядзеў бы сабе ды чытаў газеты. Дык не! Усё ў акно глядзіць. Усё непарадкі вышуквае. Жыць ён не можа без гэтых непарадкаў. Цяпер ужо напіша абавязкова. Слоўцы ў яго гладзенькія і кругленькія, як цукерачкі. Толькі іх не праглынеш. Так гаварыў Гарыкаў тата.

Першы апамятаўся Сяргей. Ён падбег, схапіў Піскуна і кінуўся з ім за дом. Мы — следам. Сабраліся ля вялізнай ямы, з якой бралі пясок на будаўніцтва, і пачалі абмяркоўваць становішча. Цяпер языкі ў нас працавалі, як малатарні.

— Вось што! — першы ўзяў слова Гуля.— Давайце самі напішам, што Люцік не дае нам жыць на свеце, што ён вельмі едкі, гэты люцік!

— І паўзучы! — падхапіў Андрэй і тут жа нешта засвістаў.

— Не,— асадзіў іх Сяргей.— Мы павінны думаць не толькі аб сабе. Гэты лысы добрая цаца! Мой тата гаварыў, каб мы яму наогул не адказвалі. І не звярталі ўвагі на яго. Няхай крычыць, хоць трэсне, а мы быццам і не чуем. Вось як мы павінны рабіць...

Андрэй перастаў насвістваць і ціха, быццам раячыся сам з сабою, сказаў:

— І ўсё ж яго трэба правучыць!

— Як ты яго праву-учыш? — працягнуў Ігар.— Ён жа ўсюды ходзіць, нагаворвае...

— І мы пойдзем! Каму хутчэй павераць — аднаму чалавеку ці калектыву?

— Ён жа даро-ослы,— цягнуў сваё Гуля.— Праўда, нам нельга пісаць. А то яшчэ горш будзе.

І раптам Сяргей прапанаваў:

— Трэба нацкаваць на яго, як сабаку, Мішку-дубца.

— Нацкуеш яго,— махнуў рукою Сярожа.— Яны ж, як брацікі, не сварацца.

— Нічога,— запэўніў Сяргей.— Мы скажам яму, што Люцік хоча Пірацікa звесці са свету.

— І яшчэ нештачка,— падхапіў Гарык.— Што Люцік хоча напісаць на Мішку ў міліцыю, бо ён нідзе не працуе...

Так мы марылі адразу расправіцца і з Люцікам і з Мішкам. Колькі б мы яшчэ пра іх гаварылі — невядома, але тут нашу ўвагу прыцягнулі высокія экскаватары, якія ішлі ў канец лугу, да моста. Яны з ходу пачалі дзёўбаць насамі ў мурог каля рэчкі. Адны сыпалі зямлю ў машыны, другія — проста на дарогу.

— Гэта будзе мора! — радасна закрычаў я.— Глядзіце, яны насыпаюць дамбу! Потым яе зацэментуюць і перакрыюць рэчку. Там працуе мой тата...

— Ну і што? Не так усё хутка робіцца, як гаворыцца,— перабіў мяне Сярожа.

Злосці на яго не хапае. Усё яму не так ды не гэтак, нікому не верыць.

— А от хутка! — запярэчыў я.— Тата казаў, што ў гэтым месяцы перакрыюць, бо ўсё ўжо гатова. Бачыце — хаты на тым баку азярыны знеслі? Знеслі. Хмызняк высеклі? Высеклі. Застаецца адна дамба... І тады будзе мора.

— Пакуль будзе мора, а ў нас цяпер гора,— вярнуўся да гаворкі Сяргей.— Давайце што-небудзь рабіць.

— Дык усё ўжо дамоўлена,— адказаў Сяргейка.— Пойдзем і нацкуем Мішку-дубца...

— А можа, лепш узяцца за работу? — параіў Заяц.

— Вось-вось,— ухапіўся за гэтую думку Сяргей.— Ты будзеш збіраць на двары паперкі, а мы надправім кветнік, каб Люцік не паказаў каму-небудзь яго патаптаным. Загладзім сляды і пальём. Пайшлі!

Працаваць дык працаваць. Урэшце ніхто гэтую работу за нас не зробіць.

Піскуна адвялі ў падвал, прывязалі да будкі.

Калі мы зноў з'явіліся на двары, Люціка на балконе не было.

— Заявы піша! — засмяяўся Ігар.

Але, збавіўшыся на час ад аднаго ворага, мы не збавіліся ад другога. Толькі гэта Грыша Заяц пазбіраў па двары ўсё смецце ў кошык, як мы ўбачылі ў паветры цэлую хмару маленькіх паперак. Яны сыпаліся, як лістоўкі з самалёта. З акна пятага паверха іх кідаў Мішка-дубец. Падхопленыя ветрам, паперкі разляцеліся па ўсім двары.

— Гэй, чухонцы-ы! — раскудлачаны Мішка напалову высунуўся з акна.— Вось вам яшчэ работка. Шуруйце!

Мы не ведалі, што адказаць. Стаялі, задраўшы галовы, і лыпалі вачыма.

І тут тоўсты Ігар крыкнуў у адказ:

— Ты зубы выскаляеш, а твайго Пірацiка ледзь да смерці не забілі. Каб не мы, то яго даўно б вароны дзяўблі, твайго Пірацiка.

Эх, і нарабіў жа новай бяды гэты Ігар!

Праз хвіліну Мішка стаяў на двары і грозна пытаўся:

— Хто біў майго Пірацiка, га? Я таму адразу галаву скручу! Дзе ён, той чалавек?!

— Вунь там,— паказаў на Люцiкава акно Гарык і адразу схаваўся за хлопцаў.

— Твой Пірацiк, мусіць, пабег недзе здыхаць.

Гэта сказаў Грыша Заяц. І таксама падаўся далей ад Мішкі. Толькі Сяргей застаўся на месцы. Да яго і падышоў Мішка-дубец.

— А вы не брэшаце? — спытаў ён.

— Была ахвота...

Сяргей адвярнуўся і сплюнуў. Мішка ўпёрся кулакамі ў бакі і, задраўшы галаву, гукнуў:

— Гэй! Стары паклёпнік!

— Ён казаў, што на цябе ў міліцыю напіша,— падбег і крыкнуў Мішку ў твар Грыша Заяц. Потым схапіў Сяргея за руку і падвёў да нас.— Цяпер — ходу! Няхай самі разбіраюцца...

Мы разбегліся па сваіх пад'ездах і з цікавасцю назіралі, што будзе далей.

Мішка зноў гукнуў угору:

— Ты за што майго Пірацiка біў, Люцiк-паўзуцiк? Гэта табе бокам вылезе! Чуеш ці не?!

— Пачынаецца! — усклікнуў Гарык.

І праўда, пачыналася. Дзверы на балконе адчыніліся, і ў іх паказаўся Люцiк.

— Шчанюк! — грымнуў ён на ўвесь двор.— Бандыт! Дабяруся я да цябе! Марш з двара! Каб і духу твайго тут не было!

— А-а! Дык ты яшчэ пагражаеш! — Мішка падняў з краю клумбы камень і — дзынь! — пасыпаліся зашклёныя дзверы балкона.— Вось цяпер дакладвай у міліцыю! Не баюся я цябе, стары пацук!

Гэта было ўжо задужа нават для Мішкі. Нам ажно страшна зрабілася, і мы ўсе разбегліся па сваіх кватэрах.

— Ну і заварылі ж мы кашу! — гаварыў на другі дзень Гуля.— З намі будзе што ці не? Ён на нас паскардзіцца ці не? У міліцыю нас возьмуць ці не?

Ён сыпаў пытанні, як гарох. І відаць было, што не так за нас за ўсіх баіцца, як за сябе.

Андрэй яму на гэта сказаў:

— Каму-каму, а табе, Гуля, будзе больш як каму, бо ты самы вялікі, а вялікіх бяруць у сведкі...

— Гэта праўда ці не? — механічна спытаў Гуля, і мы весела засмяяліся.

Сяргей прынёс новыя весткі:

— Люцік пацягнуў некуды цэлы пуд заяў. Ён хадзіў па двары і выпытваў нашы прозвішчы.

— Ну і няхай, я не баюся! — адразу зачырванеўшыся, ускрікнуў Сяргейка.— Мне мама сказала, што я здор-рава паправіўся на двары і каб заўсюды гуляў з вамі. І каб ніколі нікога не баяўся. Ніякіх Люцікаў...

— А Мішку міліцыянер забраў-такі! — далажыў Гарык.

Мы ўжо гэта ведалі, бо не зводзілі з двара вачэй. Выйсці адкрыта баяліся, дык цікавалі з-за дзвярэй, з балконаў.

Раптам Грыша Заяц нібыта па складах прачытаў:

— А Піс-кун га-лод-ны!

На Піскуна мы, і праўда, забыліся. І таму адразу панеслі яму ўсяго. Добраму сабаку на тыдзень хапіла б.

Здавалася, што за гэтыя суткі Піскун яшчэ паменшаў. Быў ён нейкі лянівы, сонны. І глядзеў на нас пакрыўджана. Гэта таму, мабыць, што доўга не прыходзілі.

Сяргей падняў яго за лапы і дзьмухнуў у нос.

— Што, сумуеш?

А Піскун толькі адвярнуўся ад яго.

— Мусіць, баіцца, што і на яго Люцік напіша заяву,— усміхнуўся Сярожа.

— Люцік едкі, люцік паўзучы! — падхапіў Гарык.— А я яго ніколечкі не баюся.

— Што табе... Бацьку будуць выклікаць,— сказаў Сяргей.— Нам цяпер трэба трымаць вуха востра!

— А мой тата не пойдзе! — адказаў Гарык.— Ён кожную раніцу спяшаецца на працу, яму няма калі бегаць абы-куды...

Было відаць, што хлопцы хвалююцца. Мне і самому ўжо не хацелася гуляць на сваім двары, такім прыгожым, та-

кім утульным. Ён быў нібы забруджаны адным іменем Люціка.

Адчуўшы агульны настрой, Сяргей рашуча махнуў рукой.

— Не здавацца! Біцца да апошняга, як Андрэйка!

Мы дружна падхапілі:

— Біцца да апошняга, як Андрэйка!

Ды ўсё ж, нягледзячы на ваяўнічы запал, хлопцаў цягнула з двара. Яны былі згодны гуляць хоць на лузе, хоць у лесе, хоць на пустцы ля падвала, абы-дзе, толькі не на двары.

— А што, калі пайсці на будоўлю? — пазіраючы на Сяргея, спытаў Ігар.

— На будоўлю? — перапытаў Сяргей і ажывіўся.— Мы лепш — во,— паказаў ён у бок возера.— Падпільнуем, як будуць перакрываць рэчку, і пойдзем ніжэй, аж да лесу. Там вада збяжыць, а рыба застанецца. Набяром цэлыя мяхі, кашы, вёдры...

— Навошта нам гэтулькі? — здзівіўся Гуля.— Досыць з нас і сетачак.

— Не твая справа! — адмахнуўся Сяргей.— Мы, можа, адкрыем тут невялікі рыбны ларок і будзем яе прадаваць. Збяром многа грошай і...

— Буржуем хочаш стаць? — не здаваўся Гуля.— Твой ларок як бачыш прыкрыюць.

— Не прыкрыюць. Мой дзядзька прывозіў з вёскі прадаваць лішняга вепрука. А ў нас будзе лішняя рыба. Лішкі дазваляюць прадаваць. Ясна? Нам трэба нарэшце паехаць у сапраўднае падарожжа. А для гэтага патрэбна шмат грошай. Мы будзем начаваць ля азёр, лавіць малпачак, ірваць на пальмах арэхі...

На Сяргея найшло натхненне. Як тады з яблыкамі. Але пра яблыкі ведаў я адзін і таму не перашкаджаў яму. Неўзабаве Сяргей завёў нас у такія джунглі, што, здавалася, адтуль мы ўжо ніколі не выберамся.

Выратаваў няшчасны выпадак. Гарыка, аказваецца, злавіла вялізная, дзевяціметровая анаконда...

— А што гэта такое — анаконда? — спытаў Гарык, і мы ў адно імгненне апынуліся каля нашага зусім нерамантычнага падвала.

— Гэта такая змяя, удаў. Яна не кусаецца, а душыць,— адказаў Сяргей.

— Дык удаў жа называецца інакш! — перабіў Грыша Заяц.— Ні то піпоп, ні то півон...

— Пітон,— ухмыльнуўся Сяргей.— Дык гэта ж сухапутны ўдаў, а анаконда — вадзяны. Не ведаеце, а перабіваеце...

Сяргей зазлаваў і змоўк. Падарожжа скончылася. Цяпер мы ўсе з надзеяй глядзелі на далёкія машыны, якія ўзводзілі дамбу. Усе былі згодны налавіць як мага больш рыбы, мець свой уласны ларок хоць на адзін дзень. Сабраць бы грошай толькі на дарогу. А там карміліся б дзічынай.

— Не, з вамі ў джунглях прападзеш,— зноў пачаў Сяргей.— Лепш паедзем на Далёкі Усход, у тайгу.

І вось мы ўжо прабіраемся па звярыных сцежках праз тайгу, лазім на высокія кедры па арэхі, імчымся на лодцы па імклівай рацэ, палюем на мядзведзя. І нарэшце знаходзім корань цудоўнай расліны — жэньшэня...

А пакуль што перад намі ляжала не далёкая тайга, а дзікае поле, зарослае дзядоўнікам, малiннікам і крапівой. Праўда, і тут была свая прыгажосць. На кветках гулі пчолы, між вішняку, кустоў бэзу і чаромхіляталі птушкі. І ўсюды, куды ні павярніся, бясконца цырыкалі конікі.

Мы пайшлі на будоўлю. З намі бег, блытаючыся пад нагамі, і Піскун.

— Бачыце, які шустры стаў,— сказаў Андрэй.— Яго не трэба трымаць на прывязі.

— А мы больш і не будзем. Няхай бегае,— падтрымаў сябра Сяргей.— Няхай развівае ногі і нюх.

Блізка да машын нас не пусцілі, але і зводдаль было добра відаць, што будаўніцтва ідзе поўным ходам.

Мы ўзабраліся на зарослы палыном узгорак і пазіралі, як расце дамба, якая хутка будзе стрымліваць напор доўгачаканага мора.

— Заўтра дамбу скончаць,— упэўнена прагаварыў Сяргей.— Вось толькі б не празяваць, як пачнуць перакрываць рэчку.

— А мы будзем дзяжурыць,— сказаў Грыша Заяц.— Нас колькі? Дзевяць? Дык кожны будзе дзяжурыць па гадзіне. А як пачнуць перакрываць, дзяжурны падасць сігнал.

Мы ўжо хацелі ісці назад, як нейкі рабочы ў сінім камбінезоне ўбачыў Піскуна і падышоў да нас.

— Чый сабака? — спытаў ён, схіляючыся над Піскуном.

Мы пераглянуліся. Што адказаць? А раптам гэты чалавек сапраўдны яго гаспадар?

Як заўсёды, выручыў Сяргей:

— Наш... Мы ўсе яго гадуем.

— І добры сабака? Слухае вас?

— Яшчэ як!— пасмяяўся Сяргей.— Любы след бярэ. Мы яго гадуем для пагранічнікаў.

— Бач ты! — здзівіўся рабочы.— Для пагранічнікаў ганчака?

А Сяргей папёс і папёс як заведзены. Манюкам, як я думаю, ён ніколі не быў. Манюка гэта той, хто хлусіць знарок, ашуквае. І ад таго бывае шкода. А ад таго, што гаварыў Сяргей, нікому ніякай шкоды не было. Ён проста летуценнік, выдумшчык. Вось і цяпер. Столькі нагаварыў пра нашага Піскуна, што мы і самі паверылі.

— Відаць, будзе неблагі сабака,— згадзіўся і рабочы.— Можа, прадасце яго мне? Я вам добра заплачу.

— Я не гаспадар. Як хлопцы,— пачаў хітраваць Сяргей.

Мы-то добра бачылі, што ён гатоў прадаць сабаку. Яму абы грошы на падарожжа. Нездарма ж хваліў Піскуна на ўсе лады. Ды мы, як адзін, не згаворваючыся, сталі на абарону свайго любімца.

— Не прададзім ні за якія грошы! — крыкнуў Грыша Заяц і падхапіў Піскуна на рукі.— Ты ж, Сяргей, сам гаварыў, што гадуем яго для пагранічнікаў.

— Ну, то гадуйце на здароўе. Дружныя вы, відаць, хлопцы! Малайцы!

Рабочы пагладзіў Піскуна і пайшоў.

Мы ўпершыню глядзелі на Сяргея варожа. Як ён мог нават падумаць такое!

— Ты ўсё гатоў прадаць! — папракнуў Сяргея Грыша Заяц.

— Нам у дарозе спатрэбіцца кожная капейка,— адказаў на гэта Сяргей.— Мы яшчэ не ведаем, што нас чакае ў тайзе.

Ён гаварыў пра тайгу так пераканаўча, быццам мы паедзем туды заўтра ці паслязаўтра. А грошы патрэбны на лодку з маторам. Бо прабірацца ў тайзе лепш за ўсё па рэках. Інакш прападзеш...

— Дык мы ж рыбы наловім! — запярэчыў я.

— Рыба — само сабою. А калі трапляецца зручны выпадак, упускаць не варта. Яшчэ невядома, ці не забярэ ў нас Мішка-дубец свайго Пірацiка. Прападзе задарма. Не забывайцеся, што ў яго два імені...

Гэта была праўда. Аднак калі ўзяць ды прадаць чужо-

га сабаку, то хто мы тады будзем, як не звычайныя зладзеі? Пра гэта мы падумалі ўсе адразу. Сяргей нават патыліцу пачухаў.

— Урэшце, сабака нам спатрэбіцца,— сказаў ён.— Раней за нас пачуе мядзведзя.

Калі ішлі назад, Сяргей з новай сілай пачаў фантазіраваць пра тайгу. Усё, што ён гаварыў, ён, вядома, недзе вычытаў. Але слухаць яго было дужа цікава.

— Лепш за ўсё спачатку спусціцца па Амуры,— як бывалы таежнік, гаварыў Сяргей.— Потым падняцца па меншых рэках — па Зеі ці Бурэі. Пад'едзем да сопак. І там знойдзем карэнні жэньшэня. Мы іх здадзім дзяржаве. Кожны грам каштуе два ці тры рублі. Ведаеце, колькі заробім за лета! Тысячы!

Грошы Сяргею патрэбны былі не для сябе, а для ўсіх. З якой лёгкасцю ён іх зарабляў, з такой і раздаваў.

— Частку мы возьмем на новае падарожжа, а частку аддадзім дзядзьку Харытону. Ён зробіць добрую парусную лодку, а мы падарым яе нашай школе.

Мы з самым сур'ёзным намерам устанавілі дзяжурства ля будучай плаціны. А яна будавалася не так хутка, як нам хацелася.

Мінула некалькі дзён, перш чым нарэшце чарговы дзяжурны — ім быў Сярожа — падаў умоўны сігнал.

Паглядзелі б тады на нас! Мы не беглі, а куляліся адзін цераз аднаго. Падалі, падымаліся і зноў нястрымна, як віхор, імчаліся наперад. Вёдры і кошыкі, якія мы загадзя падрыхтавалі да гэтай доўгачаканай часіны, грымелі і трашчалі.

Сярожа сустрэў нас на плаціне.

— Вось гэткія ёсць! — гаварыў ён, разводзячы як мага рукі.— Адзін я-а-ак скочыць угору. Ля самай плаціны...

— Хто адзін? — не зразумелі мы.

— Шчупак! Пайшлі хутчэй яго лавіць...

Раней за мостам была даволі шырокая рэчка. Цяпер там працякаў брудны ручай. Затока, дзе зусім нядаўна мы цікавалі за плоткамі, стала маленькай лужынай. Трава насярод яе палягла, пачарнела.

— Шукайце рыбу тут! — скамандаваў Сяргей.

Няўрымслівы Андрэй адразу ж скочыў з мурагу ў лужыну. Вады там было не больш як па калена, але наш адважны таварыш праваліўся па самы пояс. Аказваецца, дно ў затоцы багністае, гразі на паўметра.

Мы бегалі па беразе і раілі Андрэю, як выбірацца. Толькі нашы парады мала памагалі. Андрэй не мог выцягнуць з твані ног. Ён толькі тузаўся па месцы і рагатаў. Яго, як ён казаў, засмактала багна джунгляў.

Цыбаты Гуля, якому тут не было б і па калена, баяўся стаць ніжэй і падаць Андрэю руку. Ён толькі бегаў тудысюды і ныў:

— Я яго штурхаў туды ці не? Няўжо і мне лезці ў тую гразь? Я вінаваты ці не?

— Хопіць, не енчы,— сказаў Сяргей. — Зараз знойдзем кій і выцягнем.— І пабег паўз рэчку шукаць якуюнебудзь палку.

Між тым, Андрэй змірыўся са сваім становішчам. Ён, наколькі гэта было можна, агледзеў траву.

— Лухта ўсё, ніякіх плотак тут больш няма. Сышлі з вадою,— расчаравана прамовіў ён.— Адны п'яўкі нейкія. Чорныя, як гадзюкі.

Сяргей прыбег з доўгім кіем. Мы падалі яго Андрэю. Ён ухапіўся, павярнуўшыся да нас бокам, і крыкнуў:

— Цягні-і-і!

Цягнуць было цяжка, але з нашай сілай можна нават слана выцягнуць з багны, не толькі хударлявага Андрэя. Ды мы, відаць, перастараліся. Так шкуматнулі, што бедны Андрэй паваліўся на спіну, у самае балота.

Калі нарэшце ён апынуўся на мурагу, то быў падобны на чорта. Увесь у гразі, мокры. Адно вочы блішчалі. Ды ён хлопец што трэба, не хныкаў.

— Мой тата заўсёды кажа, што, не ведаючы броду, не сунься ў воду,— здымаючы штаны, смяяўся Андрэй.— А я не паслухаўся.

Сяргейка глядзеў на яго з жахам.

— Ты зноў будзеш мыць адзежу? — спытаў ён ціха.

— Цяпер жа яна толькі ў гразі! — адказаў Андрэй.— А гразь адмыецца раз-два!..

— Дык ты нас дагоніш, а то кожная хвілінка дарагая! — сказаў Сяргей, і мы, падхапіўшы свае кошыкі і вёдры, рынуліся за ім.

Вада спадала ўвачавідкі. Але каб дзе трапілася вялікая рыбіна — такога не было. Прайшлі ўжо і тое месца, дзе, як казаў Сяргей, «нешта боўтала», калі ён бегаў шукаць кій. І далей, за крынічку.

І раптам — удача! Чорны аголены бераг яшчэ макрэўся. З норак выбягала вада. І вось там, у адной норцы, нешта плюскатала. Яно, тое «нешта», апынулася ў пастцы.

— Ёсць! — крыкнуў Сяргей, прабег па цвёрдым дне проста ў чаравіках і сунуў руку ў нару.

Мы затаілі дыханне. Грыша Заяц падрыхтаваў вядро.

— Выкручваецца, халера,— праз нейкі момант прамармытаў Сяргей. І ўслед за гэтымі словамі выцягнуў з нары невялічкага чорнага мянька.

Хлопцы глядзелі на рыбку, і твары ва ўсіх выцягваліся, вочы станавіліся сумнымі, хоць Сяргей кінуў рыбку ў вядро з такім выглядам, быццам гэта быў пудовы сом.

Нам пашчаслівіла злавіць яшчэ некалькі вусатых слімжыкаў, печкура і ледзь жывога шчупачка грамаў на сто.

Ад плаціны мы адышліся ўжо кіламетры на два. Рэчка тут пашырэла, паглыбела. І не дзіва. Шмат крынічак несла ў яе свае вечна жывыя воды...

Сяргей яшчэ не верыў у поўны правал аперацыі «рыба», як ён не раз называў нашу задуму. Ён паглядзеў наперад і ўжо не вельмі ўпэўнена папрасіў:

— Дойдзем яшчэ вунь да таго куста.

І «той куст» быў апошнім нашым рубяжом. Мы ўздыхнулі і папляліся назад.

— Нікуды мы не паедзем! — расчаравана прамовіў Гарык.— Хіба толькі, як будзем у лагеры, пойдзем у турысцкі паход.

Усе сумна маўчалі. Так, хутка мы паедзем на другую змену ў піянерскія лагеры, і там, безумоўна, будзе паход, можа, і не адзін.

Толькі Андрэй, якому сёння не пашанцавала больш за ўсіх, бадзёра насвістваў сабе пад нос нейкую незразумелую мелодыю.

## ПАМЯЦЬ ЖЫВЕ ВЕЧНА

На двары нас чакала непрыемнасць. Малыя сказалі, што прыходзіў нейкі дзядзька з двума міліцыянерамі і што яны пыталіся, дзе мы. Дзядзька Харытон пайшоў шукаць нас, а міліцыянеры і чужы дзядзька зайшлі да Люціка.

На двары, апрача дзяцей, нікога не было.

— Што цяпер рабіць? — ціха спытаў Сярожа.— Я ж казаў, што не трэба было нацкоўваць таго Мішку на Люціка! Ага! Гэта ўсё Ігарава работа.

— І не мая! Першы Андрэй сказаў, што Люціка трэба правучыць,— адбрыкваўся Ігар.

Андрэй сказаў з ухмылкай:

— Між іншым, пацкаваць Мішку на Люціка прапапаваў сам Сяргей.

— А я і не адгаворваюся. Гэта Сярожка ўсяго баіцца.

— І што Люцік Піраціка біў, ты гаварыў,— успамінаў Сярожка.— А што Люцік напіша на Мішку, гаварыў Гаўрык! А я нічога не гаварыў!

Адным словам, усе апраўдваліся, ніхто не хацеў браць на сябе віну, апрача Сяргея. Гэта ўжо выходзіла непрыгожа, не па-сяброўску.

— А от і я нікога не баюся! — дрыготкім ад хвалявання голасам сказаў Сяргейка.— Ні Мішкі, ні Люціка, ні міліцыянераў! Я пайду і скажу ім, што Люцік нас прагнаў з двара на тую пустку.

Мы глядзелі на Сяргейку і не верылі сваім вушам. Ён аказаўся смялейшым за ўсіх нас. Твар у яго паружавеў, вачаняты гарэлі гневам. І ўвесь ён нібы падрос.

— Правільна! — падтрымаў яго Сяргей.— Пойдзем шукаць дзядзьку Харытона. Ён скажа, што мы ніколі нічога не псавалі на нашым двары.

— А ён вунь сам ідзе сюды,— паказаў Гарык.

Дзядзька Харытон яшчэ здалёк прыветліва памахаў нам рукою і прыбавіў кроку.

— Прыйшлі, брацікі-салдацікі? Вось і добра! — сказаў ён.— Пачакайце адну хвілінку, а я збегаю па астатніх. Трэба сёе-тое высветліць...

Ён подбегам падаўся да пад'езда.

Мы селі на лаўкі абапал дарожкі і пачалі чакаць. Размаўляць нам зусім не хацелася. Дужа ўсё было невядома, і гэта трывожыла.

Дзядзька Харытон вярнуўся хутка. І не адзін. З ім быў наш знаёмы карэспандэнт, два афіцэры ў міліцэйскай форме і Люцік. Мы дружна ўсталі і далі ім месца на лаўках. Сеў адзін Люцік.

— Ага, вось гэтыя! — прыжмурыўся ён і тыцнуў на нас доўгім пальцам.— Ужо да таго распусныя, да таго раздураныя, што крый божа. Проста, як жукі тыя каларадскія, усё нішчаць. А чаму? Бо з боку бацькоў няма ніякага выхавання. Вось і прыходзіцца мне звяртацца за дапамогай да грамадскасці, да адпаведных устаноў. Заўважце — усе яны піянеры.

Люцік ліў на нас усякі бруд, а мы маўчалі. Мы нават не ведалі, як сябе паводзіць. Апраўдвацца ці не? Я паглядзеў на сваіх сяброў. Гуля збялеў, быццам усё, што

плёў па нас Люцік, было праўда, і ён, Гуля, адзін ва ўсім вінаваты. Сярожка заўзята цёр кулаком нос. Заяц нешта ўважліва разглядаў па небе, хоць там не было ні воблачка. Ігар корпаўся ў кішэнях, нібы чаго шукаючы, Андрэй, як заўсёды, насвістваў. Але так ціха, што чуў яго, мабыць, толькі я.

— Ну, што ж...— нарэшце загаварыў карэспандэнт.— Калі ўжо вы напісалі на хлопцаў у газету, то я павінен факты праверыць на месцы.

— Хіба мне, пенсіянеру, не верыце? — узняў на яго вочы Люцік.— Я, можа, чалавек заслужаны.

— Можа,— кіўнуў галавой карэспандэнт.— Але справа не ў гэтым. Калі дзеці ў чым вінаваты, яны будуць адказваць. Праўда, вы абвінавачваеце іх ледзь не ў падрыўной дзейнасці, у тым, што яны наносяць дзяржаве вялікую шкоду... Раскажыце нам, хлопцы, што вы тут натварылі? — звярнуўся ён нарэшце да нас.— Як вы тут парушаеце законы нашага грамадства?

Мы ўсе зірнулі на Сяргея, і ён адчуў, што настаў самы адказны момант.

— Нічога мы не парушаем,— надзвычай спакойным голасам пачаў Сяргей.— Мы проста гуляем. І памагаем дзядзьку Харытону, каб двор быў чысты. А яны вось,— ён паказаў на Люціка,— сагналі нас са двара. Проста зненавідзелі нам двор праз іх! Нікуды не пайдзі, не ступі...

— Хі-хі-хі! — дробненька засмяяўся Люцік.— Памочнікі... Ды ваш дзядзька Харытон проста не спраўляецца са сваімі абавязкамі. Кажаце, каб двор быў прыгожы? Хіба паламаныя кветкі прыгажэйшыя за цэлыя? Ламалі вы кветкі ці не?

— Але ж мы не хацелі... Сабачка забег.

— Запішыце, таварыш карэспандэнт: факцікі пацвердзіліся. Я ведаю, як гэта ў вас робіцца! — адразу падхапіў Люцік.— Хлопчыкі пачынаюць прызнавацца...

— Іменна — факцікі! — раптам перапыніў яго карэспандэнт.— Хлопцы зламалі галінку. А яны ж тут, як мне стала вядома, пасадзілі больш за дваццаць дрэўцаў і кустоў.— Карэспандэнт падумаў і дадаў ужо больш спакойна: — Хутка яны паедуць у піянерскія лагеры. А пакуль што ім трэба чымсьці заняцца. Дзеці любяць розныя гульні... Калісьці тут, на гэтай зямлі, жылі другія дзеці. Ім было не да гульняў. Тыя дзеці таксама памагалі дарослым. Памагалі зарабляць хлеб, падтрымліваць у хаце цяпло, змагацца з ворагам. Але, як ні дзіўна, і тады, у

самыя цяжкія часіны, знаходзіліся людзі, якія пісалі на дзяцей даносы...

Карэспандэнт дастаў з бакавой кішэні пацямнелую ад часу паперу.

— Вось паслухайце, што пісалі тады фашыстам даносчыкі: «Жыхары Зарачанскай вуліцы, якія камуністы і дзеці якіх піянеры,— прачытаў карэспандэнт і зірнуў на Люціка,— ствараюць невядома што...»

— Але ж... Якое гэта мае дачыненне да майго пісьма? — здушаным голасам спытаў Люцік. Яго твар аж пасінеў, вочы пабялелі.

— А вось паслухайце, як пішаце вы: «Жыхары нашага двара, большасць якіх камуністы і дзеці якіх піянеры, твораць на двары невядома што...» — прачытаў з новай паперкі карэспандэнт.— Ці не здаецца вам, Люцік, што тэксты даносаў падобныя, як два браты. Быццам пісаў іх адзін чалавек. Не на шмат змяніўся і почырк. Усё тыя ж акуратныя, як памаляваныя, літаркі, тыя ж слоўцы... Адно разыходзіцца — подпісы. Першы данос напісаў Эдуард Пярун, брат былога паліцая, здраднік, які збег ад справядлівага суда. Толькі чужое прозвішча, якое ён недзе сабе прысвоіў, як сапраўдны злодзей, ратавала яго ад пакарання. Ды вось бяда! Яму зноў захацелася пісаць. На ўсіх сумленных людзей. У рэдакцыі газет, у савецкія ўстановы сыплюцца ананімкі, даносы, паклёпы... Вас выдала старая хвароба, грамадзянін Пярун,— ужо са злосцю закончыў карэспандэнт.

Мы і не прыкмецілі, як паабапал Люціка сталі работнікі міліцыі. Ён згорбіўся, абмяк.

— Дык навошта ж на двары гэта гаварыць. У мяне яшчэ ёсць кватэра...— Толькі і змог ён вымавіць.

— Вам непрыемна, што чуюць суседзі? — спытаў карэспандэнт.— А як жа мне было прыемна слухаць, калі вы пры мне, параненым, збітым хлапчуку, гаварылі фашыстам: «Гэта ён кінуў гранату і схаваўся ў падвале школы. Ён жыў у камуніста Пракопчыка». А мне ж тады ішоў толькі чатырнаццаты год...

Значыць, карэспандэнт і ёсць той Андрэйка! Жывы Андрэйка! І дзядзька Харытон ведае пра гэта, бо ён глядзіць на нас і шчасліва ўсміхаецца.

— Вось! — карэспандэнт працягнуў левую руку, на якой не хапала двух пальцаў, паказаў на шрам над вокам.— Я пакляўся гэтымі першымі ранамі, што знайду даносчыка. Колькі папер мне давялося перабраць! Пуды.

Але я знайшоў патрэбную! А тут гэтыя заявы ад Люціка. Хто ён, той Люцік, высветляць, каму гэта належыць. А вас я знайшоў, Пяруп! Знайшоў! Я пазнаў вас адразу, як толькі зірнуў... А цяпер мне трэба пагаварыць з малымі. Яны павінны ведаць усё. Як мяне катавалі, як везлі на чужыну, як высушвалі маю скуру і косці, як кідалі за калючы дрот і везлі расстрэльваць. Ды на злосць усім ворагам я выжыў!..

У Андрэя Захаравіча, былога Андрэйкі, ад хвалявання дрыжалі рукі, калі ён клаў паперкі ў кішэню. Яго словы прагучалі як прысуд усім паклёпнікам і здраднікам.

Шмат чаго расказаў нам пасля карэспандэнт Андрэй Захаравіч. А на развітанне падарыў фотакарткі. І вось дзіва! Ён жа сам фатаграфаваў, а на фотакартках стаяў побач з дзядзькам Харытонам. Як ён там апынуўся? Для нас гэта было загадкай. Адно мы ўспомнілі, што Андрэй Захаравіч пакідаў там сабе месца.

А праз тры дні з балкона кватэры, у якой раней жыў Люцік, пачуўся прыемны жаночы голас:

— Добрай раніцы, хлопчыкі!

— Добрай раніцы! — дружна адказалі мы незнаёмай сівой жанчыне, шчыра радуючыся, што ўжо можна смела гуляць на двары, не баяцца ступіць на траву ці расхінуць рукамі густыя кусты дзікай ружы...

Сёння мы сустрэлі Мішку-дубца. Ён стаў нейкі задумлівы. Мая маці гаварыла, што нарэшце «лайдак уладкаваўся на працу». Падышоўшы да нас, ён неяк расчулена паведаміў:

— Цяпер мне не да вас, чухонцы! — Падумаў і дадаў: — А Піраціка гадуйце! Ён разумны шчанюк.

І пайшоў ад нас шырокім крокам.

Мы паглядзелі яму ўслед і падняліся на пагорак.

— Мора! Наша мора! — закрычаў я.

Не згаворваючыся, мы пабеглі ўніз.

Гэта было, вядома, яшчэ не мора, а шырокае возера. Такое шырокае, што да супрацьлеглага берага ўжо было кіламетры два. Але хвалі, сапраўдныя хвалі, набягалі на пясок і ціха нашэптвалі: «Будзе мора, будзе мора...» Мы выразна чулі тыя галасы. І яшчэ мы ўбачылі сапраўдных чаек. Яны кружыліся над вадою і працяжна кігікалі.

Колькі радасці, прыгод прынясе яно нам, наша мора!..

1967

## ЗМЕСТ

*Яўген Курто.* Памяць сэрца... . . . . . 3
ПЕРАЛОМНАЕ ЛЕТА (аповесць) . . . 7
У БАРКОЎСКАЙ ПУШЧЫ (аповесць) . 120
НАДЗЕІ І ЗДЗЯЙСНЕННІ (аповесць) . . 203
НА ДЗІКАЙ ПАЛЯНЕ (аповесць) . . . 322
РЭХА (аповесць) . . . . . . . . . . . 379

**Ваданосаў М.**

В 12 Выбраныя творы. У 2-х т. Т. 1. Аповесці/[Аўт. прадм. Я. Курто] — Мн.: Маст. літ., 1983.— 439 с., 1 л. партр.

У пер.: 1 р. 90 к.

Двухтомнік вядомага беларускага пісьменніка Міколы Ваданосава складаюць лепшыя аповесці і апавяданні, напісаныя за многія гады творчай працы.

У першы том увайшла аповесць «Пераломнае лета», напісаная на матэрыяле з жыцця нашай моладзі, якая пераступіла парог сталасці і выйшла на прасторы самастойнага жыцця.

Цікавыя аповесці «У Баркоўскай пушчы», «Надзеі і здзяйсненні», «На дзікай паляне». Палюбілася нашаму юнаму чытачу аповесць «Рэха».

$В\frac{4702120200—056}{М 302(05)—83}116—83$

ББК 84Бел7
Бел2

**НИКОЛАЙ МИХАЙЛОВИЧ ВОДОНОСОВ**

*Избранные произведения в двух томах*

*Том 1*

Повести

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Рэдактар Г. В. Роліч. Мастак А. А. Бетанава. Мастацкі рэдактар Л. Я. Прагін. Тэхнічны рэдактар Г. П. Тарасевіч. Карэктар Л. П. Бялова.

ІБ № 1637

Здадзена ў набор 01.07.82. Падп. да друку 10.03.83. АТ 12017. Фармат 84×108¹/₃₂. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 23,10+0,11 укл. Ум. фарб.-адб. 23,31. Ул.-выд. арк. 25,76. Тыраж 12 000 экз. Зак. 2733. Цана 1 р. 90 к. Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11. Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.